
ГАРЭЗЛІВЫ
ПАЦАЛУНАК
ЕВА ВАЙТОЎСКАЯ

Ева Вайтоўская

# ГАРЭЗЛІВЫ ПАЦАЛУНАК

Кніга першая

*Маладзевы раман*

Мінск
Выдавец А. М. Янушкевіч
2020

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
В14

Аўтарка дзякуе Івану Мацяшу і Дыяне Кірэйчук,
школьніку і студэнтцы,
за «моладзевае рэдагаванне» гэтай кнігі

Мастачка Кацярына Грэковіч

**Вайтоўская, Е.**

В14 Гарэзлівы пацалунак : Кн. 1 : [моладзевы раман] / Ева Вайтоўская. — Мінск : А. М. Янушкевіч, 2020. — 448 с.

ISBN 978-985-7210-45-9.

Жыццё ціхай троечніцы Соні Сінічкі да непазнавальнасці змяняецца ў выпускным класе ў той дзень, калі яна прызнаецца ў каханні найлепшаму вучню школы Максіму Статкевічу. Дзеянне першай кнігі адбываецца ў сярэдняй школе аднаго з мікрараёнаў Мінска. У далейшым падзеі перанясуцца на філалагічны факультэт беларускага ўніверсітэта, экалагічны летнік і ў офіс сусветна вядомай беларускай IT-кампаніі.

Раман прызначаны для аўдыторыі young adult (16–25 гадоў), а таксама для ўсіх аматараў папулярнай літаратуры.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-7210-45-9**

© Ева Вайтоўская, 2020
© Афармленне. Выдавец А. М. Янушкевіч, 2020

*У аснову раману лёг сюжэт культавай японскай мангі «Ітадзура на кіс» («Гарэзлівы пацалунак»), якая выходзіла ў Японіі ў 1991–1999 гадах, маляваная манга-мастачкай Тада Каору (1960–1999). Звышпапулярны коміксавы серыял застаўся нясконччаным праз заўчасную смерць аўтаркі, што не зашкодзіла яму здабыць прыхільнікаў ва ўсім свеце — і не толькі сярод аматараў мангі і анімэ. «Гарэзлівы пацалунак» быў некалькі разоў экранізаваны азіяцкімі тэлестудыямі, а сюжэт гэтай гісторыі ўжо зрабіўся вандроўным. Аўтарка беларускага рамана вырашыла перасяліць герояў мангі з Токіа 1990-х у сучасны ёй Мінск і паглядзець, што з гэтага атрымаецца.*

*У японскім арыгінале школьніцу Катока Аіхару, якая закахалася ў прыгажунчыка Ірые Наокі, параўноўваюць са смаўжом, які паволі і ўпарта паўзе па схіле гары да сваёй мэты. Аўтарцы беларускай версіі больш даспадобы еўрапейскае параўнанне. Яна бачыць сваю гераіню Папялушкай, чые прыхаваныя таленты раскрываюцца з дапамогай чароўных фей, якія, на шчасце, апынаюцца поруч.*

# ТОМ ПЕРШЫ

Раздзел I

# КАТАСТРОФА

— Глядзіце, вунь Соня Сінічка з «Д» класа!

— Яна прызналася ў каханні Максу Статкевічу з 11 «А»!

— Вядома ж, ён яе адшыў!

— А як іначай? Дурніца! Што яна сабе думае?

Школьныя перапынкі, такія хуткаплынныя ў іншыя дні, сёння ператварыліся ў бясконцае пекла. Добра яшчэ, гісторыя ў адным кабінеце з белмовай: можна будзе застацца ў класе, прыкінуўшыся, што трэба дарабіць дамашку. Халера з імі — з адкрытымі форткамі. Для яе гэта вельмі нават добрае выйсце — праваляцца тыдзень дома з ангінай. А лепей — два тыдні. А там і восеньскія вакацыі — і пра ейны канфуз пакрысе забудуцца.

— Шу-шу-шу... Шу-шу-шу...

Але першым урокам — хімія, другім — фізра. Гэта значыць, трэба спачатку падняцца ў хімкабінет з першага паверха на чацвёрты, а потым спусціцца з чацвёртага — у цокаль, у спартзалу. Праз тры пралёты і два пераходы. У... толькі не гэта! — дзявочую шатню, дзе пасля ўрока пераапранаюцца завучкі з іхняй паралелі.

— Слухайце, як можна так аблажацца? Яна ж у адзінаццатым класе. Пара б ужо ведаць усё пра падзелы на касты!

— Ты што, яна ж з «Д»! У іх замест грамадазнаўства — практыка на заводзе!

Сярэдняя школа № 234 горада Мінска аднядаўна часу мела прагрэсіўнага дырэктара і, адпаведна, адмысловую школьную праграму. У год, калі час быў Соні Сінічцы пераводзіцца ў дзявяты клас, новы дырэктар арганізаваў набор у спецкласы. Набор правялі на базе вучняў школы, але прымалі дакументы ад любых адораных падлеткаў з прапіскай у -скім раёне. Так і стварылі спецклас «А» — з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы, «Б» — фізічны клас, «В» — матэматычны і «Г» — эксперыментальны клас з эканамічным профілем.

У іншых школах калі і праводзілі такія наборы, то з дзясятага класа. Не дзіва, што сярод бацькоў будучых дзевяцікласнікаў разгарэўся ажыятаж. І калі попыт на фізіку і матэматыку не быў надта высокім, бо побач існавала цэлая гімназія з фізматухілам, то перспектыва ўвапхнуць сваіх птушанятак у англійскі «А» ўзвінціла конкурс у гэты клас да пяці чалавек на месца.

А вось «эксперыментальны эканамічны» мала каго зацікавіў. Быў туды недабор, і клас дакамплектавалі тымі, хто не прайшоў па балах у «А». То бок усімі, каму карцела «людзьмі звацца».

— Я не зразумела, клас «Г»! Якая вам справа?! Свайго асабістага жыцця няма, дык у чужое лезеце?..

— Збаў абароты, расліна!

І — самае жахлівае:

— Пашляціна.

— Гі-гі! Пашляціна...

Адбрэхвацца ў адказ не ў манерах Соні, але гэтым разам ну сапраўды дасталі. З кабінета хіміі яна пастаралася выслізнуць першай, ні з кім не размаўляючы. Але таго, што на фізры давядзецца сутыкнуцца з «гэшкамі», не ўлічыла.

На апошнім сходзе восьмай паралелі дырэктар прызначыў дні іспытаў для спецкласаў і заадно абвясціў, што

ніводзін двоечнік і хуліган з восьмага ў дзявяты пераведзены не будзе. Пасля чаго агучыў прозвішчы ўсіх парушальнікаў дысцыпліны і статыстык паспяховасці, выдаўшы кожнаму на рукі бледненькую ксеракопію з тэлефонамі суседніх школ, дзе адшчапенцы могуць перакантавацца годзік перад хабзой.

Так і сказаў: «Вымятайцеся, калі ласка».

Для тых жа, хто застанецца ў школе, але не зможа паступіць ні ў адзін са спецкласаў, дырэктар абяцаў арганізаваць пяты — «просты клас». 9 «Д».

Міма дырэктарскага расстрэльнага спіса ціхая троечніца Соня Сінічка шчаслівa праляцела, але і на адбор у спецкласы не пайшла. Куды ёй з ейнымі здольнасцямі. Так яна трапіла ў «Д».

«Д» значыць дэбілы. Вы не ведалі?

За імі, у малодшых паралелях, ужо не было «простых класаў». А сама школа налета рыхтавалася стаць гімназіяй.

Так што на пачатку адзінаццатага класа Соня Сінічка і ейныя аднакласнікі засталіся купкай няўдачнікаў у акіяне геніяў. Проста як тыя дзікуны ў песні пра нешчаслівую выспу. «Расліны», «кабачкі» і «тубыльцы» — самыя бяскрыўдныя мянушкі, якімі іх цяпер адорвалі ў школе ўсе — ад малых да аднагодкаў.

Вось яны, 11 «Д». Уварваліся ў шатні, галосяць, балбочуць, тузаюцца. Асабліва хлопцы. Дакладна — тубыльцы.

— Сініца, ты што, праўда гэта зрабіла???

Найлепшыя сяброўкі — Галя Вайтовіч і Сняжана Кавалёва. Першая — чарнявая і кудлатая, поўненькая, як бочачка, другая — наадварот, худая, як трэска, і высокая, як слуп, фарбуе свой шэранькі лён у радыкальны блонд, які з гонарам называе «плацінай». Стаяць, задыхаліся. Жывуць у адным доме, таму на заняткі ходзяць разам і сёння традыцыйна спазніліся. Потым, відаць, хаваліся ў прыбіральні ад завучаў, якія пасля званка здзяйсняюць рэйд па школе, вылоўліваючы і перапісваючы такіх спазніўцаў. Таму пра самы гучны скан-

дал чвэрці і тое, што іхняя Сініца — пасмешышча ўсёй школы, дазналіся толькі пасля хіміі ад іншых дзяўчат.

— Ты ў курсе, што ён бог?

— На што ты ўвогуле спадзявалася?

— Ну, на разуменне.

— На разуменне?!! Давай удакладнім. Гаворка пра Максіма Статкевіча з 11 «А»?

— Ну, пра Максіма Статкевіча. І што тут такога?

Галя зарагатала, а Сняжана млява закаціла вочы.

Справа нават не ў тым, што Сінічка — «дэшка», а прыгажун Макс Статкевіч — першы вучань самага элітнага — «А» класа. Проста ўвогуле няясна, што гэты геній робіць у іхняй школе. З ягонымі дадзенымі ён мог лёгка паступіць у любы прэстыжны ліцэй. «Ашкі» даносілі, што Статкевічы агітавалі здольнага сына за элітную гімназію пры лінгвістычным, але той сказаў, што яму ляніва ездзіць на вучобу ў цэнтр горада, і сам падаў дакументы ў «А» клас.

— Ты ў курсе, што ён выйграў запар дзве рэспублікі па англійскай мове і, найверагодней, налета зноў выйграе алімпіяду?

— Ты ў курсе, што любая дзеўка ў нашай школе аддасць новы смартфон, каб хоць раз пабачыць яго ў спартыўнай форме, але гэта амаль немагчыма, бо ад фізры яго вызвалілі, бо ён — чэмпіён па тэнісе сярод юніёраў?

— Ты ў курсе, што ў яго ай-к'ю — 180 і тытул «кароль школы» ў мінулым годзе атрымаў таксама ён?

— Ты ў курсе, што ягоны бацян валодае буйной ай-ты-кампаніяй, а яго сям'я жыве ў крутым катэджы на Цнянцы?

Гэтыя балбатухі выдатна сумяшчалі пераапрананне, прычэсванне ды адсылку камусьці эсэмэсак — з экстраннай прамыўкай Соніных мазгоў. Цэзарыхі, блін. Соня маўчала, робячы выгляд, што перавязвае матузкі на кедах.

— Ідзіце. Ала не любіць, калі спазняюцца на шыхтаванне.

Вось яна, Соня Сінічка, стаіць перад люстэркам у апранальні. Такога, каб люстравацца ў поўны рост, няма ў маласямейным інтэрнаце, дзе пакуль жывуць яны з бацькам. Таму, дачакаўшыся, пакуль дзяўчаты класа «Д» па свістку фізручкі пераваНдруюць у залу, Соня глядзіць праўдзе ў вочы. Нізенькая, кату па пяту, з русымі валасамі, сабранымі ў хвост, і вялікімі шэрымі вачыма пад прамой грыўкай, што напаўзае на павекі. Не худая і не тоўстая. У свае шаснаццаць — без намёку на нейкія хоць мала выбітныя грудзі пад майкай з ідыёцкім коцікам. Худыя ногі вытыркаюць з ружовых шортаў. Сераднячок з выгляду, як і ўва ўсім астатнім.

У думках дамалявала побач з сабою высокага і станістага цемнавокага шатэна ў бездакорным шэра-сінім гарнітуры. У беласнежнай кашулі расшпілены верхні гузік. Прынцыпова без гальштука — прывілей, дараваны строгім дырэктарам. У школе ўжо тры гады як «дзелавы стыль» і фэйс-кантроль на ўваходзе, і яго не праходзяць ані джынсы, ані яркая памада, ані міні-спадніцы. Вольнасці ў аблічнасці дзірык дазваляе толькі асабліва адзначаным вучням, з імі ён вітаецца за руку, іх ён запрашае на каву ў «чыл-аўт» — прыёмны пакой свайго кабінета. З дня, калі яго сюды прызначылі, такіх таемных прывілеяў дзірык выдаў толькі тры: генію фізікі Ваню Каланіцкаму з 11 «Б» — на доўгія валасы, на завушніцу ў вуху — таму ж Каланіцкаму і на права не насіць гальштука — Максу Статкевічу.

Але доўгія валасы і нават завушніца — гэта зусім не крута, калі поруч Максім з ягонай сімпатычнай стрыжкай, ахайна прычасанай зранку і ўвечары. Кожная старшакласніца 234-й школы гэта пацвердзіць.

Соня ўздыхнула. Усе навокал мелі рацыю. Дзе ён, а дзе яна.

— Ала Юр'еўна, у мяне жывот разбалеўся... Можна я пасяджу ў апранальні?..

Усё пачалося два гады таму, на лінейцы першага верасня. Дзевяцікласнікі са спецкласаў былі ў цэнтры ўвагі,

і педагогі-арганізатары ўключылі ў сцэнар прывітальнае слова школе ад новых вучняў. Выдатнік і спартсмен з багатай сям'і — не было сумневаў, што прамову даручаць таямнічаму новенькаму.

...Калі ён падышоў да мікрафона, па шэрагах разнеслася працяглае дзявочае «ох». У Соні дык проста заняло дыханне. Адзеты ў гарнітур-тройку прыгажун трымаў у руцэ паперку з тэкстам, але, прамаўляючы, нават не зазіраў у яе. А гаварыў без запінкі — так, нібы лёгка вывучыў усё на памяць. Напрыканцы, карыстаючыся тым, што выступае ад лінгвістычнага класа, ён да месца ўкруціў нейкую фразу па-англійску, тут жа пераклаўшы яе для прафанаў. Соня чула потым, як настаўніцы англійскай захапляліся ягоным вымаўленнем: *Pure British**. Казалі, што ён некалькі гадоў жыў з бацькамі ў Лондане.

Сузіраючы на школьным ганку гэтага рыцара без страху і папроку, Соня ўпершыню ў сваім бесклапотным жыцці моцна-моцна, да рэзі ў жываце, пра нешта пашкадавала.

— Ну і дурніца я. Нават не паспрабавала здаць тыя іспыты, — зашаптала яна Галі на вуха. — Толькі падумай: я магла б вучыцца ў адным з ім класе.

— Ды ладна. Мы паспрабавалі. Скажы, Снежка? А толку? Там быў такі прахадны бал, што мама дарагая. Дый калі падумаць — навошта ён увогуле камусьці ўпаў, гэты спецклас? Восем урокаў інглішу на тыдзень — яно трэба? Хоць калі б перад іспытам нам паказалі такоооое — гэта была б зусім іншая матывацыя!..

— Я буду добра вучыцца і ў дзясятым абавязкова перавядуся ў «А». Яшчэ не позна! Яшчэ можна нешта зрабіць! Яшчэ будзе магчымасць!..

Новыя сяброўкі ў адказ толькі хмыкнулі.

* Бездакорна брытанскае *(англ.)*.

З таго часу два гады Соня жыла, нібы ў тумане, які крыху рассейваўся, калі ў калідоры вырастала фігура боства з паралельнага класа. Ён хадзіў па школе ў поўнай самоце, з каменным, нібы вечна нечым незадаволеным тварам брытанскага арыстакрата, гледзячы на іншых вучняў зверху ўніз, а на настаўнікаў — як на роўных, але малапрыемных яму асоб.

Сноб няшчасны.

Але ў гэтага сноба і зазнайку Соня з першага погляду закахалася па самыя вушы. І нават пасля таго, што адбылося сёння, кахала яго, нягодніка, аддана і безнадзейна.

Яна сапраўды спрабавала перавесціся ў лінгвістычны. Пагатоў пасля дзявятага класа частка яго вучняў спакусілася на розныя каледжы ды ліцэі і вызваліла колькі запаветных месцаў. Але, па-першае, у сваёй мілоснай ліхаманцы наша гераіня забылася пра восем урокаў англійскай на тыдзень і тую прорву ў ведах, якая цяпер аддзяляла яе ад «ашак». Самастойныя заняткі не далі плёну, а на рэпетытара грошай у іх з бацькам не было. Настаўніца англійскай толькі цяжка ўздыхнула, аддаючы ёй аркушы выніковага тэста за дзявяты клас, пасля якога перавод мог адбыцца. Па-другое, выявілася, што прэстыж «А» класа затлуміў галаву шмат каму ў раёне, і на вольныя месцы аператыўна прынялі мажораў, чые таткі ахвяравалі школе навюткую аргтэхніку і мэблю.

Мінуў яшчэ год, і на пачатку адзінаццатага класа Соня Сінічка вырашыла, што неадкладна прызнаецца ў каханні Максіму Статкевічу. Калі памарудзіць яшчэ крыху, яны скончаць школу, і шанцу ўпаляваць свайго жорава ў небе ў яе не будзе.

Цэлы месяц Соня набіралася адвагі, абдумваючы дэталі. Напісаць мэйл ці эсэмэску, як робяць у такіх выпадках іншыя дзяўчаты? Каб жа — яшчэ адной агульнавядомай прымхай Статкевіча было тое, што ён не меў ані мабільніка, ані старонкі хоць у якой сацыяльнай сетцы.

Падысці на перапынку і сказаць? Ды яна знепрытомнее, перш чым вымавіць слова!

Таму паміж асабістым зваротам да аб'екта кахання і поштай Соня выбрала сярэдні варыянт, прадыктаваны абставінамі і асвечаны школьнай праграмай па рускай літаратуры. Перавёўшы гару паперы, у выніку перапісала на чыставік кароткае, але кранальнае прызнанне свайму Анегіну. Дрыготкімі рукамі запакавала ў канверт з ружачкамі, які паўгадзіны выбірала ў аддзяленні «Белсаюздруку». На канверце каляровымі гелевымі асадкамі напісала: «For Maxim from Sonya with Love», на ўсялякі выпадак пераправерыўшы ў слоўніку нават такія простыя словы. Вырашыла, што па-англійску будзе нетрывіяльна і дарэчы. Паклала канверт у патаемнае аддзяленне заплечніка. Млеючы, стала чакаць моманту.

Спярша яна думала прыйсці ў школу як мага раней перад урокамі і, прабраўшыся ў апранальню 11 «А», пакласці канверт у кішэню ягонай курткі. Але перашкодзіла чарговая асаблівасць Максіма Статкевіча. Амаль да зімы ён не насіў верхняй вопраткі, толькі перад самымі маразамі ўбіраючыся ў піжонскае цёмна-шэрае паліто. Ну, прынамсі такое было на ім вясною. Наконт новага пакуль было няясна, бо восень выдалася надзіва цёплая. Шторанку Соня нецярпліва падбягала да тэрмометра ў кухні інтэрната, але той няўмольна паказваў не ніжэй за плюс дзесяць.

Сёння, у пятніцу адзінаццатага кастрычніка, Соня не вытрымала і сказала сабе: няхай будзе, што будзе.

Прыйшла ў школу раней. Села на лаўку пад лесвіцай каля гардэроба. Стала чакаць.

Нарэшце ён увайшоў у вестыбюль. Спакойны і ўпэўнены, як заўсёды.

— Максім, чакай, калі ласка!..

— Хто такая? — хлопец здзіўлена нахмурыўся, хоць Соня і не пабачыла гэтага, баючыся адарваць вочы ад пліт падлогі.

— Я Соня Сінічка з 11 «Д», — выпаліла яна хуткамоўкай. — Вось, гэта табе. Прачытай, калі ласка.

І яна падала яму канверт — трымаючы аберуч, сагнуўшы рукі ў локцях — так, нібы запускае паперу ў прынтар.

Ён на імгненне затрымаў позірк на ружачкавым канверце, нахмурыўся яшчэ болей і ціха, але дастаткова выразна, каб пачулі ўсе выпадковыя сведкі гэтай сцэны, працадзіў кудысьці ўбок:

— Пашляціна.

І пайшоў сабе далей.

Гэта была катастрофа.

У паўцёмнай шатні спартзалы, у адных шортах і майцы, Соня пачала замярзаць. Жывот і праўда балеў — быццам пасля іспыту, які яна правраліла.

x x x

— Ну і скот!!!

Галя і Снежка толькі што пачулі пра адрынутае прызнанне з першакрыніцы — ад самой Соні. Уцёкшы з фізры яшчэ да званка, яна кароткімі перабежкамі, каб не прыцягваць да сябе лішняй увагі, перамясцілася ў кабінет, дзе мусілі адбыцца белмова з беллітам, а потым яшчэ і гісторыя. Каля кабінета ў тарцы другога паверха была зручная каморка на швабры. Залезшы туды, Соня ўдала размінулася з папярэднім класам — хоць і тут яе сягала няўмольнае: «Пашляціна! Пашляціна!» — якое на розныя лады паўтаралі сёння на ўсіх школьных калідорах. Сказаўшы беларусіцы, што дзяжурыць, яна парасчыняла форткі, выцерла дошку бруднай анучай і хуценька зашылася ў кут, за сваю парту, марачы навекі зліцца з бэжавай алейнай фарбай на сценах кабінета. Тут яе і знайшлі сяброўкі.

— Ён, вядома, красун, — але характар у яго паскудны, — разважала Снежка. — Ну, напісалі табе ліст. Вазьмі і пачытай. Што, карона ўпадзе?

— Ён у нашай школе два гады, і нешта незаўважна, каб яго ўвогуле цікавілі дзяўчаты, — як магла суцяшала гаротніцу Галя.

— Ну што ты так сябе катуеш, Сонька? Хіба мала навокал хлопцаў?

Нібы на доказ гэтых слоў, калідор скалануў нялюдскі енк:

— Сініца!!! Сіні-і-іца!!!

— Прынесла ж нялёгкая, — закаціла вочы Снежка. — Ён, дарэчы, сёння сачкаваць збіраўся.

— Яму, відаць, Лысы з Дубовікам эсэмэснулі. Экстранны выпуск, — з сарказмам сказала Галя. — Здароў, Вася.

У кабінет куляй уляцеў высокі плячысты дзяцюк з ускудлачанымі валасамі і праставатым дабрадушным тварам. Па класе адразу разляцеўся пах цыгарэт і падгарэлага тлушчу. Лёша Васілеўскі, якога ўсе ў школе называлі Васем. У вольны час ён падпрацоўваў у в'етнамскай забягалаўцы на рынку і сёння, відаць, прыляцеў у школу проста адтуль — без заплечніка і формы, калі можна было назваць «формай» ягоны бясформенны і зацяганы клятчасты пінжак. Праз бойкі і прагулы ён таксама значыўся ў колішнім дырэктарскім спісе, але яго маці — школьная кухарка, якая гадавала сына адна, — вымаліла ў дырэктара літасці. Вось ужо два гады Вася сяк-так ліпеў у школе, цудам дацягнуўшы да выпускнога класа.

— Сініца, ты праўда прызналася ў каханні гэтаму дырэктарскаму падбрэхічу?

Вася быў Соніным аднакласнікам з шостага класа — тады іх літара была «В». Спачатку нічога не звеставала бяды — Вася спраўна лупіў Соню ранцам і цягаў яе за коскі. Як усіх і не звыш нормы. Аднак у дзявятым класе хлопец нечакана разгарэўся да Соні каханнем — гучным, бесцырымонным ды неўтаймоўным. І гарэў ім дагэтуль. Неўзаемна, ясная рэч.

— Табе што, сапраўды падабаецца Статкевіч? Гэты хлышч і батан? Я думаў, ты несур'ёзна!!!

— Не твая справа.

— Не мая справа?!! А нічога, што я першы цябе заняў?

— Я што, месца ў электрычцы? Я не твая ўласнасць.

Адказвала Соня хутчэй аўтаматычна. За два гады на Васю не хапала ўжо ніякіх эмоцый. Хаця сёння ў яе ні на кога і ні на што не хапала эмоцый. А Вася працягваў галасіць:

— Сініца, разуй вочы! Ты і я — ідэальная пара!!!

— Вася, супакойся нарэшце. Не бачыш, у якім яна стане? Статкевіч абліў яе брудам на вачах ува ўсёй школы. Ёй і без цябе моташна.

— Гэты падонак адграбе ў мяне па поўнай!!! — зароў Вася. — Ён і так усім нашым як бяльмо на воку, а цяпер яшчэ і гэта! Навешаем яму сёння па дарозе дадому люлей!..

— Тады цябе стопудова выключаць, — зазначыла Галя. Нагадаю, што ён — першы вучань школы, а ты апошні.

— Можа, ён і першы ў школе, але дакладна не мужык! Мужык бы так не абразіў дзяўчыну. Пагатоў — Сініцу!

Вася паспрабаваў абняць Соню за талію, але, на шчасце, увайшла беларусіца, і — кыш адсюль! — Соня выштурхнула яго за суседнюю парту.

Пакуль беларусіца сабачылася з Васем наконт джынсаў і адсутнага канспекта па літаратуры, пакуль той хадзіў здаваць у гардэроб куртку і мыць анучу ад крэйды, Соня ціха дзялілася з сяброўкамі невясёлымі развагамі. Яна сядзела адна за апошняй партай, а дзяўчаты — перад ёй за чацвёртай, так што выходзіла, нібы сяброўкі сядзелі ўтраіх:

— Вася мае рацыю, — шаптала Соня, нахіліўшыся наперад. — Калі хлопец не паважае пачуцці дзяўчыны, ён ні разу не мужык. Я паводзілася як немагчымая дурніца. Навошта мне гэты задавака? Карацей, даю слова: завязваю з «каханнем». Больш не буду сохнуць па гэтым паўдурку.

Але прыняць віншаванняў з нагоды мудрага рашэння Соня не паспела:

— Сінічка, можа, ты выйдзеш да дошкі і замест мяне раскажаш нам пра «Знак бяды» Васіля Быкава? Я пагляджу, як ты сачыненне напішаш. Хоць акурат з сачыненнямі ў цябе ўсё ў парадку...

У класе загагаталі. З усяго відаць, чуткі дапаўзлі нават да настаўніцкай.

х х х

На абед у школьную сталоўку Соня, ясная рэч, не пайшла. Пад'ела халодных смажаных пельменяў, якія прыцягнуў з працы Вася (хоць у нечым ад яго карысць). Дзяўчаты падкінулі пакуначак соку з буфета. Яшчэ ўрок пратрымацца — і дадому. А там і выхадныя. Можа, да панядзелка жарсці ўтаймуюцца...

— Ура-а-а!!!

Не лёс. На пачатку пятага ўрока ўвайшоў хмуры гісторык і абвясціў, што 11 «Д» здымаюць з заняткаў. Аканом павядзе іх на школьны двор прыбіраць лісце.

— Спадзяюся, да пункта прызначэння дойдзе хоць бы частка калектыву, — развітаўся настаўнік, скептычна акінуўшы позіркам галёрку, дзе разваліліся Вася, Дубовік і Лысы.

Не прадчуваючы нічога добрага, Соня пацягнулася на падворак за аднакласнікамі. І Вася за ёю. Дзіўна, што настаўнікі лічылі яго вялікім ахвотнікам прагуляць. Наадварот — усе заняткі, дзеля якіх не трэба было чытаць падручнікаў, ён успрымаў з радасцю і энтузіязмам. У малодшых класах, бывала, аж са штаноў выскокваў, калі настаўніца прасіла раздаць сшыткі — вельмі яму падабалася быць карысным для людзей хоць нечым. Староннім гэта было невідавочна, але ў «Д» класе ён быў душой кампаніі.

Вось і цяпер Вася загарлаў, што дзяўчаты могуць расслабіцца, а яны з хлопцамі хуценька ўсё прыбяруць.

Толькі пакурыць збегаюць.

— Слухай, Сонька, што там з тваім пераездам? — схамянулася Галя.

Менавіта блізкае наваселле мусіла стаць навіной дня, калі б не адчайны Сонін выбрык.

— Дык заўтра і пераязджаем. З інтэрната выпісаліся. І ўжо амаль усе рэчы спакавалі. Мэблі трэба будзе дакупіць, але на першы час нармальна.

— Свой дом — гэта проста выдатна!

— Ага. Толькі ён у нас зусім маленькі. Да хаты вясковай падобны. І, ведаеш, тата рабіў усё сам — на свой густ. А густ у яго — ну, вы ведаеце... Вагонка ды фоташпалеры. І — галоўны прынцып — каб патанней. І так на будоўлю ішлі ўсе грошы.

— Густ, густ — галоўнае, каб смакавала! А гатуе твой татусь на «выдатна», — запэўніла Сняжана.

— Ну, проста калі новы дом, дык хай нешта прасторнае, мегасучаснае. Без катушкоў гэтых, перагародак, — летуценіла Соня. — Або наадварот — стрыманае, шляхетнае, у англійскім стылі. Вось бы жыць у светлым пакоі з белай мэбляй і карункавымі фіранкамі...

Ізноў палюе на жорава ў небе.

— Не плач, красуня! — Вася лагодна паляпаў Соню па пакатых плячах. — Скончым школу, ажэнімся, возьмем ільготны крэдыт маладой сям'і — і я пабудую табе такую хату, якую захочаш!

— Наўпраставае ўключэнне «Дому-2», — фыркнула Галя.

— Усё будзе! Галоўнае — вер мне! Хадзем, рэбза, — і, звабліва патросшы перад носам Лысага і Дубовіка пачкам цыгарэт, Соніна светлая будучыня знікла за рагом школы.

— Нам сёння падключаюць ваду і газ, а ўчора пасля школы мы куплялі шпалеры, — працягвала асвятляць уласнае кватэрнае пытанне Соня. — Ну, хоць шпалеры сабе ў пакой я сама выбірала... Вой! Дзевачкі! Я толькі што асэнсавала! У мяне ж будзе асобны пакой!!! Мансардавы!

— Здарава!!! Будзе куды паставіць твой лялечны дом!

— А яшчэ можна купіць вялікі мяккі кілім, накідаць на падлогу падушак і варажыць са свечкамі!..

— А яшчэ!..

— А яшчэ!..

— Давай мы заўтра прыедзем да вас, дапаможам абжыцца!

— А потым хай твой тата забацае вячэру!

Сяброўкі ўзяліся за рукі і пачалі кружляць, смяяцца і падскокваць.

Соніна ранішняе ачмурэнне як ветрам знесла. Толькі вось раптам...

— Макс, гэта што, тая самая дзяўчына?

Дзяўчаты замёрлі, як у зямлю ўкапаныя.

Соня азірнулася і тут жа перапужана схавалася за спінамі Галі ды Снежкі.

Па школьным парку з садовымі граблямі ў руках ішоў Максім Статкевіч у кампаніі аднакласніка — кудлатага акулярыстага бландзінчыка. Нават з граблямі наперавес Статкевіч выглядаў арыстакратам.

11 «А» прыбіраў лісце на папярэднім уроку. Як жа без гэтага.

— А яна нават сімпотная. Толькі інфантыльная нейкая.

— Хадзем. Тут нічога цікавага.

І нават не паглядзеў у бок беднай Соні.

Так бы і завяршылася гэтая няёмкая сцэна, але тут на падворку пачуўся конскі тупат. З-за рага школы вылецеў раз'ятраны Вася, абапал якога, як прыпражныя ў тройцы, несліся Лысы і Дубовік.

Соня закрыла вочы рукамі, бо спужалася, што Вася адразу пачне біць. Толькі гэтага ёй сёння не хапала. Але пацанскі этыкет, відаць, вымагаў нейкіх цёрак перад крывавай бойкай. Рэзка затармазіўшы пад носам хлопцаў з «А» класа, Вася аддыхаўся і зароў:

— А ну, стаяць, ыліта!

Хлопцы спыніліся, але ніякай іншай рэакцыі Вася не дачакаўся.

— Думаеш, калі ты завісаеш з дзірыкам, табе ўсё можна? — грозна працягнуў ён.

Маўчанне.

— Дзяўчына хацела адкрыць табе пачуцці, а ты яе пры ўсіх прынізіў. Ты перакананы, што ты мужык?

Вакол галоўных герояў сцэны ўжо сабралася масоўка з вучняў «А» і «Д» класаў. Стаіўшы дыханне, хлопцы і дзяўчаты чакалі, што адкажа Максім.

Вытрымаўшы паўзу, падчас якой ён змерыў Соню халодным позіркам, гэтак жа грэбліва, як зранку, Максім Статкевіч прамовіў:

— Ненавіджу тупых жанчын.

Соню як сцюдзёнай вадой з вядра абдалі. Калі б ён замест гэтых словаў выцяў яе граблямі, было б менш балюча.

«Дэшкі» застагналі ад абурэння, «ашкі» — ад смеху. Акулярысты таварыш Статкевіча рэзка перамяніўся ў твары. Відаць, зразумеў, што біць усё-ткі будуць. Хлопцы з «А» класа пачалі шыхтавацца за Статкевічам няроўным клінам. Іх у лінгвістычным было няшмат, але амаль уся моцная палова «Д» класа, як і прадказваў гісторык, зваліла дадому. Перавага была на баку батанікаў. Таму Лысы з Дубовікам асадзілі назад, абмежаваўшыся пагрозамі на словах:

— Калі мы ў простым класе — гэта не значыць, што мы тупыя!

— Зараз так увалім — касцей не збераце!

І толькі Вася быў настроены рашуча. Ён пачаў паволі падкасваць рукавы швэдра.

«А» і «Д» пайшлі сценка на сценку праз Соню Сінічку. Выдатная навіна для школьнага пабліку.

Першымі апамяталіся Галя і Снежка. Яны павіслі на Васілеўскім, галосячы на ўвесь падворак:

— Вася, не трэба! Ты са школы вылеціш!

— Ну і што? Затое ўвалю гэтаму ўроду! Кавалёва, адпусці руку! Адпусці руку, я сказаў!!!

Але дзяўчаты ўчапіліся ў Васю проста намёртва:

— Дурань! Пра маму падумай!!!

Максім Статкевіч, які дагэтуль са здзеклівай цікаўнасцю назіраў за валтузнёй «дэшак», моўчкі падышоў да зваленых на падворку садовых прыладаў і, не згінаючыся, дакладным жэстам кінуў граблі паўзверх кучы. Гэтак савецкія салдаты на старой кінахроніцы зрыналі нацысцкія штандары пад муры маўзалея:

— Спадарства, мы на інгліш спазняемся.

І пайшоў сабе, а яго фанабэрыстыя аднакласнікі — следам.

— Што, засцаў, Статкевіч? Батон недарэзаны!!! — не сунімаўся Вася.

Калі «А» клас знік у школьным пад’ездзе і дзяўчаты нарэшце адпусцілі Васілеўскага, той ужо спакойным голасам звярнуўся да Соні:

— Слухай, Сініца. Вы ж пераязджаеце. Бацьку скажы, каб грузчыкаў не наймаў, а толькі машыну. Я заўтра выхадны вазьму. Лысы з Дубовікам таксама дапамогуць. Праўда, пацаны?

І, падхапіўшы граблі, якія хвіліну таму кінуў Статкевіч, пашыбаваў да дрэваў, донкіхот.

— Ну што, пераканалася, які ён падонак? — кіўнула Галя ў бок школы.

— Я два гады ўяўляла сабе зусім іншага чалавека, — уздыхнула Соня. — Я так кахала яго, а ён... Я ніколі яму гэтага не дарую. Заўтра — новы дом і новае жыццё без недарэчнага кахання, — ваяўніча трасянула яна аброслай грыўкай. — А гэты свой ідыёцкі ліст... Спалю яго сёння з лісцем.

Так вырашыла Соня Сінічка.

Але ліста не спаліла.

## Раздзел II

# ЯШЧЭ АДНА КАТАСТРОФА

— У сапраўднай хаце мусіць стаяць водар сасновых дошак!

Соня прынюхалася. У нос шыбануў рэзкі пах марылкі, якой тата цягам апошніх месяцаў апантана абмазваў вагонку ўсярэдзіне і знадворку. Жоўтая падлога, жоўтыя сцены, жоўтая столь, самаробная жоўтая мэбля на кухні... Толькі пластыкавыя вокны былі белыя. І дах — чырвоны.

Колькі сябе памятала, Соня жыла ў маласямейным інтэрнаце пры нейкім чагосьці там будаўнічым заводзе. Мама з татам пасяліліся ў ім, як толькі ажаніліся, дый так і засталіся — хоць і завода таго ўжо не было, і тата даўным-даўно перакваліфікаваўся ў прадпрымальніка. Зрэшты, апошнія пару гадоў адміністрацыя вельмі празрыста намякала Сінічкам на высяленне. Яны ўжо даўно б маглі перабрацца ў якую двухпакаёўку ў Зялёным Лузе, але бацька смяротна баяўся ўлазіць у крэдыты. З ягоным бізнесам — рэстарацыя блізу Камароўкі — прагназаваць прыбыткі было складана. Пятру Сінічку не хацелася перадаваць дачцэ ў спадчыну адны пазыкі. Таму ён пацішку-патроху, на жывыя грошы паставіў сабе катэджык не так далёка ад Мінска, фактычна пад кальцавою.

— Тата, у нас проста цудоўны дом!.. Шкада толькі, мама не бачыць...

Тата з мамай заўсёды марылі пра катэдж.

Мама Соні загінула, калі Соня была зусім маленькай.

Яшчэ не стары, але ўжо крыху ссівелы мужчына з прыгожым стомленым тварам, Пётр Сінічка пагладзіў дачку па валасах:

— Даруй, родная... Табе столькі давялося вытрываць за апошнія гады... Адмаўлялі сабе ўва ўсім, затое сумленнай працай прыдбалі свой кут. Дзякуй, што ты цэніш гэта. Абяцаю, цяпер усё будзе іначай.

Соня, колькі сябе памятала, насіла чорны скураны абутак. Узімку і ўлетку — адна пара на сезон, а калі пашанцуе, то і на два.

Таму што чорнае — практычна. І да ўсяго пасуе.

Былі і іншыя чыста дзявочыя крыўды на бацьку, які зранку да ночы бавіў час то на працы, то на будоўлі. Але Соня не лічыла патрэбным іх агучваць. Дый што гэта за крыўды? Мабільнік без наваротаў? Джынсы з сэканд-хэнда? Яна не такая спешчаная, як некаторыя паненкі! І ніхто ў 234-й школе не мог упікнуць іх, што яны бедныя. Тата спраўна фінансаваў усе рамонты, абеды, экскурсіі, культпаходы ды падарункі настаўнікам і нават ахвяраваў нешта ў фонд школы. Жыццёвым прынцыпам Сінічак было: «Нічога лішняга».

Бацька схадзіў да машыны, занёс у навюткую гасцёўню першую скрыню з хатняй драбязой. Пакорпаўся ў ёй. Выцягнуў старую фотарамку з партрэтам прыгожай шэравокай жанчыны. Красуня мякка ўсміхалася і глядзела кудысьці ўдалеч. Паставіў партрэт на падлогу пасярод пакоя. Не вытрымаў і расплакаўся.

— Вось, Алена. Усё, як мы планавалі. Праўда, прыгожа?..

Соня села побач з бацькам, абняла яго за плечы.

Мамы не стала ў канцы дзевяностых, калі Соня яшчэ не хадзіла ў школу. Тата часта браў дзяўчынку ў кавярню, і яна ціха гулялася з лялькай у кутку павільёнчыка, а тата за стойкай сварыўся з нейкімі людзьмі. Тыя крычалі на яго,

пагражалі, але ён іх не баяўся і заўсёды праганяў. Калі яны сыходзілі, Соня пачынала плакаць, а тата супакойваў яе і казаў, што гэта «нехарошыя дзядзькі» прыходзілі да яго «аджаць бізнес», але плакаць не трэба, бо ўсё будзе добра. Тых, хто ведаў уладальніка рэстарацыі «Пан Сцяпан» па працы, вельмі здзівіла б, наколькі ён можа быць сентыментальным.

Соня падышла да сцяны дома і злёгку стукнула па ёй кулачком. Па сцяне пайшоў нейкі дзіўны рэзананс — нават шклопакеты завібравалі.

— Тата, а дом дакладна трывалы?

— Не хвалюйся, дачушка. І на мой век хопіць, і на твой. І на век твайго мужа і дзетак.

— Ну не, татуля. Я не збіраюся вечна жыць у гэтым доме! А пагатоў калі выйду замуж!

— Што ты такое кажаш, Соня? Пакінеш мяне тут самога на старасці?

— Ну татка, ты яшчэ малады!..

У гэты момант каля Сінічкавага навабуда затармазіў бусік. З пасажырскага месца выскачыў хлопец. Ён аператыўна адчыніў заднія дзверкі. Адтуль вылезлі яшчэ двое і тут жа пачалі выцягваць на ўзбочыну мэблю. Гэта быў верны рыцар Вася і ягоныя збраяносцы Лысы і Дубовік. Вася рашуча накіраваўся ў дом.

Пару гадзін таму, калі хлопцы павыцягвалі майно Сінічак з інтэрната, выявілася, што грузавая машына спазняецца. Тады Вася дзеля эканоміі часу накіраваў Соню з бацькам наперад, на іхняй старэнькай «таёце», а сам з хлопцамі застаўся чакаць перавозку.

Блазнаваць Вася пачаў адразу з парога:

— Спадар Пётр! Зранку не было часу, але цяпер рэкамендуюся. Аляксей. Для вашай Соф'і я не проста аднакласнік. Маю надзею, што ў даволі блізкай будучыні змагу назваць вас бацькам.

І, гледзячы проста ў вочы імавернаму цесцю, працягнуў таму шырокую шурпатую даланю.

Іранічна прыўзняўшы бровы, Пётр Сінічка парукаўся з Васілеўскім, а потым запытальна паглядзеў на дачку.

«Не, ты што, не слухай яго! Гэта няпраўда!» — адчайна сігналізавала Соня тату за Васевай спінай.

— Ну што, Соня, а вось і муж знайшоўся.

Вася не стаў стрымліваць рогату:

— Бачыш, Сініца, нават твой продак лічыць нас выдатнай парай... Ладна, пайду пакамандую пацанамі.

— А вось і мы!!! — на парозе матэрыялізаваліся Галя і Снежка.

— Сняжана! Галіна! Рады вас бачыць! — павітаўся Сонін бацька. — Не распранайцеся: я батарэі не паспеў падключыць.

— Прыйшлі дапамагчы Соні распакавацца і... адзначыць! — апошняе слова дзяўчаты выгукнулі разам, патрасаючы торцікам.

— Хлопцы зараз мэблю ў дом занясуць, дык давайце, перш чым расстаўляць, гарбаты пап'ём. З торцікам? — прапанавала Сняжана. — Дзе тут у вас можна вады згатаваць?

— Вунь у куце электраплітка. Мая паходная кухня на час рамонту.

Снежка стала завіхацца з імбрыкам, а Галя завяла свецкую гутарку.

— Цэлую вечнасць да вас дабіраліся... Сініца, як ты адсюль у школу ездзіць будзеш?

— Буду падвозіць Соню пад аўтобус, — адказаў за дачку Сінічка. — І потым, колькі той школы? Адзінаццаты клас, дзякаваць Богу... А кампанія ў вас, бачу, дружная. Дзякуй вам, што вы дапамагаеце Сонечцы.

— Ну, ты хоць ацаніла, як завіхаецца Васілеўскі? — зашаптала Галя Соні на вуха. — Ведае, як табе цяпер фігова, вось і прыйшоў падтрымаць. Ён, вядома, клоўн, але на справе значна лепшы за розных там статкевічаў. Я б на тваім месцы задумалася.

— Уф, нібы ўсё, — спацелыя хлопцы ўваліліся ў гасцёўню. — Дзе ў вас тут можна вады папіць?

— Там, дзе вы мэблю заносілі, — на кухні кран. Ваду ўчора падключылі.

Вася вярнуўся ў кухню, аддзеленую ад гасцёўні перагародкай. Але на парозе замёр, інтэнсіўна зашмыгаўшы носам.

— Народ, вы паху не адчуваеце? Тут, па ходу, няслабая ўцечка газу.

— Усё, імбрык паставіла, хутка будзе кіпень, — абвясціла Снежка.

— Што ты зрабіла??? — закрычаў Васілеўскі. — На выхад усе! Жыва!!!

Ён высадзіў нагой уваходныя дзверы і, адштурхнуўшы з дарогі канапу, стаў выпіхваць дзяўчат надвор.

— Валім адсюль! За бетонныя блокі!!!

Насупраць ішла будоўля. Падбухтораныя Васем, які запанікаваў, Соня з сяброўкамі, яе тата, а таксама Дубовік і Лысы зваліліся ў канаву за плітамі агароджы, якую яшчэ не паставілі.

Вася ляцеў апошні, размахваючы мабілкай.

— Чорт, батарэйка села! Хто-небудзь, набярыце службу газу! 104!

Ягоныя апошнія словы перакрыла магутнае «бабах».

Вызірнуўшы з-за пліт, Соня пабачыла, як іхні з татам дамок складваецца, як... картачны. Менавіта так яно выглядала.

— Набірайце адразу 101, — сказаў Васілеўскі, калі аддыхаўся.

x x x

Лысы з Дубовікам ляжалі на дне канавы і разгублена мацюкаліся. Ані іх датклівыя аднакласніцы, ані агаломшаны тата адной з іх не былі ў стане зрабіць ім заўвагі. Калі б не гэтыя двое, сцэна была б нямой. Соня з партрэтам

маці ў руках, Галя, што мёртва сціскала ў кулачку матузок, на якім матлялася пакамечаная скрынка з торцікам, і астатнія — бледныя, з вачыма вырачанымі, як у персанажаў японскіх мульцікаў. На заднім плане, ходзячы сюды-туды перад іх імправізаваным брустверам, Вася тэлефанаваў у МНС, патрабуючы пажарную машыну на Садовую вуліцу.

— Як ты, Аляксей, увогуле зарыентаваўся, што рабіць? — паволі спытаўся Сонін бацька, калі Вася вярнуў яму мабілку.

— Мне нядаўна васямнаццаць споўнілася, і мой в'етнамец павесіў на мяне пажарную бяспеку ў сваім «Сайгоне». Дык, халера, давялося розныя брашуры чытаць, а потым яшчэ выпісваць пасведчанне ў пажарнікаў. Я і ў школе так не вучыўся... Ніколі не думаў, што так хутка прыдасца... Што прыдасца ўвогуле... У вас цыгарэткі не будзе?

Слухаючы, як набліжаюцца сірэны пажарнай і хуткай, Соня думала пра тое, што новае жыццё не проста пачалося, але прызначыла ёй, Соні Сінічцы, месца ў сваім эпіцэнтры.

## Раздзел III

# НЕВЕРАГОДНЫ ЗБЕГ АКАЛІЧНАСЦЕЙ

*Неверагодны збег акалічнасцей справакаваў поўнае разбурэнне дома ў катэджным пасёлку непадалёк ад Мінска. Халатнасць газавай службы — няшчыльная зварка труб — выклікала ўцечку газу ў прыватным доме. А рэзкі пах лакафарбавых сродкаў пасля нядаўняга рамонту не дазволіў гаспадарам своечасова звятрыць блакітную небяспеку, якая пагражала дому на працягу сутак. Дадайце сюды яшчэ ўключаную электрычную плітку... Выбух газу не быў асабліва сур'ёзным, але канструктыўныя хібы, дапушчаныя пры будаўніцтве дому, спрычыніліся да таго, што яго сцены скаліся, як косткі даміно. Пажарнай службе, што аператыўна прыбыла на месца выбуху, удалося ліквідаваць узгаранне за паўгадзіны. Па іншым — шчаслівым — збегу абставін ахвяр няма. Вінаватых у гэтым надзвычайным здарэнні вызначыць следства.*

Па тэлевізары паказалі яшчэ пацярпелага — тату, падпісаўшы яго: «Мінскі рэстаратар Пётр Сінічка». Тата расказаў, што збудаваў дом на ўспамін пра жонку, што гэта ўсё, што мелі ён і дачка, і ім цяпер няма куды ісці.

— Сінічка! Твой тата трымае рэстаран? А па табе не скажаш!

Гэта была доўгая дарога да школы. Спасылку на тэлесюжэт пра іх выбухную суботу выклалі ў школьным пабліку з падзагалоўкам: «У Соні Сінічкі знесла дах». І кожны, хто абганяў яе хмурым восеньскім ранкам на вуліцы, лічыў сваім абавязкам гэта адкаменціць.

— Спярша пракінуў Статкевіч, потым — Мінгаз. І невядома, што горай.

— Класічны выпадак няпрухі.

— Сінічка, улётна выглядаеш!

Усю нядзелю зранку да вечара Соня корпалася ў завалах, з усіх сіл намагаючыся не трапіць у аб'ектывы фотарэпарцёраў, якія, не раўнуючы каршакі, зляцеліся на іхняе папялішча. І ўсё-ткі ў інтэрнэт-хроніку яна загрымела — на заднім плане, укленчаная над абгарэлай скрыняй, перапэцканая, з разяўленым ротам, як гаіцянскі бесхацінец пасля землятрусу.

— Соня! — Галя і Сняжана дагналі сяброўку на прыступках перад школьнай брамай. — Як ты?

— У норме. Улічваючы акалічнасці. Вось, вазьмі, — пад узрадаваныя воклічы Снежкі Соня працягнула той салатавую торбачку з грашыма і мабілкай, якую сяброўка пакінула ў доме перад выбухам. Торбачка была запыленая, але цэлая. — Начавалі мы ў інтэрнаце. Суседзі пазычылі спальнікі і раскладушкі і два дні адпойвалі тату каньяком. Я яго таксама як магла супакойвала. Ён праз дом проста ў аўце, але я яму кажу: тата, машына — цэлая, шмоткі, кнігі і ўсе самыя дарагія рэчы — у багажніку, а мэбля — ну і няхай патрушчылася, яна ўся была старая, мы б яе ўсё адно хутка выкінулі... А самае галоўнае, мы самі засталіся жывыя-здаровыя, значыць, усё будзе! Страшна падумаць, а калі б нехта закурыў? Або Снежка не на электраплітку імбрык паставіла, а на газ... Нам усім здорава пашанцавала!

— Дарэчы, ты нас не палі, — папрасіла Галя. — Мы сваім сказалі, што яшчэ не даехалі да цябе, калі газ бахнуў. Яны

і так ледзь ад жаху не пасівелі... А што вы будзеце рабіць далей? І ці вернуцца вам грошы?

— Там усё складана. Тата размаўляў са знаёмым юрыстам. З аднаго боку, вінаватыя газавікі, але з іншага — тата ставіў дом сам і нешта там напартачыў, таму будзе многа спрэчак у судзе. Не факт, што нам кампенсацыю выплацяць. А застрахаваць дом, пакуль ён недабудаваны, тата неяк не парупіўся... Але ёсць і добрыя навіны!

— ???

— Тату па тэлевізары пазнаў ягоны харошы сябар, з якім яны сто гадоў не бачыліся, і адразу патэлефанаваў. У яго вялікі дом, дзе ёсць для нас месца. Ён запрасіў пажыць у іх, колькі нам трэба, пакуль не вызначымся!

— Дык выдатна, Сонька!

— Цяпер галоўнае табе нямоцна вытыркацца ў школе, пакуль справы не наладзяцца, — і далей усё будзе ў ажуры...

— Вой, глядзіце, што там?

— Толькі не гэта... Васілеўскі!

Каля ўвахода ў школу мітусілася высокая фігура ў клятчастым пінжаку. Гэта сапраўды быў Вася.

— Увага, увага, — бойка вяшчаў Вася ў немавед дзе адкапаны мегафон. — У адной нашай вучаніцы, Соф'і Сінічкі, вялікае няшчасце! Яе дом быў разбураны выбухам газу. Не застанемся глухімі да чужой бяды! Аказваем грашовую дапамогу, хто колькі можа! Нават тысяча беларускіх рублёў* мае сэнс!

Побач на ганку Лысы з Дубовікам падсоўвалі галаслівай плыні школьнікаў пераносную чырвоную урну для бюлетэняў, якую выкарыстоўвалі, калі школа была выбарчым участкам. Проста на дзяржаўны герб скотчам быў прылеплены аркуш з неахайным надпісам: «Збор сродкаў для бяздомнай Соф'і Сінічкі».

* Падзеі адбываюцца да дэнамінацыі 2016 года.

— Галасуем за будучыню Соні! — як мог абыгрываў гэты факт клятчасты аратар.

— Вася, што ты робіш? — Соня схапіла таварыша за крысо пінжака.

— А вось і сама пацярпелая, — абвясціў Вася ў мегафон. Нягледзячы на сваю бяду, яна сёння з намі — і нават у гуморы! Уразімся духоўнай моцы гэтай неверагоднай дзяўчыны!

— Вася, што за цырк??? — зашыпелі, падаспеўшы, Галя са Снежкай.

— Мне класуха дазволіла!

— А ў мяне ты дазволу спытаўся? — закрычала Соня. — Хіба ты не разумееш, у якое ты мяне ставіш становішча?

— Магла б і дзякуй сказаць! Для цябе шчырую!

— Дарэчы, бабло даюць, — далажыў Дубовік і патрос урнай, у якой сапраўды нешта зашамацела.

— Васілеўскі, я цябе як чалавека прашу! Годзе выстаўляць мяне на пасмешышча!

У сваёй беспаспяховай спробе суняць Васю Соня незнарок перагарадзіла ўваход у школу. І раптам сэрца абарвалася:

— Можа, пасунешся? — прагучаў над ёй незадаволены голас.

На школьным ганку стаяў Максім Статкевіч.

— А ну, стаяначка! — цяпер дарогу адстаўному Сонінаму ідэалу заступаў ужо Васілеўскі. — А бабкі здаць? Ты хоць ведаеш, хто вінаваты ў тым, што Соня засталася без дома?

— П’яны зваршчык, — спакойна прамовіў Статкевіч.

— З Соняй здарылася бяда, бо ты павёўся з ёй, як падонак! — выпаліў Васілеўскі ў мегафон.

«Божа, што ён вярзе?» — схапіўшыся за галаву, Соня прыхінулася да вушака. Больш за ўсё ёй хацелася ператварыцца ў невідзімку.

— З логікай у цябе яўна праблемы, — хмыкнуў Статкевіч. — Але калі ты настойваеш... Даруй, няма беларускіх.

І, засунуўшы руку пад лацкан пінжака, ён раскрыў гаманец і паклаў Соні на плячо дзесяцідоларавую купюру.

Некалькі імгненняў Соня не магла паварушыцца, але потым, апамятаўшыся, сарвала з пляча паперку і рынулася следам за Статкевічам у вестыбюль.

— Гэй ты!!!

Ён удала абярнуўся, бо скамечаныя дзесяць баксаў пстрыкнулі яму проста ў жывот.

Яны стаялі на тым жа пятачку, дзе пару дзён таму сустрэліся ўпершыню.

І куды толькі падзелася тадышняя Сінічкіна сарамлівасць і нерашучасць?

— Забірай сваю падачку, урод! Сорамна падумаць, што я два гады марыла пра цябе! Я лепш памру, чым прыму ад цябе дапамогу!!!

Статкевіч абыякава сузіраў яе істэрыку, але, пачуўшы апошнюю фразу, злацешна ўсміхнуўся.

— Ну глядзі. Ты сама гэта сказала. Запомні свае словы.

І пайшоў уверх па сходах.

— І запомню! Годзе ўдаваць з сябе генія і глядзець на ўсіх, як на кампост! Валі давай! — крычала Соня наўздагон.

— Народ, там зноў Сінічка і Статкевіч!

— Што гэтая парачка не падзяліла?..

«Парачка»? Не, яе больш не будуць асацыяваць з гэтым бяздушным балванам. Іхнія дарожкі канчаткова разышліся.

— Ты, маці, руліш! — Галя і Снежка аж заходзіліся ў экстазе, бо гэтым разам назіралі ўсё на свае вочы. — Здорава ты яго... Так яму!..

— Калі табе не трэба, я вазьму працэнт з дабрачыннасці, — Вася старанна разгладжваў пакамечаную інвалюту. — З паршывай «ашкі», як той казаў, хоць воўны жмут.

Да дошкі аб'яў купкамі падыходзілі школьнікі. Рагаталі і адыходзіліся.

— Што там? — спахмурнела Соня.

— Не трэба, не хадзі!!! — у адзін голас завішчэлі Галя са Снежкай.

Але Соня пайшла.

Нехта павялічыў яе мурзатую выяву на папялішчы, раздрукаваў і прычапіў на дошку. У раёне джынсаў асадкай дамалявалі выхлап і падпісалі: «Газ».

Гэта быў фініш.

x x x

— Калі разабрацца, татусь, то, можа, яно і да лепшага. Не газ, дык ураган. Раней ці пазней гэта адбылося б. Ты ж сам прызнаўся, што сцены былі хліпкія...

— Ды нармальныя былі сцены, Соня. Не забывай, што твой тата ўсё-ткі інжынер па адукацыі. Гэта ўсё Антонавіч. Загнаў мне гнілыя бэлькі. Усё ад іх.

— А я казала, што не трэба будаваць з усякага ламачча.

— Усё, давай закрыем тэму.

Надвячоркам таго ж дня бацька падабраў Сінічку на прыпынку непадалёк школы. Вызваліўся так рана, як змог, але ўрокі ў Соні скончыліся яшчэ да абеду. Каб не туляцца пад гідкай імжой па гразкім мікрараёне, дзяўчына некалькі гадзін прасядзела з кніжкай за пластыкавым сталом у кафетэрыі ўніверсама. Ёй не было больш куды ісці. Патрыманая «Таёта Карола», да самых пярэдніх седалаў наладаваная скрынкамі, скруткамі ды валізамі, была цяпер іх адзіным домам. Зрэшты, яны акурат кіраваліся ў свой новы прытулак.

— Тата, дык у каго мы будзем жыць?

— У майго блізкага сябра. Мы разам былі ў інтэрнаце.

Сонін тата вырас у барысаўскім дзетдоме, так што ягонай адзінай сям'ёй былі равеснікі — такія ж сіроты, як ён сам.

— У нас з Віцьком была неразлітая вада. Мы і ў вучэльню разам пайшлі, потым у палітэх разам паступілі. Я яго і з Юляй, ну, жонкай ягонай, пазнаёміў. Яны цудоўныя людзі,

вось пабачыш... Дарэчы, у іх сын прыкладна твайго веку. Віця казаў, што той ходзіць з табой у адну школу. І ён цябе ведае.

Яшчэ б. Цягам дзесяці гадоў у 234-й школе Соні ўдавалася заставацца нікім. Але за апошнія дні адбылося столькі ўсяго, што цяпер яе пазнаваў у твар кожны вучань ад сёмага да адзінаццатага класа. Асабліва пасля выбуху. Сам дырэктар спыніў Соню на калідоры і спытаўся, чым школа можа дапамагчы.

Дзякуй, але ёй нічога не трэба. Нават ад дробязі, сабранай Васем, яна адмовілася. Той не знайшоў нічога лепшага, як здаць гэтыя грошы за Соню старасце на школьныя абеды.

— Калі ён такі блізкі твой сябар, чаму я яго не ведаю?

— Мы пасля інстытута разам яшчэ трымаліся, у дзевяностыя, а пасля ў яго свой бізнес, у мяне свой, жытка закруціла... Мы яшчэ сяк-так перасякаліся, але потым Статкевіч з сям'ёй з'ехаў за мяжу, я думаў, з канцамі. Але вось, аказваецца, ён тут, у Мінску...

Статкевіч?!!

У Соні ўжо амаль алергія на гэтае прозвішча.

— А дзе іхні дом?

— Тут зусім блізка, у элітным пасёлку. Віця апошнім часам вельмі падняўся. Ведаеш «Стар сістэмз»?

— Не.

— Гэта ягоная кампанія. Ён уладальнік. Сказаў, што адгакаў сабе даміну, а цяпер не ведае, што з такой плошчай рабіць. Фармальна мы будзем здымаць у яго два пакоі. Так што не трэба пачувацца там беднай сваячкай, як ты часам любіш...

Уздоўж кальцавой замільгалі маркотныя крыжы Курапатаў. Неўзабаве бацька збавіў хуткасць і стаў прымаць управа.

— Тата, чакай, мы што, на Цну з'язджаем?

— Ага. Вуліца Верасовая. Чытай шыльды. Тут трэба ўважліва. Статкевіч тлумачыў, але першы раз, баюся, давядзецца пакруціцца...

Дарога нырнула пад МКАД, і ўваччу ў Соні на міг пацямнела.

Дзяўчына не магла не звязаць разам усе відавочныя факты. Яна не надта добра вучылася ў школе, але ў яе было здольнае сэрца. І цяпер яно шалёна тахкала, поўнае прадчуванняў.

— Я спадзяюся, ты і Віцькаў сын паладзіце. Толькі я цябе вельмі прашу — паасцярожней. Гармоны — такая штука, што ў любым, нават самым выхаваным сямнаццацігадовым хлопцы тоіцца звер. Па сабе ведаю.

Колькі Статкевічаў вучыцца ў іх школе? Не такое ўжо і рэдкае прозвішча.

Ай, супадзенне.

Улетку яны з Галяй і Снежкай часта бегалі купацца на Цнянку. Часам, ад няма чаго рабіць, завітвалі «ў катэджы», разглядаючы рознакаліберныя палацы, шчыльна натыканыя мінскімі багацеямі ці не ў ахоўнай зоне. Летуценілі, якая ў якім хацела б жыць. Але даходзіць да гэтага глухога кута, з трох бакоў аточанага сасоннікам, не даводзілася.

Хоць не: глухі — не адпаведнае слова. Хутчэй зацішны. На фоне бору няроўнай лініяй мірна расцягнулася стракатая чарада ўтульных віл. І не скажаш, што зусім блізка — лічы, за лесам — двухмільённы горад.

Дом быў не такі ўжо і круты, як апісваў бацька. Побач стаялі больш самавітыя. Але, божухна, якім цудоўным быў гэты дом! Ахайная белая камяніца з паўкруглым гаўбцом, двухпавярховая, пад высокім светла-карычневым дахам, што блішчэў ад ліхтароў і імжы, як луска гіганцкай рыбіны. У абрамленні дахоўкі прыветнымі агеньчыкамі свяціліся паўкруглыя мансардавыя вокны. Такія ж вокны беглі па фасадзе на першым паверсе. На высокіх драўляных дзвярах з паўкруглым жа навершам вісеў малаточак. За ажурнай агароджай з падмуркам з натуральнага каменю да самага ганка раскінуўся густы траўнік з кветнікам: сям-там яшчэ дацвіталі

астры. Сонін лялечны дамок не меў фасада, але калі б меў, ён быў бы рыхтык такім. Верасовая, 77.

— Пятруха!!!

На гук матора з дома выкаціўся пацешны нізенькі дзядзька, пузаты і з залысінамі. У расцягнутым швэдры і хатніх сланцах. У Соні адлягло ад сэрца: зусім непадобны. Гэта дакладна не тыя Статкевічы.

— Віцёк! Брат!!!

Калі радасць ад доўгачаканай сустрэчы аціхла, згадалі пра Соню:

— Вось, Віцёк. Знаёмся. Мая дачушка.

— Дык гэта Соня? Якая прыгажуня! Уся ў маму! Ласкава запрашаю ў ваш новы дом. Пеця, куды ты? Потым разгрузімся. Спярша я вас хачу з маімі пазнаёміць.

Яны пакінулі абутак у светлай вітальні, і гаспадар правёў іх у памяшканне, якому і назву падабраць было цяжка. Усярэдзіне дом быў значна прасторнейшым, чым здавалася. Яны стаялі пасярод вялізнага хола, застаўленага канапамі, кніжнымі стэлажамі, рознакаляровымі фатэлікамі і разнастайнымі столікамі. У супрацьлеглым канцы ад увахода, перад шырачэзным французскім акном, за якім сцяной калыхаўся лес, стаяў трохметровы абедзенны стол. На сцяне справа вісеў здаровы пляскаты тэлевізар. Салідная барная стойка адгароджвала раскошную кухню са светлага дрэва. Злева ад уваходных дзвярэй на другі паверх вялі масіўныя сходы.

— Максім, хадзі сюды, з сябрамі пазнаёмлю!..

Яна пачула і пабачыла адначасова. З канапы перад тэлевізарам узняўся не хто іншы, як Максім Статкевіч:

— Ну што ж, прывітанне. Даўно не бачыліся.

Соня магла нема закрычаць, уцячы на вуліцу ці праваліцца скрозь зямлю. Яна выбрала самы энергазберагальны варыянт і самлела.

х х х

Соня паволі расплюшчыла вочы. Яна ляжала на чорнай скураной канапе, пад галавой у яе была салонная падушка. Перад ёй з занепакоеным тварам сядзела зграбная дагледжаная жанчына ў бэжавай ваўнянай сукенцы і абмахвала яе ручнікам:

— Ну вось і слаўна! Ачуняла.

— Як ты пачуваешся, золатка? — на тату не было твару.

— Галава крыху круціцца.

— Можа, у больніцу? — занепакоена спытаўся Віктар Статкевіч.

— Што вы, не трэба! — спужалася Соня. — Проста мяне ў цяпле размарыла. І гэта... я ў абед не ела нічога.

— Божухна, беднае дзяўчо! Табе ж столькі давялося перажыць! Максім, падай вады, калі ласка!

З незадаволеным выглядам — ягоная канапа занятая! — хлопец стаяў, прыхінуўшыся спінай да калоны каля барнай стойкі і, як нічога ніякага, працягваў глядзець тэлек. Гэта быў нейкі навінны канал накшталт «Еўраньюзу». Відавочна, дзеянні палестынскіх тэрарыстаў цікавілі яго значна больш за тое, што адбывалася проста ў яго пад носам. На вокліч маці ён неахвотна адарваўся ад экрана і, наліўшы вады з графіну, перадаў Соні шклянку. Пасля чаго зноў уперыўся ў экран. Падчас усіх гэтых маніпуляцый ягоны твар не скаланула ні адна хоць колькі пазітыўная эмоцыя.

Соня адчула сябе пачаткоўкай-геймеркай, якая і дэма-версію крутой стралялкі прайсці не ў стане, а тут раптам глюк праграмы закідвае яе адразу на дзясяты ўзровень. І яна, не ведаючы на што націскаць, роспачна глядзіць, як выбухаюць касмічныя караблі, сусветы і цывілізацыі. Бо гэта быў новы, палепшаны, можна сказаць, інтымны Максім Статкевіч у хатніх тапачках, чорных джынсах і мяккай байцы прыглушана-блакітнага колеру. Шчасце, якое не магло зваліцца на яе ніколі, ні за што і ні пры якіх умовах.

— Вось што, — абвясціла гаспадыня. — Вы, хлопцы, ідзіце выгружайце багаж, а потым адразу будзем вячэраць. А то зусім дзіця голадам заморанае. Максім! Тата Віця!..

Зрабіўшы некалькі імклівых па вакол пліты, жанчына ў бэжавай сукенцы зноў апусцілася на канапу поруч з Соняй і горача паціснула ёй руку:

— Будзем знаёмыя. Мама Юля.

У яе былі вельмі прыгожыя цёмныя вочы. Максім, без сумневу, удаўся ў маму. Толькі вось ейныя вочы, у адрозненне ад сынавых, гледзячы на Соню, прамянілі непадробную радасць і захапленне.

— Ах! У нашай сям'і будзе жыць дзяўчынка! — узбуджана сакатала мама Юля. — У мяне адны хлопчыкі, а я заўсёды так марыла пра дачку! Пячы з ёй пячэнькі, хадзіць па крамах, дзяліцца рознымі дзявочымі сакрэтамі! Соня, дарагая, пачувайся як дома! О, а вы ўвогуле знаёмыя з Максікам? Сустракаліся ў школе? Вы ж абое ў адзінаццатым, так?

Соня толькі адкрыла рот, каб прамямліць нешта абцякальнае, але яе апярэдзіў кплівы голас:

— Паміж нашымі класамі, мама, існуе, скажам так, пэўная акадэмічная адлегласць, — прамовіў Максім, ставячы каля сходаў валізу. — Але мы моцна зблізіліся апошнім часам. Праўда, Сонья?

Чаму ён яе так назваў? Не... Божа!..

Яна рэзка пачырванела.

— Ты...

— У мяне фатаграфічная памяць. Калі я нешта прачытаў, ужо не забуду. Як бы мне гэтага ні хацелася.

Ён такі мілы ў гэтай блакітнай байцы. За што ёй гэта?

— Ну вось і слаўненька, дзеці, што вы так добра ладзіце. А, шчочкі паружаве-е-е-лі. Табе ўжо лепей? Сядайце за стол.

Раптам тэлевізар пераключыўся з навінаў на нейкі агрэсіўны мульцік. Усе ажно здрыгануліся ад нечаканасці, але твар мамы Юлі тут жа расквеціўся хітрай усмешкай. Яна

зазірнула пад журнальны столік і выцягнула за нагу таўставатага хлопчыка гадоў пяці-шасці ў джынсавым камбінезончыку і з пультам у руках.

— Мама, пусці! Я ў засадзе!

— І як даўно ты тут сядзіш? Вадзік, павітайся са сваёй новай суседкай!

Перад Соняй на падлозе сядзела пухленькая копія Максіма Статкевіча. Што з твару, што ў манерах. Састроіўшы ёй незадаволеную міну, малы прабуркатаў: «Я зараз», — і паляцеў уверх па сходах.

— Гэта табе! — Сонін тата ўручыў маме Юлі букет чырвоных руж, пацалаваўшы яе ў шчаку. — Не паспеў сказаць, што ты шыкоўна выглядаеш, Юлька! А гэта гаспадару — ён працягнуў тату Віцю нейкую дарагую з выгляду пляшку віскі. — Ад майго аптавіка. Проста з рыжскай партовай мытні. Віцёк, адзначым як след!

— У мяне тост! — абвясціў тата Віця, калі Статкевічы і Сінічкі селі за стол. — Прапаную выпіць за двух дзетдомаўскіх пацаноў, што не спасавалі перад цяжкасцямі, якія прызначыў ім лёс, не адчаяліся, не апусціліся, а выбіліся ў людзі, знайшлі сябе ў жыцці і заслужылі павагу сваімі талентамі і працай! За тое, што яны нарэшце разам, як у былыя часы! За тое, што ў іх, няхай і праз невясёлыя акалічнасці, цяпер зноў адзін дом! За нас з Пецькам!

Над сталом сутыкнуліся шклянкі з кампотам і віскі.

— Праз колькі прыблізна, па вашых прагнозах, мы пачнём вам назаляць? — асцярожна спытаўся Сонін тата, калі ўзяліся за ежу. — А то на першы дзень госці — золата, на другі — срэбра, а на трэці — як кажуць, медзь, хоць дадому едзь...

— Праз дванаццаць гадоў, — мякка ўсміхнулася мама Юля. — Менавіта столькі мы цябе не бачылі.

— Пятруха, што за пытанне! Жывіце, колькі трэба, пакуль з вашым домам не наладзіцца. Хоць год, хоць два — я не жартую! — загарлаў тата Віця.

Соня сядзела, уткнуўшыся носам у талерку. Сказала, што згаладала, дык трэба было намагацца есці, але кавалак у горла катэгарычна не лез. А ад толькі што пачутага не тое што есці — жыць не хацелася.

Хлопец, па якім яна сохла з дзявятага класа, — яе сусед па доме на год, а то і на болей.

Хлопец, якому яна зранку нагаварыла гадасцей, дзеліць з ёй вячэру.

Ведала б — нізашто не панесла б яму гэты ідыёцкі ліст, за які ён цяпер так няшчадна яе троліць.

Вось бы адкруціць усё назад...

Та-дам! «Я Соня Сінічка, дачка найлепшага сябра твайго бацькі. Мы будзем жыць у вашым доме». — «Рады пазнаёміцца з табой, Соня».

...Але, можа, яшчэ можна нешта паправіць? У яго такая прыветная маці! Здаецца, Соню тут палюбяць...

Яе развагі перапыніў імклівы тупат. Па сходах уніз каціўся Вадзік са сшыткам у руках.

— А ну, за стол! — строга скамандавала мама Юля.

— Не! Я тут дарабляю дамашку. Я хачу, каб мая новая суседка Соня дапамагла.

— Соня вельмі стамілася. Папрасі Максіма.

— Не, я хачу, каб Соня!

— Дапамагу, вядома, — зычліва схілілася над малым Сінічка. — Што там у цябе?

Трэба паладзіць хоць з малодшым, калі са старэйшым нявыкрут.

*Сшытак*
*па англійскай мове*
*вучня 1-га класа*
*Прыватнай гімназіі*
*імя Альберта Эйнштэйна*
*Вадзіма Статкевіча*

— Вось, зірні. Мы праходзім розную гароднiну. Якое тут апошняе слова?

Ну, з заданнем для першага класа яна неяк дасць рады.

У сшытку было старанна накрэмзана:

*tomato — памідор*
*beet — бурак*
*cabbage — капуста*
*carrot — морква*
*onion — цыбуля*
*garlic — часнок*
*cucumber — ...*

Ну ў іх і словы першым класе.

— Ку-кум-бэр!.. Не ведаю, можа... кабачок?

Максім Статкевіч ледзь не падавіўся кампотам.

— Дурніца, гэта гурок! — пераможна заверашчаў Вадзік. — Ты ў адзінаццатым класе не ведаеш такіх рэчаў??? Яна мне не падабаецца! Бэ-э-э-э!

Што гэта было? Яе толькі што аблажаў першакласнік!

— Вадзік!!! А ну, папрасі прабачэння! — рыкнуў тата Віця.

Але малпяня, схапіўшы са стала банан, ужо знікала на другім паверсе.

— Даруй, Сонечка, такі ў нас нявыхаваны гэты Вадзік. Зусім разбэсціўся, — расхвалявалася мама Юля.

— Я хачу падняць тост! — пастараўся выправіць няёмкасць Пётр Сінічка. — За нашых цудоўных дзяцей. Максім, я ведаю цябе ўсяго якую гадзіну, але ўжо магу ацаніць тваю мужнасць і самаадданасць...

Мужнасць і самаадданасць? Адкуль ты гэта ўзяў, тата? Ведаў бы ты, як ён прынізіў тваю дачку, не распінаўся б так перад гэтым нягоднікам.

— ...спадзяюся, ты станеш добрым таварышам маёй Соні!

— Ну што, — скамандавала мама Юля пасля гарбаты. — Пара паказаць новым жыхарам іх пакоі. Ты, Пеця, будзеш жыць у гасцявым. Баўцеся тут, Віця цябе потым завядзе.

— Ты хацела сказаць, занясе, — удакладніў старэйшы Статкевіч і падміргнуў сябру.

— А я, — тут яна аж засвяцілася, — пакажу Соні яе спаленьку... Хадзем, Сонечка, табе варта сёння адпачыць. Максім, ты падымеш наверх яе рэчы?

— Вядома, мама. Калі толькі яна… прыме маю дапамогу...

— Чаго ж не прыме? Прыме, вядома!

— Не трэба, я сама! — падарвалася з крэсла Соня, але тут жа села, бо пакой зноў паплыў у яе перад вачыма.

— Нават не думай! Хадзем, дзяўчыначка мая. Пара вучыцца выкарыстоўваць хлопцаў па прызначэнні...

x x x

— Твой арыенцір — гэты зайчык. Гатовая?

— Ах! Мама Юля...

Дзверы з павешанай на іх драўлянай фігуркай велікоднага трусіка расчыніліся і адкрылі Соні пакой яе мары. Усю прастору выцягнутага мансардавага пакоя запаўнялі міленькія цацкі, таршэрчыкі ды статуэткі. Белыя драўляныя ложак, туалетны столік, шафу і камодку аздаблялі ружовыя сурвэткі, накрыўкі ды падушачкі.

На абодвух вокнах пакоя віселі чароўныя карункавыя фіранкі.

Мама Юля пралезла Соні ў галаву.

— Ну як, падабаецца?

Як гэта магло не падабацца?!!

— Некалькі гадоў скупляла ўвесь гэты цуд па лонданскіх распродажах, — пахвалілася мама Юля. Але ў мяне поўны дом мужыкоў, дзе тут гэта павесіш? Затое цяпер ёсць каму раздзяліць са мной радасць! Карыстайся, Соня!

— Дзякуй вам, цётачка Юля! Вы такая добрая! Гэта проста казка!

— Ружовае пекла.

Соня падскочыла. Яна, відаць, ніколі не прызвычаіцца. Максім зацягваў у пакой ейныя набіткаваныя валізы.

— Ну, вы тут баўцеся, дзеці, а я пабягу посуд прыбраць.

І знікла, добрая фея.

А Соня і Максім засталіся сам-насам.

— Далей сама, — Максім зваліў Соніна майно каля ўвахода і развярнуўся, каб выйсці.

— Ну, а малы твой чаго на мяне ўз'еўся? — нечакана пачула Соня свой голас.

Максім абярнуўся.

— Бо ты заняла ягоны пакой. Вадзіка, дарэчы, падсялілі да мяне. Мне там усё перагарадзіў ягоны стол, сам я буду спаць на канапе, а ўсе свабодныя паверхні цяпер застаўленыя робатамі-шпіёнамі. Як ты разумееш, я таксама не ў захапленні. Так што пастарайся сядзець ціха і не лезці ў маё жыццё. Ёсць ты тут ці цябе тут няма, ты для мяне — пустое месца.

Дзверы за ім зачыніліся, але праз хвіліну зноў адчыніліся. Па пакоі бесцырымонна прашлёпаў Вадзік. Пагрымеўшы шуфлядкамі камоды, ён нарэшце выцягнуў адтуль фламастары і, паказаўшы Соні язык, выбег, з усяго размаху бразнуўшы дзвярыма.

Неверагодны збег акалічнасцей прывёў Соню ў апошняе месца на зямлі, дзе ёй варта было апынуцца.

Раздзел IV

# ДЗЯВОЧЫЯ САКРЭТЫ

— Я кахаю цябе, Соня, — Максім далікатна прыўзняў ейнае падбароддзе, правёў вялікім пальцам па яе анямелых вуснах і пяшчотна іх пацалаваў. Яго вусны былі мяккія і пухнатыя, як...

Плюшавы мядзведзік?!!

Соня расплюшчыла вочы. У пакоі было цёмна. Носам яна ўтыкалася ў адну з мяккіх цацак, якімі шчодра быў абкладзены ложак. Ну вядома! «Лялечны дом».

Значыць, усё астатняе, акрамя пацалунка, ёй не прыснілася.

Пазяхнуўшы, Соня намацала каля падушкі мабільнік. Да сігналу будзільніка заставалася сорак пяць хвілін, але спаць зусім не хацелася. Звычайна яе зранку і гарматамі не падняць, але пасля ўсіх хваляванняў вечаровага пераезду яна так рана завалілася спаць, што цяпер пачувалася свежай і бадзёрай. У пакоі было прахалодна. Соня зладзіла пацягушкі, занурылася з галавой пад цёплую коўдру і стала летуценіць ужо наяве.

Спадзяюся, ніхто з вас не сумняваецца, што Соніны зарокі адмовіцца ад Максіма Статкевіча з яе русявай галованькі як выветрыла. Бо адна справа — марыць пра недасягальнага прынца, з ва ўсіх сэнсах паралельнага твайму класа, і зусім

іншая — скарыць сэрца блізкага суседа. Больш не трэба завучваць на памяць расклад 11 «А» і пракладаць свае школьныя маршруты так, каб прамільгнуць паўз яго на калідоры. Цяпер зранку і ўвечары і — страшна падумаць! — у суботу з нядзеляй ёй нават не трэба будзе выдумляць прычыны, каб звярнуцца да яго. Сямейныя абеды і пыласос з пральнай машынай — агульны дом поўніўся агульнымі тэмамі! Побыт звычайна забівае каханне; Соня спадзявалася, што ў яе выпадку побыт падзейнічае з дакладнасцю да наадварот.

Напрыклад, неабходнасць чысціць зубы сама сабой ператваралася ў рамантычную прыгоду. Учора перад сном мама Юля выдала ручнікі і паказала хлапечую купальню на другім паверсе, куды Соня, крыху ніякавеючы, перанесла пакунак з усімі сваімі шампунямі. Умываючыся, паненка гіпнатызавала позіркам чорна-белую шчотку ў шклянцы пад люстэркам. Ягоную шчотку. Зялёная, у форме цмока, яўна належала малому Вадзіку. Падумаць толькі — памыць галаву і, завярнуўшы валасы ў какетлівы турбан, размінуцца з ім у дзвярным прахоне, зачапіўшы яго рукавом начнушкі...

Стоп! Якой начнушкі? Начнушак у яе ніколі не было. Колькі сябе памятала, Соня спала ў балахонных футболках таты. Тых, якія не падышлі яму памерам або проста знелюбелі. Хадзіць у такім выглядзе па чужым доме не выпадала. Экстранны шопінг — пастанавіла Соня і тут жа падхапілася з ложка. Трэба было наведаць купальню, пакуль ніхто не прачнуўся.

...Як толькі гадзіннік на мабільніку паказаў сем сорак пяць, Соня выйшла з пакоя — у форме і з ранцам. У звычайныя дні ўсе школьнікі ў доме снедаюць у адзін і той жа час, урачыста абвясціла ўчора мама Юля, таму будзе зручней, парэкамендавала яна, спускацца на сняданак ужо сабранай. Так Соня і зрабіла, але, нягледзячы на пунктуальнасць, усё адно выйшла апошняй.

— Гэта парушэнне маёй прыватнай прасторы, — пачула яна незадаволены голас Максіма. — Спачатку ўшчыльненне ў пакоі, а цяпер яшчэ і гэта!.. Там жа не прадыхнуць ад слоікаў ды цюбікаў!

— І што ты прапануеш? — кпліва азвалася мама Юля.

— Памяняйся са мной купальнямі. Мужчыны — асобна, жанчыны і дзеці — асобна. Збярыце разам усе гэтыя вашы, як ты кажаш?.. Дзявочыя сакрэты... А я перайду да таты і спадара Пятра.

З усяго відаць, Максіма імаверныя сутычкі з Соняй у купальні зусім не натхнялі.

— А пра маю прыватную прастору ты падумаў? Пра маю зручнасць?

— А ты, калі заварыла ўсю гэтую камуналку, хіба ў нас спыталася?

— Я хачу мыцца з Максімам! — запіскляві ў трэці голас.

— Замаўчы і еж... Добра, я падумаю, Максім. Але ўзамен ты зробіш тое, пра што я цябе прасіла. Табе ясна?.. А, вось і Сонечка прачнулася! Спускайся хутчэй, што стаіш?

Максім сядзеў пры стале ў сваім школьным гарнітуры без гальштука, у адной руцэ — газета, у другой — кубак з кавай. Есці, гледзячы на такое, было абсалютна немагчыма. Калі так пойдзе далей, Соня змарнее ад недаядання.

— Максім, колькі разоў прасіла, не чытай за сталом!.. Ці добра адпачыла, Соня? Як там — сплю на новым месцы, прысніся жаніх нявесце, га? А тата Віця храпе як жыта прадаўшы — да пятай ранку з Пятром сядзелі, размаўлялі... Што значыць даўно не бачыліся... Я ўжо апоўначы звалілася... А твой тата, Соня, на працу заўсёды позна ўстае, так? Вадзік, не дурэй, а даядай: мы спазняемся! Усё, уцякаем... Да Вадзікавай гімназіі тут блізка, але зранку заторы... Посуд не прыбірайце — я прыеду памыю. Добрага дня!

Кажучы ўсё гэта, мама Юля паспела скінуць пустыя ўжо міскі ў мыйку, выцерці твар і рукі Вадзіку, які зацята раз-

мазваў кетчуп па талерцы кавалкам сасіскі, схапіць ранец са сходаў і ключы — з камоды, захутаць у верхнюю вопратку сябе ды сына і знікнуць разам з малым за дзвярыма. Праз хвіліну знадворку пачуўся пошум матора.

Над сталом павісла цішыня. Каб схаваць няёмкасць, Соня схапіла свае талерку і кубак і ўсё-ткі пацягнулася іх мыць. Максім адклаў газету, падчапіў з падлогі заплечнік і пакрочыў да выхаду. Абуўся і знянацку, абярнуўшыся, зазірнуў у гасцёўню:

— Ты як, у школу ідзеш? — з яўнай неахвотай спытаўся ён. — Я цябе на дварэ пачакаю.

— А?.. Навошта?

— Навошта? А ты дарогу ведаеш?

Кухонны гадзіннік паказваў восьмую. Да званка на першы ўрок заставалася дваццаць хвілін. Соня неяк і не задумвалася, як яна трапіць адсюль да школы — ды яшчэ ў такія рэкордныя тэрміны. Яна нават не ўяўляла, у якім кірунку размяшчаецца іхняя школа. Пакінуўшы посуд, яна пабегла ў вітальню шукаць паліто і боты. Ад хвалявання доўга вазілася з матузкамі.

Калі Соня выскачыла за веснічкі, на вуліцы нікога не было. Яна роспачна забегала сюд-туд перад домам — хацелася крычаць ад крыўды. Сышоў без яе. Што яна цяпер будзе рабіць? Але тут яе сягнуў кплівы голас з падворка.

— Чаго мітусішся як апечаная?

Максім вызіраў з-за рага «лялечнага дома».

— За мной давай.

Яны прайшлі чыста прыбраны двор Статкевічаў, і Максім націснуў гузік на брамцы ў высокай — больш паважнай, чым з вуліцы, — агароджы, якая затуляла дом ад лесу.

— Мама сёння зробіць вам ключы. Усё, цяпер не адставай.

І, заклаўшы рукі ў кішэні нагавіцаў, хутка пакрочыў па лясной сцежцы.

x x x

Ах, што гэта быў за лес! Высока ў нясмелым святле ранішняга сонца шамацелі гонкія хвоі, а пад імі буяла чырвона-залатая восень бяроз ды клёнаў. Соню аж распірала ад хараства моманту. Навокал прасціраўся зачараваны, казачны лес, па якім яе, як тую кэралаўскую Алісу, вёў Белы Рыцар.

Толькі вось з боку ўсё выглядала не надта рамантычна. Максім ішоў так хутка, што, каб паспець за ім, Соні трэба было трусіць, як сабачку на шворцы. Калі ўжо згадваць творы англійскіх пісьменнікаў, гэтыя двое былі падобныя хутчэй да Пятачка з Віні Пухам.

«Віні, Віні, куды мы ідзём?» — мімаволі згадала Соня савецкі мульцік і голасна рассмяялася.

— Чаго рагочаш? — панура спытаўся Статкевіч, так рэзка спыніўшыся, што Соня мала на яго не наляцела.

— Ну... Хіба тут не цудоўна? — знайшлася яна пасля некаторага замяшання. — Пагодны ранак, сонца, водар хвой — ці шмат трэба для добрага настрою? Ты ўвогуле калі-небудзь бываеш у гуморы?

— Ты хоць ведаеш, што гэта за лес? — раптам зашыпеў Статкевіч.

— Ну, лес як лес. Наш, мікрараённы.

— Ты ведаеш, колькі тут у трыццатыя людзей расстралялі?

— А... Дык тут не. Гэта ж там, за кальцавою, у Курапатах, — махнула Соня рукою туды, адкуль даносіўся шум аўтатрасы.

— Значыць, за кальцавою расстрэльвалі, а тут не? Выдатна!..

— Ну, нам гісторык так казаў.

— Ты ведаеш толькі тое, што расказваюць у школе? Гэта шмат што тлумачыць, Сінічка. Дык вось, запомні. Ніякіх раскопак ніхто тут ніколі не рабіў. Ахоўная зона — гэта адно,

магілы — іншае. Тут усё на касцях. Так што будзь ласкавая, паводзься прыстойна.

І пакрочыў далей. Зануда. Як можна быць такім занудам? Соня аж запаволілася ад абурэння.

— Не тармазі! А то спознімся.

Гэтак Соня Сінічка зноў аканфузілася на роўным месцы. Але лес сапраўды быў казачны. Здаваўся дрымучым — ажно праз нейкія пяць хвілін Соня пачала пазнаваць мясціны. З гэтай горкі яны ўсім раёнам узімку каталіся на санках. Статкевіч правёў яе напрасткі. Адсюль ужо была відаць школа: за купай хмызу, з якога вытыркаў закінуты двухпавярховік, прасціралася пустка школьнага стадыёну.

На ўзлеску Статкевіч спыніўся. Павярнуўся да Соні, не вымаючы рук з кішэняў, і загаварыў.

— Адсюль пойдзеш сама. Але спачатку паслухай уважліва, Сінічка. Я цягаюся з табою толькі таму, што мяне вельмі прасіла мама — ёй у гэтым лесе вечна мрояцца нейкія міфічныя маньякі. Запомні раз і назаўжды: не размаўляй са мной у школе! Мне хапае тых плётак, што ўжо існуюць — па тваёй міласці! І толькі пасмей хоць каму ляпнуць, што мы жывём у адным доме! Сяброўкам сваім, жанішку гэтаму свайму лахматаму... Толькі паспрабуй — мала не пакажацца.

— І што ж ты зробіш?

— Я знайду спосаб зняславіць цябе на ўсю школу. Гарантую табе гэта. Так што не вытыркай языка. Усё, я пайшоў.

І ён хутка-хутка збег уніз па схіле. Соня стаяла колькі хвілін, гледзячы яму ў спіну. Вельмі многае хацелася крыкнуць яму ўслед: і «што ты сабе дазваляеш, Статкевіч?», і «гэта мне трэба саромецца цябе!», і «Вася мне не жанішок». Але яна толькі сціснула кулакі, пачырванеўшы ад гневу.

А самае вясёлае, што ў школу ёй не было трэба. Па аўторках «Д» клас меў вытворчую практыку, і а восьмай дваццаць метадыстка сустракала ўсіх дзяўчат, хто вучыўся на швачак, каля тралейбуснага прыпынку, каб везці на швей-

ную фабрыку. Сёння быў першы дзень навучання на прадпрыемстве.

Уздыхнуўшы, Соня таксама разагналася па схіле, але збочыла ўправа ад школы, туды, дзе, на ейнае меркаванне, мусіў быць прыпынак.

x x x

— Дык усё-ткі, у каго ты жывеш? — спытала Галя, жвава перабіраючы піжамкі на вешалцы ў краме бялізны.

Увесь дзень з самага ранку Соня трымалася, не раўнуючы юнак на дапросе. Тоячы думкі і мары свае — што было нялёгка, улічваючы шквал пытанняў, якімі засыпалі сяброўкі. А які дом, а хто гаспадары, а як туды ехаць, а ці запросіш у госці... Звар'яцець можна. А гэта ж Снежка і Галя, ад якіх яна ніколі нічога не ўтойвала ўжо цэлыя два гады — з часу, як яны разам трапілі ў «Д» клас і моцна пасябравалі. Адказвала Соня асцярожнымі агульнымі фразамі. Дом вялікі і прыгожы, гаспадары заможныя, але вельмі простыя ды прыязныя, жывуць далекавата, але яе будуць падвозіць у школу машынаю.

Адбыўшы практыку, дзяўчаты хуценька паабедалі ў фабрычнай сталоўцы і пабеглі ў горад — гуляць і на шопінг. Цяпер Галя з выглядам знаўцы прамацвала швы піжам і начнушак, рэкамендуючы сяброўцы толькі найлепшае. Хто-хто, а яна на швейнай практыцы пачувалася як рыба ў вадзе. Выдатніца шыцця, Галя зачаравана сачыла за рухамі закройшчыцы, калі тая спрытна разразала тканіну паводле лякалаў. Соня нібы таксама сачыла ўважліва, але калі ёй у выніку даручылі нешта раскроіць, заданне ўзорна-паказальна праваліла. Яшчэ дагэтуль увушшу стаялі крыкі майстрыхі.

— А дзеці ў іх ёсць? Можа, сыны-студэнты? — Снежка круцілася па краме, трымаючы перад сабой легкадумны ружовы пеньюарчык.

— У іх шасцігадовы сын, а ў доме дубак, бо топяць газам і, каб ашчадзіць, прыкручваюць батарэі, — стрымана прамовіла Соня і выхапіла ў Галі піжаму ў шэрыя слонікі, на памер большую, чым ёй было трэба. Прыклала да сябе байку і штанішкі. Цёплыя — і нідзе нічога не будзе вытыркаць. У самы раз. Трасцы гэтаму Статкевічу, а не эротык-шоу. Ну што гэта за шчасце — жыць побач з завучкам, які цябе за чалавека не лічыць і саджае ў лужыну пры першай-лепшай нагодзе? Ну і што, што яна ў «Д» класе? Яна можа вучыцца на выдатна — проста не хоча... Але калі захоча — зможа. І лёгка.

— Соня, ты чаго? Пяць хвілін ужо так стаіш.

— Дзяўчаты, ведаеце што? Сёлета я траплю на слуп, — павол прамовіла Соня, гледзячы на сябе ў люстэрка.

Пасля секунднай паўзы крама бялізны напоўнілася залівістым дзявочым смехам.

x x x

— І навошта табе гэта?

— Во дае! На слуп!

Галя і Снежка зноўку зафыркалі. Яны рагаталі, пакуль Соня плаціла на касе. Надрывалі жываты, пакуль прадавачкі пакавалі піжаму ў фірмовую торбачку. Гігікалі, купляючы марозіва ў холе гандлёвага цэнтра. Вохкалі і ўсхліпвалі, бухаючыся за столік кавярні, дзе іх працягвала накрываць, як толькі размова вярталася да чарговага Сонінага прыбабаху.

На слэнгу 234-й школы «трапіць на слуп» значыла прабіцца ў топ-45 вучняў паводле адмысловага тэста, які школьная адміністрацыя ладзіла напрыканцы першай чвэрці. Прагрэсіўны дырэктар ці то пабачыў у вар'яцкім сне, ці то вычытаў у інтэрнэце, што духу спаборніцтва, які натуральна віруе ўнутры школьных класаў, недастаткова. Для лепшых акадэмічных паказнікаў важна вывесці гэты самы дух на іншы ўзровень. Таму ў кастрычніку настаўнікі складалі для

ўсіх дзявятых, дзясятых і адзінаццатых класаў пяць аднастайных тэстаў па матэматыцы, фізіцы, англійскай, рускай/беларускай мовах і гісторыі. Балы, атрыманыя кожным вучнем, падсумоўваліся, і такім чынам складалася тры рэйтынгі для трох паралелей, без падзелу на класы. На загад дырэктара найлепшыя сорак пяць вынікаў выводзілі на прынтары буйным шрыфтам і вывешвалі з трох бакоў на слуп — белую чатырохкутную калону ў вестыбюлі побач з дошкай аб'яў.

Узнагародай для найлепшых была турыстычная паездка на восеньскіх вакацыях за кошт школы. Ці, дакладней, за кошт спонсараў.

Лішне казаць, што больш за палову спіса ў Сонінай паралелі традыцыйна займаў «А» клас амаль у поўным складзе. Лішне таксама казаць, што два гады запар гэты спіс ачольваў Максім Статкевіч.

Спадзявацца на месца ў топ-45 камусьці, хто вучыўся ў 11 «Д», было гэтак жа недарэчна, як марыць пра палёт на Месяц. Зрэшты, «Д» клас гэтая гонка за лідарам не хвалявала. Тры дзясяткі дзяўчат і хлопцаў жылі насычаным жыццём сучасных падлеткаў, пакуль аднагодкі гібелі над падручнікамі ды канспектамі.

— Сініца, хто-хто, а ты ніколі не замарочвалася вучобай, — сказала Галя, нарэшце супакоіўшыся. — Што раптам здарылася?

— Гэты Макс Статкевіч, — насуплена прамовіла Соня, — ён проста не мае права нас абражаць. Я давяду яму, што не тупая. Што «Д» клас чагосьці варты.

— Цьху ты, зноў Статкевіч? — раззлавалася Снежка. — Ты ж учора ўрачыста абяцала забыць гэтага ідыёта.

— Не, кахаць — кахай, справа твая. Але так надрывацца праз каханне — Соня, гэта занадта!

— Гэтым разам рэч не ў каханні. Рэч у прынцыпах.

— Ты што, сур'ёзна збіраешся вучыцца? — Галя глядзела на Соню, нібыта ўпершыню яе бачыла. — Тэсты ў сераду.

— Значыць, у запасе цэлы тыдзень. Сёння пачну. Усё, дзяўчаты, абдымаю. Мне пара.

— Стой, куды ты?

— А на чым ты паедзеш?

— А давай мы цябе праводзім!

Ну вось, зноўку. Давялося яшчэ паўгадзіны пазбаўляцца ад «хваста»: саджаць сяброўак на тралейбус, а самой ехаць на наступным. Канспірацыя, каб яе.

Дарогаю дадому яна яшчэ трохі паблукала ў пасёлку, шукаючы Верасовую вуліцу. У дзверы пазваніла, калі ўжо бралася на цемру.

x x x

— Соня, золатка, як прайшоў твой дзень? Як вучоба?

Пытанне прыспела Соню знянацку. Так склалася, што ніхто ніколі не цікавіўся ў яе, як прайшоў дзень у школе. Яна сыходзіла з дому, калі тата яшчэ спаў, і засынала, калі ён яшчэ быў на працы. У нячастыя гадзіны разам Соня паспявала паведаміць толькі самае асноўнае са свайго жыцця. Таму цяпер, перад дапытлівым тварам мамы Юлі, яна спачатку няпэўна мэкала, але паціху-патроху разгаварылася.

Найдзіўней было тое, што маме Юлі сапраўды было цікава. Па аўторках яна ездзіць на вытворчую практыку, прызналася Соня і ўцягнула галаву ў плечы. Але, здаецца, маці дваіх геніяў гэтая інфармацыя прывяла ў захапленне. Швачка? Гэта выдатна! І ў жыцці прыдасца. Соня, калі трэба, можа карыстацца швейнай машынкай — яна ў гаспадарчым пакоі. Сама мама Юля ў пачатку дзевяностых на вытворчай практыцы вучылася... кіраваць грузавіком. І дагэтуль мае правы катэгорыі С. Як-небудзь яна пакажа.

Пабачыўшы, што Соня ідзе вячэраць, малы Вадзік апаратыўна вылез з-за стала і, ігнаруючы дзяўчыну, знік у невядомым кірунку. Чыста папугай, які ва ўсім капіраваў старэй-

шага брата. Тата Віця быў дома, але, відаць, працаваў, бо засяроджана сядзеў тут жа ў холе пры хатнім камп'ютары, перыядычна аддаючы камусьці кароткія каманды праз мабільны. А Максіма нідзе не было.

— Максік на тэніс пайшоў. Ён тут непадалёк займаецца, на крытым корце, — адказала мама Юля, хоць Соня і не пыталася.

Спрабуючы прагнаць з думак узрушальную выяву Максіма Статкевіча з ракеткай, Соня працягвала балбатаць пра школу. Не, тэлевізара глядзець яна не будзе. Ёй трэба многа вывучыць. Расказала пра дырэктарскі супертэст і пра тое, як цяжка да яго падрыхтавацца.

— Як цікава, Соня! І што, гэта такі складаны тэст? Як добра, што цяпер ты жывеш у нас, а то Максік ну нічагуткі пра школу не расказвае. Так, не — абцугамі інфармацыю трэба выцягваць. А ты такая старанная — ну ідзі, займайся. Удачы. Табе трэба камп'ютар для вучобы? Тата Віця, адарвіся на хвіліну, я дзіцяці персанальны профіль ствару. Глядзі, Соня, будзе кветачка на іконцы.

Аказваецца, мама — гэта вось як. Калі пасля вячэры Юлія Статкевіч уручыла ёй ключы на бліскучай бірульцы, Соня ледзь не расплакалася.

x x x

— Што рабіць? Я нічагуткі не разумею! — Соня ў роспачы павалілася на горку падручнікаў. — Я нават не разумею, чаго менавіта я не разумею!

Толькі цяпер яна пачынала ўсведамляць, што падрыхтавацца за тыдзень да пяці тэстаў па шасці прадметах — па-за межамі ейных магчымасцей. Калі б яна прысвяціла гэтаму папярэднія чатыры гады, а не гадзіны — магчыма, быў бы нейкі плён.

Да шостага класа Соня вучылася лёгка і амаль на выдатна. Але ў сёмым нешта пайшло не так — калі ў раскладзе з'явіліся

алгебра, фізіка і хімія, яна рэзка з'ехала і з таго часу перабівалася з пяцёрак на шасцёркі — з рэдкімі ўкрапінамі васьмёрак па гуманітарных прадметах. Што і давяло яе да «Д» класа.

Яна шчыра спрабавала ўчытацца ў параграфы, якія задаў ім паўтараць настаўнік фізікі, але безвынікова.

«А гэты сядзіць, відаць, за сценкай, шчоўкае задачкі як арэшкі, — злосна прабурчэла яна. — Батанік чортавы!»

З гадзіну таму Максім вярнуўся дадому — Соня чула голас на калідоры.

Раптам пачуўся стук у дзверы.

— Соня, можна? — мама Юля прасунула ў пакой свой курносы носік. — Я табе гарбаты прынесла. З канапкамі! Падсілкуйся, зрабі перапынак — нельга займацца запар шмат часу. А можна з табой пасядзець?

Пытанне было рытарычным, бо на вялізным падносе, што яна трымала ў руках, стаяла дзве філіжанкі.

— Я так удзячная табе за магчымасць пагуляцца ў сапраўдную маму, — прасакатала мама Юля, разліваючы гарбату. Калі я вучылася ў школе, мая матуля заўсёды ладзіла мне такія вечаровыя перакусы: я, здаралася, начамі рыхтавалася да кантрольных. І нават падчас сесій у інстытуце, калі прыязджала ў Полацк... Цяпер мне гэтага вельмі не хапае.

— Вы хіба не робіце канапак Максіму, калі ён вучыцца?

— Як табе сказаць... Ніколі не бачыла, каб Максім вучыўся.

— Што?!!

— Не, ну нейкія ўрокі робіць. Рэфераты піша і ўнізе раздрукоўвае. Але каб дапазна з падручнікамі...

— Чым жа ён цяпер займаецца?

— Чытаў, калі я зазірала. Можа, фільм глядзіць. Ці з Вадзікам у стралялкі гуляецца. Увогуле, яны ў мяне рана спаць кладуцца. А я сава.

Увесь імпэт Соні як рукой зняло. Статкевіч дакладна геній. І свае дзясяткі з плюсам здабывае, бо разумны, а не таму, што зубрыць дзень і ноч.

Бо гэта няпраўда, маўляў, троечнікі ненавідзяць выдатнікаў. Ненавідзяць зубрылак: калі б зубрылкі не зубрылі, былі б гэткія ж троечнікі, як усе.

А калі чалавек ад прыроды разумны, яму ўсё само сабой даецца. Як можна ненавідзець прыроду? Ёй можна толькі ціха зайздросціць.

— Ты, калі чагосьці не разумееш, у Максіма спытай. Ён патлумачыць. Ён з брацікам часта займаецца. Заўсёды рады дапамагчы.

Гэх, як шмат вы не ведаеце пра свайго сына, мама Юля.

— Соня, што гэта? Які цуд!

Гэта мама Юля зірнула ў кут, туды, дзе Соня пачала парадкаваць самае дарагое, што мела, — свой лялечны дамок.

Некалькі гадоў таму, калі тата толькі заліў падмурак іх будучага былога дома, ён змайстраваў для Соні фанерную скрынку з пераборкамі. Падгледзеў у часопісе аб рамонце заходнюю забаўку — дом для лялек.

— Вось, Сонюшка. Я буду будаваць вялікі дом, а ты — маленькі, — сказаў ён тады.

І Соня спраўна будавала. Фарбавала дах, клеіла на сценкі шпалеры, майстравала мініяцюрныя карціны, на кішэнныя грошы скупляла ў інтэрнэце мэблю ды розныя фінціфлюшкі. Шыла з лапікаў тканіны фіранкі, дыванкі ды пледзікі. За час, пакуль ішла татава будоўля, лялечны дамок зазнаў некалькі рамонтаў, рэдызайнаў і перастановак мэблі. Вось толькі такіх маленькіх лялек, каб пасяліць у доме, Соні не траплялася. Але яна спадзявалася аднойчы іх знайсці.

Учора тата адарваўся ад пасядзелак са Статкевічамі, каб сказаць ёй дабранач. Прыцягнуў і паставіў каля ложка густа аблепленую скотчам кардонку з-пад тэлевізара.

— Хоць твой дом цэлы застаўся, — сумна ўсміхнуўся ён. — Забірай, а то яго ў мой пакой памылкова занеслі.

Сам дамок-скрынку Соня выцягнула, але мэблю расставіць не паспела. Загорнутыя ў газеты шафкі ды камодкі грувасціліся на кіліме.

Мама Юля перабірала прадмецікі і здзіўлена вохала.

— Гэта проста здорава, Соня! Я не думала, што гэта можа быць так здорава! Можна я дапамагу табе тут усё расставіць? Ну калі ласка! Дарэчы, а хочаш зірнуць на маё хобі? Можна паказаць табе? Я хуценька!

Мама Юля знікла і праз пару хвілін вярнулася з абярэмкам фотаальбомаў.

— Я фатаграфую, — з гонарам сказала яна. — Альбомаў у мяне толькі надрукаваных штук трыццаць. Але я табе толькі старыя прынесла. Гэта з часу, калі Максім быў зусім маленькі. Табе ж цікава зірнуць? — хітра спыталася яна.

Соні было страх як цікава.

— Гэта я яшчэ на «Зеніт» здымала, — прамовіла жанчына, любоўна разгладжваючы старонкі. Старыя фота былі перакладзеныя ў новыя дарагія альбомы са скураным пераплётам.

На каляровых здымках з жаўтаватым адлівам былі прыгожыя цэрквы і касцёлы («Полацк», — патлумачыла мама Юля), нейкія дзяўчаты і хлопцы ў джынсавых куртках, між іх — малады тата Віця ў цяльняшцы на фоне возера... Потым, нібы нехта пераключыў канал, пачаліся выявы адна-, двух- і трохгадовага шэравокага карапуза ў смешных гарнітурчыках. Маленькі Максім Статкевіч! Гартаючы альбомы, Соня вішчэла ад замілавання.

І раптам яна пабачыла дзяўчыначку гадоў чатырох у мілай ружовай сукенцы. Дзяўчыначка была вельмі прыгожая і так падобная да мамы Юлі...

— У вас... Гэта ваша дачка? — няўпэўнена спыталася Соня.

— Гэта? — задаволена захіхікала жанчына. — Хіба не пазнаеш? Гэта ж Максік!

— Што?!! — Соня пачала хапаць ротам паветра.

І тут мама Юля вываліла на Соню свой галоўны дзявочы сакрэт.

— Калі я была цяжарная першы раз, то вельмі хацела дзяўчынку, — патлумачыла яна. — Але нарадзіўся хлопчык. І вось, пакуль Максік у школу не хадзіў, я часам шыла яму спаднічкі ды сукеначкі. Але толькі каб сфотаць! Вось гэта, — тут яна перагарнула старонку, — мой шэдэўр.

На Соню, міла ўсміхаючыся, глядзеў маленькі Максім Статкевіч у цюлевым строі сняжынкі. Валасы яго былі сабраныя ў пацешныя хвосцікі, упрыгожаныя замест банцікаў срэбнымі гірляндамі. За ім зіхцела навагодняя ялінка. Выглядала, малы на фота і не падазраваў, што нешта не так.

— У садочку сказалі пашыць касцюмчык зайчыка... Але я не ўтрымалася. Праўда мілашка? Шкада, нельга было на ранішнік так адвесці.

Мама Юля бестурботна рассмяялася.

— А... Максім увогуле ведае?

— Ведае, а як жа. Толькі вельмі злуецца, калі пра гэта згадваеш. Як падрос, нават папікаць стаў: «Мама, у мяне дзіцячая траўма!», — тут мама Юля смешна перадражніла сына. — Але дурное, якая траўма! У Еўропе да Першай сусветнай маленькіх хлопчыкаў пагалоўна апраналі ў дзяўчатак — традыцыя такая была. І нічога. Але ты глядзі, глядзі. А я пакуль тваім дамком займуся. Гэта ў цябе кухня?.. Мамачкі, якая прыгажосць!

Больш у той вечар Соня не вучылася.

x x x

«Калі кагосьці баішся, уяві яго без штаноў», — раіў адзін пісьменнік. Або ў строі сняжынкі — магла б дадаць цяпер Соня. Пасля дакументальна пацверджаных прызнанняў мамы Юлі думаць пра Максіма Статкевіча без смеху ў яе

не выходзіла. На шчасце, калі наступным ранкам яна спусцілася на сняданак, хлопца за сталом не было.

— Зусім забыла папярэдзіць, — выгукнула мама Юля, пабачыўшы Соню на сходах. — Спускайся і хутчэй еж. У Максіма першым урокам фізкультура, у яго вызваленне. Ён яшчэ спіць. А адну ў лес я не адпушчу. Так што падвязу цябе да школы. Але ты нядоўга, каб Вадзік не спазніўся.

Соня хуценька паснедала, імкліва апранулася і праз пяць хвілін ужо сядзела ў машыне.

Яе высадзілі перад школай хвілін за дваццаць да заняткаў. Амаль ніхто так рана не прыходзіў. Толькі дзяжурны клас размяркоўваўся па вестыбюлі для фэйс-кантролю, чапляючы на форму бэджыкі. Каторая ўвогуле гадзіна? Соня стала корпацца ў кішэнях і заплечніку, але мабілкі нідзе не было.

Ну вось, у спешцы тэлефон дома пакінула.

Соня паднялася ў кабінет рускай мовы і літаратуры. На шчасце, ён быў ужо адчынены. Села за парту, разгарнуўшы падручнік па сусветнай гісторыі. Трэба ж хоць нешта зрабіць для гэтага клятага тэста.

— Сініца, дык дзе ты цяпер жывеш? — Вася ўварваўся ў клас перад самым званком.

Блін, ну калі гэта скончыцца?

— Васілеўскі, не твая справа.

— Як не мая? Мой абавязак — праводзіць цябе штодня дадому. Туды далёка ехаць?

Каб жа гэтага Статкевіча з яго забаронамі пярун лясснуў! Хоць калі б ён і не забараняў, ці прызналася б Соня сябрам, у які нерат трапіла? Тое яшчэ пытанне.

Між тым у кабінет зарупіла русіца і, як заўсёды, завялася з паўабароту:

— «Д» клас! Слухайце мяне ўважліва. Я вам гэта першы і апошні раз скажу! Вы — пакаранне, пасланае мне за грахі. Мне не хапіла смеласці адмовіцца ад вас, пакуль было

можна, і вось ужо трэці год працягваюцца мае пакуты! Хіба вы не можаце быць як усе нармальныя людзі?

Гэты спіч, уключна з фразай пра першы і апошні раз, «Д» клас выслухваў ад класнай кіраўніцы рэгулярна. Ніна Віталеўна была маладой настаўніцай з паўтары стаўкамі, двума маленькімі дзецьмі і без мужа. Пра мужа, у сэнсе, былога, «Д» клас таксама рэгулярна ад яе чуў — ці не часцей, чым пра рускіх пісьменнікаў і катэгорыі дзеясловаў.

— Праз тыдзень — усяго праз тыдзень! — тэсты, а вы ў гэтым годзе і не пачыналі вучыцца! Гэта яскрава дэманструюць вынікі дыктанта, — тут Ніначка (так за вочы называлі яе вучні) вымоўна патрэсла стосам сшыткаў. — І не толькі мой прадмет! Мне скардзяцца на вас усе — без вынятку ўсе настаўнікі! Што вы сабе думаеце? Як вы ва ўніверсітэты паступіце з такімі баламі? На рынак гандляваць пойдзеце пасля школы?

— А што, лепш як усе? Спачатку ва ўнівер, а потым на рынак?

— Га-га-га! Малаток, Дзімон!

Русіца цяжка ўздыхнула.

— Мы з Аленай Іванаўнай дамовіліся, што вашы адзнакі ў чвэрці будуць наўпрост залежаць ад тэстаў па рускай і беларускай мовах.

— У-у-у...

— Зразумейце, я не патрабую ад вас трапляць у топ-45, крый божа, я проста прашу адказна паставіцца да тэстаў. Выкласціся напоўніцу. Успрыняць як папярэдняе выпрабаванне перад НЦТ. Як праверку сваіх сіл... Урэшце, зразумейце, што сваімі вынікамі вы ганьбіце мяне перад усім педкалектывам!

— А Сінічка сказала, што сёлета трапіць на слуп! — крыкнуў нехта з хлопцаў.

— Сяброўкі называецца. Растрапалі ўжо, — зашыпела Соня на Галю і Снежку.

— Хто? Сінічка? Не смяшыце мяне, — Ніна Віталеўна з недаверам зірнула ў Сонін кут. — Хутчэй Дубовік паступіць у Гарвард. Так, сунялі рогат, разгортваем сшыткі. Праца над памылкамі...

— Ну, і як поспехі? Шмат вывучыла? — пацікавілася Галя ў перапынку. Яны збіралі рэчы, каб пераходзіць на фізіку.

— Ніякіх поспехаў. Толькі галава пухне, — панура адказала Сінічка.

— Я ж кажу, кінь дурное!

— Статкевіч, — агаломшана прашаптала Снежка.

Соня падняла галаву. У дзвярах кабінета ўва ўсёй сваёй красе стаяў Максім.

— Сінічка, на выхад! — скамандаваў ён тонам, які не дапускаў пярэчанняў. — Праз тры хвіліны ў «калодзежы», — дадаў ён, калі Соня падышла.

x x x

Вось-вось мусіў празвінець званок, але ў кабінеце фізікі было пуста. «Д» клас у поўным складзе папрыліпаў да вокнаў калідора, якія выходзілі ў школьны двор-калодзеж.

— Што там? Што яны робяць?

— Няясна. Проста размаўляюць.

— Глядзіце, ён нешта перадаў ёй.

— Што там? Кепска відаць.

— Нахіляецца да яе. Няўжо пацалуе???

— Рэбза, што тут? — Вася актыўна прабіраўся да акна.

— Не бачыш хіба? Статкевіч тваёй Соні прызнаецца.

— Што, Васілеўскі, пракурыў сваё шчасце?

— Ну і гад! Замачу баклана!

— Куды ты? Стой ужо. Бачыш, вяртаюцца.

— І што гэта за шоу? — да Сонінага здзіўлення, дзверы, якія вялі ў «калодзеж», зазвычай намёртва перакрытыя дзеля прафілактыкі курэння, цяпер былі адчыненыя. Відаць,

прамяністы Статкевічаў позірк быў здольны растапіць нават сцюдзёнае сэрца цёткі Ядзі, школьнай вахцёркі.

— Ты ж забараніў мне падыходзіць да цябе. А цяпер нас усе бачаць.

— Затое гарантавана не чуюць. У нашым выпадку гэта больш істотна.

— Кажы, чаго табе. Я спяшаюся.

— Вось, трымай. Ты заўсёды такая разява? — прыкрываючы далонню, каб не было бачна з вокнаў, Статкевіч працягнуў Соні яе мабільнік. — І зараз жа прыбяры гэта, — дадаў ён узлавана.

Соня зірнула на экран і зніякавела. На застаўцы ў яе стаяў здымак Максіма ў вайсковай форме і са зброяй.

У траўні хлопцы дзясятых класаў маршыравалі на гэтым самым падворку падчас дапрызыўных збораў, а іхнія аднакласніцы з віскатам і шушуканнем прымалі парад. Калі ваенрук скамандаваў: «Аўтаматы на фронт!», — Максім разам з усімі эфектна прыціснуў да грудзей вучэбны калашнікаў. Гэта было так крута, што Соня не змагла ўтрымацца і сфатаграфавала.

Жах які. Зноў аблажалася.

— Нашто прыносіў? Мода такая — чужыя рэчы цапаць?

— Табе мама ўвесь ранак названьвае. Ёй трэба ўсё кантраляваць. Менавіта таму ў мяне няма мабільніка, — адказаў Статкевіч. — Сінічка, ты чула? Зараз жа прыбяры гэтую фотку!

— Гэта мой мабільнік! І мне вырашаць, якія фоткі на ім ставіць. Табе не здаецца?

— Не здаецца, бо на гэтай фотцы — я, — рэзка адказаў Статкевіч. — І ты прыбярэш яе, бо яна мяне раздражняе... Фенаменальна, — дадаў ён, памаўчаўшы, — ты ўсяго два дні жывеш у нашым доме, а ад цябе ўжо столькі праблем!

— Што, баішся выпадкова маю спадніцу ў школу апрануць? — зласліва рассмяялася Соня.

Статкевіч паглядзеў на яе, як Хама Брут на Вія.

— Што ты сказала?

— Што чуў. Думаеш, у мяне адна твая фотка? Зірні вось на гэта! — і, пашнарыўшы ў заплечніку, яна выцягнула здымак з вясёлай дзяўчынкай-сняжынкай.

— Адкуль гэта ў цябе??? — Статкевіч тарганууўся ў ейны бок, але Соня хуценька схавала фотку ў кішэню пінжачка.

— Ну давай. Аблапай мяне на вачах ува ўсёй школы.

Статкевіч адхіснуўся і абвёў вачыма «калодзеж». Соня не перабольшвала — з усіх вокнаў на ўсіх паверхах, як з ложаў стадыёна для карыды, за імі сачылі прагныя гледачы.

Прычым тарэадорам у іх дуэце быў зусім не Статкевіч.

— Дзе ты гэта ўзяла? — цяпер ён глядзеў на Соню, як бык на чырвоную анучу. — Скрала?

— Усё законна. Выменяла ў тваёй мамы на чыгунную ванначку.

— На што?!

— Няважна. Доўга тлумачыць... Галоўнае, Статкевіч, я знайшла спосаб зняславіць цябе на ўсю школу. Бо гэтая мілая лялечка збярэ рэкордную колькасць лайкаў у інтэрнэце...

— І што ты хочаш узамен?

— У сэнсе?

— Шантаж і вымагальніцтва. Так «Д» клас пракладае сабе дарогу?

Пра што ён увогуле? Шантаж? Яна б ніколі сама не даўмелася. Але ж адна галава добра, а дзве лепей. Дзякуй, Статкевіч. Ты сапраўды геній. Але што б такое ў цябе папрасіць?

— Я аддам табе фотку, калі ты дапаможаш мне трапіць на слуп! — выпаліла яна перш, чым зразумела, што кажа.

— Чаго? Ты з глузду з'ехала?

— Я хачу трапіць у топ. Дапамажы мне падрыхтавацца да тэстаў.

— Застаўся тыдзень. З тваім узроўнем гэта тэхнічна немагчыма. Я не гасподзь бог, Сінічка, ты ў курсе?

У Соні на гэты конт былі іншыя звесткі, але яна хітра прымружылася і сказала:

— Так. Ты не бог. Ты — маленькая вясёлая сняжынка! — і яна са смехам папляскала сябе па кішэні.

Твар Статкевіча перакасіўся ад ятрасці. Але ён хутка ўзяў сябе ў рукі і, хвіліну памаўчаўшы, спакойна сказаў:

— Добра. На тыдзень я стану тваім настаўнікам. Але, як ты разумееш, гарантаваць я нічога не магу. Вынік залежыць толькі ад цябе. Пачнём дома пасля абеду. Не падыходзь да мяне ў школе!!!

І, рэзка развярнуўшыся, знік у будынку.

— Чаго ён хацеў ад цябе? — пад пералівы званка (які, паміж намі, крыху прыпазніўся, бо цётка Ядзя замыкала дзверы ў «калодзеж») плынь «Д» класа ўнесла Соню на фізіку.

— Нічога асаблівага. Яшчэ раз нагадаў мне, што я тупая, — выкруцілася Соня.

Па сутнасці, так яно і было.

Падчас занятку яна непрыкметна праўдзіла мабілку. Пабачыла тры прапушчаныя званкі ад мамы Юлі і чатыры эсэмэскі ад яе ж:

«Не адказваеш — ты на ўроку? Пзв пасля шк, кл, патлумачу, як ісці дадому паўз возера».

«Не хадзі адна праз лес!»

«Знайшла твой тэл на стале ўнізе. Перадаю ў шк з М».

«А ў цябе добрае пачуццё кампазіцыі ;)».

Цяпер мама Юля ведала, што Соні падабаецца ейны Максік. Абмен дзявочымі сакрэтамі можна было лічыць завершаным.

Раздзел V

# УСПОМНІЦЬ УСЁ

Шух-шух-шух-шух...

Соню абудзіў незвычайны шоргат. Яна агледзелася і зразумела, што заснула ў форме на неразабраным ложку. Хацела была ўзняцца, але войкнула і падабрала ногі. Па падлозе проста на яе ехаў пузаты белы агрэгат на колцах. Нешта сярэдняе паміж гуссю і пыласосам — толькі замест галавы ў гэтай нана-гусі была вэб-камера.

Вока вэб-камеры нацэлілася на ложак:

— Максім, яна дрыхне! — раптам заверашчала нана-гусь голасам Вадзіка.

Агрэгат развярнуўся і на поўнай хуткасці выехаў на калідор праз прачыненыя дзверы. Соня скочыла за ім. Дзверы супрацьлеглага пакоя адчыніў, упускаючы свайго робата-шпіёна, Вадзік з мінібукам пад пахай. Страшна ўявіць, колькі каштавала гэтая цацка.

Соня абурана ляснула дзвярыма. Але неўзабаве ў іх пагрукалі.

— А ну, уставай там. Я прыйду праз тры хвіліны, — пачула яна Максімаў голас.

Соня распахнула дзверы.

— Заходзь. Я гатовая.

Статкевіч скептычна акінуў вачыма спачатку Соню, потым пакой.

— Што, сур'ёзна? Ты робіш урокі на туалетным століку?

Сінічка азірнулася. Перад люстэркам упярэмешку з касметыкай ляжалі сшыткі і алоўкі.

— Ну, ён даволі зручны. А іншага тут і няма.

— Я так сядзець не буду. Зараз вярнуся. А ты пераапраніся хоць. Пакамечаная ўся, як бамжыха.

Бамжыха?!! Ды за такое трэба было адразу ў морду, а не заняткі з ім ладзіць! Але што цяпер рабіць? Моўчкі праглынуць абразу? Або псіхануць і адмовіцца? Дык сама ж набілася ў вучаніцы. І так гонар пацярпіць, і гэтак. Соня толькі ціха заскавытала ад бяссілля.

Адны мучэнні ад гэтага Статкевіча.

Спачатку яна доўга намагалася пазбавіцца Васілеўскага, які пастанавіў праводзіць яе дадому, чаго б яму гэта ні каштавала. Соня ледзь не плакала, маўляў, ідзі ўжо, мяне забяруць на машыне. Хлопцы з дзяжурнага класа далажылі Васю, што зранку Сінічку падвозіла ў школу «крутая тачыла», так што прынамсі гэтая частка легенды выглядала праўдападобна. У выніку, стоячы на прыпынку, Соня выбрала момант, калі Вася адвярнуўся да шапіка, і ўскочыла ў тралейбус. Прыкра выйшла — але што паробіш.

Але сапраўдная прыкрасць чакала Соню, калі тая, без усялякіх званкоў маме Юлі, самастойна і даволі хутка адшукала «лялечны дом» на Верасовай. Мама Юля адчыніла ёй дзверы з такой змоўніцкай усмешкай, што Соню абдало жарам. Яна баялася падняць вочы, пакуль ёй налівалі суп, а ад асноўнай стравы зусім адмовілася. Маўляў, абедала ў школе. Ёй хацелася як найхутчэй апынуцца ў сваім пакоі.

— Я ў гіпермаркет на закупы, — абвясціла мама Юля. — Хочаш са мною?

З радасцю б, але ёй трэба займацца.

Адасобіўшыся ў ружовым пакойчыку, Соня зірнула на гадзіннік. Максім прыйдзе толькі праз гадзіну — у яго сёння сем урокаў. Каханне, вядома, — пройдзены этап, але Статкевіча ў школе яна адчувала ўжо інстынктыўна. Не падыходзь, не размаўляй — ды Соня яго нават патыліцай бачыла, калі толькі той быў побач. Вось і ў сталоўцы сёння заўважыла, што еў ён не ў гордай самоце, як звычайна, і не са сваімі «ашкамі», а за сталом фізкласа. А яшчэ яна ледзь не сутыкнулася з Максімам, калі ён выходзіў з настаўніцкай. І хто ён такі, гэты Статкевіч, што перад ім адчыняюцца ўсе дзверы, недаступныя простым смяротным?

Падчас гэтых разваг яе, відаць, і разморыла.

...Максім занёс у Сонін пакой журнальны столік, на якім грувасціліся салонныя падушкі. Столік заняў амаль усё вольнае месца ў вузкім праходзіку. Хлопец раскідаў падушкі па падлозе і апусціўся на іх, склаўшы ногі лотасам:

— Усходні стыль. Давай, валяй, што там табе не зразумела.

Соня нясмела прысела з іншага боку століка, паклаўшы рукі на каленкі, якія цяпер былі абцягнутыя джынсамі.

— Па шчырасці, нічога не зразумела, — прызналася яна.

— Ну, а з чым найбольшыя праблемы? — пазяхнуў Статкевіч, гледзячы кудысьці ўбок.

— Матэматыка! — выпаліла Соня. — І фізіка. І інгліш.

— То бок з усім. Добра. Пачнём з матэматыкі. Якія там параграфы?

— Тыя ж, што і ў вас.

— Думаеш, я ведаю?

— А ты сам да тэстаў не рыхтуешся?

— Мне не трэба. Я запамінаю ўсё, што калі-кольвек прачытаў на паперы ці маніторы. А для ўсяго астатняга існуе логіка.

Геній і пазёр.

— Вам казалі, што будзе на тэстах?

— Паўтарэнне... Зараз, — Соня разгарнула канспект. — Алгебра — карані, геаметрычная прагрэсія, графікі функцый; геаметрыя — усё да саракавой старонкі.

— Ясна. Давай сюды рашэбнік.

І Статкевіч хутка-хутка пачаў гартаць старонкі, пазначаючы алоўкам некаторыя задачы.

— Па алгебры, найхутчэй, будзе такое, такое і, я думаю, такое. Для геаметрыі трэба рашыць гэта, гэта і цалкам гэтыя дзве старонкі.

— Адкуль ты ведаеш?

— Дык лагічна ж. Падчас тэста правяраюць самае асноўнае. Асноўнае я і адзначыў. Што датычыць геаметрыі, я даведаўся, што ўсе задачы рыхтуе Баразноўская. А ейная слабасць — піраміды. Таму зоймемся найперш імі.

Соня глядзела на Максіма на ўсе вочы.

— Ну, ты ж мяне не для ўдасканалення ведаў прыпахала? І не для ўласнага духоўнага развіцця? Патрэбны вынік — буду нацягваць на вынік. Зараз пакажу, — самазадаволена ўсміхнуўся ён. — Дай чым пісаць. І на чым.

Пашнарыўшы на туалетным століку, Соня працягнула Максіму нататнік і асадку. Абедзве канцылярскія прылады былі з серыі «Прынцэсы». Хлопца злёгку перакасіла.

— Я тут пацікавіўся структурай тэстаў і сістэмай ацэнкі, — пачаў ён, хуценька крэслячы ружовай асадкай у бэзавым нататніку. — Гэта не тэсты нават, а хутчэй мадыфікаваныя кантрольныя. Прынамсі, у нас дзяўчаты ў класе стогнуць, што гэтая лажа ну ніяк не падобная да НЦТ. Дзесяць заданняў, варыянтаў адказу няма, адзнакі выстаўляюцца за кожнае заданне асобна. Максімум за адзін тэст — 100 балаў. А максімальная сума за ўсе пяць — 500. У мінулым годзе самы нізкі прахадны бал у топ-45 быў 320. Такім чынам, наша з табой планка сёлета — 350. Зразумела?

Соня мала што зразумела, але кіўнула.

— Гэта значыць, па 70 балаў за кожны тэст. То бок амаль нерэальна для цябе, Сінічка. Таму для падстрахоўкі будзем старацца выбіць максімум па рускай, беларускай і гісторыі. У цябе з імі дакладна менш праблем?

Соня спалохана праглынула сліну.

— Ясна, — уздыхнуў Статкевіч. — Усё, алгебра. Пабудуй графік вось гэтай функцыі, — пастукаў ён пальцам па старонцы рашэбніка. А сам выйшаў і, вярнуўшыся з кнігай фантастыкі, паглыбіўся ў чытанне.

...Праз дзесяць хвілін хлопец адклаў кнігу.

— Ну, што там у цябе?.. Сінічка, ты што, здзекуешся?

За ўвесь час Соня толькі і здолела што накрэсліць дзве восі: гарызантальную і вертыкальную — ды вывесці нуль на іх перакрыжаванні.

— Я не разумею, куды тут ставіць кропкі, — прабурчэла яна вінавата. — Я сама і не рабіла такое ніколі. Мы ўсім класам у Ракавец гэтыя графікі перамалёўваем.

— Навошта ты ўвогуле ў школу ходзіш? Глядзі, гэта ж элементарна. Падстаўляеш замест «ікса» любую лічбу, рашаеш ураўненне, здабываеш значэнне «ігрэк». І так тры разы. Атрымліваеш каардынаты, крэсліш парабалу. Што тут складанага?

— Дарэчы, мяне гэта заўсёды здзіўляла: як можна памнажаць «ікс» на «ігрэк», а на выхадзе атрымліваць лічбы? — задуменна працягнула Максімава вучаніца, гледзячы настаўніку ў рот.

Статкевіч агаломшана ўперыў у яе вочы. Раптам у іх адлюстравалася страшнае падазрэнне:

— Сінічка, колькі будзе шэсць на дзевяць? — насцярожана спытаў ён.

— Сорак восем? — няўпэўнена прамовіла Сінічка і, пабачыўшы рэакцыю Максіма, пацягнулася па калькулятар.

Ні слова не кажучы, Статкевіч выйшаў з пакоя. Вярнуўся праз колькі хвілін, уручыўшы Соні тонкі блакітны сшытак у клетачку.

— Назубок, усю табліцу множання! — рыкнуў ён. — Пасля вячэры праверу.

Ну вось. А Соні здавалася, што пасадзіць яе ў лужыну глыбей, чым яна ўжо сядзіць, немагчыма.

x x x

— Куды падзеўся доўгі драўляны столік, хто ведае? — спыталася мама Юля, раскладваючы спагеці па талерках.

— Я занёс яго наверх, у Сонін пакой, — спакойна адказаў Максім. — Дапамагаю Соні падрыхтавацца да тэстаў.

— Аёй, як міла! — засакатала мама Юля. — Віця, ты чуў? Наш сын клапоціцца пра кагосьці іншага, апроч сябе і брацікa! З уласнай ініцыятывы! Чысты цуд! Дзякуй табе, Соня!

Пры словах «з уласнай ініцыятывы» Соню зноў абдало жарам няёмкасці.

— А як жа я? Ты казаў, што будзеш займацца са мной! — раптам зароў малы Вадзік. — Ма-а-аксім! Я таксама хачу-у-у-у!

— Максім заняты. З табой тата пазаймаецца, — строга сказала мама Юля.

— Дура! — піхнуў Вадзік Соню ў бок кулачком. — Гэта ўсё ты вінаватая!

— Вадзік!!! — крыкнуў тата Віця. — Яшчэ адзін выбрык — пазбаўлю камп'ютарных гулек да канца тыдня!

— І што вам абаім сёння прыгатаваць для перакусу? — ажыўлена спыталася мама Юля.

— Мне — тэрмас кавы з малаком, — сказаў Максім.

— Каву? Нанач? Але згода. Сёння для цябе — што заўгодна.

— Дарэчы, як наконт купальні? Ты абяцала падумаць.

— Наконт купальні?.. У вас душавы блок, а я люблю паляжаць у ванне. Так што ўсё застаецца як ёсць, — і, падміргнуўшы Соні, мама Юля завальсавала на кухню.

Рэшту вечара і частку ночы можна было параўнаць з галівудскім фільмам «Total Recall»*. Спачатку Максім ганяў Соню па табліцы множання. Потым доўга тлумачыў, адкуль пры памнажэнні «ікса» на «ігрэк» бяруцца лічбы. Потым падрабязна рашыў для яе некалькі тыповых заданняў з падручніка і прымусіў яе зрабіць тое ж, прагаворваючы кожнае дзеянне. Калі Соня пачынала кляваць носам, падліваў ёй кавы з тэрмаса.

Разышліся толькі а трэцяй, пасля таго як Статкевіч надыктаваў ёй фронт працы на заўтра. Засынаючы, Соня бачыла кубічныя карані ў фіялетавых разводах. Столькі часу сам-насам, думала яна. Нават шкада, што яна яго больш не кахае.

x x x

— Вам не здаецца, што з Сініцай нешта не так?

На перапынку Вася выклікаў Галю і Сняжану на пільную нараду. Быў панядзелак, і на Соні пяты дзень як не было твару. Хадзіла з чорнымі колцамі пад вачыма, не раўнуючы мішка-панда. Не чула, пра што яе пытаюць, і ўвесь час, нібы апраўдваючы ўласнае імя, цаляла заснуць.

— Ды ўсё ў парадку. Проста ўбіла сабе ў галаву, што здасць тэсты, вось і вучыцца дзень і ноч, — паціснула плячыма Галя. — З намі амаль не размаўляе.

— Вайтовіч, я ўсё магу зразумець, але яна сёння на хіміі рабіла фізіку! Гэта, па-твойму, нармальна? У чацвер па геаграфіі адхапіла двайбан — двух слоў звязаць не змагла! Я ўжо маўчу пра яе выгляд. Гэта не дзяўчына — гэта жыхар Зомбілэнду! Але тое паўбяды, — Вася працягваў выкладаць аператыўныя звесткі. — Яна не дае праводзіць сябе дадому! Хаваецца ад мяне!

* Успомніць усё *(англ.)*.

— Ну, тут нічога дзіўнага, — хмыкнула Сняжана. — Я б таксама ад цябе хавалася. Ты ж яе дастаў ужо сваімі заляцаннямі. Нельга гэтак клеіцца да дзяўчыны. Дзіка раздражняе.

— Так, але навошта яна хлусіць? Кажа, што яе забіраюць на машыне, а сама сядае ў тралік! А на выхадных у яе ўвогуле быў адключаны тэлефон! Вось што, дзяўчаты... Мне здаецца, што Соню ў новым доме трымаюць у рабстве!

— Што?!! Ну і лухта, Васілеўскі!

— Так. У рабстве. Толькі ў школу выпускаюць. Утрымліваюць шантажом і пагрозамі... Дарэчы, хто бацьку яе апошнім часам бачыў?

— О, эсэмэска ад Соні, — выцягнула Галя мабільнік, які вібраваў. — «Галя, Снежка, я адпрасілася. Еду дадому вучыцца. Заўтра на вытворчасці скажыце, што я захварэла», — прачытала яна ўголас і абвяла сяброў занепакоеным поглядам.

— Я гэтага так не пакіну! — выгукнуў, стукнуўшы кулаком па падаконні, Васілеўскі.

x x x

«Good evening my fellow citizens...»*

Соня сядзела ў доме на Верасовай вуліцы перад хатнім камп'ютарам Статкевічаў і прашчоўквала відэаролікі на тэму «Cuban Missile Crisis»**.

Тое, што прыдумаў для яе заслужаны настаўнік Беларусі Максім Віктаравіч гэтым разам, было форменным садызмам. Соня мусіла паслухаць у інтэрнэце зварот Джона Кенэдзі да амерыканскага народа 22 кастрычніка 1962 года па-англійску, перакласці ўсе незразумелыя словы, навучыцца правільна іх чытаць, а потым сцісла пераказаць, што менавіта па-

* Добры вечар, мае суайчыннікі *(англ.).*

** Карыбскі крызіс *(англ.).*

ведаміў JFK свайму народу. Так, меркаваў Статкевіч, Соня падрыхтуецца адначасова да двух прадметаў.

Сінічка ледзь не плакала. Усё, што яна пакуль магла сказаць, гледзячы рэтравідэа, дык гэта тое, што Джон Кенэдзі быў вельмі прыгожым мужчынам.

Нарэшце яна здагадалася ўвесці ў пошукавік першую фразу звароту, якую добра разабрала. Знайшла тэкст. Справа пайшла весялей.

Апошнія дні былі ці не самымі цяжкімі ў ейным свядомым жыцці. Яна амаль не спала і, нягледзячы на шчыраванні мамы Юлі, амаль не ела, затое выпіла кубалітр кавы, прачытала кіламетр тэкстаў і амаль столькі ж напісала. Час перад тэстам Статкевіч размеркаваў так: дзень на кожны прадмет і два дні на замацаванне пройдзенага. У панядзелак, напрыклад, яны паўтаралі матэматыку і фізіку.

Самымі цяжкімі — але, мусіць, і самымі цікавымі таксама.

Усю нядзелю Соня і Максім займаліся гісторыяй. Статкевіч называў адвольную дату пасля 1945 года, а Соня мусіла пералічыць усе важныя гістарычныя падзеі, якія адбываліся ў гэтым годзе. Максім прымушаў знаходзіць сувязі між падзеямі ў розных краінах, чым выводзіў яе з раўнавагі. І асабліва даставаў з Карыбскім крызісам. Калі ён запытаўся, як звязанае з Кубінскай рэвалюцыяй будаўніцтва Берлінскага муру, Соня не вытрымала і сказала, што ніяк не звязанае і яна не вельмі разумее, навошта гэта ўсё ведаць беларускаму вучню.

— Навошта ведаць? — абурыўся Статкевіч. — Ды для мяне гэты крызіс — частка сямейнай гісторыі! Мой полацкі дзядуля Барыс быў на адным з тых караблёў. Акурат у 1961 годзе яго прызвалі ў войска. Праз год пасадзілі на крэйсер, павезлі, а куды — не сказалі. Яны ўсе даведаліся, толькі калі выйшлі ў Атлантычны акіян. Душыліся ў трумах пры спёцы 40 градусаў, бо іх днём не пускалі на палубу... Дзед Барыс быў кіроўцам цягача, мусіў вазіць па Кубе

ядзерныя ракеты... Дарэчы, чаму гэтыя ракеты мелі галоўнае значэнне?..

Захапіўшыся, Максім прыцягнуў ноўтбук і тут жа паказаў ёй гістарычную праграму пра 1962 год на Кубе. Соня сама сабе дзівілася: боегалоўкі нейкія лётаюць, самалёты выбухаюць — а не адарвацца. У сваю чаргу Соня расказала, што ейная мама нарадзілася ў Чэхаславаччыне, бо там служыў дзядуля Ягор, афіцэр артылерыі. Яны адразу ж загрузілі фільм пра 1968 год у Празе. А потым панеслася: пераходзячы па спасылках, глядзелі гістарычныя перадачы: і пра Берлінскі мур у выніку паглядзелі, і пра вайну ў В'етнаме, і нават пра забойства Кенэдзі. Усё па-англійску, ясная рэч.

Сядзелі амаль да ранку. Нават мама Юля, ускрай лаяльная да іхніх супольных заняткаў, некалькі разоў падымалася і спрабавала загнаць спаць.

Найцяжэй было ў суботу — у дзень, прызначаны для англійскай мовы. Калі паўтаралі граматыку і лексіку, Соня сяк-так, падглядаючы ў слоўнікі ды канспекты, давала рады, але падчас апошняга практыкавання — скласці тэкст на зададзеную тэму — расплакалася.

Статкевіч, які перад гэтым накрычаў на яе, зніякавеў і не ведаў, што рабіць. Сядзеў і чакаў, пакуль яна сама супакоіцца.

— Проста мне сорамна, што я такі адстой, — усхліпвала Соня. — Нават твой малы англійскую мову лепш ведае.

— А, кабачок? — захіхікаў Статкевіч. — Так, гэта было незабыўна. Але наконт Вадзіка ну ўвогуле не заганяйся. Для яго англійская — фактычна родная. Ён жа нарадзіўся ў Лондане.

— Праўда?..

— Праўда. Зрэшты, праўда і тое, што табе насамрэч варта павучыцца ў Вадзіка. Нават я ў яго вучыўся.

— Гэта як?

— Калі Вадзіку было два з паловай, ён ужо балбатаў напоўніцу. У Лондане яго здалі ў яселькі. І малы сутыкнуўся

з тым, што яго ніхто не разумее. Падумаў ён, падумаў і стаў усіх: выхавальніц, нянечак, дзетак у групе — вучыць сваёй мове. «Аўсянка», «суп», «цацка», «гуляць» — праз месяц у яго і брытанцы, і індусы, і кенійцы хадзілі як па струнцы. Але тут мы пераехалі ў іншы раён, і яго аддалі ў новы дзіцячы садок. Прыходзяць яго забіраць — а ён сядзіць і раве: столькі намаганняў, а яго зноўку ніхто не разумее, — аж свяціўся, згадваючы Статкевіч. — І тады ён скеміў, што будзе прасцей самому навучыцца размаўляць па-англійску. І з таго дня размаўляў. У першы дзень ён ведаў тры словы — і размаўляў трыма словамі. У другі — шэсць, і размаўляў як мог. Праз паўгода балбатаў лепш за Гары Потэра. Але тут мы ў Мінск пераехалі. Цяпер, мусіць, забыў палову без асяроддзя.

— Дарэчы, усё баялася спытацца. А колькі дакладна гадоў Вадзіку?

Максім захіхікаў:

— Шмат хто пытаецца. «Па пашпарце» яму шэсць з паловай. Налета ў траўні сем споўніцца. Але людзі блытаюцца, думаюць, што чатыры-пяць, бо ён, хоць крэпенькі, але нізенькі — у тату пайшоў. І хоць мазгамі развіты на ўсе восем, без задушэўных гутарак, якіх з малазнаёмымі ён не пачынае, гэтага не відаць. А ў паводзінах ён яшчэ зусім дзетсадавец. А што паробіш? Мы хоць браты ад тых самых бацькоў, па-рознаму выхоўваліся. Я ў правінцыйнай беларускай сям'і, з «драўлянымі цацкамі, прыбітымі да падлогі», з дзедам і бабуляй старой загартоўкі. Вадзік прыйшоў у сям'ю англійскіх алігархаў, на ўсё гатовае. Яму ні ў чым не адмаўляюць. Мама, калі ў Мінск пераехалі, вельмі баялася, што яго — такога завумнага інфантыла — будуць цкаваць у простай школе. І аддала ў гэтую наварочаную гімназію з эксперыментальнымі методыкамі ды індывідуальным падыходам. Не ведаю... Не бачу, што яму гэта на карысць. Зрэшты, можа, проста мы зусім розныя. Ведаеш, Вадзік, як толькі друкаванымі

літарамі пісаць навучыўся, стаў «сачыняць кнігі». Пры тым што прымусіць яго пачытаць нейкую на ягоны век літаратуру амаль немагчыма. «Чукча не чытач, чукча пісьменнік» — анекдот пра нашага Вадзіка.

Максім, здавалася, мог цэлую гадзіну гаварыць пра брата, але раптам схамянуўся. Ён нахіліўся да працоўнага століка і ўзяў Сонін сшытак.

— Твая праблема ў тым, што ты спрабуеш перакласці на англійскую мову свае думкі, сказаць усё, што ты ведаеш па тэме, у свае шаснаццаць. А табе проста трэба прызнаць, што ты ў англійскай мове — пяцігадовае дзіця. І гаварыць, як такое дзіця. І тады ўсё складзецца і памылак будзе меней. Бо ў простым сказе цяжэй наламаць дроў. Так ты зможаш усвядоміць свой узровень і пачаць расці — праз тыдзень станеш шасцігадовым дзіцём... І ў гэтым няма нічога ганебнага. Вось, тэма «My room»*. Сядзь і апішы, як умееш...

Статкевіч быў прыроджаным настаўнікам. Нельга было не прызнаць гэтага.

Соня так замучылася, што ў аўторак вырашыла сачкануць вытворчую практыку. Узнялася пасля дзявятай — лічы, выспалася. Тут жа пацягнулася ўніз па каву — трэба было займацца.

На кухні яе чакала засада ў асобе мамы Юлі.

Сустрэчы з Максімавай маці сам-насам яна ўдала ўнікала амаль тыдзень з мінулай серады, калі тая пабачыла застаўку на ейным мабільным.

— Адзін кубак — і вельмі слабую, — скамандавала мама Юля. Яшчэ каваманамі станеце з гэтай вучобай. Зусім павар'яцелі.

— Даруйце, праз мяне і Максім не высыпаецца, — сказала Соня.

— Ды што ты, Соня! Наадварот — я радая, што ён табе дапамагае... Усё ніяк не магу табе сказаць, што вы цудоўна

* Мой пакой *(англ.)*.

глядзіцеся разам, — мама Юля сядзела за сталом насупраць Соні, назіраючы, як тая снедае.

— Не, мама Юля, вы ўсё не так зразумелі... Паміж намі зусім нічога няма. Мы нават не сябруем...

— Але ж табе падабаецца мой Максім, — лісліва прамовіла кабета. — Я правільна зразумела?

— Гэта было даўно і няпраўда!

— Не адкручвайся, Соня! Я ж усё бачу... Паслухай, — нахілілася яна да дзяўчыны і перайшла на шэпт, хоць ніхто не мог іх падслухаць. — Характар у Максіка, вядома, не падарунак. Але хлопец ён цудоўны. Я думаю, табе варта за яго пазмагацца.

— Што вы такое кажаце?

— Праўда-праўда. Ты — у ягоным гусце. Гэта я як ягоная маці табе кажу. І вы — пара. Я гэта адразу зразумела, як толькі вас з ім пабачыла. Так што смялей, Соф'я. Я — у тваёй камандзе...

«God willing, that goal will be achieved. Thank you and good night»*.

Гэтую прамову немагчыма вывучыць! Але ладна, колькі паспее. Статкевіч у любым выпадку будзе злавацца.

x x x

— Усё, гатова! — Соня адклала апошні аркуш.

Яна без перапынку пісала пяць спробных тэстаў чатыры гадзіны. Максім склаў іх для яе, пакорпаўшыся ў падручніках ды інтэрнэце. Нават на тэніс не пайшоў. Заўтра — дзень ікс. Соня здала апошні тэст Статкевічу на праверку, а сама выйшла з пакоя. Адкрыўшы шкляныя дзверы, выбралася на ажурны гаўбец — падыхаць свежым паветрам. Наастачу яны яшчэ дамовіліся разабраць яе памылкі ў тэстах. Ну ўсё, мусіць, праверыў. Халодна тут стаяць.

* Дасць Бог, гэтая мэта будзе дасягнутая. Дзякуй і дабранач *(англ.)*.

Вярнуўшыся ў пакой, яна пабачыла, што Максім спіць за драўляным столікам, паклаўшы галаву на рукі. Ёй зноў стала няёмка. Зусім замарыла хлопца. А яму ж таксама заўтра пісаць тэсты!

Які ж ён прыгожы, калі спіць! Цяпер гэта проста прывабны хлопец. Не зазнайка і сноб, не геній і супермен... Ці праўду сказала мама Юля, што яна, Соня Сінічка, можа падабацца Максіму Статкевічу?..

...Мама Юля ўвайшла ў пакой, несучы талерку з канапкамі. Абодва ейныя дзеці (а Соню яна ўжо лічыла сваім дзіцём) мірна спалі за столікам адно насупраць аднаго, кранальна стуліўшы галовы. Паміж імі ляжаў аркуш, на якім была абведзеная лічба: 325. «Які цуд!» — расчулена прашаптала кабета і хуценька выйшла...

x x x

Ранкам наступнага дня ў доме Статкевічаў панавала ўрачыстае напружанне. Нават Сонін тата ўзняўся раней, каб пажадаць дачцэ ўдачы.

Усе ведалі: Соня ідзе здаваць супертэст. Максім, які таксама ішоў яго здаваць, чамусьці нікога не цікавіў.

— Трымайся, дзяўчыначка мая, — абняла мама Юля Соню. — Вось, амулет на ўдачу, — яна працягнула ёй невялічкі канверцік. Раскрыеш, калі ўсё напішаш!

Па дарозе праз казачны лес Максім паўтараў з Соняй няправільныя дзеясловы англійскай мовы. Нават гэтыя хвіліны яны выкарыстоўвалі для вучобы.

На ўзлеску Статкевіч спыніўся і замаўчаў. Адсюль, па дамоўленасці, яны ішлі асобна. Соня адчувала, што мусіць нешта сказаць.

— Дзякуй табе, — нарэшце вымавіла яна. — У любым выпадку дзякуй.

— А табе — удачы, — кінуў ён цераз плячо і збег па схіле.

х х х

Для тэстаў дзявятыя-адзінаццатыя класы рассадзілі па кабінетах на трэцім і чацвёртым паверсе. Да кожнага класа прыставілі настаўніка-наглядчыка — прычым стараліся, каб той не быў знаёмы з вучнямі. Некалькі настаўнікаў дзяжурылі на калідорах. Першай здавалі матэматыку, потым — інгліш, фізіку, русбел і, нарэшце, гісторыю. Па ўроку на тэст, але дазвалялася пісаць на перапынку, да званка на наступны ўрок.

«Дэшкі» былі яўна не ў захапленні ад неабходнасці столькі думаць цягам аднаго дня. У класе панавала шушуканне і пераміргванне, і наглядчыца — матэматыца малодшых класаў — штохвіліны сканфіскоўвала шпаргалкі.

Затое ў Соні адкрылася другое дыханне. Яна радасна ўскрыкнула, пабачыўшы матэматыку ды фізіку: амаль усё яна разбірала са Статкевічам. На аўтамаце зрабіла інгліш, рускую/беларускую мовы. Так распісалася, што з паловы на дзявятую ўздымалася з-за парты, толькі каб папрастаць ногі. А калі прыйшла чарга гісторыі, Соня вачам сваім не паверыла: «Якія важныя падзеі адбываліся ў свеце ў 1962 годзе?», «Назавіце прычыны ўзвядзення Берлінскага муру»...

— «Ашкі» ў суседнім кабінеце зубарацъ што дурныя. Падручнікамі абклаліся, — далажылі Галя са Снежкай, схадзіўшы на перапынак. — І толькі твайму Статкевічу хоць бы хны. Сядзіць, часопіс чытае.

— Ніякі ён не мой, — абрубіла сяброўак Соня, а самой аж цёпла стала. Значыць, ён тут, за сценкай...

Калі празвінеў званок з пятага ўрока, да Соні падляцеў Вася.

— Сініца, харэ пісаць! Здавай хутчэй — затусім у макдоне!

— Чакай, я яшчэ не ўсё!

— Ды колькі можна страчыць? Чатыры старонкі ўжо дробным почыркам. Усё, яна здае! — і вырваўшы ў Соні тэст, аднёс яго на настаўніцкі стол.

— Ты хворы? Я не дапісала!!! — зараўла Соня. — Што ты нарабіў?

— Перш папрацуй, пасля — патанцуй! — павучальна прамовіў Вася, згроб Соніны асадкі ў ейны ж заплечнік, закінуў яго сабе на спіну, падхапіў Соню на рукі і вынес з кабінета.

— Адпусці мяне, каму я сказала! — верашчала Соня, але магутныя Васевы абдоймы не дазвалялі ёй вырвацца.

З суседняга кабінета выходзіў Максім у кампаніі акулярыстага бландзіна.

— Глядзі, Макс, — дык гэта ўсё-ткі ейны бойфрэнд? Ну, той дзяўчыны? — пачула за спінай Соня.

— Табе справа да плебсу? — грэбліва адказаў Статкевіч.

— Адчапіся, ідыёт! Нікуды я з табой не пайду, бо ты запароў мне кантрольную! Я дадому — спаць!

Соня хуценька саскочыла на падлогу, але на калідоры ўжо было пуста.

x x x

Гэтым разам Вася не спрабаваў праводзіць Соню дадому легальна. Ён вырашыў незаўважна прасачыць за ёю. І правільна зрабіў. Соня, пабачыўшы, што няма чаго хавацца, пайшла пешкі. Прайшла ўніверсам, будоўлю, абмінула лес і выйшла да вадасховішча. Вася асцярожна шыбаваў следам па ўзлеску. Але Соня, відаць, надта стамілася, каб заўважыць пераследніка. Калі праз нейкі час дзяўчына выйшла на шырокую паляну, атачаную шыкоўнымі маёнткамі, ён ужо не мог ісці за ёю. І толькі здалёк яму ўдалося пабачыць, як яна падышла да аднаго з дамоў і адкрыла ключамі веснічкі.

x x x

— Вывесілі! Вынікі тэстаў вывесілі!!!

Адбылося гэта ў чацвер пасля трэцяга ўрока. Усе старэйшыя класы навыперадкі сыпанулі ў вестыбюль, да запаветнага слупа, які густа аблеплівала скотчам намесніца дырэктара. Топ-45 для трох паралелей раздрукавалі буйным шрыфтам, па 15 прозвішчаў на аркушы і вывесілі на слуп трыма белымі кілбасамі.

Соня таксама пайшла. Праўду кажучы, яна ні на што не спадзявалася. Калі эйфарыя мінула, яна зразумела, што нарабіла ва ўсіх пяці тэстах процьму памылак.

Адзінае, пра што яна цяпер хвалявалася, — вынік Статкевіча. Як ён даў рады пасля такога недасыпу?

Хвалявалася яна, аднак, дарма. Падышоўшы да калоны, яна пабачыла па-над галовамі вучняў першыя радкі спіса:

*ВЫНІКІ ТЭСТАЎ (11 КЛАС)*
*1. Максім Статкевіч — 11 «А» — 498 балаў.*

Як заўсёды, з адрывам балаў пяцьдзясят ад другога месца. Камень з душы зваліўся.

У гэты момант у вестыбюлі з'явіўся Максім. Не падыходзіць да яго ў школе, не падыходзіць да яго ў школе... Але, можа, сёння яна мае права павіншаваць яго?

Так падумала Соня, але адышлася пад лесвіцу, ад граху падалей.

— Статкевіч, што ты тут забыў? Чаго ты яшчэ пра сябе не ведаеш?

Але «кароль школы» паводзіўся неяк не па-манаршы. Ён паспрабаваў уплішчыцца ў натоўп, які густа абляпіў слуп з вынікамі.

— Табе што, адсюль не бачна? Чатырыста дзевяноста восем!

— Каланіцкі, прысядзь! — раптам скамандаваў Статкевіч.

Каланіцкі здзіўлена загігікаў, але паслухаўся.

— Ніжэй, яшчэ крыху... А ты, Канькова, адыдзіся ўправа. Так... Можаш уставаць, Каланіцкі.

Невядома, ці хто заўважыў гэта, але твар Максіма Статкевіча на момант кранула шчырая ўсмешка.

Ён азірнуўся і раптам сустрэўся позіркамі з Соняй. Вачыма паказаў ёй на бакавы выхад з вестыбюля.

Соня тут жа пабегла туды.

За дзвярыма ў вузкім калідорчыку размяшчаліся кабінет псіхолага, каморкі аканома, бухгалтара і выхад на пажарную лесвіцу. Паколькі ўся школа сабралася ў вестыбюлі, тут было пуста.

— Віншую! — сказала Соня Максіму, калі той падышоў. — Ты зноў лепшы за ўсіх! Радая за цябе!

— Толькі за мяне? А сябе ты не хочаш павіншаваць?

— У сэнсе?

Максім кіўнуў галавой у бок слупа.

Соня кінулася туды з усіх ног. Прабілася да спіса, з’ехала па ім вачыма і нарэшце, у самым нізе, нахіліўшыся, прачытала:

*45. Соф’я Сінічка — 11 «Д» — 343 балы.*

— А-а-а-а! Я ў спісе! — заенчыла Соня на ўсю школу. — Я ў спісе!!!

Калі, сама не свая ад радасці, яна вылецела ў калідорчык, Статкевіч працягнуў ёй руку.

— Дзякуй табе, Максім! Дзякуй! Калі б не ты... — яна горача сціснула яго правіцу ў сваіх далонях.

— Ты з дубу ляснула? — Максім абурана вырваў руку. — Фотку давай.

— А, так... Вядома, — Соня агаломшана выцягнула з кішэні здымак «сняжынкі» і перадала яго Максіму.

— Не размаўляй са мной у школе! — рыкнуў Статкевіч і знік на пажарнай лесвіцы.

45 - 1 = 44. Гэта адлегласць паміж Максімам Статкевічам і Соняй Сінічкай. Аднак няхай іх прамыя па-ранейшаму паралельныя, цяпер яны прынамсі ляжаць у адной плашчыні.

Раздзел VI

# У СКУРЫ БАТАНІКА

— Глядзіце, вунь Соня Сінічка з «Д» класа!

— Учора яна трапіла ў спіс найлепшых вучняў школы!

— Выходзіць, «дэшкі» не такія тупыя?

— А яна сімпатычная!

Роўна два тыдні прайшло з той чорнай пятніцы, калі Соня наважылася ўручыць ліст з прызнаннем Максіму Статкевічу, — і вось пра яе зноў загаварылі. Толькі гэтым разам у шушуканні на калідорах пераважалі не злыя кпіны, а павага і захапленне. Гэта была ненармальная школа, дзе твой статус наўпрост залежаў ад сярэдняга бала ў чвэрці.

Упершыню ў жыцці Соня атрымлівала столькі кампліментаў. Аказваецца, быць батанічкай не так і адстойна.

Калі яна зранку ўвайшла на хімію, клас сустрэў яе авацыямі. І гэта пры тым, што яшчэ ў чацвер з Васевай ініцыятывы хлопцы хвілін пяць яе падкідалі, а потым пасадзілі на крэсла і хацелі так пранесці па калідоры. «Кожны тэст Соні Сінічкі праверылі чатыры розныя настаўнікі, — абвясціла на ўроку матэматыца, — спісванне выключаецца». Трэба думаць, яна расказала гэта ўсім астатнім паралелям — калі Соня спусцілася на фізру, «гэшкі» сустрэлі яе засяроджаным маўчаннем. Ніхто з «Г» класа сёлета ў топ-45 не прабіўся.

Перад гісторыяй Соню знайшла Ніначка.

— Дзякуй табе, Сінічка, — сказала яна сваім заўсёдным пакрыўджана-абураным тонам. — Праз твой нечалавечы рывок дырэктар не толькі адкамандзіраваў мяне везці адзінаццатыя класы ў Кіеў, але і павесіў на мяне ўсю арганізацыю паездкі! А яна ўжо праз тыдзень! На грамадскіх пачатках, Сінічка! Толькі гэтага мне не хапала! З кім я на два дні пакіну ўласных дзяцей? Ты пра гэта падумала?!!

Пахваліць, падбадзёрыць, натхніць на новыя поспехі — усяго гэтага сярод Ніначкіных педагагічных прыёмаў не значылася. Так што гэтую яе эскападу можна было лічыць афіцыйным прызнаннем Соніных заслуг. Цяжка было не заўважыць, у якую эйфарыю прывёў Ніначку поспех адной з вучаніц — той, ад якой ужо ніколі нічога талковага не чакалі.

— І праўда! Ты ж паедзеш на экскурсію з усімі гэтымі зазнайкамі! — аж падскочыла Снежка, калі Ніначка развярнулася і зацокала ад іх абцасікамі па калідоры. Ужо вывесілі на дошцы аб’яў. Дзявятыя класы — Піцер, дзясятыя — Львоў, адзінаццатыя — Кіеў!

— Вы чулі? У сталоўцы нехта пажартаваў: «Сінічка — гэта Статкевіч 11 „Д“ класа», — дагнала дзяўчат запыханая Галя. — Соня, я думаю, гэта трыумф!

Максім! Ізноў школьныя зубаскалы спалучаюць іхнія імёны. Але новы кантэкст падабаўся Соні значна больш.

Але галоўнае — вельмі хутка яна паедзе з ім у Кіеў.

Дзяўчаты ўжо рассаджваліся за партамі перад урокам.

— Сініца, дай перапішу, што па інглішы задавалі — папрасіла Галя. — Ты ж у нас цяпер батанік. Яўна ўсё канспектуеш — не тое што я.

Перш чым Соня кіўнула галавой на знак згоды, Вайтовіч цапнула са стала ейны дзённік. Адтульываліўся канверцік.

— Што гэта? «Соні — амулет на ўдачу. Адкрыць, калі абвесцяць вынікі тэстаў», — прачытала Снежка, падняўшы канверцік з падлогі.

— А, гэта... Мне далі... Я і забыла зусім... — рассеяна адказала Соня.

— Ну, вынікі абвясцілі, значыць, можна адкрыць, — сказала Снежка і спрытна разарвала лінейкай край канверціка.

Адтуль вывалілася паперка. Снежка і Галя з цікаўнасцю ўперыліся ў яе і раптам перамяніліся ў твары.

— Соня? Гэта што?!!

Але зірнуць на паперку Соня не паспела. У кабінет рашуча ўвайшоў Васілеўскі.

У яго быў такі спакойны твар, што зрабілася нават страшна. Зноў адпрасіўся з рынку. Халодны як мярцвяк, ён з парога пасунуўся да Сінічкінай парты.

— Сініца, я ўсю ноч не спаў. Зараз жа выкладай, што за вафлі. Што за дом на Цнянцы, у якім ты жывеш? Чаму ты нам хлусіш? Навошта шыфруешся? Скажы, яны мучаць цябе?

Вочы ў Снежкі і Галі, і так да краёў поўныя шокам, цяпер сталі зусім па пяць капеек. Снежка бязгучна працягнула Васю змесціва канверта.

Вася акінуў вокам паперку — і ўвесь ягоны спакой як цяля языком злізала:

— Сініца?! Што гэта?! Як ты магла так са мною?!! — заскавытаў ён.

Соня ўрэшце выхапіла загадкавую паперку, перагарнула яе і закрычала з перапуду.

Гэта быў фотаздымак, раздрукаваны на каляровым прынтары. Яна і Максім спалі, як тыя анёлкі, паклаўшыся з двух бакоў на стол, у атачэнні падручнікаў. Фатограф яшчэ ўпрыгожыў здымак, дадаўшы ў спецыяльнай праграме рамачку з чырвоных сэрцаў.

Божа, які жах! Што цяпер будзе?

Зацікаўлены «Д» клас тут жа згрувасціўся ў Соні за спінай. Фотку вырвалі ў яе з рук, і яна пайшла гуляць па класе.

— Ну проста галубкі!!!

— Сінічка, як гэта тлумачыць?

— Ты што, сустракаешся са Статкевічам?

У гэты момант дзверы кабінета расчыніліся. На парозе стаяў Максім з перакошаным ад злосці тварам. У ягонай руцэ быў ружовы смартфон.

— Сінічка, на хвілінаачку!

— Максі-і-ім! Аддай! Свайго няма — нефіг чужыя хапаць! — пачулася з калідора. За спінай Статкевіча намалявалася мажная паненка з фарбаванымі ў руды колер кудзерамі, сабранымі ў, наколькі тое было мажліва, строгі пучок. На ёй быў дарагі цвідавы строй у краткі, які шчыльна абцягваў фігуру. Давяршалі вобраз чорныя «офісныя» пантофлі на невысокім тоўстым абцасе.

Гэта была Ліза Паўзункова — стараста 11 «А». Губкі яна склала ў манерны банцік, які сімвалізаваў скрайнюю ступень абурэння. Аднак няўзброеным вокам было відаць, што пасяганне Статкевіча на ейны мабільны сталася захапляльным здарэннем у асабістым жыцці Паўзунковай.

Хлопцы скруцілі Васю яшчэ да таго, як Статкевіч пераступіў парог кабінета. Але Вася і не думаў вырывацца, а толькі цяжка дыхаў, з нянавісцю паглядаючы на саперніка.

— Чаго зноўку прыйшоў? Сам жа казаў, не размаўляй са мной, а то чуткі папаўзуць, — ціха сказала Соня, падышоўшы да дзвярэй.

— Чуткі? Ды яны ўжо ўваўсю поўзаюць! — прагрымеў Статкевіч. Ён сунуў дзяўчыне пад нос экранчык смартфона, на якім свяцілася тая самая фотка, якую Снежка толькі што выцягнула з канверта. «Дэшкі» проста фізічна не маглі паспець заліць яе ў сеціва.

— Я сапраўды не ведаю, адкуль гэта. Клянуся, я тут ні пры чым! — пачала апраўдвацца Соня.

— Ні пры чым?!! Уся школа ўжо гадзіну перапошчвае гэта з тваёй старонкі!

Соня схапілася за свой мабільнік. Інтэрнэт у яе працаваў глючна, але на белмове тэлефон вібраваў ад эсэмэсак.

— Гэта не я! — тыцнула яна пальцам у апавяшчэнне «кантакціка». Гэта нехта запосціў на маёй сцяне! Нейкая... Юля Арцёмава! Я не ведаю, хто гэта! — ледзь не плакала Сінічка.

— Арцёмава? Юля, кажаш? — Статкевіч умомант асадзіў назад. — Усё ясна... Ты задзяўбала мяне за гэтыя два тыдні! — ізноў падвысіў ён голас. — Адны непрыемнасці ад цябе! — і, сунуўшы тэлефон у рукі яго законнай уладальніцы, развярнуўся і выйшаў.

— Соня, ты патлумачыш, што адбываецца, ці як? — пагрозліва спыталася Галя. — Чаму вы разам на фотцы і чаму Статкевіч узяў моду ўвальвацца ў наш клас як дадому?

— Так, вельмі хацелася б ведаць, — азвалася Паўзункова. Яна таксама была ўвайшоўшы ў кабінет, але спынілася адразу пры ўваходзе, збоку ад дошкі, так, нібы перад ёй прасціралася атрутнае мора.

— А, Ліза-Падліза!

— Якія людзі — і без аховы!

— Заходзь, не страмайся, госцяй будзеш!

Ліза Паўзункова заўсёды вучылася ў «А» класе. Толькі калісьці ён быў самым звычайным. Многія яе былыя аднакласнікі — у тым ліку Галя са Снежкай — цяпер былі вучнямі класа «Д». Калі абвясцілі набор у англійскі спецклас, бацькі Паўзунковай мабілізаваліся і нанялі сваёй пасрэднай дачушцы плойму рэпетытараў. Тая зубарыла дзень і ноч і ў выніку паступіла. І з таго часу з былымі сябрамі нават не віталася. Менавіта Паўзункова, як чула Соня, была галоўным ідэолагам «ашкінай» элітарнасці.

— Вось яшчэ. Я тут пастаю. А раптам дэбілізм заразны, — паморшчылася Паўзункова.

— Народ! Усё зусім не так, як вы сабе ўяўляеце, — нясмела пачала Сінічка. — Я зараз усё патлумачу...

x x x

— Сядайце, калі ласка, — сказаў гісторык пасля таго, як «Д» клас, які не адразу заўважыў ягоную прысутнасць, пашыхтаваўся каля партаў. — Пачну з топ-ньюз. Вынікі тэстаў у вашым класе мяне станоўча шакавалі. Гаворка, вядома ж, пра Сінічку. Ты мяне парадавала, Соня. Я б табе толькі за цытату з прамовы Кенэдзі сто балаў паставіў! І як табе ўдалося?

— А яна жыве з Максімам Статкевічам!

— Іхнія бацькі сябруюць!

— Яе тата папрасіў генія з ёй пазаймацца!

— І ўвогуле, яны спяць разам!

— Сродкі, вядома, пікантныя, але вынік уражвае. Сёння на ўроку мы падрабязна разбяром усе пункты тэста. Сінічка, рыхтуйся на пятае пытанне. Паўторыш свой каронны нумар з Карыбскім крызісам...

x x x

— Шу-шу-шу... Шу-шу-шу...

На вайне як на вайне, у школе — як у школе. Зранку ты кароль гары, але вось апошні званок — і ты па-ранейшаму запісны блазан.

— Вядома ж, дзе ёй самой... З такімі мазгамі... Статкевіч сядзеў з ёй удзень і ўночы.

— Што, за так?

— Ды дзе там! Яму за рэпетытарства заплацілі...

— Відаць, шмат заплацілі. Я б і за сто баксаў на дзень не пагадзілася!

— Бедны хлопец! Столькі недасыпаў — і ўсё праз гэтую дурніцу!..

Што ведала Ліза Паўзункова, ведала ўся паралель. І нават болей. «Бізнес-лэдзі» Паўзункова была генератарам школь-

ных плётак. Соня спускалася ў гардэроб, не гледзячы па баках і ўпарта абнаўляючы старонку ў браўзеры мабільніка. Нарэшце, калі яна ўжо забірала паліто, браўзер злітаваўся з яе і выдаў жаданае.

На экранчыку раскрыўся профіль Юлі Арцёмавай. Аніякай інфармацыі, толькі дата нараджэння — 31 ліпеня. Абсалютна пусты, нібы створаны спецыяльна, каб скампраметаваць яе і Максіма. Соня ўглядзелася ў фота карыстальніка. Яно было зробленае ў стылі «фотарасчлянёнкі» — калі на юзэрпік выстаўляўся не твар цалкам, а нейкая яго частка. Як яна раней не здагадалася... На Соню, не міргаючы, глядзела прыгожае цёмнае вока мамы Юлі.

x x x

— Усё больш чым цнатліва, — вынесла канчатковы вердыкт Снежка, кідаючы на столік злашчасную фотку. — Гэтым разам, Сініца, мы табе, так і быць, паверым.

Адданая чытачка ўсіх дамскіх інтэрнэт-парталаў, якія толькі былі ёй даступныя, Снежка лічылася ў іх кампаніі эксперткай па міжполавых зносінах. Адразу пасля ўрокаў дзяўчаты заселі з марозівам у «Макдоналдсе» ў сябе на раёне. Было б наіўна меркаваць, што пасля таго, як столькі ўсяго таемнага сталася яўным, сяброўкі дазволяць Соні ўцячы, не ўзнагародзіўшы іх цікавымі дэталямі.

А Соня была нават радая такому павароту. Пасля двух тыдняў таямніц і недамовак яна нарэшце магла падзяліцца ўсім, што прыгнятала яе апошнім часам.

— Дык значыць, гэта падстроіла ягоная мама? Ну нішто сабе!

— Яна праўда хоча, каб ты сустракалася з яе Максімам?

— Ну, яна так сказала: «Я ў тваёй камандзе, Соня». Вось толькі Статкевічу гэта яўна не будзе даспадобы. Страшна падумаць, што ён цяпер выкіне, пасля гэтай фоткі.

І Соня пераказала сяброўкам, колькі здзекаў ёй давялося вытрываць ад нечаканага суседа. І гэта, лічы, на роўным месцы.

— Раней ён мяне проста ігнараваў, а цяпер... Да чаго гэта халодны і калючы чалавек, вы б толькі ведалі...

— Але, Сініца, калі раней усё было вельмі сумна, то цяпер, я сказала б, ты маеш сур'ёзны шанц на ўзаемнасць, — аўтарытэтна заявіла Снежка.

— Што ты! Усё яшчэ горш, чым было, пакуль я была ніхто. Дый увогуле, нешта не надта мне ўсміхаецца карыстацца такім шанцам.

— Ды ладна! Нас хоць не падманвай! Ты ў яго яшчэ сур'ёзней уцюхалася. Бачыла б ты сябе збоку...

— Вош што, Шыніца. Буджэм лічыч, што гэта лёш, — прамовіла Галя, дажоўваючы шакаладны кексік. — Мара плыве табе проста ў рукі. Не факт, вядома, што ўсё складзецца, як ты захочаш, але паспрабаваць варта.

— Інакш усё жыццё шкадаваць будзеш, — строга дадала Снежка.

— Ладна, што мы ўсё пра бздуры... У вас што, праўда агульная купальня?

— Сініца, давай інтымныя падрабязнасці... Ты ж ужо яўна бачыла генія ўва ўсёй красе? Ну, аголены торс там, цягліцы?

— Ну не, што вы... — пачырванела Сінічка. — Але так і быць, сёе-тое я вам раскажу. Толькі прысягніце, што — нікому. Іначай гэты параноік нашаму класу шатню падпаліць. Я сур'ёзна.

Дзяўчаты прысягнулі.

— Ну то слухайце... Максім... сам прасуе сабе кашулі!

— А-а-а-а!!!

— Ты гоніш!!!

— Сур'ёзна. У іх ёсць такі гаспадарчы пакой, і вось аднойчы я туды зайшла...

— Божухна, як гэта сімпатычна!

— Называй рэчы сваімі імёнамі, Снеж. Гэта папросту э-ра-тыч-на!

Дзіўныя істоты гэтыя беларускія дзяўчаты. Як мала ім трэба для радасці. Але пазітыўным было, несумненна, тое, што ці не ўпершыню за два тыдні Соня Сінічка бесклапотна смяялася.

Раздзел VII

# ЛОГАВІШЧА ЗВЕРА

— Тссс... Сюды! Тут не зачынена.

Вася крануў рукой веснічкі «лялечнага дома».

— Вы як хочаце, а я не пайду, — гучна прашаптала Снежка. Яны з Галяй сядзелі на кукішках за старэнькай «таётай» Сінічак. — Мы і так выглядаем як ідыёты. Тут жа голае поле! Усе гэтыя багачы навокал могуць пабачыць нас з вокнаў і выклікаць міліцыю. Ці якую ахову. У іх жа тут ува ўсіх прыватная ахова!

— Спакуха, Кавалёва. Мы проста пераканаемся, што з Сініцай усё ў парадку, і тут жа звалім.

Апошнія содні Васілеўскі правёў у засадзе, цікуючы за катэджам Статкевічаў. Вывучыў усе хады і выхады і цяпер, позняй нядзельнай раніцай, прывёў дзяўчат у логавішча звера. Праўда аб новай прапісцы Соні, якая адкрылася ў пятніцу, не толькі не пахіснула ягоных падазрэнняў што да рабства, у якім нібыта трымаюць Сінічку, але яшчэ больш іх умацавала. Хто-хто, а Максім Статкевіч цалкам адпавядаў Васевым уяўленням пра гнюснага эксплуататара.

— Вася, мы пайшлі з табою, проста каб адным вокам зірнуць на дом, — сказала Галя. — Сама Сініца ў госці запрашаць страмаецца, кажа, няёмка ёй. Дык вось, мы зірнулі. Цяпер можам сыходзіць.

— Вам што, нецікава, як там усё ўсярэдзіне? Я тут прыкмеціў акно, можна незаўважна зазірнуць, — спакушальна прамовіў Вася.

— Толькі нядоўга!

— Ледзь што — уцякаем.

І тройца дружна прыліпла да вузкага бакавога акенца, спрабуючы разгледзець хоць нештачка ў шчыліны жалюзі...

x x x

— І вось адчыняюцца дзверы — шух адзін. Праз пяць хвілін — шух другая. І адразу наверх па пакоях і спаць! — смеючыся, расказвала мама Юля. — Да вечара падняць не магла... У нас цяпер цэлы тыдзень — мараторый на каву.

Кампанія дружна засмяялася.

— Рагочаш так, нібы ведаеш значэнне слова «мараторый», — ціха сказаў Статкевіч, злёгку нахіліўшыся да Соні.

З вечара пятніцы Максім не выходзіў з пакоя і не размаўляў з маці. І толькі сёння, пасля таго як з ім паўгадзіны гутарыў тата Віця, спусціўся на абед. Гэта быў не зусім звычайны нядзельны абед, бо гатавалі яго Соня і Сонін тата. Пётр Сінічка сказаў, што хоча аддзячыць Статкевічам за гасціннасць, але не было сакрэтам, што найперш адзначалі неверагодны Сонін поспех на супертэсце.

Пабачыўшы сына ў гасцёўні, мама Юля на радасцях пасадзіла іх з Соняй побач. Так, нібы яны ўжо былі парай. І гэта было яшчэ горш, чым выпадкова сустракацца позіркамі, калі ён сядзеў насупраць. Бо ўвесь абед Максім люта спаганяў з яе. Навонкі такі стрыманы і выхаваны, ён непрыкметна даводзіў Соню жарцікамі і падколкамі. Ён умеў казаць вельмі ціха, амаль ёй на вуха — так, што чула толькі яна. Была такая сацыяльная рэклама: «Рыба не паскардзіцца» — пра забруджванне вадаёмаў. Соня акурат пачувалася

такой бязмоўнай рыбай, у чый ставок хуліганы беспакарана кідалі пустыя бляшанкі і недапалкі.

— Соня, а чаму вы з Максімам вяртаецеся дадому паасобку? Вы ж вучыцеся ў адной школе, — спытаўся Пётр Сінічка.

— У мяне амаль заўсёды раней заняткі заканчваюцца, тата. Я ж у простым класе, — знайшлася дзяўчына.

— Ды ладна, Пятруха. Нашы дзеці няблага паладзілі. Узяць хоць бы гэтую падрыхтоўку да тэста. Было займальнаназіраць, як хвацка твая Соня круціць нашым Максам. Гэта скажы, таму навучы... Да яе гэтага нікому не ўдавалася.

Ну хто вас за язык цягне, тата Віця? Што зараз пачнецца...

— Слухай, Віцёк... Нешта не прыгадаю... Соня і Максім увогуле перасякаліся, калі былі маленькія?

І сапраўды. Соні таксама было вельмі цікава гэта ведаць.

— І я не прыгадваю... Такія часы былі. Сюды, туды...

Позіркі абодвух мужчын звярнуліся да мамы Юлі.

— Не, не перасякаліся, — спакойна адказала мама Юля. Ты ж, Віця, у раз'ездах быў. А я з Максікам у Полацку жыла. Ён і ў школу там пайшоў... Але я прыгадваю іншую цікавую дэталь, — хітравата прымружылася яна. — Па-мойму, у Максіма і Соні народзіны ў адзін дзень.

Што???

— Дваццаць дзявятага сакавіка. Так, Соня?

— І праўда! Мы, помню, у Варшаве з табой адзначалі разам, бо ў нас адначасова дзеці нарадзіліся! — згадаў тата Віця, і размова ўмомант скацілася да настальгіі па чаўночнай рамантыцы.

— Дзякуй табе, Сінічка, — ціха прамовіў Максім. — Я заўсёды не любіў свой дзень народзінаў. Цяпер у гэтай нелюбові з'явілася рацыянальная прычына.

Яшчэ крыху — і Соня выбухне.

— Рулька — смакоцце, — абвясціў тата Віця, накладаючы сабе другую порцыю. — Ты, Пятруха, — кухар ад бога.

Але што я сапраўды хачу пакаштаваць, дык гэта тое, што прыгатавала Соня...

Пётр Сінічка сумеўся.

— На Соні была мачанка з дранікамі, — урэшце прызнаўся ён. Але я нават на стол выстаўляць не стаў. Як прафесіянал, не магу падвяргаць вас небяспецы.

— Ну што ты, Пецinformal, — запярэчыў тата Віця. — Я перакананы, што Соня выдатна гатуе.

— Каб жа, — уздыхнуў Сінічка. — Паколькі мы жывём пад адным дахам, трымаць такое ў сакрэце доўга не выпадае. Мушу папярэдзіць: мая дачка проста безнадзейная на кухні. Як я ні стараўся... Прырода адпачыла.

— Ладна табе. З часам прыйдзе. Калі спатрэбіцца — навучыцца. Пакаштавалі б вы мой першы суп, — засмяялася мама Юля.

— Не, Юлька, ты не ўяўляеш, пра што я кажу... Ды ладна, праехалі.

— А ці не наліць нам старэйшым дзецям віна? — памяняў тэму тата Віця. — У мяне тост!

— І мне!!!

— Ты, Вадзік, пі сок... Вось, адкаркую маё любімае — італьянскае...

— Сінічка, які сорам, — нахіліўся над яе вухам Максім, пакуль разлівалі віно. — Ты, да ўсяго, яшчэ і кухарка ніякая. А гэта ж твой адзіны шанц выйсці замуж.

Падонак.

— За Максіма, Вадзіма і Соф'ю! За нашу будучыню! — абвясціў тата Віця. Соня, сама не свая ад няёмкасці, схапіла келіх і, нават не сутыкнуўшы яго з келіхамі іншых, нагбом выліла ў рот. Фу, кісляціна. Як гэта можна піць?

За сталом запанавала няёмкая ціша.

— Ну, бачу, бухаць цябе ў «Д» класе навучылі, — ціха прамовіў Статкевіч.

— Максім!!!

Гэтым разам мама Юля яго пачула.

— Чырвонае віно п'юць пакрысе, ім запіваюць ежу. Інакш можа развезці, — мякка патлумачыла яна Соні.

— Вось таму я і кажу, што культуру піцця дзецям трэба прышчэпліваць у сям'і, — павучальна сказаў тата Віця.

Пасля некаторай паўзы, падчас якой усе засяроджана жавалі, загаварыў Пётр Сінічка.

— Максім — фенаменальна разумны хлопец. Безумоўна, ідзе на медаль?

— Не, — засмяялася мама Юля.

— Як гэта «не»?

— Ты кажаш «ісці на медаль», нібы гэта нейкае паляванне. Кшталту «ісці на мядзведзя». Нібы можна збочыць і не дайсці да яго. А ў нас, уласна, з першага класа ніякай інтрыгі. Максіму зусім нескладана вучыцца. Вадзік не такі. Яму трэба пасядзець, разабрацца... Добра, што прыклад брацika добра ўплывае. З лонданскіх часоў, калі я зранку да ночы змушаная была працаваць для Віцевай кампаніі, Максім быў Вадзіку за бэбі-сітэра. З таго часу Максім у нас і бог, і цар, і герой. Усё «Максім» ды «Максім»...

— Няпраўда, мама! — раззлаваўся Вадзік. — Я вельмі разумны.

— Ну вядома, ты разумны, — палашчыла мама Юля сына па валасах. — Хто спрачаецца?

— Вам у гэтым пашанцавала, — уздыхнуў Сінічка. — Куды ты збіраешся паступаць, Максім?

— Ён яшчэ не вырашыў, але найверагодней, гэта будзе Лонданская школа эканомікі, — адказаў за сына бацька.

— Гучыць салідна.

— Гэта адзін з найлепшых універсітэтаў у свеце, калі гаворка пра ІТ-менеджмент. Мая кампанія развіваецца, і я спадзяюся, Максім працягне справу. З ягонымі здольнасцямі Макс можа атрымаць ступень «эмбіэй» ўжо праз тры гады.

— Тата, ты ж ведаеш, што адразу мяне туды ніхто не возьме.

— Не будзем загадваць. У любым выпадку, будучыня сына — ягоны выбар. Рашэнне за ім. А ў вас што з паступленнем?

— Ну, — закехкаў Пётр, — у нас яшчэ нічога не вядома. Я б таксама хацеў, каб Соня працягнула маю справу. Адзін я не зусім даю рады: і на кухні я, і ў бухгалтэрыі... Ёсць добрая спецыяльнасць у наргасе — менеджар гатэльнага і рэстараннага бізнесу. Але невядома, ці хопіць нам балаў. З вучобай у Соні не надта.

— Можа, варта наняць рэпетытараў?

— Ды я да апошняга часу не ведаў, ці мае сэнс. Дый не бачу я, каб Соня была хоць крыху матываваная на вучобу. Па шчырасці, я нават абвінавачваю іхнуюю школу. З гэтымі спецкласамі, на якія ўся ўвага... За апошнія два гады Соня зусім імпэт страціла.

— Максім паступіў у найлепшы клас, але я таксама незадаволеная са школы, — падхапіла мама Юля. Сутыкаюць дзяцей ілбамі, прымушаюць грызціся за адзнакі... Толькі вучоба ды вучоба. Нічога чалавечнага не засталося. Ну вось, свежы прыклад. Дзеці тыдзень не спалі, а потым паўдня пісалі кантрольныя! Гэта недапушчальная нагрузка! Такі стрэс! І ўсё для чаго? Вучоба — гэта не галоўнае ў жыцці...

— ...сказала найлепшая студэнтка прыкладной матэматыкі за ўсе часы факультэта.

— Была б, калі б нармальна давучылася. Але я дачасна перавялася на завочнае ў сувязі з дэкрэтам, — засмяялася мама Юля. — І зусім не шкадую.

— Мне 234-я школа падабаецца, — сказаў тата Віця. — Дырэктар праводзіць разумныя рэформы. У краінах Азіі ўся сістэма адукацыі — на прынцыпе спаборніцтва. І паглядзіце, які шалёны скачок зрабіла там эканоміка...

— Я — за тое, каб аднакласнікі былі сябрамі, а не канкурэнтамі, — запярэчыла мама Юля. — Прынамсі, мы

выхоўваліся менавіта так. Ніхто ў кампаніі не глядзеў, троечнік ты ці выдатнік. Не бачу ў кепскіх адзнаках нічога заганнага.

— Так, атмасфера ў іх школе даволі непрыемная, — пагадзіўся Сінічка. — Ты, Юлька, не ўяўляеш, якое для мяне выпрабаванне — бацькоўскія сходы. Класная кіраўніца мне пры ўсіх заяўляе: «А вам, спадар Сінічка, спадзявацца няма на што, бо ваша Соня — няздатная».

— Ты што?!

— Ага. Так і кажа. І Соні яна гэтак у твар кажа. Як тут паверыш у свае сілы, калі штодня чуеш ад настаўнікаў, што ты — тупая?

— Яна не тупая. Яна запушчаная.

Усе са здзіўленнем паглядзелі на Вадзіка.

— Так Максім кажа, — дзелавіта дадаў малы.

— Ве-е-ельмі цікава, — працягнула мама Юля. — І што яшчэ кажа Максім?

— Што Соня — чарговы мамін бзік. Што яна — няшчасце, якое звалілася нам на галаву. Што яна па вушы закахалася ў Максіма і не дае яму праходу. Што ад яе ў яго адны непрыемнасці... І што ён знойдзе спосаб пазбавіцца яе, каб мы зноў зажылі спакойна, — дадаў Вадзік, падумаўшы.

— Апошняга я не казаў, — рыкнуў на малога Максім.

— Але ж ты зробіш гэта для мяне? Ну калі ла-а-аска, Ма-а-акс! — нахабна прагундосіў хлопчык.

— Максім, я правільна зразумела? Ты ў курсе, што Соня ў цябе закаханая?

— Дык уся школа ў курсе. Яна ж мне ліст напісала.

— Ліст?!! Соня, ты напісала яму ліст? Як рамантычна! Максім, і што было ў лісце?

— Адкуль мне ведаць?

— Ты што, не прачытаў?!!

— Не, вядома. Няма чаго рабіць.

— Як ты мог, Максім?

— Не переношу дзяўчат, у якіх у галаве адны дурніцы. Лепш бы сапраўды вучылася. Усё карысней.

Гэта было занадта. Ці то віно сапраўды шыбанула ёй у галаву, але найхутчэй ад крыўды, што накапілася, Соня падскочыла на месцы і каршаком накінулася на Максіма.

— Ты, самазадаволены крэтын! З чаго ты ўзяў, што я цябе яшчэ кахаю? Так, я была дурніца, бо спрабавала прызнацца табе! Але цяпер я ведаю тваё аблічча, двудушная ты сволач! Ты ж даводзіш мяне, калі ніхто не чуе! Здзекуешся! Абражаеш! Мама Юля, ён забараніў мне падыходзіць да яго ў школе, бо саромеецца мяне!

— Максім, гэта праўда?.. Ну ці не дурань ты? Вы з Соняй створаныя адно для аднаго! Я гэта адразу зразумела, як Соня да нас прыехала. Выходжу на сходы — а мой сын трымае дзяўчыну на руках... Вы проста ідэальная пара. Глупства адмаўляць гэта.

— Што? Што вы сказалі? — не паверыла вушам Соня.

— Што вы ідэальная пара.

— Не, пра «на руках»?

— А ты што, не помніш? — уставіў слова агаломшаны Сонін тата. — Ты страціла прытомнасць, і ён падхапіў цябе. Я табе, хлопча, дагэтуль ускрай удзячны, — павярнуўся ён да Максіма.

— Я бліжэй за ўсіх стаяў, — паціснуў плячыма маладзён. — А яна ляцела галавой на кафлю, — Ці лепей было дапусціць, каб у нас у гасцёўні з'явіўся труп?

— Рэакцыя тэнісіста, — з гонарам прамовіў тата Віця.

— Ды лепш памерці, чым трываць такое! — з усяе моцы закрычала Соня, амаль плачучы. — Ненавіджу цябе! Ненавіджу!!!

Уваходныя дзверы нечакана расчыніліся.

— Сініца, я тут, Сініца! Я іду на дапамогу!!!

У гасцёўню Статкевічаў уварваўся Вася. За ім, спрабуючы спыніць шаленца, забеглі Галя і Снежка. Пабачыўшы

таварыства за сталом, усе трое замёрлі на парозе. Вася апамятаўся першым.

— Добры дзень. Дазвольце назвацца. Я — Аляксей, аднакласнік і вельмі блізкі сябар Соні. Я пачуў, што Соня крычыць, і падумаў, што гэты баклажан, — тут ён сувора зіркнуў на Максіма, — чыніць ёй крыўду. Мая місія — абараняць ад такіх, як ён, Сініцу.

— Соня, гэта што, яшчэ адзін твой кавалер? Які прыгожы хлопец! — чамусьці ўзрадавалася мама Юля. — А ты, я бачу, папулярная... А гэта твае сяброўкі?

— Э-э-э, добры дзень. Галіна.

— Сняжана.

— Што значыць кавалер? Я — жаніх, — з гонарам прамовіў Вася. — Скажыце, спадар Пётр? Так што ты, — тут ён, як быў у ботах, пасунуўся ў бок Максіма, — не распускай рукі. Можа, ты жывеш з ёй у адным доме, але замуж яна за мяне выйдзе!

— Гэта мы яшчэ паглядзім, — спакойна прамовіў Статкевіч.

Што ён сказаў???

— Што ты сказаў, баклажан? — сціснуў кулакі Вася. — Ты ж яе ненавідзіш!

— Сёння ненавіджу — заўтра кахаю. Пачуцці і ўсялякая такая чухня — непрадказальная рэч. І ўвогуле, за каго яна сама хацела б замуж? Ты як думаеш?

— Гэта што за заявачкі такія? — зніякавеў Вася.

— Ануча пад сходамі. Вытры. Усю падлогу стаптаў. Мама, тата, я на шпацыр, — сказаў Максім і, мінуўшы аслупянелых дзяўчат, выйшаў у вітальню. Бразнулі дзверы.

— Цуд які! Мой сын змагаецца за дзяўчыну! Хлопча, я не ведаю, хто ты і адкуль прыйшоў, але дзякуй табе за гэтую сцэну ў маёй гасцёўні! — звярнулася мама Юля да Васі, склаўшы рукі замочкам. — Каму дэсерт?

— Пятруха, я не зразумеў... Нашы дзеці што, пажэняцца?

Соня адчула, што яшчэ крыху — і яна непрыгожа разрыдаецца. Яна з усіх ног кінулася на сходы і знікла ў сваім пакоі.

x x x

— Хлюп, хлюп...

Соня ляжала на ложку ў абдымку з плюшавым мядзведзікам. Яна ўжо не плакала, а толькі ўсхліпвала. Мозг хатычна працаваў, асэнсоўваючы тое, што адбылося.

Адзін прыём ежы — а столькі новай інфармацыі.

Па-першае, Максім трымаў яе на руках, а яна была ў адключцы і ўсё прапусціла.

Але не гэта было самым галоўным з пачутага сёння. Галоўным было тое, што Максім не лічыць Соню тупою. Гэта было нават важней за тыя загадкавыя словы пра замуж, якія ён кінуў Васю. Дарэчы, што ён увогуле меў на ўвазе? «Сёння ненавіджу — заўтра кахаю». Няўжо гэтак ён дае Соні шанц? Спатрэбіцца толькі час, каб...

Але тут сэрца балюча кальнула. Часу, лічы, не будзе, бо Статкевічы пасылаюць сына вучыцца за мяжу. Пасля выпускнога ў чэрвені ён з'едзе ў Лондан, і іх з Соняй кантакты перапыняцца... І навошта такая надзея, калі ад яе на душы зусім пагана?

Але галоўнае — ён больш не лічыць яе тупою.

У дзверы асцярожна пастукалі. Увайшоў Сонін тата.

— Ну, як ты, золатка?

Маўчанне. Сінічка прысеў на край ложка.

— Я ж казаў, ад хлопцаў у такім веку можна чакаць усяго. Ну, што ты плачаш?

Маўчанне.

— Ты што, праўда кахаеш Максіма?

Маўчанне. Ківок.

— І даўно?

— З дзявятага класа.

Сінічка прысвіснуў. Потым прамовіў, памаўчаўшы:

— Нават не ведаю, што на гэта сказаць... Была б жывая мама... Што хлопец ён годны, яно бясспрэчна. Куды да яго гэтаму твайму Васю. Толькі я прашу, ты менш Юлю слухай. Наконт таго, што вы пара. Не варта ўпадаць у беспадстаўныя ілюзіі. Будзе цяжэй з імі развітвацца.

— Ты таксама ў мяне не верыш?

— Ну чаму? Веру. Толькі яшчэ больш я цябе люблю. І не хачу, каб ты пакутавала. Таму кажу як ёсць.

Маўчанне.

— Дарэчы, пра Васю. Патлумач яму прынагодна, што сённяшняя сцэна — гэта было непрыстойна. У чужы дом, без запрашэння... Добра, што Юлька — сама дабрыня. Дагэтуль тваіх сяброўак частуе гарбатай з торцікам. Так што годзе хлюпаць носам, вымый тварык і спускайся да іх. Дамовіліся?

Маўчанне.

— Ну, Соня?

Маўчанне. Ківок.

— Ну, вось і слаўна... Мне, на жаль, трэба ехаць. У нас на сёмую спецабслугоўванне, пяцьдзясят чалавек. Кухарка адна не дае рады. Трымайся тут. Галоўнае, не сядзі адна ў пакоі.

— Тата!

— Што, золатка?

— Паабяцай, што мы з'едзем адсюль, як толькі будзе можна.

— Ну, пакуль гэта немагчыма. Нічога не ясна з домам, з судом...

— Але тата, ты ж бачыш, што іхні сын мяне са свету зжыць хоча!

— Затое Юля на цябе нарадавацца не можа. Толькі ўчора дзякавала мне менавіта за цябе. За тое, што ты тут пасялілася. Дый мне спакайней, калі яна за табой прыглядае.

— Тата, ты абяцаеш, што мы адсюль з'едзем?

— Добра. Паглядзім.

Хлюп. Хлюп. Так плакала Соня Сінічка, у якую пакуль яшчэ не верылі, але якую ўжо не лічылі тупою.

Раздзел VIII

# ТАЯМНІЦА ДЗЯВЯТАЙ ПЛАНЕТЫ

— Соня, не спі — замерзнеш!

Быў панядзелак, канец другога ўрока, час пераходзіць з хіміі на астраномію. Але нават залівісты званок не вывеў Сінічку з самнамбулічнага стану. Гэты Сонін стан быў добра знаёмы сяброўкам і звычайна сігналізаваў пра тое, што безнадзейнае каханне да Статкевіча абвастрылася.

І як яму не абвастрыцца — пасля ўчорашняга. Дзяўчаты з разуменнем уздыхнулі.

— Соня, дом у Статкевічаў проста ўлётны, — пераміргнуўшыся з Галяй, пачала Снежка.

— Шкада толькі, твайго пакоя мы так і не пабачылі. Чаму ты не спусцілася? Мы цябе на гарбату чакалі, чакалі, — падхапіла Галя.

— Нічога, затое Вайтовіч торціка за траіх намяла, — хмыкнула Снежка.

— Не перабольшвай!

— Праўда-праўда. За сябе, цябе і Васілеўскага.

— Вася адразу пасля цябе выпарыўся. Статкевіча дагнаць вырашыў. Думалі, знойдзе — зарэжа, такі ён быў раз'юшаны. Але, здаецца, абышлося.

— Дарэчы, а дзе ён падзеўся? — спыталася Снежка. — Зноў сачкуе?

— Адпрасіўся ў сталоўцы дапамагчы. У яго мама прыхварэла, — далажыла Галя. — Так што сённяшні абед не рэкамендую. Перасоліць са злосці. Ці спаліць.

— Глядзіце, вунь Соня Сінічка з «Д» класа.

— Яна жыве разам з...

— А ну, завалілі зяпы, балаболкі!!!

— Слухай, Соня, якая ў Статкевіча крутая мама! Такая маладая і прыгожая. І простая — не мама зусім, а сяброўка! — працягнула Снежка, як толькі яны з Галяй адбілі атаку калідорных пляткарак.

— І так добра да цябе ставіцца!

— І ведаеш, яна нам... Ай!

— Ціха ты, — пхнула Снежку ў бок Галя.

— Я проста хацела сказаць, што па ходу, Сініца, мы цяпер таксама ў тваёй камандзе.

За час размовы дзяўчаты перавялі Соню ў кабінет астраноміі, рухаючы яе па школе, нібы касманаўта ў стане бязважкасці. Сінічка ўсё цаляла ўпячатацца ў сценку на паваротах калідора і пару разоў упусціла заплечнік. Як толькі адбылася паспяховая стыкоўка Соні і парты, празвінеў званок, і ў кабінет уляцела Арына Андрэеўна.

Астранаміцу ў «Д» класе вельмі любілі. Гэта была зусім маладзенькая настаўніца, якая трапіла ў школу па размеркаванні. Яна і апраналася як падлетак — усю першую чвэрць дзяжурныя класы, якія яшчэ не ведалі новую «вучылку» ў твар, прымалі яе за старшакласніцу і надзіліся разварнуць на фэйс-кантролі. Праз які, напрыклад, нельга было прайсці ў чырвоных калготках. Або ў байцы з выявай панк-гурта. Або з вялікімі алюмініевымі завушніцамі, якія няўлоўна нагадвалі лятальныя талеркі.

Арына Андрэеўна купіла 11 «Д» на першым жа ўроку ў верасні, сказаўшы, што той, каму не патрэбная дзясятка па астраноміі, можа ейнага прадмета не вучыць. Бо нельга прымусіць чалавека глядзець на зоры, калі ён сам таго не жадае.

Для тых жа, каго астраномія цікавіць як навука, па суботах яна вядзе гурток у раённым доме творчасці. Яна прытарабаніла туды свой персанальны тэлескоп, а яшчэ, пакуль цёпла, будуць выезды на пленэр, і ўвогуле будзе вельмі крута. Дзіўна, але шэсць чалавек з «Д» класа — на чале з Настай Ракавец — адразу запісаліся. І тут жа ўтварылі фан-клуб Каметы (так у школе празвалі астранаміцу). Арына Андрэеўна нават жартам называла 11 «Д» сваім спецкласам па астраноміі. Так ці іначай, ступень даверу паміж ёй і «дэшкамі» аж зашкальвала.

— Слава Юпітару, 11 «Д»! Ледзь вас дачакалася! — сказала яна, пляснуўшы па стале журналам. — Хоць маральна адпачну. 11 «А» мне сёння вынес мазгі на першым уроку. Дагэтуль не магу апамятацца. У мяне там пара фіфаў паўгадзіны гістэрылі. Вучыць яны не хочуць, бо ім «няма калі», і астраномія ім «не патрэбная»! Але дзясяткі ў чвэрці ім падавай! Бо яны, бачце, «на медаль ідуць». Ды ў мяне і так патрабаванні да вас, як да дзіцячага садка!

Камета перавяла дух і хуценька пачала крэмзаць у класным журнале, пазначаючы адсутных.

— Карацей, «Д» клас, слухайце сюды. Маю ўзаемавыгадную прапанову. Мне трэба па справах скочыць. Вось тут, — яна рэзка раскрыла палоўкі дошкі — пытанні для пятнаццаціхвіліннай выніковай працы. Лёгкая: калі ўсё напішаце, атрымаеце не менш за восем. Падручнікам можна карыстацца. Зрабілі — здалі працы Ракавец, сядзім ціха, займаемся сваімі справамі. Нехта зойдзе — я пайшла ў лабаранцкую па мапы. Журнал стараста занясе ў настаўніцкую. Адзнакі за чвэрць выстаўлю заўтра. Ясна?

І, заручыўшыся ўхвальным гулам класа, Камета выцягнула з-пад свайго стала куртачку і расчыніла акно.

Дваццаць першы кабінет на другім паверсе быў знакаміты тым, што праз перапады рэльефу яго скрайняе акно было нават бліжэй да зямлі, чым вокны першага паверха

ў іншых крылах школы. Пад дваццаць першым размяшчаўся школьны цір, ён быў пад зямлёю. Са скрайняга акна было зручна ўцякаць з урокаў проста на вуліцу. З гэтага прагалу ў сістэме адукацыі і скарысталася астранаміца.

— Зусім забылася! — Камета падцягнулася на руках, зазірнуўшы ў кабінет знадворку. Абвестка для маёй «зорнай брыгады»! Вечарам я кіну ў групу спасылку на зашыбенную дакументалку. Як я вам расказвала, не так даўно планету Плутон панізілі ў статусе ледзь не да астэроіда. У суботу на гуртку абмяркуем, як Плутон дайшоў да такога жыцця.

І нарэшце знікла.

— Сініца! Пад'ём! Давай, пішы!

— Халява ж!

— Гэй, Сініца! Ну, апошні рывок! Яшчэ пяць дзён — і вакацыі!

— Гэта ўжо ў суботу, Соня! Ты едзеш у Кіеў!

— Слухай, можа, ёй проста кавы прынесці?

x x x

Пакуль «Д» клас адносна ціха «займаецца сваімі справамі», Наста Ракавец збірае кантрольныя, скатаныя з падручніка, Галя і Снежка выслізнулі з кабінета «папудрыць носікі», а Соня бязрадна паклалася тулавам на сваю апошнюю парту каля акна, падмяўшы пад сябе атлас зорнага неба, я раскажу вам, дарагія чытачы, чаму пасля ўсяго, што адбылося за прамінулыя два тыдні, вучаніцы с/ш № 234 Соні Сінічцы варта пашукаць сабе нейкія недарагія курсы па выжыванні ў адкрытым космасе.

Прытым што, нагадаю, у адкрытым космасе ўвогуле немагчыма выжыць.

Максім Статкевіч падабаўся абсалютнай большасці дзяўчат, якія яго атачалі, і ладная частка з іх была закаханая ў яго без памяці. Такі ўжо быў закон сусветнага прыцягнення.

Што ў полацкай гімназіі, што ў міжнароднай школе Лондана — паўсюль было адно і тое ж.

І самае паганае, што праз прыгажосць і абаянне пагалоска аўтаматычна запісвала Максіма ў злосныя бабнікі. Шчодрая прырода, аднак, надзяліла хлопца яшчэ і не абы-якімі мазгамі, таму той быў цвёрда перакананы: быць бабнікам — гэта поўны адстой. І таму ўсё свядомае жыццё цураўся дзяўчат.

Тыя ж хадзілі за ім натоўпам, пераконваючы навакольных, што наш Максім — форменны казанова.

Таму, паступіўшы ў 234-ю школу, геній пачаў дзейнічаць на апярэджанне. Скарыстаўшыся пляткаркамі з «А» класа як піяр-агенцыяй, Статкевіч давёў да ўсеагульнага ведама, што ў Брытаніі ён прызвычаіўся да сапраўдных лэдзі. А сапраўдная лэдзі ніколі не будзе назаляць джэнтльмену. Навязвацца, вешацца на шыю ці неяк прыцягваць да сябе ўвагу. Бо гэта вульгарна і пошла. «Так і сказаў! Вульгарна і пошла», — паўтарала Ліза Паўзункова ўсім, каго гэта магло зацікавіць.

Так што мне, як і вам, чытачы, не вельмі зразумела, чым думала Соня Сінічка, калі складала свой мілосны ліст. Бо яна была адзінай, хто за два гады наважыўся парушыць негалосную забарону лезці да Максіма Статкевіча з каханнем. Многія ў школе рашуча асуджалі яе за гэта, але былі сярод дзяўчат і тыя, што зайздросцілі Сонінай адвазе.

Далей — болей. Статкевіч жыў мерным жыццём самотнага вундэркінда і, здаецца, быў з гэтага абсалютна задаволены. Не насмельваючыся набліжацца да светача, сонм школьніц ад сёмай да адзінаццатай паралелі кружляў вакол яго на паважнай адлегласці, утвараючы арбіты самых разнастайных формаў і дыяметраў. Можна было нават сказаць, што ў космасе 234-й школы існавала нешта накшталт нашай Сонечнай сістэмы. Сонцам якой быў Максім Статкевіч.

Па рэакцыі, напрыклад, Васі вы можаце меркаваць, як да гэтага ставіліся хлопцы 234-й школы. Хадзілі чуткі, што перад утварэннем кожнай новай школьнай парачкі хлопец

нязменна браў з дзяўчыны слова, што Максім Статкевіч ёй ані крышачку не падабаецца.

І амаль кожная дзяўчына, кленучыся, крышачку крывіла душою.

Нябесныя целы, якія круціліся вакол Максіма, мелі строгую іерархію, якой пазайздросціў бы і Міжнародны астранамічны звяз, чые чальцы не перастаюць спрачацца, якія аб'екты ў нашай галактыцы важныя, а якія — не вельмі.

Найперш існавала некалькі планет зямной групы — самыя набліжаныя да Сонца — такія як Зямля, Марс або Венера з Меркурыем. Гэта былі дзяўчаты 11 «А» класа, якія ўваходзілі ў адну са Статкевічам групу па англійскай мове. Стасункі ў дзяўчат з геніем маглі быць толькі дзелавыя — і гэтыя шчаслівіцы мелі найчасцейшы і найшчыльнейшы доступ да зорнага цела. Яны маглі хоць штодня размаўляць з Максімам на пабытавыя тэмы: выбіраць ежу ў рэстарацыі, школу для будучых дзяцей, запаўняць мытную дэкларацыю або засяляцца ў гатэль. Зразумела, усяго толькі ў межах моўнай практыкі — але гэта ўжо было нешта.

Далей ішлі планеты-гіганты — такія як Сатурн, Уран, Нептун або Юпітар. Гэта былі ўсе астатнія дзяўчаты «А» класа, якія маглі дачыняцца з богам на ўсіх астатніх занятках — няхай і без той душэўнай блізкасці, на якую часам правакуе вывучэнне замежнай мовы. Юпітарам — самым гіганцкім гігантам — тут, несумненна, была Ліза Паўзункова (вы не падумайце, зусім не праз яе ўнушальныя габарыты). Паўзункова як стараста — то бок фармальны лідар — ува ўсім абапіралася на нефармальнага лідара — Статкевіча. Ніводнае важнае рашэнне не заставалася без ягонай парады. Узважаныя, дзелавыя стасункі дарослых людзей — вось як называла гэта Паўзункова.

Усе гэтыя планеты ганарліва і ўпэўнена рассякалі вакол Сонца па сваіх эліптычных арбітах, а паміж імі круціўся хаатычны і разнатраўны пояс астэроідаў, які складаўся

з запісных школьных прыгажунь і выключных разумніц. І калі прыгажуня ды разумніца супадалі ў адной асобе, то гэта цягнула на цэлую малую планету. Такой Цэрэрай была, напрыклад, алімпіядніца Наташа Цапко з дзявятага матэматычнага. Або ўладальніца джазавага голасу Каця Арыстава з 10 «А», якую багатыя бацькі акурат выводзілі на эстраду пад псеўданімам Arizona.

І была ў 234-й школе яшчэ адна бязрадасная група. Ёй у нашай Сонечнай сістэме адпавядае пояс Койпэра, гэтак званыя транснептунавыя аб'екты. Змрочныя кавалкі лёду і скал, якія таксама прыцягваюцца Сонцам, але амаль не маюць шанцу не проста наблізіцца да яго, але хоць бы адлюстраваць праменьчык яго асляпляльнага святла.

У школьны пояс Койпэра ўваходзілі таўстухі і анарэксічкі, карліцы і дылды, прышчавыя і акулярыстыя, сэкс-бомбы і шэрыя мышкі, троечніцы і харашысткі. Усе тыя, хто, на агульнае перакананне, ні ў якім разе не мог прывабіць такога хлопца, як Максім Статкевіч. То бок звычайныя дзяўчаты — а такіх у 234-й была большасць. У гэтай групе астэроідаў-няўдачніц круцілася і Соня Сінічка.

Тым не менш усе выхадныя школьныя форумы напаўняліся домысламі пра ейны раман з Максімам. І калі палова карыстальнікаў пераконвала іншых, што «гэтага не можа быць, бо гэтага не можа быць у прынцыпе», другая палова вельмі актыўна даводзіла, што «дзівосы здараюцца». Але ўсе ўдзельнікі дыскусіі пагаджаліся ў адным: Сінічка — выскачка.

І тут я мушу апярэдзіць Камету, дзеці, і расказаць вам неверагодную гісторыю малой планеты Плутон, якая таксама круціцца вакол нашага Сонца.

А было так. У XIX стагоддзі астраномы, якія назіралі за планетай Уран, правялі разлікі і выявілі, што на яе арбіту нешта ўплывае. І тады яны прыпусцілі, што побач з Уранам вакол Сонца круціцца невядомая планета. Астраномы пача-

лі шукаць і ў 1846 годзе сапраўды знайшлі такую планету, якую назвалі Нептунам.

Астраномы, аднак, не ўтаймаваліся і, правёўшы новыя разлікі, выявілі, што на арбіту Урана ўплывае яшчэ нешта.

Так з'явілася гіпотэза пра існаванне загадкавай Планеты X — дзявятай у Сонечнай сістэме.

Планету X шукалі амаль стагоддзе. Яна нібы гулялася ў хованкі з астраномамі, упарта ўнікаючы тэлескопаў.

І вось зімой 1930 года 24-гадовы астраном-самавук з Канзаса Клайд Томбаў, фоталабарант Абсерваторыі Лоўэла, назіраў за небам вакол сузор'я Блізнят. Тут ён і заўважыў, што за пэўны час адна з зорак ледзь прыкметна перамясцілася.

— Здарова, малая, — стомлена ўсміхаючыся, пастукаў Клайд пальцам па астранамічным здымку. Я ўпэўненая, што менавіта так ён і зрабіў.

Гэта была планета, не падобная да астатніх. Маленькая, цёмная, аточаная такімі ж нягеглымі астэроідамі, як сама, яна, тым не менш, упарта мігцела, заяўляючы пра сваё існаванне. Яна вельмі павольна рухалася вакол Сонца па вельмі дзіўнай арбіце. То набліжалася да яго, абганяючы Нептун, а то так аддалялася, што, здавалася, яшчэ крыху — і яе зусім адарве, і яна пачне насіцца ў бяскрайнім космасе, як некаторыя іншыя беспрытульныя планеты. Было ў ёй нешта хімернае і адначасова кранальнае.

Імя для новай планеты прыдумала адзінаццацігадовая англійская дзяўчынка Вэнэцыя Бэрні. Гэта было ўдалае імя: Плутон — бог падземнага царства, а за Нептунам яно менавіта так: халодна, цёмна і глуха.

Астраномы з самага пачатку сумняваліся, ці паўнавартасная гэта планета. А ў 1986 годзе каля Урана прайшоў амерыканскі касмічны апарат «Вояджэр-II». Ён скарэктаваў некаторыя зямныя разлікі, і выявілася, што ніякіх невядомых цел на арбіту Урана не ўплывае. Дзявятай планеты не існавала. Але толькі ў 2006 годзе астраномы прызналі Плутон

малой планетай. Большай за розныя там астэроіды, але зусім не ўнікальнай. Да таго часу з дапамогаю новых крутых тэлескопаў такіх міні-планет у нашай сістэме выявілі вагон і маленькую цялежку.

Выглядае, што людзі знайшлі Планету X таму, што вельмі хацелі яе знайсці.

Пытанне, хто стане дамай сэрца Максіма Статкевіча, даўно не давала спакою 234-й школе. І вось нарэшце школьныя астраномы засеклі ў ягоным гравітацыйным полі Соню Сінічку і вырашылі, што дзявятая планета — гэта яна. І няхай не існавала ніякіх доказаў, што нешта ёсць паміж Соняй і Максімам, — каго гэта цяпер хвалявала?

Добрая парада для малых планет і вялікіх астэроідаў: калі побач з вамі круціцца планета-гігант, не стойце ў яе на арбіце. Не трэба было ўмець чытаць па зорах, каб зразумець, што Соню чакаюць вялікія непрыемнасці.

І яны неадкладна пачаліся.

x x x

Дзверы дваццаць першага кабінета шырока раскрыліся. Пакінуты без нагляду «Д» клас на секунду прыціх, але тут жа выбухнуў рогатам і свістам. Бо на парозе стаяў не завуч ці дырэктар, які прагнуў прыспець на гарачым прыпанкаваную астранаміцу, а...

Ну, вы здагадаліся.

— Сінічка!!! — зароў Максім Статкевіч з парога, пабачыўшы, што ў класе няма настаўніка. У руцэ ён сціскаў мокрую анучу.

Соня тут жа падхапілася, вачам не верачы. Максім! Сволач і падонак, сноб няшчасны... Сонейка, зайка, рыбка... Чаго яму зноў трэба? А яна ж сёння нават у школу раней выйшла, абы з ім не звязвацца...

— Статкевіч, нешта ты зачасціў!

— Можа, ужо перавядзешся да нас?

Максім імкліва зайшоў у кабінет і, схапіўшы Соню за запясце, пацягнуў да выхаду.

— Пойдзеш са мною.

— Здурэў? Чаго табе знову? Адпусці, нікуды я з табой не пайду!

Але Статкевіч моўчкі цягнуў яе па калідоры на сходы. Спыніўся ён толькі каля раскладу на трэцім паверсе.

— Вось, палюбуйся. Выйшаў, блін, анучку памачыць.

Соня разявіла рот. На раскладзе вісеў калаж, змайстраваны з іх скандальнай фоткі. Іх выявы з заплюшчанымі вачыма былі ўклееныя фоташопам на панараму кіеўскага Майдана Незалежнасці. Пад імі быў рознакаляровы надпіс: «Соня Сінічка і Максім Статкевіч. Вясельнае падарожжа ў Кіеў».

На дах аднаго з будынкаў Майдана гора-дызайнер начапіў неонавую шыльду з надпісам «Honney Moon».

— Што не так з тваімі сяброўкамі?! — рыкнуў Статкевіч.

— Пры чым тут мае сяброўкі? — абурылася Соня.

— А хто яшчэ гэта мог зрабіць? Па-першае, учора яны былі ў нас і чулі ўсю гэтую лухту пра замуж. Па-другое, я іх пяць хвілін таму бачыў на калідоры. Ну і па-трэцяе, «honey» пішацца з адным «n»! Няцяжка зразумець, адкуль тут ногі!!!

— Дык значыць, пра замуж — гэта для цябе лухта?

— Вядома ж лухта! Я проста так сказаў, каб падражніць твайго кавалера-імбецыла. А ты, бачу, ужо і губу раскатала?

— Яшчэ чаго! Вельмі трэба.

— Слухай уважліва, Сінічка. Такі ж плакат я сарваў каля прыбіральняў. Я так разумею, твае агенткі імі ўсю школу завешалі. Так што мятніся кабанчыкам і здымі ўсё даастаку, пакуль не пачаўся перапынак. Сама сцяміш, куды ісці, ці маршрут падказаць?

Аднекуль знізу пачуўся прыглушаны, але вельмі выразны енк:

— А-а-а-а! Сіні-і-іца!!!

— Думаю, пачну са сталоўкі, — уздыхнула Соня.

— Давай, у тэмпе вальса, — кіўнуў Статкевіч і пайшоў прэч. Вада капала з анучы на падлогу. Соня глядзела яму ўслед, пакуль ён не зайшоў у клас, а потым узнялася на дыбачкі і пацягнула на сябе калажык.

Не зважаючы на звесткі крутых тэлескопаў, невялікая група навукоўцаў дагэтуль лічыць Плутон дзявятай планетай Сонечнай сістэмы. І няхай Соні Сінічцы было як ніколі далёка да Сонца, ёй стала крыху цяплей ад таго, што нехта ў яе верыць.

Раздзел IX

# АЦЭТОНАВЫЯ ВОЙНЫ

Апошні тыдзень першай чвэрці быў для Сінічкі кашмарам. Што праўда, не зусім праз Максіма. Ён усяго толькі ігнорыў яе — так, нібы яна была пустым месцам. Затое Вадзік няспынна дражніў Соню, ладзіў ёй дурныя дзіцячыя прыколы (кшталту намазаць зубную шчотку мылам) і раз-пораз пужаў яе сваімі робатамі-шпіёнамі.

Але самае непрыемнае было ў школе. Там супраць Соні Сінічкі разгарнулася сапраўдная вайна, ананімная і падступная.

На перадавой гэтай вайны ў іх «Д» класе нечакана апынуліся Аліна Макей і Дзяніс Лінькоў, якія сядзелі за адной партай — чацвёртай у сярэднім шэрагу.

— Тваю ж дывізію! — ускрыкнуў Дзяніс, падышоўшы да свайго месца, калі клас заваліў у сераду на фізіку. — Ну і мярзоцце!

Хлопцы і дзяўчаты згуртаваліся вакол Ліньковa. Калі Соня падышла зірнуць, што адбываецца, аднакласнікі моўчкі расступіліся, даючы ёй дарогу.

Цераз усю парту сінім спіртавым маркерам нехта вывеў прозвішча Соні, а побач з ім — брыдкае, абразлівае, а галоўнае — несправядлівае слова.

— Соня, той, хто зрабіў гэта, — апошняя сволач, якая адграбе па поўнай. Ты мусіш ведаць, што клас на тваім баку, — сказаў нехта з хлопцаў. «Дэшкі» загулі ў знак згоды.

— Я толькі аднаго не разумею. Чаму на нашай парце? — пачухаў патыліцу Дзяніс.

Камок падступіў Соні да горла. Яна выдатна ведала чаму. За чацвёртай цэнтральнай партай у 11 «А» сядзеў Максім Статкевіч.

У гэты момант, разносячы вакол сябе смурод нікаціну, у клас увайшоў Вася.

— Стопудова гэта зрабіў лонданскі баклажан! — завёўся ён, як толькі пабачыў надпіс. — Гэтым разам ён нарваўся!

— Максім тут ні пры чым, — раптам вырвалася ў Соні.

— Што, святы анёл, значыцца? Абараняць гэтага казла надумала? — пакрыўджана выгукнуў Васілеўскі.

— Я яго не абараняю. Проста гэта не ён — і ўсё.

Нават у страшным сне яна не магла ўявіць, што Максім напісаў гэта. Але разлік ананіма быў ясны: Максім дакладна гэта прачытаў.

— Можа і не ён, але ўсё гэта дзякуючы яму!

— Трэба разабрацца з «ашкамі». Гэта па-любому нехта з іх!

— «Д» клас мы або хто? Мы гэтага так не пакінем!

— Не, пакінем!!! — раптам крыкнула Соня.

«Дэшкі» прыціхлі:

— Ты чаго, Сінічка?

— Мы нічога не будзем высвятляць і нікому не будзем помсціць! Мне ўсё адно. Я не буду звяртаць увагі! Нас і так усе лічаць няздарамі, якія толькі і ўмеюць, што кулакамі размахваць, — выпаліла Соня і зашмыгала носам.

Вася развярнуўся і паляцеў да выхаду.

— Ты куды, Васілеўскі? Я ж сказала, не трэба!

— Я да аканома. Ацэтону ўзяць. Трэба выцерці гэтую гадасць.

Такі самы надпіс на той жа парце знайшоўся ў кабінеце матэматыкі. Як і на фізіцы, Вася выгнаў усіх з класа, раскрыў вокны і доўга шараваў літары ацэтонам — пакуль

цалкам не вынішчыў. Макей і Лінькоў эвакуяваліся з чацвёртай парты. Аліна перасела да Соні.

— Почырк Паўзунковай, — задуменна прамовіла яна.

— Што, праўда? — скасавурылася на суседнюю парту Снежка.

— Ды не, я фігуральна. Вельмі да яе падобна.

— Ну, даруй нам, Сініца. Мы праўда не думалі, што ўсё так абернецца, — кранула Галя Соню за руку.

Але тая не адказала. Яна яшчэ ў панядзелак уваліла сяброўкам за калажыкі. Усе іх яна здзерці не паспела — знятую на мабілку копію такі выклалі ў школьны паблік. Там — пакуль Соня не дамаглася ад мадэратара выпілу фоткі — пра іх з Максімам напісалі яшчэ і не такое.

— Гэта называецца «чорны піяр». Для цябе ж стараліся, Сінічка, — абвясціла тады Галюня. — Акцыя абуджэння сонных пачуццяў Статкевіча.

Вось і дапіярыліся.

Вася цёр парты ўсю сераду і яшчэ чацвер. Той жа надпіс выявілі ў кабінетах біялогіі, геаграфіі і хіміі — праз іх за два дні прайшла палова школы. Пасля ўрокаў Вася зладзіў рэйд і знайшоў яшчэ два надпісы. У пятніцу здарыўся адзін рэцыдыў, але, на шчасце, гэта быў апошні дзень чвэрці. Што праўда, графіці вокамгненна набыло вусную форму і да канца тыдня праследавала Сінічку на калідорах. Але тая хадзіла па школе як глухая. «Д» клас, трэба аддаць яму належнае, таксама не вёўся на правакацыі. Ад паху ацэтону шмат у каго балела галава, але ніхто не скардзіўся. А галоўнае, настаўнікі пра гэтую непрыгожую гісторыю так і не дазналіся. Можна было лічыць, што ацэтонавыя войны скончылася маральнай перамогай «дэшак».

Адзіным, што хвалявала ў сувязі з гэтай гісторыяй Соню, былі думкі пра ўсё гэта Максіма. Але той і выгляду не падаваў, што нешта адбываецца. І толькі ў пятніцу...

— Максім, ты захварэў? Заўтра ж паездка!!!

Соня дапамагала маме Юлі мыць посуд, калі Статкевіч разачхаўся перад тэлевізарам.

— Ды не, мама. Гэта ў мяне алергія на ацэтон.

Соня ад нечаканасці бразнула патэльняй аб мыйку.

— Ацэтон? Адкуль у нас ацэтон?!!

— Ды не ў нас, мама. У школе. У мяне ім усе сшыткі прасмярдзелі. І форму трэба здаць у хімчыстку, — Максім падняўся з канапы і паволі зайшоў у кухонную зону.

— Што здарылася? — устрывожылася мама Юля.

— Разумееш, мама, нехта ў школе параспісваў парты абразамі на адрас Сінічкі. А ейны жанішок не прыдумаў нічога лепшага, як змываць гэта ацэтонам. У класы зайсці немагчыма. Вось я і чхаю.

— Божухна, Соня, гэта праўда?

Соня моўчкі кіўнула.

— Жанішок — гэта той хлопец, Лёша? І ён, значыць, змываў абразы? Які годны малады чалавек! Але, Максім, чаму ты не ўступіўся за гонар Соні?

— Бо гэта не мая вайна. Разумееш, мама, нехта змайстраваў пра нас з Сінічкай ідыёцкі калаж і развесіў па ўсёй школе. І цяпер пра нас, натуральна, ходзяць розныя плёткі. Вось ёй і дастаецца. Ты, выпадкам, не ведаеш, адкуль той калаж узяўся?

— Ты што, на мяне намякаеш? Пра той першы здымак мы з табой гаварылі. Я прызналася і перапрасіла. Але калаж? Ты сур'ёзна думаеш, што я буду развешваць у вашай школе нейкія карыкатуры?

— Ну што ты, мама. Я так не думаю. Вось толькі глядзеў я на той калаж і спрабаваў зразумець, адкуль аўтар узяў той самы фотаздымак у добрай якасці? Га?

Мама Юля прыкусіла язык.

— Вось чаму я чхаю, — падсумаваў Статкевіч і, вымоўна зірнуўшы на Соню, пайшоў у свой пакой.

Калі ён сышоў, мама Юля накінулася з роспытамі на Сінічку. Але тая як вады ў рот набрала. Здаецца, да яе пачало даходзіць, што ідэя мамы Юлі звесці іх з Максімам хутчэй ім абаім на шкоду, чым на карысць.

А горш за ўсё было тое, што пакідаць свайго сватаўства Максімава матуля не збіралася. І яна яскрава прадэманстравала гэта, збіраючы дзяцей на экскурсію.

x x x

*ДЗЁННІК*
*назіранняў за Соняй Сінічкай*

*Аўтар — Вадзім Статкевіч*

*Хутка зіма. Вераніка Андрэеўна сказала выбраць сабе птушку і назіраць за яе паводкамі. Я расказаў гэта Максіму, і Максім сказаў, што акурат ведае адну птушку. І сказаў, што я мог бы назіраць за ёю, бо гэта будзе забаўна. Таму я завёў дзённік. Я буду запісваць сюды ўсё пра Соню Сінічку.*

*Соня Сінічка вучыцца ў адной школе з Максімам. Але не ў адным класе, бо яна тупая. Максім нядаўна сказаў, што яна не тупая. Але я думаю, ён памыляецца. Соня ўцюхалася ў Максіма. Мне яе шкада, бо яна не толькі тупая, яна яшчэ і страшная. Максім яе не выносіць.*

*Сёння зранку Соня збіралася на экскурсію. Яна напакавала здаровы пляцак. Забрала ўсе свае цюбікі з купальні і гару адзення. Навошта? Яны едуць толькі на два дні. Потым яна краіла канапкі і парэзала палец. Потым яна гадзіну шукала шапку. Тады я паклаў ёй у пляцак гоначку і запусціў пультам. Соня верашчала на ўвесь дом, бо думала, гэта мыш. Было весела.*

*Цяпер яны з Максімам едуць на вакзал, каб ехаць у Кіеў. Бедны Максім. Соня яго там дастане.*

Раздзел X

# КІЕЎСКІЯ ВАКАЦЫІ

— Падумаць толькі... Дняпро, Андрэеўскі спуск, Лаўра... Такая рамантыка... Як я вам зайздрошчу!

Шыкоўная машына мамы Юлі выруліла на галоўны праспект Мінска. Быў вечар, і праспект ужо расквеціўся сваімі фірмовымі агнямі. Соня рэдка выбіралася ў цэнтр горада, але ёй заўсёды падабалася шпацыраваць тут, у атачэнні ўсёй гэтай ілюмінацыі. Вось і цяпер ёй вельмі хацелася, каб мама Юля спыніла машыну. Хацелася выйсці, занурыцца ў восеньскі парк, застацца тут, нікуды не ехаць. Чамусьці было адчуванне, што яны з'язджаюць у Кіеў на два гады, а не на два дні.

— Максім, ты шапку ўзяў?

— Мама, там будзе цёпла.

— Нельга давяраць прагнозам надвор'я, асабліва калі едзеш у іншую краіну. А ты, Соня, шапку ўзяла?

— Узяла.

— Максім, усе лекі я запакавала Соні. Калі, крый божа, нешта забаліць, звяртайся да яе. Раней цябе заўсёды загойдвала ў аўтобусе.

— Мама, мы едзем на цягніку!

— Але мала што можа здарыцца... І яшчэ раз паўтараю: я дазволіла табе ехаць без мабільніка толькі таму, што ў Соні

будзе эсэмэс-роўмінг. Так што, калі ласка, хадзіце паўсюль разам. Мне так спакойней будзе... Соня, уся ваша ссабойка — у заплечніку Максіма... Пашпарты на месцы?

Так працягвалася ўжо дзве гадзіны. Яны выехалі раней, прыхапіўшы з сабой Вадзіка. Мама Юля завезла ўсіх траіх у рэстарацыю на «развітальную вячэру». І толькі цяпер яны кіраваліся на вакзал. Соня сядзела ззаду, адразу за Максімам. Побач з ёй уладкаваўся Вадзік, які засяроджана выводзіў нешта ў тоўстым сшытку.

— Вадзік, перастань рабіць урокі на хаду. Зрок сапсуеш!

— Мама, не магу! Я распачаў важныя назіранні. За птушкамі.

Максім хмыкнуў у кулак.

— Сынок, ты ж ракету праектаваць не скончыў. Куды табе яшчэ птушкі?

Юлія Статкевіч як дэмакратычная маці аддала Вадзіка адразу ў два гурткі: юных тэхнікаў і юных натуралістаў. Маўляў, хай асвойтаецца там і там ды вызначыць, што яму больш даспадобы. Вадзік, аднак, выбраць не змог, таму патрабаваў вадзіць яго ў абодва. Хатнія заданні гурткоў ён выконваў з усім фанатызмам, на які быў здольны.

— Дай зірну, што там у цябе, — нахілілася да малога Соня.

Але той зрабіў страшны тварык, пагрозліва выставіўшы локаць. Соня адвярнулася.

Запаркаваліся каля вакзала. Цягнік на Кіеў стартаваў праз дваццаць хвілін. Соня выйшла з машыны, як з камеры смяротніка. Зараз яны ўсёй кампаніяй з'явяцца на пероне...

...На пероне побач з праваднічай стаялі Ніна Віталеўна ды Мікалай Іванавіч — настаўнік біялогіі і класны кіраўнік 11 «А» — са спісамі ў руках. А яшчэ там стаяла Ліза Паўзункова з бацькамі. Пабачыўшы «ашку», Соня чамусьці адчула пах ацэтону.

— На любыя вольныя месцы. Увесь вагон наш, — сказала Ніначка, па сваёй завядзёнцы не павітаўшыся.

Мама Юля абняла Максіма, потым Соню.

— Пакуль, малы, — сказаў Максім Вадзіку, які шмыгаў носам, прыціскаючы да грудзей сшытак. Пасля гэтага хлопец спрытна заскочыў у вагон, нават не падумаўшы дапамагчы Соні. Сяк-так ускараскаўшыся па крутых прыступках, дзяўчына апынулася ў тамбуры, а потым — у вузкім вагонным калідорчыку. Каля тытана яна пабачыла Максіма, які шнарыў рукой у заплечніку.

— Трымай, — увапхнуў ён Соні ў рукі скрутак з канапкамі, банан і яблык. — Не размаўляй са мной у цягніку!!!

Ну вось. Прыехалі.

x x x

Толькі ўвайшоўшы ў вагон, Соня зразумела, чаму не хоча на экскурсію. Бо па сутнасці едзе туды зусім адна. Няхай яна і была крыху з імі пасварыўшыся, але ў гэты момант Соня моцна засумавала па Галі і Снежцы. І, як ні дзіўна, па Васю. Хлопец, да якога яна прызвычаілася ставіцца як да блазна, у гісторыі з ацэтонам павёўся па-рыцарску. Гэта яе моцна ўразіла.

Да таго ж Соня ўпершыню ў жыцці ехала ў цягніку. І ўпершыню ў жыцці — за мяжу. Было зусім ніякавата. У 234-й школе чыйсьці бацька быў шышкай на Беларускай чыгунцы, таму вучням з топ-45 прапанавалі цэлы плацкартны вагон у цягніку «Мінск — Кіеў». Квіткоў не было — сядай дзе хочаш. Але лёгка сказаць: месцаў ужо амаль не заставалася. У першую чаргу школьнікі пазабівалі бакавушкі — на іх ужо не было як прыткнуцца, бо месцы для кагосьці «трымалі». Да таго ж панавала цісканіна, бо з некаторымі дзяўчатамі і хлопцамі ў вагон увайшлі бацькі.

У апошнім нязручным плацкарце каля прыбіральні заставалася тры вольныя месцы. Загваздка была ў тым, што на чацвёртым ужо сядзеў Максім.

Соня спынілася, не ведаючы, што рабіць. Статкевіч зірнуў на яе, як памежны аўчар на кантрабандыста.

Дапамога, аднак, прыйшла адкуль не чакалі. Траха не зачапіўшы Соню, на паліцу бухнулася здаровая лакаваная сумка.

— Тут занята! Не бачыш? Гэта месцы «А» класа!

У праходзе высілася Ліза Паўзункова з сяброўкамі Вікай і Крысцінай. Апошнія калісьці былі аднакласніцамі Соні, а цяпер вучыліся ў англійскім і ўваходзілі ў паўзункоўскую світу. З Соняй яны, натуральна, не павіталіся.

— Ды калі ласка.

Сінічка развярнулася і пайшла назад. Дзе тут месца? Ну мусіць жа быць недзе месца...

Раптам яна ўбачыла адсек, які раней чамусьці прапусціла. У ім завіхалася ўсяго тры дзяўчыны.

— Прывітанне. У вас свабодна?..

І Соня з палёгкай паставіла набіткаваны заплечнік побач з Машай Ротмістравай.

У Сонечнай сістэме 234-й школы Маша Ротмістрава з 11 «А» была планетай зямной групы, бо разам са Статкевічам хадзіла на інгліш. Больш за тое, у гэтай зямной групе Маша Ротмістрава была сама планета Зямля — адзіная, на якой магчымае існаванне разумных істот і ўвогуле — жыцця.

Бо яе яшчэ год таму адзначыў сам Максім Статкевіч, сказаўшы пры сведках: «Ротмістрава — адзіная талковая дзяўчына ў школе».

Гэтая заява сталася сенсацыяй, але ніякіх асаблівых наступстваў не мела. Ротмістрава, магчыма, была адзінай дзяўчынай у школе, не закаханай у Максіма. Ані яўна, ані таемна.

Соня была крыху знаёмая з Ротмістравай — праз сябровак. Як і Паўзункова, тая калісьці вучылася з Галяй і Снежкай у адным класе. Але, у адрозненне ад Лізы-Падлізы, была здольнай вучаніцай і ў спецклас паступіла без усялякіх

рэпетытараў. Магчыма, таму не зафанабэрылася і аднакласніц былых не занядбала. Час ад часу нават тусіла з імі.

Вось толькі Соні чамусьці крыху цуралася.

Ротмістрава была высокай, танклявай і любіла цёмныя доўгія спадніцы, якія ёй шалёна пасавалі. Яна збірала ў хвост доўгія каштанавыя валасы, не насіла ўпрыгожанняў і зусім не карысталася касметыкай. Карацей, была эльфам у царстве троляў.

Ледзьве кіўнуўшы Соні, яна зноў паглыбілася ў кнігу, якую чытала.

Дзве іншыя дзяўчыны выявіліся больш прыветнымі. Гэта былі Лена Канькова ды Іра Жданок з 11 «Б». Абаяльныя паненкі, каля якіх, праходзячы, увесь час затрымліваліся іншыя «бэшкі» — і іх у Кіеў ехала штук дзесяць. Фізікі з адзінаццатай паралелі ўвогуле былі залатымі людзьмі: ад іх бесклапотнага смеху і дасціпных жартаў Соні зрабілася не так непамысна. Да таго ж яны адразу пачалі знаёміцца з Соняй, балбатаць з ёй як нічога-ніякага — у яе сітуацыі гэта было выратаваннем.

Ну і зусім здораўскім было тое, што на заслупаваную таварышам бакавушку насупраць іх паліц перад самым адпраўленнем цягніка засяліўся Ваня Каланіцкі з гітарай.

— Здарова, ясачкі! — павітаўся ён і падміргнуў аднакласніцам.

Карацей, гэта быў угар. Недзе пасля Бабруйска настаўнікі, падбухтораныя роспачнай праваднiцай, пачалі хадзіць па вагоне і намаўляць фізікаў класціся, каб хоць крыху паспаць да пашпартнага кантролю.

— Дзяржаўную мяжу, Віялета Максімаўна, мы сустрэнем дэцыбеламі! — заявіў Каланіцкі і ўдарыў па струнах. Пажылая матэматыца — трэцяя суправаджальніца групы — бездапаможна паківала галавою.

Вакол іх плацкарты сабралася ледзь не траціна вагона. Соня шчыра весялілася. Песні, якія ведала, падпявала, якія не ведала — ужо да Гомля вывучыла і падпявала таксама.

— Гэй, можна цішэй? — у праходзе намалявалася Паўзункова. — Нармальныя людзі, між іншага, заснуць спрабуюць.

— «Ліза, не улятай... Ліза, не ішчэзай», — не разгубіўся Каланіцкі. — Спецыяльна для дзяўчыны ў ружовым спартыўным гарнітуры гучыць гэтая калыханка!

І пад радасныя смяшкі грамады праспяваў папсовую песню пра Лізу цалкам.

Ён мог з ходу падабраць любую мелодыю, гэты Каланіцкі.

Толькі пасля таго, як яго праверылі ўкраінскія памежнікі і мытнікі, вагон аціх. Але ненадоўга. Перад восьмай ранку падлеткаў пачала будзіць правадніца, якой, відаць, паспаць зусім не ўдалося. Юныя турысты тут жа падхапіліся, утварылі галаслівыя заторы каля прыбіральняў, сталі запарваць вермішэль і гарбату, расплёскваючы ваду каля тытана.

Раптам нехта закрычаў:

— Дняпро! Дняпро!

Усе папрыліпалі да вокнаў. Цягнік пераязджаў раскошную раку, над якой зіхцелі ў ранішнім сонцы макаўкі прыгажэзных сабораў.

— Лаўра! Лаўра! — замітусіўся вагон, выцягваючы фотаапараты.

...Яны пад’язджалі да вакзала. Ехаць было яшчэ хвілін дзесяць, але хлопцы і дзяўчаты ўжо шыхтаваліся ў праходзе з багажом. Соня таксама паддалася масаваму псіхозу. У адрозненне, напрыклад, ад Ротмістравай, якая спакойна сядзела ў сваім куце з сумкай, заткнуўшы вушы плэерам.

— Выйшаўшы на перон, ніхто не разбягаецца, не разыходзіцца! — надрывалася ўсярэдзіне вагона Ніначка. Мы выгружаемся, робім пераклічку, нас сустракае экскурсавод, і мы арганізавана, я паўтараю, ар-га-ні-за-ва-на ідзём да аўтобуса...

— Сінічка, слухай сюды, — раптам пачула Соня над вухам такі знаёмы ўжо прыцішаны голас.

Соня і не заўважыла, што за ёю стаў Максім. Калі шчыра, яна за вечар і думаць пра яго забыла.

— А як жа «не размаўляй са мной у цягніку?» — з'едліва перапыталася дзяўчына, не абарочваючыся.

— Цішэй ты! Справа ёсць.

— Аўтобус адразу вязе нас на экскурсію. І толькі пасля мы засяляемся ў гас-ці-ні-цу...

— Слухай сюды, Сінічка. На экскурсію я з вамі не пайду і ў гатэлі жыць не буду.

— Ты што, зусім? Мама Юля цябе прыб'е!

— Менавіта. Таму ты будзеш пісаць ёй эсэмэскі, нібы ўсё ў парадку і я з групай.

— Яшчэ чаго! Я не буду ёй хлусіць.

— Навошта хлусіць? Проста ўключы фантазію. Калі ты ёй увогуле ўкамплектаваная. Напрыклад, дазваляю табе напісаць, што мы гуляем па Хрэшчатыку, узяўшыся за ручкі.

Соня сцяла зубы.

— І куды ты намыліўся?

— Не твая справа.

— Не мая справа? Ды я маме Юлі адразу эсэмэсну, як толькі ты адваліш.

— Ну, эсэмэсні. Але я ў Кіеве, а яна — у Мінску. Ты ж не хочаш маю маму да інфаркту давесці?

— Я ўсё адно не буду яе падманваць!

— Ах так? Ну то слухай, Сінічка. Малы Вадзік — цяжкая артылерыя ў спрактыкаваных руках. Калі ты здасі мяне маці, па вяртанні дадому тваё жыццё ператворыцца ў пекла. Але калі ты зробіш, як я прашу, я, магчыма, згадаю, што я ягоны старэйшы брат, і правяду з ім выхаваўчую гутарку.

— Статкевіч, твой план — фігня. Цябе настаўнік не адпусціць.

— Ужо адпусціў. Я з ім учора дамовіўся. Пакуль вы тут горла дралі.

— Адразу пасля засялення ў нас будзе абед! А потым мы паедзем грамадскім транспартам на пе-ша-ход-ную экскурсію!

— Ну што, мы дамовіліся, Сінічка?.. Маўчанне — знак згоды. Я ведаў, што на цябе можна спадзявацца.

— А цяпер дружна выходзім на перон! І, я нагадваю, ніхто нікуды не адыходзіцца!..

x x x

— Булава або трызуб?

Соня Сінічка закахалася. З першага погляду. У Кіеў.

У прынцыпе, закахаць беларускага падлетка ў Кіеў лягчэй лёгкага. Дастаткова яго туды прывезці. Астатняе Кіеў зробіць самастойна.

Гэта былі неверагодныя два дні свабоднага палёту. Усё натхняла Соню ў Кіеве і ўсё было ёй блізка і цікава.

Кіеў адразу падаўся Соні незвычайна жывым. Ужо на вакзале іх сустрэў мітуслівы і рухомы шматлюдны рынак, які расцякаўся ракою па бакавых вуліцах. Навокал было безліч людзей, і ўсё яны нечым былі занятыя, штосьці прадавалі, кудысьці спяшаліся.

Калі ж школьнікі загрузіліся ў аўтобус і экскурсія пачалася, Соню ўразіла, які Кіеў быў вялікі. У сэнсе прапорцый — раскошныя, прадстаўнічыя будынкі ў цэнтры горада, цэрквы, помнікі і сам Дняпро — усё тут было разу ў паўтара, а то і два вышэйшае, шырэйшае і ўнушальнейшае, чым у родным Мінску.

Калі экскурсія скончылася, аўтобус павёз іх у гатэль. Той, здавалася, быў зусім далёка ад цэнтра, але пазней экскурсанты зразумелі, што жывуць за пару крокаў ад станцыі метро. Таму перамяшчацца па горадзе было зручна. Выявілася, што пасля абеду (боршч, катлета па-кіеўску) на пешаходную экскурсію яны паедуць падземкай. Дзяўчаты-«ашкі» пачалі

незадаволена бурчэць, але кіеўскае метро выявілася дадатковым атракцыёнам. Таксама разу ў паўтара большае за мінскае, але галоўнае — страшэнна глыбокае. А ў адзін момант цягнік выехаў на паверхню — на мост над Дняпром. Гэтага ўвогуле ніхто не чакаў.

Выйшлі на станцыі «Залатыя вароты». Пешая экскурсія была нават цікавейшай за аўтобусную, бо датычыла старажытнага Кіева. Найбольш Соні запаў у душу Сафійскі сабор. Калі іх правялі ў сціплую з выгляду царкву, усярэдзіне якой, як пад белым каўпаком, мігцелі старажытныя роспісы ды мазаікі незямной прыгажосці, у нашай гераіні перахапіла дых.

Вось так і з людзьмі. Гледзячы на звычайнага чалавека, можна нават не падазраваць, наколькі ён неверагодны.

Працягнулася экскурсія на даўжэзнай вуліцы пад назвай Андрэеўскі спуск, над якой царавала велічная Андрэеўская царква.

— Мы называем гэтую вуліцу «узвіз» — «узвоз». Так што вы, турысты, па ёй спускаецеся, а мы, кіяне, заўжды падымаемся, — жартаваў экскурсавод Раман, стылёва апрануты чарнявы хлопец гадоў дваццаці пяці. — І не дзіва: гэта ж адна з дарог, якая вяла з Падола на Замкавую гару...

Раман меў фурор у дзяўчат. Усе яны імкнуліся сфоткацца з сімпатычным гідам на фоне кожнага архітэктурнага помніка. Групкамі і індывідуальна. І, здаецца, самому Раману гэта вельмі імпанавала.

— Перад вамі — Кіева-Магілянская акадэмія. Самы важны архітэктурны здабытак Кіева. Бо гэта — універсітэт, дзе я вучыўся, — абвясціў Раман, калі яны канчаткова спусціліся са спуску. Беларускія дзяўчаты завішчэлі, як на поп-канцэрце, і зладзілі новаму куміру авацыі. Той самазадаволена ўсміхнуўся, бо разлічваў на такую рэакцыю.

А яшчэ кажуць, што Максім Статкевіч — самазакаханы тыпус, думала Соня. На фоне кіеўскага Рамана ён сама сціпласць.

Пад вечар, калі пачало цямнець, група пагрузілася на рачны параходзік, які гадзіну катаў яе па Дняпры. Велічная рака з высокімі берагамі, дзе прыгожа дагарала залатая восень... Настрой у Соні быў ускрай лірычны.

Яе толькі засмучала, што побач не было Максіма.

Соні чамусьці вельмі хацелася глядзець на ўсю гэтую прыгажосць разам з ім. Няхай ён не размаўляе з ёю пры людзях, але яна магла б бачыць ягоную рэакцыю на ўсё навокал. Тады ёй здавалася б, што яна глядзіць на Кіеў яго вачыма.

Параходзік прайшоў пад пешаходным мостам — і над імі па канаце, працягнутым з правага высокага берага да вострава пасярэдзіне Дняпра, праляцеў чалавек, прышпілены да каната карабінам.

— Атракцыён «Рэдкая птушка»! — пажартаваў хтосьці з дарослых, а хлопцы з Сонінай школы тут жа замітусіліся па караблiку, высвятляючы, што гэта за штука такая, колькі гэта каштуе і, галоўнае, як туды трапіць.

— І думаць забудзьце! — заверашчала Ніначка.

Добра Максіму, падумала Соня. Ніякай Ніначкі над ім не стаіць, хадзі дзе хочаш, рабі што хочаш... І тут раптам на сэрцы стала неспакойна. Яна ж зусім не ведае, дзе ён і з кім ён. Ці ўсё ў парадку? Не, усё мусіць быць у парадку — бо гэта ж Максім, але featured рознае можа здарыцца, а яна нават не ведае, як з ім звязацца.

— У «А» класе бракуе Максіма Статкевіча! — абвясціла Паўзункова, калі група пагрузілася ў аўтобус на вакзале. Яна вельмі імкнулася надаць голасу дзелавіта-занепакоены тон, але атрымалася, як заўсёды, — плаксіва і какетліва.

— Усё ў парадку, — сказаў Мікалай Іванавіч, — я яго адпусціў.

Калі б Соня мела ўплыў, дастатковы, каб прыдумваць і пашыраць мянушкі настаўнікам, яна б празвала біёлага Амёбай. Бо гэта быў шэры, бляклы чалавек няяснага веку без якіх-кольвек адметных рыс. Без хрыбта і характару, без улас-

нага погляду на рэчы і, здавалася, без асаблівай ахвоты да чаго-кольвек. Урокі ён вёў ускрай нецікава — здавалася, яму самому не была патрэбная ягоная біялогія. «Д» клас яе часта прагульваў — дастаткова было прыдумаць любую драбязу, каб адпрасіцца, — і біёлаг без пярэчанняў адпускаў з урокаў.

Зрэшты, біёлаг быў такім нецікавым, што нават мянушкі яму прыдумляць было нецікава. У школе дзеля зручнасці яго называлі проста Іванавіч.

— Усё ў парадку?!! — не паверыла вушам Ніначка. Яна аж падскочыла на сваім пярэднім сядзенні. — Ты... Вы адпусцілі непаўналетняга гуляць аднаго ў чужым горадзе?! Гэта ж чэпэ!!!

— Максім правядзе час з сям'ёй кіеўскіх сяброў. Ён вернецца да цягніка. У яго тут будзе тэлефон, мы на сувязі, — невыразна адказаў Іванавіч.

Якія яшчэ кіеўскія сябры? Соні стала крыўдна. Яна зусім нічога не ведае пра Максіма.

— Добра, пад вашу адказнасць, Мікалай Іванавіч, — Ніначка палічыла за разумнае ўтаймавацца, але ўсё яшчэ глытала ротам паветра. — Але дамовімся: ледзь што якое, у турму пойдзеце вы, а не я.

«Як справы ў нашых вандроўнікаў?» — запіпікала эсэмэска ад мамы Юлі.

«Усё добра. Катаемся на караблiку па Дняпры», — адпісала Соня.

Пасля вячэры (боршч, варэнікі) іх адпусцілі пагуляць на Хрэшчатык і Майдан Незалежнасці. Галоўная вуліца Кіева была перакрытая, як заўсёды на выхадных, і на ёй спявалі, танцавалі, агітавалі за палітыкаў, збіралі грошы на дабрачыннасць… Соні было цяжка ўявіць нешта такое ў цэнтры Мінска.

Дзяўчаты ўвесь час забягалі ў модныя крамы памераць шмотачкі, у той час як хлопцы разглядалі вулічныя латкі з сувенірамі. Ваня Каланіцкі ўсё прыцэньваўся да футболак

і ўрэшце набыў адну з партрэтам Рэнэ Дэкарта і подпісам: «Дякую тобі, Боже, що я не Паскаль». Якую тут жа апрануў, да радасці іншых фізікаў.

Урэшце тры настаўнікі трыма групкамі канваявалі стомленых школьнікаў да месца начлегу. Соня — разам з Ніначкай — вярнулася сярод самых стойкіх ледзь не апоўначы. Ногі гулі, а ўваччу каруселлю круціліся агні вечаровага горада.

Пасялілі Соню ў трохмясцовы нумар з Ленай і Ірай, што нашу гераіню вельмі ўзрадавала. З выгляду дзяўчаты нават нагадвалі ёй Галю і Снежку — толькі без камічных перабольшанняў у аблічнасці. Іра была далікатнай натуральнай бландзінкай, Лена — пякучай брунеткай з усходнімі вачыма. Соня сказала Лене, што ў яе прыгожыя вочы. «Гэта маміны. Мама ў мяне з беларускіх татараў», — патлумачыла дзяўчына.

Вось толькі Лена з Ірай былі далёка не Галя са Снежкай. Соню яны, вядома, ласкава прынялі да сябе, але ўсё адно пераважна шушукаліся міжсобку. Мусіць, мелі свае сакрэты.

У нядзелю Ніначка згледзела на Андрэеўскім спуску дом-музей Міхаіла Булгакава і раптам прачнулася, што дзецям конча трэба яго наведаць. Бо яны акурат у другой чвэрці праходзяць «Майстра і Маргарыту». Русіца не злезла з Рамана, пакуль той не замовіў ім на панядзелак прагляд музея — за кошт вольнага часу. Таму на другі дзень, пасля Кіева-Пячэрскай лаўры, спехам паабедаўшы (боршч, галушкі), Ніначка зноў павезла школьнікаў на Андрэеўскі спуск. Праўда, ладная частка іх вялікай групы з дадатковай экскурсіі шчасліва саскочыла, але Соня вырашыла далучыцца.

Па-першае, Ніначка ўсё-ткі яе класная кіраўніца, і яе трэба падтрымаць.

Па-другое, можна яшчэ раз паглядзець сувеніры.

Усе рэчы ў музеі былі пафарбаваныя ў белы колер, а ўваход у кватэру Булгакавых меў выгляд старасвецкай шафы. Як у «Хроніках Нарніі».

— Ці чыталі вы «Белую гвардыю»? — спыталася ў іх натхнёная экскурсаводка тыпу «тургенеўская паненка».

— Вы што, у нас яе і ў праграме не было ніколі, — адказала за школьнікаў Ніначка.

— Я чытала, — раўнадушна прамовіла Маша Ротмістрава. Ніначку аж перасмыкнула.

Цяпер Соня стаяла на Андрэеўскім спуску і засяроджана вызначала, купіць ёй драўляную гетманскую булаву памерам з таўкачык або драўляную ж плашачку з прымацаваным да яе латунным трызубам і надпісам «Україна». Булава выглядала даволі ўніверсальна і пасавала па стылі да інтэр'ера татавай рэстарацыі «Пан Сцяпан». З іншага боку, калі купіць трызуб — то адразу ясна, адкуль падарунак. Учора яна ўжо набыла на Андрэеўскім магніцік для мамы Юлі, завушніцы для Галі і Снежкі ды — на памяць пра паездку — туркусовыя каралі для сябе. Важкія, буйныя пацеркі самі паклаліся ёй у руку, апёкшы восеньскай прахалодай — яна не змагла прайсці міма. А вось падарунак для таты яна не выбрала — адклала на апошні дзень.

Разважаць не было калі. Хутка трэба было рушыць да станцыі метро «Тэатральная». Адтуль яны ўчора з'язджалі ў гатэль, адтуль сёння ехалі на вакзал — у Соні гэтае месца было пазначана крыжыкам на мапе.

— Соня, прывітанне, — раптам пачула яна за спінай ялейны галасок. Каля суседняга латка стаялі, трымаючыся за рукі, паўзункоўскія падпявалы Віка Крылова і Крысціна Віткевіч.

— Прывітанне, — здзіўлена адказала Сінічка.

— Сувеніры выбіраеш? Мы таксама. Глядзі, што я маме купіла...

Неяк рэзка яны заўважылі яе існаванне. Якога ляду?

— Ай, Сонька, што ты куксішся як нярodная, — нібы пачуўшы яе нямое пытанне, прамовіла Віка.

— Проста Паўзункова — яна ў нас з прыбабахам. Зусім са сваёй статуснасцю з’ехала, — хлопаючы вачыма, паскардзілася Крысціна.

— Ага. Хварэе на «зорачку». У яе паразмаўляць з кімсьці «не з „А“ класа» карона зваліцца. І на нас злуецца, калі што якое.

— Але мы не такія. Мы не забываем сяброў.

Соня не магла згадаць, каб Віка і Крысціна калі-кольвек з ёй сябравалі. Але, прынамсі, яны добра да яе ставяцца. Калі, вядома, Паўзункова не бачыць.

— Вой, добра, што мы цябе сустрэлі! — раптам хлопнула сябе па лбе Крысціна. — Іванавіч з матэматыцай памянялі месца збору.

Што за навіны?

— Усё адно ўсе ламануліся ў гэтую частку Кіева, — падхапіла Віка. — Бліжэй сустрэцца ў той жа час, але на «Залатых варотах». Ніначка вам не казала ў музеі?

Не, Ніначка не казала.

— Ну і балда гэтая Ніначка! Карацей, прыходзь туды. Мы пабеглі. Нам яшчэ біжутэрыю трэба зірнуць.

І, памахаўшы Соні ручкай, дзяўчаты пашыбавалі па спуску.

Соня зірнула на мапу. Станцыя метро «Залатыя вароты» была, лічы, побач.

— Трызуб, калі ласка.

Расплаціўшыся, яна паволі пасунулася ўверх па спуску.

x x x

Соня сядзела на лавачцы каля Залатых варотаў і ела марозіва на тры шарыкі. У яе ружовых марах марозіва ў Кіеве ёй, зразумела, купляў Максім, але раз не склалася, то яна і сама можа зрабіць сабе гэткі падарунак. Адзначыць цудоўнае завяршэнне цудоўнай паездкі.

Менш чым праз дзве гадзіны цягнік стартуе на Мінск. Але яшчэ трэба ўсім разам дабрацца да вакзала, забраць рэчы з камер захоўвання, купіць ежы ў дарогу ў прывакзальных забягалаўках... Соня прыйшла на месца збору крыху раней і цяпер расслаблена чакала групу.

Цікава, Максім таксама прыйдзе сюды або прыедзе адразу на вакзал?

Са смакам дахрумсцеўшы вафельку, Соня азірнулася. Дзіўна: да часу ікс пяць хвілін — а нідзе нікога. Было ўжо пасля сёмай вечара.

Яна двойчы абышла помнік старарускага дойлідства. Пуста.

Соня аббегла плошчу, праверыла ўсе ўваходы і выхады з метро — і не пабачыла знаёмых твараў. Яе агарнула паніка.

Яна спынілася пасярод сквера і роспачна азірнулася. Атмасфера навокал заўважна змянілася. Людзей усё прыбывала. Многія неслі ў руках скручаныя сцягі і транспаранты. Выходзілі з метро, спыняліся, стэлефаноўваліся з кімсьці, пераступалі з нагі на нагу, нібы кагосьці чакаючы.

— Прабачце, што тут адбываецца? — торгнула яна за рукаво пажылога дзядзечку побач з сабою. На ягоныя плечы, нібы ручнік, быў накінуты жоўта-блакітны сцяг.

— А ты што, не з Кіева?

— Я і не з Украіны.

— Ох, дывчынко, біда тут адбываецца, — уздыхнуў пенсіянер. — Нашая Рада, каб яе, не ратыфікавала закон...

І дзядзечка прачытаў Соні цэлую лекцыю пра бягучую сітуацыю ва ўкраінскай палітыцы.

— Гэта супярэчыць волі народа! Усе сумленныя людзі ідуць на Майдан, каб заявіць пра гэта!

Соня слухала, але амаль не ўнікала ў сутнасць. Ясна было толькі, што ў Кіеве збіраецца мітынг, а ў іх — цягнік.

Можа, таму настаўнікі зноў памянялі месца сустрэчы?

Не маглі ж Віка з Крысцінай так тупа з яе прыкалоцца.

Або ўсе з’ехалі на вакзал раней?

Дзе цяпер шукаць сваіх?

Трэба было тэрмінова пісаць эсэмэску Ніне Віталеўне. Соня схапіла мабілку і раптам пахаладзела.

У ейнай мабілцы быў працоўны нумар Ніначкі, які тая завяла ў Беларусі для кантакту з вучнямі. У роўмінгу яна мела іншы нумар.

Гэты іншы нумар Соня запісала ў нататнік, які цяпер мірна ляжаў у ейным заплечніку ў камеры захоўвання. І ні з кім — увогуле ні з кім у групе сувязі ў яе не было.

Ну і ў каго яна такая разява?

Дзядзечка са сцягам на плячах прыступіў да ёмкай характарыстыкі ўкраінскіх палітыкаў, тлумачачы, чаму асабіста ён — на баку Стасюка, а не Пракапенкі. Ці наадварот — Пракапенкі, а не Стасюка. Соня ліхаманкава варушыла звілінамі.

Што рабіць? Каму пісаць? Тату? Чым тата дапаможа? Максім! Халера, чаму яна ўвесь час думае пра Максіма... Мама Юля!!!

Мама Юля запісала сабе тэлефоны Ніначкі, Іванавіча, Віялеты Максімаўны, а таксама амбасады Беларусі ў Кіеве і Дзяржаўнай службы Украіны па надзвычайных сітуацыях.

У гэтую хвіліну да ўхутанага сцягам дзядзечкі далучылася кабета. Пад расшпіленым паліто ў яе стракацела вышыванка. Пара развіталася і сышла, але Соня гэтага нават не заўважыла. Неслухмянымі ад панікі пальцамі яна набірала на тэлефоне:

«Я заблукала. Напішыце Ніне В., што я каля ст. м. „Залатыя вароты“ або дашліце яе нумар».

Заплюшчыўшы вочы, націснула «адправіць».

Хоць бы мама Юля пачула тэлефон, хоць бы мама Юля пачула тэлефон...

На гадзінніку была сёмая трыццаць. Паўгадзіны, як мусілі сабрацца. Толькі вось дзе? Соня цалкам дэзарыентавалася. Але дзе б ні была група, Соню, мабыць, ужо шукаюць.

Пацягнуліся хвіліны. А сёмай сорак пяць тэлефон нарэшце забібікаў:

«СІНІЧКА ТЫ ЗВАР'ЯЦЕЛА МЫ СПАЗНЯЕМСЯ НА ЦЯГНІК Я НЕ ВЕДАЮ ШТО ТАБЕ ЗРАБЛЮ».

Незнаёмы нумар, але тон паведамлення і яго малазмястоўнасць выдавалі Ніначку. Толькі яна, калі яе вучаніца заблукала ў чужым горадзе, магла траціць каштоўныя секунды на словы кшталту «звар'яцела».

«Я ля Залатых варот ля фантана. Куды мне ісці?» — адпісала Соня.

Зноў чаканне. Сёмая пяцьдзясят.

«СТОЙ ДЗЕ СТАІШ ЦЯБЕ ЗАБЯРУЦЬ».

Соня паслухмяна стала каля круглага фантана, які ўжо не працаваў. Які-ніякі, але арыенцір для настаўнікаў. Калі, каго з іх і адкуль чакаць?

Сёмая пяцьдзясят пяць.

Здавалася, яшчэ крыху — і яна знепрытомнее ад хвалявання. Пачынаў балець жывот.

Пікнула эсэмэска. Гэта была мама Юля:

«Соня, ты нрм? Як ты магла згубіцца? М. што, не з табою?»

Ну вось што ёй на гэта адказаць?

Восьмая вечара.

Пік. Новая эсэмэска:

«У Кіеве зноў Майдан. У цябе ўсё нрм? Адгукніся».

Восьмая нуль пяць.

Людзей усё прыбывала. Узбуджана гамонячы, яны выходзілі з метро і, зліваючыся ў суцэльную плынь, кіраваліся кудысьці ўніз.

Восьмая дзесяць.

— Опа, чыкса! Такая малая, а ўжо майданутая!

Толькі гэтага ёй бракавала. Побач з Соняй матэрыялізаваліся два няголеныя хлопцы бамжаватага выгляду. Ад абодвух смярдзела перагарам. Той, які звярнуўся да Соні, ледзь

трымаўся на нагах. За ім стаяў яго крыху больш адэкватны таварыш.

— Серы, хадзем, яна ж малалетка.

— А мне шо? Мне пазваніць трэ. Малая, дай пазваніць! — гопнік на імя Серы ўпэўнена цягнуўся да мабілкі ў Сінічкінай руцэ.

Соня інстынктыўна прыціснула да грудзей тэлефон з напаўнабраным адказам для мамы Юлі. Калі яе зараз абрабуюць, усялякая сувязь са светам будзе страчаная.

— Не забірайце, калі ласка, я не адсюль, я на цягнік спазняюся... — замармытала Соня, прымружыўшы вочы. — Калі ласка.

— Ты шо? Не з Кіева? Шо, данецкая?

— Не, не данецкая... Калі ласка...

— Серы, пакінь яе.

Пах перагару ўзмацніўся, звястуючы набліжэнне Серага.

— Не данецкая? Тады скажы, за каго ты! За Стасюка ці за Пракапенку? Ну?

Божухна, і каго тут выбраць? Стасюка ці Пракапенку? Якая хоць паміж імі розніца? Гэта табе не булава або трызуб — правільны адказ толькі адзін, а няправільны яўна абыдзецца Соні даражэй за ўсе набытыя ў Кіеве сувеніры...

— Серы, кораш дзела гаворыць. Пакінь дзяўчыну. А не тое міліцыі здам абодвух.

Соня расплюшчыла вочы. Працягваючы выкрыкваць нейкія абразы, ейны агрэсар няцвёрда целяпаўся прэчкі следам за сваім таварышам.

Яна абярнулася, каб зірнуць на свайго збаўцу.

За ёй стаяў высокі хлопец гадоў сямнаццаці ў байцы, пад якой рэльефна праступалі мускулы. Сімпатычная стрыжка абрамляла яго загарэлы твар рванымі пасмамі.

— Я мяркую, Сафі? — злёгку пакланіўся ён. — Прынамсі, апісанне супадае. Маленькая, перапужаная і ўжо ўляпалася ў нейкую гісторыю.

Сінічка раскрыла рот.

— А... Ты хто?

— Я звідсі. А ты пойдзеш са мною.

— Нікуды я, Звідсі, з табой не пайду! Я цябе не ведаю! — ледзь не заплакала Сінічка. На сёння для яе было занадта.

— Цябе хіба не папярэдзілі?

— Пра што?

Тут у незнаёмца зазвінеў мабільны. Зірнуўшы на экран, ён прыняў званок і з усмешкай працягнуў Соні тэлефон.

На экранчыку пагрозліва міргаў беларускі мабільны нумар.

— Алё, — машынальна прамовіла Соня.

— СІНІЧКА, ТЫ МЯНЕ Ў МАГІЛУ ЗВЕСЦІ НАДУМАЛА?!! КАБ ПРАЗ ПАЎГАДЗІНЫ БЫЛА Ў ВАГОНЕ!!! ІНАКШ У ШКОЛУ МОЖАШ НЕ ПРЫХОДЗІЦЬ!!!

Соня націснула адбой. Восьмая дваццаць. Да адыходу цягніка — трыццаць пяць хвілін.

— Ну што, цяпер ты пойдзеш са мною?

— Цяпер пайду, — агаломшана пагадзілася Соня.

— Ну то слухай. У нас тут соцыум штарміць, шмат людзей у цэнтры, усе перасадачныя станцыі перакрытыя, — незнаёмец кіўнуў на ўваход у метро, які і сапраўды ачапляў спецназ. — Я сюды з вакзала ледзьве дабраўся.

— Можа, на таксі?

Хлопец засмяяўся:

— Мы ў заторах да наступнага вашага цягніка стаяць будзем. Калі хочаш дадому, выйсце адно, донька. Трэба бігты.

— Як бігты?

— Ножкамі, Сафі, ножкамі. Як у цябе з фізкультурай? За мною!

Сказаўшы гэта, загадкавы незнаёмец схапіў Соню за руку і пацягнуў па вуліцы.

x x x

Гэта быў крос, які б высока ацаніла фізручка Ала Юр'еўна, Сонін начны кашмар, вычварэнка ад лёгкай атлетыкі. Яны несліся па вуліцах ды завулках, абмінаючы густа напаркаваныя машыны, праразаючыся скрозь чалавечы тлум. Хлопец і сапраўды быў тутэйшы, бо ведаў, як бегаць па Кіеве напрасткі: у пары месцаў яны вельмі ўдала зрэзалі па дварах, а адзін раз ён нават правёў яе скрозь будынак, у якім было два ўваходы. Бегчы было нескладана, толькі торбачка на баку крыху замінала. А яшчэ Соня не ведала, колькі засталося бегчы — цяжка было разлічваць сілы.

Нарэшце яны вылецелі на шырокі праспект. Гэта быў бульвар Шаўчэнкі — Соня пазнала яго з аўтобуснай экскурсіі. Яна з палёгкай пабачыла наперадзе чырвоную літару М і надпіс «Універсітэт», але радасць яе была нядоўгай — гэтую станцыю таксама перакрылі.

Калі яны, ігнаруючы зебры і святлафоры, пераляцелі праезную частку, хлопец затармазіў. Яны некалькі хвілін стаялі і, гледзячы адно на аднаго, сінхронна ўзнаўлялі дыханне.

— А ты стаерка, — аддыхаўшыся, сказаў хлопец.

— Чаго?

— Я кажу, бегаеш добра.

Соня кіўнула.

— У вашай групе, — хлопец дыхаў ужо амаль нармальна. — Чарнявенькая такая дзяўчына ў сінім palітончыку...

— Гэта Лена Канькова, — адказала Соня, усё яшчэ задыхана. — Яна падабаецца Ваню Каланіцкаму.

— Восем сорак. Адсюль паўдарогі. Сілы яшчэ засталіся?

Соня кіўнула.

— Тады ляцім!

Яны прыпусцілі па бульвары. Неўзабаве на нейкім нечаканым павароце ўнізе перад імі адкрыўся будынак вакзала. Яны выйшлі на фінішную прамую.

Калі бачыш мэту, лягчэй бегчы. У Соні як крылы выраслі. Дзякуй табе, Божанька, за тое, што я ў кедах.

Праз нейкія восем хвілін яны ўжо ўзляталі па эскалатары ў цэнтральным холе Кіеўскага вакзала.

Толькі б паспець... Зусім крыху...

Наперадзе ўжо гарэў надпіс «Кіеў — Мінск, 20:55». Гэта быў спуск на платформу.

Каля яго, абапёршыся на парапет, стаяў Максім.

Соня ўжо ледзьве перастаўляла ногі. Загадкавы праважаты фактычна цягнуў яе за руку.

Яны затармазілі каля Статкевіча.

— Дзякуй, Дэн, — сказаў Максім хлопцу і, схапіўшы Соню за другую руку, пацягнуў яе на сходы.

— Няма за што, Макс! — пракрычаў той ім услед, адпускаючы Соню. — Гарачыя вітанні Лене Каньковай!

x x x

І нават стоп-кран зрываць не давялося. Пасля таго як Соня з Максімам заскочылі ў вагон, цягнік яшчэ цэлыя дзве хвіліны стаяў каля платформы.

Ужо ў тамбуры іх перахапіла зялёная ад злосці Ніначка.

— Сінічка, гэта як называецца?!! Ды я ледзь не пасівела! Ты ведаеш, колькі грошай я прагаварыла ў роўмінгу? Ты думаеш, нехта дадасць мне іх да заробку? Што, так цяжка было знайсці «Тэатральную»? Усе чамусьці знайшлі, і толькі ты як заўсёды! Ды я табе ўласнаручна крыжык на мапе паставіла!!!

Соні было што на гэта адказаць, але гаварыць яна не магла. Яна аддыхвалася, прытуліўшыся да сценкі вагона.

— Дзе мае рэчы? — прахрыпела яна, уклініўшыся ў паўзу паміж Ніначкінымі тырадамі.

— Вось не ведаю. Ідзі шукай. Хтосьці ды забраў. Можа быць, — сярдзіта прамовіла Ніначка, упускаючы ў вагон яе ды Максіма.

— Максім, ваў! Новая куртка! — прыязна махалі аднакласніку дзяўчаты-«ашкі».

— Максім, прыходзь піць гарбату!

— Максім, а хто быў твой класненькі сябар?

— Вось, ехаць будзеце з намі. Тут два месцы засталося, — Ніначка паказала Максіму і Соні на плацкартнае купэ, дзе ўжо раскладала вагонную вячэру Віялета Максімаўна. — Як вы разумееце, на верхніх паліцах.

Соня выправілася па заплечнік. На шчасце, знайшоўся ён хутка — у Лены ды Іры.

Ідучы назад, яна думала толькі пра тое, каб хутчэй адкрылі прыбіральні. Тады яна пераапране майку. Тую, што на ёй, трэба было выціскаць ад поту.

Але тут яе вочы слізганулі па адным з адсекаў. У ім Крылова, Віткевіч і Паўзункова, што ўбралася ўжо ў свой ружовы гарнітур, елі «Кіеўскі» торт, адкалупваючы шурпатыя кавалкі пластыкавымі лыжкамі і запіваючы яблычнай газіроўкай «Живчик».

Соня спынілася і люта паглядзела на Віку з Крысцінай.

— Ну вы і сцервы, — сказала яна.

Дзяўчаты намалявалі на тварах непадробнае здзіўленне.

— Гэй, «дэшка», зусім абарзела — на роўным месцы людзей абражаць?!! — рыкнула Паўзункова.

— На роўным месцы? Ды яны сустрэлі мяне на вуліцы і сказалі, што збор — на «Залатых варотах», а не на «Тэатральнай»! — выпаліла Сінічка.

— Не выдумляй, — з непадробным абурэннем сказала Віка. — Нават калі б мы цябе пабачылі, мы наўрад ці сталі б размаўляць з табою.

— Але ж яна праўду кажа, — раптам пачула Соня голас Машы Ротмістравай.

Маша стаяла ў праходзе з коўдрай у руках. «Ашкі», «бэшкі» ды «вэшкі» пачалі з цікаўнасцю вызіраць са сваіх паліц. Некаторыя падышлі бліжэй.

— Ротмістрава, ты чаго?

— Ты ж, Крылова, сама расказвала, як Паўзункова прыдумала падаслаць вас да Сінічкі і сказаць ёй, нібы месца сустрэчы перанеслі.

Віка зрабіла шалёныя вочы і заміргала Ротмістравай: маўляў, ты што, здурэла?

— Ты расказвала гэта на вакзале ўсім нашым дзяўчатам, — як нічога ніякага працягвала Маша.

Тут ужо з суседняга купэ вытыркнулі насы русіца з матэматыцай.

— Чаго ты нас паліш? — ледзь чутна прашыпела Паўзункова.

— Ну, не ўсе чулі аповед Крыловай. Напрыклад, настаўнікі ў гэты час былі занятыя: наладжвалі дастаўку Сінічкі на вакзал. Так што нялішне яшчэ раз паўтарыць гісторыю, раз усе ў зборы.

— Паўзункова, Крылова, гэта праўда? — падскочыла Ніначка.

— Ніна Віталеўна, мы проста хацелі пажартаваць!

— Мы не думалі, што яна паверыць...

— Не думалі?!! Ды я ледзь не пасівела праз вас! Ведаеце, колькі я грошай у роўмінгу прагаварыла?!! Напішы сваёй цётцы, ці хто яна табе, — павярнулася Ніначка да Соні, — яна мне тэлефон абрывае... Вы разумееце, што было б, калі б яна не паспела на цягнік?! Мне давялося б заставацца ў Кіеве! Хто б аплаціў мне дадатковы квіток? Добра, што са Статкевічам быў гэты хлопец! Калі б не ён... Мікалай Іванавіч!!!

— Мікалай Іванавіч! — працягнула Ніначка, калі амёбападобны біёлаг адпачкаваўся ад сваёй сядушкі на ейны покліч. — Вы чулі, што выкінулі вашы дзявіцы?!!

— Ніна Віталеўна, раз усё абышлося, няма сэнсу падымаць такі вэрхал. Прапаную спакойна, узважана абмеркаваць усё па вяртанні.

— Па вяртанні?!! Мікола, ты што, замяць гэта хочаш?!!

— Ніна, давайце выйдзем у тамбур. Непедагагічна высвятляць стасункі пры вучнях.

Гатовая забіць маланкай любога, хто трапіцца ёй пад руку, Ніначка пасунулася ў канец вагона следам за калегам. За імі — мусіць, разнімаць у выпадку патрэбы — пайшла матэматыца.

— Які сорам! А яшчэ староста класа, — пакачала яна галавой, мінаючы Паўзункову.

— Ротмістрава, ты нарвалася!!! — сказала Паўзункова страшным голасам.

— І што ты мне зробіш? — мякка, як нянечка ў душэўнахворай, спыталася Маша. — Байкот мне зладзіш? Дык я толькі за. Раз гэта пазбавіць неабходнасці з табой дачыняцца.

— Нахалеры ты здала нас вучылкам?!

— Шасцёрка!

— Ага. Напішы гэтае слова маркерам мне на парце.

Паўзункова аж затрэслася:

— Ты на што намякаеш?

— Ды я так, вобразна.

— Ты што, сур'ёзна абараняеш гэтую тупіцу? — паказала Паўзункова гелевым пазногцем на Соню, якая ўсё яшчэ стаяла ў праходзе.

Ротмістрава зірнула на Сінічку, а потым зноў павярнулася да Паўзунковай.

— Тупіцу? Наколькі мне вядома, Сінічка добра напісала выніковыя тэсты і трапіла на слуп. А вось ты, Лізавета, якое месца заняла?

Паўзункова маўчала, ненавідна гледзячы на аднакласніцу.

— Нешта я не помню, каб ты была ў спісах... Вой, а што ж ты тады робіш у гэтым вагоне? А-а-а, ну вядома! Чыйсьці тата кіруе Беларускай чыгункай...

Хлопцы, якія сачылі за сваркай, расчаравана засвісталі, як заўзятары на стадыёне.

Ротмістрава вытрымала паўзу, падчас якой з перабольшанай ахайнасцю распрастала коўдру па сваёй верхняй паліцы. Урэшце яна нахілілася да Паўзунковай і з ліслівасцю, за якой была кепска прыхаваная агіда, сказала, гледзячы ёй у вочы:

— Ведаеш, дарагая стараста, часам ажно карціць зладзіць табе працэдуру імпічменту. Проста каб наш клас не асацыяваўся ў іншых з такою поганню, як ты. Але, па-першае, у нас усім усё фіялетава. Па-другое, няма дурных цягнуць на сабе ўсю гэтую абавязалаўку, якую ты так зычліва на сябе ўзваліла. Ну, і па-трэцяе, цябе так феерычна штырыць нават ад такой намінальнай і мінімальнай улады, якую ты сабе ўрвала, што неяк негуманна пазбаўляць цябе адзінай радасці ў тваім жыцці.

Пасля гэтага Ротмістрава падцягнулася на руках і, матлянуўшы прыполам даўжэзнай спадніцы, улеглася на верхнюю паліцу, высунуўшы ў праход ногі ў аранжавых шкарпэтках.

— Манашка сраная, — раз’юшана працадзіла Паўзункова.

Але Ротмістрава наўрад ці гэта пачула, бо ўжо начапіла слухаўкі.

— Як у вас, гуманітарыяў, усё складана, — кінуў хлопец-фізік, праходзячы побач з шклянкамі гарбаты, што пагойдваліся ў падставачках.

— Дзякуй табе, Маша, вялікі, — прашаптала Соня, калі праз колькі хвілін падпільнавала Ротмістраву каля купэ правадніцы.

— Я зрабіла гэта не дзеля цябе, а дзеля справядлівасці, — суха адказала тая.

x x x

— Адпусціў школьніка аднаго ў чужы горад... Прытым што ў дарожных дакументах распісвалася я. Не параіўся нават. Нават не паведаміў... Цяпер па гэтым апошнім чэпэ нічога не хоча рабіць... Увогуле нічога... Хоча ўтаіць ад дырэк-

тара. Ну, вы чулі... І, ведаеце, Віялета Максімаўна, усё яму будзе як з гусі вада...

Цягнік «Кіеў — Мінск» мерна пагойдваўся на рэйках, закалыхваючы ўсіх сваіх пасажыраў. Усіх «ашак», «бэшак» і «вэшак» — не падзяляючы на класы і касты, незалежна ад вынікаў тэста і ўзроўню інтэлекту закалыхваў гэты цягнік. Калыхаў ён і Соню. Пад ёю на ніжняй паліцы гучным шэптам наракала на нялёгкае настаўніцкае жыццё русіца:

— Пачнём з таго, што яму ўвогуле не мусілі даваць гэтае класнае кіраўніцтва... Гэта ж клас лінгвістычнага профілю!.. І што ў выніку?.. Селекцыянаваныя дзеткі прыносяць медалі за алімпіяды — а яму ўсе вяршкі... А потым прызначаць завучам або пусцяць па лініі райана… А ўсё таму, што ён — мужчына! Ну вядома. Ні жонкі, ні дзяцей — толькі кар’еру рабіць. А ты круціся як хочаш...

— Ай, Ніна, што тут гаварыць... Я ўжо сорак гадоў у школе. Заўсёды так было і, паверце мне, будзе...

Аднекуль з нетраў вагона даносіўся мяккі перабор струн. Хорам сёння не спявалі — так натаміла шкаляроў паездка. Цяпер Ваня Каланіцкі аднаасобна брынькаў ціхія песні «на дабранач». Соня пазнала перабор. Гэта была тая самая прыгожая песня, якую ён граў учора ў гатэлі. «Для мілых дзяўчат», — сказаў тады Каланіцкі, але каго ён падманваў: гэта была песня для Лены Каньковай.

Гэта была песня пра тое, што адчувае закаханы ў імгненне перад пацалункам.

*Калі да вуснаў — паўпаловы подыху,*
*Калі да вуснаў — паўпаловы кроку,*
*Здзіўленне выбухае ў тваім позірку,*
*У вачах тваіх азёрна і шырока.*

Максім ляжаў на паліцы насупраць і мерна дыхаў ува сне. Ягоныя вусны, здавалася, былі зусім блізка ад Соніных —

але як жа яны адначасова былі далёка... Паміж імі ляжала не проста яміна плацкарты — паміж імі была непераадольная прорва.

*Штось шэпчаш ты, зачаравана, ціхая —*
*Той шэпт мне рве душу азёрнай хваляй,*
*І забываюся, што ўмею дыхаць я,*
*І што хадзіць умею — забываю…*

— Цяпер ты разумееш, чаму не трэба размаўляць са мной у школе?

Соня прахапілася. Максім глядзеў на яе.

— Бачыш, як цябе ставяць на месца. Сама нарвалася.

Соня моўчкі адвярнулася. Але доўга так ляжаць не змагла. Страшэнна хацелася есці. З абеду ў яе страўніку пабывала толькі марожка. Купіць харчоў у дарогу яна праз свае кіеўскія прыгоды не паспела. А галодная яна вельмі кепска засынае. Соня стала пыхцець і круціцца на паліцы. Пачала спаўзаць коўдра.

— Ты можаш цішэй? Я спрабую спаць.

У Соніным жываце забулькатала. Чорт.

— Ты што, не ела сёння?.. — Максім выгнуўся і, намацаўшы на багажнай паліцы свой заплечнік, выцягнуў адтуль скрутак. — Вось, вазьмі.

— Што гэта?

— Галіцкія пампушкі. Там з курагой і макам. Смачныя, але я ўжо аб’еўся.

*А чорны птах павекаў уздымаецца,*
*Руйнуючы рашучасць мімаволі.*
*І паўпаловы кроку не ступаецца,*
*І застрае паўподыху — у горле.*

Адвярнуўшыся ад Максіма, Соня пачала паволі жаваць пасыпаныя цукровай пудрай пончыкі. Сапраўды смачныя. Хатняя выпечка. Цікава, адкуль ён іх узяў?

Статкевіч за спінай пырснуў смехам.

— Што зноў? — прабуркатала Соня.

— Ты не Сінічка. Ты хамяк. Дабранач.

*Здзіўленне выбухае ў тваім позірку,*
*У вачах тваіх азёрна і шырока,*
*Але да вуснаў — паўпаловы подыху,*
*Але да вуснаў — паўпаловы кроку.**

Дабранач, каханы.

х х х

*Соня і Максім вярнуліся з Кіева, і мама моцна насварылася на Максіма. Праўда, няясна чаму. Як я і прадбачыў, у Соні былі непрыемнасці. Гэтую дуру захапілі ў палон тэрарысты, а Максім і яго сябрук Дэн яе цэлы дзень вызвалялі.*

*Дарма. Лепш бы пакінулі яе ў палоне.*

* Пераклад з украінскай мовы Паўла Свярдлова.

Раздзел XI

# ХТО ТАКІ ДЭН

— Табе абавязкова штодня за мной хадзіць?

— Хачу і хаджу. Нам як бы ў адзін бок.

— Я разумею, што многае табе даецца няпроста, але дарогу ў школу можна было за месяц вывучыць. Надалей будзь так ласкавая — пазбаў мяне свайго таварыства.

— А як жа мама Юля? Яна кажа не хадзіць адной праз лес.

— А ты, бачу, узяла за моду дакладаць ёй кожны свой крок? І мой заадно?

— А раптам тут сапраўды маньякі?

— Не смяшы, Сінічка. Ты сябе ў люстэрка бачыла? Хто на цябе паквапіцца?

— Ты казёл, Статкевіч.

— Сінічка, тут першаклашкі самі ходзяць. Каб заўтра я цябе за сабой не бачыў. Усё. Стой тут. І...

— Не размаўляць з табой у школе?

— Малайчынка. Падлягаеш дрэсіроўцы.

Соня глядзела ў спіну Максіму, які разганяўся ўніз па схіле. Быў першы дзень другой чвэрці.

Палітона ён, дарэчы, так і не надзеў. У Мінску было анамальна цёпла для лістапада.

Пасля вяртання Соні і Максіма з Кіева на Верасовай вуліцы прадказальна выбухнуў скандал. Падчас эвакуацыі

Соні ад Залатых варот усхваляваная Юлія Статкевіч датэлефанавалася Ніначцы, якая, плачучы, апісала гэтую эвакуацыю ўва ўсіх падрабязнасцях. Так мама Юля дазналася, што ейны сын не быў на экскурсіях, а тусаваўся з кіеўскім сябрам. Гэты хлопец, прыйшоўшы з Максімам на вакзал і даведаўшыся, што недзе пасярод Кіева засталася маленькая беларуска, тут жа выклікаўся дапамагчы. Так што дзякуючы Соніным непрыемнасцям маці цяпер была ў курсе Максімавай «самаволкі».

Зранку ў Мінску яны пабачылі маму Юлю з белым ад гневу тварам у натоўпе бацькоў, што сустракалі дзяцей на пероне. Мікалай Іванавіч, нутром адчуўшы нядобрае, віртуозна ўнік сустрэчы з раз’юшанай ільвіцай, таму асноўны ўдар прыняла на сябе Ніначка.

Але і Ніначка ў даўгу не засталася.

«Вы, Ніна, э-э-э, Віталеўна, вядома, не яго класная кіраўніца, але раз вы неслі адказнасць за паездку...» — «Вы, Юлія, э-э-э, Барысаўна, вядома, не Соніна маці, але раз вы ўжо ёй апякуецеся...» — «Як вы, педагог, маглі яго адпусціць, нягледзячы...» — «А як вы, маці, маглі не ведаць, што ён...»

Дарога дадому прайшла ў магільнай цішы.

Не трэба думаць, што вас прынялі ў сям’ю, калі вы — удзельнікі ўсіх сямейных свят. Першая сямейная сварка — вось абрад пасвячэння.

Што праўда, наўпрост перад Соняй мама Юля скандаліць не стала. Але дзяўчына ўсё адно чула ўсё да апошняга слова. Бо Максім і мама сварыліся ў калідоры на другім паверсе, насупраць ейнага пакоя.

— Як ты мог пакінуць Соню адну?!! — грымела мама Юля. — Чужы горад, чужая краіна! Ды яшчэ і Майдан гэты! Калі б, крый божа, нешта з ёй здарылася, як бы ты ейнаму бацьку ў вочы глядзеў?

— Ды калі б не я... Дакладней, калі б не Дэн...

— Твой Дэн — асобная размова! Што ён увогуле рабіў у Кіеве? Яго бацькі ў Кітаі! Чаму ты мне не сказаў, што Даніла ва Украіне?!

— Каб ты на мяне «джыпіэс» павесіла?!

— Ты думаеш, я маці-монстр, думаеш, я цябе не адпусціла б? Чаму ты так паводзішся са мною?..

— Таму, што ты мяне ўвесь час кантралюеш! Лезеш у маё жыццё! Гэтае тваё «хадзі паўсюль з Соняй» мяне ўвогуле выбесіла. Не табе вырашаць, што мне рабіць і чым з кім займацца!

— Значыць, твой выбар — цягацца з гэтым тваім Дэнам, у якога вецер у галаве?! Дзе ты начаваў?! Што вы там елі?!

— Не твая справа!

— Не мая справа?!! Вось выгадавала сыночка! Сабе на гора!!!

Соня пачула здушаныя рыданні. Амаль сінхронна бразнулі дзверы розных пакояў.

Дзяўчына сядзела на падлозе, абхапіўшы калені рукамі. Праз колькі хвілін пачуліся крокі. Соня вызірнула ў калідор.

— Толькі ты не лезь, — адрэзаў Максім. — Ад цябе і так адны непрыемнасці.

— Нельга так з мамай.

— Можа, я сам вырашу, як з ёй можна, а як нельга? Бо гэта мая мама.

— Так, гэта твая мама. А яшчэ... Яна ў цябе заўсёды была.

Максім уважліва паглядзеў на дзяўчыну і пайшоў уніз па сходах.

Соня пагрукалася ў дзверы дарослай спальні Статкевічаў. Зарумзаная мама Юля сядзела з нагамі на сафе перад ложкам. На каленях яна трымала ноўтбук.

— Заходзь, Соня.

— Даруйце мне, калі ласка, — сказала Соня, прысеўшы перад сафою на кіліме. — Я вам няпраўду пісала ў эсэмэсках. Мне вельмі прыкра.

— Ды што ты, сонейка. Пры чым тут ты? Ён жа цябе прымусіў, так? Што я, сына свайго не ведаю...

Жанчына сумна зірнула ў акно, выцершы чарговую слязінку.

— Мама Юля, я хацела спытацца. Што гэта быў за хлопец? Дэн, які мне дапамог...

І, каб падняць гаспадыні дома настрой, Соня пераказала ёй гісторыю пра іх кіеўскі крос. Па магчымасці з гумарам, апускаючы розныя стрэмныя дэталі кшталту п'яных гопнікаў. Спрацавала — мама Юля заўсміхалася.

Толькі пра тое, чаму яна станцыю «пераблытала», Соня змаўчала. Няма чаго ўмешваць дарослых у вайну з Паўзунковай.

— Пазнаю Данілу, — усміхнулася мама Юля скрозь слёзы. — Пяць хвілін на вакзале — і ўжо нагледзеў дзяўчыну.

— Як яны пасябравалі з Максімам?

— О, гэта былі выдатныя часы. Яны разам у школу ў Лондане хадзілі.

І мама Юля з настальгічнай усмешкай адкрыла перад Соняй на ноўтбуку фота чатырох падлеткаў у брытанскай школьнай форме.

Гэтых фота Соня яшчэ не бачыла. У разгляданні бясконцых Статкевічавых альбомаў яна прасунулася толькі да першых крокаў Вадзіка.

Каля лаўкі перад цагляным мурам, на якой былі зваленыя партфелі, стаяў Максім, але гады на чатыры малодшы. У прыгажунчыку побач з ім Соня пазнала свайго кіеўскага праваднікa, але таксама зусім яшчэ малога. Далей абапіралася каленам на лаўку стройная дзяўчына, вельмі падобная да ўкраінца і таксама вельмі прыгожая. Чацвёртым у кампаніі быў скуласты азіяцкі хлопчык.

Усе яны з чагосьці весела смяяліся.

— У гэтую школу прымаюць дзяцей замежнікаў, якія часова жывуць у Брытаніі. Поўны інтэрнацыянал. Але мне ўсё

адно дзіўна, што іх усіх звяло разам. Ну вось Даніла Бандарчук — абсалютная Максімава супрацьлегласць. Жыўчык і язык без касцей. І Ксеня, ягоная сястра. Яны з Данілам двайняты. Таксама балбатушка. Але тут яшчэ можна патлумачыць: братні народ, мова ўрэшце... А вось Коджы як да іх прыбіўся...

— Коджы?

— Садзукі Коджы. Таксама з айцішнай сям'і. Яны з бацькамі стала ў Нью-Ёрку жывуць, але на некалькі гадоў, як і мы, па працы ў Брытанію пераехалі. І вось гэтая чацвёрка паўсюль была разам. У класе разам, пасля школы — разам. Яны і на тэніс разам хадзілі.

— Яны, мусіць, усе такія ж разумныя, як Максім?

— Коджы вельмі старанны хлопец, выдатнік. А Даніла з Ксеняй... У іх здольнасці іншага характару. Зорныя дзеці. Вельмі інтэлігентная сям'я: бацька — дыпламат, маці — з кансерваторскай адукацыяй... А вось Даніла — прафесійны тэнісіст.

— Як Максім?

— Не. Максім непрафесійна гуляе. А гэты — у нацыянальнай зборнай Украіны. А Ксеня — творчая натура...

У Соні заварушылася нехарошае падазрэнне.

— Яна... Таксама была ў Кіеве?

— Не думаю. Акурат яе лёгка адсочваць, — усміхнулася мама Юля. — Цяпер праходзіць тыдзень моды ў Маскве. Ксеня — топ-мадэлька.

Мама Юля хуценька набрала ў гугле «Ксенія Бандарчук» і адкрыла відэаролік. На Соню па подыуме ляцела незямная красуня ў смелай вячаровай сукенцы.

— Што, раўнуеш? — хітра зазірнула Соні ў вочы мама Юля. — Не варта. Ксеня не Максімаў тып.

— Але яна такая прыгожая!

— Прыгожая, не прыгожая... Я мама, я ведаю. Не такія дзяўчаты яго вабяць.

Соня прашчоўкала іншыя лонданскія фота Максіма і ягоных сяброў. Адна рэч падалася ёй вельмі дзіўнай.

— Яны ніколі не глядзяць у камеру. Так, нібы...

— Не ведаюць, што іх здымаюць? Гэта мой фірмовы стыль! — сказала мама Юля. — Ненавіджу, калі пазіруюць. Апроч таго, Максім, калі падрос, вельмі не залюбіў фатаграфавацца. Я часам незаўважна хадзіла за імі. Таму яны тут гарантавана такія, якімі ёсць насамрэч. А не такія, якімі хочуць здавацца дарослым.

— Вы што, і ў нашу школу так хадзілі?

— Хадзіла. Спачатку, — мама Юля адкрыла іншую тэчку, і Соня з хваляваннем пабачыла Максімаў здымак з той самай лінейкі ў дзявятым класе. Той самы момант, калі яна ў яго закахалася. — Але ў вашай школе — ніякай пажывы. Поўная статыка. Ён амаль увесь час адзін. А калі нешта цікавае для аб'ектыва адбываецца, ён хіба раскажа? Напрыклад, вельмі зайздрошчу табе як фатограф наконт іхніх вайсковых збораў.

— Я ўвогуле не магла ўявіць, што ў Максіма могуць быць сябры, — Соня вярнулася да фота шчаслівай чацвёркі.

— Разумееш, ён ніколі не зробіць першы крок. Але і да яго наблізіцца цяжка. Бо на ім панцыр, які трэба ўхітрыцца прабіць. І вось гэтым траім тое ўдалося. Ён вельмі сумаваў па іх, калі мы вярнуліся ў Беларусь. Можа, ад таго яшчэ больш замкнуўся...

У дзверы пагрукалі.

— Мама, прабач, калі ласка, — пачаў Максім з парога. — Так супала, што Даніла на тыдзень прыляцеў у Кіеў на перамовы з Федэрацыяй тэніса. Ён думае зусім вярнуцца на радзіму. Мы гулялі па горадзе, потым схадзілі на канцэрт ягонага ўлюбёнага гурта, а яшчэ Дэн вазіў мяне на корт, дзе будзе трэнавацца. Жылі мы ў ягонай бабулі. Яны перавезлі яе ў Кіеў з-пад Львова. Пані Стэфанія да адвалу карміла нас баршчом і пампушкамі. Вось, табе гарачыя вітанні ад яе, — і ён паклаў на камоду скрынку цукерак і плеценую сур-

вэтку. — Ну, я яшчэ пазней зайду, — сказаў ён, хутка зіркнуўшы на Соню, і выйшаў.

— Так хутка перапрасіў. І што на яго найшло? — мама Юля выцерла апошнія слязінкі.

А Соня сама сабе ўсміхнулася. Здаецца, цяпер яна крышачку лепей разумела Максіма.

...Соня стаяла на пагорку, пакуль Статкевіч не знік за будынкамі. Яна знойдзе, як іначай заваяваць ягонае сэрца. З сёння яна не будзе за ім бегаць.

Так падумала Соня Сінічка, але пагарачылася.

Раздзел XII

# ШВЕДСКАЯ ЭСТАФЕТА

Андрэй Васілевіч Лабановіч з дзяцінства ведаў, што будзе працаваць у школе.

Толькі вось, скончыўшы біяфак і пераступіўшы парог кабінета, дзе ў куце з фікусавых зараснікаў вытыркаў чалавечы шкілет, а на сценах выцвіталі фоташпалеры з белавежскім зубром, ён зразумеў, што памыліўся з пакліканнем. Сеяць разумнае, добрае, вечнае яму зусім не падабалася. Думаў, апетыт прыйдзе ў час яды — але пацягнуліся гады, вырваныя з жыцця. Ён уладкоўваўся ў модныя школы, прэстыжныя гімназіі і ліцэі, думаючы, што ў ягоным дыскамфорце вінаватыя «не тыя» дзеці або «не той» педкалектыў, але паўсюль паўтаралася адно і тое ж. Трэба нешта мяняць, пакуль не позна, падумаў ён і завочна паступіў у эканамічны на менеджмент.

І вось на сорак другім годзе жыцця, калі ён быў гатовы кінуць працу настаўніка і сысці ў бізнес, яму зрабілі прапанову, ад якой ён не змог адмовіцца.

Дырэктарка 234-й школы ў -скім раёне сышла на не надта ёю заслужаны адпачынак, пакінуўшы пасля сябе руіны — як у простым, так і ў пераносным сэнсе. Ўратаваць сітуацыю мог толькі энергічны адміністратар на пару з інспектарам па справах непаўналетніх. Калі Лабановіча, простага настаўніка, няхай і вышэйшай катэгорыі, запрасілі ажно ў Мінадука-

цыі і, прапанаваўшы крэсла дырэктара аварыйнай школы, далі карт-бланш на любыя ініцыятывы, той зразумеў, што пакліканне заўсёды было побач.

Упершыню ён пабачыў гэтую школу зімою, амаль тры гады таму. Не вытрываў: знайшоў яе ў той жа дзень, калі пагадзіўся на пасаду. Толькі прайшоў першы сур'ёзны снегапад, і на аблупленым школьным ганку высілася снежная фартэцыя. Атрад расхрыстаных пацанятаў стаяў за ёю, закідваючы белымі снарадамі ўсё, што рухалася. Зіхоткі снег пад вокнамі быў спрэс у шэрых праталінках ад недапалкаў. Раптам Лабановіч аслеп на адно вока. Проста ў акуляры яму ўляпілі сняжок.

Гэта было балюча, але Лабановіч зняў акуляры і, мружачыся, усміхнуўся. Лепш быць першым у вёсцы, чым другім у імперыі, казаў Юлій Цэзар. Нарэшце Лабановіч трапіў па адрасе.

Цяпер, пагодным днём у пачатку лістапада, ён стаяў ва ўласным кабінеце каля наварочанай эспрэса-машыны і напаўняў філіжанкі духмянай кавай. Былі восеньскія вакацыі — той час, калі настаўнікам усё адно трэба хадзіць у школу, але можна крышачку перадыхнуць ад вучняў, сшыткаў і план-канспектаў. У «чыл-аўце», як празвалі кабінет вучні, — прасторным пакоі, абстаўленым канапамі і фатэлямі, — некалькі падначаленых засяроджана сачылі за дырэктарскімі рухамі. На журнальным століку высіліся вазы з цукеркамі і пячэнькамі.

— А вам, Ніна Віталеўна, з малаком ці без?..

Настрой у дырэктара 234-й школы быў самы пазітыўны. А гэта ніколі не звеставала нічога добрага. Пагатоў на каву было запрошанае сапраўды выбранае таварыства — усе пяцёра класных кіраўнікоў адзінаццатых класаў. Некаторыя адмыслова дзеля гэтай кавы прыехалі ў школу.

У гэткай нязмушанай, нефармальнай атмасферы Андрэй Васілевіч звычайна праводзіў свае таталітарныя планёркі.

— Я сабраў вас, — урачыста пачаў ён, далучыўшыся з філіжанкай да калег, — каб выказаць некаторую занепакоенасць справамі адзінаццатай паралелі...

Пяць пар вачэй са здзіўленнем уперыліся ў дырэктара.

— О, не хвалюйцеся, я не пра адзнакі, — сказаў той і з асалодай адсёрбнуў з філіжанкі. — З імі ўсё выдатна. Ну, амаль выдатна, — скасавурыўся ён на Ніначку, — але гаворка сапраўды не пра гэта. Мы складалі справаздачы ў райана па выніках першай чвэрці, і я заўважыў адну прыкрую рэч. Адзінаццатыя класы фактычна не бралі ўдзелу ў пазашкольных мерапрыемствах.

Пасля некаторага маўчання настаўнікі пачалі наперабой апраўдвацца:

— Андрэй Васілевіч, гэта ж выпускнікі!

— Вялікая нагрузка: мы і вучыць іх не паспяваем, куды яшчэ капуснікі!

— Праграма як у ліцэях, а гадзін...

— А гэтыя савецкія перажыткі? У мінулым месяцы прыходжу — а мой «Б» клас знялі з фізікі, і яны лісце ў двары грабуць, як «Зелянбуд» нейкі! А іхні настаўнік, між іншага, кандыдат навук! Заняты чалавек! Ён у нас паводле дамоўленасці выкладае!

— А яшчэ дзяжурства гэтае!

— Стоп, стоп, стоп. Я ўсё разумею. Але ёсць нормы, ведамасці, і ў іх трэба нешта пісаць. Напрыклад, канцэрт на Дзень настаўніка. Ніводнага нумара ад адзінаццатых класаў! А мы не можам займацца прыпіскамі! А раптам праверка? Нагадваю, што мы падаём на статус гімназіі. Усё мусіць быць узорна-паказальна!

— Мой 11 «Д» рассоўваў крэслы перад дыскатэкай!

— Ніна Віталеўна, мы, вядома, дадамо такую яскравую дэталь у справаздачу, але гэтага недастаткова... Ваша паралель і ў мінулыя гады не вылучалася актыўнасцю. Мікалай Іванавіч, асабліва «А» клас.

— Э-э-э, м-м-м, прашу мець на ўвазе наш статус. У дзяцей вучоба, рэпетытары. У мяне дваццаць чалавек з трыццаці прэтэндуюць на медалі. Пагатоў у другой чвэрці раённыя алімпіяды. Самі ведаеце. Дарэчы, у нас ужо ёсць адзін пазашкольны вынік — перамога ў турніры «Што? Дзе? Калі?» у Мазыры.

— У інтэлектуальныя гульні ў вас гуляе толькі Марыя Ротмістрава. Прычым у гарадскім клубе. Яшчэ раз паўтараю: займацца прыпіскамі нам не да твару. Мы паставілі планку і мусім яе трымаць. Такім чынам, наша задача — паўнавартаснае супольнае мерапрыемства, якое з'яднала б вучняў адзінаццатых класаў і станоўча ўразіла райана.

— Я баюся, Андрэй Васілевіч, — запярэчыў Іванавіч, — што гэта невыканальна. Не ўсе адзінаццатыя класы здатныя на інтэлектуальную кааперацыю. Некаторыя вучні ў нас вельмі нізкага ўзроўню.

— Гэта вы пра каго?!!

— Ніна Віталеўна, я не хацеў вас абразіць, але давайце зірнём праўдзе ў вочы. Што супольнага можа быць у 11 «Д» і 11 «А»?

— Думаю, я ведаю адказ, — асляпляльна ўсміхнуўся Лабановіч. Ён падышоў да акна прыёмнай і эфектным рухам раскрыў жалюзі.

Рабочыя замацоўвалі даражэзныя з выгляду футбольныя брамы на бяскрайнім полі, дзе ўжо зелянеў гумавы траўнік. Вакол гэтай смарагдавай красы закальцоўваліся цагельныя авалы дарожак. Давяршалі ікебану жоўтыя і белыя крэслы на трыбуне, якую іншыя рабочыя ўсталёўвалі на дальнім ад школы ўскрайку стадыёна. За праваю брамай ужо высіліся баскетбольныя стойкі з колцамі і слупы для валейбольнай сеткі.

— «Холдынг-Молдынг» падтрымаў фінансамі! — пахваліўся дырэктар. — Паставілі ўсё ў самыя сціслыя тэрміны. Нам дзіка пашанцавала, што адзін з топ-менеджараў не про-

ста даверыў нам усіх траіх дзяцей, але і любіць спорт гэтак жа, як яго люблю я... Паводле дакументаў, «дарослы» стадыён тут планавалі яшчэ ў час СССР. Але, відаць, не дайшлі рукі. А цяпер гэта не проста звышсучасны спартыўны аб'ект для школьнікаў, гэта наш козыр! Адзіны стадыён такога ўзроўню не толькі ў нашым раёне, але і ва ўсім Мінску. Я ўжо запланаваў урачыстае адкрыццё ў наступную суботу. І ў гэтым мне дапамогуць вашы вучні.

— Але Андрэй Васілевіч!..

— Не хвалюйцеся, я ўсё прадумаў, — дырэктар падляцеў да белай дошкі ў куце прыёмнай і зняў каўпачок з маркера: — Мы правядзём спаборніцтва па лёгкай атлетыцы. Мой любімы від — мідлі, або шведская эстафета. Паўтара кіламетра. Два забегі. Ад кожнага класа пабягуць чатыры юнакі і чатыры дзяўчыны...

— Восем чалавек ад класа?!! Андрэй Васілевіч, гэта нерэальна!!!

— Згода. Тады — гендарна карэктны варыянт. Змяшаны забег: два юнакі, дзве дзяўчыны ад класа, але ў гэтым выпадку — чатыры кіламетры! Першы ўдзельнік бяжыць 400 метраў, другі 800, трэці 1200 і нарэшце — 1600 метраў! Надзвычай відовішчна. Мы запросім у судзейства прадстаўнікоў райана, заангажуем танцавальны калектыў, я арганізую прэсу, а потым у сталоўцы зладзім уручэнне прызоў і гарбату з пірожнымі для бегуноў ды іх заўзятараў за кошт «Холдынг-Молдынгу»... Ну што? Пытанні, дапаўненні, прапановы?

— Ды мы і па чатыры чалавекі не збяром!

— А за дзясяткі па фізкультуры?

— Ды што вы!.. Іх так танна не купіш!

— Ну, добра. Школе падарылі плазму. Мы павесім яе ў кабінет таго класа, які выйграе эстафету... Далей. Важна данесці да грамадскасці: у нашай без пяці хвілін гімназіі ў здаровым целе — здаровы дух. Эстафета — гэта не проста від

спорту. Гэта сімвал роўных магчымасцей для ўсіх, метафара працы ў камандзе... Спадзяюся, Мікалай Іванавіч, ад англійскага класа абавязкова пабяжыць Максім Статкевіч. І яшчэ Марк Бергер. Нашы выдатнікі вучобы і спартсмены.

— Статкевіч наўрад ці пагодзіцца.

— Трэба, каб пагадзіўся... На яго ўсе дзяўчаты зляцяцца. Хоць трыбуны запоўнім.

— Выклікалі, шэф?

— Ала Юр'еўна! Вы акурат учасна, — узрадаваўся Лабановіч. — Як вам ідэя... У першую суботу чвэрці — мідлі, чатыры кэмэ, змяшаны забег. Абновім стадыёнчык, пакуль снегам не замяло?

— Гэта можна, — сказала Ала Юр'еўна і драпежна ўсміхнулася.

x x x

Прынята было лічыць, што ў Соні няма ніякіх талентаў. Але гэта была няпраўда. Прынамсі адну рэч Соня ўмела рабіць надзіва добра. Соня добра бегала на доўгія дыстанцыі.

Стаметроўку яна прабягала сярэдненька — ледзьве ўкладалася ў нарматывы. А вось калі справа даходзіла да кросу, без цяжкасцей абганяла ўсіх аднагодак, нават самых фізічна развітых і спрытных.

Гэтую Соніну асаблівасць яшчэ ў сёмым класе запрыкмеціла Ала Юр'еўна, якая адразу задалася мэтай зрабіць з Соні лёгкаатлетку. Соні, праўда, бегаць было нецікава, і хадзіць у секцыю яна адмовілася. Фізручка, аднак, усё адно запірала яе на розныя міжшкольныя спаборніцтвы — у дзявятым класе Соня нават прыбегла другой на раённым кросе на тры кіламетры, трапіўшы такім чынам на гарадскі этап. Гэтым, да расчаравання фізручкі, ейныя спартыўныя дасягненні абмежаваліся.

— Крэпенькая юніёрская бронза, — уздыхаючы, казала настаўніца, гледзячы на секундамер, калі Соня чарговага

разу добра фінішавала на фізры. — Разумееш, талент у цябе, Сінічка. Трывушчая ты. Умееш сілы размяркоўваць. І дыхаеш правільна. Іншыя гэтаму гадамі вучацца. І што табе замінае на спаборніцтвах выкладацца?

Замінала Соні тое, што яна страшэнна не любіла спорту. Не разумела, навошта гэта ўсё. Ну бяжыш. Ну прыбегла. Ты першая. І што далей?

Так што, калі па школе пайшла пагалоска, маўляў, адзінаццатыя класы пабягуць эстафету на адкрыцці новага стадыёна, Сінічка, прадчуваючы чарговы спартыўны прыгон, вельмі неахвотна пераапраналася на фізкультуру.

Да таго ж зранку ім усім настрой папсаваў Вася. Дакладней, не ён сам, а тое, што ў першы ж дзень заняткаў завуч залавіла яго каля школы з цыгарэтай. Парушальніка дысцыпліны тут жа даставілі ў дырэктарскі кабінет, дзе той атрымаў апошняе кітайскае папярэджанне. Такія вучні, як Вася ці ягоныя таварышы Лысы і Дубовік, былі ў дырэктара на алоўку: ён спаў і бачыў, як выкідвае іх са школы. Дырэктар верыў, што тым самым паляпшае мікраклімат у калектыве і статыстыку паспяховасці.

— Спадзяюся, вы ўжо чулі пра эстафету, — сказала Ала Юр’еўна, калі «Д» клас пашыхтаваўся перад ёй на пятым уроку.

— У-у-у.

— Прапаноўваю хуценька вызначыць, якім складам вы пабяжыце.

— Ы-ы-ы.

— Ну, давайце, «Д» клас, вы маеце шанц паказаць, што хоць на нешта здольныя.

— Э-э-э!

— Прыз за першае месца — плазменны тэлевізар...

— О-о-о!

— ...у кабінет класа-пераможцы.

— А-а-а...

— Добра. Жаночую частку каманды я бачу так: Макей і Сінічка.

— Е-е-е!

— Хлопцы?..

— А хто будзе ад іншых класаў?

— Якая вам розніца?

— Ну-у-у...

— Пакуль цалкам заявілася толькі каманда 11 «А».

— І-і-і?

— Ну, раз вам так прынцыпова... Крылова, Паўзункова, Бергер, Статкевіч.

— Гэты баклажан бяжыць?!! Тады і мяне запішыце!

— Цудоўна. Васілеўскі! Хто яшчэ?

— І Жэку Дубовіка са мной запішыце!

— Дарэчы, а дзе сам Дубовік?

— Ды пабяжыць ён! Куды ён падзенецца?

— Ну вось і добра. Заўтра пасля сёмага ўрока вы чацвёра прыходзіце на стадыён у форме для вуліцы. Буду тлумачыць правілы эстафеты...

— Гэта здорава, што Васілеўскі завёўся супраць Статкевіча, — сказала Снежка, калі дзяўчаты рабілі выгляд, што качаюць прэс на матах. — Дзірык пабачыць, як ён актыўнічае, і запіша яму плюсік.

— Ды ладна. Ён бы і так выклікаўся бегчы. Каб падтрымаць Сініцу, — запярэчыла Галя.

— Ой, не думаю. Сініца Сініцай, але Вася не пераносіць дзірыка і ўсяго, з ім звязанага. А эстафету ён сёння абвясціў чарговым дырэктарскім прыбабахам. І вось раптам у бегуны запісваецца. Дзірыка ён, вядома, моцна ненавідзіць, бо той яго пасля восьмага класа хацеў са школы выперці, але з часу як Соня напісала ліст, Статкевіча ён ненавідзіць яшчэ болей. Так што, Соня, ускосна гэта ўсё дзякуючы табе... Гэй, Соня?

— Ты што, не бачыш? Гэта не Соня, гэта вожык у тумане. Яна ж бяжыць з Максі-і-мам!

— Не з ім, а супраць яго!

— Якая розніца? Каханне не разбірае.

— А? Што?

— Прачынайся, кажу. Званок праз хвіліну.

x x x

У аўторак пасля вытворчай практыкі Соня сядзела на трыбунах, чакаючы фізручку. Побач уладкавалася Аліна Макей — Соніна таварышка ў няшчасці. Аліна добра бегала кароткія дыстанцыі. Галя і Снежка таксама былі тут: прыйшлі падтрымаць сяброўак. Вася і Дубовік насіліся па полі з васьмікласнікамі, ганяючы мяч, — аматары «футбіка» ўжо два дні не вылазілі з новага стадыёна.

Пакрысе збіраліся эстафетныя каманды іншых класаў. Прыйшлі Лена Канькова, Іра Жданок, Ваня Каланіцкі і яшчэ адзін фізік, якога Соня не ведала. «Бэшкі» прывіталі яе, як старую знаёмую. На супрацьлеглым канцы трыбуны тусаваліся «ашкі»: Ліза Паўзункова, Віка Крылова і Марк Бергер — высокі чарнявы хлопец, які займаўся ў валейбольнай секцыі. Максіма нідзе не было. Гледзячы на зыркі ружовы гарнітур старасты «ашак», Соня ўсміхнулася: згадала, як Ротмістрава раскатала тую ў блін па дарозе з Кіева.

— А, слухайце навіны, — схамянулася Галя, калі фізікі адышліся. — Я ж да Машкі хадзіла. Меркі здымаць. Яна мне замовіла спадніцу. Дык вось, у «А» класе — раскол.

— А што, у іх калі-небудзь было святое братэрства? — хмыкнула Снежка.

— Не, зусім раскол. Раскол Раскольнікаў. Карацей, калі я правільна зразумела, мама Статкевіча патэлефанавала дзірыку і запатрабавала ад яго крыві Паўзунковай.

Соня кіўнула. Пра тое, чаму Соня заблукала ў Кіеве, маці радасна паведаміў Максім. Хлопец не забыў звязаць паўзункоўскія інтрыгі з вясельным калажыкам, каб лішняга

разу абудзіць у маме Юлі пачуццё віны за зводніцтва. Тая так раззлавалася, што стала шукаць тэлефон Лізавеціных бацькоў, але потым даўмелася патэлефанаваць у школу. Дырэктар уваліў класнаму «ашак», а Ніначку пахваліў, бо тая ў крытычнай сітуацыі не разгубілася, вывезла дзяцей з цэнтра горада на вакзал, пакуль міліцыя не перакрыла метро, і ўрэшце прыдумала, як ратаваць Сінічку. Сёння на літаратуры Ніначка пятнаццаць хвілін расказвала пра Міхаіла Булгакава, яшчэ дваццаць — пра яго выдатны дом-музей, а рэшту часу — пра свой педагагічны гераізм, праяўлены ў Кіеве.

— Дык вось, — працягнула Галя, — дзірык сказаў Іванавічу разабрацца з Паўзунковай. І той пакінуў «ашак» пасля ўрокаў, сказаў, што падманваць няхораша, і замуціў перавыбары старасты.

— Ды ну?

— Ага. Але «электарат» ужо быў як след падрыхтаваны. Паўзункоўская каманда ўзнялася і сказала, што іх усё задавальняе. Потым Віткевіч штурханула спіч пра заслугі правадыра перад нацыяй. Рэшта класа проста прамаўчала. Карацей, засталася Паўзункова пры пасадзе.

— Я не разумею, чаму Ротмістрава не выступіла, — нахмурылася Снежка. — Яна ж Паўзункову ненавідзіць.

— Яна кажа, што староста — дурная праца і выконваць яе нармальным людзям ляніва, — уставіла шэлег Соня.

— А ты адкуль ведаеш?

Соня нагадала сяброўкам пра сутычку Паўзунковай і Ротмістравай у цягніку.

— Казала ж я табе, Соня... Ротмістрава класная, — прамовіла Снежка, задаволена смеючыся.

— Ну так, — уздыхнула Соня. — Нават не забаялася, што гэтыя гадаўкі могуць зацкаваць яе.

— А чаго ёй баяцца? — паціснула плячыма Галя. — Па-першае, ёй пофіг на клас. У яе ўсе сябры — у клубе «Што? Дзе? Калі?». У школе яна не тусуецца. Машка ж не толькі

Паўзункову не трывае, а ўсіх дзяўчат з «А». Кажа, што палова з іх — завучкі, а другая палова — сцервы. Кажа, у іх толькі хлопцы збольшага нармальныя. Але іх мала. А па-другое, пасля ўчарашняга Паўзунковай не да юру, абы вынесці скуру.

— А што здарылася?

— О-о-о! Яна тут жа, на роўным месцы падставілася! Не апраўдала народнага даверу. Пасля перавыбараў Іванавіч выклікаў яе на калідор і сказаў разруліць эстафету. Падліза паляцела на крылах ночы ў спартзалу і даведалася, што трэба скласці каманду ад класа, прычым дзірык ужо асабіста запрасіў Бергера і Статкевіча. І тады яна хуценька ўпісала Крылову і сябе.

— Ты гоніш!

— Прыкінь! Прычым Машка дапускае, што Паўзункова гэта зрабіла з найлепшых памкненняў. «Ашкі» ігнаруюць усё, што можна ігнараваць, і Падліза прызвычаілася кідацца грудзямі на амбразуры і ўсяляк імітаваць сацыяльную актыўнасць. І ніхто б нават не заўважыў ейнай ахвяры на алтар міру і спакою, калі б Статкевіч не пагадзіўся бегчы... Карацей, яе ж сяброўкі закацілі ёй істэрыку, чаму яна не расказала пра эстафету, чаму не запрасіла іншых у каманду, чаму бягуць такія каровы... Енк стаяў на тры паверхі. Асабліва заходзілася Віткевіч, якая фактычна адмазала Паўзункову ад перавыбараў. У выніку Падліза перасварылася з паловай класа, там паходу над ёй самой байкот навісае, так што ёй цяпер не да інтрыг...

Дзяўчаты злацешна захіхікалі. Паўзункова засяроджана махала нагамі на дарожцы, размінаючыся перад бегам. Тоўстай яна не была, але з такой камплекцыяй ёй бы ядро штурхаць, а не кросы бегаць.

— Ты, Галька, не помніш: яна малая, здаецца, мастацкай гімнастыкай займалася? — спыталася Снежка.

— Ага. У цяжкай вагавой катэгорыі, — саркастычна прамовіла Аліна.

Яны б яшчэ доўга перамывалі косці «ашкам», але тут над трыбунамі пачуўся свісток. Соня і Аліна неахвотна ўзняліся са сваіх месцаў. Ала Юр'еўна пачынала інструктаж.

— Як вы думаеце, што самае цяжкае ў эстафеце? — звярнулася фізручка да купкі школьнікаў, што пасела перад ёй на трыбунах. Калісьці яна прафесійна займалася лёгкай атлетыкай, таму ейныя вочы блішчэлі настальгіяй і фанатызмам.

— М-м-м?

— Самае цяжкае ў эстафеце — правільна перадаць палачку, — урачыста прамовіла Ала Юр'еўна, прадэманстраваўшы доўгі цыліндр чырвонага колеру, які трымала ў руцэ.

Падлеткі недаверліва захмыкалі.

— У мяне таксама ёсць такая палачка! — сказаў Дубовік, але засмяяўся толькі Васілеўскі.

— Вельмі дасціпна, — скрывілася настаўніца.

— «Д» клас дэманструе свой узровень, — пракаментаваў хтосьці з «гэшак».

— Добра, жартаўнік, хадзі сюды і паспрабуй перадаць Васілеўскаму эстафету, — загадала Ала Юр'еўна.

Вася з гатоўнасцю ўстаў на адну з дарожак, а Дубовік, адышоўшыся падалей, разагнаўся з палачкай у руцэ наўпрост на сябрука. Вася павярнуўся да яго тварам, выцягнуўшы наперад руку і заступіўшы сабой усю дарожку. Калі паміж хлопцамі заставалася пяць метраў, Дубовік скеміў, што нешта не так, і пачаў экстранна тармазіць, але цалкам спыніцца не здолеў. Ён з разгону ўрэзаўся ў Васю — і хлопцы паваліліся, як снапы. Палачка, выпаўшы з рукі Дубовіка, пакацілася на футбольнае поле.

Гледачы разрагаталіся.

— Ну што, пераканаліся? — трыумфальна спыталася фізручка. — Пра адзін гэты момант напісаныя цэлыя падручнікі. Існуюць нават матэматычныя формулы, якія дапамагаюць бегунам не згубіць секунд на перадаванні... А вы думалі, толькі вы задачкі ў класах рашаеце? У спорце трэба думаць

галавой... Разбіваемся на пары, разбіраем палачкі. Будзем вучыцца прымаць і перадаваць эстафету... Статкевіч!!!

Соня абярнулася. Максім падыходзіў да іх па беражку стадыёна.

— Ты чаму без формы?!!

— Ала Юр'еўна, я прыйшоў сказаць, што не магу тут заставацца, бо інакш спазнюся на корт.

— Але ў нас таксама занятак!

— Я чытаў правілы эстафеты. Я прабягу ў суботу.

— Мы праходзім важны элемент! Яго трэба адпрацаваць у камандзе!

— Але я сапраўды не магу сёння застацца.

— Максім, ты зараз станеш на дарожку ў пару да Крыловай і будзеш вучыцца разам з усімі!

— Не вам загадаваць мне, што і калі рабіць, — нахмурыўся хлопец.

— Што, Статкевіч, зноў засцаў? Баішся, што ўсе пабачаць, які ты слабак завучаны? — злосна выкрыкнуў Вася. — Давай, валі! Сустрэнемся ў суботу, калі ты зліеш мне забег!

— Хочаш сказаць, «Д» клас хоць у чымсьці стане першым? — хмыкнуў Статкевіч. — Вельмі сумняваюся. Усяго добрага, — кіўнуў ён фізручцы і пайшоў да брамкі, якая вяла ў бок казачнага лесу.

Усе дзяўчаты на стадыёне праводзілі яго вачыма.

— І вось як на яго злавацца? — задуменна сказала сабе пад нос Ала Юр'еўна.

x x x

І ўсё-ткі за адну рэч Соня была спорту вельмі ўдзячная. За рэдкія гадзіны, якія магла бавіць з татам.

Амаль усе вечары, выхадныя і святы Пётр Сінічка працаваў у рэстарацыі, бо тады быў самы наплыў кліентаў і трэба было кіраваць працэсам. Адзін кухар не даваў рады з замо-

вамі, афіцыянткі збіваліся з ног, і таму тата разрываўся паміж плітой і касай. Але ў тыя вечары, калі граў «Манчэстар Юнайтэд», ён як штык быў дома да пачатку гульні. Калі Сінічкі жылі ў інтэрнаце, мужчыны збіраліся на футбол па чарзе ў кагосьці з суседзяў, а часам выносілі тэлевізар на калідор — і Соня заўсёды таксама ішла глядзець матч. Часта яна нават не ўздымала вачэй на экран тэлевізара, а ўладкоўвалася ў кутку з кнігай і сачыла хутчэй за татам: як ён гіпнатызуе экран, як перажывае за галы, прапушчаныя «Манчэстарам», і цешыцца забітым. Ёй падабалася, як тата звяртаецца да яе, каментуючы тое, што адбылося на полі. Падабалася, як у перапынку ён абмяркоўвае з ёю імаверны вынік гульні і пераказвае плёткі пра футбалістаў і трэнераў «Манчэстара».

Калі пару гадоў таму тата закупіў вялікія плоскія тэлевізары, каб паказваць футбол наведнікам рэстарацыі, Соня перажывала, што сямейным вечарам надыдзе канец. Але Пётр Сінічка сваёй звычцы глядзець футбол дома не здрадзіў.

Таму, калі, ідучы са школы, Соня атрымала эсэмэску: «Дачушка, рыхтуйся: сёння футбол!» — ейнае сэрца закалацілася ад радасці.

А восьмай вечара дзяўчына спусцілася ў гасцёўню Статкевічаў, дзе ўжо засядаў на канапе тата Віця. Ён таксама выявіўся заўзятарам «Манчэстара» і вярнуўся з працы раней, чым звычайна. Неўзабаве знадворку загуў, спыняючыся, матор — і Сонін тата ўляцеў у дом:

— Ледзьве паспеў! Не ведаю, як мяне ДАІ не спыніла з такою яздою! — узрадавана закрычаў ён. — Ну што, пачынаецца?

Соня сядзела ў фатэлі і праглядала фотаальбомы мамы Юлі з паездак па Еўропе. Яе і Максімаў тата зліліся ў футбольным экстазе з тэлевізарам. Здаецца, яны ўпершыню разам глядзелі футбол пасля таго, як уз'ядналіся.

— А я ж, Пятруха, на іхнім стадыёне быў, калі яны гралі. У Трэфардзе! З «Ліверпулем», чатыры гады таму!.. Го-о-ол!

Здаецца, «Манчэстар» забіў камусьці два галы да перапынку. Тата выглядаў абсалютна шчаслівым.

Рыпнулі масніцы на сходах. У гасцёўню спусціўся Максім. Ён падышоў да лядоўні наліць сабе соку.

— А ты, Максім, не цікавішся футболам? — спытаўся Сонін тата. Акурат ішла рэклама паміж таймамі.

— Не-а. Забава для пралетарыяту. Я гляджу біятлон. Ну і, само сабой, тэніс.

— Зразумеў, Пятруха, хто мы з табою? Пралетарыят! — засмяяўся тата Віця.

— Дык ясна, што тэніс, — заківаў Сонін тата.— Дарэчы, я чуў, ты на вакацыях у турніры перамог.

— Ну, гэта быў несур'ёзны турнір. Можна сказаць, міжсабойчык. На прызы спонсара.

— Але ўсё адно! Гэта ж не першая твая перамога. Дзіўна, што ты не захацеў займацца прафесійна.

— Навошта? — пацінуў плячыма Статкевіч. — Я гуляю для сябе. Апроч таго, у гэтым спорце трэба з чатырох гадоў пачынаць, каб выбіцца. А прысвячаць жыццё таму, каб быць васьмісотай ракеткай свету, неяк па-дурному.

— Я часам здзіўляюся, як яму ўдаецца перамагаць, калі ён так мала займаецца, — з гонарам сказаў тата Віця.

— Я проста прыкмячаю слабыя бакі саперніка і паварочваю іх на сваю карысць, — стрымана прамовіў Максім.

— А мы Соню таксама ў вялікі тэніс аддавалі, — сказаў Сінічка, — у шэсць гадоў. Толькі нічога з гэтага не выйшла.

Вядома ж, не выйшла. Соня добра памятала, як аднойчы бабуля завяла яе ў вялікі ангар, прапахлы потам. Упоперак ангара былі ў радочак нацягнутыя бурыя ад бруду сеткі, на якіх сям-там перацерліся канацікі. Соню адзелі ў шорты ды футболачку і ўручылі ёй аблупленую драўляную ракетку. Гэтую ракетку ім бясплатна аддалі знаёмыя. Бабуля і тата падумалі: няхай дзіця паспрабуе. Калі ў дзяўчынцы нешта ёсць, варта будзе ўкласціся ў прафесійны рыштунак.

Вось толькі трэнер быў з вялізнай кагорты тых, хто не верыў у Соню Сінічку. «Забярыце ад мяне гэтае непаразуменне! — нязменна казаў ён бабулі, калі тая прыходзіла па ўнучку пасля занятку. — Або купіце ёй нармальную ракетку».

Прыстойна адбіваць мяч не тое што злева — справа — Соня так і не навучылася. І праз год тэніс занядбала.

На фігурным катанні, куды яе аддалі ў другім класе, паўтарылася гэткая ж гісторыя.

А потым бабуля памерла, і вадзіць яе ў спартыўныя секцыі больш не было каму.

— Тата, у суботу зранку я бягу эстафету на новым школьным стадыёне, — сказала Соня, каб памяняць тэму. — Прыходзь паглядзець, добра? І Максім таксама пабяжыць, — сказала яна, хутка зірнуўшы на хлопца.

— Соня, вы з Максімам бяжыце эстафету? Што ж вы маўчалі? — мама Юля высунула з гаспадарчага пакоя свой курносы носік. — Божухна, які цудоўны месяц! Спачатку тэнісны турнір, а цяпер гэта! Столькі пажывы для маёй камеры! Вядома ж, Соня, твой тата будзе. Мы ўсе будзем на трыбунах! Трэба надрукаваць расцяжку!

— Я не буду ўдзельнічаць, — раптам сказаў Максім.

— Сына, ты чаго? Ты абавязкова мусіш! Ты ж падвядзеш Сонечку!

— Пры чым тут яна? — раздражніўся хлопец. — Я не магу яе падвесці, бо мы ў розных класах. Я проста не хачу мець нічога агульнага з гэтай паказухай. Спачатку на каленях упрошваюць бегчы, а потым выстаўляюць нейкія прэтэнзіі, нібы я ім штосьці вінны. Надрывацца дзеля галачкі? Заўтра папрашу, каб мяне выкраслілі.

Хлопец паставіў пустую шклянку ў пасудамыйку і пайшоў наверх, засунуўшы рукі ў кішэні джынсаў.

...Соня, не міргаючы, глядзела на здымак рымскага Калізея ў альбоме, што ляжаў у яе на каленях. Мужчыны зноў засяродзіліся на тэлевізары, бо пачаўся другі тайм. Мама Юля

сядзела ў інтэрнэце за хатнім камп'ютарам. Соня згадвала, як Вася апошнімі словамі лаяў Максіма, калі яны вучыліся перадаваць палачку. Як ён старанна капіяваў усе пазіцыі, якія паказвала ім фізручка, як потым яны яшчэ на паўгадзіны затрымаліся на стадыёне, паўтараючы рухі. Трэба было пачынаць разгон, калі папярэдні бягун амаль да цябе наблізіўся, і пры гэтым забраць палачку, не дабягаючы да жоўтай рысы. Рысу на просьбу фізручкі накрэсліў упоперак дарожак школьны аканом. Гэта ў Сонінай каманды яшчэ не надта выходзіла, таму яны дамовіліся папрактыкавацца заўтра.

І вось калі Васілеўскі даведаецца, што Статкевіч саскочыў, у яго знікне ўвесь імпэт. Сыдзе ён, за ім Дубовік, які і так не надта гарыць жаданнем, — і бывай грамата за ўдзел у эстафеце. А яна абараніла б Васю ад выключэння, што цяпер над ім павісла.

А ў «Д» класа ёсць усе шанцы перамагчы — Соня бачыла, як бегаюць іншыя. Так што Максім усё-ткі падвядзе іх, калі адмовіцца.

Яна незаўважна адклала альбом убок і пайшла на другі паверх.

x x x

— Можна да цябе?

— Зусім страх згубіла? Я забараняю табе сюды ўваходзіць!

Соня стаяла на парозе Максімава пакоя ўпершыню з часу, як пераехала ў «лялечны дом». Гэтак дысцыплінаваны вернік з усіх сіл трымаецца падалей ад святыні іншай канфесіі, але аднойчы ўсё-ткі наважваецца і ўваходзіць. Бо жах як цікава, што там за дзвярыма.

Што?!! Яму цесна з малым Вадзікам?! Максімаў пакой быў не проста большы за той, у якім цяпер жыла Соня, — ён быў прасторнейшы за іх з татам катух у маласямейцы. З вы-

гляду гэта быў звычайны хлапечы пакой, хоць Соня не асабліва мела з чым параўноўваць. Аскетычны, у светла-шэрых і балотных колерах. Ведаючы маму Юлю, можна было зрабіць выснову, што панавалі тут зусім не ейныя густы.

У глыбіні пакоя злева, пад мансардавым акном з рымскай шторай, стаяў белы пісьмовы стол. Мяркуючы па знаёмых Соні падручніках за 11 клас, што ляжалі на ім ахайнымі стосікамі, Максімаў працоўны кут. Справа, пад другім мансардавым акном, адгароджаная ад стала стэлажом, тулілася раскладзеная канапа, засцеленая шатландскім кратчастым пледам. Ад яе да дзвярэй цягнулася шчыльна замкнёная шафа-купэ; на адной са створак вісеў брытанскі сцяг, на другой — постар гурта «Placebo».

Адразу каля дзвярэй злева высіўся метровы ложак-подыум; з прачыненых шуфлядак вытыркаліся скамечаныя шмоткі. Мудрагелістыя дэвайсы ў гэтым куце мала што не звісалі са столі. Тут жа, паралельна ложку, стаяў яшчэ адзін працоўны стол, таксама белы. На ім, пад ім і вакол яго на стэлажах грувасціліся рознакаляровыя пластыкавыя кошыкі, набіткаваныя зашмальцаванымі кнігамі, сшыткамі, паперамі, рассыпанымі канструктарамі і такой колькасцю бластарападобных цацак, што імі можна было ўзброіць цэлую флатылію прышэльцаў з космасу. Усё гэта сігналізавала пра вялікае перасяленне сюды малога Вадзіка.

Паміж сталамі на сцяне быў замацаваны невялікі тэлевізар. На ім ішоў баявік з Брусам Уілісам. Максім, які сядзеў перад тэлекам у камп'ютарным крэсле, клацнуў пультам, калі Соня ўвайшла, і на экране застыў твар актора, перакошаны ад болю і напругі.

Пакой тут жа напоўніўся плачам пратэсту. Соня не адразу яго заўважыла, але на падлозе каля Максіма перад брустверам з канапных валікаў і падушак ляжаў Вадзік, цаляючы ў тэлевізар з аднаго са сваіх бластараў. Мусіць, прыкрываў Бруса. Хоць гэты д'яблік мог атаясамліваць сябе і з кепскімі хлопцамі.

Пабачыўшы Соню, Вадзік рашуча наставіў на яе зброю.

— Колькі разоў табе казаў: не тыцкаць руляй у жывых людзей! Нават калі гэта Сінічка... Што там у цябе? — Максім крутануўся на крэсле тварам да Соні. — Толькі хутка.

— Хачу папрасіць цябе пра адну рэч.

— Ну, паспрабуй.

— Калі ласка, не адмаўляйся ўдзельнічаць у эстафеце.

— Яшчэ адна настаўніца адшукалася... Чаму ўсе лічаць, што могуць загадваць мне, што рабіць?

— Я не загадваю, я прашу. Вельмі важна, каб ты там быў.

— Што, зусім без мяне не можаш? — здзекліва спытаўся Статкевіч, адкінуўшыся на крэсле. — Хочаш пабегаць за мной на законных падставах?

— Гэта не для мяне. Гэта для Васі... Разумееш, ён зацяўся ўва ўсім з табой супернічаць. Ён так захапіўся гэтай эстафетай толькі таму, што ў ёй ты. Калі ты адмовішся, ён адмовіцца таксама. А мы вельмі хочам, каб ён паказаў сябе з найлепшага боку хоць бы ў спорце. Тады, можа, дзірык яго не будзе чапаць да выпуску.

— Дык значыць, для жанішка свайго шчыруеш? — паморшчыўся Максім.

— Вася мне не жанішок! — выпаліла Соня. — Але... Вася мой сябар. І я перажываю за яго. Не ведаю, ці ведаеш ты... Дакладней, я спадзяюся, ты ведаеш, што такое сябры.

— Добра, — Максім павольна круціўся на крэсле з боку ў бок, закінуўшы нагу на нагу і паставіўшы пальцы дамком, як вярхоўны злодзей у галівудскім фільме, — я пабягу. Але што мне за гэта будзе?

— У сэнсе?

— Ну, мушу ж я таксама мець нейкі інтарэс. Раз усім навокал карціць, каб я наняўся акрабатам у гэты цырк. Вось што, Сінічка. Давай так. Я пабягу. Але калі «А» клас пераможа ў эстафеце, ты пераканаеш свайго бацьку, каб вы з’ехалі з нашага дому.

— Але гэта пакуль немагчыма...

— Выбірай, Сінічка. Я за сценкай, або Вася ў класе, — кпліва прамовіў Максім, склаўшы на грудзях рукі.

— А што тут выбіраць? Мы пераможам. З вашымі-та атлеткамі...

— Але не забывай, што яны пабягуць са мною. А твой Вася здохне на трохстах метрах. Ён жа, мусіць, з ясельнай групы садка дыміць як паравоз. Ці я не маю рацыі?

— Гэта мы яшчэ паглядзім, хто каго... Добра, Статкевіч. Я згодная.

— Ну і слаўна! — сказаў Максім і вярнуў да жыцця Бруса Уіліса, даўшы зразумець, што размова скончаная.

— Дура! — пачула Соня за спінай Вадзікаў голас, калі зачыняла за сабой дзверы.

x x x

У сераду Соня куляй уляцела на першы ўрок і з парога кінулася да Васілеўскага.

— Вася, давай сюды руку, — загадала яна, пасля чаго бесцырымонна сцягнула з таварыша пінжак і пачала закасваць яму рукаво кашулі.

— О-о-о, Сініца, ты распранаеш мяне проста пры людзях? — узрадаваўся Вася.

— З сёння да суботы ты ані цыгарэты ў рот не возьмеш! — сказала Соня, налепліваючы хлопцу на жылу нікацінавы пластыр. — Усё: здаровы лад жыцця да самай эстафеты. Табе трэба берагчы дыхалку.

— Ты чаго? — разявіў рот Васілеўскі.

— Круціся як хочаш, але нам кроў з носа трэба перамагчы.

— Вось гэта імпэт! Вось гэта запал! Нарэшце пазнаю Сініцу!

— А яшчэ сёння, заўтра і ў пятніцу мы бегаем па пяць кіламетраў! Зразумела? Дзе Дубовік?!!

Барацьба за права жыць у «лялечным доме» пачалася.

x x x

*Соня — дура. Яна пагадзілася з’ехаць з нашага дому, калі Максім адужае яе ў эстафеце. Максім спрытны і здорава бегае. Так што хутка Соні тут не будзе. Што б такое ўчыніць на развітанне? Тыдзень таму ў мяне было многа ідэй, але Максім сказаў: «Такія людзі не вартыя, каб на іх марнаваць энергію, лепш іх ігнараваць». Цяпер я ўсе ідэі забыў. Што б такое прыдумаць?*

x x x

*Трэці дзень Соня носіцца па лесе, як дурная, са сваімі дурнымі аднакласнікамі. Учора ішоў моцны дождж, і яна ўся прамачылася. Але нікому не сказала, а толькі адціскала штаны ў купальні. Але нічога не дапаможа. Максім усё адно будзе лепшы. Заўтра мы ідзём глядзець на гэтую весялуху.*

x x x

Золкі, вогкі туман падымаўся над казачным лесам, прабіраючы да касцей. Соня ішла па сцежцы, захутаная ў цёплы шэры палітончык, які нарэшце выцягнула з шафы. З-пад яго вытыркалі ногі ў красоўках і спартыўных штонцах. Няяркае сонца разагнала імглу на адкрытых абшарах, але тут, у сасонніку, пакуль не давала рады. Зрэшты, яно ўжо ўвогуле не давала рады з восенню, што наступала па ўсіх франтах.

Інтэрнэт папярэдзіў беларусаў, што з панядзелка на іх радзіму канчаткова насунуцца халады. Нон-стоп пойдуць дажджы, і паверне на зіму. Невыносна балела горла. Соня пракашлялася, з трывогай прыслухоўваючыся да самаадчування. Не, тэмпература пакуль не паднялася. Учора дзяўчына

непрыкметна прабралася ў татаў пакой, каб адшукаць аптэчку — хоць у нечым Сінічкі захавалі пакуль аўтаномію ад мамы Юлі. Намерала трыццаць восем ды пяць і жахнулася. Але ці то ад ударных доз аспірыну і стараннага пацення ў ложку, ці то ад самаўнушэння ў суботу зранку градуснік паказаў трыццаць шэсць і шэсць. Не арганізм, а малайчынка. Толькі вось горла па-здрадніцку дзерла.

Пра хваробу Соня, ясна, нікому не сказала. Яна памрэ, але 11 «Д» эстафету выйграе. Цяпер гэта ўжо прынцып.

Дзяўчына ішла па сцежцы, якая вяла крыху ўбок ад школы. У чацвер падчас прабежкі яна прыкмеціла тут закінуты турнік. Каля яго можна было размяцца перад забегам. Вельмі не хацелася рабіць гэтага на стадыёне, на вачах ува ўсёй школы. Да пачатку заставалася паўгадзіны, але дырэктар яшчэ будзе казаць сваё бла-бла-бла... Трэба проста вось тут абаперціся на ржавую жалязяку, але не вельмі напружвацца, каб зноў не было запамарокі.

Соня зняла паліто і ўскрыкнула, нібы сунулася ў халодную ваду. І раз, і два...

Два тыдні таму яна сама вельмі хацела зноў жыць удваіх з татам. Але цяпер, раз такія справы, трасцы яна з’едзе з Верасовай вуліцы. І не спадзявайся, Статкевіч.

Як любіў жартаваць у такіх сітуацыях Вася, Сінічка села на каня.

Дарэчы, пра Васю. Па-першае, за тры дні ён ні разу не закурыў.

Па-другое, ён з патройнай энергіяй упрогся ў падрыхтоўку. У аўторак Ала Юр’еўна запусціла ўсіх удзельнікаў эстафеты бегчы чатыры колы па стадыёне, а сама стала на фінішы з секундамерам, запісаўшы час кожнага бегуна пасля кожнага кола. Потым, крыху памедытаваўшы над табліцай, сказала, каму за кім бегчы на эстафеце. Дырэктар загадаў расставіць вучняў на этапы, чаргуючы: дзяўчынка-хлопчык-дзяўчынка-хлопчык. Відаць, дбаў пра шоу, а не пра спорт.

Гэтую самую табліцу Вася ў сераду выпрасіў у фізручкі і занёс у кабінет псіхолага на ксеракс. Рэшту ўрокаў Сінічка і Васілеўскі праседзелі над ксеракопіяй, нібы японскія шпіёны над шыфрамі савецкай выведкі.

Афіцыйна Васілеўскі і Сінічка з дзявятага класа сядзелі разам, за пятай партай па цэнтры. Але на справе Соня далучалася да таварыша толькі на ўроках Ніначкі, калі ў той быў кепскі настрой і яна дачэплівалася да рассадкі. Апошняя парта каля акна была заўсёды вольнай, Соня любіла сядзець тут адна. Бо Вася, калі быў пад бокам, неадменна яе даставаў, а тут, за высокай Снежкай Кавалёвай, можна было спакойна перачакаць нудны ўрок, летуценіць пра Статкевіча і не баяцца, што настаўнік выкліча да дошкі толькі таму, што ты трапілася яму на вочы.

Але з нагоды эстафеты Васілеўскі быў рэабілітаваны. Сам не свой ад шчасця, хлопец дзелавіта шушукаўся з Соняй, седзячы з ёй плячом да пляча. Час ад часу да «дэшак» даносіліся загадкавыя фразы кшталту «пачатак калідора перадавання» ці «выбегчы з пятнаццаці хвілін».

У самы ніз сваёй табліцы настаўніца ўпісала нарматывы Максіма Статкевіча за дзясяты клас. Відаць, адшукала ў сваіх нататніках. Гэта была неацэнная інфармацыя для стратэгаў эстафеты.

Спачатку Соня і Вася доўга складалі і адымалі вынікі спробнага забегу для ўсіх класаў з улікам часу, патрэбнага для перадавання палачкі. Па-майстэрску аперуючы няхітрай формулай $S = vt$, разумення якой ад іх не змагла дамагчыся цэлая плеяда фізічак і матэматычак, яны вызначылі, хто з бегуноў спрынтар, а хто — стаер, расставілі школьнікаў па этапах і прыйшлі да аптымістычнай высновы, што ў 11 «Д» вялікая фора. Аднак калі Статкевічавы нарматывы правільныя, 11 «А» — іх адзіны сур'ёзны канкурэнт.

І Вася, і Соня, і Аліна на арганізаванай фізручкай «кваліфікацыі» прыбеглі першымі. Крыху падвёў Дубовік — але

і ён быў не ў апошнім эшалоне, хоць не мог цягацца з валейбалістам Бергерам, з якім мусіў бегчы другі этап. Да таго ж Віка Крылова выявілася не такой ужо й адстойнай бягунняй і мусіла скласці канкурэнцыю Сінічцы на трэцім этапе. Калі Бергер абгоніць Дубовіка, Соні давядзецца пастарацца, каб нагнаць і перагнаць Крылову.

Адзіным слабым звяном «ашак» была Паўзункова. Яна, відаць, пачне забег — і застанецца ззаду, а вось Аліна ў гэтым этапе адназначна пераможа... Але толку? На самым пачатку гэта нічога не вызначае.

Карацей, расслабляцца не выпадала.

Соня, вядома ж, не прызналася нікому, а пагатоў Васю, чаму ёй раптам заманулася быць першай. Хлопец тлумачыў ейны імпэт на сваю карысць:

— Нарэшце, Сініца, ты зразумела, што ты мой чалавечак!.. Разам мы ўвалім батанікам!

Соні было крыху няёмка чуць гэта. Калі б не «кантракт з д'яблам», яна нізашто не надрывалася б так цэлы тыдзень. Васілеўскаму для граматы «за актыўны ўдзел» дастаткова было проста з'явіцца на дарожцы. А цяпер выходзіла, што яна выкарыстоўвала Васю ў сваіх мэтах. Бо калі б ён даведаўся, што ад ягонай перамогі залежыць, ці застанецца Соня ў адным доме з Максімам...

Такая вось выйшла «санта-барбара». На роўным, лічы, месцы.

І раз, і два...

— Фізкульт-прывет! — пракрычаў падцягнуты дзядок у шортах, футболцы і паласатай вязанай шапачцы, вынырнуўшы з туману за тры метры ад Соні.

Блін, так і да інфаркту давесці можна.

— Разумнічка! Спорт — гэта жыццё! А то што за моладзь у наш час... У камп'ютары ўсе ўткнуліся або п'юць пад плотам...

Ну і туман. Далей за ўласны нос не бачна. Не дай бог яшчэ на Статкевіча тут напароцца, як пазаўчора... Але ж як дзярэ горла...

Соня, Аліна і Вася бегалі тры дні запар. Сустракаліся тут, у лесе. Толькі Дубовік сачкаваў. Соня вельмі баялася, што іх пабачыць Максім. Так, вядома ж, і адбылося. У чацвер, калі Аліна сышла дадому, Соня з Васем пастанавілі прабегчы да кальцавой і назад. У Соні ўвесь час развязваліся матузкі на красоўках, і яна часта спынялася.

— Ну хто так завязвае! — не вытрымаў нарэшце Васілеўскі. — Дай навучу. Сядай тут. Трэба закручваць у іншы бок, тады вузел будзе трывалы...

Соня, седзячы на валуне, дрыгала нагамі, так што Вася доўга не мог схапіцца за матузкі. Яны рагаталі да колікаў у жываце.

Раптам Соня падняла вочы і пабачыла Максіма. Спыніўшыся на сцежцы, ён глядзеў на іх з прыцемак. Мусіць, вяртаўся праз лес з горада. Соня асеклася і паставіла ногі на зямлю.

— Ну вось, разумнічка. А то вожкаюся з табой, як з дзіцём малым у ясельках.

З таго, як сутаргава, адным рэзкім рухам Вася зацягнуў матузкі, Соня зразумела, што ён таксама заўважыў Статкевіча.

Калі Соня ўзняла вочы другі раз, Максіма на сцежцы ўжо не было.

А потым сябры падбеглі да МКАДа, і пачалася залева. Яны не знайшлі схову і разбегліся ў розныя бакі: Вася — да сябе на раён, а Соня — у катэджны пасёлак.

У пятніцу на фізкультуры каманда «Д» класа зрабіла спробны забег, паставіўшы Галю са Снежкай сачыць за секундамерам.

— Вельмі нішто сабе, — паківала галавой фізручка, калі ёй сказалі вынік. — Каб жа ўсе класы так... А то вас адных гэтая эстафета зачапіла за жывое.

А ўвечары ў Соні паднялася тэмпература.

Накінуўшы паліто на плечы, каб не застудзіцца яшчэ болей, дзяўчына спынілася на ўзлеску. Школа і новы стадыён былі відаць адсюль ува ўсёй красе. Яна зірнула на іх, нібы ўпершыню. За апошні год 234-я радыкальна змянілася. Раней пасярод вялізнай пусткі тут стаялі дзве аднолькавыя скрынкі з брудна-жоўтай цэглы — карпусы пачатковых і старэйшых класаў. Новы дырэктар перафарбаваў будынкі. Цяпер яны былі бела-шэрыя са смарагдавымі і муштардавымі паскамі на фасадзе. На корпус для старэйшых маляры нанеслі болей зялёніва, на пачаткоўку — болей жоўці. Вялізны стадыён дапаўняў гэты сакавіты краявід, які цяпер заслугоўваў моднага эпітэта «ўрбаністычны».

Туман пакрысе рассейваўся, і было відаць, што вакол стадыёна мітусяцца людзі. Трэба спяшацца. Хутка пачнуць.

Пераадолеўшы раптоўную запамароку, Соня разагналася ўніз па схіле.

x x x

— Як па мне, то, калі ён зачэсваў грыўку на бок, яму больш пасавала.

— Ну не. Вось так, як цяпер, з простаю — зусім пусечка.

— Афігець! Дзе бяруць такія красачы?

— Папусціся, братан. Каб ты змог такія набыць, твайму бацю трэба два тыдні стаяць на праспекце са знакам «сорак»!

— Круглы выдатнік?.. Рэспубліканская алімпіяда? Што вы кажаце... Не ведаеце, куды паступае?.. Ну, зразумела, у Англію!

Розныя размовы даляталі да вушэй Соні Сінічкі з трыбун над ёю, але ўсе яны датычылі аднаго прадмета. «Прадмет» стаяў на дарожцы перад фінішнай рысай, з абыякавым выглядам ківаючы Але Юр'еўне, якая энергічна яму штосьці

тлумачыла, перыядычна адводзячы назад левую руку з адтапыраным вялікім пальцам. Усё пераймаецца, каб ён правільна прыняў эстафету...

— Шу-шу-шу... Шу-шу-шу...

Знаёмае шушуканне. Пачуўшы яго за спінай, Соня абвяла поглядам трыбуны. Так і ёсць. Статкевічы і бацька ўжо былі тут. Тата Віця акурат замацоўваў над сядзеннямі расцяжку з надпісам: «Удачы, Максім і Соня!» А каб не паўстала сумневаў, пра каго менавіта гаворка, у ілюмінатарах літар «С» і «О» красавалі фотаздымкі. Мама Юля спецыяльна сфатаграфавала Соню для плаката, але яго змест быў для дзяўчыны сюрпрызам.

Пётр Сінічка, сустрэўшыся поглядамі з дачкою, прыўзняў бровы, паказваючы на расцяжку, і вінавата ўсміхнуўся. Маўляў, прабач дачушка, нічога не мог зрабіць. Хоць, ведаючы яго, Соня была перакананая: дзеля гэтай чарговай непрыемнасці на ейную галаву бацька дысцыплінавана скінуўся з мамай Юляй грашыма.

— Ніяк не магла выбраць, каго мне падтрымліваць! Як шкада, што вы ў розных камандах, — заспявала мама Юля, калі Соня падышла аддаць ім паліто. Адпаведна сітуацыі, Максімава матуля была ўбраная ў джынсы і чырвоную спартыўную куртачку. На ейнай шыі вісела саліднага выгляду фотакамера, якую яна тут жа навяла на Соню.

— Я за Максіма! — абвясціў малы Вадзік у куртачцы таго ж колеру і фасону, што маміна. Гэтым разам ён быў узброены біноклем, хоць трыбуны былі зусім невысокія: можна было разгледзець бегуноў і так.

— Даруй, дачушка. Я, мусіць, не дабуду да канца. Ну, субота ж, — пачаў, як заўсёды, апраўдвацца бацька. — Удачы табе!

— Сініца, дзе цябе носіць? — загарлаў на ўвесь стадыён Вася, махаючы знізу. Соня спусцілася да бегавых дарожак, і сябрук, скамандаваўшы: «Хэндэ хох!» — пачаў чапляць ёй

на байку белыя суконныя квадрацікі з літарай Д, хітра сплеценыя матузкамі. Побач стаялі падпісаныя такім чынам эстафетнікі з іншых класаў. Аліна Макей ужо трымала ў руцэ жоўтую палачку.

— Давайце ўсе сюды, — Вася па-капітанску згроб за плечы Дубовіка і Соню. З іншага боку іх абняла Аліна. — Адразу скажу: мы іх усіх парвём. Але для гэтага нам трэба ўявіць, што мы — адзін арганізм — магутны і вельмі — Жэка, асабліва цябе датычыць, — вельмі хуткі арганізм! Давайце пакажам ім усім...

Соня адчула незвычайнае цяпло, якое падымалася да твару. Толькі не гэта... Няўжо зноў тэмпература?..

«Дэшкі» разамкнулі абдымкі. Рэшта бегуноў глядзела на іх, як на клоўнаў. Іншыя каманды стаялі адасоблена, нібы не знаёмыя міжсобку, так, нібы іх гвалтам прымусілі бегчы. Толькі «бэшкі» сабраліся купкай і, як заўжды, смяяліся і абмяркоўвалі нейкае мудрагелістае заданне па фізіцы.

Тая ж карціна панавала на трыбунах. Імпэт Васілеўскага і Сінічкі перадаўся ўсяму класу. Ніначцы нават не спатрэбілася намаўляць кагосьці прыходзіць на стадыён. Дзевяць «дэшак» трымалі аркушы ватману з надпісам: «Наперад!». Усе літары былі чорныя, і толькі «Д» вылучылі чырвоным. Усе, у каго былі свабодныя рукі, звінелі бразготкамі, дудзелі ў дудкі, прызапашаныя з колішніх паходаў на хакей ці футбол. «Д» клас свістаў, гарлаў і пляскаў, размінаючыся, нібы сапраўдныя фанаты.

Вучні іншых класаў, многіх з якіх загналі на стадыён сілай, трымалі перад сабою па дзяжурным плакаціку. Фізікі напісалі балончыкам на кавалку тканіны: «11 „Б“: толькі паскарэнне», і нават праскандавалі нейкую крычалку, але перагарлаць «дэшак» усё адно не здолелі. Соня рассмяялася, пабачыўшы ватман з лаканічным надпісам «11 А». Яго трымала мажная жанчына ў дарагім паліто і з пышнай хімічнай завіўкай. Тая самая, што праводзіла Паўзункову ў Кіеў.

Мама, значыцца. Стараста Ліза ўмудрылася паактыўнічаць адначасова і на стадыёне, і на трыбунах.

Але нікога з «ашак» і блізка не было каля плаката. Хоць амаль усе іх дзяўчаты заявіліся на эстафету, паселі маленькімі купкамі ў розных канцах трыбун. Была тут нават Ротмістрава, якая заняла месца каля Галі і Сняжаны.

Трыбуны былі забіткаваныя. Мусіць, спрацавалі сродкі масавай інфармацыі (афіша на дошцы ў вестыбюлі), адміністратыўны рэсурс (абвесткі на ўроках, зробленыя дзяжурным класам) і вірусная рэклама (чуткі, што ў пятніцу ў сталоўку на бусіку падвезлі торцікі, колу і сокі). Гледачы млява пляскалі дзяўчатам, якія танцавалі з бумбонамі пасярод футбольнага поля пад стары хіт гурта «Тату» «Нас не дагоняць».

— Ён тут! — сказала задыханая завуч дырэктару, які нервова перамаўляўся з фізручкай, — намміністра тут!

— Прыехаў? — замітусіўся дырэктар. — Усё, Алачка. Праз пяць хвілін пачынаем цырымонію. Пасадзіце ўсю эстафету на першы шэраг...

— Скажыце, а хутка дзеці пабягуць? — спыталася, падышоўшы, маладая нахабнаватая дзяўчына з мікрафонам сталічнага тэлебачання. Непадалёк ужо ўсталёўваў камеру аператар.

— Хвілін дваццаць. У нас прывітальныя словы, потым сам намеснік міністра адкрые стадыён, а тады старт, — павярнуўся да журналісткі Лабановіч.

— А нельга неяк хутчэй? Мы спазняемся на наступны аб'ект, а нам трэба зняць, як дзеці бягуць, для карцінкі... Слухайце, а вы не можаце іх папрасіць, каб яны зараз крыху пабегалі?

Дырэктар разявіў рот ад нечаканасці.

— Што, Ліпніцкая, зноў прымушаеш свет круціцца вакол свайго мікрафона? — кпліва сказаў, падыходзячы, дробненькі хлопец у дзьмутай ярка-сіняй камізэльцы паўзверх ваўнянага швэдра. — Адчапіся ад людзей і працуй, як усе. Не звяртайце ўвагі, Андрэй Васілевіч.

— Зміцер! — узрадавана ўскрыкнуў дырэктар і, паціснуўшы хлопцу руку, павярнуўся да Алы Юр'еўны. — Зміцер Перчыкаў. Мой вучань з пятай гімназіі. Цяпер — рэдактар папулярнага спартыўнага парталу zauziatar.by! Дзякуй, што пагадзіўся прыйсці. Разумею, гэта не зусім ваш узровень...

— Рэпартаж з адкрыцця стадыёна ў школе на ўскраіне Мінска, дзе бягуць эстафету нікому не вядомыя юніёры? Дык у нас увесь спорт такі. Так што галоўнае — цікава падаць. Менавіта таму нас чытаюць.

— Ты толькі скажы, што трэба. Дамо любую інфармацыю. Напэўна, ты хочаш пагаварыць з удзельнікамі... Вось вучні 11 «А»... Гонар школы — Максім Статкевіч, Марк Бергер. Можа, паклікаць для інтэрв'ю?.. Дзе твой дыктафон?

— Дыктафон — не мой метад, — з апломбам прамовіў Перчыкаў. — Ды і што яны мне скажуць? Што вельмі хвалююцца перад забегам і хочуць перамагчы? Усё, што мне трэба, — спіс удзельнікаў па класах. Дайце я на мабілку сфатаграфую.

Ала Юр'еўна працягнула журналісту тэчку. У сваім парадным жоўтым спартыўным гарнітуры яна выглядала, як Ума Турман з фільма «Kill Bill». Толькі замест шаблі ў свабоднай руцэ яна трымала стартавы пісталет.

— Усё, пайшоў працаваць, — кіўнуў Перчыкаў, хаваючы тэлефон. — У мяне накладка. Усе мае фотакоры, як адзін, занятыя: здымаюць вяселлі. Але нічога: я, калі ішоў, бачыў на трыбунах мамашу з прафесійным аб'ектывам…

Соня спрабавала сканцэнтравацца. Туман даўно развеяўся над раёнам і школай, але перад ейнымі вачыма ўсё нібы зацягнула смугою.

— Вядома ж, я вельмі хвалююся перад забегам. Але як стараста 11 «А» магу запэўніць: мы рашуча настроеныя на перамогу, — вяшчала Паўзункова перад камерай сталічнага тэлебачання.

Хутчэй бы старт.

x x x

Бабах!!!

Ад стрэлу стартавага пісталета ў Соні заклала вушы. Заціснуўшы іх рукамі, яна віскатала — ад пераляку і ад радасці.

— Сініца, гэта перамога! Мы перамаглі! — пракрычаў, падбягаючы да яе, Васілеўскі. — Ты гэта бачыш?

Соня яшчэ як бачыла. Яна не ўтрымалася і, адшукаўшы вачыма каманду «ашак», трыумфальна паглядзела на Статкевіча. Той нахмурыўся і адвёў позірк.

Мала хто яшчэ на стадыёне зразумеў, у чым прыкол. Але Максіму гэта было больш як відавочна.

— Паўзункова, што за фокусы? Чаму стартавала Крылова?!! — імпульсіўна махаў рукамі Бергер. — Чаму нейкія змены, а каманда не ў курсе?

— А якая розніца, хто за кім? У Вікі бацькі сёння не змаглі прыйсці. А ў мяне тата з камерай на трыбуне — і я бягу ўсяго чатырыста метраў? Вось мы і памяняліся.

«Ага. Расказвай. Палачку Максіму ты ўласнаручна перадаць захацела», — злацешна падумала Соня.

— Ты з глузду з’ехала? Ты сябе на дарожцы бачыла? Ты хоць эстафету прымеш нармальна? Толькі паспрабуй упусціць! — не сунімаўся Бергер.

— Марка, давай на старт, — паклікаў яго Статкевіч. Твар ён меў ускрай азадачаны.

Яшчэ б. Цяпер Паўзунковай давядзецца спаборнічаць з Соняй. А гэта значыць, у «ашак» няма шанцаў. Перад чацвёртым этапам у «Д» класа будзе такая фора, што Васю можна будзе крокам ісці на фініш.

На дарожках ужо стаялі бегуны другога этапу. Аліна Макей першай перадала палачку Жэку Дубовіку, Віка Крылова дабегла да Марка Бергера другой, Іра Жданок была трэцяй. І вось тут у Соні пачаўся сапраўдны мандраж. Яна наступная...

...Калі Дубовіку заставалася да яе пяць метраў, Соня пачала разганяцца, трымаючы напагатове левую руку. «Гоп!» — нарэшце пачула яна за спінай. Адточаны рух рукой — і палачка ў яе. Цяпер тры колы — толькі наперад.

— Сі-ніч-ка! Сі-ніч-ка! — заходзіліся аднакласнікі на трыбунах.

На першым коле Соня лёгка абагнала Лену Канькову з зялёнай палачкай і Паўзункову з чырвонай. Дубовік за свае восемсот метраў прапусціў наперад дзве каманды. Аднак фізікам «дэшкі» саступілі ўсяго нічога, а ў Паўзунковай з эстафетай адразу не заладзілася: палачкі яна не ўхапіла, і раззлаванаму Бергеру давялося падымаць чырвоны цыліндр з дарожкі і перадаваць зноў: абодва спыніліся. Ды і запыхалася ружовая бягуння ўжо на палове кола. Пакрысе разрыў паміж Соняй і рэштай дзяўчат павялічваўся.

Соня выйшла на трэці віраж. Заставалася чатырыста метраў. Як заўсёды, бліжэй да канца адкрылася другое дыханне. Наперадзе пашыхтавалася пяцёрка хлопцаў чацвёртага этапу. Яны маляўніча стаялі па дыяганалі на высокім старце, выцягнуўшы назад руку з адстаўленым вялікім пальцам і гледзячы цераз левае плячо. «Д» класу вылучылі другую дарожку, але на трэцім этапе, паводле правілаў, бегуны маглі займаць тую, якая зручней. Толькі трэба было вярнуцца «на радзіму» да ўваходу ў калідор перадавання...

На першай дарожцы, бліжэй да цэнтра стадыёна, перад Васілеўскім стаяў Максім. Неверагодна прыгожы, у майцы з кароткім рукавом, ён працягваў да Соні мускулістую руку і ўсміхаўся ёй цераз плячо самай асляпляльнай усмешкай, якую дзяўчына калі бачыла. Яго вусны злёгку варушыліся. «Соня, давай сюды. Хутчэй перадай мне палачку», — нібы казалі яны. Не, дакладна гэтак яны і казалі...

— У-у-у!!!

Чаму завылі трыбуны? Чаму Максім не пачынае бегчы? Соня ўжо ў калідоры перадавання... Ну ж, Максім, мы перамагаем!..

Тут Соня рэзка затармазіла і ледзь не ўпячаталася ў Статкевіча. Да яе пачало даходзіць.

— Сініца, ты што? Ты дзе? Давай сюды!!! — крычаў Вася. Ён стаяў крыху наперадзе, круцячы галавою. Падбегчы да Соні ён не мог, бо гэта б азначала дысквал. Зрэшты, іх і так дыскваліфікуюць.

— Гоп... гоп... — бяздумна прамовіла задыханая Соня. Яна ўсё яшчэ працягвала Максіму жоўтую палачку.

— Дурніца! — сказаў Статкевіч, смеючыся. І раптам, хітра прымружыўшыся, вычапіў палачку з Сонінай рукі і панёсся па дарожцы.

Соня толькі што перадала эстафету суперніку. Ногі ў яе падкасіліся. Яна павалілася проста на фінішную рысу.

х х х

— Ты наўмысна гэта зрабіў.

Соня сядзела з краю трыбуны на першым шэрагу, захутаўшыся ў паліто і нацягнуўшы на вочы шапку, калі да яе павольі падышоў Максім. На стадыёне ўжо амаль нікога не засталося. Гледачы перамясціліся ў сталоўку, на пачастунак. Уваччу было цёмна. Круцілася галава. Было вельмі балюча глытаць і гаварыць. Хацелася пад коўдру. Хацелася цішыні.

— Я ж казаў, што прыкмячаю слабыя бакі саперніка і паварочваю на сваю карысць. Але я проста хацеў цябе дэмаралізаваць. Я не думаў, што ты мне палачку ў зубах прынясеш.

— Гэта было несумленна.

— О так. Раскажы гэта людзям. «А» клас выйграў эстафету, бо я табе ўсміхнуўся...

Соня сціснула кулакі. Які ён усё-ткі падонак! І якая яна ўсё-ткі дурніца! Яны так рыхтаваліся да спаборніцтва — і Соня адным махам перакрэсліла ўсе намаганні проста таму, што закаханая ў Статкевіча, як котка, і нічога не можа

парабіць з сабою. Яна ўмее кантраляваць дыханне, але хто б навучыў яе кантраляваць пачуцці?

Найбольш няёмка было перад Васем. Той паспрабаваў выправіць сітуацыю, але што ён мог зрабіць? Бег, як мустанг, і нават на апошнім коле абагнаў Каланіцкага, але ўсё адно фінішаваў другім. Ляснуў аб зямлю чырвоную палачку, якую з боем вырваў у Паўзунковай, і пайшоў дадому адразу з фінішу, ні з кім не размаўляючы. Такой крыўды ён не заслужыў. Соня была перад ім моцна вінаватая.

— Ну што, Сінічка, табе дваццаць чатыры гадзіны на зборы. Круціся як хочаш. Мы дамаўляліся.

— Я помню.

— Пайшлі ў сталоўку. Нам прыз будуць уручаць. Хоць той факт, што ты прыбярэшся з майго дому, — найлепшая ўзнагарода. Ну, давай, уздымайся.

— Не магу.

— Як не можаш?

— Я не магу ісці.

— Не выдумляй. Толькі што лётала як апечаная — і раптам ісці не можаш?

— Сонейка, ну як ты? Галава круціцца? — мама Юля падляцела да Соні і адразу пачала мацаць ёй лоб. — А божухна! Максім, у яе тэмпература! Яна зноў страчвала прытомнасць. Трэба адвезці яе дадому і тэрмінова выклікаць доктара! Тата Віця пабег на Верасовую па машыну!

— Ясна. Я пайшоў.

— І куды ты сабраўся? — уперла рукі ў бакі мама Юля.

— На ўзнагароджанне пераможцаў, — здзіўлена адказаў Максім.

— Ага. Бачыла я тую «перамогу». Маўчаў бы ўжо... Чакай, — мама Юля выцягнула з куртачкі мабільнік. — Алё... Ага... Ага... Вадзік з табою?.. Праз колькі?.. Вось што, «пераможца», — кабета сувора паглядзела на сына. — Зараз жа бяры Соню і нясі да машыны. Тата запаркуецца каля вунь таго дома.

— Але...

— Ніякіх але. Што, мне яе несці? Не бачыш, яна ледзь у крэсле трымаецца. Заварыў кашу — разграбай...

х х х

— Рох... Рох...

Соня душылася смехам, уткнуўшыся носам у мяккую байку, якую Статкевіч нацягнуў пасля эстафеты паўзверх вільготнай футболкі. Байка пахла потам, байка пахла Максімам.

— Вельмі смешна, Сінічка. Колькі ты хоць важыш?

— Пяцьдзясят два кілаграмы.

— Ашалець! Больш за паўцэнтнера. На цяжкую атлетыку я сёння не падпісваўся.

— Рох... Рох...

— Ды што ты ўсё рохкаеш?

— Ты зноў нясеш мяне на руках, але гэтым разам я ў прытомнасці. Гэта мне дасталася самая крутая ўзнагарода...

Так сказала б Соня Сінічка, але адразу за стадыёнам яна адрубілася.

х х х

*НЕ КАЖЫ «ГОП!»*

*Zauziatar.by наведаў шведскую эстафету ў адной з мінскіх школ і паўплываў на вынік*

*Тэкст: Зміцер Перчыкаў*
*Фота: Юлія Арцёмава*

*Як многа ў Беларусі — ладна, у Мінску — якасных школьных стадыёнаў? «Заўзятар» налічыў сем. Добра, восем, калі ўмоўна ўключыць Астрашыцкі Гарадок у рысу сталіцы. Беларускія чыноўнікі ад спорту і адукацыі шмат і ў адзін*

*голас кажуць аб прапагандзе здаровага ладу жыцця сярод падлеткаў. Але, як правіла, далей за лозунгі справа не ідзе.*

*На мінулым тыдні, аднак, у гэтага сумнага правіла з'явілася яскравае выключэнне. 11 лістапада галоўны рэдактар «Заўзятара» трапіў на адкрыццё звышсучаснага чатырохсотметровага школьнага стадыёна, якое сталася магчымым дзякуючы падтрымцы буйной кампаніі «Холдынг-Молдынг».*

*Разынкай мерапрыемства была шведская эстафета сярод вучняў выпускных класаў. Эстафета, у якой было ўсё: страх і нянавісць на трыбунах, каханне і «смерць» на бегавой дарожцы, феерычны абмен эстафетнымі палачкамі перад самым фінішам, а таксама цыганачка з выхадам нашага галаўрэда на цырымоніі ўручэння прызоў і патрасанне ім правіламі Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый дзеля таго, каб у асобна ўзятай школе перамог алімпійскі прынцып. Чытайце ў нашым рэпартажы...*

x x x

...Вася бег па Андрэеўскім спуску, цягнучы Соню за руку. Раптам перад імі разліўся Дняпро. На трапе белага парахода стаяў Максім, які асляпляльна ўсміхаўся Соні, гатовы прыняць ад Васі ягоную эстафету. На борце парахода сінім маркерам было выведзена... Не, толькі не гэта!..

Соня расплюшчыла вочы ў сваім утульным пакойчыку. Мабільнік паказваў поўдзень. Які хоць сёння дзень? Нядзеля. Яна спала без малага содні. Па-ранейшаму балела горла, але тэмпературы яна пакуль не адчувала.

Дзяўчына асцярожна выслізнула з пакоя ў купальню. Потым зазірнула ў бацькаў пакой.

Таты не было. Соня вярнулася да сябе, патэлефанавала. Пераканалася, што тата ў рэстарацыі. Вызірнула ў акно, упэўнілася, што машын каля дома няма. Тата Віця — у ад'ездзе,

мама Юля, мусіць, на рынку. Трэба было хутчэй выходзіць. Дайсці да тралейбуса, пакуль ясная галава.

— І далёка сабралася?

Соня абярнулася. Яна ўжо замыкала веснічкі, калі пачула кплівы Максімаў голас. Хлопец стаяў на ажурным гаўбцы з кубкам у руках.

— Да таты ў «Пан Сцяпан».

— Доктарка сказала табе тыдзень ляжаць, — Максім адпіў з кубка, разглядаючы Соню на падворку, як экзатычную рэптылію ў тэрарыуме.

— Я еду пагаварыць пра тое, што нам трэба адсюль з’ехаць.

— З чаго раптам?

— Бо мы з табой дамаўляліся. А я заўсёды трымаю слова.

— А... Я і забыў ужо.

— А я вось выдатна помню. Я не застануся тут, Статкевіч. Вы перамаглі — значыць, я з’язджаю.

— Ты што, не чытала інтэрнэт? — здзіўлена спытаўся Максім. — А, ну так, ты ж у анабіёзе ляжала... Карацей, Сінічка, школы табе было мала — гэтым разам ты мяне на ўсю краіну зняславіла. Але сутнасць не ў гэтым, а ў тым, што і нас, і вас у выніку дысквальнулі.

— Як дысквальнулі?

— Вельмі проста. Калі бягун памылкова перадае палачку саперніку, дыскваліфікуюць абедзве каманды. Так што перамог 11 «Б».

— Дык значыць...

— Значыць, ты можаш заставацца. Ну, вядома, калі хочаш. Бо я таксама заўсёды трымаю слова. Так што не дуры, а ідзі кладзіся ў ложак. Мяне тут да цябе медбратам прыставілі. Але паколькі агоніі я не назіраю, абслужыш сябе сама. Пігулкі на стале ў кухні. Твая ранішняя доза. І не заходзь у мой пакой!!!

— Статкевіч!!!

Максім павярнуўся быў, каб ісці ў дом, калі Соня яго спыніла.

— Чаго табе яшчэ?

— Ты ж чытаў правілы эстафеты?

— Ну і?..

— І ты запамінаеш усё, што калі-кольвек прачытаў?

— Ну і?

— І ты ведаў, што, калі дакранешся да нашай палачкі, 11 «А» дыскваліфікуюць?

— Мучся здагадкамі, — яхідна прамовіў Максім і замкнуў за сабой гаўбец.

Рып, рып... Так рыпелі веснічкі «лялечнага дома», радуючыся, што яшчэ пэўны час ім давядзецца ўпускаць і выпускаць Соню Сінічку.

# ТОМ ДРУГІ

## Раздзел I

# ВАСЯМНАЦЦАЦЬ ГРАДУСАЎ

Вышчыпаць бровы ці і так нармальна?

Соня Сінічка стаяла ў купальні з зубной шчоткай за шчакой і разглядала сябе ў люстэрку. На ёй была балахонная піжама ў шэрыя слонікі — тата Віця выстаўляў ацяпленне на васямнаццаць градусаў. Так Статкевічы прызвычаіліся ў Лондане. Стаяў люты, трывалі маразы. Вось ужо чатыры месяцы Пётр Сінічка з дачкой жылі ў катэджы сяброў пасля таго, як іхні дом склаўся ад выбуху газу.

Чатыры месяцы — а ўжо столькі змен. Соня пастрайнела, выцягнулася, а шчокі ейныя паружавелі. Калі яны жылі ўдваіх з татам, Соня спажывала пераважна пельмені ды сасіскі (усё, што была ў стане прыгатаваць), разагрэтыя ў мікрахвалёўцы катлеты і адбіўныя з татавай рэстарацыі, але часцей — чызбургеры з «макдональдса» ды піражкі з кулінарыі. Мама Юля ж спраўна ўлівала ў Соню суп, а таксама сачыла, каб дзяўчына штодня піла сокі і ела свежыя салаткі з гародніны. Галава перастала круціцца, і жывот цяпер балеў зусім рэдка. Не сказаўшы «гуд бай», адзін за адным пазнікалі з твару самыя буйнакаліберныя прышчы.

Соня паціху інтэгравалася калі не ў сям'ю Статкевічаў, то, прынамсі, у іхную хатнюю гаспадарку. Па суботах прыбірала свой, татаў пакой і, калі паспявала за ўвішнай мамай

Юляй, яшчэ нейкую частку дому. Мыла кухню і прала свае ды татавы рэчы. Вось толькі пасля таго, як ейная спроба спячы торцік запусціла пажарную сігналізацыю, да пліты Соня не падыходзіла.

Мама Юля па-ранейшаму была на сёмым небе ад таго, што ў ейным доме жыве «самая сапраўдная дзяўчынка». То на шопінг Соню зацягне, то ў модную кавярню, то ў кіно на рамантычную камедыю. Спрабавала нават арганізаваць Соні візу на калядны распродаж у Вільню, але з тэрмінамі не атрымалася. А з новага года ўпісала юную сяброўку на свой абанемент у салон прыгажосці. І вось пакуль маму Юлю стрыгуць, фарбуюць і абгортваюць, Соні прапаноўваюць каву, зялёную гарбату і розныя дробныя касметычныя працэдуры: то грыўку падраўняць, то крэм для твару падабраць. А цырульніца Ляля панадзілася чапляцца да Соніных валасоў. Спачатку спрабавала Соню хной падфарбаваць, але дзяўчо катэгарычна адмовілася. А ўчора Ляля прапанавала якое-небудзь арыгінальнае карэ. Соня ўзяла ды пагадзілася. Варта ўпершыню ў жыцці паспрабаваць, а калі не спадабаецца, «да вяселля адрасце».

І вось дзяўчына, чысцячы зубы, ацэньвала новы вобраз. Ляля ведала сваю справу. Соня... Не, не папрыгажэла — такімі словамі я б не раскідвалася. Але «пацікавела» — дакладна. Нават выраз вачэй, здавалася, змяніўся.

Можа, пачаць вейкі падфарбоўваць?

Адным словам, наша гераіня ўвачавідкі мянялася. І не яна адна. Выплюнуўшы пасту, яна з замілаваннем агледзела мужчынскі станок для галення, які ўжо з тыдзень ганарліва красаваўся ў шклянцы на мыйцы.

Паненка з надзеяй абцягнула слонікаў на грудзях. Не, мянялася далёка не ўсё.

— Сінічка! Ты вызваліш санвузел ці не? За табой чарга, як у плацкартным вагоне!

Ну вось. Гэта за чатыры месяцы таксама засталося без змен. Уздыхнуўшы, Соня выйшла з купальні насустрач заспанаму Максіму. Збіваючы іх абаіх з ног, туды адразу заскочыў малы Вадзік.

— Не суй сваю шчотку ў маю шклянку!!! Дура!

Стасункі Соні і Максіма пасля эстафеты можна было абазначыць як халодны мір. Высяляць Соню з Верасовай браты Статкевічы больш не спрабавалі, але, як і тата Віця дом, пастаянна трымалі Соню на васямнаццаці градусах. Каб не расслаблялася. Ну, а паколькі Соня і Максім свята датрымліваліся прынцыпу «не-размаўляй-са-мной-у-школе», пляткарыць і жартаваць іхнім аднакласнікам больш не было пра што. Хіба што мама Юля пару разоў заруліла, падмяняючы Пятра Сінічку, на бацькоўскі сход «Д» класа. Але ад гэтага «ашкі» (а зрэшты і «дэшкі») толькі сталі ўспрымаць Соню як пацешную малодшую сястрычку Максіма. Раўнаваць да якой смешна і недарэчна.

Да таго ж на навагодняй дыскатэцы Ваня Каланіцкі прызнаўся ў каханні Лене Каньковай, і пра Соню з Максімам канчаткова забыліся.

— Што, Максік, загледзеўся? Праўда, Соні пасуе новая стрыжка?

— Ды не, мама. Акурат разважаў пра тое, што галоўная аздоба жанчыны — доўгія валасы.

Гэта ўжо за сняданкам.

— Мама, ты пасля абеду выпадкова не едзеш у горад?

— А што?

— Мне трэба ў цэнтр, на курсы па інглішы перад рэспубліканскай алімпіядай.

— Ты ж ніколі на іх не хадзіў.

— Я еду на першы занятак сказаць, каб мяне выкраслілі. У мінулым годзе ў школу тэлефанавалі, скардзіліся, бо я там не з'явіўся.

— Я паеду, але вечарам. Павязу Вадзіка на прэзентацыю чарговай кнігі пра мумітроляў.

— Мама, я не хачу!

— Сынок, табе ж спадабаліся папярэднія кнігі пра мумітроляў...

— Але я вырас! Цяпер я аддаю перавагу навуковай літаратуры.

— Размаўляй як нармальнае дзіця.

— Але Максім так заўсёды кажа!

— Максіму можна, ён дарослы.

— Дык што, мама?

— Слухай, пад'едзь сам. Мне яшчэ да доктара сёння... Зірні расклад аўтобуса, у мяне на працоўным стале захаваны. Усё, Вадзік, абувайся.

— Мама, я цябе прасіў, прыбяры гэтую фотку!!!

Соня ажно здрыганулася. Максім вывеў хатні камп'ютар з соннага рэжыму, і на маніторы высвеціўся фотаздымак. На фоне жоўтай трыбуны хлопец прыціскаў Соню да грудзей, трымаючы на руках. Гэты здымак з лістапада ўпрыгожваў працоўны стол мамы Юлі.

— І не падумаю, — сказала мама Юля, высоўваючыся з вітальні. — Гэта мой найлепшы рэпартажны кадр!

— Ты ж ведаеш, мяне раздражняе. Я прыбяру.

— Але ты ж ведаеш, я вярну. Мы паехалі. Змагайцеся тут, дзеці.

Словам, звычайны ранак у сям'і Статкевічаў.

Соня мыла свой кубак, калі ейны мабільны каротка пілікнуў. Вася. Пусціў званок, каб Соня выходзіла.

— Ізноў ты? І не абрыдла сюды цягацца? — пачула Соня, запакоўваючыся ў куртку, Максімаў голас знадворку.

— Ды вось. Пільную, каб геній раптам не абярнуўся зверам, — пратрубіў Вася аднекуль з-за веснічак. — А то знаеш, як яно бывае… Жыве сабе батанік, на алімпіяды ходзіць,

а потым бярэ драбавік і расстрэльвае палову школы. Так што мне неспакойна, пакуль побач з табой Сініца.

— Ну, пільнуй, пільнуй, пільны ты наш, — зноў загаварыў Максім. — Слухай, а вы з ёй адно аднаго вартыя...

— Вось бачыш, нарэшце ты прызнаў гэта!

— Абодва цягаецеся за чалавекам, якому да вас няма справы.

— Паўтары, што ты сказаў?!!

Але адказу не было. Мусіць, Максім ужо завярнуў за рог дома, каб ісці ў школу напрасткі.

Соня расчыніла дзверы. У твар сыпанула снегам.

— Сініца, ты зноў без шапкі? Ты што, пастрыглася?! А табе да твару.

Была сярэдзіна трэцяй чвэрці.

Раздзел II

# КІМ БЫЦЬ

Была сярэдзіна трэцяй чвэрці, і 11 «Д» пачынаў хаатычна брацца за розум. Не было ўжо як адкручвацца: навучальны год ляцеў з гары, і наперадзе праглядаўся канец школы і яно — няўмольнае і непазбежнае Паступленне.

Галоўнае — зрабіцца студэнтам і яшчэ пяць гадоў ні пра што не парыцца. Такі быў агульны настрой. Так разважалі Соня, Галя і Снежка яшчэ перад новым годам, калі млява, паміж пераказам школьных плётак і спісваннем адна ў адной дамашкі, гутарылі пра будучыню.

Але ў трэцяй чвэрці тройца раптам усвядоміла, што яны адзіныя ў класе не тое што не выбралі ўніверсітэта, але ў прынцыпе не ведаюць, кім быць.

Між тым градус паступляжу нарастаў. Усё часцей замiж пытанняў «Ці не саскочыць нам з белліту?» і «Што будзем рабіць пасля ўрокаў?» «дэшкі» адрасавалі адно аднаму сакраментальнае «А куды ты паступаеш?»

Яшчэ і Ніначка падлівала алею ў агонь:

— Выпускны вы клас або дзе? — грымела яна на ўроках. — У сакавіку, максімум у пачатку красавіка я мушу ведаць, якія іспыты вы здаяце ў школе! Але, як відаць, вам па барабане! Вышэйшая адукацыя нікому, бачу, не патрэбная. Вы нават не чухаецеся! Што, усе хочуць на рынку гандляваць? Падумайце

пра будучыню! Вось «А» клас — такія разумнічкі — кожны з пялюшак ведае свой універсітэт! Вось гэта мэтанакіраванасць! А вы што? Ганьбіце мяне, спіце ў шапку...

Гэта была не зусім праўда. «Д» клас у шапку не спаў. Раптам выявілася, што той ці гэтая занятыя на нейкіх курсах і запісаныя да кучы рэпетытараў. Не ўсе, зразумела. Дубовік з Лысым, важна цвіркаючы слінай, расказвалі, што пасля школы будуць чакаць прызыву, бо сапраўдны пацан мусіць адслужыць. Пералічвалі вайсковыя гарнізоны, у якія мараць трапіць, і спрачаліся міжсобку, які круцейшы. Пра «пасля арміі» хлопцы не асабліва задумваліся, але пераконвалі, што, дэмбельнуўшыся, лёгка ўладкуюцца на службу ў прыватную ахову ці нават АМАП.

Амаль усе іншыя хлопцы ў класе і нават пара дзяўчат трызнілі камп'ютарамі. Большасць збіралася вучыцца на праграмістаў. Пра заробкі ў IT «дэшкі» гаварылі часта і са смакам. Трэба прарывацца ў тэхнічныя ўніверы, на факультэты, куды лягчэй паступіць, пагаджаліся ў 11 «Д». А там паглядзім.

Аліна Макей збіралася ў медвучэльню і паралельна на курсы касметолага-візажыста, каб пайсці ў які спа-салон або прыватны медцэнтр. Дзяніс Лінькоў надумаў у эканамічны, вывучаць лагістыку.

Карацей, большасць «дэшак» цвёрда стаяла на зямлі і ведала, чаго хоча ад жыцця. Слухаючы аднакласнікаў, Соня і ейныя сяброўкі пачыналі ўсур'ёз пераймацца. Дакладней, пераймаліся толькі Соня і Снежка. Галя акурат ведала, чаго хоча ад жыцця. У яе была іншая праблема.

— Я пасля школы адразу магу ісці ў швачкі, — уздыхала яна. — Але мама... Кажа, не для таго яны з татам у сталіцу з вёскі прабіліся, каб дзеці без вышэйшай адукацыі засталіся. Я кажу, што ўладкуюся для пачатку на які «Серж», а потым паступлю на тэхнолага завочна, а яна заладзіла: непрэстыжна, катарга. Сказала, ідзі куды хочаш, толькі на дзённае,

вывучым, аплацім. А што мне іхнія грошы... Я і сама на вучобу зарабіць магу!

На перапынку Соня пазычыла ў Сняжаны «Даведнік абітурыента» і гартала яго ў спадзеве наткнуцца на прафесію мары. Загадвала лічбу і разгортвала на пэўнай старонцы. Спрабавала свой дзень народзінаў, а таксама мамы і таты. Нічога не ляжала да сэрца.

Першай справай, калі Снежка прытарабаніла ў школу даведнік, Соня адшукала раздзел «Эканамічны ўніверсітэт, Вышэйшая школа турызму». «Спецыяльнасць: менеджмент сферы турызму. Іспыты: матэматыка, руская/беларуская, замежная — ЦТ». Матэматыка! Не-е-е-е.

Але справа была не толькі ў матэматыцы. Тата хацеў, каб яна паступіла менавіта сюды. Хацеў, каб Соня аднойчы пераняла ў яго рэстарацыю. Соня заплюшчвала вочы і згадвала, як дапамагае яму на кухні ў святы або калі нехта з персаналу не выходзіць на працу. Прадымлены каўтух, дзе заўсёды пара і мітусня. За сценкаю — цемнаватая зала з масіўнымі драўлянымі сталамі, напоўненая хамаватымі наведнікамі, якія рэдка скажуць «дзякуй» за смачную ежу, але абавязкова абураюцца і патрабуюць кнігу скаргаў, калі нешта не так. Бачыла, як у калідорчыку плачуць ад крыўды і стомы татавы афіцыянткі.

Яна бачыла, як цяжка працуе бацька, і не хацела сабе такога ж.

Але потым яна бачыла прасторную залу і столікі, засланыя бялюткімі абрусамі. На венскіх крэслах сядзіць добра ўбраная публіка, а яна ў бездакорнай сукенцы ідзе паўз іх, правяраючы, ці ўсе ў парадку, ці завіхаецца персанал... Ці ўдалася цяляціна па-бургундску, ці шампанскае ў срэбных вядзерцах як след ахаладзілася... Максім завітвае на вячэру — найлепшы столік зарэзерваваны для іх. Ён — уладальнік гэтай фешэнебельнай рэстарацыі, а Соня — адміністратарка. Шэф-повар выходзіць да іх, каб прыняць замову...

Вася?!! Ну чаму ён вечна ўсплывае ў яе ружовай мары ў гэты момант!

— Васілеўскі, а ты што будзеш рабіць пасля школы?

— Што за пытанні, пацаны! Ажанюся з Сініцай!

— Не, ну гэта ясна. А па жыцці? Так і будзеш пельмені смажыць у «Сайгоне»?

— Спакуха! У мяне будзе свая рэстарацыя. Я там буду шэф-повар, а Соня — адміністратар. Скажы, Сініца?

За праваленую эстафету Вася злаваўся на Соню доўга — ажно тры дні. Пасля гэтага ён зноў нагадаў усім, што ён — Сонін жаніх.

У дзявятым класе з Васі страшна кпілі, калі ён абраў сабе «бабскі занятак» — вытворчую практыку па кулінарыі. Вася, аднак, зусім не камплексаваў і практыку, у адрозненне ад школы, наведваў спраўна. У дадатак да падпрацоўкі ў «Сайгоне» ён праз настаўніц кулінарыі, з якімі пяшчотна пасябраваў, перыядычна ўладкоўваўся кухарыць на розных банкетах-фуршэтах і, па чутках, няблага зарабляў. Ды і гатаваў ён крута — «дэшкі» аднойчы каштавалі на школьным «салодкім стале». Ён сапраўды меў усе шанцы стаць выбітным кухарам.

Не, рэстаранная сфера — не для Соні.

Можа, у турфірму? Сядзець у офісе, прадаваць пуцёўкі, адкрываць візы... Ганяць турыстаў па антычных развалінах... Аб'ездзіць свет... Вось яна і Максім каля егіпецкіх пірамід. Соня з ног да галавы захутаная ў белыя шаты — ад сонца і таму, што навокал мусульмане. Максім падсаджвае яе на вярблюда...

Але навошта ім турфірма, каб вандраваць? Яна і Максім — на возеры Байкал, з вялікімі заплечнікамі за спінай ловяць спадарожную машыну, каб ехаць далей, на ўсход. Разам яны пройдуць увесь свет...

— Не, турызм — адстой, — запэўніла Снежка, звяраючыся з экранам смартфона. — Вось нейкая «Dolly, 25 гадоў»,

піша: «Вучылася на турызме ў наргасе, працую па спецыяльнасці. Працы шмат, заробак маленькі, кліенты сволачы, за тры гады толькі аднойчы сама была ў адпачынку. А самае крыўднае — я адна ў нашым офісе заканчвала турызм!!!»

Снежка стварыла тэму пад назвай «Кім быць?» на жаночым форуме, дзе тусавалася. Тэма нечакана выявілася папулярнай, і Снежка цэлы тыдзень зачытвала сяброўкам самае цікавае з расповедаў дарослых карыстальніц.

— Галоўнае, усе пішуць: пофіг дзе вучыцца, усё адно не адгадаеш. Вось тут адна цётка 40 гадоў, скончыла палітэх, а ўжо дзесяць гадоў працуе... фларыстам у салоне кветак — і ёй па кайфе. Піша, што знайшла сябе. І шкадуе толькі, што паслухалася бацькоў і прамарнавала больш за дзесяць гадоў. А сама ў школе вельмі хацела на гістфак, бо заўсёды цікавілася гісторыяй, і цяпер шмат кніг чытае... Ага, вось тут пагаджаюцца, што адукацыя і прафесія — гэта дзве розныя рэчы...

— Дык навошта тады вучыцца? — хмыкнула Галя.

— Во, тут ёсць адказ: «Паўлінка, 30 гадоў. Нават калі вы замужам за мільянерам і вам ні дня ў жыцці не давядзецца працаваць, варта атрымаць добрую гуманітарную адукацыю хоць бы для таго, каб ваш муж меў вартую жонку а дзеці — разумную, развітую маці».

— Дарэчы, Соня, а Статкевіч — мільянер?

Вось пра гэта Соня ніколі не задумвалася. Вядома ж, тата Віця — уладальнік буйной фірмы і шмат зарабляе. У Статкевічаў — вялікі дом, яны маюць усё неабходнае і нават крыху болей. Але ў кішэні да іх яна не зазірала, а багаццем сваім яны не патрасаюць. Усе іх рэчы дарагія і якасныя, але не раскошныя. Максім можа быць як проста заможным, так і вельмі багатым.

Яна не ведала, ці Максім мільянер. Але безумоўна, калі глядзела ў будучыню, ясна бачыла тое, што будзе ягонаю жонкай.

І, безумоўна, не дзеля грошай.

Пра «гуманітарную адукацыю», дарэчы, гэтая Паўлінка добра сказала. Бо, скажам, Соні вельмі хацелася гаварыць па-англійску гэтак жа хораша, як усе ў «лялечным доме». Статкевічы часта ўключалі англамоўныя каналы — і калі там жартавалі, смяяўся нават малы Вадзік. А Соня пачувалася зусім адсталай.

І калі на зімовых вакацыях настаўніца англійскай мовы арганізавала факультатыў, Соня туды таемна запісалася. Схавала сваю раптоўную прагу ведаў нават ад Галі са Снежкай. Пагатоў групы па інглішы ў дзяўчат былі розныя.

Адным словам, у трэцяй чвэрці Соня стала цішком зубарыць мову Шэкспіра і «Бітлз». Абклалася слоўнікамі і падручнікамі ды чытала граматыку перад сном, аблеплівала спінку ложка стыкерамі з мудрагелістымі словамі. Спрабавала глядзець анлайн брытанскія фільмы без перакладу. Балазе ў Соні цяпер быў асабісты ноўтбук! Лёгкі, хуткі, прыгожы і новы — няюзаны. Тата падарыў на Новы год. Сказаў ашалелай ад шчасця дачцэ, што нельга вечна збіраць грошы, пара пажыць для сябе.

Спачатку фільмы зусім не заходзілі. Потым Соня даўмелася тытры падключаць. І нічога так — праз месяц і на слых разбіраць пачала. Усё новыя словы праточваліся ў бедны Сонечкін лексікон. Паводле класіфікацыі Максіма, ёй цяпер было гадоў дзесяць з паловай.

«Лінгвістычны ўніверсітэт. Факультэт англійскай мовы. Лінгвіст, выкладчык дзвюх замежных моў». Выдраўшы палоску паперы з канспекта па хіміі, Соня паклала ў даведнік закладку.

х х х

Сёмага лютага Сонiна дылема «кім быць?» увайшла ў крытычную фазу. Сёмага лютага — яна добра запомніла

дату, бо цэлы ўрок разглядала надпіс на дошцы, зроблены беларусіцай і не сцёрты гісторыкам, — Соня сядзела, як заўсёды, схаваўшыся за Снежкай, і думала. Гісторыя была апошнім урокам у пятніцу ў «Д» класе — але не для яе. У яе яшчэ факультатыў па інглішы, на які настаўніца задала прынесці чарнавік новай тэмы. Каб разам яго праверыць і паправіць.

І ўсё было б добра, калі б не тэма. «My Future Profession»*. Гэтыя тры словы Соня напісала на паперцы, двойчы падкрэсліла асадкай, пасля чаго машынальна пачала ўпрыгожваць іх завіткамі ды кветачкамі.

— Не вызначылася — нічога страшнага, — сказала Соні англічанка. — Ты ж не да споведзі рыхтуешся, а да іспыту. Галоўнае — прадэманстраваць моўны ўзровень.

І праўда. Снежка Кавалёва, падхалімка — а ў іхняй групе гэтае заданне было на мінулым тыдні, — напісала, што хоча быць настаўніцай. Дакладней, з інтэрнэту скатала. «The teacher is a sculptor of a young personality»**. Цьху. І яшчэ цэлая старонка туфты, якой бы яна сама ў жыцці не прыдумала.

Ці не зрабіць так Соні? Але яна не магла напісаць няпраўды. Яна ўсё прымярала на сябе.

А можа сапраўды — у лінгвістычны, а потым — настаўніцай англійскай мовы?

Але Снежка сказала, што настаўніцай — гэта ўвогуле жах, бо ім нічога не плацяць, а маладых цяпер размяркоўваюць у вёскі.

Быць настаўніцай у вёсцы Соня не хацела.

Зрэшты, калі б у тую ж вёску паехаў настаўнічаць Максім, гэта было б вельмі рамантычна. Яны б жылі ў простай драўлянай хатцы на ўскрайку сяла, грэліся б каля груб-

* Мая будучая прафесія *(англ.)*.

** Настаўнік — скульптар юнага індывідуума *(англ.)*.

кі, варылі б на вячэру бульбу ў чыгунку, слухалі б завіруху знадворку і доўга размаўлялі б пра ўсё на свеце... А ўдзячныя бацькі іх вучняў прыносілі б ім сала і гуркі ў слоіках... З Максіма б выйшаў выдатны вясковы настаўнік!..

У нейкі момант Соня заўважыла, што яна зусім не ўяўляе, кім быць, але вельмі добра ведае, з кім.

Добра гэта ці кепска? У каго б спытацца?

— Мама Юля, а гэта добра ці кепска, калі, напрыклад... мужчына выбірае прафесію, каб заўсёды быць побач з жонкай? — пацікавілася Соня, калі яны засталіся сам-насам у гасцёўні.

— Гэта здараецца, — пацiснула плячыма мама Юля. — Мусіць, гэта нармальна. Але мне здаецца, мужчыны так ніколі не робяць.

— Што, зусім ніколі?

— Ну, тата Віця любіць расказваць, што заснаваў IT-кантору, каб даць працу такому шыкоўнаму спецыялісту, як я. Але гэта проста прыгожая байка для застолляў. Я ў ягонай кампаніі пісала ўсё што заўгодна, апроч кодаў. Справаздачы, бізнес-планы, плакаты для карпаратываў... А ўвогуле, мне падабаецца працаваць жонкай і мамай. Як у Лондане было: дома муж, на працы муж... Сварыліся мы часта. Не ведаю, як мужчыны... Мне здаецца, жанчыны часта выбіраюць прафесію, каб пабыць асобна ад сям'і. Самімі сабою. Дарэчы, хочаш табе маё новае працоўнае месца пакажу? — усхапіўшыся, кабета падляцела да хатняга камп'ютара.

— Вы на працу выходзіце?

— Ну, не зусім. Хутчэй на рынак, — і яна з гонарам націснула закладку ў браўзеры. «Фотаблог Юліі Арцёмавай» — высвецілася на маніторы.

— Я даслала некалькі здымкаў у суполку беларускіх фотамастакоў, і яны дазволілі мне адкрыць профіль на сваім рэсурсе. Пакуль буду змяшчаць тут працы. Каму яны спадабаюцца — могуць замаўляць фотасесіі. А яшчэ тут можна

прадаваць здымкі медыя. Праўда здорава? А то Вадзік хутка зусім вялікі стане... Увогуле, гэта вельмі цікавы сайт. Давай я табе старонкі тутэйшых зорак пакажу...

Сузіраючы чорна-белыя фота закінутых заводаў і каляровыя — закінутых вёсак, Соня так і не наважылася спытацца: «Мама Юля, а кім хоча стаць Максім?»

Паводле афіцыйнай, «татавіцевай», версіі Максім атрымае дыплом за мяжой і ачоліць фірму Стакевічаў. Або адзін з яе філіялаў.

Але Соня надта добра адчувала людзей, каб зразумець: усё не так проста.

Кожны раз, калі старэйшы Статкевіч паспяваў да вячэры, ён заводзіў за сталом размову пра Максіма і Лонданскую школу эканомікі. Максім у адказ маўчаў. Часам ён спрабаваў нешта запярэчыць. Тады тата Віця зіркаў на Соню і маму Юлю і казаў сыну: «Хадзем прагуляемся. Ёсць мужчынская размова». Аднойчы, вяртаючыся з крамы, Соня бачыла такую размову здалёк. Сын і бацька стаялі на беразе Цнянкі, зацята жэстыкулюючы.

У чым Максім сапраўды бачыць сваё пакліканне? Соні конча трэба было ведаць гэта, каб вызначыць, кім быць ёй. Каб усё жыццё ісці з ім поруч.

Яна паспрабавала спытацца ў хлопца наўпрост і падпільнавала ў калідоры каля пакоя.

— Максім...

— Чаго табе яшчэ?

— Скажы, толькі шчыра: кім ты хочаш быць?

— Ты ж чула. Я буду вучыцца ў Лондане, а потым працаваць з бацькам.

— Я не пра гэта спыталася. Я спыталася, кім ты сапраўды хочаш быць.

— Гэта ўсё, што табе належыць ведаць, — пасля некаторай замінкі прамовіў Максім.

— Але...

— Усё. Прэс-канферэнцыя скончаная.

На іншы вынік не варта было і разлічваць.

Сонінай цікаўнасці, аднак, было не ўтаймаваць. І гэта зрабілася прычынай таго, што адбылося толькі што, перад гісторыяй, і цяпер рвала Соні сэрца.

У трэцяй чвэрці Соня адпісалася ад школьных абедаў, толькі зрэдчас забягаючы ў сталоўку па шакаладку ці булачку. Але сёння з самага ранку Вася сеў ёй на галаву. Маўляў, цётка Тоня — ягоная мама — гатуе сваю каронную тварожную запяканку, якую Соня заўсёды вельмі любіла. Са слоў Васі вынікала, што запяканка запякаецца ледзь не выключна дзеля Соні і тая проста мусіць спусціцца на абед.

І Соня пайшла. Найперш таму, што ўсё яшчэ пачувалася вінаватай перад Васем і не хацела крыўдзіць яго, а пагатоў ягоную маму.

Запяканку ў школе любіла не адна Соня. Перад раздачай пашыхтавалася галаслівая чарга.

— Ну, як вам? Праўда шык? — даляцеў да яе раптам ялейны галасок.

— Ваў! Суперскае адценне.

Соня ўскінула галаву. Перад ёй у чарзе стаяла Паўзункова ў кампаніі дзвюх «гэшак».

Гэта былі даставучкі, якіх звалі Соня і Соня. Наша Соня ведала іх з дзіцячага садка і заўсёды завочна не любіла, бо яны самім сваім існаваннем нагадвалі, якое папсовае яна мае імя.

Пабачанае адпавядала чуткам. Крылова і Віткевіч, замірыўшыся пасля эстафеты, пастанавілі сябраваць супраць Паўзунковай. Канчаткова рассварыўшыся з аднакласніцамі, Паўзункова набрала новую світу падхалімак. І, стусаваўшыся з імі, рэзка гламурызавалася. Цяпер яна падціскала да бока кампактную лакаваную сумку з кракадзілавай скуры. Няшчасны рыдыкюль ажно распірала ад падручнікаў ды сшыткаў, а Соня і Соня з фальшывым захапленнем углядаліся ў паўзункоўскія скулы, падкрэсленыя яркімі румянамі.

Усе тры паненкі ледзьве трымалі раўнавагу на высачэзных шпільках, якія рабілі рост абедзвюх Сонь блізкім да мадэльнага, а Лізін — амаль баскетбольным.

— Мама прывезла з Беластока. Каштавала як такі ж аб'ём какаіну, але хіба на такое шкада?

— Абалдзець. Твой Максік, напэўна, у экстазе!

— І не кажы! Сёння ўсе ўрокі глядзеў толькі на мяне. Вачэй не адводзіў!

Соні аж дыхалку заняло ад абурэння. «Твой Максік!» Што за беспардоннасць! Нават Соня мае большае права называць яго «сваім»! А наконт «вачэй не адводзіў» дык увогуле смешна. Цікуючы за «А» класам, Соня добра ведала, што Паўзункова сядзіць на пятай парце, на варыянце Статкевіча, адразу за ім. І бачыць яе на ўроку ён мог бы, толькі скруціўшы шыю на 180 градусаў... Ведаем мы гэтыя фокусы: «Максім, пазыч сцірку... Максім, а які ў цябе адказ у пятым заданні?»

— Няма павідла! Па рэцэпце паложана смятана! — пачула Соня сярдзіты голас цёткі Тоні. Паўзункова з эскортам дастаяліся да раздачы.

— Ну можна хоць бы сярэдзінку? Тут край падгарэлы — капрызна прагундосіла Ліза.

— Бяры што даюць і не затрымлівай чаргі!

— Цёця, паветлівей! Ты як бы з будучай элітай размаўляеш, — гаркнула адна з Сонь.

— Эліта — хата бляхай крыта! Талеркі навучыся прыбіраць за сабою, эліта. А то пасля вашага класа няясна, ці то свінні паелі, ці то шляхта паабедала...

Вымова ў цёткі Тоні была мяккая, вясковая. І сама яна была мяккая, пульхная. І характар мела мяккі, дабрадушны. Калі яе, вядома, не даводзілі.

Сінічку яна, зрэшты, любіла.

— Сонечка, дабрыдзень, золатка! Даўно ж цябе тут не было! Дай жа на цябе паглядзець! Але ж вырасла! Зусім ужо нявеста! Па запяканачку прыйшла?

Магчыма, нават занадта любіла.

— Вой, я столькі не з'ем! — замахала рукамі Соня, калі Васева мама паклала на талерку вялізны кавалак запяканкі: духмяны, паркі, з самага сэрца бляхі.

— Еж, папраўляйся! А то зусім змарнела з гэтай вучобай! Табе чым паліць: смятанай ці павідлам?

— Дык няма ж павідла?

— Для Лёшкавых сяброў ёсць усё. Во, трымай... Ну як вы там з маім аболтусам? Ладзіце? Не сварыцеся? — цётка Тоня перахілілася цераз раздачу, шматзначна падміргнуўшы. Замест адказу Соня хуценька падзякавала, сунула касірцы грошы і, схапіўшы са стойкі шклянку з гарбатай, пайшла шукаць столік...

...Сцерва часта прачынаецца ў дзяўчыне адначасова з жанчынай. Пабачыўшы на сваім шляху Паўзункову, Соня не стала, як зазвычай, шукаць спосабу абмінуць яе, а, зрабіўшы самы анёльскі тварык, на які была здатная, павалі і ўрачыста (як у зачараваным сне) пранесла пад носам гадаўкі талерку з палітай павідлам запяканкай. Адышоўшыся, прыслухалася. Пачула тое, што хацела. Паўзункова за ейнай спінай ціха, але са злосцю вылаялася. Прычым даволі брудна.

«Хо-хо, якія мы словы ведаем!» — у думках парадавалася Соня і села за свой улюбёны столік каля акна, што выходзіла ў школьны сквер.

Яна ведала: калі нейкі чараўнік узмахам палачкі выключыць гук у сталоўцы, можна будзе пачуць, як цвіркаюць сініцы. Яны спявалі ёй сёння па дарозе ў школу. Соня з дзяцінства пяшчотна ставілася да гэтых пацешных жоўтых птушак. «Наша татэмная жывёла, — смяяўся тата, калі яны падвязвалі ім узімку сала да фрамугі ў інтэрнаце, — у мяне ж у дзетдоме іншае прозвішча было. А Сінічкай мяне выхавальніцы называлі. Казалі, бо вяртлявы і шмат чырыкаю».

І так тата прырос да сваёй мянушкі, што, атрымліваючы пашпарт, не захацеў быць Пятром Пятровым.

Сініцы заўсёды пачыналі свае нясмелыя песенькі бліжэй да сярэдзіны лютага, калі яшчэ трывалі маразы, але ўжо ўваходзіла ў свае правы сонейка. Дзень, калі пачыналі спяваць сініцы, Соня лічыла першым днём вясны і адзначала як асабістае свята.

Промні зыркага сонца слізганулі па стальніцы і праламаліся ў гранёнай шклянцы з гарбатай. Соня прасачыла танец промняў — і раптам пабачыла ўсё нібы ўпершыню. Нібы яе закінула сюды з іншага кантынента. Персікавыя сцены, бэзавыя жалюзі на вокнах, белыя сталы з мармуровымі разводамі. Нейкія падлеткі ў шэра-бура-малінавых гарнітурчыках схіліліся над талеркамі, жуюць, гудуць як вулей... Школа. Яшчэ некалькі месяцаў — і ўсё гэта застанецца ў мінулым. Ці будзе яна сумаваць па тым, да чаго так прызвычаілася?

Раптам Соня зразумела, што яна пранізліва шчаслівая. Нягледзячы на Максіма, але і дзякуючы яму. Дзякуючы тату і маме Юлі. Дзякуючы Снежцы і Галі. Урэшце дзякуючы Васю. Дзякуючы запяканцы і сініцам.

Напяваючы сабе пад нос песеньку, Соня выбегла са сталоўкі і ўзляцела па прыступках на другі паверх. І раптам замёрла на месцы. Сэрца яе абарвалася, а да горла падкаціў камок. Прыватнай вясны ў душы як не бывала.

На другім паверсе ў гэтым крыле школы змяшчаўся квадратны хол, завешаны насценгазетамі, плакатамі пра здаровы лад жыцця і іншай школьнай атрыбутыкай. Сюды выходзілі актавая зала, бібліятэка, настаўніцкая і кабінет дырэктара. Уздоўж сцен стаялі банкеткі, абцягнутыя чырвоным дэрмацінам. Гэта было адзінае месца ў школе, дзе на перапынку можна было цывілізавана прысесці — на падаконні ў 234-й не дазвалялася ставіць нават сумак. Пятачок гэты дзеці трапна назвалі «біржай». Тут вучні розных класаў сустракаліся, каб абмяняцца сшыткамі і плёткамі. Тут старэйшыя браты і сёстры падлоўлівалі малодшых, бо сюды прыводзіў пераход з корпуса пачатковай школы. Тут прадаваліся і купляліся

кантрольныя і дамашкі. Дык вось, у самым утульным кутку «біржы», на банкетцы каля акна, у поўнай самоце сядзела Маша Ротмістрава.

Безліч эмоцый апошнім часам скаланала душу Соні, калі яна бачыла Машу. А сутыкацца даводзілася часта — як-ніяк, тая вадзілася з дзвюма Сонінымі найлепшымі сяброўкамі. З аднаго боку, Соня заўсёды завочна захаплялася Ротмістравай, пра якую чула толькі харошае. Да таго ж паненка заступілася за Соню пасля экскурсіі ў Кіеў. Соня гэтага, вядома ж, не забыла.

З іншага боку, наша гераіня не ведала, як успрымаць тое, што Ротмістрава амаль цалкам ігнаруе яе існаванне. Не нагэтулькі, каб Галя і Снежка нешта заўважылі, але ўсё-ткі для Сінічкі даволі адчувальна.

Гэта не было звычайнай «ашкінай» фанабэрыяй. Тут было нешта іншае. І аднядаўна Соні стала мроіцца, нібы яна разгадала, што менавіта.

Гэта адбылося ў снежні. На тым тыдні, калі 11 «Д» заступіў на школьнае дзяжурства. Соня, Галя і Снежка прыйшлі ў школу раней, бо ў той дзень Ніначка паставіла іх дружную тройцу на фэйс-кантроль. Вучняў, якія прыходзілі ў школу ў фрывольным або неахайным выглядзе, належала выпраўляць дадому пераапранацца.

Фэйс-кантроль у школе люта ненавідзелі пагалоўна ўсе, асабліва дзяўчаты, многія з якіх бачылі сэнсам свайго жыцця яго абысці. Бо выглядаць адначасова прывабна і прыстойна для многіх паненак — несумяшчальныя рэчы.

Прагнучы падмануць няўмольную вахту, школьныя модніцы вынаходзілі рэвалюцыйныя фасоны. Спадніцы на гумках, якія падцягваліся-абцягваліся на дваццаць, а то і трыццаць сантыметраў; разрэзы, якія зашпільваліся на маланку, але ў класе расшпільваліся, прыадкрываючы ляжкі, абцягнутыя карункавымі панчохамі; шорты-трансформеры — усё гэта крытыкі моды маглі б знайсці ў гардэробе вучаніц 234-й.

Але на два тыдні за год, выходзячы на школьнае дзяжурства, кожная бунтаўніца ператваралася ў няўмольную цэнзарку. Навукоўцы добра апісалі гэтую дзіўную з'яву. І нават фільм пра яе знялі. «Эксперымент» называецца.

У фэйс-кантролі штодня ўдзельнічала тры-чатыры дзяжурныя. Часам да іх далучаўся дырэктар. Калі яго не было, школьны вестыбюль патруляваў дзяжурны класны кіраўнік.

Напярэдадні рэзка пахаладала, і дзяўчатам дазволілі прыходзіць у нагавіцах. Толькі ў джынсах не прапускайце, сказала Ніначка.

Маша Ротмістрава ўвайшла ў школу, як у вершы Блока, — з марозу, расчырванелая. У аблямаваным мехам доўгім кажушку, які адразу пачала расшпільваць. Гузікаў было шмат — яна на момант спынілася ў дзвярах, вожкаючыся з кожным. Такая была завядзёнка — расхінаць перад дзяжурнымі вопратку. Спачатку гэтае патрабаванне ўсіх раздражняла, але пакрысе да яго прызвычаіліся — Соня лавіла сябе на тым, што, уваходзячы ў іншыя памяшканні, пачынае машынальна расшпільваць куртку ўжо на парозе.

Выблытаўшыся з кажушка, Ротмістрава эфектна яго раскрыла і, усміхнуўшыся, падміргнула Галі. Снежка з Соняй ахнулі. На Ротмістравай быў кароткі прыталены сіні пінжачок, з-пад якога складкамі спадала раскошная спадніца ў мудрагелістыя краткі, сінія з карычневым. Спадніца даходзіла Машы да сярэдзіны галёнкі. Пад ёй дзяўчаты пабачылі какетлівыя паўботцікі на абцасіку, уцепленыя беласнежнымі гетрамі.

— Мая праца, — з гонарам сказала Галя. — У сэнсе, толькі спадніца. Складаны матэрыял. Надта ўжо сыпкі. Але затое ніякай сінтэтыкі — і вельмі цёплы. Акурат на зіму. Я...

Галя не дагаварыла, таму што ў вестыбюлі рэхам разнеслася істэрычнае:

— Ротмістрава!!! Гэта што такое?

Нязграбна слізгаючы стаптанымі лодачкамі па бетонных плітах, да іх перабірала нагамі Ніначка.

— Піпец Машцы, — ціха сказала Снежка.

Ротміcontainstраву класная «дэшак» на дух не пераносіла. І гэта было ўзаемна. Як расказвалі дзяўчаты, недалюблівалі яны адна адну яшчэ з сёмага класа — Маша заўсёды шмат чытала, у тым ліку з рускай літаратуры, і не праходзіла ўрока, каб яна не задала русіцы пытання, на якое тая не магла адказаць, не паправіла яе або іншым якім чынам не пасадзіла ў лужыну. Так што торф доўга тлеў на асушаным балоце, пакуль усё ўадначассе не палыхнула.

У дзясятым класе Ротмістрава, якая славілася сваімі сачыненнямі, напісала цэлы трактат пра сямейныя каштоўнасці, што фармальна быў водгукам на раман Льва Талстога «Ганна Карэніна». І, між іншага, укруціла туды думку, маўляў, да Талстога варта было б прыслухацца і сучасным сем'ям. Слухалі б — не мелі б мы столькі гаротных развядзёнак з маленькімі дзецьмі.

Як на тое, Ніначка акурат афармляла развод. Таму сачыненне Ротмістравай успрыняла як асабістую абразу, уляпіўшы круглай выдатніцы чацвёрку за змест. (Па дзесяцібальнай сістэме, зразумела.)

Ротмістрава страшэнна абразілася і ў пошуках праўды дайшла да дырэктара. Той, аднак, не стаў падрываць аўтарытэту педагога, сказаўшы, маўляў, адзнаку вы, Марыя, заслужылі, але — я прасачу! — на бал у чвэрці яна не паўплывае.

Ротмістравай былі патрэбныя не балы, а справядлівасць. У абыход Ніначкі, праз школьную метадыстку, яна, не змяніўшы ані слова, падала сачыненне на гарадскі конкурс, атрымаўшы ў выніку галоўны дыплом. Са словамі: «Я рады, што ўсё так слаўна развязалася», — дырэктар адшпіліў Ніначцы прэмію. Што для той было раўназначна поўсе.

Русіца паспрабавала ў пачатку года адмовіцца ад 11 «А», спасылаючыся на перанагрузку, але ёй не дазволілі. І Ротмістрава працягнула сваю страшную помсту. З дапамогаю той

жа метадысткі пратачылася на алімпіяду па рускай мове і заняла першае месца ў раёне, а потым і ў горадзе.

Звонку нібы ўсё было ціха і мірна, але далучаныя ведалі: знойдзе за што — русіца Ротміstatраву ўрые.

— Гэта што такое? — паўтарыла Ніначка, затармазіўшы перад Машай і двума пальцамі прыўзняўшы кратчастую матэрыю.

— Як што? Спадніца, — з лёгкім здзіўленнем адказала Ротмістрава.

— Зараз жа дадому! Прывядзі сябе ў чалавечы выгляд — і тады ўжо на ўрок, — скамандавала настаўніца. — А вы куды гледзіце? — накінулася яна на Сінічку, якая стаяла найбліжэй.

— Мы... Э-э-э...

Але Ніначка ўжо не слухала. Яна як ашалела.

— Ты што сабе дазваляеш?! Ты не на вечарынку прыйшла, а ў школу! Храм навукі! Табе гэтыя словы кажуць што-небудзь ці не?

— Я не разумею, што не так з маёй спадніцай, — спакойна працягнула Ротмістрава.

Ніначка асеклася. І сапраўды. Збоку цяжка было зразумець, чаго яна раптам уз'елася на Машу.

— Гэта... Гэта... Гэта выглядае непрыстойна, — нарэшце знайшлася настаўніца.

— Непрыстойна? — ускінуўшы бровы, Ротмістрава выразна агледзела Ніначку. На той быў смелы бардовы гарнітурчык у абліпку, са спадніцай-алоўкам, якая даволі зваблівa адкрывала каленкі. Ніначка сумелася.

— Ніна Віталеўна, сапраўды, ёсць адна прычына, па якой гэтая спадніца не зусім дарэчы ў школе. І калі вы мне яе назавяце, я пайду дадому і пераапрануся.

І Ротмістрава ў чаканні ўперыла вочы ў Ніначку. Тая, аднак, стаяла і моўчкі хапала ротам паветра.

Раптам Соня пачула знаёмы смех. Максім, аказваецца, стаяў у вестыбюлі і ўсё бачыў. На ім было яго восеньскае

шэрае паліто, у якім ён выглядаў яшчэ салідней і яшчэ болей ёй падабаўся. Хлопец наблізіўся да Машы і...

Соні падалося, ці ён на долю секунды абняў аднакласніцу за талію?

— Хадзем, Марыя. Хвіліна прайшла, каманда знатакоў не дала адказу.

Не разумеючы, што робіць, Соня кінулася за імі, у бок шатні 11 «А». Падбегла і застыла перад пластыкавай пераборкай, за якой знікла парачка.

— І падабаецца ж табе здзекавацца з убогіх... Кінь дурное, — пачула Соня жартаўлівы Максімаў голас.

— Ты ж ведаеш, я ўвогуле белая і пухнатая. Але з Ніначкай — тут асабістае.

— Марыя, ты ж разумная дзяўчына. Навошта марнаваць інтэлект на пасткі для кабеціны, якой, апроч гэтай школы, нічога ў жыцці не свеціць? Будзь вышэй.

— Ого, ад каго чую... Ты ж і сам такі!

— Ты пра што?

— А пра тое. Любіш пацвяліць, як ты там сказаў, убогіх... Што, таксама асабістае? — гулліва спыталася Ротмістрава і захіхікала.

— Спадніца, дарэчы, фантастычная. І табе вельмі пасуе, — памяняў Максім тэму. Яны з Машай акурат выходзілі з шатні, мінаючы пабялелую Соню.

— Значыць, гэта праўда, бо не ў тваіх правілах рабіць дзяўчатам кампліменты...

Далей Соня не пачула, але і пачутага было дастаткова, каб загнацца.

Ротмістрава і Статкевіч, аказваецца, няблага ладзяць і вельмі добра адчуваюць адно аднаго.

Ці не таму Ротмістрава не прымае Соні, што...

— Спадніцу Машка мне замаўляла ў багемным стылі. А ў школе трэба трымацца дзелавога. Ніначка гэта нутром адчула, але словамі перадаць не змагла, — тарахцела, сеўшы

на свайго канька, па дарозе на першы ўрок Галя. Але Соня не слухала. Яна больш не магла спакойна ўспрымаць гісторыі пра бліскучую Машу Ротміストраву.

x x x

Ротмістрава сядзела на банкетцы і чытала. Яе кратчастая спадніца прыгожа драпіравала чырвоную сядушку. З-пад сіняга пінжачка вытыркала бялюткае жабо блузкі. Брытанская гімназістка перад Першай сусветнай дый годзе. Ад частага прасавання тонкае сукно пачало ўжо дзе-нідзе ільсніцца. Соня гэта, вядома, адразу прыкмеціла, але сіл пазласловіць на гэты конт не адшукала.

Чым мілейшай здавалася Маша, тым больш гэта дэмаралізавала Соню. Душэўныя мукі былі невыносныя, але трэба было наважвацца. Цяпер або ніколі. Пакуль яна адна, пакуль побач няма ўсіх гэтых ганарлівых «ашак».

Бо шляхам пакутлівых роздумаў Соня прыйшла да высновы, што Ротмістрава — адзіная, хто здольны ёй дапамагчы.

— Прывітанне, Маша, — сказала Соня і тут жа замоўкла.

— Здароў, — адказала тая і запытальна паглядзела на Сінічку, адарваўшыся ад кнігі.

Соня апусціла вочы і, каб нечым заняць сябе, стала разбіраць радкі на старонках, у спадзеве зразумець, што за твор. Дурная забаўка для грамадскага транспарту. Ротмістрава прасачыла ейны позірк і з паблажлівай усмешкай прыўзняла вокладку.

— Замяцін, «Мы»... Перачытваю, — дадала яна пасля паўзы такім тонам, нібы чытаць такую кнігу ўпершыню ў адзінаццатым класе — ганьба для асобы з пачуццём годнасці.

— Я спытацца хацела, — Соня прымружылася, як перад скокам у халодную рэчку.

— Давай, толькі хутчэй, а то званок...

— Ты ж з Максімам Статкевічам на інглішы ў адной групе?

— Ну дапусцім.

— Мне вельмі трэба ведаць адну рэч. Вы... Ну... Вы ж праходзілі ўжо «My Future Profession»?

— Праходзілі. І што?

— Разумееш, мне важна дазнацца, кім хоча стаць Максім.

— А мне адкуль ведаць?

— Ну, ён жа расказваў тэму настаўніцы на ўроку?

— Сінічка, мы «А» клас, — засмяялася Ротмістрава. — Мы не «расказваем тэмы».

Соня ўздыхнула.

— Мы іх запісваем у форме эсэ, па тэме на сшытак, — засунуўшы руку ў заплечнік, Маша выцягнула даволі аб'ёмную тэчку, паказаўшы Соні набор рознакаляровых сшыткаў. — Іх заўсёды трэба насіць з сабой. Дапаўняць. І абараняць індывідуальна, у прызначаны час... Але, вядома, мы размаўляем на моўнай практыцы, адказваем на пытанні, — дадала яна, пабачыўшы ўмольныя Соніны вочы.

— І што казаў Максім?

Маша наморшчыла лоб:

— Па шчырасці, нічога не прыгадваю. Наўрад ці было нешта канкрэтнае пра «джоб». Так, агульныя фразы. Помню, ён быў сказаў: «Вялікае шчасце — дакладна ведаць, для чаго жывеш на Зямлі». Я гэта запомніла, бо і сама так думаю, — прамовіўшы гэта, Маша сумна ўсміхнулася. — А калі не сакрэт, навошта табе? — тут жа пацікавілася яна, дапытліва зірнуўшы на Сінічку.

— Разумееш, мне здаецца, я дакладна ведаю, для чаго жыву, — сказала Соня, стараючыся гучаць самаіранічна. — Бяда толькі ў тым, што гэта наўпрост звязана з Максімам... Алё, гэта ж я, Соня Сінічка, 11 «Д», — памахала яна рукою і змушана рассмяялася.

— Ну, тут я нічым не дапамагу, соры. Трэба ўсё-ткі глядзець, што ён напісаў, — сказала Маша абыякавым гола-

сам. Але ў вачах яе Соня прачытала нешта іншае. Нешта накшталт... разумення і спагады?

— Ясна. У любым выпадку вялікі дзякуй, — сказала Соня і развярнулася, каб ісці. Яе аднак дагнаў Машын голас.

— А ты мяне здзівіла, — іранічна сказала яна. — Я думала, ты пра крыху іншую тэму спытаешся.

Соня спынілася.

— «My Future Spouse».

— Га?

— Вой, вы ж такіх славей не праходзіце. Я мела на ўвазе — «My Future Husband»… Ну, у выпадку Статкевіча wife, — удакладніла Ротмістрава, задаволеная рэакцыяй суразмоўніцы.

Соня стаяла, раскрыўшы рот.

— І... што з гэтай тэмай? — насцярожана перапыталася яна.

— О, тут Статкевіч шпарыць як па напісанаму. Магу пераказаць, калі цікава... Пагаджайся... Free of charge*. Нашыя класныя фіфы даслоўна пазанатоўвалі. Вывучылі, як «Ойча наш».

— Ну, давай, — пагадзілася Соня і тут жа пашкадавала.

— «Мая будучая жонка — высокая станістая дзяўчына з доўгімі валасамі. Хутчэй цёмнымі, чым светлымі. Мае добрыя манеры, з густам апранаецца і не злоўжывае касметыкай. Размаўляе на некалькіх замежных мовах, цікавіцца гісторыяй і мастацтвам, любіць вандраваць. Яна разумная і шмат чытае...»

Соні зрабілася пагана-пагана. Ротмістрава, па ходу, малявала аўтапартрэт.

— Нешта забылася, — працягнула між тым Маша, голас якой на хвілю заглушыў школьны званок. — А, ну вядома: «Яна проста выдатна гатуе».

Дабіць вырашыла.

* Бясплатна *(англ.)*.

— She’s just an awesome cooker, — паўтарыла дзяўчына па-англійску, асабліва прасмакаваўшы «оўсам». — Што з табой, Сінічка?

Соня ледзьве стрымлівалася, каб не заплакаць.

— А ты ўмееш гатаваць? — раптам вырвалася ў яе.

— Не ведаю, не спрабавала, — млява адказала Ротмістрава. — Але думаю, што так. Я ўвогуле таленавітая.

Сказаўшы гэта, яна рассеяна кіўнула Соні і, увапхнуўшы ў заплечнік Замяціна, падарвалася з банкеткі і пабегла па калідоры.

...Завіткі і кветачкі займалі ўжо трациіну аркуша. Гэтак для тэксту месца не застанецца. «Заўсёды кажы праўду, — вучыла Соню бабуля, — тады нічога не трэба запамінаць».

Праўду дык праўду. Выцершы насовачкай мокрыя ад раптоўных слёз вочы, Соня з уздыхам прынялася спярэшчваць паперку немудрагелістымі англійскімі словамі.

x x x

Максім падняўся на другі паверх роднага дому і ў раздражненні спыніўся. Яна зноў задрыхла на калідоры.

Тут, адразу перад сходамі, адкрываўся невялічкі хол, з якога можна было выйсці на гаўбец. Гэты закутак стаяў абсалютна пусты з таго часу, як Статкевічы пабудаваліся. Абжыць яго мама Юля ўсё не мела часу. У гэтай неабжытасці было сваё хараство: узімку ён размінаўся тут з гантэлямі, а Вадзік гуляўся ў футбік або ладзіў забегі робатаў на доўгія дыстанцыі. Ідылія працягвалася да таго чорнага дня, калі дзяўчо займела новы ноўт. Вярнуўшыся з Полацка, дзе сям’я Статкевічаў сустракала Новы год і Каляды, хлопцы знайшлі свой любімы куток занятым.

У былым Вадзікавым пакоі кепска працаваў вай-фай: малога ўсё адно ў інтэрнэт не асабліва пускалі. Мадэм стаяў у супрацьлеглым канцы паверха, у ягоным пакоі пад сталом —

так, каб нармальны сігнал быў на ягоных дэвайсах і каб дабівала да бацькоўскай спальні. То бок звычайныя сайты пры такім сігнале ў «ружовым пекле» мусілі адкрывацца. Але ж гэтая назола ўзяла моду глядзець анлайн розныя тупыя серыялы! Ёсць жа людзі, якім не культуру — жуйку падавай. А як жа якасць карцінкі, гуку? І вось яна выцягне з пакоя падушкі — такія ж ружовыя, як сама, уваткнецца ў разетку для пыласоса, разляжацца на падлозе пад самай сценкай ягонага пакоя, проста ў сваёй ідыёцкай піжаме, — і давай відзікі запускаць. А ў яго там торэнты гальмуюць, скайп — і той завісае!

Але фіг з тымі запампоўкамі. Каб жа яна вачэй не мазоліла. Ён раз сказаў: не сядзі тут. Другі раз сказаў. А яна: «Перастаў мадэм да дзвярэй». Яшчэ чаго. Гэта ягоны дом і ягоны мадэм! І ён будзе стаяць там, дзе зручна яму!

Часаліся рукі пароль памяняць. Але гэтая, яшчэ чаго, здасць бацькам. І тады пачнецца: «Як-ты-абыходзішся-з-госцяй!» Ведаем, праходзілі.

А тут раптам маці рэзка азадачылася дызайнам калідора. Купіла канапу, столікаў панаставіла. Ні праехаць ні прайсці. На падлогу лёг белы пухнаты дыван — знікла прыемнае рэха. Здарылася гэта, натуральна, толькі пасля таго як запаветную пляцоўку перад гаўбцом аблюбавала Сінічка. Ён з усіх сіл стараўся не звязваць гэтыя факты.

Божухна, ніколі б не паверыў, што дзяўчынка можа так храпці, каб не пачуў на ўласныя вушы.

Як бы яе раскатухаць, пакуль маці не пабачыла... У мінулы раз, калі ён прыйшоў ледзьве жывы з корта, яна заявіла, што няшчасная Сонечка так выматалася ў школе, што не мае сіл хадзіць, і яе неадкладна трэба перанесці ў ложак. Ён так узлаваў, што зноў павысіў на маці голас. Дык гэтая ад шуму сама прачухалася.

О, трэба ляснуць дзвярыма. Ён лясне дзвярыма — і яна абудзіцца.

Ён падышоў быў да свайго пакоя, але раптам зноў зазірнуў за кут, у філію ружовага пекла. Шкляны столік перад канапай, на якім стаяў белы ноўтбук, быў засыпаны маркерамі і гелевымі асадкамі, а на падлозе валяўся пульхны агульны сшытак.

Зусім страх страціла. Урокі пачала на калідор выносіць. Сінічка і ўрокі! Ужо смешна...

Ён адчыніў быў дзверы ў свой пакой, але не вытрымаў і вярнуўся. Сшытак валяўся на падлозе. Нічога не павінна валяцца на падлозе, мусіць быць парадак, загундосіў педант у ягонай галаве.

Ён падышоў да канапы, на якой, згарнуўшыся, сапла пад ахovай статка шэрых слонікаў абстрыжанае, кірпатае і курносае непаразуменне, і падняў з дывана канспект, да паловы спісаны англійскім тэкстам. «Sophia Sinichka. 11 D. English. Topics» — прачытаў ён на вокладцы.

Увесь размаляваны кветкамі і сэрцайкамі, абклееены аплікацыямі з падарункавай паперы сшытак больш нагадваў дзявочую анкету, чым зборнік тэм па інглішы. Было відаць, што гаспадыня з вялікім піетэтам ставіцца да таго, што туды запісвае... Перш чым ён зразумеў, што робіць, ён ужо гартаў старонкі.

x x x

*МАЯ БУДУЧАЯ ПРАФЕСІЯ*

*«Вялікае шчасце — дакладна ведаць, для чаго жывеш на Зямлі». Гэта праўда. Праўда таксама ў тым, што я яшчэ не вырашыла, кім хачу стаць у будучыні.*

*Мой выбар звязаны з тым, кім хоча стаць чалавек, якога я кахаю. Мой выбар — працаваць побач з ім і дапамагаць яму, што б ён ні рабіў у жыцці.*

*Калі ён захоча стаць лётчыкам, я стану сцюардэсай. Буду разносіць напоі і ежу пасажырам у самалёце, які ён будзе весці па небе.*

*Калі ён стане хірургам, я стану медсястрой. Буду падаваць яму інструменты і выціраць лоб ад поту, калі ён ратуе людзей.*

*Калі ён захоча стаць настаўнікам англійскай мовы, я таксама стану настаўніцай, і мы разам адкрыем дзецям акно ў свет.*

*Калі ён стане дырэктарам фірмы, я стану яго сакратаркай і буду варыць яму каву і прымаць важныя званкі, арганізоўваць сустрэчы.*

*Калі ён будзе прафесійным тэнісістам, я зраблюся менеджарам тэніснага клуба.*

*Галоўнае — быць побач кожную хвіліну. Я лічу, што гэта — маё пакліканне.*

x x x

Максім згарнуў сшытак, акуратна паклаў яго на столік і, увайшоўшы ў свой пакой, з усяе моцы ляснуў дзвярыма.

Раздзел III

# АДКУЛЬ УЗЯЛАСЯ РОТМІСТРАВА

— Ого, Сініца, з якой нагоды праства? Народзіны ў цябе ў сакавіку... — Галя і Снежка з апетытам сачылі за тым, як сяброўка разгружае паднос, застаўляючы стол філіжанкамі з кавай і вазачкамі з дэсертам.

Яны сядзелі ў кавярні ў новым гандлёвым цэнтры непадалёк ад школы. Шопінг прапанавала Соня. Як-ніяк, на носе чатырнаццатага лютага, а там і дваццаць трэцяга. Самы час купляць падарункі.

— Ну хоць пасядзім, як у старыя часы, — прымружылася Галя, аблізваючыся на шакаладны мус. — А то ты зусім адкалолася. Усё мама Юля ды мама Юля...

— Нічога я не адкалолася, — пакрыўдзілася Соня. — Давайце, налятайце... Толькі гэта не праства, — працягнула яна, калі ласунні застукалі лыжачкамі. — Гэта плата. За інфармацыю.

— М-м-м?.. — ківалі галовамі дзяўчаты.

— Раскажыце мне пра Машу Ротмістраву.

Галя шматзначна паглядзела на Снежку:

— Бач ты! Сініца выйшла з астралу. Цяпер яе цікавіць навакольны свет. Падзеі. Людзі.

— Не думаю, Галюнь. Нутром чую, нешта тут нячыста, — саркастычна запярэчыла Снежка.

— Ну давай, выкладвай. Што менавіта цябе цікавіць? І з чаго раптам такі інтарэс? Табе ж звычайна пофіг на ўсіх і ўся, калі гэта не датычыць твайго ненагляднага.

— Ну, проста вы з ёй сябруеце, а я пра яе амаль нічога не ведаю... Што яна за чалавек?

Снежка рассмяялася:

— Прыко-о-ол, а яна гэтак жа пра цябе пыталася: «Што яна за чалавек?»

Соня напружылася:

— І вы што, ёй пра мяне расказвалі?

— А што тут такога? Расказвалі. Але будзь спок, гэта нікуды далей не пайшло. Не пляткарка яна. Проста... Ёй падабаецца назіраць за людзьмі. Аналізаваць іх учынкі. Яна не толькі пра цябе так пыталася.

— Адкуль яна ўвогуле ўзялася ў нашай школе? Я яе не помню ў малодшых класах.

— Машка да нас у пятым, здаецца, прыйшла. Калі яны сюды пераехалі. У новыя дамы.

— Бацькі ў яе нармальна зарабляюць. У іх інтэрнэт-крама нейкая. Ці то з памперсамі, ці то з ксераксамі. І яшчэ ў яе малодшыя браты-блізняты. Вельмі смешныя...

— І яна адразу з вамі сышлася?

— Не, ты што. Гэта цэлая гісторыя...

— Яна, як перайшла да нас, адразу затусавалася з нашымі ціпа выдатніцамі.

— Па-ба-бам, сюрпрыз! Як ты думаеш, з кім яна хадзіла? З Паўзунковай!

— Вы што!

— Ага. Яна потым расказвала, што не ўмела разбірацца ў людзях, і таму думала, што харошы чалавек — гэта той, хто атрымлівае харошыя адзнакі.

— У самой яе не тое што васьмёрак — дзявятак у чвэрці ніколі не бывала. Дзясятачніца.

— Толькі вось Паўзункова ёй нармальна так карысталася. Спісвала напоўніцу. І ўся іхняя шобла таксама.

— А паколькі мы заўсёды хадзілі ў тупых, то пару гадоў з ёй увогуле не дачыняліся.

— І што раптам перамянілася?

— У восьмым класе да нас Алега Сівохіна перавялі з 317-й, — хмура сказала Снежка. — Памятаеш такога?

Яшчэ б Соня не памятала. Пры адной згадцы пра Сівога па целе прабягалі мурашкі. Гэта быў браток, які трымаў у жаху ўсё наваколле. Пад ім хадзілі ўсе мясцовыя наркадылеры — і ў школе, і на раёне. І ўчастковы, магчыма, таксама, бо доўгі час усё з Сівога было як з гусі вада. Страшна было падумаць, што ў пятнаццаць гадоў гэты дробны чарнявы другагоднік мае ў сваіх руках столькі ўлады.

— Восьмы клас быў кашмарам. Перш-наперш ён пашыхтаваў усіх нашых хлопцаў і прымусіў прысягнуць яму на вернасць. А тых, хто не пагадзіўся, штодня люта мачылі.

— Ну і дзеўкі туды ж. Паўзункова — дык першая. Бачыла б ты тады нашу лэдзі Дзі... Макіяж, як у зулуса, скураная спадніца...

— Паліла ў фортку проста ў класе на перапынку. Спрабавала спадабацца новай уладзе, так бы мовіць.

— А Ротмістравай гэта ўсё, ясная рэч, было агідна.

— І яна аднойчы назвала Сівохіна казлом. За тое, што прадае насвай шасціклашкам.

— Што тут пачалося! Яе чмарылі ўсім класам. Заплечнік з акна выкідвалі, кампотам у сталоўцы аблівалі...

— А потым паклалі на парту, набралі ў шпрыц вады і сказалі, што гэта Ґераін. Спрабавалі ўкалоць у жылу.

— Ага. А «верная сяброўка» Паўзункова перацягвала ёй руку хусткай.

— У той дзень з Машкай здарылася істэрыка ў прыбіральні. І мы яе тады правялі дадому.

— І кожны дзень так праводзілі. Паўсюль з ёй хадзілі.

— І вам ад Сівога нічога не было?

— А што б ён нам зрабіў? У нас Аркаша.

Аркадзь Вайтовіч, старэйшы брат Галюні, вядомы на раёне як Войт, быў пазітыўным маладым чалавекам з высокімі маральнымі прынцыпамі і другім разрадам па боксе. Ён і ягоныя сябрукі з секцыі былі ці не адзінымі, каго не наважваўся чапаць лядашчы і баязлівы Сівохін. Так што Галю не тое што пальцам крануць — таўстухай абазваць баяліся. Нават цяпер, калі Аркаша служыў у памежных войсках, дастаткова было адной згадкі пра Войта, каб шантрапа адчапілася.

Адным словам, файна мець дарослага брата.

— Але вечна мы яе ахоўваць не маглі. Так што з Ротміstравай тады была поўная жэсць.

— Ды і нас яна спачатку праганяла. Маўляў, не трэба мяне шкадаваць, я сама... Але мы на простых прыкладах патлумачылі, што тут не да шкадобы, вядзецца пра элементарнае выжыванне.

— І гэтак мы пакрысе да яе прывязаліся. А яна да нас. З таго часу і сябруем.

— Я не разумею, чаму яна тады ў іншую школу не перавялася, — задуменна сказала Соня. («Падалей ад Максіма», — маладушна падумала яна.)

— Ты не ведаеш Машкі. Яна сказала, што, калі адступіць, пасля ўсё жыццё не будзе сябе паважаць. Такі яна чалавек.

— У класе з ёй месяцы чатыры ніхто не размаўляў.

— З намі, зрэшты, таксама.

— Ага. Помніш яе народзіны ў восьмым класе? Былі толькі я і ты. А мама торцік са свечкамі заносіць, такая: «Машунечка, а што, іншыя аднакласніцы не прыйшлі? А дзе Ліза?»

— Але ўсё ж неяк вырашылася?

— Ды неяк само сабой прайшло. Проста ў адзін момант Сівы ад яе рэзка адкалупаўся. Зняў асаду. А потым яго забралі ў дзіцячую калонію.

— А Машка ў той год у гурток «Што? Дзе? Калі?» запісалася. Хоць недзе прыдалася яе эрудыцыя. А ў канцы восьмага класа яна паступіла ў «А». І ўсё стала зусім зашыбок.

— То бок хочаце сказаць, раней яна была не такой, як цяпер?

— Ды не. Яна якой была, такой і засталася. Проста абставіны змяніліся.

— У нас жа цяпер выдатнікам быць крута. А Ротмістрава вучыцца найлепей за ўсіх у школе. Ой, даруй, дарагая. За ўсіх, апроч Статкевіча.

Вось не трэба было ім гэтыя два прозвішчы згадваць поруч! Падціснуўшы вусны, Соня працягнула дазнанне.

— А яна ўжо ведае, куды будзе паступаць?

— На падрыхтоўчае дык на журфак ходзіць, — паціснула плячыма Галя. — Нават публікацыі мае. На адным студэнцкім партале.

— Ага, а яшчэ яна на курсы па нямецкай мове запісалася. Проста так прычым. Кажа, для агульнага развіцця.

«Размаўляе на некалькіх замежных мовах...» — пранеслася ў галаве ў Соні.

— А хлопец у яе ёсць?— перайшла яна да галоўнага.

— Няма! — у адзін голас адказалі дзяўчаты. — Увогуле, яна з намі гэтыя тэмы мала абмяркоўвае, — удакладніла Снежка.

— Машку, пагадзіся, прыгажуняй не назавеш, хоць яна, калі б захацела, магла б выглядаць проста адпадна. Але сама яна кажа, што ёй больш даспадобы хлопцы, якія ў дзяўчатах цэняць інтэлект.

Усё. Гэта смяротны вырак.

— Хоць, вядома, мужчынскай увагаю яна не абдзелена, — падала голас Галя.

— Ага. Калі ў нашай школе каманда «Што? Дзе? Калі?» развалілася, трэнер забраў Машку ў Палац моладзі, у гарадскі клуб. І Машка цяпер гуляе ў вельмі моцнай камандзе. Яна там адзіная дзяўчына, прычым — капітан. Гэта іхняя фішка.

— Каманда «Карфаген» называецца. Бо Карфаген заснавала царыца Дыдона, якая кіравала мужчынамі.

— Хлопцы з каманды яе на руках носяць. Прычым літаральна. Пасля кожнай удалай гульні.

— Але там усё чыста платанічна.

— Ну не скажы, Галюнь... — хмыкнула Снежка. Мы ж на выхадных былі ў яе на народзінах...

Соня прагна падалася наперад. Яна ведала, што дзяўчаты хадзілі ў госці да саперніцы.

— Карацей, яе каманда напярэдадні заняла другое месца ў гарадскім турніры, а першае месца заняла каманда іх сяброў. І яны ў Машкі сабраліся, каб заадно адзначыць перамогу.

— Такой колькасці батанікаў у адным памяшканні я ніколі не бачыла, — зарагатала Галя.

— Ды ладна, — абурылася Снежка, — некаторыя хлопцы былі нават сімпатычныя.

— Ды дзе там! Прышчавыя, у акулярах і худыя, як чарвякі! — у Галі яўна загаварыла сястра Войта. — І дзяўчаты ў іх шэранькія нейкія. Паселі па коле на кілім, не п'юць, не танцуюць... А на тэмы такія размаўляюць, што нам са Снежай і два словы ў размову не ўставіць. Так мы на кухні паўвечара і прасядзелі. А яны скончылі балбатаць — і давай гуляць у свае гулькі. Нібы не нагуляліся яшчэ. Секта дый годзе!

— Ды што ты пра фігню, ты пра галоўнае раскажы! — перапыніла яе Снежка.

— Зараз... Дык вось, на «дээн» прыйшоў трэнер той другой каманды. Дарослы нейкі хлопец. І прынёс Машы букет з сямнаццаці чырвоных руж. Столькі руж, колькі ёй гадоў.

— Мы, калі ўсе пазвальвалі, засталіся посуд мыць і населі на дзеўку, маўляў, што і як.

— І яна сказала, што сапраўды: гэты хлопец да яе падкочваецца, але яна яго пракіне, бо ёй больш падабаюцца аднагодкі. Во як.

Гэта была вельмі трывожная навіна.

— А ў Ротмістравай у гасцях нікога больш не было? Напрыклад, з класа? — асцярожна спыталася Соня.

— Не-а. З усёй школы толькі мы, — надзьмула шчочкі Галя.

— А можа, ёй званілі? Віншавалі? Нейкія яшчэ... хлопцы?

— Ды што ты ўсё коламі ходзіш? Кажы наўпрост, у чым справа! — не вытрымала Снежка.

Соня набрала паветра ў грудзі і трагічным голасам выдала сяброўкам сваю жахлівую здагадку:

— Я думаю, што ваша Маша і... і Максім... Яны...

— Яны што?

— Яны разам!!!

Над столікамі запанавала ціша. Галя і Снежка завіслі, як даўно не чышчаныя камп'ютары ў інтэрнэт-клубе.

— Ды ну нафіг.

— Не можа быць.

— Мы б заўважылі.

— Сініца, у цябе паранойя.

— Але паслухайце!..

І, глытаючы слёзы, Сінічка нарэшце пераказала дзяўчатам тое, што была падслухала ў шатні, а таксама нядаўнюю размову на «біржы».

— І гэта ўсё? — засмяялася Галя, калі Соня скончыла.

— А гэтага што, мала?

— І што такога страшнага ты пачула? Ну так, Машка з Максімам сябруюць, але мы ж табе расказвалі, што яна ўвогуле з хлопцамі лепш ладзіць, чым з дзяўчатамі. Гэта зусім не значыць, што яна закаханая.

Снежка, аднак, не падзяляла Гальчынага аптымізму. Падпёршы галаву адной рукою, яна рытмічна барабаніла па стале доўгімі рознакаляровымі пазногцямі другой.

— Тут як паглядзець, — неўзабаве прамовіла яна. — Машка ў Статкевіча, можа быць, і не закаханая. А вось Статкевіч

у Машку... А такія кадры, спадарыні, на дарозе не валяюцца. І хто ведае, як Машка зрэагуе... Тое, што яны не разам, — гэта факт. Але магчыма, гэта ўсяго справа часу.

— Псс, Снеж, — зрабіўшы страшныя вочы, Галя скасавурылася на Соню, якая ажно спалатнела ад пачутага.

— А што я такога сказала? Гэта жыццё. Ты, Соня, ужо не маленькая. Час сталець і глядзець праўдзе ў яе бязлітасныя вочы.

— Але з чаго ты ўзяла, што Статкевіч закахаўся? — гнула сваю лінію Галя.

— А я не сказала, што ён закахаўся... Пачнём з таго, што мужчыны падзяляюцца на два тыпы. Адзін тып шукае ў жанчыне свой дакладны адбітак. Другі — сваю поўную супрацьлегласць. А вы ж не будзеце спрачацца, што Ротмістрава — гэта Статкевіч у спадніцы?

— І да якога ж тыпу належыць Максім? — саркастычна пацікавілася Галя, склаўшы на грудзях пульхныя ручкі.

— А гэтага так з ходу не скажаш. Прынамсі, у мяне недастаткова матэрыялу, каб рабіць нейкія высновы.

— От жа ж, псіхалагіня... Што ж у цябе нікога дагэтуль няма, разумніца ты наша?

— Бо я ў актыўным пошуку. Які рэзон будаваць трывалыя стасункі з першым-лепшым?.. І ўвогуле, на сябе паглядзі! Сто кіляў пяшчоты, ёпта!

— Я папрашу! Восемдзесят пяць!

— Якая розніца? Усё адно есці менш трэба.

— У мяне целасклад! І ўвогуле, што ты разумееш у жаноцкасці?.. Вешалка!

— Бочка!

— Швабра!

— Камбінат па знішчэнні пірожак!..

— Ды хопіць ужо! І без вас моташна!

Невядомасць страшнейшая за самую страшную праўду. Гэта раптам зразумела Соня Сінічка. Цалкам магчыма,

усе яе страхі абсалютна беспадстаўныя. Але калі б яна сама была Максімам Статкевічам, ці паглядзела б яна на Соню, калі побач — Маша?

Пытанне было рытарычным.

Раздзел IV

# НОЧ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА

*Дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура дура.*

*Цяпер Соня псуе мне жыццё не толькі дома. У панядзелак яна забрала мяне з гімназіі.*

*У апранальні я глядзеў на Ульянку. І дура вырашыла, што гэта таму, што Ульянка мне падабаецца. Як можна быць такой дурай? Я глядзеў на Ульянку таму, што ў яе нос быў у зялёнцы. Як у клоўна.*

*Дома Соня расказала свае выдумкі маме. І ўчора мама запрасіла Ульянку і маму Ульянкі ў госці.*

*Ульянка ныла і не хацела гуляцца ў робатаў. І на камп'ютары. І з Соняй. Добра, што хутка прыйшоў Максім. Яны малявалі.*

*А потым была гарбата, і Ульянка сказала, што кахае Максіма. І калі яна вырасце, выйдзе за яго замуж.*

*Усе засмяяліся, а ў Соні быў такі твар, нібы яна абкакалася.*

*У гімназіі Ульянка расказала пра Максіма ўсім дзеўкам. І яны цяпер ходзяць за мной і просяцца ў госці.*

*Чаму бабы такія дуры?*

х х х

— Трымай, — Максім паставіў заплечнік на журнальны столік і стаў вывальваць чырвоныя і ружовыя паштоўкі проста на калені маці.

Мама Юля сядзела на канапе ў сваёй любімай бэжавай сукенцы і ў беласнежных хатніх боціках з авечай воўны. Яна сама была як з паштоўкі: дамаляваць ёй крылы — атрымаўся б мілы валянцінкавы анёлак. З радасным воклічам кабета пачала парадкаваць прынесеныя сынам прастакутнічкі.

Была пятніца чатырнаццатага лютага.

— Трыццаць сем... трыццаць восем... трыццаць дзевяць, — расчаравана працягнула яна. — Гэта што, усё? У мінулым годзе было сорак дзве. Але! — тут яна схапіла купку кардонак, што ляжалі на століку. — Упершыню прызнанні на Дзень святога Валянціна атрымаў Вадзім! Так што ў камандным заліку братоў Статкевічаў абсалютны рэкорд за адзінаццаць гадоў — сорак пяць валянцінак!

Ну вядома ж. Ён іх нават не чытае... Соня сядзела за сталом і без апетыту калупала абед.

У Дзень святога Валянціна ў школе на першым паверсе ставілі паштовую скрынку. Ахвочыя маглі ўкінуць туды ананімныя і не вельмі пасланнейкі. Перад апошнім урокам дзяжурныя разносілі пошту па класах.

Тое, што дзяўчаты закідваюць Статкевіча валянцінкамі, Соня здагадвалася. Больш за тое: раней актыўна ў гэтым удзельнічала. Але пра той момант, калі паштоўкі даходзяць да адрасата, яна ніколі не задумвалася. Вось як, значыць, гэта выглядае. Як здача макулатуры. Добра, што яна сёлета гэтую справу праігнаравала. Хопіць з яе прызнанняў Статкевічу.

— Хм, дзіўна, — нахмурылася мама Юля, разбіраючы пошту. — Усе паштоўкі, якія прынёс Вадзік, усё адно падпісаныя Максіму. Як такое можа быць?

Вадзік, які з паўгадзіны булькаў супам насупраць Соні, скрывіў рожу і паказаў ёй язык. Дастаў ужо. Соня пхнула яго нагой пад сталом.

— Мама, яна б'ецца!

— Значыць, заслужыў. Сядзі і еж... І вось што цікава: валянцінкі ўсе, як адна, друкаваныя, але на кожнай абавязкова нейкая прыпіска ад рукі.

— Гэта каб можна было па почырку здагадацца, хто аўтар, — хмыкнула Соня.

— Якія жарсці... А табе, Соня, колькі валянцінак даслалі?

Соні даслалі дзве загадкавыя валянцінкі — «Ад Г.» і «Ад С.». Васева валянцінка не ўлезла б ні ў якую пошту.

Прызнавацца Соні ў каханні было буднямі Васілеўскага. Таму чатырнаццатага лютага, у гонар свята, хлопец разбаўляў руціну якім-небудзь спецэфектам. Сёлета ён зноў завабіў Соню ў сталоўку і на вачах у паловы школы, стаўшы на адно калена, уручыў даме сэрца дары «Экспабелу» — сінія хрызантэмы ў аранжавай абгортцы і вялізнае махровае сэрца-падушку. Букет Соня цішком збагрыла Снежцы, якая ехала да бабулі, падушку сяк-так запхнула ў заплечнік і кантрабандай пранесла ў свой пакойчык.

— Тры. Але ўсе ад сяброў.

— Чакай... А ты... — азірнуўшыся на сходы, дзе пару хвілін таму знік Максім, мама Юля падміргнула Соні. — Твая валянцінка таксама тут? Ты ж дасылала?

— Не, сёлета не, — сказала Соня і тут жа ляпнула сябе па вуснах.

— Сёлета не? Значыць, летась?.. — мама Юля ўскочыла з канапы і, падышоўшы да стэлажа, падхапіла на рукі ўнушальных памераў скрынку.

— У мяне тут калекцыя за ўсе гады, — дзелавіта патлумачыла яна. — Зараз паглядзім. «10 клас»...

Плюхнуўшы скрынку проста на абедзенны стол, гаспадыня дому стала хуценька перабіраць паштоўкі і неўзабаве з радасным воклічам выцягнула крыху змяты квадрацік.

— Гэтая твая?

Соня панура кіўнула.

На белую кардонку яна тады наклеіла ружовае сэрца. На яго кавалачкамі паперы наляпіла рознакаляровы дамок. Намалявала фламастарам вокны, дзверы і двух чалавечкаў — хлопчыка і дзяўчынку. Прыгожа напісала: «Welcome to my Heart». Дзіцячы садок, адным словам.

— Гэта ж твой лялечны дамок! Як міла... хэнд-мэйд! Цяпер ужо амаль не сустрэнеш саматробных валянцінак. У малодшых класах было неяк болей. І такія трапляліся арыгінальныя! Відаць, таму, што ў крамах нічога не прадавалася. Але твая — проста цуд. Трэба абавязкова ўзяць у рамачку... Хочаш, пакажу іншыя цікавенькія валянцінкі? Гэтыя вось з Полацка. А гэта ўжо Лондан...

— Я пад'еў! — Вадзік шпурнуў лыжку ў талерку.

Паводле сцэнарыя мама Юля мусіла кінуць усё і пачаць трамбаваць малодшанькага катлетамі, але замест гэтага яна сказала:

— Ну і слаўна! Ідзі ў пакой, пагуляй у прыстаўку.

Калі малы ўскараскаўся на другі паверх, яна даверліва загаварыла:

— Соня, золатка, вы жывяце тут даволі доўгі час...

— Ой, вы толькі скажыце! Мы з татам адразу... — спужана замахала рукамі Соня.

— Ты што! І гаворкі пра гэта быць не можа! — перапыніла яе мама Юля. — Я пра іншае. Ты тут даволі даўно, але я не заўважаю, каб ты хоць крыху зблізілася з Максімам.

— Ну... Гэта ж не ад мяне залежыць, — паклаўшы рукі на калені, Соня ўважліва разглядала свае пазногці.

— А ад каго ж яшчэ! Соф'я, чакаць, пакуль мужчына зробіць першы крок, у наш век не проста памылка, а вялікае

глупства! А ты нават сёння, у такі дзень, не парупілася нагадаць яму пра свае пачуцці. А ён жа па-ранейшаму табе падабаецца... Ці я не маю рацыі?

— Нешта не вельмі хочацца стаяць у чарзе, — кіўнула Соня на горку паштовак на стале. — Вы ж, мусіць, ведаеце, што ў ягоным класе вучыцца... столькі вартых дзяўчат... Прыгожых і разумных.

— Але з усіх, каго мне даводзілася бачыць, створаная для яго толькі ты! Да таго ж у цябе безліч магчымасцей... — мама Юля са значэннем абвяла вачыма гасцёўню. Тут, аднак, са сходаў данесліся крокі.

— Падумай пра тое, што я табе сказала, — шэптам скончыла кабета і пераскочыла назад на канапу.

Наклаўшы сабе абед, Максім уладкаваўся за барнай стойкай і пачаў есці, адначасова клацаючы тэлевізійным пультам. Соня сядзела ў сваім улюбёным фатэлі і рабіла выгляд, што чытае газету. Яна крадком разглядала Максімавы раменныя косткі, што рэзка вытыркаліся з каўняра футболкі.

Можа, мама Юля мае рацыю і Соня ранавата здалася? Прынамсі, гэтыя яго ключыцы... Яны вартыя яшчэ адной спробы.

— Максік, глядзі, якую мілую валянцінку год таму даслала табе Соня!

Блі-і-і-н! Мама Юля, можна я неяк сама? Бо так дакладна ніколі нічога не будзе.

Максім рэзка выключыў тэлевізар.

— Мамуль, трэба параіцца, — сказаў ён, нібы нічога ніякага.

— Табе са мной? Пару апошніх гадоў усё наадварот, — засмяялася мама Юля.

— Я толькі што памераў тройку. Ну, той парадны гарнітур, які я апранаў год таму на татаў карпаратыў. Дык мне здалося, рукавы закароткія. І калашыны. Я, па ходу, яшчэ вырас.

А ён мне хутка спатрэбіцца. Ты змагла б яго перашыць? Ці, можа, варта справіць новы? З улікам выпускнога?

— А чаго раптам такі парад?

— Ды Лабановіч выклікаў сёння на каву. На наступным тыдні ён ладзіць званы вечар для нейкіх салідных бізнесоўцаў, якія збіраюцца ўзяць шэфства над школай. Вось ён і запрасіў на банкет па двое найлепшых вучняў з кожнага класа. У сэнсе, з адзінаццатых.

— Як здорава! Ты будзеш прадстаўляць «А» клас? А хто яшчэ?

— Што за пытанні? Ротмістрава, вядома!

Ад нечаканасці Соня ледзь не парвала газету.

— Маша Ротмістрава? Такая высокая шатэнка з нявышчыпанымі бровамі? — паморшчылася, прыгадваючы, мама Юля.

— Ротмістрава класная, — Максім плюхнуўся на канапу і, заклаўшы рукі за галаву, загледзеўся кудысьці ўдалеч, нібы скрозь Соню.

— А «Д» клас, зразумела, будзеш прадстаўляць ты, Соня? Ты ж найлепей за ўсіх была напісала тэст...

— Не, мама. Банкет толькі для профільных класаў. На маглаў гэта не распаўсюджваецца.

Гэта была праўда. «Дэшкам» чарговы раз паказалі іх месца.

— Што ты сабе дазваляеш, Максім? — сярдзіта захлопала дзверцамі шафак мама Юля.

— Дык што, зірнеш гарнітур?

— Толькі не сёння. Іншых клопатаў па горла. Ты ж ведаеш, трэба сабраць бацьку...

Тут спрацаваў кухонны таймер, і мама Юля з воклічам кінулася да духавой шафы, адкуль ужо паўгадзіны як смачна патыхала капусным пірагом.

Кабета выцягнула капуснік і, паставіўшы яго на стол, зашыкала на малога Вадзіка, які зноў аб’явіўся на кухні:

— Гэта бацьку і дзядзьку Пецю з сабой!.. Лепш катлету вазьмі. Соня, патэлефануй тату, спытайся, як там яго планы...

Сёння ў Віктара Статкевіча і Пятра Сінічкі быў асабліва дзень. Пару тыдняў таму з імі звязаліся аднакласнікі са школы-інтэрната і строга скамандавалі з'явіцца вечарам 14 лютага ў Барысаўскі раён. Там на нейкай аграсядзібе іх чакала юбілейная сустрэча выпускнікоў, якая мусіла плаўна перацячы ў суботнюю рыбалку на Бярэзіне.

— Я не еду. Гэта ж свята, а ў мяне рэстарацыя, — адразу ж сказаў Сонін бацька. Соні часам здавалася, што тата хаваецца за працай ад людзей і свету. І асабліва ад старых сяброў, якія ведалі ягоную жонку, Соніну маму... Адно праз некалькі дзён, пад напорам сяброў і дачкі, Сінічка здаўся. Дадаўшы, праўда: «Калі не здарыцца ніякага форс-мажору».

— Усё ў парадку! — радасна паклала слухаўку Соня. — Ён хутка будзе!

Адна за адной пад'ехалі машыны, і пачалася заўсёдная мітусня, калі людзі збіраюцца ў адпачынак, нават такі непрацяглы. Праз дзве гадзіны вясёлыя Віктар з Пятром, перакідваючыся толькі ім зразумелымі фразамі ды мянушкамі, стаялі на парозе з заплечнікамі і прыладамі для рыбалкі, развітваючыся з хатнімі.

— Трымай, Пётра, — мама Юля ўвапхнула сябру ў рукі скрутак з капуснікам. — Мой сціплы ўнёсак у вашу бяседу. Давяраю табе як кулінару. І яшчэ, — тут яна ўзяла з камоды дзве карткі і сунула кожнаму ў кішэню, — гэта наш адрас. Для таксістаў. І вось, — яна ўручыла мужу кардонку, — мой тэлефон на лабавое шкло. Для эвакуатара.

— Ну навошта? — забурчэў тата Віця.

— Так трэба! Я навучаная горкім досведам. Дакладней, мінулым юбілеем, — саркастычна прамовіла мама Юля.

— Татка, злаві мне шчупака! — папрасіў Вадзік.

— Ага, шчупака... Сказала б я, што твой татка зловіць... Ну, добрай імпрэзы, — і, абняўшы абодвух мужчын, мама

Юля выправіла іх на ганак. — Хоць бы да панядзелка вярнуліся, — уздыхнула яна, замкнуўшы дзверы.

...Дзеці яшчэ не паспелі падняцца ў свае пакоі, калі ў мамы Юлі зайграў мабільнік.

— Алё! — радасна сказала яна, але тут жа змянілася ў твары і перапужана закрычала:

— Божачакі! Які жах! Трымайся! Я буду праз паўгадзіны!!!

Даўшы адбой, мама Юля, заламаўшы рукі, затараторыла:

— Дзеці! Мне тэрмінова трэба ехаць! Цёцю Ліну — маю сястру, — патлумачыла яна Соні, — тэрмінова кладуць на захаванне! А дзядзька Валянцін, як на тое, за мяжой. Няма каму дагледзець малых! Вадзік, збірайся, ты едзеш са мной!

— Я не хачу!

— Як жа не хочаш? Хочаш! Ты ж хочаш пагуляцца з сястрычкамі!

— Буе-е-е!

— Вазьмі піжаму і зубную шчотку. Мы будзем начаваць у цёткі!

— Я хачу застацца з Максімам!

— Максім і Соня самі дадуць рады! Давай хутчэй!

...Праз нейкія пятнаццаць хвілін дзверы за мамай Юляй і канваяваным ёй Вадзікам зачыніліся. Соня сядзела ў фатэлі і, гледзячы перад сабою невідушчымі вачыма, спрабавала асэнсаваць тое, што адбылося.

У жываце працавалі крылцамі жвавыя матылькі. Яны з Максімам упершыню засталіся ў доме сам-насам. На ўвесь вечар.

І гэта не просты вечар, а вечар Валянцінавага дня.

Ці мог святы апякун усіх закаханых прыдумаць для яе лепшы падарунак?

— Сінічка! Заснула, ці што?

Соня здрыганулася. Максім стаяў перад ёй у спартыўным гарнітуры з тэніснай сумкай цераз плячо.

— Я на корт. Вярнуся а восьмай. Зваргань чаго-небудзь павячэраць.

Гэты шанц ёй пасылае Неба, і дальбог, яна яго не змарнуе. Як там? Розум, доўгія валасы, добрая фігура... Ротмістрава — гэта ўсё лухта. Сёння Максім Статкевіч пакаштуе, тое, што згатуе для яго Соня Сінічка.

х х х

## *ПЕЧАНАЯ ГУСЬ*

*Для гэтай найсмачнейшай стравы вам спатрэбіцца:*

- *1 гусь (прыкладна 2 кг)*
- *3—4 жмені кіслай капусты*
- *1—2 яблыкі антонаўкі*
- *½ шклянкі цёмнага піва*
- *10 ягад ядлоўцу, духмяны перац (гарошыны), кмен і маяран (растаўчы ў ступцы), соль, чорны перац (растаўчы ў ступцы).*

Найсмачнейшая страва! Тое што трэба!

Як толькі веснічкі «лялечнага дома» зарыпелі за Максімам, Соня паджгала на кухню. Яна мела крыху больш за дзве гадзіны. Асноўная страва, салат, дэсерт... Не, які дэсерт. Хоць бы з гарачым управіцца. Пачынаць трэба было неадкладна.

Юная гаспадынька раскрыла лядоўню і застагнала ад роспачы. Прыпасаў было нягуста: па харчы мама Юля ездзіла на выхадных, а сёння была пятніца. Соня кінулася да шафак — там заўсёды можна было знайсці «н-з»: кансервы, крупы, спагеці... Але ж хто корміць каханага макаронаю ў Дзень святога Валянціна? Патрэбна было нешта асаблівае.

Як вы, мусіць, запомнілі, мае ўважлівыя чытачы, Соня зусім не ўмела гатаваць. Кашы зварыць яна і тое была

не ў стане. Стравы непазбежна падгаралі, вада, выкіпаючы, залівала плітку і застывала гідкай коркай, якую потым трэба было доўга адскрабаць, а тое, што заставалася, было, як правіла, няўежным.

З салаткамі выходзіла не лепей. Нават калектыўны аліўе, які яны гатавалі ў пятым класе на ўроку працы, Соня ўмудрылася сапсаваць, за што атрымала двойку. А ад яе толькі і патрабавалася, што згатаваць, аблупіць і накрышыць яйкі. Яйкі яна недатрымала — так і бухнула ў салат мяккімі. Аднакласніцы яе тады ледзь не прыбілі. Падчас адчайных спроб прыжыцца на кухні Соня рэзала пальцы, апякала рукі — але нікога не здатная была накарміць. Гэта было фатальна.

Тут патрэбная чуйка. І штодзённая практыка пад кіраўніцтвам мамы.

Ні з тым, ні з другім Соні не пашчасціла.

Спачатку трэба вызначыцца са стравай, вырашыла яна, а потым ужо шукаць харчы. Але дзе ўзяць рэцэпт?..

З радасным воклічам Соня схапіла зэдлік і палезла да адной з кухонных паліц. Тут у мамы Юлі стаялі кулінарныя кнігі, якія яна прывозіла з вандровак.

Соня разглядала карэньчыкі. Збольшага кнігі былі паітальянску ці па-французску. Англамоўныя дзяўчына браць пабаялася — з часу, калі яна, падбітая Вадзікам, пераблытала гурок з кабачком, яе слоўны запас крыху пашырыўся, але накладкі ўсё яшчэ былі магчымыя.

Па-руску была толькі адна кніга: «Грузінская народная кухня». Соня разгарнула яе і тут жа паставіла на месца. Замяшанне выклікалі ўжо самі назвы страў, не кажучы пра інгрэдыенты, якіх яны вымагалі. Сацыві, хінкалі, чанахі, ткемалі... Максім быў патрэбны ёй жывым.

Раптам яна згледзела на паліцы знаёмую вокладку. Гэта быў прыгожы фаліянт «Старадаўнія беларускія стравы». Шыкоўна афармлены, ён уяўляў з сябе не толькі карыснае,

але і цікавае чытво, бо да кожнага рэцэпта дапасоўвалася гісторыя паходжання і традыцыі ўжывання.

Як любая нармальная беларуская мама, Юлія Статкевіч пад настрой гатавала дранікі са смятанай, але на гэтым яе павазе да нацыянальнай кухні надыходзіў крэс. Затое па вечарах яна любіла сцягнуць з паліцы гэтую кнігу і зачытваць рэцэпты ўголас, смакуючы словы:

— Бабка, куцця, зацірка, крывянка... Усё гэта мы елі ў вёсцы ў бабулі, калі былі маленькія... Як жа слаўна ўмелі гатаваць нашы продкі! Якая багатая ў нас кухня!

— Нешта я не разумею. Калі ў нас такая багатая кухня, чаго гэта мы дома з лазанні на рызота перабіваемся? — нязменна кпіў з маці Максім, за што тут жа атрымліваў ад яе па шыі салоннай падушкай.

З гэтага можна было зрабіць выснову, што Максіму спадабаецца, калі ягоная абранніца прыгатуе нацыянальную страву.

Соня разгарнула фаліянт на раздзеле «Мяса — стала акраса». Пасля фізічных нагрузак чалавеку патрэбны бялок, прыгадала яна. Але, як на тое, свініны ў лядоўні неназіралася...

Затое ў раздзеле «Птушкі і гнёзды» ёй у вочы адразу кінуўся апетытны здымак з подпісам «Печаная гусь». Дый сам рэцэпт прывабіў невялікай колькасцю складнікаў.

Яна падбегла да лядоўні, каб пераправерыць. І сапраўды — у маразілцы самотна ляжала цэлая курыца.

Паміж намі кажучы, гэта было кураня-бройлер. Але каханне не разбірае. Галоўнае, птушка ёсць. Можна запячы курку па рэцэпце гускі. Бо імправізаваць на кухні — асноўнае ўменне добрай гаспадыні.

Паклаўшы птушку на вялікі спод, Соня пакінула яе размарожвацца і пачала збіраць рэшту харчоў.

Кіслая капуста, якую выдатна гатуе полацкая бабуля Статкевічаў, стаіць у каморцы пад сходамі... Трохлітровы слоік вокамгненна апынуўся на стале. Так, што там яшчэ?

Цёмнае піва... Соня кінулася ў гаспадарчы пакой. Там у куце знайшоўся блок «Гэйнэкена». Соня радасна выкалупала адну бляшанку з цыраты. Піва, мусіць, можна і светлае. Адкаркаваўшы бляшанку, яна адліла ад яе роўна палову шклянкі.

Прыправы ў асобнай шафцы... Усё неабходнае на месцы. Апроч ядлоўцу. Яго ўвогуле прадаюць? Як ён хоць выглядае?

Соня кінулася да камп'ютара і загугліла ядловец. Пошукавік выдаў набор карцінак, і Соня ажно запляскала ў ладкі. Акурат такі хмыз расце на падворку ў іх суседзяў! Проста каля агароджы! Яшчэ ўчора, вяртаючыся са школы, яна прыкмеціла, як вераб'і дзяўбуць чорна-сінія ягады на зялёным дрэўцы.

...Праз пяць хвілін яна зноў стаяла на кухні, прыцярушаная снегам, і пераможна сціскала ў руцэ галінку ядлоўцу. Раз, два, тры... Сем прамерзлых ягад. На дварэ ўсё яшчэ заходзілася суседская аўчарка, якая цапнула Соню за рукаво курткі, калі тая здзяйсняла свой кулінарны вандалізм.

Яблыкі? Чорт. Няўжо патрэбная менавіта антонаўка? У скрынцы з фруктамі Соня адшукала вялікі ананасны яблык — мама Юля клала такія Вадзіку ў гімназію. Хай так.

Можна было брацца за гатаванне.

Курыца, аднак, і не падумала размарозіцца, хоць прайшло ўжо паўгадзіны. Вось няпруха... Што б у такім выпадку зрабіла мама Юля?

Ну вядома! Размарозіць можна ў мікрахвалёўцы! Соня засунула спод у печку і выставіла паўгадзіны.

Пакуль трывае размарозка, варта заняцца найважнейшым: пошукам святочнага абруса, свечак, а таксама прасаваннем сукенкі для рамантычнай вячэры...

Праз колькі хвілін Соню вярнуў на кухню нечуваны смурод. Яна спыніла мікрахвалёўку і, разганяючы клубы гідкай пары, тарганула дзверцы. Скурка курыцы пабялела і размякла, хоць нутро няшчаснай па-ранейшаму было скутае лёдам. На стол і падлогу лінула каламутная жыжа.

Тут Соня з жахам заўважыла на панэлі сняжынку. Каб размарозіць мяса, трэба было выбраць іншы рэжым.

Яна загрылявала замарожаную курыцу.

Нічога не паробіш. Іншай у яе не было. Выцершы рукі, Соня ўзяла кулінарную кнігу, каб прачытаць рэцэпт цалкам.

«Вытапіце з гусі тлушч і пару разоў абдайце птушку кіпнем. Добра пасушыце скурку, нашмаруйце сумессю перцу, солі, кмену і маярану, загарніце ў льняную сурвэтку і...»

Пакладзіце ў лядоўню на два дні?!!

Ну, дапусцім, тлушч ужо вытапіўся ў печцы. Але два дні?!! Гэта ж да панядзелка!

Хопіць і пятнаццаці хвілін.

...Абцёршы курыцу ручніком, Соня пачала пасыпаць яе прыправамі. Пасля ўзяла іншы ручнік і, захутаўшы тушку, запхнула яе ў лядоўню. Пакуль курыца настойвалася, пачала наразаць салатку. З гародніны ў лядоўні знайшліся толькі цыбуля і памідоры... Рыдаючы над цыбуляй, Сінічка праклінала сваю жаночую долю.

«Адцісніце кіслую капусту, перамяшайце яе з нарэзанымі яблыкамі і спецыямі, нашпігуйце птушку на ¾ аб'ёму. Абдайце гусь півам і пакладзіце ў духоўку, нагрэтую да 250 градусаў, грудкай уніз на 15 хвілін. Наліце дзве шклянкі вады. Потым перавярніце птушку і запякайце...»

Ну вядома. Дзве гадзіны.

Але Максім вось-вось вернецца!

Соня ўключыла духоўку, выплюхнула на бляху дзве шклянкі вады. Потым вываліла крыху капусты ў місу, кінула туды ядлоўцавыя ягады і пачала крышыць яблык. Калі начынне было гатовае, яна горка ўздыхнула і выцягнула з лядоўні курыцу.

Як яе ўвогуле шпігуюць?

Агледзеўшы тушку, гаротніца знайшла ў ёй толькі адну адтуліну. Рабіць не было чаго. Соня загрэбла з місы капусты і, прымружыўшыся, стала пхаць яе проста між тлустых ножак...

— А-а-а-а!

Тры пальцы зашчаміла паміж костак. Руку звяло сутаргай ад холаду: нягледзячы на гвалтоўнае размарожванне, нутро тушкі было яшчэ ў лёдзе. Пазногаць паказніка нібы зацісну-ла абцугамі, любы рух цяпер прыносіў страшны боль. Соня з жахам усвядоміла, што захрасла.

x x x

Максім Статкевіч спыніўся на парозе гасцёўні. Абедзенны стол, накрыты бялюткім абрусам, быў старанна сервіраваны на дваіх. Паміж талерак высіліся грацыёзныя свечкі. На спінцы канапы ляжала акуратна распраўленая блакітная сукенка ў белыя кветачкі...

Але не гэта адразу прыцягнула яго ўвагу. У кухоннай зоне з духавой шафы валіў дым. Падлога была мокрай і ільснілася ад тлушчу. Па стале былі рассыпаныя памідоры і цыбуля. Але самае галоўнае, пасярод кухні з ускудлачанымі валасамі і ў мокрай футболцы скакала, выючы, Соня, на руку якой, як лялька ў батлейцы, быў насаджаны бройлер.

Пабачыўшы Максіма, дзяўчына тут жа заціхла.

— Трэба крыху пачакаць. Вячэра яшчэ не гатовая, — сказала яна, захлопаўшы вейкамі.

Даляцеўшы да пліты ў два скокі, Максім павярнуў выключальнік, нацягнуў кухонныя рукавічкі, выцягнуў бляху і асцярожна, каб не абварыцца, выліў з яе ваду ў мыйку. Пасля гэтага, склаўшы рукі ў кухонных рукавічках на грудзях, паглядзеў на Сінічку. Ён стараўся выглядаць сярдзіта, хоць ледзьве стрымліваўся ад смеху.

— Гэта што такое?

— Гу-гусь... За-запечаная з капустай... — прамямліла Соня.

— Гусь? — такі разрагатаўся Максім. — Калі гэта гусь, то я Марыя Шарапава. Што ў цябе па біялогіі? Блін, ды што гэта я... Дурное пытанне. Сінічка, скажы мне толькі адно: як ты

ўвогуле ўмудрылася засунуць туды руку? На вегетарыянскім судзе ты села б пажыццёва за здзек з трупа...

Ён узяў са стала шклянку з півам і прынюхаўся.

— Бухала? — кпліва спытаўся ён. — Тады ўсё зразумела.

— Я не... Не... — часта заміргала вачыма Соня, бязрадна матлянуўшы курыцай.

— Стой спакойна, — сказаў Максім, выцягнуўшы з шуфлядкі цясак.

x x x

Яны сядзелі за барнай стойкай і елі смачны амлет, які прыгатаваў Максім. Стомлены хлопец кінуў на патэльню ўсё недарэзанае Соняй, а таксама марынаваныя шампіньёны, адшуканыя ў лядоўні, заліў збоўтанымі з малаком яйкамі і засмажыў пад накрыўкай. Падчас сваіх кулінарных экзерсісаў Соня паспела добра так згаладацца. Яна намінала амлет, шмыгаючы носам. Яе правае запясце было густа аблеплена пластырам.

— Ты мне ледзь пясць не адсек! — прабурчэла яна, скончыўшы есці.

— Ага, трэба было пакінуць як было. Эдвард-рука-курыца, — Максім выбіраў з міскі кіслую капусту, грэбліва выкідваючы з яе відэльцам яблыкі і ядловец. — Мда, Сінічка... папярэдзіла б, што ўсё так безнадзейна. Я б у горадзе павячэраў. Што ні кажы, не быць табе зоркай тэлеканала «Кухня». Хоць калі падумаць... Гэты нумар з бройлерам...

Шматпакутная птушка ляжала на кухонным стале з успоратым жыватом, залітая Сонінай крывёю.

Вячэра і блізка не нагадвала рамантычную. Тую, пасля якой Ён падхоплівае Яе на рукі і яны перамяшчаюцца на канапу... Трасянуўшы грыўкай, Соня прамовіла:

— Дзякуй за амлет. Смачна... Табе б кухарам працаваць. Слухай, — Соню раптам асяніла думка, — дай спісаць інгліш.

— Яшчэ чаго захацела, — хмыкнуў Максім.

— Ну калі ласка!..

— Сінічка, каго ты гэтым падманеш? Дзе я, а дзе ты? А пагатоў інгліш! Ты ж, нагадаю, кабачок ад гурка адрозніць не можаш!

— Я толькі абароты зірну, — хуценька ўдакладніла яна. — Мне ж усяго адну тэму... «My Future Profession».

— Дык вось ты з якога боку зайшла, значыць? — нахмурыўся Статкевіч. — Трасцы табе, а не «My Profession».

Хлопец саслізнуў з барнага зэдліка:

— Посуд закідай у пасудамыйку. І ўвогуле, прыбярыся тут, — скамандаваў ён і знік на другім паверсе.

x x x

Соня круцілася ў ложку. Ніяк не магла заснуць. Замінала месяцавае святло, ледзьве чутны пошум хвой у лесе — усё на свеце. Галінку ядлоўцу яна ўторкнула над узгалоўем і цяпер удыхала яго супакаяльны водар.

Не дапамагала. З галавы не ішла навязлівая думка.

Толькі сёння яна сцяміла, што адказ на пытанне, кім хоча стаць Максім, зусім блізка. Праз калідор. Тэчка з тэмамі па інглішы, пра якую расказвала Ротмістрава, ляжыць дзесьці там, у Максіма.

І яна можа зараз пайсці і здабыць яе.

Ёй ужо проста з прынцыпу карцела ведаць, кім ён хоча стаць. Што за таямніцу ад яе хавае.

Пэўны час Соня змагалася з непераадольным жаданнем, але ўрэшце здалася. Яна ўзнялася з ложка, замест шлёпанцаў апранула мяккія бязгучныя шкарпэткі з воўны і на дыбачках выйшла з пакоя...

...Максім мірна спаў на канапе. Соня пракралася да ягонага стала і пачала перабіраць раскладзеныя стосікамі сшыткі.

Ніякай тэчкі нідзе не было. І канспекты трапляліся якія заўгодна, але не па інглішы.

Няма рады. Соня сабралася сыходзіць, але, не ўтрымаўшыся, загледзелася на мірны твар Максіма, асветлены поўняй...

Раптам адразу над ім, на стэлажы, які аддзяляў канапу ад стала, яна згледзела кардонную тэчку, пакладзеную зверху на кнігі. Маркерам на ёй было тлуста выведзена: «Topics».

Во яно што. Соня чакала пабачыць такую ж тэчку, як у Машы. А Максім, выходзіць, запісваў тэмы на аркушы для прынтара.

Прытрымліваючы кнігі, Соня выцягнула тое, што шукала, і развярнулася, каб уцякаць.

І тут яе моцна ўхапілі за параненае запясце. Дзяўчына ўскрыкнула ад болю і выраніла тэчку.

— Навошта прыйшла? — сонна прамуркатаў Максім.

Не паспела Соня апамятацца, як хлопец паваліў яе на канапу побач з сабою і схіліўся над ёю, трымаючы рукамі за плечы. Яна адчула, як Максім рассоўвае ёй ногі каленкам. Ад яго патыхала зубной пастай і мылам.

— Добра, пераканала. Давай зробім гэта хутка, — хрыпла прамовіў ён.

Чытачы жаночых раманаў выдатна ведаюць, што бывае з гераіняй пасля таго, як мужчына загаворыць з ёй хрыплым голасам. Ведала гэта і гераіня майго рамана. Вось толькі падчас чытання гэткія ўявы выклікалі ў Соні салодкія дрыжыкі, а ў рэчаіснасці яна да смерці перапужалася.

— Гэта не тое, што ты думаеш... — узмалілася Соня.

— А што я мушу думаць? Мы адны ў доме. Нам ніхто не замінае. Зусім ніхто. Бо ўсім вядома, што мне патрэбна... Усім навокал лепей за мяне вядома, што мне патрэбна, — паўтарыў ён, захіхікаўшы. — Нават гэтаму твайму Васю. Як ён там сказаў? У кожным геніі тоіцца звер? Так што давай, Сінічка...

І Максім тузануў за каўнер шэрых слонікаў.

Соня з усяе моцы ўчапілася яму ў руку.

— Максім, я кахаю цябе, праўда, — залапатала яна, — але ўсё гэта занадта хутка. Нам трэба пачаць сустракацца, лепей пазнаць адно аднаго, а ўжо потым...

Раптам яна адчула, што Максім адпусціў яе. Прыхінуўшыся да сценкі, ён зайшоўся бязгучным смехам.

— З табой? Сустракацца? Во камедыя... Сінічка, ты мяне ўмарыла... Значыць, усё-ткі кахаеш мяне? — спытаўся ён, карцінна выціраючы вільгаць з куткоў вачэй.

Замест адказу Соня куляй вылецела з пакоя.

x x x

Соня ціха ўсхліпвала, зарыўшыся носам у падушку. Праз некаторы час дзверы яе спальні адчыніліся.

— Сінічка, вазьмі, калі хочаш. Ты ж па гэта прыходзіла...

Соня прыўзняла галаву. У руках Максім трымаў сваю тэчку.

— Бяры, я сур'ёзна... Толькі ўсё адно там няма «прафэшну». Ніяк не магу напісаць. Я яго ўжо месяц настаўніцы вішу... Соня, хопіць раўці... Ну хочаш, вазьмі іншую тэму. Вазьмі «інвайранмэнт». У мяне вельмі добры «інвайранмэнт». А ён жа мутарны, яго ніхто не любіць...

Ёй падалося, ці ён толькі што ўпершыню назваў яе па імені?

— Ну, як хочаш. Я прапанаваў, — сказаў Максім і зачыніў за сабой дзверы.

Соня Сінічка ляжала на ложку і ўдыхала водар ядлоўцу. «Я кахаю цябе», — толькі што яна ўпершыню ў жыцці сказала гэта ўголас.

x x x

Суботнім ранкам мама Юля адчыніла дзверы свайго дому і з парога пабегла на другі паверх. Асцярожна зазірнула

ў адну дзіцячую спальню, потым у другую. Максім і Соня спалі. Кожны ў сваім ложку. Кабета з палёгкай уздыхнула. Дзеці растуць. Па сутнасці — не па законе — яны ўжо дарослыя людзі. Ці можа яна павесіць на яго маячок і пільнаваць кожны крок? А на яе? Пагатоў не можа. Віця кажа, прафілактыка тут адна: выхаванне.

Яны з Пецем добра выхавалі дзяцей. Трэба спадзявацца.

З іншага боку, як усё-ткі было б здорава… Вядома, не цяпер. Крыху пазней. Алена… Я памятаю, Алена.

Пад дзверы Сонінага пакоя быў ахайна падторкнуты стосік паперы. Мама Юля падняла яго з падлогі. «Environment & Ecology. Vocabulary» — было напісана на самым верхнім аркушы почыркам сына. «Pollution — забруджванне. Nuclear energy — атамная энергія. Chimney: 1) кратар вулкана; 2) комін, труба».

— Сапраўды труба, — ціха сказала сабе пад нос мама Юля.

## Раздзел V

# ВАСЮ ВЫКЛЮЧАЮЦЬ

— І ўсё-ткі гэта несправядліва!

У панядзелак перад матэматыкай «Д» клас абмяркоўваў навіну тыдня — школьны банкет для абраных. На папярэднім уроку — астраноміі — ім лішняга разу развярэдзілі рану. Грацыёзная настаўніца танцаў, запрошаная дырэктарам, зазірнула на ўрок, каб забраць двух вучняў на рэпетыцыю вальса, якім мусіў адкрывацца вечар. «Дэшкі» даволі бесцырымонна патлумачылі спадарыні, што тая памылілася кабінетам.

— Нейкі брытанскі бізнесовец прыедзе, каб даць дзірыку шмат бабла.

— Ага, у тым і рэч, што дзірыку, а не школе.

— Ну не скажы. Стадыён вунь спонсары збудавалі...

— А цяпер што, басейн? Не смяшы мае майткі!

Соні, аднак, было катэгарычна не да свецкай хронікі. Яна месца сабе не знаходзіла. Нарэшце перад матэматыкай яна не вытрымала і прашаптала Галі і Снежцы:

— Выйдзем на калідор. Мне вам нешта расказаць трэба...

x x x

— Каленку?!!

— Паміж ног?! Вычварэнец!

Пераказаўшы падзеі пятнічнай ночы ўва ўсіх падрабязнасцях, Соня спыталася ў сябровак, што яны пра ўсё гэта думаюць.

— А што тут думаць, — азвалася першай Галюня. — Запаў ён на цябе, Сініца. І, як гаворыцца, не змог кантраляваць пачуцці...

— Не слухай яе, Сонь, — з выглядам эксперта перапыніла сяброўку Снежка. — Па-мойму, відавочна, што ён з цябе здзекуецца. Гуляецца як кот з мышкай. Яму на цябе пляваць. І гэта сапраўды магло фігова скончыцца. Так што цябе, лічы, пранесла. Трымайся падалей ад гэтага казла. Наколькі гэта магчыма ў тваёй сітуацыі.

Вельмі хацелася верыць Галі, але рацыю найхутчэй мела Снежка. Слёзы з Соніных вачэй выбеглі на добра ходжаныя салёныя дарожкі.

— Сініца, што здарылася? — нанікацінены Вася, які матэрыялізаваўся каля дзяўчат, клапатліва крануў Соню за плячо.

— Што-што... А тое, што Статкевіч яе лапаў! — сярдзіта адрапартавала Сняжана.

—Што-о-о?!! — завыў Вася, як сірэна перад бамбёжкай.

— Што чуў. Заваліў, калі нікога не было дома. Васілеўскі, там былі такія позы!

Соня перапужана затуліла Снежцы рот далонню. З-пад рукава вылузнула падсохлая драпіна ад нажа, залітая зялёнкаю.

— Гэта што? — спужаўся Васілеўскі. Ён схапіў Соню за запясце, нібы збіраўся варажыць на руцэ. — Сініца, ты што, жылы рэзала?!! Заб’ю, — глуха сказаў ён і паляцеў па калідоры.

— Кавалёва, ты зусім? — схапілася за галаву Сінічка.

— Хутчэй за ім! — пацягнула Галя сябровак за рукавы пінжачкоў. — Сапраўды ж заб’е!

...Крыкі даносіліся ад раскладу заняткаў на трэцім паверсе. Але калі дзяўчаты падляцелі туды, усё было скончана. Мак-

сім сядзеў на падлозе, трымаючыся за твар, а Васю прыціскалі да дзвярэй кабінета завуча хлопцы з дзяжурнага класа.

— З глузду з'ехаў?

— За што ты яго?

— Ён ведае, за што, — вымавіў Васілеўскі скрыўленымі ад агіды вуснамі.

— Што тут здарылася? — завуч агаломшана спынілася перад уласным кабінетам.

— Вось, Валянціна Іванаўна, напаў на Статкевіча.

— Васілеўскі, зноў ты? Хадзем, — завуч схапіла Васю за плячо і павяла да сходаў. У бок кабінета дырэктара.

— Цяпер дакладна выключаць, — са скрухай прамовіла Галя.

Соня адчула на сабе позірк. Усё яшчэ седзячы пад раскладам, на яе пераможна, наколькі гэта было магчыма з падбітым вокам, якое пачало ўжо заплываць, пазіраў Максім. Яна падціснула вусны і адвярнулася.

x x x

Дырэктара на месцы не было, і Валянціна Іванаўна доўга вызвоньвала яго праз мабільнік. Нарэшце Лабановіч увайшоў у прыёмны пакой. Аднак не адзін, а на пару з біёлагам Іванавічам.

— Што тут зноў? — хмурна спытаўся ён.

— Вось, Андрэй Васілевіч, — Васілеўскі з 11 «Д». Толькі што збіў Статкевіча на горкі яблык. Калі вы хочаце майго меркавання, пара з гэтым скончыць раз і назаўсёды.

— Хай пачакае, я пакуль заняты, — кіўнуў Лабановіч і ўвайшоў да сябе разам са спадарожнікам.

— Сядзі тут, — паказала завуч Васілеўскаму на крэсла каля дзвярэй кабінета і выйшла.

х х х

Магу запэўніць вас, дарагія мае чытачы, што Аляксей Васілеўскі — самы незласлівы з людзей, якія сустракаліся вам у жыцці або ў кнігах. Не было на свеце чалавека, пра якога можна было б сказаць, што Вася яго ненавідзіць. Штосьці падобнае да нянавісці, а дакладней кажучы, вострую нелюбоў ён адчуваў толькі да аднаго суб'екта. Што, уласна, і прывяло яго на крэсла каля кабінета дырэктара.

Але быў на свеце адзін чалавек, які выклікаў у яго вельмі няпростыя пачуцці. І гэтым чалавекам быў гаспадар кабінета — дырэктар Лабановіч.

Калі пашукаць правільнае слова, каб апісаць усю гаму Васевых пачуццяў да Лабановіча, то гэтым словам будзе, бадай, крыўда. Моцная і глыбокая крыўда на несправядлівасць свету, якая ўвасобілася ў гэтым вечна бледным чалавеку з таго часу, як ён з'явіўся ў 234-й школе.

З самага дзіцячага садка Вася меў простую і зразумелую мэту ў жыцці. Ён хацеў, каб яго паважалі. А ў тым асяроддзі, дзе яму давялося сталець і кшталтавацца, спрадвек паважалі дзве рэчы: грошы і сілу. Для школьніка гэта значыла мець багатых бацькоў або вялікія кулакі.

Бацькі ў Васі не было, а мама працавала кухаркай. Што датычыць кулакоў, то і тут была няпруха: у дзяцінстве Вася часта хварэў і быў, што называецца, здыхлікам. Тонкай, кволай жардзінкай, якую можна было раструшчыць двума пальцамі. Што тут паважаць?

Так бы Вася і хадзіў па школе цыбатым ценем, калі б не ягоная прага выпендрыцца, любою цаною прыцягнуць увагу да ўласнай персоны. Сам таго не ўсведамляючы, малы ператварыўся ў школьнага клоўна. У канцы чацвёртага класа праславіўся тым, што жыўцом праглынуў хрушча, які заляцеў у кабінет на перапынку. У пятым класе залез у спартзале на канат, перакуліўся і, зачапіўшыся нагамі, вісеў уніз галавой

хвілін пятнаццаць. Проста так, без дай прычыны. А аднойчы скраў у аднакласніцы памаду і размаляваў сабе вусны.

За такія дзівацтвы Васю дражнілі і часам білі. Але нямоцна і незласліва. Што ўзяць з клоўна?

Усё змянілася, калі аднойчы да іх завітаў матчын брат, дзядзька Арсень. І забраў Васю дапамагаць на рынку — не хацеў плаціць даросламу памочніку, ашчаджаў. Вася акурат перайшоў у шосты клас.

Дзядзька Арсень прадаваў гіпсакардон і ламінат на «Экспабеле», а Вася, якому толькі споўнілася дванаццаць, за кішэнныя дапамагаў адгружаць тавар і пільнаваць шапік, калі дзядзьку Арсеню трэба было адысціся. Да абеду (бо вучыўся на другую змену) у школьныя дні, апроч панядзелка, і яшчэ па выхадных.

Рынак стаў для Васі другой школай. Ды што там — першай. Тут ён навучыўся ўсім важным рэчам, якія мусіць умець падлетак на раёне, а менавіта — курыць, біцца і прыгожа лаяцца матам. Часта, калі ў дзядзькі Арсеня не было працы, малы разгружаў фрукты ў каўказцаў — адзін з іх па вечарах за гандлёвымі латкамі і навучаў Васю самаабароне. Васю на рынку любілі і лічылі сынам палка. Таму, калі праз паўгода дзядзька Арсень прадаў месца і з’ехаў на заробкі ў Нарвегію, хлопчык лёгка знайшоў новыя падпрацоўкі.

Неяк неўпрыкмет з клоўна Вася ператварыўся ў салідната пацыка з кулакамі, біцэпсамі, накачанымі ламінатам, і грашыма. Прычым уласнымі, а не «продкі далі». На вучобу, праўда, часу зусім не засталося. Але калі яго пакінулі на другі год у шостым класе, засмуцілася толькі мама.

У свой другі шосты клас Вася прыйшоў ужо каралём. У школу яго аддалі роўна ў сем гадоў, бо нарадзіўся першага верасня, так што хадзіў ён цяпер трынаццацігадовым кабаном сярод адзінаццацігадовых шпэндзікаў. Аўтарытэт замацаваў тым, што першага ж верасня, праз нейкую дробязь зачапіўшыся, біўся за школай з сямікласнікам Валодзем

Самсонавым. Самсона ён адужаў, пасля чаго хлопцы сталі найлепшымі сябрукамі. Так была запачаткаваная слаўная банда Самсона, якая ганяла па раёне ўсіх, хто ім не падабаецца. Пераважна рэпераў ды іншых графітчыкаў.

Пацаны Самсона не здрадзілі Самсону нават калі ў 234-й з'явіўся Сівы. Больш за тое, калі Вася быў у восьмым класе, Самсону ўдалося скансалідаваць частку школьнай ценевай эліты і вывесці на бой супраць Сівога. Гэта была самая маштабная бойка за ўсю найноўшую гісторыю школы. І апошняя, бо скончылася ў кабінеце новага дырэктара.

У дырэктарскі кабінет Вася трапляў неаднойчы. Але страшна было толькі першы раз. Потым Самсон яму патлумачыў, што «выключым са школы», «перавядзём у інтэрнат» — пустыя пагрозы. Бо Вася прапісаны ў доме, які суседзіць са школай, і выгнаць яго паводле закона не могуць. Таму галоўным было адключыць слых і думаць пра нешта сваё, пакуль старая дырэктарка Зінаіда Эдуардаўна нема крычыць на цябе, трасучы кудзерамі хімзавіўкі.

Новы дырэктар ніколі ні на кога не крычаў. І гэта было найгорай.

У той дзень Лабановіч нейкім чынам аператыўна дазнаўся імёны ўсіх, хто пайшоў сценка на сценку. У ягоны кабінет завялі агулам чалавек трыццаць. Ён моўчкі пачакаў, пакуль хлопцы натрамбуюцца ў памяшканне, потым спакойна прамовіў:

— Вось што, маладыя людзі. У дзявяты клас у гэтай школе ніхто з вас пераведзены не будзе. Усім ясна? Можаце ісці.

І, што характэрна, так і адбылося. Самсона з Сівым, як завадатараў, выключылі ў той жа дзень, а ўсіх астатніх напрыканцы года. Бацькоў выклікалі, прымушалі розныя паперы падпісваць, нават калоніяй застрашвалі. Якая па іх усіх, зразумела, плакала.

І Вася б з прыемнасцю зваліў куды-небудзь з таго адстою, што развёў тут новы дзірык. Толькі вось маці раптам схамя-

нулася, што з 234-й цяпер выйдзе прыстойная школа. «Нікуды ты адсюль не пойдзеш! — рашуча заявіла яна. — Гэта твой апошні шанц чалавекам вырасці!»

Гэта яна вымаліла ў Лабановіча, каб Васю не пераводзілі.

І што цяпер? Васю ўжо васямнаццаць, войска па ім плача, а ён яшчэ школьнік. Самсон вунь перакантаваўся пару месяцаў у вечаровай, а цяпер шабашыць на будоўлях у Маскве. Дарослы чалавек. Сам сабе гаспадар.

Вельмі няпроста было Васю ў абноўленай школе. Выявілася, што ўсё, чаго ён дасягнуў, развіваючы душу і цела, больш нікога не ўражвае. Што цяпер, каб цябе паважалі, трэба мець добрыя адзнакі. Яшчэ тры гады таму скажы каму такое ў 234-й, усе б доўга рагаталі. Раней у школе каралём быў прыстойны пацан — Самсон, а цяпер — гэты баклажан завучаны. Кабель гэты. Збатанела школа да немагчымасці. Узяць хоць бы той факт, што яны з Дубовікам і Лысым — адзіныя актыўныя курцы на ўсю адзінаццатую паралель. Калі не на ўсю школу. Нядаўна Вася не вытрымаў, пайшоў перакурыць у прыбіральню падчас урока, дзе яго залавілі дзяжурныя з дзясятага фізмата. Завучу, праўда, не здалі, але, пакуль тушылі ягоны недапалак і акно адчынялі праветрываць, моцна яго лажалі:

— Мэн, мы таксама смалім. Але ж маем сілу волі пачакаць, пакуль урокі скончацца.

— Думаеш, на талчку з цыгаркай ты выглядаеш вельмі крута? Цырк!

Так Вася зноў ператварыўся ў клоўна.

Ды ну яе нафіг, такую школу. Усё да лепшага.

Але, прыслухоўваючыся да сябе, Вася разумеў, што не, не нафіг.

Па-першае, мама. Яна не перажыве. Па-другое, сябры, клас. Сініца... Але не, не толькі гэта. Як ні дзіўна, было штосьці яшчэ, з чым Васю вельмі не хацелася развітвацца...

...Па законах жанру, дзверы кабінета Лабановіч пакінуў прачыненымі. Не ў правілах Васі было падслухоўваць, але надта ўжо гучна ды эмацыйна размаўлялі дзірык з Іванавічам, каб гэта не адцягнула яго ад уласных чорных думак.

— Мікалай, і што мне цяпер рабіць? — прамовіў Лабановіч. — Ты разумееш, ува што мы ўляпаліся з тваёй міласці?..

— Давайце я яму яшчэ дадому паспрабую... Толькі трэба хатні знайсці...

— Ты разумееш, што для мяне гэта катастрофа? Я труп.

— Пачакайма да вечара. Можа з'явіцца...

— Мікалай, скажы мне шчыра: ты добра ведаеш гэтага чалавека?

— Ну, гэта мой знаёмы з універсітэта...

— У яго дакладна ёсць рэстарацыя?

— Не, рэстарацыі няма...

— Як няма?!! Мікалай!!!

— У яго фірма... Кейтэрынг, абслугоўванне банкетаў... VIP-кліенты... Ну, вам жа нешта такое і трэба было.

— Менавіта! Мікалай, банкет заўтра! А чалавек, якому мы замовілі гэты банкет «пад ключ», знік з грашыма і не адказвае на мабільны!

— Ён жа вам даў распіску...

— І што мне, распіску на стол падаваць?!! Я хачу пачуць, што ўсё ў парадку! Ты смерці маёй жадаеш? Ты ж ведаеш, у мяне сэрца!

— О, мне даслалі ягоны хатні! Дазволіце?

Пакуль Іванавіч тэлефанаваў, дырэктар, задыхаючыся, выйшаў з кабінета, нацадзіў сабе з кулера шклянку вады і нагбом выпіў. Потым нацадзіў яшчэ адну і цяпер ужо стаў адпіваць патрошку, пераводзячы дых.

— Жонка дома... — Амёба Іванавіч вызірнуў з кабінета. Выглядаў ён так, нібы выключаць збіраліся яго, а не Васілеўскага. — Сказала, што ён сарваўся. Здабыў недзе штуку

баксаў — і адразу ў казіно. Як прайграецца, сёння — максімум заўтра — мусіць адгукнуцца...

— «Шту-ку-бак-саў»? — дырэктар схапіўся за сэрца. — Штуку, кажаш, баксаў?! А ці не наша гэта была «штукабаксаў»?! Гэты твой знаёмы што, азартны гулец?!

— Ну, выходзіць, так, — на Іванавіча было страшна глядзець. — Але ж распіска ёсць! — паспрабаваў ён настроіць начальніка на пазітыў.

— Ну, вядома... Я, дырэктар узорна-паказальнай школы, выбіваю ў заўсёдніка казіно грошы бацькоўскага камітэта... Я нават да юрыстаў з такім пайсці не магу! Ты разумееш, ува што ты...

Тут дырэктаравы вочы спыніліся на Васю. Ён рэзка замаўчаў.

— Мікалай Іванавіч, вы можаце ісці, — прамовіў ён пасля некаторай паўзы. — Праходзь, — кінуў ён Васілеўскаму, калі біёлаг выйшаў.

x x x

Першыя пяць хвілін у кабінеце панавала ціша. Дырэктар павольна прайшоўся да шафы, выцягнуў з шуфляды кардонную тэчку і, сеўшы ў сваё крэсла і начапіўшы на нос акуляры, стаў павольна вывучаць яе змесціва.

— Аляксей Васілеўскі, — нарэшце загаварыў Лабановіч, перакладваючы аркушы. — Няпоўная сям'я, у пачатковай школе просьба аб матэрыяльнай дапамозе ў сувязі з хваробай маці, два гады ў шостым класе... Два прыводы ў міліцыю — у сёмым і восьмым. Станоўчая характарыстыка ў ваенкамат ад класнай кіраўніцы... Але гэта я і без дасье скажу: сістэматычныя прагулы, курэнне на тэрыторыі школы...

Вася маўчаў, разглядаючы прастору перад сабою. Па ім — на стале для наведнікаў — былі хаатычна раскіданыя нейкія паперы.

— За што ты яго хоць? — нечакана мякка спытаўся Лабановіч, здымаючы акуляры. — Статкевіч — найлепшы вучань школы, але я дапускаю, што і ён не святы. Магла быць прычына...

Вася не падымаў вачэй ад стала.

— Што, дзяўчыны не падзялілі? — працягваў дапытвацца Лабановіч. — Ды я ўсё разумею, сам жа такім пацаном быў. У нас у Любчы праз дзевак ого-го якія бойкі былі... Мы з адным хлопцам ледзь у Нёмане не патапіліся — са стромы паляцелі... Маўчыш?

Вядома ж, Вася маўчаў. Будзе ён тут трапаць Сінічкіна імя.

— Я так і думаў, — уздыхнуў дырэктар. — Кулакі проста часаліся. Сумна, відаць, без сябручкоў... Ну што, Васілеўскі. Гэты момант надышоў. Ты ведаеш, што гэта такое, — Лабановіч выцягнуў з тэчкі аркуш і паказаў яго Васю.

Вася кіўнуў.

На аркушы почыркам маці фіялетавым атрамантам было выведзена наступнае:

*Прашу выключыць са школы (выдаць дакументы) майго сына Аляксея Васілеўскага ў сувязі з пераходам у іншую навучальную ўстанову.*

*Васілеўская А. І.*

І подпіс. Толькі даты не было.

— Калі мы сустракаліся ў гэтым кабінеце тры гады таму, я пакінуў цябе ў школе толькі з той прычыны, што Антаніна Іванаўна — наша заслужаная супрацоўніца, і толькі пры ўмове, што яна напіша гэтую заяву. І мы агаварылі, што я маю права ў любы момант паставіць сюды дату. Баюся, гэта будзе сённяшняя дата, — Лабановіч выцягнуў з шуфлядкі стала асадку, каламар і асцярожна, каб не запэцкаць пальцаў, стаў нацягваць у асадку атрамант. — Гэх, Васілеўскі, усяго пару месяцаў не пратрымаўся... Я ў 317-ю патэлефаную. Можа,

злітуюцца, возьмуць давучыцца. А як не, то застанешся ты з атэстатам за дзявяты клас.

— Гэта столькі не каштуе.

Ад нечаканасці дырэктар крапнуў атрамантам на аркуш заявы.

— Што не каштуе?

— Меню ў гэтым каштарысе не каштуе тысячы. Нават з напоямі і абслугай, — і Вася пасунуў бліжэй да дырэктара аркуш, які ляжаў у завалах папер перад ім на стале.

Лабановіч спужана схапіў аркуш і хуценька падсунуў яго пад дасье Васілеўскага.

— Табе не здаецца, што гэта не твая справа? — рэзка спытаўся ён.

— Мая ці не мая, але вас кінулі на бабкі, — пацiснуў плячыма Вася. — А калі тыя бабкі былі з бацькоўскага камітэта, то гэта мая справа.

— Па-першае, як ты размаўляеш з дарослымі? Што гэта за феня? «Кінулі, бабкі»...

— Ну, падманулі з грашыма. Але сутнасць ад гэтага не мяняецца, — змрочна ўсміхнуўся хлопец.

— Па-другое, пра бацькоўскі камітэт ты нічога не чуў, ясна? Гэта не тое, што ты падумаў... Усе выдаткі аплоціць спонсар. Але постфактум. Прамінулай, так бы мовіць, датай... Я проста пазычыў...

Вася нічога не адказаў, а зноў ухмыльнуўся.

— Па-трэцяе, з чаго ты ўзяў, што мяне... падманулі?

— Вы мне паперку вярніце, я вам пакажу.

Дырэктар неахвотна працягнуў Васю аркуш.

— Ну вось, глядзіце. Банкет на трыццаць чалавек, а стэйк са свініны па кошце, нібы гэта мармуровая ялавічына. На такую суму сто чалавек накарміць можна!

— Гэта як? — недаверліва спытаўся дырэктар.

— Вы што, на рынак не ходзіце?!! Нават з нацэнкай такога кошту на гэтую страву быць не можа! Ну глядзіце,

выхад, дапусцім дзвесце грамаў на порцыю, гэта значыць сырога мяса трэба кіля на чатырох чалавек, то бок патрэбна каля васьмі кіляў свініны. Ну гэта ж максімум пяцьдзясят баксаў.

А тут які кошт?

Лабановіч зазірнуў у аркуш. Вочы ягоныя пашырыліся і тут жа ўпёрыліся назад у Васілеўскага. Той між тым працягваў:

— А гэтая закуска? Я не ведаю, яйкі якой птушкі сюды трэба класці, каб яна столькі каштавала!.. Ды ў вас тут усё з такой накруткай...

— Адкуль ты гэта ўсё ведаеш? — толькі й здолеў прамовіць Лабановіч.

— Дык з вытворчай практыкі. Я на кулінарыі вучуся. І падпрацоўваю крыхан, — адказаў Вася.

Лабановіч так уразіўся, што нават прапусціў міма вушэй слова «крыхан».

— І вас гэтаму ўсяму вучаць?

— Не, вядома. Але я на банкетах часам раблю. І прыкладна ўяўляю, адкуль якія сумы бяруцца. Я не ведаю, можа, гэтыя службы заўсёды так дзяруць, але ў рэстарацыі такі банкет каштуе нашмат танней.

— Але я замаўляў VIP-абслугу, — разгублена пралапатаў Лабановіч. — Мне трэба, каб усё было па вышэйшым разрадзе... Разумееш, у школу прыедуць вельмі важныя госці, — сказаў ён, сабраўшыся. І згадаўшы, што ён дырэктар, які выключае вучня са школы, зноў прыняў строгі від і падсунуў да сябе заяву Васевай маці.

— Андрэй Васілевіч, дазвольце мне давучыцца, калі ласка, — раптам сказаў Вася, зірнуўшы проста на дырэктара. — А я вам банкет арганізую.

— Ты сам зразумеў, што ты сказаў? — рассмяяўся дырэктар. — Ты — банкет? Ты ж школьнік. Як ты ўсё адзін зробіш? Сам прыгатуеш?

— Чаму сам? З мамай, — самавіта сказаў Васілеўскі. — Мама здорава гатуе. Асабліва калі ёй нармальныя харчы даць... Андрэй Васілевіч, слухайце, мне вельмі трэба давучыцца. Калі вы мяне вытур... выключыце, мне пасведчанне за вытворчую практыку не выдадуць. А з ім я магу адразу ўладкавацца на працу... У вас, па сутнасці, няма выйсця, — працягнуў ён пасля паўзы. — Я пачуў, што вы далі гэтаму кіда... махляру тысячу даляраў. А яшчэ хоць нешта ў вас засталося?

Дырэктар, аслупянеўшы ад такой пранікліваспі, толькі моўчкі кіўнуў.

— Дайце мне трыста на харчы — і заўтра ў вас будзе супервячэра на трыццаць персон. Такая, як у гэтым меню, — Вася кіўнуў на аркуш, — і нават лепей. Я ведаю добрых пастаўляльнікаў. І вы можаце самі купіць напоі ды садавіну.

— А як жа сервіроўка... Афіцыянты... У школе няма прыстойнага посуду. Мы разлічвалі...

— Гэта ўсё пакіньце мне. Зладжу вам урачыстую вячэру па сабекошце. Ну, маме яшчэ прэмію выпішаце за люты... — Вася ўвесь пераамяніўся. Увайшоўшы ў знаёмую тэму, хлопец вокамгненна разняволіўся. Здавалася, яшчэ крыху — і ён паляпае дырэктара па рукаве пінжака, як старога прыяцеля.

— Аляксей, ты разумееш, што ў нас будуць вельмі важныя госці? Бізнесоўцы з Лондана, якія маюць намер фінансаваць нашую ўжо амаль гімназію!

— Значыць, англійскую сервіроўку рабіць? — шырока ўсміхнуўся Вася.

З агаломшанага твару дырэктара было відаць, што ён згодны абсалютна на ўсё.

x x x

— Глядзіце, вунь Соня Сінічка з «Д» класа!

— Сёння праз яе пабіліся Статкевіч і Васілеўскі!

— Што, праўда?

— Я стаяла там і ўсё бачыла. Статкевіч глядзеў расклад, нікога не чапаў, раптам гэты клоўн наляцеў, як каршак абскубаны. Закрычаў: «Кабель! Я цябе папярэджваў! Не чапай яе!» І — бац па фізіі! Статкевіч ажно паваліўся. Ліхтар пад вокам во такенны!

— Божа, калі яны ўжо ўтаймуюцца?..

— Ну ты даеш, Сонька! За што ты так з Васем? Урэшце, ён абараняў твой гонар! — тры сяброўкі падыходзілі да ўніверсама каля школы. Соні трэба было купіць хлеба — мама Юля папрасіла, і Галя са Снежкай увязаліся за ёю.

— А ты, Кавалёва, увогуле маўчала б. Гэта ўсё ты вінаватая! — прабурчэла Соня.

— І ў чым гэта я вінаватая?

— Жартуеш? Напляла Васілеўскаму рознай лухты, вось ён і палез у бойку... А нічога ж такога не адбылося. Максім проста пажартаваў. І нават папрасіў прабачэння адразу... Ну, па-свойму.

— Сінічка, што за наезды? Дзеля цябе сёння хлопцы біліся! Не кожнай дзеўцы выпадае ў жыцці такое шчасце. Ты дзякаваць мне мусіш!

— Ага, дзякаваць. Зноў уся школа на мяне пальцамі паказвае.

— Гэта зваротны бок славы. У галівудскіх зорак так штодня.

— От дзякуй, дарагая, што мне цяпер фігова, рыхтык як ім там у Бэвэрлі-Гілз! Толькі дзе тады мой чацвёрты памер і белы «Бэнтлі»?

— Соня, а Сняжана мае рацыю. Вася спадзяецца на нас.

— Я яму не адмовіла.

— Але збіраешся. Проста ён па сваёй наіўнасці гэтага не разумее.

— У любым выпадку Вася — наш сябар, і ён у бядзе. Трэба любою цаною дапамагчы.

— Ды разумею. Але я ўсё адно злая на яго. Ён зрабіў балюча дарагому мне чалавеку.

— Халера ясна! Статкевіч — апошняе, пра што ты мусіш цяпер перараймацца. Ды бяры першы-лепшы, пайшлі ўжо, дастала! — Снежка гаварыла так гучна, што на іх зашыкалі прадавачкі. Соня стаяла над паліцай з хлебам і чытала склад на цэтліках.

— Мяне прасілі без дражджэй...

x x x

— Опа, там Сінічка!

— Тая самая?

— Ага. Праз яе сёння біліся Статкевіч і хлопец з 11 «Д». А яна іх разнімала. Івашчанка стаяла там і ўсё бачыла. «Дэшкін» падляцеў да Статкевіча і такі кажа: «Ты мярзотнік! Яна ніколі не будзе тваёй!» А Статкевіч стаіць з рукамі ў кішэнях, лыбіцца і нават не чэшацца абараняцца. І тут той пацан яму падножку, і хук справа, і па мардасах, па мардасах... А Сінічка бяжыць такая, не-е-е-е, спыніся, я буду з табой, толькі не чапай яго! Калі б не яна, Статкевіч не жыхар.

— Цырк на дроце!

x x x

Васілеўскі з'явіўся ў класе толькі на апошнім уроку. Папрасіў прабачэння ў настаўніцы, сеў і да званка сядзеў ціха, нібы і не Васілеўскі гэта зусім. «Дэшкі» ж адчайна круціліся, спрабуючы злавіць позірк таварыша. «Ну, як? Выключылі?» — пыталіся ў гаротніка на мігах, але той ніяк не рэагаваў. Як толькі празвінеў званок, аднакласнікі кінуліся да апошняй парты.

— Пакуль вучуся, — сцісла адказаў ён, закідваючы пашкуматаны дзённік у зашмальцаваны заплечнік.

— Уффф!.. Малаток, Вася!.. Гэта трэба адзначыць... — з палёгкай загуў «Д» клас.

— Не, рэбза, мне яшчэ на працу сёння, давайце іншым разам, — адказаў хлопец. Шэптам аднак сказаў Галі, Снежцы і Соні, каб тыя не сыходзілі.

— Вось што, дзеўкі. Я ў рэчыве колеру шакаладу па самыя вушы, — пачаў Вася, калі яны выйшлі ўчатырох на школьны калідор. — Тую заўтрашнюю паляну, куды дзірык збірае ўсіх школьных мажораў, накрываю я. І мы дамовіліся, што калі ўсё пройдзе чыкі-пыкі, я застаюся ў школе.

— Як так? Чаму ты? — здзівіліся дзяўчаты.

— Так атрымалася... Доўга расказваць.

— А ты раней гатаваў увогуле?

— У рэстарах — толькі дапамагаў. «Сайгон» не ў лік. На практыцы нас нацягвалі на катлеты ды шніцэлі ўсякія, паводле ГОСТа. Як для сталоўкі. Так што ў мяне паслязаўтра іспыт па стэйках. Але без вас я дакладна нічога не змагу.

— Га?

— Будзе самы сапраўдны банкет з поўным абслугоўваннем. «А-ля англез». Таму мне патрэбны персанал. Вы то бок.

— «А-ля англез» — гэта што?

— Гэта гемар, Вайтовіч. Але я вам потым усё патлумачу. Калі ўпражацеся за мяне. Дык што, упрагаецеся?

— Вася, што за пытанне!... Ясная рэч, мы з табой! — у адзін голас выгукнулі Галя і Снежка.

— Прабач, але я не ведаю, ці змагу. У сераду — тэст па фізіцы. Трэба рыхтавацца, — сказала, адвёўшы вочы, Соня.

— Сініца, ты што? Які тэст, калі тут такое? — штурхнула Галя яе пад бок.

— Ну, там яшчэ на вечар заўтрашні былі планы... Я не ведаю, ці ўдасца перанесці. Я табе сёння патэлефаную.

— Ну, ладна, — патухлым голасам сказаў Вася. — Ты вырашай, а то інакш трэба трэцяга кельнера шукаць...

— Калі ты абвесціш Васю, што, замест таго каб ратаваць ягоную задніцу, ты ідзеш у спа трымаць ручнічкі за мамай Юляй, ты разаб’еш яму сэрца, — жорстка сказала Снежка,

упіхваючы ў рукі Соні буханку з надпісам «Жытні бездражджавы». — А мы ў табе моцна расчаруемся.

Соня, якая відавочна стамілася ад усёй «санта-барбары», уздыхнула і сунула руку ў кішэню курткі.

— Ладна. Я яму тэлю... Лёша? Ну, я тут больш-менш разграблася, — прамовіла яна ў слухаўку з бадзёрымі інтанацыямі радыйнага ды-джэя, які мадэлюе ўсмешку голасам, віншуючы з дэмбелем «хлопцаў з Ваўкавыска». — Да пятніцы, Віні, я абсалютна свабодны!

— Сініца, здорава! Перадай дзеўкам: сёння а сёмай вечара — у сталоўцы. І сама прыходзь. Буду вам даваць устаноўку. О, а я з тваім продкам перацёр! Ён мне сёння посуд для банкету падгоніць! — Вася так крычаў у тэлефон, што палова крамы чула яго басавіты голас. — Слухай, ты выпадкам не ведаеш каго-небудзь з тачкай і каб не працаваў заўтра ў першай палове дня?

— Ёсць у мяне адзін варыянт, — усміхнулася Соня ў слухаўку. Гэтым разам абсалютна шчыра.

x x x

— Прыкінь, сёння ў 234-й было такое мачылава! Аднаго тамтэйшага пацыка ледзь не прыкончылі, бо лез да чужой бабы.

— Ды ну?

— Я табе кажу! У Мікітоса сястры сяброўка ў той школе вучыцца, дык яна стаяла там і ўсё бачыла. Яго пяць чалавек пятнаццаць хвілін калашмацілі. Дзве хуткія выклікалі. Адну для яго, а другую — для фізрука, які прыбег іх разнімаць! Міліцыя прыехала...

— Ух ты, жэсць якая.

— І не кажы! Дзікія людзі!

Раздзел VI

# АНГЛІЙСКАЯ СЕРВІРОЎКА

Праклінаючы сябе за безгаловасць, Соня праслізнула ў вітальню дома на Верасовай. Трэба ж было так збірацца — напхала пакет markerрознай непатрэбнай драбязою, а самае важнае — свае старыя чорныя балеткі — забылася. «Абутак вазьміце ў тон уніформы, і каб без абцасаў. Кавалёва, асабліва цябе датычыць, — навучаў учора Вася. — І крый божа не новы! Разношаны трэба. А то пад канец змены... цьху, вячэры ад ног нічога не застанецца».

Банкет пачынаўся праз тры гадзіны. Адшукаўшы каля тумбачкі торбачку з абуткам, Соня хацела была зачэкініцца, павітаўшыся са Статкевічамі, але, зазірнуўшы ў гасцёўню, перадумала. Уся сям’я была ў зборы, і кожны быў захоплены справай. Вадзік гуляўся ў стралялкі на хатнім камп’ютары. Магчыма, таму прыходу Соні не пачулі. Тата Віця, абкручаны паласатым ваўняным шалікам, працаваў з лэптопам — падчас юбілейнай рыбалкі з аднакласнікамі на Бярэзіне ён сур’ёзна прастудзіўся і толькі сёння быў пераведзены мамай Юляй з ложкавых хворых у канапныя. Сама мама Юля, адсунуўшы абедзенны стол і ўладкаваўшы Максіма пад лямпы, старанна, з высунутым ад напругі кончыкам языка, замазвала таму тонікам буйны ліловы гузак пад левым вокам.

Сёння Сінічкін каханы ўвесь дзень асвятляў школьныя калідоры гэтым ліхтаром, выклікаючы спачувальныя дзявочыя вохі і перашэпты за спінай. Хлопцы ж хіхікалі ў кулакі і цэлы дзень пацiскалі Васю руку.

— Вадзім, колькі паўтараць, надзень навушнікі! Калі ты навучышся думаць пра іншых? — крыкнула мама Юля з-за калоны. — А ты не торгайся, — сказала яна другому сыну. — Я курсы грымёраў не заканчвала, раблю як умею. Наступным разам будзеш акуратней на дзверцы шафы натыкацца.

— Максім, перадавай прывітанне Пітэру Конраду! — сказаў тата Віця. — Зрэшты, наўрад ці ён мяне згадае... Але ж які зух ваш Лабановіч! Заручыцца патранажам самога канцэрна «Люцэрна»... Перспектыўны дырэктар, кіраўнік ад бога. Юля, можа, Вадзіма ў Максімаву школу перавесці? А то нешта не бачу я ніякага прагрэсу ад гэтай ягонай платнай і, я б сказаў, празмерна платнай гімназіі.

— Ведаеш, Віця, я сёння з шостай ранку матлялася па харчовых рынках, прыкрываючы сумнеўныя справункі гэтага «перспектыўнага кіраўніка ад бога». І ў літаральным сэнсе зазірнуўшы на кухню ягонай школы, захаплення твайго не падзяляю... Слухайце, які цудоўны хлопец — гэты Сонечкін аднакласнік, Аляксей. Такі талковы. Адна прыемнасць была яму сёння дапамагаць.

— Як, яго не выключылі? — паморшчыўся Максім.

— А што, мусілі? Такога здольнага маладога чалавека? Калі нехта і пойдзе далёка, Віктар, то гэта ён. І ведаеш, ён вельмі абаяльны. Не тое што наш бука. Вох, глядзі, Максік, увядуць у цябе Соню — будзеш локці кусаць.

— Мама, ты зноў за сваё!

— Ну, ужо і пажартаваць нельга? Ну вось, гатова!

Так нікім і не заўважаная, Соня выбегла з дому. Яе чакаюць у сталоўцы. Дзяўчаты, відаць, зашываюцца.

Цікава, што адчувала б Папялушка, калі б ёй дазволілі трапіць на баль на правах Папялушкі?

x x x

— Гэта месцы Грыфіндору, — Максім Статкевіч уладна паклаў руку на спінку банкетнага крэсла ў галаве стала. — У сэнсе, тут сядзіць 11 «А».

— І хто гэта сказаў? — фыркнула адна з Сонь. Найлепшымі «гэшкамі» з нейкага ляду абралі менавіта іх. Відаць, паводле вышыні абцасаў — сёння абедзве пабілі ўласны рэкорд па шпільках. Убраныя яны былі ў пышныя шыфонавыя сукенкі, як дружкі на вяселлі.

— Дырэктар папрасіў нас сесці менавіта сюды. Або вы хочаце ўвесь вечар размаўляць па-англійску з замежнымі гасцямі?

Па Сонях было відаць, што яны вельмі хацелі, але наўрад ці здолелі б. З кіслымі мінамі паненкі адступіліся на менш прэстыжныя пазіцыі.

— Яшчэ мне, Гары Потэр! — сказала Галя на вуха Сінічцы. — Па мне дык форменны Драка Малфой.

Соня, Галя і Снежка стаялі ў радок уздоўж сценкі, заклаўшы рукі за спіну, побач з сервіравальнымі вазкамі, якіх у сталоўцы знайшлося ажно два. На тварах дзяўчат застылі ветлівыя маскі. Ад перапрацаваных рук тхнула цыбуляй — смурод ніяк не вымываўся. Ледзьве ўправіліся да пачатку вячэры.

З самага ранку ў харчаблоку 234-й школы панаваў вэрхал. На бляшаных сталах мяшаліся крэветкі і сасіскі. У пах грэчкі ўпляталіся водары спецый. Кухня, як і штодня, была загружаная, і для калег цёткі Тоні выявілася поўнай неспадзяванкай, што нехта будзе рыхтаваць тут яшчэ і банкет. На дзяўчат, якія з восьмай на Васеву каманду кроілі гародніну ў так званым «халодным цэху», увесь час шыкалі школьныя кухаркі, незадаволена адбіраючы ў «верціхвостак» нажы, якіх не хапала, таму пасля абеду Галя збегала дадому па набор нажоў, а Дубовік і Лысы прыцягнулі з лёхаў высокую шырму

для лялечнага тэатра. Шырму ўсталявалі проста ў сталоўцы і завіхаліся ўжо за ёй, паставіўшы Васевых сябрукоў па баках адганяць цікаўную малышню з другой змены.

Цяпер шырма, драпіраваная беласнежнымі абрусамі, стаяла збоку, каля ўвахода ў кухню. За ёй чакалі свайго часу напоі і закускі.

Перад новаспечанымі кельнеркамі быў разгорнуты фронт іхняй працы: раскошны, убраны белым атласам даўжэзны стол на трыццаць персон з бела-залатым парадным сервізам і дыхтоўнымі, шляхетнымі фужэрамі ды прыборамі. Атрымалася з понтам, як у фільме «Тытанік», — два відэльцы, тры нажы ды яшчэ дэсертная лыжачка. Сервіроўку перараблялі некалькі разоў. Раз-пораз Вася выходзіў у залу, крытычна аглядаў стол, пасля чаго сварліва тыцкаў Галі і Снежцы пад нос карцінку з выведзенай на прынтар фоткай.

— Ты што, не бачыш, як відэльцы ляжаць?

— Я так і паклала...

— Дагары зубкамі, Кавалёва! Дагары! І, халера, як вы скруцілі сурвэткі?!!

Васю было не пазнаць. Увайшоўшы зранку на кухню, дзяўчаты абамлелі. Іх сустракаў высокі зграбны ніндзя ў бліскучым чорным кімано. На галаве ў сябра красавала чорная шапачка з чырвонай вышыўкай. Валасы ён прычасаў і нават прылізаў гелем.

— Гэта што? — спужаліся дзяўчаты.

— Мая ўніформа шэф-повара, — адказаў Вася, стараючыся гучаць абыякава. — Надзяваю ў выключных выпадках.

— І як часта?

— Ну... сёння ўпершыню. Яна новая.

— А чаму чорная?

— А хто сказаў, што яна мусіць быць белая?

Адным словам, выглядаў Васілеўскі вельмі крута.

Але вернемся да параднага стала. Звычайныя металічныя крэслы з дэрмацінавымі сядушкамі былі зацягнутыя

ў шэрыя атласныя чахлы з белымі бантамі на спінках. Усю тэкстыльна-парцалянавую феерыю разам з прыборамі яшчэ ўчора позна ўвечары перавезлі ў школу з «Пана Сцяпана» на «таёце» Сінічак. Перад кожнай талеркай стаяў кілішак з малюпасенькім букецікам белых хрызантэмак — два мяхі так званага «кветкавага смецця» разам з харчамі прывёз з «Экспабелу» Вася — знаёмыя гандляры падкінулі. Наста Ракавец і яшчэ дзве аднакласніцы, дазнаўшыся пра Васеву бяду, пасля ўрокаў прыйшлі дапамагчы і некалькі гадзін складалі гэтую ікебану. Атрымалася вельмі святочна. Так, нібы гэта была банкетная зала школы Хогвартс і чараўнікі толькі што змянілі яе да непазнавальнасці ўзмахам палачкі.

Ежы на сталах не было. Учора Вася з запалам тлумачыў, што яны рыхтуюць не нейкае там вяселле, а самы сапраўдны банкет на манер дыпламатычнага. Дзяўчаты будуць развозіць стравы ў вялізных сподах на сервіравальных вазках, калі госці рассядуцца, і накладаць лапаткамі на талеркі. Так ежа даўжэй застанецца гарачай.

Гэтага манеўру Соня баялася найболей. Не хапала яшчэ абліць соусам якую чыноўніцу з міністэрства. У гэтую хвіліну цэлы цуг такіх салідных дам хадзіў за дырэктарам па замеценых дарожках школьнага стадыёна. У сталоўцы пакуль збіраліся адборныя вучні ды іхнія заслужаныя настаўнікі, запрошаныя на банкет дырэктарам. Чакалі галоўных гасцей.

На ўваходзе ў «банкетную залу» стаялі ў белых кашулях ды чорных нагавіцах Дубовік і Лысы. З дыскатэчнымі бэджыкамі «Ахова», начэпленымі для саліднасці. Брыгада афіцыянтак таксама апранулася па схеме «белы верх, чорны ніз». Такое проста камбінуецца са школьнай формы. Соня ці не ўпершыню за доўгі час зняла свой прасторны шэры пінжачок і таму пачувалася, нібы яе выкалупалі з футарала. Хацелася дастаць рукі з-за спіны, абцягнуць сваю караткаватую ўжо спаднічку, папраўіць кашулю, якая задзерлася на спіне. Хацелася пачухаць нос урэшце.

Але гэта ўсё да часу, калі ў залу ўвайшоў Максім. У той момант Соня забылася пра сваё існаванне.

Ён быў проста бездакорны. Пудры на ягоным твары дзякуючы шчыраванням мамы Юлі было больш, чым на Галі і Снежцы разам узятых — таму гузака пад вокам не засталося і следу. Ён быў апрануты ў прыталены шэры гарнітур з камізэлькай — такі ж, у якім Соня пабачыла яго ўпершыню на лінейцы. І так — сёння на ім быў гальштук!

Максім прайшоў паўз Соню, нават не павярнуўшыся ў ейны бок — і ўсё адно ўсе лямпы і свяцільнікі школьнай сталоўкі ззялі тысячай урачыстых агеньчыкаў. Ёй было дастаткова таго, што ён — такі гожы і такі родны — побач, за два крокі...

Але вось усе лямпы і свяцільнікі адразу згаслі. У сталоўку, следам за Ленай Каньковай і Ванем Каланіцкім, увайшла Маша Ротмістрава.

На Ротмістравай была простая, але вельмі ладна скроеная чорная сукенка, якая надзейна закрывала каленкі і дэкальтэ, але рашуча агаляла плечы, і такія ж простыя чорныя туфлі на невысокім абцасе. Валасы былі ўкладзеныя ў бабульчын вузел на патыліцы. На шыі на срэбным ланцужку блішчэў крышталік «Свароўскі» ў форме сэрца. Вось і ўсе аздобы.

Пабачыўшы Машу, Статкевіч прыязна памахаў рукой, паказваючы на крэсла побач з сабою. Соні нясцерпна захацелася стаць вядзьмаркай з кніг пра Гары Потэра і трансгрэсаваць са школьнай сталоўкі ў самы далёкі кут планеты Зямля.

Бо, вядома ж, гэта няпраўда, што яна не хацела дапамагаць Васю. Яна проста не хацела цэлы вечар назіраць Статкевіча і Ротмістраву разам. Сачыць, як яны глядзяць адно на аднаго, перамаўляюцца, смяюцца, як ён адстаўляе крэсла, дапамагаючы ёй сесці за стол... Сэрца разрывалася на кавалачкі.

Аддаўшыся рэўнасці, Соня нават не заўважыла, як Дубовік з Лысым раскрылі палоўкі дзвярэй і ў залу ўвайшлі госці.

Дырэктар, апрануты ў ільсняны светла-шэры гарнітур, вёў за сабою грамаду, большую частку якой складалі жанчыны ў дзелавых строях, аздобленых стракатымі шалікамі і зіхоткімі брошкамі. Аксесуары, відаць, меліся надаць святочнасці штодзённым вобразам чыноўніц. Поруч з дырэктарам крочылі двое мужчын. Адзін з іх — высокі, гадоў пяцідзесяці — нібы выйшаў з савецкага фільма пра Мэры Попінз ці Шэрлака Холмса: клятчасты пінжак, нагавіцы-дудачкі, лакаваныя чаравікі — зусім не на беларускія маразы, — вязаная камізэлька і пацешны гальштук-матылёк. Круглыя акуляры, кіёчак. Так, нібы гэты спадар усім сваім відам спрабаваў падкрэсліць, што прыбыў сюды наўпрост з Лондана.

Побач з ім ішоў старэйшы джэнтльмен — паўнаваты, з раскосымі ўсходнімі вачыма пад сівымі ўжо бровамі, у някідкім цёмна-шэрым гарнітуры з шыйнай хусткай замест гальштука.

Усе запрошаныя на банкет расселіся на месцы. Школьнікі ціха шушукаліся. Здаецца, іх перапужала колькасць прыбораў. Ніхто не ведаў, навошта столькі відэльцаў, у якім парадку імі карыстацца і, галоўнае, дзе ежа.

— Соня, салат! — зашыпела Снежка. Галя, прызначаная Васем афіцыянткай ад напояў, ужо выкочвала на стартавую лінію столік з шампанскім, колай і мінералкай. Пекла пачалося...

Клац! Клац! — жвавы хлопец у джынсах і спартыўнай байцы, з капюшонам на галаве і чамусьці ў сонечных акулярах спрытна адфоткаў першы тост, узняты Лабановічам «за адзінства адукацыі і бізнесу». Соня ўзлавана прымружылася: яе асляпіў фотаўсплёск. Асцярожна нахіляючыся, яна брала са стала талеркі і накладала вялізнай лыжкай салатку з авакада, памаранчамі ды крэветкамі. Снежка рабіла тое самае з іншага боку даўгога стала — ёй дасталіся дарослыя: чыноўнікі, настаўнікі ды брытанскія госці. Соня абслугоўвала вучняў. Пыталася, ці вялікую порцыю, усміхалася і жадала смачна есці... Яна пачала з дальняга ад дырэктара краю — адтуль, дзе прытуліліся чатыры збянтэ-

жаныя алімпіяднікі з дзясятага класа: іх запрасілі ў апошні момант. Салаткі на сподзе, аднак, усё менела — Сінічка няўмольна набліжалася туды, дзе леваруч ад дырэктара сядзелі Ротмістрава і Статкевіч. Стараючыся стрымаць дрыготку, дзяўчына ўзяла талерку каханага і... рука ўсё-ткі задрыжэла, а крэветкі цудам не апынуліся на плітах падлогі і Соніных стаптаных балетках.

— Мда, Сінічка, мудра ты ніколі не здымаеш пінжака, — пачула яна, нахіліўшыся да стала, кплівы шэпт Статкевіча, які толькі ейнае вуха магло вычапіць з гулу галасоў, што панаваў над ежаю. — Паказваць абсалютна няма чаго. Хіба што на конкурсе прасавальных дошак.

Кроў прыліла да Соніных шчок. Першай рэакцыяй было ўзняць талерку з салаткай і бахнуць ёй падонка па макаўцы. Спыніла толькі тое, што магла пацярпець талерка. Яна ж з татавай рэстарацыі. Фамільны, можна сказаць, сервіз. Таму Сінічка глыбока ўздыхнула, палічыла да пяці і расцягнула вусны ў ветлівую грымасу. Так вучылі татавы афіцыянткі. Калі кліент хаміць, трэба перавесці дыханне, палічыць хоць бы да трох і ўсміхнуцца.

— Прабачце, якое ў вас пытанне? Не, паводле рэцэпта мы не перчым гэтую салатку. Госці дадаюць спецыі самастойна, на свой смак. Дазвольце вам дапамагчы, — і, схапіўшы са стала перачніцу, Соня адкалупнула пазногцем донца і высыпала ўсё яе змесціва ў талерку Максіма.

— What's going on?* — вырачыў вочы англічанін, які сядзеў роўненька насупраць Ротмістравай і ажыўлена штосьці з ёй абмяркоўваў.

— Local food habits. Some like it hot, you know**, — адказала Ротмістрава.

* Што адбываецца? *(англ.)*

** Асаблівасці нацыянальнай кухні. Разумееце, некаторыя любяць пагарачэй *(англ.)*.

— Oh, I see*, — заківаў галавой брытанец і інстынктыўна пасунуў талерку бліжэй да сябе.

Максім між тым спакойна зняў відэльцам перац з салаткі і як нічога-ніякага пачаў есці.

— Вельмі люблю гэты фільм, — засмяяўся сівы спадар, што сядзеў праваруч ад брытанца. Ён надзвычай добра і амаль без акцэнту гаварыў па-руску. — Дык, Максім, калі не сакрэт, які прыбытак за мінулы год мела «Стар сістэмз»?..

Максім спрабаваў прамовіць слова, але закашляўся і пацягнуўся па шклянку.

Так табе і трэба, нягоднік.

— Яшчэ колы? — падскочыла паслужлівая Галюня з бутэлькай.

Пасля такой рашучай помсты ў Соні выраслі крылы. Яна лётала чорна-белай феечкай па зале і ззяла ўсмешкай, падаючы наступную закуску: фаршыраванага карпа, згатаванага цёткай Тоняй у перапынку паміж школьнымі баршчом і грэчкаю. У спрытным танцы расстаўляла перад едакамі жульены з шампіньёнаў. На Максіма дзяўчына нават не глядзела.

— Давай памяняемся месцамі, — папрасіла яна Снежку. — А то я яго апалонікам па галаве дзеўбану. Або задушу сурвэткай.

Нядоўга, аднак, доўжыўся Сонін палёт. Да моманту, калі Вася падаў сігнал з кухні, што можна падаваць гарачае. Тут, як і было запланавана, урубіліся сафіты, і да трохкутнай сцэны ў дальнім куце сталоўкі, дзе ўжо ўладкаваліся музыкі, падышоў акулярысты бландзінчык з 11 «А». Ягор Залескі, аднакласнік і таварыш Статкевіча.

— Добры вечар, шаноўныя госці! Вітаем вас у 234-й школе — самай крэатыўнай школе горада Мінска! Мы, аднак, не будзем дэманстраваць вам усіх нашых талентаў, паверце — для гэтага недастаткова і тыдня. Наш вечар упрыгожыць

* Ясна *(англ.)*.

усяго адзін талент — затое які! Сёння для нас спявае вучаніца 10 «А» — Кацярына Арыстава. Яна ж — непаўторная Arizona!

Перачакаўшы выгукі і воплескі, Ягор працягнуў:

— Аднак пакуль Каця рыхтуецца, мы пазнаёмім замежных гасцей з адной нашай традыцыяй. Сёння ў нас штосьці накшталт школьнага балю, а школьны баль адкрывае, вядома ж, вальс!

І тут з калонак пачуўся вальс. Зарыпелі крэслы, і, як было запланавана, вучні высыпалі на танцпол. Завучаныя матэматыкі з 11 «В», якіх Соня памятала яшчэ з экскурсіі ў Кіеў, запрасілі на танец Сонь, якім ледзьве даставалі да плячэй. Каланіцкі падаў руку Каньковай... Максім...

Максім абняў Машу за талію — і, гледзячы адно аднаму ў вочы, пара закружляла перад сцэнай пад шпаркае «раз-тва-тры, раз-два-тры» вядомай вальсавай мелодыі.

Клац! Клац! — хлопец-фатограф спрытна фіксаваў на камеру самы чорны момант у біяграфіі Соні Сінічкі.

За тры хвіліны танца Соня пражыла доўгае жыццё, поўнае злосці на ўласную нікчэмнасць. Ногі зрабіліся ватнымі. Яна абаперлася на сценку.

— А цяпер сустракайце! Арызона! — абвясціў Залескі. Статкевіч клапатліва, злёгку прытрымліваючы ззаду за локці, падвёў Ротмістраву да стала. Зрабілася душна. У Соні закруцілася галава.

*Хто натхніць мяне на смерць?*
*Я такой не маю волі.*
*Маю толькі болі.*
*Болі — каб пасціцца і гавець.*

Арыстава з'явілася на сцэне нечакана і пачала свой трывожны джаз з першым акордам мінусоўкі. Яна мела моцны аксамітны голас, тэмбры якога праточваліся ў самую ду-

шу слухача. На ёй была вузкая доўгая чырвоная сукенка. Рукі яе былі зацягнутыя ў чорныя пальчаткі да локця.

Смерць! Як гэта было сугучна Соніным думкам... Больш за ўсё яна цяпер хацела памерці.

*З гор сыдзі, як з купалоў,*
*Дух у вобразе старога,*
*праз пакуты дай мне Бога,*
*дай мне Богавую кроў.*

Музыка грымела так, што размаўляць было немагчыма. Максім схіліўся да Машы і штосьці гучна казаў ёй на вуха. Таяківала і ўсміхалася. Потым ужо Максім падстаўляў вуха суседцы — і казала штосьці яна.

*Не жыву — хаджу, што сцень,*
*брыдкі і чужы паветру,*
*хоць і выйшаў калісь з ветру,*
*выйшаў і азмрочыў дзень.*

— Гарачае пара забіраць! Сініца! — штурханула яе Снежка. Соня пахіснулася.

— Хай мяне Галя падменіць... Мне няхораша!.. — задыхана прамовіла Соня і, трымаючыся за сценку, выпаўзла са сталоўкі.

*Ты натхніш мяне на смерць,*
*чалавек, цяжарны Богам,*
*праз цябе мая дарога,*
*моцы дай яе здалець...*
*Моцы дай яе здалець...*
*Моцы дай яе...*

На калідоры, дзе было прахалодна, гаротніцу крыху адпусціла. Але ўвушшу яшчэ звінела. Трэба было асвяжыцца. Плакаць не варта — на вейках пазычаная ў Снежкі туш, Соня не спыталася, ці водатрывалая. Яна пасунулася ў прыбіральню, каб праветрыцца і заадно паглядзецца ў люстэрка.

У прыбіральні, паклаўшы на падаконне наварочаную камеру, мыў рукі хлопец-фатограф.

— Гэта жаночая! — сярдзіта буркнула Соня, падыходзячы да суседняга ўмывальніка.

— Я ведаю! — адказаў знаёмы голас.

x x x

Нейкі малады фатограф спытаўся на форуме, дзе месціцца 234-я школа. Слова за слова, выявілася, што сёння ўвечары яму цікавей пафоткаць канцэрт вядомага гурта, а не «прышчавых гімназістаў». Такім чынам маме Юлі перапала ейная першая замова: фатарэпартаж пра дабрачынную акцыю замежнага канцэрна.

Ейны маскарад таксама знайшоў тлумачэнне. «Ну, ты ж ведаеш... Максік не любіць, калі я яго здымаю»... Авантурнасці мамы Юлінай маскіроўцы дадавала сынава адзежа, для яе скарыстаная.

Кабета стаяла, разняволена прытуліўшыся плячыма да ружовай кафлі і скрыжаваўшы ногі ў рваных джынсах, як сапраўдны хлапчук. Яна свяцілася ад задавальнення — сабою, сітуацыяй і працай, якую рабіла. Яна спрытна прагортвала здымкі на камеры, раз-пораз захоплена выгукаючы.

— Ай я малойца! Ты толькі зірні, Соня! Ані следу фінгала! Нават рэтушаваць не трэба!

Яна сунула пад нос дзяўчыне экранчык, на якім буйным планам былі знятыя Максім з Машай падчас вальса. Здымак паказваў анфас вельмі падобныя, адухоўленыя твары. Нібы падсветленыя фотаўспышкам. Сапраўды, майстэрства.

Сонін жа твар перасмыкнула. Яна часта-часта зашмыгала носам. Гэта была апошняя кропля.

— Сонейка, што з табой? — не адразу зразумела мама Юля. — Ты што, раўнуеш? — рассмяялася яна. — Кінь дурное. Знайшла да каго!

— Але гэтая Маша, яна... Яна...

— Яна абсалютна не ягоны тып, — адрэзала кабета.

— Але яны так міла дачыняюцца! І ён не крычыць на яе і не буркае, і ўвогуле, размаўляе з ёй, як з нармальным чалавекам!

— Соня-Соня... Якія ж вы, дзяўчаты, дурнічкі... Ну хто гэта бачыў, каб хлопец прыязна паводзіўся з той, што яму падабаецца? А пагатоў Максік. Ён жа дзяўчат баіцца як чорт ладану. А да гэтай Машы ён ставіцца хутчэй як да хлопца. Або не... Улічваючы яе гульку, — з'едліва захіхікала мама Юля, — як да бабы Веры з Рыгі. Гэта сястра нашай полацкай бабулі Зоі, — патлумачыла яна. — У іх нешта накшталт сацспаборніцтва па ўнуках. І Максік, калі сям'я збіраецца разам на Вялікдзень ці Тройцу, сваёй абыходлівасцю са старэйшымі прыносіць бабулі Зоі шмат балаў. Павер мне як старонняму назіральніку: табой ягоная галава занятая значна болей, чым нейкай там Машай.

— А вось і не! — усё-ткі разрыдалася Соня. — Ён ігнаруе мяне. Не размаўляе. І нават не глядзіць у мой бок. А калі размаўляе, то каб абразіць або неяк зачапіць.

— Але і ты не адстаеш! — зноў захіхікала кабета. — Здорава ты яму сёння перцу ўсыпала. Калі заляцацца, дык з аганьком!

— Я? Заляцацца? — шчыра не зразумела Сінічка. — Ды вы што! Пасля таго, што ён пра мяне кажа...

— Соф'я, няважна, што кажа мужчына. Важна, што ён робіць! Ну вось з чаго ты ўзяла, што ён на цябе не глядзіць? Вельмі нават глядзіць! І ў мяне ёсць доказы! — мама

Юля яшчэ спрытней зашчоўкала фотаапаратам і неўзабаве з трыумфам прадэманстравала экранчык дзяўчыне.

Таленавіты фатограф робіць цуды. На чорна-белым фота Соня была выяўленая ў момант, калі яна ставіла талерку перад Ленай Каньковай. І яна — Соня — вельмі здорава ў гэты момант выглядала. Ёй нават пасавалі штодзённая школьная блузка і спаднічка, яе ўпрыгожвалі дзелавітасць і засяроджанасць, якую прамяніў твар. Нават тое, што валасы былі прыбраныя заколкамі са скроняў, не псавала выгляду.

А яшчэ, калі меркаваць з фота, сякія-такія грудзі ў яе былі.

І акурат іх, рэзка павярнуўшы галаву ўбок, уважліва разглядаў Максім.

Соня густа пачырванела.

— Вам здалося. Гэта выпадкова.

— Каб жа! У мяне тут цэлае дасье! — мама Юля пракруціла перад Соняй увесь рэпартаж. Памылкі быць не магло.

— Ну, можа ён за перац злуецца, вось і зіркае, — Соня ліхаманкава шукала рацыянальнае тлумачэнне.

— Анягож, за перац! — рассмяялася мама Юля. — Ты мне вось што лепей раскажы. Я ўжо гадзіну валэндаюся па вашай школе. Нават на другой змене калідоры гудзяць пра бойку... Правільна я зразумела? Ні на якія дзверцы Максім не натыкаўся?

Соня скаўтнула сліну.

— Гэта таму твайго аднакласніка хочуць выключыць са школы? Бо ён ударыў Максіма?

Соня маўчала.

— Калі так, то за што яны біліся? Я правільна зразумела, што гэта неяк звязана з табою? Га, Соня?

Горкі досвед навучыў нашу гераіню: у яе з Максімам усё ляціць у тартарары акурат тады, калі ў справу ўкручваецца ягоная маці. Таму дзяўчына перасмыкнула плячыма і як мага пафігістычней адказала.

— Я не ведаю.

— Ну маніш жа, па твары бачу, — працягвала прагна дапытвацца мама Юля. — Я ж усё адно дакапаюся да праўды.

— Дакапаецеся — раскажыце мне! — адбіла атаку Соня. — Дзякуй за цудоўныя фоткі. Мне пара!

І вылецела з прыбіральні.

x x x

Усяго дзесяць хвілін адсутнічала Соня ў сталоўцы, але па вяртанні яе было не пазнаць. Яе сэрца шалёна калацілася: «Ён глядзіць на мяне! Глядзіць, калі я не бачу! Максім глядзіць на мяне!»

Арызона між тым спявала нейкі драйвовы рок-н-рол з амерыканскіх шасцідзясятых. Такі, што ногі самі танцавалі. Госці, аднак, былі занятыя ежай — на многіх талерках паравалі ўжо ладныя кавалкі стэйка з разнастайным гарнірам.

— Соня, ты дзе ходзіш? Прыбяры посуд са стала, а то яго Дубовік носіць. Ён наносіць!

Прыбраць посуд? Лёгка! Пасля размовы з мамай Юляй у дзяўчыны адкрылася другое дыханне. Між тым Арызона скончыла першае аддзяленне, і вучняў спецкласаў папрасілі расказаць гасцям школы пра сваю вучобу. Калі ў Соні знайшлася хвілінка, каб пастаяць-адпачыць (сядаць афіцыянтам нельга, інача будуць балець ногі — папярэдзіў Вася), акурат прамаўляў Ваня Каланіцкі. Нават на такі важны вечар ён прыйшоў у джынсах і сваім заўсёдным пінжачку з дызайнерскімі латкамі на локцях, накінутым проста на чорную майку. На майцы белым было выведзена $E=mc^2$.

Лена Канькова, якая выглядала як лялька ў белай карункавай сукенцы, дапаўняла блытаны расповед прыспетага знянацку каханага. Зводзіўся ён пераважна да дыфірамбаў настаўнікам фізікі 11 «Б», якіх за сталом аказалася ажно двое. Настаўнікі, у сваю чаргу, праспявалі дыфірамбы вучням.

Ротмістрава, перасеўшы да брытанца, ціха перакладала таму на вуха бэканне Каланіцкага.

Потым слова перайшло да Сонь-эканамічак, але тут, пабачыўшы, што з гарачым скончана і Снежка прыбірае пустыя талеркі, Соня згадала пра дэсерт.

— Калі ласка, Андрэй Васілевіч, крэм-бруле, — сказала яна праз колькі хвілін, паставіўшы перад дырэктарам сподачак.

— Марозіва? — здзівіўся Лабановіч, разглядаючы жоўтую масу, аздобленую фруктамі ды ягадамі. Увесь вечар кіраўнік школы сядзеў як на шпільках, а на падаваныя стравы глядзеў так падазрона, нібы яму прапануюць з'есці жывога васьмінога.

— Крэм-бруле — традыцыйны дэсерт французскай кухні, які, паводле легенды, прыдумалі ў Трыніці-каледжы Кембрыджа, — зашпарыла як па напісанаму Соня. — Гэта жаўткова-вяршковы ванільны крэм. Але наш кухар прыгатаваў яго з малака. Таму ў ім менш калорый.

Каб яна на ўроках так адказвала...

Перад вячэрай Вася прымусіў дзяўчат прачытаць рэцэпты ўсіх страў, прыцягнуўшы з сабой рассыпаны падручнік па кулінарыі, поўны ўставак, упісак і раздрукоўвак. Каб пры неабходнасці дзяўчаты маглі патлумачыць гасцям, што яны, госці, уласна, ядуць.

— Які кваліфікаваны персанал! — азваўся сівы бізнесмен. — Ды і меню — вышэйшае за любыя чаканні!

Брытанец дадаў штосьці па-англійску.

— Містар Конрад пытаецца, у якой фірмы вы замаўлялі банкет, — пераклаў ягоны кампаньён дырэктару. — Канцэрн «Люцэрна» нядаўна ў Мінску, і яны яшчэ не знайшлі добрай службы кейтэрынгу.

Да Сонінага здзіўлення, Лабановіч, азірнуўшыся на кухню, пачаў няўпэўнена мямліць:

— Ну-у-у, э-э-э, мы карыстаемся паслугамі выключна спецыялістаў з добрым досведам. Але вы ведаеце, бюджэт школы...

— Андрэй Васілевіч хацеў сказаць, што спецнавучанне можа быць розным, — раптам загаварыла Маша Ротмістрава, гледзячы на сівога азіята. Яна паспела вярнуцца на сваё месца побач з Максімам. — Напрыклад, у адным з нашых 11-х класаў вучні праходзяць прафпадрыхтоўку, набываюць розныя працоўныя спецыяльнасці. Гэтыя стравы амаль самастойна прыгатаваў школьнік, без пяці хвілін прафесійны кухар.

Пасля гэтага яна пераключылася на англійскую, перакладаючы свае словы брытанцу. За ёй гаварыць пачаў Максім, таксама па-англійску.

— Максім кажа, што навучанне розным прафесіям: краўчыхі, цесляры, кухары, афіцыянткі — нармальная практыка ў школах, напрыклад, Нямеччыны. І што там зусім не ганебна, а нават прэстыжна засвоіць такую прафесію яшчэ школьнікам, каб з дзявятнаццаці гадоў ісці працаваць. Беларуская сітуацыя, калі ўсе, нават самыя няздольныя вучні, імкнуцца трапіць ва ўніверсітэты, бо гэта дыктуе нам грамадства, на ягоную думку, далёкая ад дасканаласці.

Калі Маша прамаўляла гэта, Максім выразна зірнуў на Сінічку, якая расстаўляла крэм-бруле перад міністэрскімі цётухнамі. Гэтым разам Соня сама заўважыла. Зноў хацеў падкалоць яе! Маўляў, ведай свой узровень, дурніца.

— Ну вось, Францаўна, а вы хацелі скасаваць вытворчую практыку ў сярэдняй школе! — гучна захіхікала адна з чыноўніц, штурхаючы суседку локцем.

— На падпісанне дамовы пра шэфства над вашай школай, Андрэй Васілевіч, я падрыхтаваў жарт, маўляў, мы робім гэта толькі дзеля прыгожых вачэй вашых вучаніц, бо адна з іх так нагадвае мне маю родную ўнучку, — на гэтых словах кампаньён містара Конрада злёгку пакланіўся Лене

Каньковай. — Але, Алах сведка, сапраўдная прычына — той цудоўны стэйк з цяляціны, які мы сёння пакаштавалі.

— I agree, the food was incredible! Could we meet this little chef?*— раптам уключыўся ў размову містар Конрад.

Да свайго здзіўлення, Соня зразумела брытанца без перакладу. Невядома, што на яе напала, але яна з усіх ног кінулася на кухню.

Васілеўскі стаяў пры стале, застаўленым сподачкамі з крэм-бруле. Ён пасыпаў дэсерты цукрам і падпальваў іх запалкамі. Гэтыя сподачкі яшчэ зранку запякла ў вялізнай, фарбаванай шэрай алейнай фарбай духоўцы цётка Тоня. Яе нідзе не было — мусіць, замарылася і пайшла дадому. На твары ейнага сына ззяла мірная ўсмешка чалавека, які завяршыў сваю працу і цяпер насалоджваецца яе плёнам. Побач з ім Галя выкладала на закарамелізаваных ужо дэсертах кветачкі з бананавых скрыдлікаў, журавін і лісткоў мяты.

Падбегшы, Соня схапіла Васю за руку.

— Хадзем! Хутчэй! Цябе клічуць!

Не паспеў Вася апамятацца, як яны з Соняй стаялі на выхадзе з кухні. Містар Конрад жвава ўскочыў са свайго крэсла, кінуўшыся да парачкі.

— Nice cook! — выгукнуў ён, паціскаючы хлопцу руку і патрабавальна азіраючыся. Клац! Клац! — законспіраваная мама Юля не прымусіла кліента доўга пазіраваць перад камерай.

— Пяску? Якога пяску? — занепакоіўся Васілеўскі. — Не было там пяску! Скажы яму, гэта французская гарчыца!

— Дурань, ён кажа, што ты выдатна гатуеш! Нават я зразумела! — прашаптала яму на вуха Сінічка.

Потым брытанец хутка залапатаў штосьці, чаго Соня разабраць ужо не здолела. І тут побач з імі вырасла Маша Рот-

* Сапраўды, ежа была неверагоднай! Ці можна пазнаёміцца з гэтым маленькім кухарам? *(англ.)*

містрава, якая стала перакладаць Васілеўскаму такія выкшталцоныя кампліменты, якіх той не чуў ніколі ў жыцці.

Першай, здаецца, запляскала класная кіраўніца 11 «В». Авацыі доўжыліся амаль хвіліну.

— Сініца, шухер такі, нібы мы з табой не з харчаблока, а з загсу выйшлі, — задаволена сказаў Васілеўскі.

Толькі тут Соня заўважыла, што ўсё яшчэ трымае сябра за руку. Яна тут жа адпусціла яе і крадком зірнула на Максіма. Той не пляскаў, а глядзеў проста перад сабою, гуляючыся дэсертнай лыжачкай.

— Крэм-бруле! — схамянулася дзяўчына і кінулася на кухню...

...Арызона, элегантна абхапіўшы рукой мікрафонную стойку, выводзіла несмяротны хіт «Sometimes»; цётухны з міністэрства танцавалі з настаўнікамі фізікі; ціхмяныя матэматыкі, расхрабрыўшыся, клеілі фанабэрыстых Сонь; Соні, у сваю чаргу, клеілі Статкевіча, абступіўшы яго з двух бакоў і патрабуючы загадаць жаданне; Ротмістрава балбатала з брытанцам; Лабановіч назвоньваў камусьці праз мабільны; Канькова і Каланіцкі цалаваліся за шырмай. Святочны вечар імкнуўся да свайго лагічнага заканчэння.

x x x

Толькі пераапрануўшыся ў прыбіральні, Соня адчула, што не адчувае ног. У сэнсе, не адчула ног. У сэнсе... Думкі таксама запляталіся. Стома была капітальная. Яна да апошняга мыла посуд, дапамагаючы Васілеўскаму, калі ўсе астатнія разбегліся па дамах. Той яшчэ заставаўся ў кухні, дамываючы бляхі, а яе амаль сілком пагнаў дадому. У пакеце яна несла балеткі, наскрозь мокрую блузку і запырсканую спадніцу. Трэба было хвартух узяць. У чым яна заўтра ў школу пойдзе?.. Можа, хворай прыкінуцца?.. Ці тут ужо мама Юля?..

Як і было дамоўлена, яна за паўгадзіны да выхаду набрала на мабілцы маму Юлю, каб тая па яе прыехала. Але пакуль Соня спусцілася ў вестыбюль, часу прайшло крыху болей за паўгадзіны. Блізілася адзінаццатая вечара.

— Давай хутчэй, а то там цябе кавалер зачакаўся, — сказаў начны вартаўнік, адрываючыся ад крыжаванкі і ківаючы на акно, за якім сыпаў лёгкі сняжок.

— Каго, мяне? — разявіла рот Соня.

— Ну не мяне ж, — рассмяяўся вартаўнік. — Топчацца тут, топчацца. Дарожку ажно вытаптаў — падмятаць не трэба.

Соня выбегла на ганак. Перад прыступкамі каля калоны яна пабачыла высокую постаць Максіма.

— Чаго спазняешся? — буркнуў ён, вымаючы з вушэй слухаўкі ад плэера. — Я тут ужо дзесяць хвілін тырчу. А зараз, калі ты заўважыла, не май месяц!

— Ты?.. А... дзе мама Юля? — толькі і выціснула з сябе Соня.

— Мама вельмі занятая тэрміновай апрацоўкай фотасесіі кактусаў, якія сёння расцвілі ў ейнай спальні, — казаў Максім кіслым голасам, шморгнуўшы пры гэтым носам.

— Праўда? Трэба будзе зірнуць на тыя кактусы, — па-змоўніцку захіхікала Соня.

— Я зараз скапычуся ад холаду. Ты ідзеш дадому ці як?

— Пешкі?!!

— Не, знаеш, паедзем у таксо.

— Праз лес?

— А якія яшчэ варыянты?

— Дык позна ж. А раптам маньяк?

— Сінічка, пасля таго, што я сёння бачыў, я табе кампетэнтна заяўляю: ніякі маньяк на цябе не паквапіцца. Хадзем.

Максім заткнуў вушы слухаўкамі, засунуў рукі без пальчатак у кішэні шэрага паліто і пашыбаваў па свежым снезе.

Асуджана ўздыхнуўшы, Соня паспяшалася за Максімам.

x x x

Вася аддзёр бляху так, што бачыў у ёй свой адбітак. Апошні раз пасудзіна выглядала гэтак шыкоўна хіба што ў дзень, калі яе вырабілі. Гэта было адзінае, што заставалася сёння зрабіць, і Вася ніяк не мог спыніцца, нібы яго завялі — і завод усё ніяк не скончыцца.

— Капітан пакідае карабель апошнім, — пачуў ён за спінай.

У дзвярах кухні стаяў Лабановіч.

— Гэта вы пра сябе? — стомлена ўсміхнуўся Васілеўскі.

— Гэта як паглядзець, — усміхнуўся ў адказ дырэктар. — Я табе прынёс сёе-тое, — ён працягнуў хлопцу жаўтаваты аркуш, заляпаны атрамантам.

— Трымай. Заява тваёй маці.

— У мяне рукі мокрыя...

— Ну вось аб яе і вытры... Давучвайся, Аляксей. Вядома ж, давучвайся. Толькі без свавольства.

— Вунь там у шафцы файлік з фактурамі за харчы, — кіўнуў галавой Васілеўскі. — Паклаў, каб не запэцкаліся. Забярыце, калі трэба.

— Дзякуй табе, хлопча. За ўсё дзякуй.

— Калі ласка. Звяртайцеся.

— Частку грошай мне, дарэчы, ужо вярнулі. Ёсць надзея, што справу мы залагодзім.

— Здарава, віншую.

— Ты сам тут зачыніш ці мне застацца?

— Ідзіце. Я сам.

...Пачакаўшы, пакуль дырэктар адыдзецца ад сталоўкі, Вася адкрыў цяжкую фрамугу, пасля чаго запарыў кавы і запаліў першую за дзень цыгарэту. Снег сыпануў у падвальнае акенца, прыемна апякаючы гарачы твар. На двары чуваць былі чыесьці імклівыя крокі...

x x x

Як ставіцца да хлопца, які цэлы вечар абзывае цябе прасавальнай дошкай, але пры гэтым чакае на марозе, каб праводзіць дадому? Калі звяртаць увагу не на тое, што кажа мужчына, а на тое, што ён робіць... Так ці іначай, Соня вырашыла перастаць сварыцца са Статкевічам. Яна прыспешыла хаду і, дагнаўшы хлопца каля ўзлеску, кранула яго за рукаво шэрага палітона. Максім абярнуўся і зняў з вуха слухаўку.

— Я хацела сказаць, што ты здорава сёння трымаўся, — пачала Сінічка. — размаўляў з гэтымі бізнесоўцамі на роўных і на такія тэмы... Ведаеш, нават гонар адчуваеш за школу: да нас прыязджае сапраўдны джэнтльмен, такі, як гэты містар Конрад, а мы можам годна сустрэць яго.

— Джэнтльмен, — рассмяяўся Статкевіч. — Як лёгка, выяўляецца, пусціць людзям пыл у вочы, — фанфарон гэты містар Конрад, а не джэнтльмен.

— Уладальнік такога буйнога канцэрна?

— Ха! Уладальнік! Усяго толькі гендырэктар. Дый тое ліпавы. Уладальнік сядзеў побач з ім.

— Хто, гэты мілы дзядуля?

— Мілага дзядулю, Сінічка, завуць Рустэм Касімаў. Гэтае імя кажа табе што-небудзь?

— Не-а, — бесклапотна адказала Соня, дыхаючы ў шалік. Бралася на мароз.

— Ну, вядома ж. Пра Касімавых жа ў «Гламуры» не пішуць. А «Форбс» ты яўна не чытаеш. Гэты «мілы дзядуля» — адзін з самых уплывовых алігархаў Татарстана. І, магчыма, усёй Расіі.

— Мільянер? — ахнула Соня.

— Мільярдэр, я думаю.

Соні паблажэла ад думкі, што яна сёння дачынялася з жывым мільярдэрам.

— Вопраткай статус дэманструюць толькі плебеі, — рассмяяўся Статкевіч, калі Соня паспрабавала выказаць сумневы што да някідкага прыкіду дзядка-алігарха. — Ты на гадзіннік ягоны звярнула ўвагу?

— І што такі чалавек забыў у нашай школе? — здзівілася Соня.

— Паесці прыйшоў. На дзяўчатак пазіркаць... Цікава іншае. Што такі чалавек забыў у Беларусі. Па ходу, «Люцэрна» цяпер — брытанскі канцэрн з расійскім капіталам... Трэба тату расказаць. Яго гэта заінтрыгуе.

— А ты таксама сёння нішто сабе трымалася, — зноў загаварыў Максім пасля працяглай паўзы, калі было чуваць толькі рыпенне снегу пад нагамі. — Ніводнай талеркі не раскалаціла. І не спатыкнулася ні разу. Вельмі для цябе нязвыкла.

— Дык я ж дачка рэстаратара! — абурылася Соня. — Я часта тату на працы дапамагаю!

— Так трымаць! — бадзёра сказаў Максім. — Здаецца, ты знайшла сваё пакліканне. Толькі да пліты не падыходзь.

— Не, афіцыянткай я дакладна не буду!

— А што тут такога? Праца як праца.

— Я буду паступаць у лінгвістычны, — раптам вырвалася ў Соні.

Максім спыніўся ад нечаканасці.

— Ты? У лінгвістычны? Ну не. Я на такое не падпісваўся.

— А ты тут пры чым?

— Як гэта пры чым? «Мой выбар звязаны з тым, кім хоча стаць чалавек, якога я кахаю, — зашпарыў Статкевіч па-англійску. — Мой выбар — працаваць побач з ім і дапамагаць яму, што б ён ні рабіў у жыцці. Калі ён захоча стаць лётчыкам, я стану сцюардэсай...»

— Што-о-о? Ты чытаў мае топікі? Як ты пасмеў?

— Не трэба сшыткі па доме раскідваць. «Калі ён стане хірургам, я стану медсястрой...»

— Нафіг ты гэта вывучыў?

— Я не вінаваты, што ў мяне фатаграфічная памяць! «Калі ён захоча стаць настаўнікам англійскай мовы, я таксама стану настаўніцай, і мы разам адкрыем дзецям акно ў свет». «Акно ў свет»... Сінічка, дзе ты набралася такіх штампаў? Дарэчы, перад «world» артыкль трэба... Не, настаўнікам я дакладна быць не хачу.

— Гэта не пра цябе, ясна? Гэта выдумка. Мастацкая! Мяне, між іншага, настаўніца пахваліла, бо я ўжыла ў тэме дафіга прафесій!

— Ага, не пра мяне! Залівай болей! «Калі ён стане дырэктарам фірмы, я стану яго сакратаркай...» Сінічка, дваццаць першае стагоддзе на двары! Для каго ўвогуле фемінізм прыдумалі, эмансіпацыю? Што за адстой — завязваць сваё жыццё на каханні? «Калі ён будзе прафесійным тэнісістам, я зраблюся менеджарам тэніснага клуба...»

— А ну, замаўчы! Хопіць! — шпурнуўшы свой пакецік на зямлю, Соня пачала лупіць Максіма рукавічкамі ў грудзі. Той схапіў яе за плечы, спрабуючы трымаць падалей ад сябе. Цёплая воўна глуха бухала па тканіне палітона: гэта было падобна да бокса рознакаліберных плюшавых мядзведзікаў.

— «Галоўнае — быць побач кожную хвіліну. Я лічу, што гэта — маё пакліканне».

— Перастань! Перастань!

Раптам нейкая сіла адштурхнула Соню ад Статкевіча. Яна паваліласе ў сумёт. Незнаёмы хлопец збіў Максіма з ног ударам кулака і цяпер прыціскаў рукамі да зямлі.

Калі б Сінічку папрасілі апісаць маньяка, які нападае на дзяўчат у цёмным лесе, яна б уявіла сабе менавіта гэтага незнаёмца. Невысокі, каржакаваты дзяцюк у чорных нагавіцах, чорнай куртцы, чорных ботах і чорнай шапачцы — карацей, ува ўсім чорным. Змрочны вобраз, што праўда, разбураў пацешны бульдог, які з брэхам мітусіўся ля ног гаспадара. Бульдог, дарэчы, быў абсалютна белы.

— Кляты амерыкос! Панаехаў тут нашых дзевак лапаць! Гэй, малая! Звані 102! — павярнуўся ён да Соні.

— Адпусціце яго! — заплакала Соня. — Вы не так усё зразумелі. Не амерыканец ён. Ён наш, беларус. Мы проста... Проста акторы! Мы з рэпетыцыі вяртаемся. П'есу ставім. Шэкспір... «Малілася ты нанач, Дэздэмона...»

— Што, праўда, акторы? — спытаўся хлопец у Статкевіча.

Той актыўна заківаў:

— Ага. Акторы. Англійскага драмгуртка імя Джоні Дэпа.

Хлопец з яўнай неахвотай адпусціў Максіма.

— Ну даруй, братан. Не зразумеў. Дакладна ўсё ў парадку? — перапытаўся ён у Соні. — А то 102, патруль... Закрыюць.

— Усё ў парадку, дзякуй за пільнасць, вы ідзіце, ідзіце! — замахала рукамі Сінічка.

— Арнольд, фу! — скамандаваў сабачнік бульдогу, які працягваў люта брахаць на Статкевіча, і пайшоў у бок шматпаверхоўкі, што свяціўся вокнамі на ўзлеску.

Як толькі хлопец у чорным і яго ўлюбёнец зніклі за дрэвамі, Соня кінулася да Максіма. На твары хлопца, пад правым ужо вокам, расплываўся новы салідны гузак. Касметыка паспела змыцца з Максімавага твару, і цяпер у яго былі рознакаляровыя шчокі — адна ліловая, другая — барвова-чырвоная.

— Халоднае трэба прыкласці, — сказала дзяўчына, пасля чаго зляпіла снежку і прыціснула яе да свежага гузака. Так яны сядзелі з паўхвіліны.

Першым не вытрымаў Максім. Ён пырснуў смехам — і тут жа скрывіўся ад болю. Так ён і рагатаў — пацешна крывячы твар. Гледзячы на яго, разрагаталася і Соня.

— Шэкспір, Дэздэмона... Ну ты даеш, Сінічка! Акторы! Ой, не магу!

— А ты — амерыканскі маньяк! Я зараз памру. Га-а-а-а! Так табе і трэба!

— Сінічка, я не магу зразумець, за што ты звалілася на маю галаву. За шаснаццаць гадоў майго жыцця, ой, не магу... Мяне ні разу не білі, га-га-га. Ні-ра-зу! Я жыў у міры і спакоі! І вось мне за два дні на роўным месцы пасадзілі два ліхтары пад вочы. І кожнага разу па тваёй, Сінічка, міласці!

Соня смяялася, седзячы на каленях перад Максімам і нават не адчувала холаду. Максім смяяўся, трымаючыся за жывот і ўпаўшы спінай на снег, а па яго расквечаным твары цяклі слёзы. Ён выціраў іх шурпатымі ад марозу касцяшкамі і смяяўся. Упершыню за ўсю нашу гісторыю смяяўся не толькі з Соні, але і разам з ёю.

## Раздзел VII

# КЎО ВАДЗІК?

Яны ляжалі ў гурбах снегу, раскінуўшы рукі. Дыхалі спакойна і мерна, як лыжнікі, якія аднавіліся пасля фінішу. Але раптам нібы зарад току працяў Соніну руку, якой чамусьці было зусім не халодна без рукавічкі. Максім паволі, але ўпэўнена загарнуў яе мокрыя ад снегу пальцы сваімі. Потым асцярожна перакуліўся і, прыўзняўшыся, укленчыў над ёю, уважліва разглядаючы ейны твар. Соня адчула, як пад ягоным праніклівым поглядам чырванеюць шчокі і сушэюць вусны.

— Ты вельмі прыгожая, — сказаў хлопец спакойным, але пяшчотным голасам.

Ён стаў нахіляцца да яе, але іх вусны так і не сустрэліся, бо Соня ўсё глыбей правальвалася ў сумёт, які чамусьці быў гарачым і вогкім…

x x x

Соня прачнулася ў сваім пакойчыку мокрая ад поту. Уф-ф-ф. Ізноў прыснілася. Ну іназольны сон, не дае спакою, паўтараецца з невялікімі варыяцыямі з таго часу, як Максім праводзіў яе праз казачны лес пасля банкету ў школе. А гэта ж больш за месяц прайшло. Піжама набрыняла — Соня

з агідай правяла рукой па шыі і скаланулася. Трэба было ўсё-ткі падкруціць батарэі на ноч. Або спаць без адзежы. За столькі часу ў новым доме яна так адвыкла ад шчодрага ацяплення, якое сама ж і ўрубіла, што ў залішне цёплым пакоі пачувалася няўтульна.

Сягнула рукой мабільніка. Дзявятая раніцы, дваццаць восьмага сакавіка. Які ўсё-ткі цуд — вакацыі. Не трэба ставіць будзільнік, спі дасхочу.

А яшчэ — заўтра дзень народзінаў.

Ад гэтай думкі і без таго добры настрой набыў лёгкае адценне эйфарыі. Соня стала на падлогу і з задавальненнем адчула ступакамі правады, што звіваліся на падлозе, як змейкі вакол ног літоўскай багіні. Цяпер яна была не проста Соня, а Соня Каралева Гаджэтаў.

Першым провадам было сілкаванне ад ужо знаёмага нам лэптопа — ён падладоўваўся тут жа, на падлозе, — на ноч дзяўчына запхнула яго пад крэсла, каб выпадкова не наступіць.

Другім провадам — ён вытыркаўся побач з першым на падаўжальніку, які, у сваю чаргу, поўз да разеткі за ложкам, — была зарадка ад новага смартфона, падарунка таты. Нічога сабе татка расшчодрыўся — Новы год, Восьмае сакавіка… Соні яшчэ ніколі не рабілі запар такіх збыткоўных пакупак. Цяпер у яе дзень і ноч быў нармальны інтэрнэт, у які можна было посціць нармальнай якасці фоткі, калі ёй заманецца. Цяпер з Галяй і Снежкай можна было дапазна вісець у чаціку, а не трындзець праз тэлефон.

Але галоўнае, ад USB-партала кампа з-пад крэсла на ложак уздымаўся трэці провад. На іншым яго канцы, каля падушкі, спачывала электронная кніга.

«Кіндл» ёй пазычыў Максім.

Кінуўшы вока на аскетычны чорны простакутнік, які адразу нагадаў пра свайго гаспадара, Соня ўсміхнулася хітраватай усмешкай. У кутках гэтай усмешкі ўважлівы

назіральнік, апыніся ён у гэтую хвіліну ў пакоі, згледзеў бы мройную надзею на ўзаемнасць, якая апошнім часам пасялілася ў Сінічцы.

Надзею? З якога гэта перапуду?

Спакойна, дарагія чытачы. Як кажуць у казках, хутка гаворыцца, ды паціху робіцца.

x x x

Можна дакладна назваць той вечар, калі ўсё раптам змянілася, — Соня памятае яго ў найдрабнейшых дэталях.

Гэта было два тыдні таму, у сярэдзіне сакавіка. Соня страшна стамілася ў школе і не выходзіла з пакоя, спрабуючы рыхтавацца да рэпетыцыйнага НЦТ — тэсты па рускай і англійскай мовах яна мелася здаваць у першыя дні вакацый. Раптам на новенькім сматфоне высвеціўся збянтэжаны татаў фэйс — ён чамусьці разгубіўся ў момант, калі яна фоткала яго для застаўкі.

— Спусціся праз пяць хвілінак, я вязу харчы, — папярэдзіў ён у слухаўку.

Дзяўчына ўздыхнула і стала шукаць, чым замяніць піжаму, у якую залезла яшчэ з абеду. Выбрала чырвоную вязаную сукенку з барскага пляча мамы Юлі — не так даўно тая перабірала шафы. Ісці ўніз не хацелася, але трэба было хуценька адбыць паншчыну і вярнуцца наверх паглядзець якую кіношку — вучоба дастала канчаткова.

Пётр Сінічка прыкладна раз на месяц падвозіў, закупляючы ў гуртоўні прыпасы для агульнай гаспадаркі. Сокі, крупы, макароны, мяса ў маразілку. Трэба было распіхаць усё гэта па кухні: тата толькі разгрузіцца — і на працу. Соня спусцілася на першы паверх, дзе гулялі ў шахматы браты Статкевічы. Мама Юля пайшла ў оперу з сяброўкай — па вітальні яшчэ разносіўся водар яе далікатнай парфумы. Тата Віця быў за мяжой.

— Сядзі, я сам, — сказаў Максім, калі яна пачала абувацца, каб ісці да машыны.

Праз пяць хвілін ён зацягнуў на кухню апошнюю скрыню. Даўшы зразумець, што мужчынская праца скончаная, а таму час ужыць жаночую дробную маторыку, Максім вярнуўся да шахматнай дошкі, дзе патрабаваў увагі настырны Вадзік.

Соня пачала млява разбіраць харчы, мімаволі прыслухоўваючыся да таго, што адбывалася па той бок барнай стойкі, ля тэлевізара. Максім быў строгім, але цярплівым братам. Гуляў з малым на роўных, але ў той жа час навучаючы. Мог вярнуць фігуру саперніка назад, калі лічыў, што той пахадзіў неразумна.

— Кўо Вадзік? — раптам ускрыкнуў Максім, калі Соня адкрыла маразілку, каб скласці туды латочкі з фаршам. — Я ж з’ядаю тваю ладдзю!

Ад нечаканасці дзяўчына рассмяялася. Ды так звонка і весела, што па той бок барнай стойкі перасталі размаўляць.

— Ты чаго там? — зазірнуў за калону Максім. — Здурэла?

— Ну, проста смешна. Кўо Вадзік і «Quo vadis» — «Куды ідзеш».

— Ну, я, дапусцім, у курсе. А вось адкуль гэта ведаеш ты?

Тут ужо і малы Вадзік вытыркнуў свой цікаўны носік над барнай стойкай, ускараскаўшыся з нагамі на канапу.

— Гэта раман Генрыка Сянкевіча, — чамусьці пачала апраўдвацца Соня. — Мне неяк далі «Крыжакоў». Вельмі спадабалася. І тады я прачытала ўсё гэтага аўтара.

Гэтае тлумачэнне мела эфект разарванай бомбы.

— Не смей смяяцца! Гэта наш сямейны жарт! — урэшце прамовіў Максім, апамятаўшыся, а Вадзік каторы раз прадэманстраваў Соні, які доўгі мае язык.

Соня паціснула плячыма і вярнулася да лядоўні.

x x x

Хіба я не згадвала, дарагія чытачы, што Соня была не зусім нармальным падлеткам? Ну, у тым сэнсе, што (як і вы, спадзяюся) любіла кнігі? Няўжо не згадвала? Значыць, да слова не прыйшлося. Пагатоў сама мая гераіня гэтую сваю слабасць ад людзей надзейна хавала.

Адзін з самых ранніх Соніных успамінаў — тата трымае яе на каленях, паказвае літары, пішучы іх у альбоме фламастарам. «Кінь дурное! Яна малая зусім яшчэ!» — смяецца мама. Соня таксама смяецца і запамінае: М-А-М-А. Т-А-Т-А. С-О-Н-R... Не — усё-ткі Я. То бок — я, Соня.

Потым Соня пасялілася з бабуляй. Калі яна плакала, просячыся да мамы, бабуля, каб супакоіць малую, чытала казкі. Соні было чатыры з паловай, яна ўжо ўмела разбіраць словы па складах, але бабулі сябе не выдавала. Баялася: калі тая зразумее, што Соня можа сама, перастане чытаць ёй перад сном. Але заўсёды зазірала бабулі цераз плячо. Тая думала, карцінкі дзяўчо разглядае.

Аднойчы, калі Соні было восем, бабулю звезлі ў бальніцу. Дадому яна больш не вярнулася. Соня, якая сама выклікала хуткую, пазваніла яшчэ і тату. І сядзела да вечара на канапе каля няскончанага бабуляй вязання, гартаючы «Казкі братоў Грым», пакуль бацька, збялелы, не прыляцеў у бабуліну кватэру. Было страшна. Страшныя ў братоў Грым казкі.

У той жа вечар тата забраў Соню ў маласямейны інтэрнат, дзе жыў. Бабулю дзяўчынка пабачыла толькі на пахаванні. Яна ўжо збольшага ведала пра смерць. Пра гэта пішуць у дзіцячых кніжках. На могілках яна рыдала рыдма. «Якая жаласлівая ўнучка ў Фёдараўны», — уздыхалі суседзі з пад’езда. Але Соня плакала па дваіх — і па маме таксама. Цьмяна згадвала першую труну — і рыдала, бо нарэшце перастала адмаўляць, што мама сапраўды не жыве і, апроч таты, у яе больш нікога няма.

— Што мне рабіць? — пыталася Соня ў бацькі, калі той, прывёзшы яе з прадоўжанкі (ён часта спазняўся, і настаўніца злавалася), заводзіў яе ў пакойчык і, хапатліва прыгатаваўшы вячэру, уцякаў у рэстаран.

— Ну ты гэта… З дзеткамі пагуляй… Пачытай штонебудзь.

Потым тата прыдумаў лялечны дамок. Тэлевізара без яго ўключаць не дазваляў і нават штосьці там падкручваў, каб сама не направіла. З дзяцей, блізкіх ёй узростам, у інтэрнаце былі толькі два васьмігадовыя хлопчыкі з трэцяга паверха. Гуляць з імі было нецікава, да таго ж яны ўвесь час біліся. Таму Соня чытала.

Старыя кніжкі — іх у дзвюх скрынках прывезлі ў інтэрнат сваякі, якія ўспадчынілі бабуліну кватэру, — Соня перачытала тройчы і занудзілася. Часам кнігі купляў тата, але з «нармальных» — тоўстых кніжак — Соня мела толькі «Гары Потэра». Астатняе тата зрэдку — калі меў час заскочыць у кнігарню — набываў на свой розум і густ. Яны хутка канчаліся, і Соня зноў нудзілася. Ледзьве перажыла лета пасля чацвёртага класа — увесь «Гары Потэр» быў вывучаны на памяць і канчаткова абрыд.

У пятым класе Соня здагадалася браць кнігі ў школьнай бібліятэцы.

Спачатку яна не рабіла са свайго занятку таямніцы. Нават магла адстаць ад аднакласніц і, несучыся па калідоры, кінуць: «Я ў бібліятэку!» Але аднойчы здарылася страшная прыкрасць. Бібліятэкарка параіла ёй кнігу аб прыгодах Солнышкіна — вельмі смешную і захапляльную. Соня разгарнула яе на перапынку, прачытала першую старонку — і ўжо не змагла адарвацца. Чытала на матэматыцы, трымаючы пад сшыткам. Ужо тады яна сядзела за апошняй партай.

На перапынку яна радасна адсунула сшытак, мяркуючы атрымаць асалоду ад дзесяці хвілін легітымнага чытання. І тут да яе падляцеў Славік Шыла.

— Рэбза, зырце, што яна робіць! Яна чы-та-е!!! — зароў Славік. — Сінічка-батанічка! Перад русіцай выпендрыцца вырашыла? Самая вумная?!

І пад гігіканне хлопцаў ды спужанае (а сям-там і злацешнае) маўчанне дзяўчат Славік вырваў у Сінічкі бібліятэчную кніжку і пачаў гуляцца ў «сабачку Соню». Так яе дражнілі ў школе — з усіх Сонь у паралелі яна была самая маленькая. «Аддайце!» — крычала яна, пацешна падскокваючы і спрабуючы перапыніць імклівы палёт «Солнышкіна».

Урэшце кніга асела на падлозе: вокладка ў адным куце класа, старонкі — у іншым, каля сметніцы.

Бібліятэкарка страшна аблаяла Соню за сапсаваную кнігу і нават выпісала штраф. Але самым жахлівым было не гэта. Было крыўдна, што гэтыя подзеўбні дражнілі яе батанічкай і рагаталі. Быць пасмешышчам Соня вельмі баялася. Ёй і так каштавала вялікіх высілкаў выглядаць, як усе: апранацца і прычэсвацца, як іншыя дзяўчаты, якім валасы запляталі мамы, а не сонны пасля паўночнай працы бацька.

З таго дня Соня дала сабе слова ніколі не чытаць у школе і ўвогуле ўдаваць з сябе форменнага Нязнайку на Месяцы (прачытана чатыры разы ў другім класе), якому кнігі рукі пякуць. І нават на ўроках літаратуры часам прыкідвалася, што не ведае зместу, атрымліваючы васьмёркі і сямёркі, — для праўдападобнасці. «Ты што, адкуль я ведаю, я ж па кароткім чытала», — магла зухавата кінуць яна сваім «дэшкам» пра якія-небудзь «Каласы пад сярпом…» Караткевіча, хоць насамрэч праглынула таўсценную кнігу за пару дзён і начэй.

Тады на кухні, каля маразілкі, Соня ўпершыню за шмат гадоў сябе выдала. І з непрывычкі спужалася.

x x x

Падпольнае Сонінa чытанне доўжылася ўвесь пяты клас, і яна яшчэ выпрасіла ў бібліятэцы некалькі кніжак на лета.

Лётала на Цнянку з аднакласніцамі, гойсала па лесе, як усе нармальныя дзеці, але калі тата браў яе ў «Пана Сцяпана» ці з сябрамі на рыбалку, цягнула з сабой кнігі і чытала ў падсобцы рэстарацыі, на беразе возера ці ў намёце. Чытала, расцягваючы прыемнасць. Здаецца, гэта былі кнігі пра Смарагдавы горад.

— Якая разумная, — дзівіліся афіцыянткі або татавы сябрукі-рыбакі.

— Ага, разумная, — уздыхаў тата. — Толькі штосьці розум на адзнаках не адбіваецца.

А чаго яму адбівацца? Соня і ўявіць не магла, як веда пра драўляных жаўнераў і сем падземных каралёў можа спатрэбіцца на ўроках.

У шостым класе, аднак, пачаліся непрыемныя сюрпрызы. Змянілася бібліятэкарка — ранейшая сышла на пенсію. Цяпер за стойкай працавала маладая дзяўчына, якая Соню адразу не залюбіла. Папярэдняя бібліятэкарка пасля інцыдэнту з Солнышкіным напісала Соні ў абанеменце за пяты клас: «Пільна правяраць пасля яе кнігі», — і новая працаўніца, калі Соня здавала прачытанае, ладзіла татальны кантроль, чапляючыся да кожнага загібу старонкі. А ў сярэдзіне другой чвэрці раптам заявіла, што кніжак для Соні больш няма.

— Як гэта? — не зразумела Соня.

— Кнігі ідуць па гадах. Рэкамендуюцца для пэўнага школьнага веку. Ты прачытала ўжо ўсё, што ў нас ёсць для шостага класа.

— Дык дайце мне за сёмы, — папрасіла дзяўчынка.

— Табе яшчэ рана. Не рэкамендуецца, — адрэзала бібліятэкарка.

З таго часу Соня стала здабываць чытанкі дзе давядзецца. Прыходзіла дадому, абедала, левай пяткай рабіла дамашку, а потым выпраўлялася ў абход па даўжэзным калідоры. Зазірала да суседзяў з інтэрната, якія днём былі дома. Увечары, калі ўсе жыхары вярталіся з працы, у вузкіх пакоях было

і сваім не прапхнуцца. Удзень жа гаспадыні, шкадуючы сіротку, дазвалялі ёй пасядзець з імі. Соня забіралася ў фатэлі, з цяжкасцю ўвапхнутыя паміж сталамі, ложкамі і камодамі, і яе частавалі чым-небудзь смачным і смажаным: аладкамі з сочывам ці бананамі ў цесце, салодкі пах якіх, перамяшаны з ёлкім смуродам алею, разносіўся па ўсім паверсе — каб не хадзіць на агульную кухню, электраплíткі ставілі проста ў пакоях. Глядзела тэлевізар з гаспадынямі — серыялы або тэлешоу, якія потым з імі, як умела, абмяркоўвала.

У суседскіх катушках Соня аглядалася і неўпрыкмет абмацвала вокам кніжныя паліцы, калі яны былі. Папрасіць кнігі ўголас яна не наважвалася. Зрэшты, кніг амаль ні ў кога не вадзілася. А калі кнігі і вадзіліся, то былі спрэс непрывабныя: шэрыя, бурыя, пажоўклыя і яўна без карцінак. У Веры Аркадзеўны яна пацíху гартала часопіс «Ліза»; цётка Каця аднойчы пазычыла амерыканскі дэтэктыў. Соня пачала чытаць, але адразу занудзілася.

Сапраўдным «кландайкам» выявіўся пакойчык цёткі Ані, якая акурат тады сядзела з двухгадовым Дзяніскам. Тая сама часта запрашала Соню да сябе, пакідаючы на гадзінку-другую з малым, пакуль хадзіла ў краму ці цырульню. За паслугу яна расплачвалася раманамі на шэрай паперы з зыркімі мяккімі вокладкамі. Раманы стосікамі ляжалі пад Дзяніскіным ложкам.

— Вельмі добрая кніжка, можаш не вяртаць, — казала цётка Аня, выцягнуўшы чарговы «пэйпэрбэк» і абцёршы яго ад пылу аб ружовы махровы халацік.

Гэта былі неверагодныя кнігі пра Каханне, якія адкрылі нашай гераіні свет Сапраўдных Пачуццяў і Неўтаймоўнай Жарсці.

Нічога падобнага раней Соня не чытала. Толькі ў кіно бачыла, але хіба можна было параўнаць фільмы з тым буяннем фантазіі, якім вылучалася Барбара Картлэнд або Джаўгэна Ліндзі? Гераіні іхніх кніг запраўлялі карпарацыямі, былі

спадчынніцамі вялізных маёнткаў або наадварот — беднымі дзяўчатамі без роду-племені. Але кожнай з іх — без выключэння кожнай — трапляўся персанальны прынц на белым кані, «кадылаку» ці аэраплане. У найгоршым выпадку — баварскі герцаг або просты амерыканскі мільярдэр, які бліжэй да апошніх старонак абавязкова нёс Яе на руках да алтара. Або прынамсі дэклараваў такі намер.

Было ў кнігах і тое, што надзвычай Соню бянтэжыла, хоць і прымушала ейныя шчокі гарэць, сэрца — калаціцца, а жывот — трымцець нейкім незнаёмым трымценнем. Гэта былі сцэны, якія нязменна мелі месца на сотай старонцы, а потым паўтараліся прыкладна на сто васьмідзясятай. Соня, вядома ж, бачыла такое ў тэлевізары — калі тата не паспяваў учасна шчоўкнуць пультам, але толькі ў кнігах пісалася, што адчувала ў такія моманты гераіня.

Соня стала задаваць пытанні цётцы Ані. Тая, відаць, прысаромленая непедагагічнасцю таго, што нарабіла, сказала: «Соня, няхай табе ма...» — але тут жа асеклася, сабралася з думкамі і прамовіла даволі доўгі ды заблытаны маналог. У ім яна спачатку на прыкладзе сабачак і котачак, а потым — сябе і дзядзькі Жэні патлумачыла, што і навошта адбываецца на сотай старонцы, аргументуючы неабходнасць усяго там апісанага існаваннем малога Дзяніскі.

Соня, аднак, спакойна зазначыла, што ўжо не такая маленькая і ведае, адкуль бяруцца дзеці. Пагатоў у раманах падобныя наступствы сотай старонкі таксама апісваліся — часам жаданыя, часам не, але ёй вядзецца зусім не пра гэта. Ёй цікава, ці сапраўды жанчына можа адчуваць такое? Цётка Аня пачырванела, сказала, што гэта вельмі складана патлумачыць, і больш кніжак Соні не давала. А той ужо і не вельмі карцела — усе кнігі цёткі Ані былі падобныя адна да адной, толькі імёны герояў мяняліся, і яшчэ эпохі, гарады і краіны, а гісторыі кахання былі як пад капірку пісаныя. Апошнія асобнікі Соня, не ўчытваючыся, адразу спрактыка-

вана разгортвала на сотай старонцы. Але і гэта ёй урэшце надакучыла.

І вось аднойчы, калі Вера Аркадзеўна выйшла на калідор, Соня, дажаваўшы перасмажаны сырнік, адважылася залезці з нагамі на канапу, каб зблізку разгледзець ейную паліцу з шэра-бурымі кнігамі, разабраць хоць бы назвы на карэньчыках. Кніжкі былі спрэс старыя, яшчэ савецкія. Гайдара Соня ўжо чытала — прывітанне школьнай бібліятэцы, — а астатнія яе не зацікавілі. Калі Вера Аркадзеўна вярнулася, дзяўчынка спалохана адскочыла. «Прабачце, калі ласка», — зашаптала яна. Але Вера Аркадзеўна не раззлавалася.

— Э-э, мая дзяўчыначка. Дык гэта ж табе да Надзенькі трэба, — паківала галавой пенсіянерка і, узяўшы за руку, адвезла на ліфце на сёмы паверх інтэрната.

Так у Соні з'явіўся новы таемны сябар. Чаму таемны? А хіба можна камусьці расказаць, што ты сябруеш са старой цёткай?

x x x

Надзея Барысаўна была нізенькай таўставатай кабетай гадоў шасцідзесяці. Яна насіла тоўстыя акуляры, а ахайнае карэ асвятляла да саламянага колеру. Твар у яе быў лагодны і летуценны, ад чаго яна была падобная да маршчыністай дзяўчынкі, якую замкнулі ў пакойчыку і не выпускаюць гуляць, таму яна паціху ссыхаецца ад нястачы кіслароду.

— Вось, Надзя, чытачку табе прывяла. Выдай ёй штонебудзь на абанемент, — адрэкамендавала Соню Вера Аркадзеўна і сышла.

Пераступіўшы парог Надзеі Барысаўны, Соня абамлела. Са звычайнай, чалавечай мэблі ў пакойчыку-пенальчыку былі толькі канапа пад акном, столік перад ёй, венскае крэсла і лядоўня ў куце пры ўваходзе. Усю іншую прастору скрадалі дзве масіўныя савецкія сценкі, да столі набітаваныя

кнігамі. Каб зручней было да іх дабірацца, з шаф паскручвалі дзверцы. Толькі знізу сценкі былі закрытыя паліраванымі фасадамі, там захоўваліся іншыя — бездухоўныя — рэчы, але, як пазней пераканалася Соня, гаспадыня дзівоснага пакоя складала кнігі і туды таксама.

Надзея Барысаўна калісьці даўно была бібліятэкаркай пры Доме творчасці завода, дзе працаваў ейны муж, дзесяць гадоў як нябожчык. Калі, скарачаючы прадпрыемства, бібліятэку зліквідавалі, Надзея Барысаўна самаахвярна перацягнула дадому спісаныя кніжкі.

— Тут сканцэнтраваная вечнасць. Класіка на ўсе часы, — узнёсла сказала яна, праводзячы рукой па паліцах.

Вось тут для Соні пачалася сапраўдная чытанка. Жуль Верн — усё тое, чаго не давалі ў школе. Абодва Дзюма — бацька і сын. Праклятыя каралі. Марк Твэн, аказваецца, напісаў не толькі Тома Соера. Майн Рыд. Эдгар По. Конан Дойл. Фенімар Купер!!!

Лета перад сёмым класам было самым запамарочным у жыцці Сінічкі. На Цнянку яна ні разу не схадзіла.

Венскае крэсла выконвала ролю драбінкі — на яго Надзея Барысаўна залазіла, каб дацягнуцца да паліц пад столлю. Кнігі стаялі ў два шэрагі — і гаспадыня амаль беспамылкова ведала, якую трэба пацягнуць за карэньчык, каб адшукаць патрэбную, схаваную. Соня чытала хутка, бегала на сёмы паверх раз, а то і двойчы на тыдзень, і кніжкі ў ейнай памяці нанізваліся адна на адну, як пацеркі — адна цягнула за сабой іншую, і далей, і далей… І гэтак да пачатку восьмага класа чытачка падабралася да галоўнага — Залатога фонду кніг пра каханне.

Першай, здаецца, была Джэйн Эйр. Агаломшаная да глыбіні душы, Соня дні два не магла апамятацца ад прачытанага і папрасіла ў Ніны Барысаўны «ўсё гэтай аўтаркі».

Падобнае прыцягнула падобнае — і вось ужо за плячыма ўсе шэсць раманаў Джэйн Остэн, два — Уілкі Колінза

і эпапея пра Скарлет О'Гару. Усё гэта, зрэшты, выявілася падрыхтоўкай да вышэйшай матэматыкі Кахання — бясконцай Анжалікі і іншых спеваў у цярноўніку.

Але самае галоўнае — што напачатку вельмі дзівіла Соню, — Надзея Барысаўна, забіраючы кнігі, прапаноўвала Соні гарбаты і гутарыла з ёй аб прачытаным. Да гэтага Соня сама б ніколі не дадумалася. Яна так прызвычаілася перажываць любыя кнігі сам-насам, што спачатку нават не ведала, што гаварыць. Але пакрысе думкі рабіліся ўсё больш уцямнымі, гутаркі — жывейшымі, а гарбата — працяглейшай. Соня нават падазравала, што Надзея Барысаўна харчуецца выключна пячэнькамі і зефірам — яна ніколі не бачыла ў яе іншай ежы. Пасядзелкі на сёмым паверсе сталі для Соні ўцёкамі ў вышэйшы, ідэальны свет, у якім паслясмак ад толькі што скончанай кнігі трываў яшчэ крыху, пакуль эмоцыі не аціхалі і космас, створаны пісьменнікам, не адпускаў канчаткова. І чым больш сталела Соня, чым больш брыняла кніжкамі — тым больш драбнела ўзроставая прорва паміж ёй і Надзеяй Барысаўнай.

Так, аднойчы Соня заўважыла, як у старой кабеты разгладжваюцца зморшчкі, як маладзеюць вочы за тоўстымі акулярамі. Гэта здарылася адразу пасля Джэн Эйр. Ужо не бібліятэкарка выцягвала з Соні меркаванне аб прачытаным, а сама Соня захацела пагаварыць. Але нічога, апроч «ах!» і «ух!», напачатку вымавіць не змагла.

І тады Надзея Барысаўна расказала ёй пра сваё Каханне.

Не пра мужа — інжынер завода з'явіўся нашмат пазней, — а пра Сапраўднае Каханне. Ён быў афіцэр артылерыі, яго адкамандзіравалі ў вайсковую частку пад Лепелем, дзе маладзенькая Надзея Барысаўна — толькі з педінстытута — працавала настаўніцай рускай мовы ў гарнізоннай школе. Ён выступаў перад вучнямі на школьнай лінейцы першага верасня. Яго звалі Уладзімір. Надзея Барысаўна — Надзенька — умомант страціла галаву.

Пазней, прыгадваючы гэтую шматкроць чутую гісторыю, Соня вылічыла, што раман доўжыўся ўсяго год, прычым навучальны: у траўні афіцэра адкамандзіравалі назад, кудысьці ў бок Урала. У пераказе ж Надзеі Барысаўны гэта была бясконцая вясна чыстай любові і незямной пяшчоты. Пачуццё разгарэлася вокамгненна і палала ярка, хоць і не склалася ні ў які развіты сюжэт. Меў месца хіба шэраг аднастайна жарсных эпізодаў у лесе, на КПП ракетнага палігона ці ў нядзельным кафэ-марожаным у Віцебску. Рамантычныя дэталі кожнага спаткання Надзея Барысаўна і праз трыццаць гадоў памятала ўва ўсіх узрушальных падрабязнасцях. Каханкі гойдаліся ў аблоках, пакуль рэчаіснасць не абрынула іх на цвёрдую зямлю Лепельшчыны. Развітанне было нечаканым, як супрацьпаветраная трывога: Надзенька некалькі гадоў не магла апамятацца, жыла як у тумане.

Дамаўляліся, што яна будзе пісаць Уладзіміру, што прыедзе да яго, калі ён уладкуецца на новым месцы — але лісты вярталіся назад, дамоўленых тэлеграм з-за Урала не прыходзіла. Соня здагадалася, што афіцэр, мусіць, быў жанаты, але Надзеі Барысаўне пра гэта не сказала. Тая, відаць, і сама ўсё выдатна разумела. Але ж і гісторыя была пра іншае. Не пра вайскоўца-здрадніка і жонку за Уралам, а пра тое незямное шчасце, якое тады адчувала закаханая Надзенька.

Сотая старонка там, безумоўна, таксама была, але гэтую тэму Надзея Барысаўна далікатна абмінала. Хоць Соня потым вылічыла, што інжынер жаніўся з Надзенькай, калі тая ўжо мела дзіця. Сын яе цяпер быў зусім дарослым і жыў у Нямеччыне.

Галоўнымі былі Пачуцці. Соня і Надзея Барысаўна разбіралі душэўныя пакуты літаратурных гераінь і параўноўвалі са сваімі. Дакладней, з Пакутамі Надзеі Барысаўны — у Соні ніякіх Вялікіх Пакутаў пакуль не мелася, было толькі іх Прадчуванне. Яе ж сяброўка-пенсіянерка, хоць і перажыла ў жыцці адзіную мілосную прыгоду (мужа, як выглядала,

яна не надта кахала), але мела з гэтай прыгоды столькі Досведу, што яго з лішкам хапіла б на ўсіх гувернантак віктарыянскай Англіі.

— Як зразумець, што ты пакахала? — аднойчы спыталася Соня.

— Ніяк. Ты проста зразумееш — і ўсё, — мройліва адказала Надзея Барысаўна, і тоўстыя шкельцы акуляраў нібы зацягнуліся ружовай смугою.

На першай лінейцы ў дзявятым класе так і адбылося. Соня пабачыла Максіма — і адразу ўсё зразумела. А галоўнае — адчула. Адчула першую, другую, дзясятую і сотую старонку і многа чаго іншага адначасова, чаго ўвогуле ніякая кніга апісаць не можа. Надзея Барысаўна была першай, каму яна расказала пра святы момант пралёту скрозь яе сэрца Стралы Амура. Цяпер іх збліжала яшчэ больш рэчаў. Яны маглі параўноўваць афіцэра Уладзіміра і Максіма з героямі прачытаных раманаў — і гадзінамі гаварыць пра агульнае і адрознае ў абодвух. Хоць што адзін, што другі вобраз, які яны яскрава адна адной вымалёўвалі, меў столькі ж агульнага з рэчаіснасцю, як Рэт Батлер або містар Дарсі.

У дзясятым класе Соня захапілася кнігамі, якіх у Надзеі Барысаўны не было і быць не магло. Тата купіў сабе лэптоп і перацягнуў дадому з рэстарацыі вялікі камп'ютар. Соня прылаўчылася чытаць з манітора і ўжо не так часта зазірала да сяброўкі — хіба здабыць сёе-тое са школьнай праграмы. Гэта было зручней, чым хадзіць у бібліятэку. А выселіўшыся з інтэрната, Соня пра цётухну ў вэрхале пераезду зусім забылася.

Цяпер вы разумееце, дарагія чытачы, на якім грунце расцвіло Соніна бязмежнае каханне? Здавалася, ёй наканавана вечна паласць у агні ілюзій, які раздзьмула ў ёй рамантычная літаратура, рэкамендаваная летуценнай сяброўкай — але цынічная рэчаіснасць даволі хутка абрынула на зямлю нават Соню. Чым больш яна жыла поруч са Статкевічамі, тым

больш разумела: вобраз Максіма, які яна калісьці прымроіла на школьнай лінейцы, — адно плён яе фантазіі. Сапраўдны Максім быў звычайным хлопцам. З мілым тварыкам, вострым розумам, але ж і паскудным характарам, праз які з ім амаль немагчыма было зблізіцца такой дзяўчыне, як Соня, хоць чым далей, тым больш хацелася. Чорт з ім, з каханнем, — Соня прагнула аднойчы зрабіцца яму проста добрай сяброўкай. Як Маша Ротмістрава…

Вось пра што думала Соня Сінічка, седзячы на падлозе паміж кухонным востравам і маразілкай.

x x x

Раптам у Соні за спінай захрабусцеў поліэтылен. Яна спужана абярнулася. Максім разарваў блок з апельсінавым сокам, выкалупваючы адзін з пакетаў.

— Я вазьму, — сказаў ён.

Соня кіўнула.

Максім наліў дзве шклянкі соку, выклаў на талерку печыва, выцягнуў з шафкі шакаладную пасту.

— Дык ты, выходзіць, і сапраўдныя кнігі чытаеш? — раптам прамовіў ён задзірліва. — А па табе і не скажаш.

— А што, пісьменнікі толькі для цябе пішуць? Можна падумаць, табе ў Польскай амбасадзе патэнт выдалі на чытанне Сянкевіча.

Жарцікі наконт ейнай тупасці Соні парадкам надакучылі.

Максім загрузіў ежу на паднос і, выносячы яго з кухні, прамовіў цераз плячо:

— Я Сянкевіча не чытаў. Вось у чым прыкол.

Соня вылупіла яму ўслед вочы. Няўжо знайшлася рэч, у якой Максім быў не самым дасканалым чалавекам у радыусе ста кіламетраў? Беднае, няшчаснае эга! Няхутка, мусіць, адновіцца пасля такога ўдару.

— Мы былі ў царкве «Домінэ Кўо Вадыс», — загарлаў са свайго месца Вадзік. — І тата тады прыдумаў пра «Кўо Вадзік»!

Ад такой класавай несправядлівасці Соня ціха засычэла. Рымам і Апіевай дарогай яна трызніла ўжо трэці год, з часу, як прачытала «Quo Vadis». І вось нават гэтая казюрка саплівая была ў знакамітай «царкве Сянкевіча», на якую яна магла толькі аблізвацца, гартаючы ў сеціве блогі падарожнікаў. Ну што за жыццё!

Дзяўчына вырашыла, што ёй таксама пара перакусіць. Наліла сабе соку з таго ж пакета і выцягнула рэшту пячэнек. Ускараскалася за барную стойку. Адсюль добра было відаць гульцоў за журнальным столікам. Браты густа намазвалі шакалад ножыкамі на квадратныя крэкеры, складаючы іх у сэндвічы.

Надзея Барысаўна падсунула Соні «Крыжакоў» у той жа вечар, калі дзяўчына расказала ёй пра навічка на лінейцы. Соня літаральна за верасень прачытала ўсяго Сянкевіча, наяўнага ў «бібліятэцы», таму ёй наканавана было бачыць загадкавага хлопчыка з 9 «А» ўва ўсіх галоўных героях Сянкевічавых твораў — і ў слаўным рыцару Збышку, і ў шляхціцу Яну Скшэтускім, і ў статным трыбуну Марку Вініцыі. Сябе яна, адпаведна, асацыявала з іхнімі прыўкраснымі нявестамі. Так што ўсе цноты, якія Соня наіўна прыпісвала Максіму, датычылі хутчэй гэтай фікцыйнай групы таварышаў. Ну ці не дурнічка? Соня паспрабавала ўявіць Максіма ў рымскай тозе і пырснула смехам.

Хлопец панура зіркнуў у ейны бок, зразумеўшы, што смяюцца з яго, але моўчкі працягваў займацца сваім няхітрым дэсертам.

Раптам Соня зразумела, што таксама хоча шакаладнай пасты. Але слоік быў толькі адзін. Яна спаўзла з барнага зэдліка і самавіта пакрочыла да тэлевізара.

— Вам ужо не трэба? Я вазьму, — сказала яна як мага больш абыякава і, схапіўшы слоік, вярнулася на сваё месца.

Браты ажно раты параскрывалі. Гэта было дзёрзкае ўварванне на іхную тэрыторыю.

Соня ляпала пасту на пячэньку лыжачкай і тут жа запускала ў рот, гучна чвякаючы. Раптам ёй зрабілася ўсё адно, што скажуць або падумаюць пра яе манеры малы ці большы Статкевіч. Так працягвалася некалькі хвілін.

— Як так магло атрымацца, што ты не чытаў Сянкевіча? — спыталася Соня нарэшце, нагбом выпіўшы сок. — Што за збоі ў праграмаванні?

— Нецікава было. Пачынаў «Патоп» — не спадабалася. Нічога агульнага з гісторыяй! Буду я чытаць усякую рамантычную лухту, — адказаў Максім, пражаваўшы пячэньку. На свеце яшчэ многа харошых кніжак. На ўсё часу не хопіць.

— Дзіўна, а я падручнік спецыяльна потым чытала — усё там з гісторыяй нармальна, — запярэчыла Соня. — Я ўвогуле, калі нейкая кніжка спадабалася, не магу спыніцца, пакуль не прачытаю ўсё таго ж аўтара і ўсё, што звязана з яго кнігамі.

— Болей за мяне ты па-любому не чытала. Я малы чытаў вельмі шмат і нармальныя кніжкі па гісторыі таксама!

— Ну ладна, можа, я і неразумныя кніжкі чытала, але дакладна не меней за цябе. Я — чэмпіёнка па чытанні на доўгіх дыстанцыях!

Максім хмыкнуў.

— Не верыш? — разахвоцілася Соня. — Давай праверым.

— Якім чынам?

— Ну, можам у тэніс згуляць.

— Ува што?!!

Соня ўзяла апельсін з вазы, якая стаяла на барнай стойцы.

— Гэта наша з бабуляй гульня. Як у гарады, толькі паводле правілаў тэніса. Калі я малая была, мы прыдумалі, каб я лепей правілы запомніла. Што ты так глядзіш? Я гуляла ў тэніс.

— Я помню.

— Карацей, трэба па чарзе называць нейкія рэчы з аднаго ланцужка. Напрыклад, кнігі аднаго аўтара. Калі нехта не можа працягнуць, ён прагульвае. Адзін ланцужок — гейм. Гуляем адзін сэт. Да шасці. Ну ці да сямі — ты ў курсе. Называем толькі тыя кнігі, якія чыталі. Не падманваць!

І перш чым Максім паспеў апамятацца, яна кінула яму апельсін:

— Падавай першы!

Максім узняўся ад шахматнай дошкі і падышоў да канапы. Барная стойка цяпер раздзяляла іх з Соняй на манер сеткі на корце.

— Аўтар... Аўтар... — Максім на хвіліну задумаўся (яму так пасуе, калі ён думае, адзначыла пра сябе Соня). — Ну добра. Роберт Хайнлайн, «Зорны дэсант».

Соня злавіла апельсін і завісла.

— Гэта што, пра космас? Не, давай фантастыку не трэба. Я яе трываць не магу.

Максім іранічна прыўзняў брыво:

— Згода. Ну тады і без гэтай вашай дзявочай лабудзені кшталту «Дзённікаў Брыджыт Джоўнз» ці «Д'ябал носіць Прада». Я такое ўвогуле не пераношу.

Соня кіўнула і перакінула яму апельсін.

— Чарльз Дыкенс, «Олівер Твіст», — пачаў Максім.

Ён, відаць, спадзяваўся ўсё скончыць хутка. Але не на тую натрапіў. Дыкенса Соня багоміла. Хоць ён і асацыяваўся ў яе з той страшнай ангінай у восьмым класе, калі месяц не ўставала з ложка і Надзея Барысаўна сама насіла ёй кнігі. Дыкенса жанчына выбрала, бо ягоны збор твораў быў бясконцы.

— «Домбі і сын», — тут жа згадала Соня самы любімы свой раман Дыкенса.

— Што, праўда, Сінічка?.. «Дэвід Коперфілд».

— А поўную назву слабо? «Жыццё і неверагодныя прыгоды...»

— Гуляй давай!

— «Малютка Дорыт»!

— Ты гэта вось цяпер прыдумала? Няма такой кнігі!

— Не, ёсць! — крыкнуў Вадзік. Ён ужо раскрыў Вікіпедыю на хатнім камп'ютары.

— Ах так? — Максіма пачынаў браць азарт. — «Пасмяротныя нататкі Піквікскага клуба»!

— «Антыкварная лаўка!»

Максім злавіў апельсін і замаўчаў. Па твары было бачна, што ён злівае.

— «Калядны харал», — урэшце адбіў мяч ён.

— «Барнэбі Радж»! — вокамгненна зрэагавала Сінічка.

Апельсін праляцеў міма Максіма і ледзь не бомкнуўся ў тэлевізар. Максім знайшоў яго на падлозе і перакінуў Соні.

— Я больш не чытаў нічога з Дыкенса.

Соня не верыла сваім вушам. 1:0 на яе карысць. Цяпер задумалася яна. Хацелася доўгага ланцужка. Прымружыўшы вочы, яна згадвала самы працяглы шэраг на паліцах Надзеі Барысаўны.

— Джэралд Дарэл, «Мая сям'я і іншыя звяры».

Дарэл напісаў блізу трыццаці кніг. Недзе дваццаць з іх Соня чытала. Як выявілася, Максім таксама. Гэты гейм Соня прайграла проста таму, што заблыталася ў такой колькасці раманаў і не прыгадала наступнай назвы да моманту, калі Вадзік крыкнуў: «…чатыры… пяць!» Лік зраўняўся. Максім задумаўся і раптам, хітра ўсміхнуўшыся, зрабіў падачу, прамовіўшы:

— Фенімар Купер, «Следапыт»!

— «Піянеры»!

— «Апошні з магікан»!

— «Прэрыі»!

— «Зверабой»!

Шпурнуўшы «мячык», Максім радасна захіхікаў, але Соня ўжо вяртала яго назад:

— «Шпіён»!

— Які такі «Шпіён»? Усяго пяць раманаў пра Чынгачгука!

— А гэта не пра Чынгачгука. Але таксама Купер.

Максім павярнуў галаву да Вадзіка, але той толькі змрочна кіўнуў.

— Не пра Чынгачгука не лічыцца! — паспрабаваў бараніцца Максім.

— Правілы падчас гульні не мяняюць! 2:1, Статкевіч!.. — крыкнула Соня з запалам. — Волкаў, «Чараўнік Смарагдавага горада»! — звонка абвясціла яна, атрымаўшы ад Максіма апельсін, бо прыйшла ейная чарга падаваць.

— «Урфін Джус», — тут жа адказаў Максім.

Пакуль апельсін ляцеў да яе, Соня зразумела, што зрабіла дурасць. Раманаў у Волкава было ўсяго шэсць, а паколькі яна падавала, гэты гейм яна прайграе.

— «Сем падземных каралёў», — бязрадасна працягнула яна.

Але Максім, да яе здзіўлення, вымавіў:

— 3:1. Я далей не чытаў. І, крыху падумаўшы, зрабіў новую падачу:

— Альфрэд Шклярскі, «Томэк на сцяжыне вайны».

Соня злавіла апельсін і разгублена паглядзела на хлопца.

— Я пра такую не чула нават.

Вадзік пераможна загігікаў.

— Ды ладна! Мая любімая кніга, — задаволена прамовіў Максім. — І не пра космас. Гейм, Сінічка!

Лік цяпер быў 3:2. Барацьба зрабілася напружанай. Далей Соня прапанавала Жуля Верна, Максім — Аляксандра Дзюма, абодва геймы наша гераіня выгуляла, другі, праўда, са скандалам, настаяўшы на тэхнічнай паразе саперніка за «Даму з камеліямі», якую напісаў іншы Дзюма — сын, а не бацька. 5:2, яшчэ адзін рывок — і яна разграміць зазнайку. Напаследак яна вырашыла пасмакаваць прыемнае:

— Джордж Марцін, «Гульня тронаў»!

Яна чытала ўсе сем кніжак, якія былі ў інтэрнэце па-руску. Максім, відаць, таксама. Аднак, да ейнага здзіўлення, пасля апошняй, сёмай, пазіцыі Максім спакойна адпасаваў:

— «Таямнічы рыцар».

— Ты што, яе ж яшчэ не пераклалі…

— А ты думаеш, мне трэба чакаць перакладу? 5:3!

Гэтага Соня не ўлічыла. Ну ўсё, зараз ён зразумее яе слабасць — і пачне бамбіць усякімі амерыканскімі навінкамі… Але Максім павёўся па-джэнтльменску:

— Янка Маўр, «Палескія рабінзоны».

Тут іх шанцы былі роўныя, але Соня ўсё адно, апроч «рабінзонаў», чытала толькі «Чалавек ідзе». І калі яна ад бяды спрабавала ўпарыць суперніку «Слёзы Тубі», той грэбліва сказаў, што на апавяданні, ды яшчэ з хрэстаматыі, яны не дамаўляліся. 5:4. Трэба было тэрмінова перамагаць, інакш, калі дацягнуць да 5:5, давядзецца гуляць яшчэ два геймы.

Раптам Соню асяніла. І як яна раней не здагадалася?.. Яна карцінна пахукала на апельсін, размахнулася і здзекліва прамовіла:

— Джаан Роўлінг, «Гары Потэр і філасофскі камень»!

Джаан Роўлінг на той момант напісала дзевяць кніг. Соня перамагала пры любым раскладзе.

Максім быў размахнуўся ў адказ, але тут жа зразумеў усю падступнасць саперніцы і мяккім, але трапным рухам запусціў фрукт назад у вазу.

— Сэт. Вадзім, вырубай камп'ютар. Будзем у сапраўды разумныя гульні гуляць.

— Макс, мы што, прагулялі ёй? Ты што, Макс?

— Давай, расстаў пакуль фігуры.

І, адышоўшы да акна, Максім пачаў глядзець на лес і хрумсцець пячэнькамі, запіваючы сокам, нібы нічога не адбылося.

Соня паказала малому Вадзіку язык. Потым даразбірала харчы і паднялася на другі паверх. Выцягнула лэптоп у калідор,

з асалодай расцягнулася на канапе. Дзякуючы падзеям вечара кінапраграма намалявалася сама сабой: яна захацела перагледзець «Quo Vadis». Пакуль на сайце адкрываўся плэер, яна паднесла далонь да носа. Далонь пахла цытрусамі, як паветра Сіцыліі.

Фільм яшчэ падгружаўся, калі яна пачула Максімавы крокі:

— Можаш да сябе ісці. Я мадэм да дзвярэй перастаўлю.

Нешта вялікае здохла ў Рыме. Імаверна, імператар Нерон. Гэта была ашаламляльная перамога.

Але сюрпрызы на гэтым не скончыліся. Гадзіне а дзясятай, калі Соня падумвала, ці не легчы б ужо спаць, у дзверы пагрукалі. Вызірнуўшы на калідор, Соня пабачыла Максіма. У руках ён трымаў тры тоўстыя кнігі ў каляровых вокладках.

— Вось. Гэта прыгоды Томэка. Усім фанатам Дарэла і Сянкевіча настойліва рэкамендуецца. Бяры, калі не чытала.

— Дзякуй, — толькі і змагла прамовіць Соня ад нечаканасці.

— Толькі вярні, як прачытаеш. А то Вадзік да іх праз пару гадоў дарасце, яму падсоўваць буду.

— Божа, няўжо я на два гады апярэдзіла ў развіцці Вадзіка?

І тут адбылося неверагоднае. Максім усміхнуўся. Гэта быў не сон. Яна бачыла ягоную ўсмешку, і ўсмешка была не здзеклівай, як зазвычай, а прыязнай і адрасавалася ёй, Соні.

— Ладна, дабранач, — кінула дзяўчына і хуценька знікла ў пакоі, каб не паказваць, як яна збянтэжылася.

x x x

Тыдзень прайшоў пад Знакам Томэка Вільмоўскага. Максім прынёс ёй кнігі «Томэк на сцяжыне вайны», «Таямнічае падарожжа Томэка» і «Томэк на Чорным кантыненце». Цяпер па вечарах, замест каб утыкаць у кіношкі, Соня зноў

чытала — гэта была ўжо крыху забытая прыемнасць. Томэк выявіўся кімсьці накшталт польскага Гары Потэра. Як і героі Дарэла, Томэк ездзіў па свеце, каб лавіць дзікіх звяроў для заапарка, але па дарозе трапляў у самыя розныя, не толькі «жывёльныя» прыгоды. Аўтар відавочна ствараў кнігі, каб зацікавіць дзяцей дзікай прыродай і біяграфіямі знакамітых польскіх вандроўнікаў — гэтыя канцы ў кнігах былі кепска схаваныя, але Соня прабачыла аўтару ўсё за экшн і сімпатычных герояў кшталту боцмана Навіцкага.

Праз тыдзень ужо яна асцярожна грукала ў дзверы Максімавага пакоя. Гэта было, здаецца, у чацвер, у перадапошні дзень трэцяй чвэрці.

— Дзякуй яшчэ раз. Вяртаю, — чынна сказала яна, перадаючы кнігі гаспадару.

— Праўда здораўскія?

— А то! — ажывілася Соня. Вочы заблішчэлі. — Шкада толькі, я іх гады тры таму не прачытала… Але герой — такі душка! Ведаеш, аказваецца ў гэтай серыі яшчэ шэсць кніжак! Я іх ужо на комп захавала! Ты ўратаваў мае вакацыі!

— На комп? Ты што, з кампа чытаць будзеш?

— Не, з тэлефона. Неяк туды перакіну...

— Пачакай, — Максім зайшоў у пакой і праз паўхвіліны вынес на калідор «кіндл» ахайна абкручаны белым дротам.

— Во, трымай. Мне пакуль не патрэбна.

— Ды навошта? Я лепш з мабільніка…

— Сляпіцца будзеш? — звёў бровы Максім. — Ты на тату свайго зірні: яшчэ не стары, а ўжо ў акулярах. Генетыка — жорсткая рэч, Сінічка. Бяры, а то зрок пасадзіш. Тут электронны атрамант, вочы менш стамляюцца…

Потым яны сядзелі на калідоры, і Максім паказваў Соні, як правільна канвертаваць файлы для «кіндла». У пятніцу яны зноў перамаўляліся: Соня пацікавілася пра ладаванку, а ён папрасіў перад тым, як аддаваць «кіндл», загрузіць туды які-небудзь раман Сянкевіча, але не «Патоп».

А ў суботу Статкевічы раз'ехаліся на вакацыі. Мама Юля звезла тату Віцю з Вадзікам на тыдзень у Барселону. Яны прыляталі сёння зранку ў Вільню, у Мінску яны мусілі з'явіцца бліжэй да вечара. Максім з імі не паехаў. Едучы ў віленскі аэрапорт, бацькі завезлі яго ў Полацк. Але не толькі ў госці да бабулі з дзядулем, а яшчэ і на «рэспубліку» па англійскай мове. Сёння пачынаўся апошні тур, Максім мусіў вярнуцца ў Мінск заўтра цягніком, разам з іншымі алімпіяднікамі.

Якая карысць з кніжак? Так проста і не адкажаш. Але Соня дакладна ведала, што адна з іх — «Quo Vadis?» Генрыка Сянкевіча — у адно чароўнае імгненне змяніла ейнае жыццё. Яна падняла «кіндл» з ложка і асцярожна кранулася вуснамі электроннай паперы.

Раздзел VIII

# ПІКНІК НА ПОПЕЛІШЧЫ

Дваццаць восьмага сакавіка заставаўся адзін дзень да сустрэчы з Максімам і палова апошняй кнігі пра Томэка Вільмоўскага. Заўтра зранку трэба адразу ж аддаць «кіндл» — Соня не любіла доўга трымаць чужыя рэчы. А пакуль яе чакае яшчэ адна забытая прыемнасць — сняданак з татам. На працу яму сёння толькі пасля абеду, і яны змогуць спакойна пасядзець удваіх, як у былыя часы. Напяваючы песенькі каля пліты, Соня паціху падсмажвала вымачаныя ў малацэ і яйку грэнкі. І, задумаўшыся, нават не заўважыла, што машынальна зрабіла ўсё правільна — нічога не пераблытала і не падпаліла.

— Сонейка, адыдзі ад патэльні, а то зноў што-небудзь згарыць. Я сам.

— І табе добрай раніцы, татуля… Ну скажы, калі ты мяне ўвесь час будзеш выганяць з кухні, чаму я навучуся?..

x x x

Яны пілі каву і моўчкі жавалі грэнкі. Соня так рэдка бачылася з татам, што, калі гэта здаралася, не ведала, пра што з ім гаварыць. «Як справы?» — спытаўся ён, калі яны ўселіся за стол. «Нармальна», — адказала яна. Насамрэч шмат

чаго адбылося апошнім часам. Але вось так за два словы над грэнкамі і не раскажаш.

Соня сядзела і не ведала, пра што гаварыць з татам. Яна вельмі яго любіла, але за апошнія месяцы яны аддаліліся.

Вось мама Юля б ужо тысячы тэм для размовы прыдумала.

— Калі будуць вынікі НЦТ? — нарэшце спытаўся Пётр Сінічка.

— Праз тыдзень.

— Ты рускую мову ў суботу здавала?

— Так. І ў нядзелю — англійскую.

— А матэматыку калі?

Опачкі. Лепш бы маўчалі і жавалі.

Сваім планам паступаць у лінгвістычны Соня падзялілася пакуль толькі з адным чалавекам на свеце — Максімам. Дый тое само вырвалася. А тата тыдзень таму выдаў грошы на НЦТ, на тры тэсты, але рэшту Соня пакінула сабе на шакаладкі. Тата, вядома ж, нешта казаў пра матэматыку, але яна прапусціла міма вушэй.

— Ну… Матэматыкі я не здавала.

— Як не здавала?..

— У лінгвістычным матэматыкі не было.

— Чакай, які такі лінгвістычны? Мы ж гаварылі пра наргас?

Пра наргас яны гаварылі месяц таму. Тата ўсё дастаўаў яе з гэтым турыстычным менеджментам.

— Соня, ты мяне здзіўляеш, — працягнуў ён. — Ты ж ведаеш: у наргас трэба матэматыка. І калі ты цяпер здасі трэці тэст? Я не маю ілюзій, нібы ты зможаш прабіцца на бюджэт… Я аплачу табе вучобу. Але нам трэба ведаць, ці маеш ты шанцы хоць бы на платнае. Для гэтага здаюць рэпетыцыйныя тэсты…

Тата аплаціць ёй вучобу? Во навіна… І за якія, цікава, шышы, калі яны ўсё ў дом убухалі?..

— Я не хачу ў наргас. Я хачу ў лінгвістычны.

Пачуўся гром сярод яснага неба. Гэта бацька з грукатам паставіў кубак на стол.

— Прабач, куды ты хочаш?

— На факультэт англійскай мовы.

— І навошта табе гэта ў рэстарацыі? Ты што, сама не вывучыш? Я вось ведаю пяць слоў па-англійску, пяць — па-нямецку і дзесяць па-польску — і нічога, яшчэ ніводзін турыст галодным не сыходзіў. Пяць гадоў мовы вучыць? Якога ляду?

— Тата, бо я хачу вучыць мовы! Я не хачу ў рэстарацыю!!!

Яна гэта крыкнула. Так выйшла. Пётр Сінічка вытрымаў паўзу, потым выцягнуў сурвэтку, працёр акуляры, адсёрбнуў кавы і прамовіў.

— Вось што, дачушка. Мова — гэта не прафесія. Калі я сказаў, што магу аплаціць табе вучобу, то меў на ўвазе, што інвестую ў тваю будучыню. А фінансаваць твае хоцькі — гэта неяк непрадукцыйна. Табе не здаецца?

— Ну чаму адразу фінансаваць? — прабурчэла Соня. — Можа, я на бюджэт паступлю?

Тата засмяяўся:

— Хто, ты? Соф'я, давай будзем рэалістамі…

— Я вучу інгліш! У мяне васьмёрка ў трэцяй чвэрці.

— Гэта лінгвістычны, сонейка. Туды заўсёды было не ўбіцца. Калі штурмаваць — то хоць карысны ўніверсітэт. Не пройдзеш на менеджмент, падамо на эканаміста. Таксама вельмі добры занятак.

— Гэта што, на бухгалтара? Калі табе патрэбны бухгалтар, сам туды ідзі і вучыся! — выпаліла Соня і надзьмула шчокі.

— Дачушка, для лінгвістычнага яшчэ два гады таму рэпетытара браць трэба было. Куды ўжо цяпер? Год страціць хочаш?

— Ага, рэпетытара!.. Вядома ж, рэпетытара... Вось толькі калі ён быў мне сапраўды патрэбны, у нас грошай не было, бо мы дом будавалі!

Тата пабялеў. Не трэба было згадваць пра дом. Але Соню ўжо было не стрымаць.

— Дарэчы, як там дом? Калі мы ўжо яго адбудуем і пераедзем?

Пётр Сінічка зноў пачаў праціраць акуляры. Потым сказаў:

— Ну, Соня, дом… Не ўсё так адразу. Да зімы мы толькі пажарышча разгрэблі. Вось як снег сыдзе, паеду туды, агледжуся, якія страты, што трэба аднавіць… Новы праект трэба… Слухай, што мы ўсё пра бздуры? Я табе падарунак на Дзень народзінаў прыдумаў.

Тата відавочна пераводзіў тэму, але выбраў слушнае рэчышча. Дзень народзінаў — гэта было святое. Соні падабаліся, калі ў гэты дзень з ёй насіліся.

— Ну, татусь… Ты ж ведаеш, я люблю сюрпрызы.

— Тут сюрпрызу не атрымаецца. Я хачу зарэзерваваць для на нас абаіх які-небудзь тур на жнівень. Тыдні на дватры з пералётам. Каб экскурсіі і на мора. Выбірай краіну.

— Татка, ты найлепшы! — Соня кінулася яму на шыю і пачала душыць абдоймамі. — Я цябе люблю!!! Люблю! Люблю!

— Цішэй ты, гарэза... Краіну назаві.

— Ну што за пытанні! Італія, вядома! Ці не… Англія… Ой не, калі мора, то, вядома, Італія!

Тата зацокаў языком.

— От, а я спадзяваўся якой Турцыяй абысціся. Ці Егіптам. Але ж мая дзяўчынка распанела і прагне раскошы… Ды ладна. Хай будзе Італія.

Так што гэта быў проста выдатны дзень. І толькі калі тата з'ехаў па справах, а Соня засталася на самоце дамываць посуд, у галаву зноў палезла неадчэпнае: «І на якія такія шышы?»

x x x

Нарэшце можна было вярнуцца ў пакой і дачытаць кнігу. Соня ўзняла ноўтбук з ложка, каб пераставіць яго на туалетны столік, але той прабудзіўся, і ў браўзеры зацвіркалі новыя паведамленні.

Першым акенцам быў іх чацік з Галяй і Снежкай. Дзяўчаты ўжо трэці дзень абмяркоўвалі заўтрашні «дзень нарodзінаў» Соні. Яна запрасіла ўсю маленькую кампанію ў боўлінг. Ніхто з іх раней у кеглі не гуляў, таму запрашэнне сяброўкі прынялі з імпэтам. Пра ўсё ўжо было дамоўлена, таму ў чаціку ўсплыла ўсяго толькі пара нязначных рэплік і гара смайлаў. Раней Соня ўпотай сумавала, што ейнае свята вечна прыпадае на вакацыі і ў класе ніхто не віншуе. Але цяпер, калі ў яе з'явіліся блізкія сяброўкі, гэта стала неістотна. Затое можна святкаваць строга ў свой дзень, не пераносячы на выхадныя.

Другое акенца было ад Крысціны Віткевіч.

«Прывет», — прачытала Соня.

Вышэй у тым жа чаціку былі яшчэ словы «хаюшкіх», «вітаю», «вітанкі», «прывітосікі» — так, нібы Віткевіч выконвала моўны практыкум «Прыдумайце сінонімы да слова „прывітанне“».

Яна ўжо амаль тыдзень прабівалася да Соні ў прыват, але тая яе ігнаравала. Як можна было размаўляць з Віткевіч пасля таго, што «ашка» ўчыніла ў Кіеве?

Але сёння Соня была добрая і мела настрой крыху пачаціцца, няхай і з Віткевіч.

«Вой, прывітанне. Не бачыла тваіх месаг».

Чацік тут жа піпікнуў адказам:

«Як справы?»

«Справы супер! — напісала Соня чыстую праўду. — А ты як?»

«Норм».

Неверагодна змястоўная размова. Соня ўжо хацела закрыць ноўт, але наступная месага прымусіла яе адпусціць палоўку з маніторам і ўперыцца ў літары:

«Сінічка, слухай, я табе пра Ротмістраву раскажу».

«З чаго раптам?» — адпісала Соня, вытрымаўшы, для саліднасці, паўзу секунд трыццаць.

Сказаць, што яна была заінтрыгаваная, — гэта нічога не сказаць. І тым больш яе агаломшыў адказ:

«Гэта наконт Статкевіча».

«Мне пофіг, — пачала пісаць Соня, але потым знішчыла і адправіла: — Давай. Што там пра іх?»

«Карацей, Віка Крылова сустракаецца з Маркам Бергерам».

Віткевіч заўсёды была трындзёлкай і ніколі не пераходзіла да сутнасці, пакуль не выдавала ўсяго, што ведала.

«Ну», — стымулявала яе Соня.

«Яны паўсюль ходзяць разам, і вось у пятніцу перад вакацыямі…»

Віткевіч набірала і скідвала ў чат па кавалачку. Соня чакала, пакуль тая выкладзе ўсю гісторыю.

«…яны стаялі на калідоры: Залескі, Статкевіч, Бергер і яна».

«І тут падгрэбла Ротмістрава».

«І, такая, кажа, Максім, ты прынёс мне кіндл?»

«А ён зрабіў такія круглыя вочы і кажа, які кіндл?»

«А яна, ты мне ў панядзелак абяцаў, што пазычыш на алімпіяду».

«А Статкевіч, такі, вой, даруй, ты не нагадала, я думаў, не трэба ўжо…»

«А яна, ты ж ніколі нічога не забываеш…»

«А ён, ну, вось, забываю, я забыў і пазычыў іншаму чалавеку».

У Соні ёкнула сэрца.

«А яна, ну, вось, ты мяне падвёў, я хацела даведнікі загрузіць, цяпер іх з сабой цягнуць…»

«А ён, ну, даруй».

«І што яна?» — не вытрымала Сінічка.

«Павярнулася і сышла».

«Цудоўная гісторыя, — напісала Соня, вычакаўшы з хвіліну, — але пры чым тут я?»

«Ну, ты ж з ім у адным доме жывеш. Вельмі трэба праверыць, ці ён сапраўды камусьці пазычыў. Можа, ты бачыла каму?»

«Мне:)»

«:))))))))))))) Я сур'ёзна. У нас з Вічкай версія, што ён нікому не пазычаў, а проста не хацеў даваць».

«Ну так... Ён з'ехаў, а ягоны кіндл у гасцёўні ;)»

Ягоны «кіндл» ляжаў у Соні каля падушкі.

«:))))))). Выдатна. Так Ротмістравай і трэба. А то корчыць з сябе манашку тут…»

Перамыць костачкі саперніцы — што можа быць лепш для добрага настрою?

«Манашку?»

«Ага. Мы за ёй даўно назіраем. Ну вось якая карысць ад кіндла?..»

Соня магла напісаць доўгі адказ на гэтае рытарычнае пытанне, але абмежавалася кароткім:

«І не кажы».

«Мы думаем, Ротмістрава так да яго падкочвае».

«Ды ладна».

«Запала яна на яго, Сонька. Проста добра шыфруецца. Маўляў, я не такая, чакаю трамвая…»

Тут Соня, сёе-тое прыгадаўшы, пстрыкнула па акенцы чату з Галяй і Снежкай і прагарнула яго назад.

Апошняя доўгая размова ў дзяўчат была ўчора позна вечарам, і недзе ў яе сярэдзіне Соня перачытала такое:

Галя: «Вой, мне Ротмістрава эсэмэс даслала. У яе другое месца на алімпіядзе! І дыплом першай ступені!»

Снежка: «І мне!»

Галя: «Прыкольна! Трэ з ёй у пн адзначыць!»

Соня: «Кхе... кхе… Нічога, што я тут стаю?»

Снежка: «Сініца, ты што, раўнуеш? :))))»

Соня: «Яшчэ чаго».

Галя: «Дарэчы, што ты ёй зрабіла?»

Соня: «Я????? Ёй??????»

Галя: «Я да яе перад яе ад'ездам у Мазыр забягала, сказала, што мы ў пт святкуем твой дн, а яна ўся перакрывілася і кажа: ох ужо гэта ваша Сінічка...»

Соня: «Нічога я ёй не зрабіла. Я з ёй месяц не размаўляла. Дасталі вы ўжо са сваёй Ротмістравай. Ротмістрава тое, Ротмістрава сеё… :(«

Снежка: «Галюнь, праехалі…»

Ротмістрава ж халерна разумная дзеўка. Няўжо яна вылічыла ўсё пра «кіндл»? І таму ў яе алергія на Соню?

Чацік з Віткевіч настойліва цвіркаў.

«Сінічка?.. Ты тутака?... Гэй?»

«Ага…» — адпісала Соня.

«Давай пра Крылову і Бергера раскажу».

Віткевічына бессаромнасць не лезла ні ў якія вароты. Калі найлепшая сяброўка закахалася і не мае на цябе часу, значыць, можна пляткарыць пра яе налева і направа. Нават з тымі, хто мае поўнае права паслаць цябе за ўсё «добрае», што ты ім зрабіла… У Соні зноў ускалыхнулася крыўда за Кіеў. Вельмі хацелася высветліць стасункі з Віткевіч проста цяпер, але тая не пакідала суразмоўцы ніякага шанцу:

«Карацей, ёй жа брэкеты паставілі…» — пачала яна, не дачакаўшыся Сонінай рэакцыі.

«У яе і так фізія сістэмы „мама мія“, а тут яшчэ і такое».

«Яна была ў поўным аўце, ціпа, асабістае жыццё скончылася. Ціпа яно ў яе пачыналася :)))»

«І тут, прыкінь, прыходзіць яна ў клас, шапялявіць, рота раскрыць баіцца, а тут падлятае Бергер і пачынае ўнаглую КЛЕІЦЬ».

«Кажа, у маёй стрыечнай былі бр., і яна практыкавалася са мной цалавацца, давай навучу».

«Ну, яна яму фізрой па задніцы».

«А праз два дні здалася і пайшла вучыцца».

«Кажа, яна яму даўно падабалася, але ён не ведаў, як падкаціць».

«А тут падабраў… параненую казулю на вадапоі… Хехе».

Ну і гадаўка ж гэтая Крысціна… Калі ўжо ладзіць конкурс прыгажосці паміж ёй і Крыловай, то прышчавая Віткевіч атрымала б тытул віцэ-міс з вялікім адрывам ад першага месца.

Між тым чацік не супакойваўся:

«А ты ведаеш, як з брэкетамі цалуюцца?.. Гэй, ты тут?..»

«Карацей, цалуюцца як звычайна, толькі павольней, таму пацалунак вельмі пяшчотны... Гы, прыкольна».

Соня з агідай згарнула браўзер. Паставіла комп пад крэсла, села на ложку і надзьмулася. «Як звычайна». Маўляў, усе такія крутыя і ведаюць, як цалавацца «звычайна». Вось Соня, напрыклад, ніколі не цалавалася і не ведае, як гэта — «звычайна». Ну іх.

Затое яна даведалася, што Максім — Максім! — выкінуў з галавы, нібыта камусьці ўжо абяцаў «кіндл» і сам прапанаваў яго Соні.

Ён ніколі б так не зрабіў, калі б яму падабалася Ротмістрава.

Ці значыць гэта, што яму падабаецца Соня?

Сінічка адкінулася на падушку і, уключыўшы электронную кнігу, узялася чытаць.

Не паспела яна, аднак, прагарнуць і дзесяці старонак, як завібравала эсэмэска:

«5 хв. Апранайся — вецер!»

Чорт! Чорт! Чорт!!! Дзіравая галава!!!

x x x

Вася ўчора цэлы дзень даставаў яе праз тэлефон, запрашаў пагуляць. Яна пагадзілася, каб адчапіцца, — і тут жа забылася, бо Вася адарваў яе ад чытанкі. Яна была глыбока ў Даліне Цароў разам з Салі і Томэкам — якія яшчэ шпацыры па Мінску? А Вася, ясна, прыцеляпаўся і цяпер ашываецца пад вокнамі.

Сінічка неахвотна паднялася з ложка і пацягнулася да шафы. Трэба будзе не падаць выгляду, што забылася. Як бы так палазіць гадзінку — і хуценька назад? Ох ужо гэты Вася…

Яна ўлезла ў джынсы, нацягнула белы швэдар, адкапала ў пакеце з учарашнім шопінгам «халодную» белую шапачку з люрэксам, абматляла каўнер швэдра такім жа шалікам, спусцілася ў вітальню, абулася і, накінуўшы прыталены чорны пухавічок — абноўку мінулага месяца — выскачыла на вуліцу.

Здаецца, зіма канчаткова адступіла. Сонца не было, пад дрэвамі на ўзлеску яшчэ ляжалі гурбы снегу, але ў твар ужо дзьмуў смачны вецер. Пахла вясною — ранняя вясна мае непаўторны водар. Невядома, з чаго ён складаецца, але адчуеш яго — і разумееш: маразы не вернуцца.

Соня азірнулася — Васі нідзе не было. Але тут яна пачула ягоны голас. Яна павярнула галаву да кучы жвіру, якую тата Віця купіў на пару з суседам, каб утрамбаваць пад’езд да дома, і пабачыла Васю…

x x x

На Васі была зацяганая бясформенная куртка і чорная шапачка, з-пад якой, як з-пад гаршка, вытыркаліся даўно нястрыжаныя патлы. За спіну быў закінуты заўсёдны стары заплечнік. Адным словам, гэта быў незайздросны кавалер.

Але ў момант, калі Соня пабачыла яго каля кучы жвіру, «аўтфіт» адышоў да другі план. Таму што Вася з гонарам «вассядаў» на навюткім беласнежным скутары.

Больш за тры гады Васілеўскі збіраў грошы ў круглую бляшаную скрынку з-пад печыва, каб нарэшце прыгнаць з мотасалона кітайскі скутар «Самурай» апошняй мадэлі.

Калі ў дванаццаць гадоў уладкаваўся на рынак у дзядзькаў павільён, ён проста не хацеў залежаць ад маці, трасучы ў яе грошы на марозіва і цыгарэты. Выявілася, аднак, што зарабляе ён болей, чым можа пракурыць і праесці. Таму калі яму споўнілася пятнаццаць, ён вырашыў, што назапашваць зялёныя паперкі проста так нецікава: яму патрэбная мэта. Ровар? Скейт? Смартфон? Камп'ютар? Не. Гэта былі дзіцячыя і нейкія несалідныя мары. Аляксей Васілеўскі адразу замахнуўся на матацыкл.

Бо няма нічога круцейшага, чым рассякаць паміж машын на трасе, адчуваючы, як цябе ззаду пяшчотнымі абцужкамі абхопліваюць дзявочыя рукі. Намёртва сціскаючы тваю дыяфрагму — бо страшна, бо матацыкл ляціць на мяжы дазволенай хуткасці. Зрэшты, якая розніца, чаму яна абдымае цябе? Важны сам факт.

Што да ўладальніцы пяшчотных абцужкоў, варыянт адшукаўся хутка. Соня — мілая аднакласніца з вялікімі шэрымі вачыма, якія так даверліва на цябе паглядалі. Утульная, хатняя, свойская. Ён шкадаваў яе, бо такая файная дзеўка прыніжала сябе, кахаючы нейкага баклана толькі таму, што той падобны да галівудскага актора з саплівай рамантычнай камедыі. Такі чалавек заўсёды будзе выціраць аб жанчын ногі. Іншая справа — ён, Вася. Вася заўсёды будзе побач. І ў яго будзе матацыкл. Ці, як варыянт, — наварочаны скутар. На яго і правоў не трэба.

Калі пасля новага года ў бляшанай скрынцы храбусцела запаветная тысяча, Вася пачаў урачысты абход мінскіх мотасалонаў.

І вось тыдзень таму на Лагойскім тракце ў секцыі нависнак яму спакусліва падміргнуў фарамі двухмясцовы кітайскі скутар «Самурай». Вася адчуў ціск у дыяфрагме — так, нібы Соня ўжо абдымала яго сваімі пяшчотнымі абцужкамі.

Яму бракавала дзве сотні. Палову ён пазычыў у хлопцаў на рынку, палову — у «Сайгоне» за кошт будучага заробку. Нарэшце — тыдзень таму — скутар быў перавезены грузавым таксі ў дзядзькаў гараж у Лошыцы. З таго часу Вася ездзіў туды штодня. Заліваў паліва. Праціраў і без таго бліскучыя паверхні. Спрабаваў ганяць паміж гаражамі. На дарогах па-здрадніцку ляжаў снег, і ён ніяк не наважваўся выправіць «Самурая» на вуліцу. Ён пхаў скамянелыя бурыя гурбы ботам і шалеў — так яму хацелася зрабіць Соні сюрпрыз да канца вакацый!

Нарэшце ў чацвер усё пацякло, снег пачаў знікаць — і кітайскі самурай вырушыў у сваё першае падарожжа.

— Вау, — толькі і здолела сказаць Соня, калі выйшла на ганак.

Яна зразумела ўсё без слоў. Кінулася да Васі, спрытна ўскараскалася на задняе сядзенне. Адразу паспрабавала ўхапіцца за Васеву талію, але зашкодзіў заплечнік. Соня сцягнула лейкі з ягоных плячэй і моўчкі перакінула брудны мех сабе за спіну. І ўжо тады сціснула яму дыяфрагму абцужкамі і застыла ў чаканні.

— Куды паедзем? — спытаўся Вася, робячы выгляд, нібы нічога не сталася і ён штодня возіць яе на скутары.

— Адвязі мяне дамоў, — сказала Соня, крыху падумаўшы.

Вася інстынктыўна павярнуў галаву ў бок катэджа Статкевічаў, але тут жа ўсё зразумеў, кіўнуў і, завёўшы рухавік, накіраваў «Самурая» на кальцавую.

x x x

Ад дамка Сінічак застаўся адзін падмурак. Снег, які ляжаў на ім брудна-белым футрам, прасеў і зрабіўся рыхлым,

як пена. Тата ўласнаручна заліў шыкоўны лёх і вельмі ім ганарыўся. Соня ўцягнула носам паветра — паленым больш не пахла. Увосень гаркавы смурод пажарышча прасякаў усё навокал. Ля агароджы з сеткі-рабіцы (яе тата з часам збіраўся замяніць на нешта прыстойнейшае) пад імправізаванай паветкай грувасціліся рэшткі будоўлі: лісты бляхадахоўкі, ацалелая шалёўка, бэлькі, якія не прагарэлі. Тата завіхаўся тут да самых маразоў, спрабуючы ўратаваць хоць нешта.

У Соні зашчаміла сэрца. Ёй, вядома, вельмі падабаўся дом Максіма і яго сям'і, але гэтае папялішча было ейным, родным. Няхай і выглядала цяпер так мізэрна.

Дзяўчына стала прабірацца да мураванага ганка, правальваючыся ў рыхлым снезе. І раптам зразумела: штосьці не так. Сляды ад ейных боцікаў не былі адзінымі на падворку. Тут хадзілі іншыя людзі. І хадзіла іх шмат.

Гэта было незразумела і падазрона.

— Сініца, пікнік! — закрычаў Вася, вызіраючы з-за паветкі з будаўнічым ламаччам. Хадзем гарбаты налію.

Вельмі ўчасна, бо Соня паспела змерзнуць.

Яны стаялі каля неахайнага штабеля, выступ якога ператварыўся ў фуршэтны столік, і па чарзе адпівалі салодкую гарбату з накрыўкі алюмініевага тэрмаса. Язда па трасе і небяспека, якая чакала іх, калі міма па кальцавой праносіліся фуры, зрабілі сваю справу: расслабіўшыся, Соня адчула ваўчыны голад. Яна пашнарыла ў Васевым заплечніку і адкапала там ладны пакунак з канапкамі. З густым слоем масла, сырам і доктарскай кілбасою.

— Мама спакавала, — патлумачыў Вася, надкусіўшы паўмесяц доктарскай.

Холад, які пранізваў Соню да костак, ненадоўга адступіў. Імправізаваны пікнік з Васем нават пачынаў быць рамантычным.

— Сініца… — раптам сказаў Вася, калі яны дажавалі буцікі і спустошылі тэрмас.

— Ага? — рассеяна азвалася дзяўчына.

— Можна… я зараз… цябе пацалую?

Хлопец стаяў, апусціўшы вочы, і круціў накрыўку тэрмаса ў руках.

Больш за ўсё яна баялася гэткага пытання, зададзенага гэткім тонам. Раней Вася падкочваў да яе жартам — так, што можна было аджартавацца ў адказ. Цяпер жа ён задаў пытанне наўпрост і ўпершыню сам-насам.

У Соні зашчаміла сэрца.

Вася быў вельмі добрым таварышам, але не падабаўся ёй як хлопец. Ані кропелькі.

З іншага боку, ёй толькі што прапанавалі пацалунак у вусны. Такі, якіх у Соні ніколі не было. І было страшна цікава даведацца, як гэта — цалавацца з хлопцам па-сапраўднаму.

З іншага боку, калі ты цалуеш кагосьці, асабліва ўпершыню, гэта мусіць быць той, хто табе сапраўды падабаецца. Інакш гэта будзе нейкі спорт. А першы пацалунак — магія. Соня гэта дакладна ведала.

З іншага боку, пацалунак — гэта яшчэ і тэхналогія. Як яна пацалуе каханага, калі не будзе ведаць, як гэта робіцца? Што той пра яе падумае? І чаму нельга папрактыкавацца з Васем? Не чужы ж чалавек. Паставіцца з разуменнем, даруе любую лажу.

З іншага боку, менавіта што Вася — не чужы чалавек. І хоча пацалаваць Соню не са спартыўнага інтарэсу, а таму, што яўна нешта адчувае. І калі раней яна магла ад яго адбівацца і аджартоўвацца, то пасля пацалунка ўсё зменіцца. Вася захоча большага. І Соні не будзе як адкручвацца.

З іншага боку, што ён сабе думае? Пакатаў на скутары — і адразу цалаваць? Ці не абражае гэта яе годнасць?

Вось колькі думак можа прамільгнуць у галаве за 5 секунд.

— Ну што, Сініца? — сказаў Вася надзіва мяккім голасам. У чаканні ён заплюшчыў вочы і пацешна склаў вусны трубачкай.

Першы пацалунак быў так блізка — колькі праблем і комплексаў здымецца адным махам! Ён не будзе нічога значыць, але затое можна будзе падтрымліваць размову на гэтую тэму ўжо не на ўзроўні тэорыі. Цяпер не трэба будзе «адседжваць» карты для варажбы, таму што «нецалаваная».

Снежка, напрыклад, даўно «цалаваная». Пасмакталася ў трынаццаць гадоў з нейкім сувораўцам на навагодняй дыскатэцы ў Палацы моладзі. Нават твару не памятае, бо ніколі яго пры дзённым святле не бачыла — затое мае досвед.

Дый Галя мінулым летам цалавалася ў вёсцы з суседскім хлопцам.

Соня ўздыхнула і пацягнулася да Васілеўскага.

Ад Васі пахла варанай кілбасой. Максім таксама любіць такія буцікі. Часам робіць сабе сам на сняданак да кавы, калі мама Юля не накроіла…

Соня згадала Максімаву ўсмешку, калі ён аддаваў ёй «кіндл».

Яна зразумела, што не можа. Яна ўскладняе сабе жыццё — але яна проста не можа.

— Не, Лёша, нельга. Прабач, — сказала яна вінавата.

— Ну, я ведаў, што нічога не атрымаецца. Але паспрабаваць было варта, — засмяяўся хлопец як нічога ніякага. Расплюшчыў вочы і стаў шукаць тэрмас, каб закруціць накрыўку.

Зноў ператварыў усё ў жарт. Вось і слаўненька.

— Ты мне ўсю куртку заляпаў, пакуль ехалі, — пачала буркатаць Соня, каб схаваць няёмкасць. — Глядзі, пыркі. А шапка дык зусім новая. Калі ты мне шапку заляпаў…

Яе перапыніў шум з дарогі. Каля ўчастка затармазіла машына.

Соня і Вася вызірнулі з-за штабеля і пабачылі дзіўную тройцу, якая дэсантавалася з маленькага сіняга «Пежо» і, як да сябе дадому, заруліла на падворак.

Наперадзе скакала па лунках ад Соніных ботаў маладая, гадоў дваццаці пяці, дзяўчына. Яна была добра апра-

нутая і дагледжаная: дарагі паўкажушок, вузкія левайсы, запраўленыя ў угі. Раскошныя кудзеры, фарбаваныя ў блонд, спадалі на плечы з-пад яўна брэндавай шапачкі. У руках яна нязмушана несла шуфлік і венік.

За ёй прабіралася па снезе пажылая пара — з усяго відаць, муж і жонка. Абодва гадоў пяцідзесяці, вельмі падобныя адзін да аднаго: поўныя, чырванашчокія. На жанчыне было кудлатае чорнае футра і фіялетавы цёплы капялюшык з брылікам, на мужчыну — руды кажух і футравая шапка. Яны маглі б быць бацькамі дзяўчыны — але тая трымалася з імі зусім не як з роднымі.

— Праходзьце смялей, узбірайцеся, — паслужліва сакатала паненка з венікам. — Фундамент вельмі трывалы... Гаспадар будаваў для сябе. Снег яшчэ не сышоў, але я пачышчу кавалачак, каб вы зірнулі на якасць бетону.

— Сколька метраў падвал? — дзелавіта пацікавіўся дзядзька.

— Амаль сорак квадратаў, — адказала дзяўчына, саскрабаючы снег шуфлікам з ганка. — Вы ж ведаеце: падмурак — палова будоўлі…

Соня разявіла рот ад абурэння.

— Што вы тут робіце? — выскачыла яна з-за паветкі і пабегла ў бок дзіўнай кампаніі. — Гэта мой дом!

Тройца агаломшана ўставілася на дзяўчыну і Васю, які маячыў у яе за спінай.

— Гэта, мусіць, дачка ўладальніка, — апамяталася першай дзяўчына з венікам.

— А эта, відна, зяць, — іранічна прамовіла сталая жанчына, кіўнуўшы ў бок Васілеўскага.

— Зяць любіт взяць, — дадаў яе спадарожнік, і пара гучна разрагаталася, паказваючы залатыя зубы.

— Я на хвіліначку, — сказала паненка з венікам і спрытна саскочыла з ганка.

Падышоўшы да Соні, яна ўсміхнулася так непадробнашчыра, нібы пабачыла найлепшую сяброўку. Ейныя словы,

нячутныя яе спадарожнікам, аднак, зусім не спалучаліся з прыязнай усмешкай:

— Як там цябе… Света? — засіпела золатавалоска.

— Мяне?.. Соня.

— Што ты сабе дазваляеш?

— Гэта ў вас трэба спытацца…

— Ты хоць ведаеш, які гэта квэст — прадаць попелішча? У вас жа, калі снег сыдзе, уся праўда на Божы свет вылезе. А яшчэ інтэрнэт! Людзі правяраюць такія рэчы. Гэтыя хоць інтэрнэтам не карыстаюцца. Рэальны шанц на ўгоду — а тут ты скачаш.

— Прадаць?.. Гэта ж наш дом! Ён не прадаецца!

— Прадаецца — і яшчэ як. Ужо трэці месяц.

— Можа, вы памыліліся?

— Ну зараз — памылілася, — хмыкнула дзяўчына. — Я з другога курса ў прафесіі… Табе CV паказаць? Тваё прозвішча ж Сінічка?

Соня кіўнула. Яна, праўда, так і не зразумела, што гэта за паненка і што яна збіраецца паказаць.

— Спадар Пётр казаў пра непаўналетнюю дачку... Ён звярнуўся ў нашу фірму пасля Новага года. З таго часу спрабуем прадаць ваш надзел. Але, відаць, давядзецца зніжаць цану.

— Тата не можа прадаваць дом! — вылупіла Соня вочы. — Гэтага не можа быць…

— Не, ну ты з ім сама неяк разбярыся. А я тут скончу, — рыэлтарка развярнулася і пайшла да сямейнай пары, якая тым часам дзелавіта аглядала падворак.

Падлеткі выйшлі на вуліцу і яшчэ крыху патапталіся каля скутара. Вася праціраў свайго «Самурая» анучкай, а Соня прытулілася да халоднай сеткі-рабіцы, як сіротка, якую выкінулі з дому. Рыэлтарка паказвала кліентам, дзе падведзеныя газ і каналізацыя. Азяблымі пальцамі Соня колькі разоў запар набрала бацьку. Той не азываўся.

— Твой продак няхіла праганяе, — сказаў Вася, калі яны ўселіся на скутар. — Я б на тваім месцы запатрабаваў долю.

— Адвязі мяне дамоў, — сказала Соня, і Вася зноў зразумеў яе, як мае быць.

x x x

Назад ехалі даўжэй, затое без экстрыму. Вася прызнаў, што выехаць на кальцавую паспяшаўся, да таго ж язда без шаломаў — гэта не справа, таму вярталіся па горадзе, прычым збольшага — уздоўж каналаў, па сцежках і алеях, пужаючы бабулек з сабачкамі і цётачак з дзіцячымі вазкамі. Вася старанна аб'язджаў лужыны, каб не заляпаць Соніну куртачку.

Адным словам, Соня ўшчэнт занудзілася. Рукі задубелі без пальчатак, нос і шчокі абветрыліся. Згадаўшы пра жахлівы асфальт на Цнянцы, Соня паторгала Васю за куртку.

— Чаго ты? — спытаўся той, спыніўшыся.

— Высадзі мяне каля царквы. Я пешкі дайду.

— Ды ладна, давай да канца давязу.

— Не трэба, высадзі тут.

Паціснуўшы плячыма, Вася накіраваў «Самурая» да прыпынку каля царквы. На святлафоры з'ехаў на дарогу і загальмаваў каля бардзюра. Соня саскочыла на ходнік і крыху замарудзіла, сцягваючы са спіны Васеў заплечнік.

— Лёша… Дзякуй табе, — сказала яна правільныя ў гэтай сітуацыі словы. — Было вельмі здорава з табой ездзіць. Мапед — адпад. Ведаеш… Ты — мой найлепшы сябар сярод хлопцаў. І я люблю цябе як брата!

— Без балды? — заззяў Васілеўскі.

— Ага, без балды… Ведаеш што? Прыходзь заўтра на мой «дээн». У «Кеглю». А сёмай, — сказала Соня і хуценька чмокнула Васю ў няголеную шчаку.

Сам не свой ад шчасця, хлопец даў па газах і, здаецца, парушыў нейкае правіла, бо на яго забібікалі адразу дзве машыны.

Але Соню гэта ўжо не хвалявала. Яна мелася забыцца пра Васева існаванне, як толькі ён ад'едзе ад яе на сто метраў…

— Я вось не разумею: а другі табе навошта?

Соня павярнула галаву на голас. Крыху ўбаку ад прыпынку на ходніку стаяла Ротмістрава. Адна з яе фірмовых доўгіх спадніц, спадаючы на ярка-зялёныя боты, вытыркалася з-пад палітончыка такога хіпоўскага крою, што, здавалася, яно трымаецца на ўладальніцы з дапамогай усяго аднаго гузіка. На руках у Машы былі стракатыя непальскія рукавічкі, на галаве — такая ж шапачка. За плячыма — здаровы квадратны заплечнік з чорнага брызенту.

З усёй гэтай нефармальнай раскошай слаба стасавалася клятчастая чаўночная торба, якую Ротмістрава раз'юшана спрабавала зашпіліць. Торба была набіткаваная таўсценнымі кнігамі, таму маланка не слухалася. Паваліў мокры снег і верхнія фаліянты пачало прыцярушваць. Урэшце Ротмістрава рэзка скінула з сябе заплечнік, паставіўшы яго на прарэх у торбе.

— Навошта табе двое? — паўтарыла яна пытанне. — Гэта ў нізкапрыматыўных істот пытанне прэстыжу ці як? І рыбку з'есці, і на паравозіку пакатацца?

— Маша, я не разумею, чаго ты ад мяне цяпер хочаш, — сказала Соня агаломшана. — Што я табе зрабіла?

— Ды нічога, — пацiснула плячыма «ашка». — Проста цікава назіраць за тваімі паводкамі.

Тут да прыпынку пад'ехаў масіўны джып, і высокі мужчына, які з яго выйшаў, ухапіў торбы і пацягнуў да багажніка. Соня развярнулася і пайшла на святлафор. «Раўнуе. Адназначна раўнуе да Статкевіча», — задаволена канстатавала яна, збягаючы па сходах у нетры цнянскага парку.

x x x

Што, Ротмістрава, абломчык выйшаў? Як ты там сказала? «Нізкапрымітыўныя істоты»? Можа, ты ўся з сябе высокая

і непрымітыўная, але «кіндл» — у Соні! І зусім хутка яна даведаецца, чым скончыцца гісторыя Томэка Вільмоўскага, а потым верне дэвайс Максіму. Яна ўжо запампавала туды «Quo Vadis», як ён і прасіў.

А потым Соня падорыць яму падарунак на іх агульны Дзень нараджэння. Яна яшчэ не вырашыла, як усё абставіць: зранку вярнуць «кіндл» і адразу падарыць падарунак, ці толькі вярнуць «кіндл», а падарунак — за святочным абедам з торцікам і барселонскімі фоткамі, як абяцала мама Юля. Але падарунак яна ўжо купіла, і гэта — кніга па найноўшай гісторыі, якую так любіць Максім.

Каля вялізнага каменя з надпісам «Беражыся кляшча!» Соня збочыла ў лес. Тут — для далучаных — бегла ледзь прыкметная вузкая сцежка, якую пратапталі Статкевічы з суседзямі. Тры хвіліны напрасткі — і Соня ў «лялечным доме». У Краіне Фараонаў. У Даліне Цароў. У Космасе. У нірване.

Зараз яна вернецца дадому і сустрэне маму Юлю, а заўтра яны ўсе адсвяткуюць Сонін і Максімаў Ідэальны Дзень Нараджэння.

Хочаш насмяшыць бога — раскажы яму пра свае планы. Шаснаццацігадовым недаступная гэтая простая жыццёвая мудрасць. Яна адкрываецца толькі сямнаццацігадовым.

Раздзел IX

# НАЧНОЕ КАПУЧЫНА

Соня прачнулася а гадзіне ночы і зразумела, што да раніцы не засне. Вечаровы сон — самы салодкі з усіх, якія дораць нам біярытмы. І, як і за ўсё салодкае, арганізму даводзіцца за яго расплачвацца. Кнігу яна дачытала, так што заняцца не было чым. Намацаўшы нагамі тапачкі, дзяўчына вырашыла схадзіць у купальню, а потым усё-ткі паспрабаваць заснуць. Заўтра — дакладней, сёння — насычаны дзень, і варта правесці яго без цёмных мяшкоў пад вачыма.

Усё пайшло не па графіку яшчэ звечара. Замест прывітальнай вячэры са Статкевічамі яна займела шквал эсэмэсак ад мамы Юлі. Яшчэ перад абедам тая спавясціла Соню, што яны шчасліва прызямліліся ў Вільні і ўжо стаяць у чарзе на літоўскай мяжы і, з усяго відаць, а пятай будуць дома. Чарга, аднак, слаба рухалася — кожную гадзіну мама Юля дасылала зводку: «Будзем а шостай... сёмай... восьмай... Мінулі літоўцаў», але ў выніку ад няма чаго рабіць стала страчыць мікрарэпартажы з жыцця КПП «Катлоўка» кшталту: «Танчым на нейтральнай паласе полечку са студэнтамі ЕГУ».

«Будзем позна. Вячэрай без нас! Да заўтра ;)» — нарэшце напісала яна, калі ў Мінску была сёмая вечара. Але Соня і так ужо хапанула з духоўкі мяса па-французску — каронную страву таты. Пасля вячэры яна і заснула.

Яна выслізнула з пакоя. У доме было ціха, але гара валізак і каляровых пакетаў у калідоры падказвала: Статкевічы дабраліся дадому і так стаміліся, што, не распакаваўшыся, паваліліся спаць. Стараючыся не шоргаць тапкамі па падлозе, яна пацягнулася ў купальню.

…Калі Соня зноў адчыніла дзверы купальні, то абамлела: на калідоры з рукамі ў кішэнях мяккіх трэнікаў і беласнежнай футболцы стаяў Максім. Пабачыўшы яе, ён здзіўлена прыўзняў бровы і прысвіснуў.

— Ты вярнуўся? — ускрыкнула Соня, але тут жа заціснула сабе вусны далонню, каб не пабудзіць усяго дому.

— А дзе сланы? Пайшлі на вадапой?

Соня агледзела сябе і войкнула. Яна стаяла на калідоры, у чым заснула — кароткіх шортах у абліпку і паласатай саколцы. Максім фыркнуў і зайшоў у купальню.

Калі ён прыехаў? Соня ламанулася ў свой ружовы пакойчык і, натыкаючыся ў цемры на мэблю, намацала каля падушкі «кіндл». Пашнарыла па падаконні, шукаючы дрот. Праз хвіліну яна ўжо пільнавала каля дзвярэй хлапечага пакою.

— Трымай. Дзякуй вялікі, — працягнула яна «кіндл» гаспадару, калі той параўняўся з ёй на калідоры.

— Прачытала ўсяго Томэка? І як табе? — лагодна спытаўся Максім, забіраючы кніжку.

— Ух! — закаціла вочы Соня. — Космас… А, я там табе «Quo Vadis» запампавала.

— Дзякуй, пачытаю, — кіўнуў галавой хлопец. — І Томэка таксама. Калі шчыра, мне ніколі не прыходзіла да галавы, што тамоў ажно дзевяць.

— Калі ты вярнуўся? Ты ж мусіў быць толькі зранку, на цягніку…

— Пару гадзін таму, амаль адначасова з нашымі. Знаёмыя ехалі ў Мінск на машыне, падвезлі. А ты не чула хіба, як мы валізы цягалі?

— Не-а. Я моцна спала... А што алімпіяда? Ты, вядома ж, усіх перамог? — хітра прымружыла вока Соня.

— А то. Аж няёмка. Ніякай інтрыгі.

— Крута! Віншую!

Тут бы ім раскланяцца і разысціся па пакоях, але Соні чамусьці здалося, што Максім не спяшаецца сыходзіць… Яна вельмі павольна павярнулася да сваіх дзвярэй, ліхаманкава думаючы, пра што б яшчэ ў яго спытацца. Але ён загаварыў першы.

— Дарэчы, пра віншаванні. З днём народзінаў цябе! І, прынагодна, мяне. Ужо можна.

— Аёй! І праўда! — схамянулася Соня. — Стой тут!

І яна зноў ламанулася ў свой пакойчык і зноў, спатыкаючыся і набіваючы гузакі, пачала абмацваць усе паверхні, пакуль не кранулася шурпатага пакета на туалетным століку.

— Гэта табе! — выскачыла яна з пакоя, як зязюля з гадзінніка. — Яна вельмі баялася, што Максім усё-ткі сышоў, хоць яе не было нейкіх секунд пятнаццаць.

— Дзякуй, — здзіўлена прамовіў Максім. — «Лі Харві Освальд у Мінску»? А, я чытаў электронны варыянт, — дадаў ён, зазірнуўшы ў пакет. — Але ўсё адно дзякуй. А мне табе няма чаго падарыць… Зрэшты… — і тут Максім таямніча ёй усміхнуўся. — Хадзем кавы зраблю.

— Ты што! — жахнулася Соня на словах, хоць сэрца ў яе шалёна закалацілася ад эйфарыі без усялякай кавы. — Палова на другую ж!

— А калі гэта нас спыняла? — і Максім па-змоўніцку пстрыкнуў пальцам па носе Освальда на вокладцы кнігі.

— Але твая мама…

— Калі ты не будзеш так крычаць, яна не прачнецца і не заўважыць.

Максім акуратна паклаў Сонін падарунак на шкляны столік каля канапы і, стараючыся не шамацець пакетамі, што прывезлі бацькі, выцягнуў бляшанку «Лавацці».

x x x

На Восьмае сакавіка мама Юля падарыла сабе прафесійную кава-машыну. То бок дарылі, згодна з паштоўкай, знойдзенай у фільтры, «верныя і адданыя мужчыны», але гаспадыня дому так спрытна падрыхтавала глебу, што ў таты Віці не заставалася выбару, апроч як раскашэліцца на гэты сучасны адпаведнік норкавага футра. Прынамсі, адпавядалі кошты. Соня як дачка рэстаратара прыкладна іх сабе ўяўляла. Таму яна абыходзіла наварочаны агрэгат вялікімі коламі, каб нават выпадкова не зачапіць яго, не кажучы пра тое, каб выцадзіць з яго якое эспрэса. Але Максім цягам нейкіх пяці хвілін смела раскачагарыў апарат — і неўзабаве яны сядзелі поруч за барнай стойкай над здаровымі кубкамі капучына з цынамонам.

Сонін мозг адмаўляўся верыць рэшце цела: носу, які адчуваў пах італьянскай кавы, вуснам, белым ад салодкай малочнай пенкі, голай каленцы, якая, калі яе крыху зварушыць управа, краналася калашыны Максімавых мяккіх штаноў, абуджаючы жвавых матылькоў у жываце. Ёй сямнаццаць гадоў. Яна сядзіць уночы на кухні з хлопцам сваёй мары, і яны вось проста так п'юць каву.

Ціша была такой чароўнай, што здавалася блюзнерствам парушаць яе. Так магла прайсці вечнасць — а Соня не заўважыла б.

Але ціша ўсё-ткі была парушаная — Максімавым голасам.

— Я не ведаю, — сказаў ён.

— Чаго? — не зразумела Соня.

— Ты неяк пыталася, кім я хачу стаць. Дык вось, я не ведаю кім.

— Чаму ты цяпер пра гэта?

— Ды так. Згадалася. У нас з табой няшмат агульных тэм… Вось ты, — працягваў Максім, уперыўшыся ў чорны экран тэлевізара перад сабою, — як ты вызначыла, што хочаш стаць настаўніцай англійскай?

— Ды проста… Гартала даведнік. Матэматыку здаваць не трэба — і на тым дзякуй. Па-англійску я размаўляю кепска — дык хоць навучуся. Але настаўніцай я быць не хачу.

— Дык навошта тады будзеш паступаць? Займаць чужое месца?

— Ну чаму чужое? Паступлю — будзе маё. А так… — Соня задумалася. — Паступаю, бо ўсе паступаюць. Так трэба. Але не факт, што паступлю, — уздыхнула яна і зарылася носам у кубак.

— А я вось увогуле не хачу ва ўніверсітэт. Ні ў які, — сказаў Максім. Соня ўтаропілася ў яго, як у гуманоіда.

— Як гэта — не хочаш? Ты ж можаш паступіць у любы. Увогуле ў любы.

— Менавіта таму не хачу, — панура сказаў хлопец. — І гэта не панты: я праўда не хачу. У мяне няма спартыўнага азарту, бо я загадзя ведаю вынікі тэкстаў. У мяне няма ніякай уцямнай мары. І гэта дзіка прыбівае.

— А як жа Лондан? Школа эканомікі?

— А, гэта мой тата мяне туды ўпарта паступае. Дастаў ужо, — уздыхнуў Максім. — Ты не ўяўляеш, які гэта кашмар, калі бацця на цябе ціснe.

— А вось і ўяўляю, — амаль пахвалілася Соня. — Мой, думаеш, на мяне не ціснe? Ведаеш, што заявіў? Што аплаціць мне вучобу толькі ў наргасе! А ў лінгвістычным — не! І што ім гэты менеджмент даўся? Як мёдам намазана!

— Ха, дык яны ў нас з табой самавукі. Вывучалі эканоміку на калькулятарах у шоп-бусах Варшава — Мінск, калі мы на гаршках сядзелі. І няблага вывучылі, трэба сказаць. Вось мой, скажам. Такую імперыю збудаваць з нуля... Няхай і ў дзевяностыя — тады ўсё іначай было, але ўсё-ткі. Ведаеш, я сваім бацем шчыра захапляюся!

— І я сваім. Яны крутыя!

— Але ў гэтым уся праблема. Ведаеш, адкуль гэтая школа эканомікі выплыла? Тата гадоў пяць таму туды трапіў

на летні семінар для айцішнікаў. На «курсы павышэння кваліфікацыі», як тут сказалі б. Ён там месяц тусаваўся з рознымі знакавымі таварышамі, навязаў кантакты, увайшоў у кібернетычны бамонд. Яму сам Стыў Джобс руку паціснуў. Я вельмі выразна помню, як ён пра гэта мне ўзахлёб расказваў. Але ўсё адно хаўрусуе ён з гэтай усёй элітай на нейкіх птушыных правах. Бо, па сутнасці, як быў савецкім інжынерам, так і застаўся. Я нічога не маю супраць савецкіх інжынераў, яны вельмі пазітыўныя і вынаходлівыя. Але ў таты — сапраўдны комплекс. І вось ён, як жанчына, якая ўсё жыццё марыла быць балерынай, але не выйшла фігурай, прымушае дачку хадзіць у харэаграфічную вучэльню. Хоць той на танцы фіялетава. Можа, яна хоча аўтагоншчыцай зрабіцца. Або матэматыкам.

— Як трапна ты параўноўваеш сябе з дзяўчынкай-балерынкай, — з'едліва пракаментавала Соня, і Максім штурхануў яе ў бок.

— Толькі яшчэ слова! Касцей не збярэш!

Але выйшла гэта ў яго зусім не зласліва, а неяк нават юрліва.

— Дык, значыць, тата хоча, каб ты атрымаў заходнюю адукацыю замест яго? — спыталася Соня.

— Ага. З самага дзяцінства прагружае, што я буду там вучыцца, — уздыхнуў Максім. — Спачатку я гэта прымаў як належнае, але чым далей, тым больш мяне накрывала: з чаго раптам? Мне ягоная праца зусім нецікавая.

— Але ж тата Віця не такі звер! Няўжо ён хоча паламаць табе лёс? — засумнявалася Соня.

— Ды не звер, вядома, — адказаў хлопец, адсёрбнуўшы кавы. — Ён мяне кожнага разу, як у нас размова заходзіць, пытаецца: скажы, куды ты хочаш, калі гэта сапраўды сур'ёзна, я не буду пярэчыць. А я не магу. Не магу выдумаць, што я хачу стаць доктарам або адвакатам, бо гэта няпраўда. Я не ведаю, кім хачу стаць, я нікім стаць не хачу.

— Дык яшчэ не вечар…

— У тым і бяда, што вечар… У нас у Беларусі дзіўная завядзёнка — выбіраць прафесію ў сямнаццаць гадоў. Лепш бы я тады застаўся ў Лондане... Там, па-першае, вучацца да васямнаццаці, а па-другое, яшчэ пару гадоў ніхто не парыцца, кім быць. І толькі як павучацца крыху — вызначаюць. Або ўвогуле перад універсітэтам едуць па свеце, спасцігаюць жыццё. А тут — я проста абавязаны паступіць у гэтую клятую школу эканомікі, але так неадкладна, нібы гэта сапраўды нейкі наргас і нас суседзі засмяюць, калі я правалюся. Я не разумею: куды спяшаецца тата? У мяне ад выразаў кшталту «згубіць год» вушы вянуць.

— Ты не рады, што вярнуўся ў Беларусь? — запыталася Соня, захлопаўшы вачыма.

— Я не рады, што з’ехаў з Брытаніі.

— Чаму?

— Бо там засталіся сябры, — сумна сказаў Максім. — Яны, праўда, праз год пасля мяне таксама раз’ехаліся, але тады я гэтага не ведаў… Я мог застацца ў Брытаніі ў інтэрнаце, давучыцца і адразу паступіць з іх атэстатам. Але, як ты разумееш, мама была ў шоку ад самой думкі пра гэта. А цяпер — чорце што. Я атрымліваю беларускі атэстат і мушу вяртацца туды як замежны студэнт, хоць вучыўся ў англійскай школе.

— А калі ты давучышся, ты вернешся ў Беларусь?

— Ты разумееш, цяпер са мной тая самая фігня. Цяпер я не хачу з’язджаць з Мінска. Мне паўсюль добра. Але тры гады нада мной вісела татава ідэя фікс, што я мушу вярнуцца ў Лондан. І цалкам імаверна, калі я там буду вучыцца, мне не захочацца з’язджаць і адтуль.

— Там ёсць дзе працаваць?

— У таты застаўся брытанскі офіс. Але ён нязначны. Хутчэй паказны. Фінансавыя справы адбываюцца на Кіпры, а асноўная праца — тут. Я думаю, што тата хоча, каб я з Лондана кіраваў усімі міжнароднымі справамі «Стар сістэмз».

— Ух ты! — акругліла вочы Соня.

— Гэта толькі гучыць крута. На справе я бачыў гэтую кухню… Разумееш, каб нечым кіраваць, мне не трэба вучыцца ва ўніверсітэце. Але брытанская «корачка» патрэбная для сувязей, для пантоў, вось, маўляў, наш малады дырэктар — выпускнік прэстыжнага ўніверсітэта і бла-бла-бла. Мяне гэта дзіка раздражняе, хоць я і разумею, чаму тата гэта ўсё робіць.

— І чаму?

— Усё проста, — зноў уздыхнуў Максім. — Ад твайго, здаецца, адмовіліся?..

— Што?.. А — у дзетдоме? Ну, так, — кіўнула Соня.

— То бок твой тата не ведаў, хто ён і адкуль. А мой ведаў, бо яго аднялі дашкалёнкам ад пітушчай маці. У нейкай вялікай вёсцы пад Барысавам. Тата, калі быў ужо дарослы, знайшоў тую вёску. Ён ніколі не расказваў нават нашай маме, што ён там пабачыў, але факт — там быў жасткач. Разумееш, тата выдатна ведае, адкуль ён выйшаў. І для яго паняцце «дынастыя» — святое. Ён вельмі хоча заснаваць дынастыю. З усімі гэтымі манаршымі наваротамі. У яго светлых марах ягоныя дзеці — раўнапраўныя фігуранты сусветнай айцішнай «арыстакратыі». Ён рукаўся з Джобсам, дык мая мэта, мусіць, Цукерберг, — прамовіўшы апошняе прозвішча, Максім нервова гігікнуў.

— Твае сябры… Ты вельмі па іх сумуеш? — спачувальна спыталася Соня. Яна згадала фотку: Дэн, украінец, ягоная сястра Ксеня і японскі хлопчык, імя якога яна не запомніла.

Максім пацiснуў плячыма.

— Раней вельмі сумаваў. У нас нават група ёсць у пошце, мы пісалі лісты ўчатырох. Гэта пачалося, калі я з’ехаў. Але цяпер абменьваемся мэйламі гады ў рады. На дні народзінаў. О! — падняў ён угару палец. — Трэба мэйл спраўдзіць.

— Але наша школа… Хіба ты там ні з кім не пасябраваў? У цябе ёсць цікавыя аднакласнікі, — асцярожна спытала Соня.

— Ведаеш, не так цяжка зблізіцца з кімсьці. Але калі ведаеш, што ўсё адно давядзецца развітвацца… Я гэтага не разумею. Вось Марк Бергер адразу пасля школы з'едзе да дзядзькі ў Ізраіль. Але ён усё адно завязаў раманчык з аднакласніцай! Гэта несур'ёзна.

— А калі раптам гэта не раманчык, а каханне на ўсё жыццё? — горача запярэчыла Соня. — Можа, яны застануцца разам, нягледзячы ні на што?

— Ну, гэта тэхнічна немагчыма, — саркастычна прамовіў Максім.

— Нейкі ты нерамантычны, — прабурчэла Соня.

— Я ж казаў: не магу трываць усю гэтую ружовую муць.

— А па мне, здорава заводзіць сяброў тут і цяпер, — натхнёна сказала Соня. — Няхай вы развітаецеся… Але ты не страчваеш — ты набываеш. Калі твой аднакласнік з'едзе ў Ізраіль — значыць, цяпер у цябе ёсць сябар у Ізраілі. Па-мойму, так ты толькі widen your horizons.

— І праўда. Лінгвістычны, Сінічка, па табе плача. З гэткім вымаўленнем.

І тут ужо Соня пхнула ў бок Максіма.

— Разумееш, — прамовіў той, крыху памаўчаўшы, — самае цяжкае з гэтым брытанскім паступленнем, што вучыцца ў Англіі халерна дарага. Апроч таго, што трэба плаціць за вучобу, там яшчэ трэба жыць і харчавацца. У таты адзін з самых салідных бізнесаў у краіне, але сваіх грошай не так шмат. За нейкія тры гады яны ўсё спусцяць на мяне. І я нават не асабліва нешта магу зрабіць, бо ў Англіі замежным студэнтам забаронена працаваць больш чым адзін дзень на тыдзень. А калі вучыцца ў тым рэжыме, як хоча тата, пяцігодку за тры гады, то працаваць і не будзе калі. Я буду на бацькоўскім утрыманні. Цалкам ад іх залежны. І ведаючы, колькі бабак у мяне ўбухваюць, буду маральна абавязаны гэта адпрацаваць. Такія справы.

— Але ты такі таленавіты… Я думаю, абавязкова існуюць нейкія стыпендыі, якія ты можаш выйграць, — Соня прыгадала абвесткі пра вучобу за мяжой на сайтах з серыяламі.

— Скаларшыпаў да халеры, — Максім сутаргава правёў рукой па валасах. — Але разумееш… У Полацку на алімпіядзе быў хлопец з Гомельшчыны. Ён каторы год прыязджае, бо займае першае месца ў вобласці, але яшчэ ні разу не браў дыплома на рэспубліцы. І сёлета ён быў як ніколі блізкі — над ім правялі рысу. Быў бы ў яго хоць які дыплом — паступіў бы ён у твой лінгвістычны без іспытаў. І калі ўручалі дыпломы, па ім было відаць, як гэта важна для яго, як ён прагнуў перамагчы. І ў мяне раптам паўстала адчуванне, што я, якому на свой першы дыплом пофіг, займаю ягонае месца. Бо ні ў які лінгвістычны, зразумела, не збіраюся. І калі я выйграю брытанскую стыпендыю, якая на справе больш патрэбная якому-небудзь філіпінскаму хлопчыку з сям'і за рысай беднасці, бо гэта яго адзіная дарога да мары… У мяне зноў будзе адчуванне, што я займаю чужое месца. Хоць, зразумела, гэты гомельскі сам вінаваты, што прайграў алімпіяду, бо быў недастаткова дакладны. Але пачуццё віны нікуды не дзяваецца.

— Карацей, у цябе выбар: абабраць уласнага бацю або абабраць беднага філіпінскага хлопчыка, — дзелавіта падсумавала Соня, і абое засмяяліся.

А потым зноў запанавала ціша. Яны дапівалі каву і глядзелі на чорны экран плоскага тэлевізара. Нічога не хацелася гаварыць.

А што, калі б Максім зараз спытаўся: «Соня, можна я цябе пацалую?» — уявіла сабе Сінічка, але тут жа адагнала прэч гэтую думку. Гэта сапсавала б святасць моманту. Тое, што адбылося, — доўгая, шчырая размова — узрушала больш за любыя пацалункі. Максім аказаўся зусім не цынічным і нават высакародным. Вось што ён хавае пад сваёй непрабівальнай бранёю. Яна будзе даражыць яго прызнаннямі.

х х х

Усё добрае аднойчы заканчваецца — нават кава ў паўлітровым кубку. Або яна астывае, і піць яе ўжо немагчыма.

Максім пазяхнуў і перавёў позірк на барную стойку. Сподкам з фруктамі проста ў яго перад вачыма быў заціснуты нейкі аркуш. Ён ляжаў тут з мінулага тыдня, Соня колькі разоў працірала стойку, але пацікавіцца, што за аркуш, ёй неяк не прыйшло да галавы. Максім жа рассеяна выцягнуў яго з-пад сподка, распрастаў па стале і стаў вывучаць ягоны змест. Соня таксама з цікаўнасцю ўперылася ў паперку. Бо гэта была законная нагода прыцісну́цца да Максімавага пляча…

…Калі яна зразумела, што гэта за паперка, яна пабялела. Потым пачырванела. Потым у галаве ейнай пранеслася: гэта канец. Канец усяму.

— Мама! — раз'юшана крыкнуў Максім на ўвесь дом. — Мама!!!

Ён скамячыў аркуш у кулаку і за тры скокі заляцеў на другі паверх. Соня з усіх ног кінулася за ім.

— Што гэта такое?!! — прарыкаў Максім, сунуўшы змяты аркуш проста пад нос спужанай мамы Юлі, якая стаяла на парозе спальні, спешна завязваючы пояс халата. За ейнай спінай, уключыўшы начнікі абапал ложка, выблытваўся з коўдры тата Віця.

— Божухна, навошта так крычаць? — з палёгкай уздыхнула кабета, пабачыўшы аркуш. — Я думала, нешта здарылася.

— Гэта, па-твойму, «нічога не здарылася»?! Ты звар'яцела?!

Аркуш фармату А3 уяўляў з сябе праектную прапанову архітэктурнага бюро. На адной яго палоўцы быў план «лялечнага дома» — першы і другі паверхі. Ён быў абазначаны чорным колерам. Сінім колерам на другой палоўцы аркуша да кожнага паверха была дарысаваная прыбудова. Той, хто калі-кольвек бачыў дом Статкевічаў жыўцом, лёгка зразумеў

бы, што архітэктар прапанаваў даставіць да катэджа яшчэ адно крыло — амаль такі самы дом, толькі крыху меншы, упоперак галоўнага. Новая частка будыніны заняла б увесь траўнік з левага боку, працягнуўшыся амаль да плота, за якім высіўся лес. У выніку дом прыняў бы від літары Г. Прыкладна па гэткай схеме звычайна пашыраліся родавыя маёнткі ў якім-небудзь Хэмпшыры. Агульны выгляд сядзібы можна было ацаніць на трохмернай карцінцы ў ніжнім правым куце аркуша.

Але юных рэцэнзентаў зачапіў не новы выгляд дома, а план, на якім кучаравым почыркам мамы Юлі былі зробленыя пазнакі.

Так, на першым паверсе новага крыла, дзе планаваўся такі ж вялікі пакой з аб’яднанай кухняй, як у асноўным доме, была адгароджаная прасторная святліца з асобнай купальняй. У гэтай кратцы было напісана: «Пецькаў пакой».

Але самае цікавае пачыналася на другім паверсе. Там было тры пакоі, якія выходзілі ў агульны калідор, і мама Юля падпісала іх так: «Гасцявы пакой», «Спальня Соні і Максіма» і… «Пакой малой».

У новым крыле меркаваўся асобны ўваход, але гэта маме Юлі не спадабалася, таму яна прамалявала дзверы з адной кухні ў іншую.

— Мама, што гэта такое? Што за хрэнь ты тут панапісвала? — ашалела крычаў Максім, тыцкаючы пальцам у план другога паверха. — Якая яшчэ «малая»?

— А, гэта? — радасна заўсміхалася Юлія Статкевіч. — У вас будзе дзяўчынка.

— Але…

— Гэта не абмяркоўваецца! Дзяўчынка — і ўсё тут!

— Але, мама Юля… Мы з Максімам не збіраемся жаніцца... Мы нават сустракацца не плануем!

— Не плануеце цяпер, сплануеце ў чацвер, — хітра паглядзела на дзяцей кабета.

— Мама, ты хоць помніш, колькі мне гадоў? — не сунімаўся Максім.

— Помню, вядома. З днём народзінаў, дарэчы. Са згоды бацькоў ужо можна.

Максім адчайна завыў, а потым, злосна паглядзеўшы на Соню, выпаліў:

— А нічога, што Сінічка — апошняя, з кім бы я ажаніўся?

— Што-о-о? Ды гэта ты — апошні, за каго б я… Вельмі ты мне патрэбны, казёл самазакаханы! — выпаліла Соня.

— Віця, ты толькі паслухай — яны нават сварацца, як сямейная пара! — замілавана прасакатала мама Юля. Тата Віця, аднак, не падзяляў ейнага энтузіязму. Ён крануў яе за плячо, нібы просячы спыніцца.

Соня ліхаманкава пракруціла ў галаве намаляваны мамай Юляй сцэнарый яе шчаслівай будучыні. Выходзіла, што замест універсітэта Соні свеціць вялікае пуза і ружовыя пялюшкі. Не, ну вядома ж, аднойчы яна хоча стаць мамай, але ж не адразу пасля выпускнога! Лепш ужо наргас, чым дэкрэт.

— Мама, колькі цябе прасіць — перастань сунуць нос у маё жыццё! — Максім раз’юшана махаў планам. — Я думаў, што да ўсяго прызвычаіўся, але гэта ўжо занадта!

— Мне хіба ўжо і памарыць забаронена? — какетліва абурылася мама Юля. — Я ж так жартавала… Але сам праект канчатковы. Мы з татам вырашылі пабудаваць супольны дом з Сінічкамі.

— Што-о-о-о? — разявіла рот Соня.

У гэты момант на другі паверх узняўся ейны тата. Ён выглядаў як ніколі змораным. Але, пачуўшы апошнюю фразу і пабачыўшы твар дачкі, спужана ўсміхнуўся і сказаў як мага лагоднейшым голасам:

— А, усе вярнуліся!.. Ну і добранька! Заўтра пагаворым. А то я з ног валюся.

І, хуценька прашмыгнуўшы па калідоры, схаваўся ў сваім пакоі.

— Яны што, вечна будуць жыць тут? — з напорам спытаўся Статкевіч.

— Максім, гэта негасцінна!

Максім развярнуўся і шпарка пайшоў па калідоры. Соня ламанулася за ім, схапіўшы яго за футболку проста на парозе пакоя.

— А ну, стой! Аддай паперку! — загадала яна.

— Ды забірай! — рыкнуў Максім, кінуўшы план на падлогу. — І не размаўляй са мной дома! — дадаў ён, ляснуўшы на развітанне дзвярыма.

«Лялечны дом» гудзеў, як трансфарматар. У хлапечым пакоі незадаволена енчыў абуджаны Вадзік. У дарослай спальні на павышаных тонах перамаўляліся мама Юля і тата Віця. Соня, сама не свая ад злосці, падняўшы з падлогі аркуш, з грукатам расчыніла дзверы татавай спальні.

Той сядзеў на ложку, корпаючыся ў мабільніку.

— Ты мне тэлефанавала, — сказаў ён, узняўшы галаву на дачку. — Я тэлефон дома пакінуў.

— Ты можаш патлумачыць, што гэта такое? — сказала Соня сурова, працягнуўшы тату скамечаны план.

— Гэта? — тата вінавата заўсміхаўся. — Соня, я збіраўся табе сказаць, калі будзе нейкая пэўнасць, але пакуль нічога толкам не вызначылася…

— Праўда? А я так бачу, усё даўно вызначылася. Прычым без мяне і за мяне! — яна ткнула яму пад нос схему. Зірнуўшы, тата нахмурыў лоб і зноў перавёў позірк на дачку:

— Ну, гэтыя надпісы, дапусцім, — Юльчыны фантазіі.

— А тое, што мы прыбудуем свой дом да іхняга, — таксама яе фантазіі? А тое, што ты прадаеш надзел з падмуркам, — чые фантазіі? Мы з Васем туды сёння ездзілі і бачылі рыэлтарку, якую ты наняў, і пакупнікоў!

— Дачка, сядай. Трэба пагаварыць.

— Ды што ты кажаш, татачка? — уключыла Соня іронію. — Чатыры месяцы я ў яго пытаюся, што там з домам, —

і чую адны адгаворкі. А тут нам раптам пагаварыць спатрэбілася. Даўно не бачыліся!

Тата пацягнуў яе за руку і пасадзіў поруч з сабой на ложак.

— Ладна, Соня, не бузі і слухай, — ён уздыхнуў, сабраўшыся з думкамі, і працягнуў:

— З домам нашым усё выйшла няпроста. Я доўга раіўся з Віцем, хадзіў да юрыстаў — падаваць у суд на Мінгаз няма сэнсу, працэс зацягнецца на гады, а кампенсацыю мы наўрад ці адсудзім. Збудаваць дом наноў я не пацягну — здароўе не тое, дый імпэту, калі шчыра, паменела. Апроч таго, рэстарацыя займае ўсё больш часу, а прыбытак змяншаецца. Да таго ж цяпер ёсць больш важныя рэчы — тваё паступленне, напрыклад, на вучобу таксама патрэбныя грошы. Так што я думаў-думаў і надумаў надзел з падмуркам прадаць, а замест яго купіць нам кватэру.

— Але тата… Дом — гэта тое, што мы… Што ты абяцаў матулі над магілай, — патухлым голасам сказала Соня, апусціўшы галаву.

— А таксама я абяцаў ёй, што выгадую цябе разумнай адукаванай дзяўчынкай. З домам выйшла як выйшла — дык цяпер мне важна не праваліць другую місію… Але даслухай да канца, — тата зноў цяжка ўздыхнуў і паправіў на носе акуляры. — За пятнаццаць гадоў, што мы валодаем гэтым надзелам, ён істотна падаражэў. Нам яго выдавалі ледзь не як дачу, а цяпер гэта амаль горад. Яго можна няблага прадаць, але ёсць нюансы: выбух газу, цяжкасці афармлення… Карацей, выявілася, што за такія грошы мы можам сабе дазволіць тут і цяпер або аднапакаёўку ў нашым раёне, або двушку ў Чыжоўцы. А на гэта я дакладна пайсці не магу, проста таму, што псіхалагічна цяжка — пасля мары пра ўласны дом.

— Тата, але мы столькі гадоў жылі ў інтэрнаце! — перапыніла яго Соня. — Што нам пасля такога аднушка!

— Яно, вядома, так, але ж… Карацей, я падзяліўся нашымі праблемамі з Віцем і Юляй, і яны самі прапанавалі дапамогу.

Соня тарганулася:

— Навошта ім нам дапамагаць?

— Соня, паслухай, гэта сапраўды неблагі варыянт. Будаваць дом з нуля складана, але можна разбудаваць ужо гатовы дом. Гэта будзе танней і хутчэй па дакументах. Па Віцевых падліках, збудавацца можна менш чым за год! І мы зможам дазволіць сабе вялікі мураваны дом за меншыя грошы. Мы ашчадзім на матэрыялах, бо адна сцяна, лічы, ёсць… Апроч таго, калі падзяліць суму ад продажу надзелу на некалькі дэпазітаў, то з аднаго можна аплачваць тваю вучобу, з другога — гасіць крэдыт на новую машыну, і на будоўлю застанецца яшчэ прыстойная сума! Фармальна дом будуць будаваць Статкевічы, але ў выніку мы аформім яго на сябе!

— І мы паселімся там, каб я нараджала ўнукаў маме Юлі, а потым перадавала на яе палову праз акенца ў кухні? — саркастычна падсумавала Соня.

— Соня, у Юлькі багатае ўяўленне, але тваё асабістае жыццё — твая справа. Прыводзь у дом каго хочаш, хоць Васю свайго. Я зараз кажу толькі пра саму магчымасць мець прыстойнае жытло ў прыстойным раёне. А са Статкевічамі мы, па-мойму, няблага ладзім. Што нам замінае быць ім добрымі суседзямі?

— Вось што, тата, — сказала Соня, як след паразглядаўшы пумпоны на тапачках. — Уласнік надзелу па дакументах ты. А па сумленні — і я таксама. І мама, хоць яе няма з намі… Ты можаш прадаць дом і ўкласці грошы ў кватэру, або новую будоўлю, або новую машыну, або маю вучобу, але я табе гэтага ніколі не дарую. І мама не даруе. Дабранач.

Калі Соня прымкнула за сабой дзверы ружовага пакойчыка, «лялечны дом» канчаткова ацiх. Заснуў спакойным сном рэспектабельнага катэджа ў англійскім стылі, так, нібы ў ім не адбушавалі толькі што лацінаамерыканскія жарсці.

## Раздзел X

# НІНАЧКА EX MACHINA

Першы ўрок апошняй чвэрці Соня праспала. Яна са здзіўленнем выйшла з пакоя. Раней, калі не спрацоўваў будзільнік, па яе душу абавязкова прыходзіла мама Юля, але выглядала на тое, што сёння пра Соню ўсе забыліся. Тата спаў; больш у доме не было ні душы.

Соня аўтаматычна апранулася, пакідала ў заплечнік нейкія падручнікі і сшыткі і, не паснедаўшы, выйшла з дому. Толькі пасярод казачнага лесу яна зразумела, што не хоча ў школу.

Яе сямнаццаты дзень народзінаў, які яна адзначыла ўчора, быў самым змрочным днём народзінаў у ейным жыцці.

Дваццаць дзявятага сакавіка пачалося на Верасовай яшчэ ў той атмасферы. Зранку, калі старэйшыя Статкевічы прачнуліся апоўдні пасля цяжкай дарогі, выявілася, што Максім забарыкадаваўся ў пакоі і не рэагуе на сістэмныя запыты. Вадзік, які выпаўз на кухню паласавацца прывезеным з Барселоны хамонам, ужо не змог туды вярнуцца. Замест таго каб рыхтаваць святочны абед, мама Юля рыдала, прыгаршчамі піла валяр'янку і благала тату Віцю, каб той пагаварыў з сынам. Але старэйшы Статкевіч, утыкнуўшыся ў працу, рабіў выгляд, што нічога не адбываецца.

А пятай гадзіне, калі мама Юля, наплакаўшыся, сядзела ў фатэлі з мокрым ручнікам на лбе, са сходаў пачуліся крокі.

Максім, апрануты на выхад і з заплечнікам за спінай, спускаўся ўніз, несучы ў руках новыя красоўкі.

— Ты куды?!! — падскочыла мама Юля.

— Гуляць з сябрамі, — адказаў хлопец.

— З якімі яшчэ сябрамі? Хто табе дазваляў?!!

— Не твая справа!

— Як ты размаўляеш з маці? Віця, скажы яму! Віця!

Зноў зарыдаўшы, жанчына кінулася на другі паверх.

— Каб а дзясятай быў дома! Інакш не ведаю, што табе зраблю!!! — крыкнула яна са сходаў і, мяркуючы па грукаце дзвярэй, схавалася ў спальні.

Максім выйшаў з дому. Тата Віця панура паглядзеў яму ўслед, але не прамовіў ні слова, адно клацаў клавішамі камп'ютара.

Соні таксама трэба было збірацца. Яна сяк-так апранулася, сяк-так нафарбавалася і паехала ў боўлінг-клуб «Кегля», дзе мелася адзначыць свае народзіны з дзяўчатамі і Васем.

Усё прайшло даволі звычайна. Супольны падарунак ад Галі і Снежкі, піца, кола, апошнія плёткі. Потым прыехаў Вася, падарыў Соні букет руж і падбадзёрыў дзяўчат згуляць пару партый на кеглях.

Пасля імпрэзы Вася паехаў адганяць у гараж свайго ненаглядннага «Самурая», Снежка хуценька развіталася і выправілася начаваць да таты, а Галя і Соня паехалі дадому на тралейбусе.

Галя ехала да канцавой, а Соня выйшла каля царквы, тамсама, куды яе надоечы падвозіў Вася. На прыпынку, абняўшыся, стаялі Лена Канькова з Ванем Каланіцкім і пра штосьці жарсна шапталіся.

Каханне і так зрабіла Ваню і Лену падобнымі адно да аднаго, але, відаць, яны пастанавілі давесці падабенства да абсалюту. Доўгія валасы ў абаіх цяпер былі заплеценыя ў дрэды і завязаныя ззаду ў пышныя хвосцікі. Соня павіталася з парачкай і, усміхнуўшыся, павадзіла рукамі вакол сваёй галавы.

— Калі адрастуць — пажэнімся! — весела сказала Лена, матлянуўшы касматым хвастом.

— Дзірык вас раней налыса пастрыжэ, — скептычна сказала Соня.

— Не пастрыжэ, — засмяяўся Ваня. — Пераможцаў алімпіяды свету па фізіцы не стрыгуць. Мы ўзялі залаты медаль у Осла. Лабановіч нам за такое гэтыя дрэды да самага выпускнога падплятаць будзе.

— Што, праўда? — узрадавалася Соня. — Вы ездзілі ў Нарвегію?

— Так. Акурат адзначалі гэта, — сказаў Ваня. — Але ты, мусіць, у курсе. З намі ж быў Максім.

— Чаму я мушу быць у курсе? — адвяла Соня вочы ў бок. — Ён мне не дакладваецца.

— Мы даведаліся, што Ротмістрава выйграла «рэспу» па рускай мове, і прапанавалі ёй разам адзначыць, — патлумачыла Лена. — У апошні момант да нас далучыўся Максім, які ў Полацку ўзяў першы дыплом па інглішы. Яго Машка запрасіла.

— Праўда? І куды вы хадзілі? — спыталася Соня як мага больш абыякава.

— У боўлінг.

— Цікавае супадзенне. Я таксама зараз з боўлінга. Дзень народзінаў адзначала, — сказала Соня.

— О так, хацела спытацца, адкуль букет. Віншую! — зычліва сказала Лена. — А маглі сустрэцца. Мы таксама спярша ў «Кеглю» збіраліся, Ротмістрава нават дарожку там замовіла. Але Максім усё перайграў, і мы сустракаліся ў «Біг Лебоўскі». Гэта ве-е-ельмі пантастае месца тут, на Цнянцы, пры тэнісным корце. І школьнікаў туды як бы не пускаюць, але Максім там усіх ведае. І ён за ўсё заплаціў, бо ў яго сёння дзень народзінаў… О, Соня, у вас што, у адзін дзень народзіны? Вось дзе супадзенне! Мы толькі адтуль. Нагуляліся так, што будзь здаровы… А Максім і Машка яшчэ на нейкі

рок-канцэрт паехалі, у Ротмістравай музыкі знаёмыя, яна хацела Статкевічу аддзячыць за вечар. І нас запрашала, але мы па сваёй праграме, а яны…

Пакуль Канькова гаварыла, яны з Каланіцкім не размыкалі абдымкаў, і ў нейкі момант хлопец далікатна пачаў пляскаць яе па спіне, маўляў, годзе, ты што, не бачыш? На Соню, мусіць, страшна было глядзець. Букет белых руж матляўся ў апушчанай руцэ і падмятаў прыпынак, вочы вылупленыя. Каля горла стаяў такі знаёмы даўкі камок. Вусны перасохлі.

У Каланіцкага завібраваў мабільнік.

— Таксоўка! — ажывіўся ён.

Хуценька развітаўшыся, закаханыя пабеглі цераз дарогу, туды, дзе спынілася машына.

Соня панура паплялася ў «лялечны дом». Яна прыспела яго такім жа маркотным, як і ўдзень, калі сыходзіла.

У яе не было наўпроставых доказаў, але яна пачувалася так, нібы Ротмістрава скрала ейны дзень народзінаў. Падслухала тады на прыпынку, калі бачыла іх з Васем, што яны збіраюцца ў боўлінг, і арганізавала ўсё тое самае. І нават хацела заявіцца ў той жа клуб з крутой кампаніяй. І з Максімам. Вядома, усё гэта гучала як поўнае трызненне, але Соня праклінала ўсё на свеце: паездку з Васем, шпіёнку Ротмістраву, дурны татаў план і архітэктурную гіперактыўнасць мамы Юлі… Але, калі разабрацца, вінаватых не было. У выніку заставалася шкадаваць сябе. Чым Соня і занялася — з усім мазахізмам, на які была здатная.

Максім вярнуўся дадому адразу пасля поўначы. Яна пачула грукат дзвярэй і хрыплы ад слёз голас мамы Юлі на калідоры.

x x x

Панурая і маркотная, Соня збочыла са сцежкі, якая вяла ў школу, у бок універсама, дзе папіла нашча распушчальнай

кавы ў кафетэрыі.Ператрывала сутаргі ў страўніку, які даўно не зазнаваў кантакту з гэткай гадасцю, і пайшла далей. Перайшла дарогу, занурыўшыся ў такі знаёмы шэры лес дзевяціпавярховікаў…

Ногі самі вялі яе да інтэрната, у якім яны з бацькам пражылі шмат гадоў перад тым, як усё змянілася. Знаёмыя расхлябаныя дарожкі з выбоінамі, поўнымі мутнай вясновай жыжы. Газоны, з якіх злез снег, агаліўшы смецце і сабачыя какашкі. Імжа.

Соня ведала, куды ідзе. Пасля ўсяго перажытага ёй раптам захацелася на канапу ў пакойчыку Надзеі Барысаўны. Папіць гарбаты з зефірам. Проста пасядзець памаўчаць. А можа, і паплакаць. Расказаць пра ўсё, што адбылося за апошнія месяцы. І пра ўсё, чаго так і не адбылося.

Сваёй сяброўкі-бібліятэкаркі Соня не бачыла шмат месяцаў. Яна дакарала сябе, што не развіталася з ёю. Але выправіцца ніколі не позна. Цётухна, мусіць, узрадуецца, убачыўшы яе…

Перад абклееным абвесткамі пад'ездам інтэрната яна прыкмеціла іншую знаёмую постаць.

— Вера Аркадзеўна! — радасна дагнала яна колішнюю суседку з паверха. — Як вы? Вам дапамагчы?

— Сонька, ты? — ахнула бабулька, паставіўшы торбы з пакупкамі на лаўку. — Нізашто не пазнала б… Як ты вырасла! І папрыгажэла… Ну дзеўка… У госці прыйшла ці як?

— У госці… Да Надзеі Барысаўны, — кіўнула Соня.

— Да Надзенькі? — узмахнула рукамі Вера Аркадзеўна. — Гэх… Спазнілася ты, Сонька.

— Яна што?..

— Ды не. Усё з ёй добра, цьху-цьху-цьху. З'ехала яна. З інтэрната і з Беларусі.

— Куды? На Урал? — агаломшана спыталася Соня. Яна цьмяна прыгадала, што Надзея Барысаўна перыядычна дасылала лісты ў праграму «Чакай мяне», спрабуючы адшукаць свайго вайскоўца.

— На які яшчэ Урал? У Берлін! Унук у яе ў Нямеччыне нарадзіўся! Дык сын яе туды і перавёз. Як толькі вы пераехалі, ён з'явіўся, пачалі дакументы афармляць. А пасля Новага года яна і выселілася.

— Вось яно што… А як жа кнігі?

— Ай… З кнігамі такая катавасія была... Яна іх і па бібліятэках раздавала, і ў букініст цягала… І па людзях дарыць спрабавала, дык ніхто не браў тую макулатуру. Вой! — стукнула сябе па лбе Вера Аркадзеўна. — Яна ж табе цэлую скрынку пакінула. Збор твораў нейкі. Пісьменніка Дзікава. Ведаеш такога?

— Можа, Дыкенса?

— Мо і Дзікенса. Скрынка ў ейным калідорчыку месяц стаяла. Але ж вы як з'ехалі, нікому сваіх тэлефонаў не пакінулі… Усе ж прызвычаіліся, што вось вы тутачка, насупраць — а як выселіліся, то і канцы ў ваду... Надзенька очынна прасіла цябе знайсці.

— Дык дзе тыя кнігі? — сказала Соня дрыжачым галасам. — Я б забрала.

— Няма іх ужо, — сумна паківала галавой пенсіянерка. — У Надзеньчын пакойчык маладая сям'я засялілася — і адразу ўсё на сметнік. Я калі пабачыла, таго Дзікава ўжо і снегам замачыла, і абы-што там было — каша з паперы. Так іх, мусіць, камунальнікі і вывезлі… Ну а ты, Соня, можа, зойдзеш? Адведаеш нашых? Я аладак зраблю.

— Не, дзякуй, — панура сказала дзяўчына. — Мне ў школу пара.

— Але ж як Надзенька шкадавала, што не змагла з табой развітацца… Так шкадавала…

Усё-ткі часам бывае надта позна.

У Соні зашчаміла сэрца ад таго, што так атрымалася з Дыкенсам. Ад таго, што суседзі не змаглі іх адшукаць. Ад таго, што цяпер ужо наўрад ці давядзецца пабачыцца з той, хто зрабіла ёй столькі добрага. З іншага боку, цяпер

Надзея Барысаўна не такая самотная — яна побач з сынам і маленькім унукам. Так што ўсё да лепшага.

Соня ўскінула галаву. Валасы адрослага карэ заказыталі падбароддзе. Апошняга яе схову больш не існуе. Зона камфорту беспаваротна знішчаная. І гэта знак, што не варта хавацца. Што б яе ні напаткала, трэба прыняць гэта з адкрытым забралам.

Тэлефон запілікаў. Паведамленне з паштовай скрынкі: Соні прыйшло ажно два мэйлы. Вельмі дзіўна — мэйлам дзяўчына карысталася хіба для таго, каб лагініцца ў «кантакціку». Заінтрыгаваная, яна загрузіла пошту...

Там былі лісты з вынікамі спробнага НЦТ. Соня села на лавачку і стала выводзіць на экран ведамасці. Інгліш. Чорт! Яна не разлічвала на завоблачны бал, але лічба, якую яна пабачыла, яе проста забіла. Два месяцы зубрэння — і пшык. Руская мова. Тут палепей, але ж…

Ясна як дзень: у лінгвістычны на бюджэт Соня ніколі не паступіць.

Што ж, і гэта трэба прыняць. Трэба ўвогуле прымаць жыццё такім, як яно ёсць, а не праз ружовыя акуляры.

Добра знаёмай сцежкай Соня выправілася ў школу.

x x x

— Здарова, Сініца! Ты адкуль тут?

— А мы думалі, ты захварэла!

— З днюхай!

Толькі пачаўся трэці ўрок — гэта была фізра ў 11 «Д». Вельмі дарэчы — Соня праслізнула ў школу праз спартыўную залу, абмінуўшы галоўны ўваход, шатню, вахцёрку, дзяжурных, а магчыма, і дзірыка з завучамі. Прабегшы па зале пад прывітальныя крыкі аднакласнікаў, яна ўвайшла ў дзявочую шатню.

Форму яна, вядома ж, забыла. Гэта значыць, давядзецца выкручвацца перад фізручкай.

Яна пабачыла найлепшых сябровак у шатні на лавачцы. Галя ўжо ўлезла ў кеды і спартыўную форму, а Снежка, мусіць, і не думала пераапранацца. Яна ляжала на каленях у Галі і ўсхліпвала. Соня тут жа забылася пра свае праблемы — у Сняжаны яўна здарылася вялікае гора.

— Што з ёю? — заклапочана спыталася яна ў Галі.

— Зрабілася ахвярай прагрэсу, — адказала тая.

— У сэнсе?

— У сэнсе інтэрнэт — зло… Ну, учора, памятаеш, італьянец? — ціха працягнула Галюня. — Які каля яе круціўся. І калі мы дадому ехалі, яна схлусіла, што едзе да таты начаваць, а сама ў боўлінг вярнулася. Яна ж гэтаму італьянцу зацерла, што ёй дваццаць гадоў. А ён яе на дыскатэку запрасіў. Ну, Снежка пільнасць страціла, спыталася ягонае прозвішча і проста за сталом зафрэндзіла яго ў фэйсбуку.

— І што?

— Той яе адразу дадаў… А ў яе ж у профілі дата нараджэння! Я думаю, ён проста вырашыў не звязвацца з малалеткай... І яны з таварышам адышліся ціпа ў прыбіральню і проста звалілі! Снежка там патыкалася, патыкалася, не знайшла яго і дадому паехала… А сёння зранку адчыняе інтэрнэт — а там усё завалена ягонымі фоткамі з той самай дыскатэкі, толькі пазней на пару гадзін. Ён там быў ужо з нейкай іншай дзеўкай. Прыгожай і, трэба думаць, сапраўды дваццацігадовай.

— Прыгожай? Курыца яна абшчыпаная!!! — выгукнула Снежка і зноў зайшлася ў рыданнях.

— Ну, Снежка яму адразу месагу ўваліла. Маўляў, як ты мог, навошта табе яна, я лепей… А ён прачухаўся, відаць, пасля гарачай ночкі і такі адказвае, бамбіна, я не разумею, што за прэтэнзіі. Ю а світ гёрл, але знайдзі мяне праз годзік. Чао. А Снежка яму і піша, ай лав ю, дарлінг! Ай міс ю! Так і напісала, Сініца. Я сама бачыла.

— Што ты разумееш? Я сапраўды яго кахаю-ю-ю! — завыла Снежка.

— А ён яе ўзяў і заблакаваў. Вось толькі што, на хіміі. Снежка ад нечаканасці прабірку з лакмусам на канспект выліла. Да канца ўрока яшчэ неяк пратрымалася, але цяпер — во, — скончыла Галя справаздачу, сумна кіўнуўшы сабе на каленкі.

— Што тут адбываецца? Чаму не ў зале? Званок звінеў не для вас? — незадаволена паморшчылася Ала Юр'еўна, зазірнуўшы ў дзявочую шатню.

— Я зараз іду! — сказала Галя.

— А ў мяне… нага вельмі баліць! — схлусіла Соня.

— Так… А ў Кавалёвай што баліць? Я так разумею, душа?

— Ала Юр'еўна, яе ўчора хлопец кінуў! — заступілася Галя за сяброўку. — Бачыце, у якім яна стане?

— Анягож, трагедыя… — сказала фізручка з іроніяй. — Нехта са школьных аболтусаў?

— Не… Джава-а-ані! — азвалася Снежка, размазваючы вадкія смаркачы па твары.

— А божухна, — адказала Ала Юр'еўна. — Знайшла гора. Супакойвайся давай. Забудзеш ты заўтра свайго Джавані, знойдзеш сабе нармальнага нашага Ванюшу і будзеш з ім усё жыццё мучыцца.

Гэткая вясёлкавая перспектыва выклікала ў Снежкі новы прыступ плачу.

— Ала Юр'еўна, я з ёй тут пабуду, — сказала Соня. — Бачыце, яе нельга адну пакідаць.

— Ну што з вамі паробіш, — уздыхнула фізручка. — На наступным уроку адпрацуеце абедзве. Вайтовіч, шыхтавацца давай!

Галя акуратна пераклала Снежку са сваіх каленак на Соніны і выйшла з шатні.

Некаторы час Снежка ціха ўсхліпвала, а Соня моўчкі гладзіла яе па галаве, як маленькую. Нарэшце, крыху аціхшы, Снежка прамовіла:

— Соня… Я такая няшчасная… Гэта так балюча: мець надзею — і раптам яе страціць… Ты сабе не ўяўляеш.

— І праўда, не ўяўляю, — ціха адказала Соня і горка ўсміхнулася.

x x x

Пасля фізры, пазычыўшы ў дзяўчат лішні пакецік, Соня ўвапхнула ў яго куртку ды шапку і пад выглядам спартыўнай формы панесла з сабой на ўрокі. Яна ўздымалася на другі паверх па сходах, што вялі ад сталоўкі і спартыўнай залы на школьную «біржу»…

На «біржы», на той самай выгоднай банкетцы каля акна, сядзеў Максім і чытаў нешта з «кіндла». Соня спынілася ад нечаканасці, загледзеўшыся на яго скрозь парэнчы. Сонца вызірнула з-за хмар, рассыпаўшы мядзяныя яскаркі па яго каштанавых валасах… Але тут жа згасла, бо краты парэнчаў засланілі фальбонкі клятчастай спадніцы.

— This is my spot!* — пачула яна гуллівы голас Ротмістравай. — Што ты чытаеш?

— Адгадай!..

— А божа ж, я гэта яшчэ ў восьмым класе прачытала. Лямур-тужур пад соусам ранняга хрысціянства!

— Ага, я вось спрабую зразумець, за што аўтару далі Нобелеўку…

Соня знайшла ў сабе сілы і працягнула ўздымацца па сходах. Цяпер трэба прайсці праз іх. Што ж, калі яна вырашыла быць моцнай, яна мусіць прыняць і гэта.

Яна прамінула «біржу» спакойна, ні разу не азірнуўшыся. Магчыма, за ёй у гэты момант цікавалі дзве ўважлівыя пары кплівых вачэй. Але яна з усіх сіл намагалася пераканаць сябе, што ёй няма справы.

* Гэта маё месца! *(англ.)*

У такім стане яна самнамбулічна пасунулася па калідоры і, вядома ж, наляцела на Ніначку. Класная схапіла вучаніцу за локаць.

— Сінічка, як добра, што я цябе сустрэла! Ты мне патрэбная.

Быць патрэбнай Ніначцы — у гэтым было штосьці экзатычнае. У русіцы з «дэшкамі» быў падпісаны своеасаблівы пакт пра ненападзенне. Тая, вядома, крычала на іх на ўроках, але ў душу нікому не лезла — і нават класныя гадзіны, а дакладней, класныя пяціхвілінкі ладзіла добра калі раз на месяц. І гэта пры тым, што набліжаўся выпускны і арганізацыйных спраў усё прыбывала. Навошта, калі можна вырашыць усю «цякучку» на ўроку рускай мовы…

Нічога не разумеючы, Соня слухмяна пайшла з настаўніцай на чацвёрты паверх, у лабаранцкую.

У цесным пакойчыку без вокнаў, заваленым кнігамі і кардоннымі тэчкамі, яны селі на рыпучыя крэслы абапал хісткага стала. Ніначка дзелавіта пакорпалася ў моднай, але абтрапанай ужо сумцы са штучнай скуры, выцягнула новенькі чырвоны нататнік і разгарнула яго на старонцы, дзе ейным нервовым почыркам сіняй гелевай асадкай было тлуста выведзена: «Соф'я Сінічка». Далей ішлі нейкія пазнакі. Соня вылупіла вочы ад нечаканасці.

— Соня… — адкашляўшыся, пачала класная. — Ты ведаеш, што мой, так бы мовіць, абавязак — правесці з усімі вамі гутарку наконт вашай будучыні пасля школы. Наконт прафарыентацыі… Дык вось… Ты ўжо вызначылася, куды будзеш паступаць?..

— Я… Вы толькі не смейцеся, калі ласка, — адказала Соня.

— Ну, давай, паспрабую.

— Мне вельмі хацелася б у лінгвістычны. На англійскую мову. Але… — і яна пераказала Ніначцы свае сённяшнія балы за спробнае НЦТ, а таксама размову з татам,

у выніку якой яна, цалкам імаверна, увосень стане студэнткай наргаса.

— З матэматыкай у цябе не надта, — сказала Ніначка, пастукаўшы пальцам па старонцы нататніка. Соня ўздыхнула.

— Ведаеш што? Я тут, мусіць, салідарная з тваім бацькам, — працягнула русіца. — У лінгвістычны табе не трэба… Але гэта і не значыць, што табе трэба ў наргас…

Соня здзіўлена паглядзела на Ніначку.

— Разумееш, — прамовіла тая, зноў адкашляўшыся, але гэтым разам неяк вінавата, — я за апошнія тры гады, лічы, завеліла ўсю педработу па вашым класе. Занятая была толькі асабістымі праблемамі, а вас пусціла на самацёк… І вось нядаўна я падумала, што гэта непрафесійна і нават непрыгожа з майго боку. Я стала разбірацца, наводзіць парадак у вашых справах... Па-новаму прыглядацца да вас. І ведаеш, наш «Д» клас — ён жа цудоўны! Магчыма, адзнакі ў вас не вельмі, але ў кожнага столькі нечаканых граняў, столькі прыхаваных талентаў… Вось ты, Соня. На вакацыях я зайшла ў школьную бібліятэку, і мне прыйшло да галавы прагледзець вашы абанементы. Соня, я не ведала, што ты столькі чытаеш! Я не магу паверыць, што ты брала «Белую гвардыю» пасля нашай паездкі ў Кіеў! І хоць бы слова сказала пра гэта на ўроку пра Булгакава! Бібліятэкарка цябе вельмі добра ведае, і яна мне сказала, што гэтую дзяўчыну лепей характарызуюць не тыя кнігі, якія яна бярэ, а тыя, якіх не бярэ, бо іх проста няма ў школе! Напрыклад, не так даўно ты пыталася пра Яўгенія Замяціна…

Соня маўчала, таму што сапраўды не знаходзіла, што сказаць.

— Ведаеш, я заўсёды чытала твае сачыненні па дыяганалі: была перакананая, што ты іх спісваеш. Але на днях я падняла твае сшыткі за дзясяты клас… — Ніначка так захапілася сваім расследаваннем, што ажно паружавела ад узбуджэння. — Слухай, ты ж сапраўды чытала «Абломава».

І напісала тое, што думаеш! Няхай стыль у цябе не такі складны і мудрагелісты, як у некаторых надта адораных вучняў, — тут яна падціснула вусны, — але ж там было некалькі вельмі трапных і арыгінальных назіранняў. У цябе аналітычныя схільнасці! — урачыста падсумавала яна. — Далей — болей, — працягнула настаўніца, перавёўшы дух. — Я пагаварыла з Дар'яй Аляксандраўнай. Ты, аказваецца, са студзеня ходзіш на факультатыў па англійскай мове… Яна вельмі цябе хваліла. Казала, што ты вельмі стараешся. І яшчэ яна мне паказала адно тваё эсэ, якое дало мне цудоўную ідэю.

— Якое маё эсэ? — напружылася Соня.

— «Мае любімыя пісьменнікі», — адказала Ніначка. — Ты там згадваеш Дыкенса, Тэкерэя і Остэн… І нешта мне падказвае, што гэта ўсё ты сапраўды прачытала…

Ніначка ўзнялася і, пашнарыўшы рукой на адной з паліц, паклала на стол «Даведнік абітурыента».

— На філалагічным факультэце ўніверсітэта ёсць спецыяльнасць «англійская мова і літаратура». Я пра яе добра ведаю, бо чатыры гады пражыла ў інтэрнаце з дзяўчынай, якая на тым патоку вучылася. Яна цяпер выкладае на факультэце замежную літаратуру. І ўсе гэтыя Дыкенсы і Тэкерэі ў нас горкамі ў пакоі ляжалі, таму я вельмі добра ўяўляю, пра што кажу… Соня, у лінгвістычным ты вывучыш мову, але гэта хіба што ўсё. А на філфаку табе будзе вельмі цікава вучыцца, там выкладаюць вельмі шмат літаратуры. І там ты дакладна будзеш на сваім месцы. Здаецца, гэта будзе кампраміс для вас з татам.

Соня маўчала. Яе першай рэакцыяй было абурэнне — якога ляду Ніначка мяшалася ў ейную будучыню? Але тут яна згадала пра знішчаную скрынку з кнігамі Дыкенса, і ў грудзях нешта заварушылася. Ідэя вывучаць англійскую літаратуру падалася ёй не такой ужо кепскай.

— Але з такімі баламі, як у мяне… — нясмела запярэчыла Соня.

— Спакойна. У цябе яшчэ больш за два месяцы, — дзелавіта сказала Ніначка. — І, ведаеш, гэта самае галоўнае, пра што я з табой хацела пагаварыць… Налета тут будзе гімназія, і з намі перазаключаць кантракты. І нешта мне падказвае, што з кепскімі настаўнікамі Андрэй Васілевіч абыдзецца не лепш, чым з кепскімі вучнямі. А мне як педагогу, калі шчыра, няма чым пахваліцца. І ў мяне, як і ў цябе, таксама ёсць толькі два з паловай месяцы... Таму я прыдумала факультатыў па падрыхтоўцы да НЦТ па рускай мове. Факультатыў пачынаецца мінімум ад дзесяці вучняў. У мяне ўжо ёсць пяцёра з «Г» і двое з «А»… І вось з цябе я пачынаю кропкавую агітацыю ў нашым класе... Заняткі бясплатныя! А ў якасці бонусаў — некалькі ўрокаў з выкладчыкамі ўніверсітэта. Ну як, Соня? Я цябе пераканала? Можна цябе запісваць?

Соня вагалася, і сумневы адбіваліся на яе твары.

— Ну ладна, — засмяялася Ніначка, — раз не разумееш па-новаму, скажу па-старому. Калі ты не запішашся на мой факультатыў, улетку мяне звольняць і мне не будзе чым карміць дзяцей!

Жарт спрацаваў. Соня звонка рассмяялася — і ёлкі пыл неправетранай каморкі трапіў ёй у нос і горла. Яна пачала чхаць і кашляць, а Ніначка замітусілася, адчыняючы дзверы і шукаючы папяровыя насовачкі…

— Алергія на кніжны пыл, — задумліва сказала сама сабе Ніначка, калі Соня, задыхаючыся, пабегла ў прыбіральню. — Трэба тут прыбрацца, — азірнулася яна, рашуча трасянуўшы грыўкай. — Разабраць к чортавай мацеры ўсю гэтую макулатуру!

Раздзел XI

# ДЫЯГНАЗ — ПАСТУПЛЕННЕ

Апошні аўторак красавіка быў адным з тых дзён у годзе, калі не хацелася прачынацца. Але Соня зрабіла высілкі і разляпіла павекі. Сонца біла ў шыбы, але яна не дала сябе падмануць і, раскрыўшы мансардавае вакно, высунула руку. Інтэрнэт не памыляўся. Было па-травеньску ясна, але дзьмуў моцны, халодны, яшчэ сакавіцкі вецер. Выдатныя ўмовы, каб загарэць і прастудзіцца адначасова.

З люстэрка над туалетным столікам на яе зіркнулі апухлыя вочы ў сетцы чырвоных пражылак. Апошнія пару тыдняў Соня не засынала, не паглядзеўшы пару-тройку эпізодаў з серыяла пра вампіраў. Дый засынала пасля такога гледзіва неспакойна, трывожна, з адпаведным ікласта-крывавым відэашэрагам замест салодкіх сноў. Напрыклад, сёння Соня сніла, што яе нарэшце пакусала каралева вампіраў і ёй не давядзецца больш прачынацца зранку. Але яна ўсё адно прачнулася.

«Лялечны дом» быў ахутаны магільнай цішай. Сяк-так спарадкаваўшы сябе ў купальні, дзяўчына вярнулася ў пакой і неахвотна расчыніла шафу, адкуль на яе высыпалася гара скамечаных шмотак — цёплых і лёгкіх, старых і новых. Соня не прыбіралася тут з зімы. Папоркаўшыся крыху ў гэтай стракатай куламесе, яна выцягнула мінулагоднія чорныя джынсы

і стары гольф, таксама чорны. Зграбла астатнюю вопратку і як было — камяком — запхнула назад. Перад люстэркам сцягнула кончыкі адраслага карэ ў два неахайныя вузельчыкі. Фарбавацца не мела сэнсу — усё адно вочы апухлі. Намацала ў шуфлядцы камоды цёмныя акуляры. Адшукала ў куце стаптаныя салатавыя кеды з мінулага лета. У выніку атрымаецца нейкі аграрна-гатычны лук, але сёння гэта тое што трэба.

Есці не хацелася абсалютна. Соня згатавала вады маленькім электронным імбрыкам, які нядаўна пасяліўся на тумбачцы, і запарыла каву з пакеціка. Апякаючыся і дзьмухаючы на кубак, паспешліва выпіла гэтую саладжавую гадасць. Канчаткова прачнулася.

Выйшла на калідор і пагрукалася да таты. Адказу не было. Пачула шум вады ў «дарослай» купальні. Значыць, тата таксама ўстаў. Увайшла ў пакой, узяла са століка ключы ад машыны. Праз хвіліну ўжо была на падворку.

Дзе мама Юля ўсё гэта трымае? Гараж! Соня згадала, што ключ ад гаража вісіць у вітальні. У гаражнай паўцемры адшукала патрэбнае — рыдлёвачку, матычку, кавалак старой прасціны на анучы. Спакаваўшы ўвесь рыштунак у ружовае пластыкавае вядро, зачыніла гараж і, на хвілінку забегшыся ў дом, каб павесіць ключ, пашыбавала на вуліцу.

Аднак далёка яна не прасунулася. Проста перад ёю, у прахоне веснічак, вырас Максім. Ад нечаканасці яна замёрла на месцы.

Ужо тры тыдні яны ўзаемна ігнарылі адно аднаго. Соня спынілася, не ведаючы, што рабіць. Але Максім паблажліва ўсміхнуўся і загаварыў першым.

— Ну ты і эма, Сінічка! У пясочніцу сабралася? Або магілкі раскопваць?

— А як жа «не размаўляй са мной дома»? — паморшчылася Соня.

— А я пакуль не дома, — хмыкнуў Максім, правёўшы рабром далоні перад сабою, па лініі агароджы. — Так што

давай, пакуль не ўвайшоў, задавай свае шматлікія пытанні, што накапіліся…

Соня падышла бліжэй, разважаючы, як бы ямчэй абмінуць хлопца, каб трапіць да «таёты». Але Статкевіч перагарадзіў ёй дарогу, моцна ўчапіўшыся ў слупы веснічак і напяўшы рукі так, што пад белай кашуляй праступіла мускулатура. Ягоны швэдар быў накінуты на плечы, падпахі — вільготныя. Відаць, ён хутка ішоў праз лес. Соню абдало знаёмым пахам поту, які мяшаўся з учарашнім водарам дарагога спартыўнага дэзіка ў прапорцыі, якая проста зносіла ёй дах.

— Пусці, — грозна сказала яна, шмыгаючы носам. — А то…

— А то што? Цяпкай мяне вытнеш? Спачатку раскажы, куды ты ў такую рань сунешся? Ува ўсіх нармальных людзей выхадны, — тут ён з асалодаю пазяхнуў, прыкрыўшы рот кулаком.

— Значыць, я ненармальная. І так, я іду раскопваць магілкі! Бо ўва ўсіх нармальных людзей, калі ты не ў курсе, Радаўніца. І мы з бацькам едзем да мамы і бабулі.

Максім зніякавеў і на момант аслабаніў рукі. Скарыстаўшыся гэтым, Соня хуценька прашмыгнула ў вузкі зазор паміж хлапечым торсам і слупам веснічак, выпадкова заехаўшы Статкевічу локцем па рэбрах. Той войкнуў ад нечаканасці і развярнуўся за ёю, як сланечнік за сонцам.

Соня адчула гэта спінай, спынілася і, зразумеўшы, што мяч на ейным баку, рэзка крутанулася вакол сваёй восі і пафасна прамовіла:

— А ты, відаць, мне моцна зайздросціш, і таму вырашыў уласную маці загнаць у магілу. Ты хоць уяўляеш, што ўчора дома было?

— Я папярэдзіў, што заначую ў гасцях!

— Ага. Эсэмэскай з левага нумара, які выявіўся недаступным.

— Я вінаваты, што ў Ротмістравай мабілка села?

Ад згадкі пра Ротмістраву ў Соні ледзь заўважна таргануліся кончыкі вуснаў. Але Максім заўважыў.

— Што, Сінічка, раўнуеш?

— Яшчэ чаго… Мне на цябе даўно пофіг. І пофіг, дзе ты і з кім валэндаўся. Але ідзі патлумач гэта сваім бацькам. Ім на цябе яўна не пофіг, хоць наўрад ці такі чэрствы батон, як ты, здольны ацаніць гэта.

Максім зноў хмыкнуў, але гэтым разам менш самаўпэўнена. Соня яўна ўзяла гейм. Тут бы ёй і скончыць партыю, але, падышоўшы да машыны, яна зноў павярнулася і спыталася:

— Новы пароль ад вай-фаю які?

Статкевіч радасна рассмяяўся:

— Што, вечаровы серыяльчык накрыўся?.. Пароль дзіцячы: першыя восем знакаў ліку «пі».

— Гэта якія? — раскрыла рот Соня.

— Пагуглі, — кінуў хлопец цераз плячо і, развярнуўшыся, пашыбаваў да дома.

1:1. Гульня працягваецца.

x x x

Апошні раз мы бачыліся з Соняй амаль месяц таму. У момант, калі жыццё (як ёй здавалася) пачало імкліва абрынацца пасля таго, як усё (як ёй зноў жа здавалася) пачало наладжвацца. Шчаслівай яна была або няшчаснай — тады яна, прынамсі, пачувалася жывым чалавекам. Цяпер жа Соня была робатам, якога штодня зранку да вечара загружалі аднастайным алгарытмамі. Зрэшты, ёй гэта нават падабалася. Кожная свабодная хвіліна, што выдавалася апошнімі днямі, вяртала ў сэрца горыч.

Выйшаўшы ад Ніначкі і перастаўшы чхаць, Соня стала абдумваць нечаканую прапанову класнай. На аўтапілоце

зарулiла на наступны ўрок. Сяброўкi былi ў кабiнеце, Снежка ўжо не плакала, а проста глядзела перад сабою распухлымi вачыма.

— У цябе даведнiк з сабой? — спыталася Соня. — Дай, калi ласка.

Снежка кiнула кнiгу на парту. Соня, прысеўшы на месца Галюнi, разгарнула даведнiк на «англiйскай фiлалогii». Снежка абыякава зiрнула Сонi цераз плячо i раптам балюча схапiла яе за локаць.

— Ай!

— Сiнiца! Гэта лёс! Гэта лёс, Сiнiца!

Соня зiрнула туды, куды сутаргава тыцкаў Снежкiн доўгi палец з накладным пазногцем. Побач з «англiйскай фiлалогiяй» у таблiчцы са спецыяльнасцямi значылася «iтальянская фiлалогiя». I, што характэрна, iспыты былi адны i тыя ж. Толькi конкурсы асобныя.

— Ты разумееш, што гэта значыць? Сустрэча з Джаванi была знакам! Я мушу прысвяцiць будучыню Iталii! Што там трэба здаваць?

Пачакаўшы, пакуль Снежка супакоiцца i ўдосталь памацае i без таго абтрапаны даведнiк, Соня пераказала сваю размову з Нiначкай.

— Пайшлi хутчэй, трэба запiсацца на факультатыў! — падарвалася Снежка.

— Так, але Нiначцы патрэбны яшчэ адзiн чалавек… Каб усяго ў групе было дзесяць.

— Галя!!! — закрычала Снежка ў iншы канец класа. — Iдзi сюды, жыва!..

— Ну нафiг, — гiгiкнула Галя, калi даведалася, навошта патрэбная сяброўкам. Але хiба яна мела выбар?

Так дзяўчаты пачалi двойчы на тыдзень дадаткова займацца рускай мовай пасля ўрокаў. I самi не заўважылi, якператварылiся ў класiчных «паступашак» — абiтурыентак, замучаных бясконцымi тэстамi. Снежка знайшла iнтэнсiўныя

курсы па інглішы. Моўная школа «Апошні вагон», пакпіла Галюня, але з падводнай лодкі нікуды не падзелася. Яе мама правяла выведку і высветліла, што замежнае аддзяленне філфака — даволі інтэлігентны варыянт для маладой дзяўчыны з добрай сталічнай сям'і, але з кепскім атэстатам. Таму Галя магла кпіць колькі заўгодна, але мусіла вярнуць сваё ненаглядная кравецтва з катэгорыі «future profession» назад у «hobby». Галюніна мама адшукала для дзяўчатак рэпетытара па гісторыі Беларусі, якую ім таксама было наканавана здаваць, — гісторыяй яны цяпер займаліся па некалькі гадзін у суботу і нядзелю. Соня пагутарыла з татам і абвясціла, што англійская мова для яе — гэта ўсур'ёз і надоўга. Паабяцала, што, калі не паступіць сёлета на бюджэт у БДУ, з восені пойдзе працаваць і рыхтавацца да паступлення туды, куды ён толькі захоча, але цяпер яна ўсё-ткі паспрабуе ўчапіцца ў хвост сваёй мары. Гэта было вельмі смелае абяцанне, і Соня не надта задумвалася, што будзе, калі на бюджэт яна ўсё-ткі не паступіць. Ёй здавалася, што размова ў яе з татам выйшла вельмі дарослая.

Так што ўжо хутка месяц, як дзяўчаты вучыліся зранку да вечара, без выхадных. Рабілі хатняе заданне ў тралейбусах, спробныя тэсты — на перапынках, а макіяж — у школьнай прыбіральні пасля першага ўрока. Ледзьве ставаўся час на тое, каб есці, спаць і ўвогуле дыхаць. А восьмай Соня прыходзіла дадому, спусташала лядоўню, глядзела на ноч серыял і адрубалася да наступнага ранку. Але правільна сказана: не наеўшыся — не належышся.

А вось Максім жыў зусім іншымі клопатамі. Дакладней, увогуле без іх. Пасля дня нараджэння яго як падмянілі. Быў спартсмен і хатні хлопчык — стаў заўзяты тусоўшчык. І амаль усе вечары ён бавіў з Ротмістравай.

Калі Максім першы раз адпрасіўся «пагуляць з сябрамі», мама Юля нават узрадавалася. Хоць бы таму, што сыну давялося памірыцца з ёю, каб дазволіла. Але паходы ў кіно,

на канцэрты і проста «пасядзець у кавярні» сталі паўтарацца ці не штодня — і калі яму спрабавалі запярэчыць, Максім спакойна адказваў: «Я не пытаюся, ці можна ісці, я проста папярэджваю», — і знікаў да позняга вечара. Праз тыдзень такіх пагулянак мама і сын зноў моцна рассварыліся. У «лялечным доме» зрабілася няўтульна. Мама Юля стала нервовай, злоснай, агульным сняданкам перад школай надышоў канец. Кабета ўвесь час казала, што ў яе баліць галава, і замыкалася ў спальні. Нават Вадзіка ў гімназію колькі разоў адвозіў тата Віця. Гледзячы на Максіма, ён хмурыўся, але маўчаў. Так працягвалася да ўчора, калі апоўначы Максім так і не з'явіўся дома. Соня была заснула, але яе абудзіў плач мамы Юлі і гучны голас таты Віці, які супакойваў жонку, не зачыніўшы спальні. Соня тады перавярнулася на іншы бок і паспрабавала зноў заснуць, але нічога не выходзіла. Недзе а гадзіне ночы маме Юлі прыйшла эсэмэска, і Соня чула, як тая ў экзальтацыі набірае нумар, але не можа дазваніцца.

Загрузіўшы рыштунак у багажнік, Соня залезла на задняе сядзенне «таёты», расцягнулася там, падклаўшы пад галаву падушачку, і занялася тым жа, чым займалася кожную вольную хвілінку — цікаваннем за Ротмістравай. Яна запусціла мабільны інтэрнэт і адкрыла закладку. У Соніным «кантакціку» было ад сілы 50 сяброў, дый тое трацiна з іх — розныя знакамітасці. Маша, такая стрыманая ў школе, у інтэрнэце была проста зоркай. Прынамсі, сяброў у яе было больш за 200, і з усімі імі, калі браць да ўвагі ейную старонку, яна актыўна дачынялася. Колькі разоў на тыдзень яе пазначалі на фотках розныя невядомыя Соні дзяўчаты і хлопцы. Звычайна гэта былі кадры з гульняў «Што? Дзе? Калі?», сэлфі з пагулянак па горадзе або нейкія клубныя тусоўкі… І апошнім часам Ромістрава часта фігуравала побач са Сташкевічам. Нічога такога — зазвычай яны проста стаялі або сядзелі побач, але гэтая няпэўнасць і бянтэжыла. Калі б нехта падлавіў, як яны абдымаюцца або хоць бы трымаюцца за рукі, усё

адразу б зрабілася ясным, а з яснасцю прыйшла б палёгка. А так — калідорныя і інтэрнэтныя пляткаркі 234-й школы ламалі дзіды на тэму, «ці Р. і С. разам». Ад гэтага бясконцага пералівання з пустога ў парожняе, якім займаліся нават Галя са Снежкай, Соні рабілася яшчэ горай.

Уночы ніякіх абнаўленняў у Ротмістравай не было, але цяпер, відаць, папрачыналіся ўдзельнікі чыёйсьці хатняй вечарынкі, і павыскоквалі фота. На адным з іх была пазначаная Маша, але цэнтр кадра складала не яна, а Максім. Пара сядзела на падлозе перад грандыёзнай скураной канапай, патурэцку, у атачэнні дзяўчат, якіх Соня не ведала, зверху з канапы звісалі хлапечыя ногі ў стракатых шкарпэтках. Усе, хто трапіў на фотку, з запалам усміхаліся. Нават Максім. Ён зацікаўлена глядзеў крыху ўбок, на экран тэлевізара, а ў руцэ ў яго была бутэлька піва.

Максімава мама актыўна гойсала па профілях вучняў 234-й школы пад дзявочым іменем Юлія Арцёмава і гэтую фотку калі яшчэ не выпаліла, хутка выпаліць. Будзе новы скандал. Але Соню зачапіла зусім не піва. А тое, што да бутэлькі ў Статкевічавай руцэ нязмушана, па-свойску, цягнула руку Маша.

Што гэта, калі не доказ? Ускосны, але доказ. Соня зарылася галавой у падушку і ляжала так, пакуль тата не прыйшоў у машыну.

x x x

Мама Юля сядзела на канапе ў холе другога паверха і цітутка выла, выціраючы твар лапікамі папяровага ручніка. Скрутак ляжаў побач на шкляным століку. Яшчэ на століку ляжалі ноўтбук, мабільны тэлефон і спустошаная бутэлечка валяр'янкі. Тата Віця хадзіў сюды-туды па калідоры з мабільнікам:

— Слухай, падмяні мяне… У мяне дома «чэпэ»… Пасля абеду пастараюся пад'ехаць… Ну ўсё, давай… Юля, —

працягнуў ён, схаваўшы тэлефон у кішэню пацёртых джынсаў, — прашу цябе, супакойся ўжо…

— Віця, можа, усё-ткі ў міліцыю?

— Якая міліцыя, Юля?.. І содняў не прайшло.

— Ёсць жа валанцёры, яны шукаюць людзей, яны адразу...

— Не накручвай сябе. Проста трэба пачакаць…

— У нас у доме ўвогуле ёсць мужчына?! — мама Юля выбухнула новай серыяй рыданняў, уткнуўшы твар у рукавы хатняй кашулі. — Зрабі хоць што-небудзь! Знайдзі на яго ўшчунак, мяне ён зусім не слухае! Паглядзі, што ён выкідвае! А ты ўвесь час маўчыш!

— Я маўчу? Я — маўчу? — тата Віця стомлена ўздыхнуў — размова гэтая шматкроць паўтаралася за апошнюю ноч. — А хто казаў, каб я не лез да дзяцей са сваімі дзетдомаўскімі метадамі? Хто мне тут расказваў пра ліберальнае выхаванне? Пра тое, што не трэба хлопца кіем заганяць ва ўніверсітэт, што ён сам мусіць зрабіць выбар? І што? І які ягоны выбар? Гэтага ты дамагалася?

Мама Юля ўсхліпвала, не адказваючы. Потым падсунула мужу ноўтбук са здымкам развясёлай моладзі.

— Вось, палюбуйся.

Старэйшы Статкевіч млява зірнуў на фота сына з бутэлькай і спытаўся:

— І што?

— П’е піва.

— І што?

— Як «і што»? Алкаголь… Хто ведае, што там у іх яшчэ? Ведаеш, якія зараз шкодныя наркотыкі?

— Ён дастаткова разумны, каб не пхаць у сябе розную дрэнь. А гэта проста піва… Вось я ў ягоны час…

— Але ў твой час не было наркотыкаў! І потым, ён з дзяўчынай!

— І што? Яму сямнаццаць! Ці ты хочаш, каб ён быў з хлопцам?

— Яна мне не падабаецца!..

— Вось менавіта! Кажаш пра нейкую свабоду выбару, а сама ўвесь час дыктуеш мальцу, з кім і калі яму сустракацца, — тата Віця азірнуўся на дзверы Сонінага пакоя і сцішыў голас. — Паміж намі, Юля, вось гэтае тваё бясконцае сватанне да Пецевай дачкі выглядае вельмі непрыгожа. Я б на месцы Максіма таксама раззлаваўся. І ўвогуле, несправядліва неяк: я не магу і слова сказаць, як і куды яму паступаць, а ты, значыць, у ягонае асабістае жыццё ўлазіць можаш. Не падабаецца яна ёй! Галоўнае, каб яму падабалася.

Мама Юля зноў пацягнулася па папяровы ручнік.

— Ведаеш што, даражэнькая… — працягнуў Віктар Статкевіч, — з дэмакратыяй мы завязваем. Я пагавару з ім, але мы зробім так, як я хачу і як я лічу правільным...

Ён замоўк, бо на сходах з'явіўся Пётр Сінічка. Зразумеўшы, што трапіў у эпіцэнтр сямейнай сваркі, той пачаў апраўдвацца:

— Гэта… Ключы не магу знайсці. Увесь дом абшукаў… — Ён зазірнуў у даччын пакой і працягнуў: — Ну, можа Соня ўзяла… Я пайду.

— Пеця, — сказала, усхліпваючы, мама Юля. — Максіма дагэтуль няма…

— Як няма? — заміргаў вачыма Сінічка. — Я ж з ім толькі што на кухні снедаў. Сядзіць там, сардэлькі наварочвае. Як з галоднага краю. Расце арганізм… Я думаў, вы ў курсе…

Юлія Статкевіч падарвалася з канапы і кінулася да сходаў, але муж схапіў яе за плячо.

— Не трэба, не прыніжайся… Давай мы зараз супакоімся і пагаворым з ім як дарослыя людзі з дарослым сынам, а не як квахтухі з куранём.

І, зноў выцягнуўшы мабільнік, пачаў пракручваць пальцамі кантакты.

x x x

Больш за ўсё на свеце Максіму хацелася спаць. Калі ён паеў, гэта сталася зусім відавочна. Спаць хацелася нават больш, чым у душ. Увушшу звінела, вочы зліпаліся. Калі ён увайшоў у дом, яму здалося, што наверсе нехта размаўляе, але цяпер усё было ціха. Яно і да лепшага. Яго начная выхадка ў вачах бацькоў — форменнае злачынства. А любое злачынства, як вучаць нас Фёдар Дастаеўскі і яго прарок — гэтая прыпыленая Ніна Віталеўна, — цягне за сабой пакаранне. Але ўсё-ткі прыемней адкласці сямейную сцэну да вечара, калі ён крыху ачомаецца.

Але каб жа. Не паспеў ён крануць клямкі ўласнага пакоя, як дзверы бацькоўскай спальні плаўна адчыніліся, і адтуль вызірнуў тата.

— Максім, зайдзі на хвілінку. Ёсць размова.

Калі яны будавалі дом, мама прапаноўвала выгарадзіць тату асобны кабінет, але той адмовіўся, бо любіў працаваць у гасцёўні. Ён увогуле любіў бавіць вольны час на першым паверсе, бо дома бываў рэдка і ўнізе было больш шанцу перасячыся з хатнімі. Але былі сямейныя справы, якія вымагалі камерных умоў. І для такіх спраў — ува ўсіх уласных і здымных кватэрах — бацькі выкарыстоўвалі сваю спальню.

У бацькоўскую спальню хлопчыкі заходзілі не так часта. Пераважна прасіць прабачэння ў мамы, калі нашкодзілі. Або прапыласосіць ці занесці бялізну з сушкі. Яшчэ радзей бацькі запрашалі іх туды самі. На Максімавай памяці такое адбылося ўсяго тройчы. Першы раз — у Полацку, калі тата паведамляў яму, што яны ўсёй сям’ёй выязджаюць за мяжу. Другі раз — у Лондане, калі тата абвяшчаў ужо яму з Вадзікам, што сям’я вяртаецца ў Беларусь. Трэці раз — тут, у яшчэ не дабудаваным доме, калі бацькі сказалі хлопчыкам, што ў вёсцы пад Полацкам памерла старэнькая прабабуля.

— Спадзяюся, усе жывыя? — млява прамовіў хлопец, пераступіўшы парог спальні.

— Не смешна, Максім, асабліва сёння, — адказаў тата. — Сядай.

Максім прызямліўся на крэсла каля камоды, насупраць бацькоў, якія размясціліся на сафе перад ложкам. Ложак быў бездакорна засланы, і мама яшчэ расклала на ім поўны камплект дэкаратыўных падушак — так, нібы пакой збіраліся дэманстраваць новым гасцям. Увесь гэты парад не зневаставаў нічога добрага.

— Ты, мусіць, думаеш, што мы будзем абмяркоўваць твае апошнія выбрыкі, але ты памыляешся, — сказаў тата. Мама, якая сядзела побач густа напудраная, скрыжаваўшы ногі і склаўшы рукі на каленях, кінула на яго гняўлівы позірк і штурханула локцем. Яна яўна была не супраць пачаць менавіта з абмеркавання выбрыкаў. Але тата, не звярнуўшы на яе ўвагі, працягнуў: — Гэтыя дробныя скандалы — марнаванне рэсурсаў. Таму да справы. Як на мяне, ты нерацыянальна выкарыстоўваеш свой вольны час і магутны патэнцыял. Таму я вяртаюся да нашай размовы пра Лонданскую школу эканомікі. З верасня ты павінен пачаць там вучобу.

— Але гэта немагчыма, — трасянуў галавой Максім. — «Эй лэвэл»…

— Менавіта, «эй лэвэл». Праз месяц у Брытаніі — апошні тэрмін здачы адзінага іспыту, таму ты зараз жа туды паедзеш.

— Экстэрнам нельга.

— Усё можна, калі асцярожна. Я толькі што размаўляў з місіс Фішар.

— Дырэктрысай?..

— Так, з дырэктаркай тваёй лонданскай школы. Яна была ў захапленні, калі я ёй пазваніў, і ахвотна дасць табе допуск для іспытаў. Яна вельмі зацікаўленыя, каб выдатнікі здавалі «эй лэвэл» у іх экстэрнам, бо гэта падымае рэйтынг школы, —

тата працягнуў Максіму бліскучую флэшку. — Яе памочнік пераслаў мне патрабаванні, спробныя тэсты і ўсё такое. А заўтра зранку ў нас з ёй прызначаны скайп, дзе яна назаве табе даты іспытаў.

Максім пазяхнуў:

— Гэта ўсё?

— Не, не ўсё, — адказаў бацька. — Паколькі ты і так едзеш у Лондан, я хачу, каб ты застаўся там да канца чэрвеня, скажам так, на стажыроўку. У нас рэструктурызацыя замежных аддзелаў. Я хачу, каб ты быў у курсе ўжо цяпер. Ва ўніверсітэце ты б ужо змог пачаць працаваць. Неафіцыйна, вядома.

— А як жа школа… У мяне яшчэ тут іспыты.

— Пра гэта я падбаю. Мяркую, вашаму Лабановічу будзе вельмі даспадобы новы праектар. А то і два... Збяруць камісію раней на пару тыдняў. Або так усё паставяць. У тваім выпадку, я думаю, школьныя іспыты — фармальнасць.

— Віця, выпускны, — палыхнула вачыма мама. Частка плана пра стажыроўку, відаць, была для яе нечаканасцю.

— Перажыве. Жыццё — бясконцыя ахвяры. Усё, што зараз робіцца, робіцца дзеля яго будучыні... Максім, табе ўсё ясна?

— Так, — сказаў хлопец, хаваючы флэшку ў кішэню кашулі. — Можна ўжо ісці спаць?

— Віця, піва, — гучна прашаптала мама.

— Маралі сама яму чытай. Я на працу, — сказаў тата і, з цяжкасцю ўзняўшыся з канапы, выйшаў.

x x x

*Дома сумна. Гурткоў няма, бо майскія. Але мама ўсё адно мяне туды даўно не вазіла. Мама занятая. Робіць Максіму візу. Максім паедзе вучыцца ў Лондан. Хутка скончыцца школа. Стане зусім сумна. Мы нікуды не паехалі на святы.*

*Максім не хоча ў Лондан. Як можна туды не хацець? Тата кажа, Максім дурань.*

*Максім дурань і Соня дура. Пачытаў дзённік. І я дурань. Мой настрой зусім паганы. Больш я нічога сюды пісаць не буду.*

х х х

Ён з'язджае — гэта канчаткова. Як толькі Соня пачула пра Максімаву высылку ў Лондан, усё ўнутры ў яе абарвалася. Але неўзабаве яна паспытала палёгку. Хто з вачэй — той і з думкі. Прынамсі, Соня на гэта вельмі спадзявалася. Таму два апошнія тыдні красавіка яна прасмуткавала — але гэта быў светлы смутак. Яна ўжо ведала дату вылету — адзінаццатага траўня. І цяпер лічыла гадзіны да расстання. То бок да часу, калі яна нарэшце пачне забываць Максіма.

Тое, што Статкевіч больш не завісаў з Ротмістравай па начах, таксама было як бальзам на раны. Вось толькі раны былі надта глыбокія.

Дый яшчэ гэты ягоны тэст... Соня моцна налажала, і цяпер пачувалася адказнай за наступствы.

Перад іспытам IELTS, які трэба было здаць Максіму, на Соню напалі сантыменты. Яна выпадкова пабачыла ў краме маленькага плюшавага мядзведзіка з матузком, каб вешаць, і надпісам «Good luck» на пузіку. Кіраваная імпульсам, купіла падвеску, каб зрабіць талісман для Максіма.

З дзяцінства ў яе быў адзін верны спосаб ператварыць у талісман што заўгодна. Трэба было на некалькі дзён пакласці гэтую рэч на падручнік па прадмеце, па якім кантрольная.

Ёй, праўда, рэдка дапамагала.

Соня пасадзіла мядзведзіка на Оксфардскі слоўнік, які знайшла ў Статкевічаў, і пачала абдумваць, як перадаць талісман Максіму.

Сам не возьме — гэта ясна. Заставалася падкінуць. Прычым у апошні момант, каб хлопец ні пра што не здагадаўся.

Тэст прыпаў на суботу другога траўня, заняткаў у школе не было, але мама Юля паднялася рана, каб прыгатаваць Максіму сняданак. Соня таксама ўзнялася параней. Афіцыйна — каб хапануць амлету, але насамрэч — каб падпільнаваць хлопца.

Максім нарэшце з'явіўся ўнізе. Выглядаў ён кепска. Вочы меў чырвоныя, а нос увесь час выціраў папяровай насоўкай.

— Што, зноў? — устрывожылася мама Юля.

— Нейкая трасца расцвіла. З вечара слёзы, нічога не бачу, — Максім чхнуў і пачаў хапаць ротам паветра.

— Трэба адразу было пігулку!

— А ў мяне ёсць? Два гады амаль не было алергіі. Можа, я іх выкінуў… Чхі!

— Божухна, ну чаму сёння? Трэба ў мяне пашукаць… — мама Юля хацела была ісці наверх, але зірнула на патэльню з амлетам, потым на Соню…

— Я збегаю! — з гатоўнасцю выгукнула дзяўчына і палярцела да сходаў…

— Кларытын, такія белыя авальныя пігулкі, у верхняй шуфлядзе камоды, — крыкнула ёй наўздагон мама Юля.

Пакорпаўшыся ў скрынках, Соня адшукала лекі. Год як пратэрмінаваныя… Яна тут жа кінулася ў татаў пакой і асцярожна, каб не абудзіць яго, палезла ў аптэчку. Знайшла супрастын — тата таксама быў алергікам.

Максім закінуў таблетку ў рот і навобмацак пайшоў да абедзеннага стала. Уратаванне не прымусіла чакаць: ужо да канца амлету яму заўважна палягчэла.

— Заплечнік забыў, — сказаў ён і пацягнуўся наверх.

Праз тры хвіліны ён, аднак, звесіўся са сходаў і заенчыў на ўсю Верасовую:

— Сінічка!!! Ты мне што дала?!!

— Лекі… Ад алергіі… — Соня пачала блытана расказваць пра кларытын, які быў пратэрмінаваны.

— Супрастын?!! Мама, яна дала мне супрастын!!!

— Ён таксама ад алергіі.

— А нічога, што ў яго седатыўны эфект? — засычэў Максім.

— Чаго? — захлопала вейкамі Соня.

— Мама, у мяне ўваччу цямнее. Я ж засну! — не супімаўся Статкевіч.

— Максіму можна не ўсе лекі, — устурбавана сказала мама Юля. — Калі ў нейкіх ёсць у пабочках санлівасць, ён проста ўпадае ў спячку… Выпі яшчэ кавы! — апамяталася яна і кінулася да кава-машыны.

— Якая кава… Я спазняюся! — сказаў хлопец і вылецеў з дому, моцна грукнуўшы дзвярыма.

На ягоным заплечніку нервова торгаўся мядзведзік-талісман. Соня, калі хадзіла наверх, заадно пракралася ў хлапечы пакой і хуценька прычапіла мішутку, што ўвесь ранак сядзеў у яе ў кішэні, да ланцужка. На тым ланцужку ў Максіма вісеў чорны скураны кашалёчак. Вадзік нават не прачнуўся.

Мядзведзік, нікім не заўважаны, паехаў на іспыт разам з новым гаспадаром. Вось толькі пасля Сонінага канфузу хлопцу сапраўды патрабавалася ўдача — і неслабая.

Праз чатыры гадзіны хлопнулі дзверы ўнізе, і Соня з хваляваннем падышла да дзвярэй свайго пакоя. «Ну як?» — пачула яна голас мамы Юлі на калідоры. «Як-як… Фігова, — быў адказ. — Я спаць».

У нядзелю, як яго ні ўпрошвалі, Максім ні слова не сказаў пра тое, як прайшоў тэст, але твар пры гэтым меў вельмі кіслы. Вынікаў трэба было чакаць два тыдні — сертыфікат выдавалі, ужо калі Максім з'едзе.

У панядзелак пасля ўрокаў змучаная сумленнем і бессанню Соня выплыла, як самнамбула, на школьны ганак, каб

ісці дадому. Апошні ўрок адмянілі — і яна спадзявалася, што перад факультатывам па рускай, які стаяў сёмым урокам, паспее нешта з'есці.

Стаяла цеплыня, як улетку, таму на ганку было тлумна — школа радасна грэлася на сонейку ў перапынку перад шостым урокам. Справа ад увахода стаяла кампашка «ашак». Акулярысты бландзін Ягор Залескі са смехам расказваў пра нешта, побач яму ў рот зазірала прышчавая Віткевіч. Марк Бергер адбымаў ззаду Крылову, якая ўсміхалася ўва ўсе брэкеты. Ротмістравай з імі не было. Максіма таксама.

Соня думала спакойна мінуць гэтую чацвёрку, але раптам яе схапілі за рукаво.

— Стой, Сінічка, — сказаў Залескі, — усхліпваючы ад смеху. — Ты мне патрэбная як інсайдар.

— Што?

— Я проста ўчора са Статкевічам ездзіў здаваць IELTS, і там была такая феерыя, што не перадаць, — патлумачыў ён Соні змест папярэдніх серый. — Дык вось, сустракаемся мы на трамвайным прыпынку, а Максім памяты нейкі, соплі жуе, а на заплечніку боўтаецца мі-мі-мішка. Я, вядома ж, адразу пытаюся, што гэта за звер. А ён такі: халера! — раз'юшана зрывае гэтага мішку — і ў сметніцу. Прамазаў, вядома, бо баскетбол — гэта вам не тэніс. «Мішку брасіла хазяйка», адным словам. Заходзім, значыцца, мы ў трамвай, Макс адразу бухаецца лбом да шкла і кажа, маўляў, пабудзі мяне, Ягорка, на Якуба Коласа. І ўмомант адрубаецца! Ну чыста робата выключылі… На Чарнышэўскага заходзяць кантралёры. Я даведку з сумкі выцягваю і пачынаю яго штурхаць, маўляў, даведку давай. Ён уключаецца і пачынае мацаць свой пляцак — і потым літаральна «изменившимся ліцом бежіт к пруду». У сэнсе, не бяжыць нікуды, бо і сядзець кепска можа, а б'ецца галавой у трамвайную шыбу. Боўдзіла я, гаворыць, даведка ў гаманцы была. Аказваецца, ён на пляцак чапляе такі скураны кашалёчак са складзенай

даведкай, каб доўга не корпацца, калі аблава. І ён яго разам з мішкам выкінуў.

Ну, ясна — бяруць яго мінсктрансныя цётухны пад белы ручанькі і выводзяць з трамвая, бо школьнай даведкі няма, квітка таксама. Я, натуральна, выходжу за ім — але часу вобмаль, да тэста літаральна дваццаць хвілін. Пачынаю яго адмазваць, паказваю сваю даведку, кажу, мы ў адным класе вучымся. А яны, нешта надта дарасла ён выглядае… А ён не пагаліўся чамусьці, у шчэці ўвесь быў. Карацей, прыйшоў наступны трамвай, я яму сказаў, што паеду, бо баяўся спазніцца… Потым, ужо ў трамваі мяне азарыла, хацеў яму эсэмэснуць, маўляў, пашпарт пакажы, але ў яго ж мабілкі няма! Добра, што пачатак тэста крыху затрымалі. Ён спазніўся на дзесяць хвілін, але пусцілі. Там адразу аўдзіраванне. Паслухаць даюць адзін раз толькі, вялікі стрэм. Ён нават пытанняў не паспеў прагледзець перад тым, як слухаць. Потым былі яшчэ рыдынг і райтынг… Ведаеце, я ўпершыню бачыў, каб Статкевіч апошнім здаваў заданне… Калі ўсё скончылася, можна было яшчэ застацца адказаць т'ютару вусную частку, але Макс сказаў, Ягорка, я не дажыву… Карацей, запісалі нас на вусны іспыт на заўтра… На зваротным шляху Макс ужо з квіточкам ехаў, як пацан, ён толькі сказаў, што штраф заплаціў, каб хутчэй ад цётак адбіцца… І зноў адрубіўся і спаў ужо да Зялёнага Лугу. На прыпынку мі-мімішкі з даведкай ужо не валялася…

— Мда, жэсць, — сказаў Бергер, хмыкаючы. — А мы-та думаем, чаму Статкевіч сёння ні сцяты ні павешаны. — Такі падрыў аўтарытэту, дый яшчэ пры сведку.

— Але гэта яшчэ не ўсё! — радасна абвясціў Залескі. — Вось калі мы зараз выходзілі, я на стале ў вахцёркі пабачыў што б вы думалі? — і ён выцягнуў з кішэні Сонінага мі-мімішку з кашалёчкам на ланцужку.

— Ого, — запішчэлі Крылова з Квіткевіч. Соня ціха скаўтнула.

— Цётка Ядзя сказала, дзяўчына нейкая прынесла, з выгляду студэнтка. І вельмі хацела аддаць гаспадару асабіста. Мусіць, фотка з даведкі спадабалася.

Соня асцярожна тарганула рукою, якую ўсё яшчэ сціскаў у руцэ Залескі.

— А, Сінічка! — схамянуўся ён. — Ты не ведаеш, адкуль уся гэтая жэсць? Чаму Статкевіч з ног валіўся? Так, нібы не спаў усю ноч? Я Ротмістраву пытаўся — яна ўвогуле не ў курсе... І ў чым таямніца мішкі? Можа, ты дома нешта бачыла? А то Статкевіч маўчыць як партызан.

— Ягор, — Крылова зрабіла круглыя вочы і пачала вымоўна міргаць імі Залескаму.

Соня павярнулася. За іх спінамі стаяў Максім.

— Усё проста, — сказаў ён. — Сінічка падкінула мне «шчаслівага» мядзведзіка, які ў выніку каштаваў мне палову базавай велічыні. А перад гэтым замест нармальных лекаў ад алергіі накачала мяне тымі, ад якіх я вырубаюся. У выніку, калі я набяру мінімальны прахадны бал, гэта будзе вельмі і вельмі добра. Ён узяў з рук таварыша шматпакутнага мядзведзіка і ўпіхнуў яго ў рукі Соні. — Ты, аказваецца, нясеш не проста непрыемнасці. Ты нясеш няшчасці, — і павярнуўся, каб ісці ў школу.

— Даведка, — разгублена сказала Соня. — Даведку забяры.

— Навошта яна мне? — засмяяўся Максім. — Я квіточкаў накупляў.

— Па ёй яшчэ да новага года можна ездзіць… — ляпнула Соня і тут жа прыкусіла язык.

— Да новага года я тут больш не з'яўлюся, — Максім спыніўся і змрочна акінуў вокам аднакласнікаў. — Тут увогуле ў Беларусі хто-небудзь застаецца? Апроч «дэшак», вядома?

— Я ў Прагу паступаю, — пацiснуў плячыма Залескі.

— Я ў Тэль-Авіў, — адказаў Бергер.

— А мы з Вікай у Вільню, — адказала Віткевіч.

Максім хмыкнуў і зайшоў у школу адначасова са званком.

Школьнікі магутнай плынню рынуліся ў вестыбюль. Соня стаяла на ганку з мядзведзікам у руках. Статкевіч яе зноў наўмысна апусціў пры сведках, думала яна.

Яна лёгка прыняла рашэнне, пакуль ішла казачным лесам дадому. Кахаць такога чалавека — прыніжаць сябе. Таму яна проста мусіць даць сабе слова: выкінуць Статкевіча з галавы. Раз і назаўсёды. Раз і назаўсёды.

У шуфлядцы туалетнага століка, закапаны пад хламам, ляжаў канверт у ружачкі. Той самы. Кіч і аграгламур. Як гэта ўсё падабалася ёй мінулай — але цяпер яна была здольная зірнуць на канверт вачыма Максіма. Пашляціна. Сапраўды — пашляціна. А тое, што ўнутры, нават згадваць не хочацца. Такая дурасць... Трэба зараз жа пазбавіцца гэтага ліста. Бо гэтае недарэчнае каханне ў стылі кніг пра Анжаліку кампраметуе яе нават перад самой сабою. Не пакідаць доказаў. Выкінуць з шуфлядкі і з галавы. Вось толькі яна прыйдзе дадому — яна адразу ўсё выкіне.

Дальбог, так яна і зрабіла.

x x x

Але вяртанне шчаслівага мядзведзіка не было апошняй дзіўнай падзеяй дня. Спусціўшыся да абеду, які ёй клапатліва накрыла здзіўленая мама Юля, Соня з не меншым здзіўленнем пабачыла за сталом тату Віцю. На стале стаяла вялікая ваза з піражнымі.

— О, Соня, даўно не бачыліся! Як вучоба?

— А… што вы дома робіце? — спыталася Соня замест адказу.

Тата Віця ўсміхнуўся:

— Ды вось, прыехаў у абед, бо са мной звязаўся адзін дзіўны таварыш. Ён зараз заедзе да нас на гарбату.

— Добра, я паем і пайду ўжо. Мне назад у школу трэба.

— Ды не, калі ёсць час, заставайся. Магчыма, табе будзе цікава. Ён з універсітэта, — і старэйшы Статкевіч пасунуў да Соні візітоўку, дзе поруч з гербом — залатое пяро на сінім шчыце — значылася: «Раман Дзянісавіч Когут, к.э.н., намеснік дэкана эканамічнага факультэта БДУ».

І сапраўды — праз чвэрць гадзіны ў дзверы пазванілі, і на парозе матэрыялізаваўся шыракаплечы мужчына ў ідэальным гарнітуры і чаравіках такіх бліскучых, што, здавалася, трэба прыбраць кілім у вітальні, каб ён не запэцкаў гэтых чаравікаў, а не наадварот. Было яму ніяк не больш за трыццаць гадоў. Хоць, магчыма, ён проста так выглядаў — у форме ён быў выдатнай і да таго ж прамяніўся шырокай еўрапейскай усмешкай, якой Соня ўвогуле ніколі не сустракала ў выкладчыкаў.

Мужчына абышоў пакой, каб парукацца з усімі. Соню яму назвалі як дачку сябра сям'і, і неўзабаве ўся кампанія ўжо сядзела за прыбраным да гарбаты сталом.

— Віктар Іванавіч, я ведаю, колькі каштуе кожная хвіліна кіраўніка «Стар сістэмз», таму паспрабую патлумачыць усё сцісла. Максім казаў вам, чаму я тут?

— Не.

— Вось жа, Віктар, Юлія... — візіцёр далікатна адкусіў эклер і, запіўшы каўточкам гарбаты, працягнуў:

— Маштабны праект, які я сёлета пачынаю, адбываецца пад патранажам міністэрстваў адукацыі, эканомікі і замежных спраў, таму, як вы пераканаецеся, паўнамоцтвы мае неабмежаваныя... З Максімам мы пазнаёміліся ў Полацку, на алімпіядзе па англійскай мове. Я правёў сумоўе з пераможцамі і выбраў найлепшых... Максім, несумненна, у іх ліку. Рэч у тым, што з гэтага года эканамічны факультэт супольна з Брытанскай амбасадай набірае эксперыментальную групу па міжнароднай эканоміцы. Навучанне амаль цалкам па-англійску — апроч няпрофільных прадметаў.

Тэрмін — шэсць семестраў, тры гады, студэнты атрымліваюць дыплом бакалаўра. Мы ўжо абвясцілі набор, але часу мала, у даведніках спецыяльнасці няма, і мы баімся, што конкурс будзе вельмі нізкі. Нам жа патрэбныя зоркі — каб добра зарэкамендаваць праграму і праз тры гады займець вынік. Таму я прапанаваў Максіму паступаць да нас. Такі бліскучы студэнт, як ён, будзе жывой рэкламай факультэта. Апроч таго, імя… Вы разумееце, што сын Віктара Статкевіча — гэта ўжо брэнд… — ён узняў вочы, нібы чакаў нейкай рэакцыі ад таты Віці, але той проста кіўнуў галавой, маўляў, працягвайце, я ўважліва слухаю. — Праграму мы падрыхтавалі салідную, — Раман Дзянісавіч засунуў тры пальцы ва ўнутраную кішэню пінжака і выцягнуў буклецік. — Вось. Там імёны выкладчыкаў, некаторыя — сусветна вядомыя. І ўсё гэта — тут ён засвяціўся, як залаты медаль, — будзе адбывацца ў Беларусі, у нашым універсітэце. Неверагодна, але факт! — ён сёрбнуў яшчэ гарбаты і самазадаволена працягнуў: — Мы дамовіліся з Максімам, што ён запішацца на сумоўе, каб больш даведацца аб праграме. Але ваш сын даслаў мэйл, маўляў, сустрэчу трэба адмяніць, бо ён паступае ў Лондан. З нашага ліставання я зрабіў выснову, што гэта не яго рашэнне. Максім нават напісаў мне — і паміж радкоў я прачытаў роспач, — што ягоны лёс ад яго не залежыць і гаварыць трэба з бацькамі. І вось я тут, — Раман Дзянісавіч зноў шырока ўсміхнуўся і адкрыта паглядзеў на тату Віцю. — Зразумела, я не хачу ўтручвацца ў справы незнаёмай сям'і і займацца псіхалогіяй пераходнага ўзросту. Я проста прашу вас падумаць пра тое, што я сказаў, і дазволіць сыну паступаць да нас на факультэт. Так сказаць, выдаць бацькоўскае благаславенне…

Ён скончыў спіч і, чакаючы рэакцыі ад слухачоў, узяўся даядаць эклер, старанна аблізваючы вусны ад шакаладу. Тата Віця нядбала пакруціў у руках брашуру і перадаў яе маме Юлі.

— Гэты дыплом бакалаўра, — спыталася тая, — прызнаецца ў Еўропе?

— Не проста прызнаецца! Ён еўрапейскі! — зноў заззяў Раман Дзянісавіч. — Гэта маё найгалоўнейшае дасягненне! Ведалі б вы, чаго мне каштавала...

— І з ім можна будзе паступіць на МВА ў Лонданскую школу эканомікі? — тут мама Юля выразна скасавурылася на тату Віцю.

— А чаму не ў Оксфард? — імпазантна спытаўся намдэкана. — У любы ўніверсітэт ЗША, Брытаніі — або куды ён толькі пажадае. Падкрэсліваю: студэнт атрымлівае замежную адукацыю, але жыве ў родным доме, пад бацькоўскім, так сказаць, крылом. Не мне, Юлія Барысаўна, тлумачыць вам, наколькі гэта важна ў такім чулым веку. Апроч таго, НЦТ па англійскай мове яму здаваць не трэба, яму залічаць аўтаматам сто балаў за вынікі алімпіяды.

Мама Юля з надзеяй паглядзела на тату Віцю, а той, пажаваўшы губы, урэшце прамовіў:

— Дзякуй, што ўвялі ў курс справы, Раман Дзянісавіч. Праграма ваша звышцікавая, для Беларусі гэта вялікі прарыў. І я зычу вам поспехаў. Не смею затрымліваць…

— Чую жалеза ў вашым голасе, Віктар Іванавіч, — шырока ўсміхнуўся Раман Дзянісавіч і ўзняўся з-за стала. — Але ў вас ёсць час падумаць. Калі што, адрас прыёмнай камісіі вядомы.

І, зычліва развітаўшыся, Когут вылецеў з дому Статкевічаў. Соня, якая абувалася ў вітальні, пабачыла праз акно, як ад веснічак газануў чырвоны спартыўны аўтамабіль, а з-пад колаў ягоных ува ўсе бакі пырснуў салют жвіру.

Застаўшыся ўдваіх, Віктар і Юлія Статкевічы доўга маўчалі. Муж метадычна даядаў піражкі з вазачкі, а жонка прыбірала посуд са стала. Нарэшце муж цяжка ўзняўся з крэсла і, аддыхаўшыся, прамовіў:

— Каб не цудоўны абед, Юлечка, я б сказаў, што змарнаваў гадзіну часу.

— Але Віця! — Юля сярдзіта грымнула падносам аб стол.

— Нават не думай! Прапанова акадэмічнага шарлатана, які падсоўвае нам ката ў мяшку, або праверанная стагоддзямі сістэма брытанскай адукацыі? Цікава, і што я выберу?

— Але Максік…

— Што Максік? — падвысіў голас тата Віця. — Я за год ні слова ад яго не пачуў пра тое, чаго ён хоча ад жыцця і ці хоча чагосьці ўвогуле. Ну давай, ён будзе шукаць сябе, у войска давай сходзіць, пакуль я… Ладна, — уздыхнуў тата Віця, і, крэхчучы, нахіліўся, каб абуць красоўкі. — Буду позна.

І, выцершы рукавом пот з лысіны, выйшаў з дому.

x x x

Нарэшце гэты дзень надышоў. Соня расплюшчыла вочы і перавярнулася на іншы бок на вільготных прасцінах. Яна сёння амаль не спала, бо ўночы моцна балеў жывот. Яна спустошыла ўсе татавы запасы актываванага вугалю і падбіралася ўжо да мамы Юліных, але лепей не рабілася. Апетыту не было ўвогуле. Не ўстаючы з ложка, яна ўключыла імбрык і навобмацак выцягнула з шуфлядкі пакецік распушчальнай кавы.

Сёння яна апошні раз пабачыць Максіма перад ад'ездам.

Калі ў 234-й даведаліся, што Статкевіч з'язджае ў Лондан і не застаецца на выпускны, па школе пракаціўся адчайны дзявочы стогн. Так, нібы ў кожным палымяным сэрцы згасла апошняя надзея. Так, нібы камусьці штосьці на тым выпускным нешта з тым Статкевічам свяціла.

— Ты ведала, але нічога не сказала?! — абураліся Галя і Снежка, дазнаўшыся ад школьных пляткарак, што ў кабінеце спеваў засядае камісія, якая датэрмінова атэстоўвае генія з 11 «А». Соня ў адказ толькі паціснула плячыма.

Усе дакументы да ад'езду былі падрыхтаваныя, тэлефанаванні зробленыя, валіза складзеная. Мама Юля выставіла

яе паміж пакоямі, каб дакладаць у багаж дробязі, пра якія згадвалі ў апошні момант. Максім у гэтых рыхтаваннях браў роўна нуль удзелу. Соня ўвесь час спатыкалася на раскрыты баул з джынсамі і кашулямі, калі праходзіла па калідоры. На душы было пуста. Выявілася, што не так гэта і проста — адпусціць таго, каго тры гады аддана кахала.

Соня запарыла каву і зноў завалілася на ложак. Калі яна адляпіла твар ад падушкі, кава ўжо парадкам астыла, і яе можна было выпіць за тры каўткі, што і было зроблена. Жывот проста скручвала. Не, у школу яна сёння не пойдзе.

Раптам у дзверы настойліва пастукалі.

Зашпіліўшы слонікаў на ўсе гузікі, Соня спаўзла з ложка і незадаволена адчыніла дзверы. На парозе стаяў Максім.

— Ты? — разявіла яна рот.

— Ты што, не снедаеш? — нецярпліва сказаў ён. — Колькі цябе можна чакаць?

— Ты? Чакаеш мяне? З якой радасці?..

— Ты ж адна па лесе не ходзіш, — хмыкнуў хлопец. — А мне акурат не зашкодзіць танная працоўная сіла. Трэба зайсці ва ўніверсам, купіць для класа чатыры торцікі. Праставіцца за ад’езд. А рукі ў мяне ўсяго дзве. Баюся скамячыць па дарозе. Апранайся давай. Сорак пяць секунд на зборы.

…Праз дзесяць хвілін Соня і Максім ужо прабіраліся па золкім казачным лесе, які аддзяляў катэджны пасёлак ад мікраraёна. Як і ў самы першы дзень, Соня ледзьве паспявала за хлопцам. Але не таму, што захаплялася прыгажосцю травеньскага ранку і наваколлем з яго гонкімі хвоямі і звонкімі птушкамі. Гэтым разам яе хвалявала тое, што ўнутры. Жывот проста разрывала. Яна баялася, яе вось-вось званітуе…

Максім загаварыў першы:

— Хацеў сказаць табе на развітанне, што тэст па англійскай быў самым вялікім пападалавам у маім жыцці.

Соня хіснулася і схапілася за хвою, але сабралася з сіламі і пайшла далей.

— І ведаеш, дзякуй табе за гэта, — Максім не спыняўся і не паварочваўся, гаварыў нядбала, як бы пра надвор'е, але тым не менш гаварыў з ёю, гэта ўжо было нешта. — Я ніколі ў жыцці так не хваляваўся, пакуль чакаў вынікаў, як хвалююся цяпер. Такі адрэналінчык нават спортам не заробіш… І ведаеш, падумалася, што ты ператварыла ў кашмар увесь мой апошні год. Усе мае непрыемнасці сёлета былі праз цябе. Ты і ўявіць не можаш, як мяне гэта злавала. Але адначасова гэта было самым крутым, што са мною здарылася. Ну, з часу, калі я трапіў на фестываль для фанатаў гульні «Раскрадальнікі склепаў». Мне тады было дванаццаць. Бо да таго як ты пачала блытацца ў мяне пад нагамі, перашкоды я сустракаў толькі ў камп'ютарных гульках. Я не хачу з'язджаць, не сказаўшы табе гэтага.

Камплімент быў сумнеўны, але Соні чамусьці зрабілася цёпла ўнутры. Яна збіралася нешта адказаць на гэтае развітанне, але раскрыла рот і зразумела, што не можа. Зямля сышла ў яе з-пад ног. Яна адчула сябе бязважкай пушынкай, якая ўзлятае ў неба, а жывот нарэшце адпусціла.

x x x

Калі ў галаве перастала гудзець і Соня змагла сфакусаваць зрок, то пабачыла перад сабой сцяну, свежа памаляваную зыркай ружовай фарбай. Яна ляжала, дакладней, паўсядзела на белым ложку, а з рукі ў яе вытыркаўся катэтар, груба залеплены пластырам. Зверху злева над ёй было акно, справа — кропельніца. Жывот не балеў — балела рука. На жываце ляжаў гумавы блін, які апякаў холадам. Яшчэ на Соні была рабая фланелевая начнушка, што ёй не належала.

Першы раз яна прыйшла ў прытомнасць у машыне хуткай дапамогі, але больш нічога не памятала. Яна паварушылася і застагнала.

— Сястра! Кропельніца скончылася, і яна ачуняла! — закрычала, вызірнуўшы на калідор, паненка гадоў пятнаццаці ў сінім халаціку, якая сядзела на ложку ля дзвярэй. Пасля гэтага паненка вярнулася на ложак і, засунуўшы ў вушы слухаўкі, уперылася ў экран ноўтбука. У палаце былі яшчэ белая металічная шафа, такія ж тумбачкі, стол, крэсла, рукамыйнік з люстэркам і трэці — незаняты — ложак.

Разам з цётачкай у блакітнай уніформе ў палату ўварвалася цэлая дэлегацыя. Першым ляцеў кругленькі тата Віця, ад якога не адставалі мама Юля і Пётр Сінічка. Усе яны шамацелі па чысцюткім лінолеуме рознакаляровымі шпітальнымі бахіламі, а занепакоенасць Сонінай хваробай мяшалася на іхніх тварах з радасцю ад таго, што дзяўчына нарэшце апрытомнела.

— Вы разумееце, што праз пяць хвілін вас тут не павінна быць? — незадаволена сказала медсястра, адшпільваючы шланг ад катэтара. Але па тым, што яна не прагнала ўсю групоўку дарослых з палаты, было ясна: сваю шакаладку яна ўжо атрымала.

— Як ты пачуваешся, дарагая? — кінулася да дзяўчыны мама Юля. — Ведала б ты, як мы ўсе перапужаліся, калі Пецю патэлефанавалі…

— Мне няёмка ў такі момант з такімі пытаннямі, — перапыніў жонку тата Віця, — але Соня, ці не ведаеш ты выпадкам, дзе зараз Максім?

Соня адмоўна паківала галавою.

— Віця, яна ж непрытомная ляжала, — раздражнёна сказаў Сонін тата. У руцэ ён сціскаў кніжачку з цыркавымі зайчыкамі — у такой вокладцы Соня трымала пашпарт.

— Мне, Пеця, праўда няёмка, але праз тры гадзіны самалёт, а нам яшчэ ў аэрапорт ехаць. Рэчы ўжо ў багажніку. А Макса нідзе няма. Мне толькі сказалі, што нейкі хлопец прыехаў з Соняй на хуткай, але ў прыёмны пакой яго не пусцілі.

— Чатыры хвіліны, — сказала медсястра і, сцягнуўшы гумавы блін з Сонінага жывата, выйшла, штурхаючы перад сабою стойку з кропельніцай.

Сонін тата прысеў на край даччынага ложка і, акуратна паклаўшы пашпарт на падаконне, пачаў гладзіць дачку па валасах, у той час як папа Віця і мама Юля бегалі па калідоры: ён — у пошуках сына, яна — у пошуках доктара.

— Знайшла! — радасна зазірнула ў палату мама Юля. — Загадчыцу аддзялення. Пеця, выходзь, яна хоча гаварыць толькі з «сапраўдным сваяком»!

Дзверы засталіся адкрытымі, і Соня пачула нізкі жаночы голас:

— Стан стабільны, прыйшлі аналізы, і ўжо можна сказаць, што гэта не апендыцыт. Вельмі падобна да язвы, але дакладней можна сказаць толькі пасля ФГДС... Скажыце, ці правільна яна харчуецца?..

— О, і цябе зонд глытаць павядуць, — сказала дзяўчынка ў сінім халаціку, якая, вызваліўшы адно вуха, таксама прыслухвалася да размовы на калідоры. — Гэта жасткач. Мяне ледзь не разарвала.

— Максіма нідзе не бачна, — змрочна прамовіў тата Віця, уваходзячы ў палату. — І дзе ён мог падзецца?

— Максім — гэта такі сімпотны пацанчык, падобны да ўсіх салістаў «One Direction» адначасова? — спыталася Сеніна суседка. — Дык ён тут быў. Як яе прывезлі, увайшоў у палату і сядзеў каля яе, а калі яго медсястра пагнала, сеў на калідоры. Сказаў, што ейны брат... Дык вось жа, ён заплечнік пакінуў.

Дзяўчына паказала пальцам кудысьці пад Сонін ложак, але тут дзверы палаты раскрыліся, і ўвайшоў Максім з пустым папяровым кубачкам у руках. За ім ішлі мама Юля і Сонін тата.

— Дзе ты ходзіш?! — ускрыкнуў тата Віця. — Нам трэба ў аэрапорт!

— Аўтамат на каву быў толькі ў суседнім корпусе, — адказаў Максім. — А яшчэ — я нікуды не еду.

— Што-о-о? — ускрыкнулі ў адзін голас ягоныя бацькі. Праўда, эмоцыі ў гэты выгук яны ўклалі супрацьлеглыя.

— Спакойна, — сказаў хлопец. — Сядайце. Я буду гаварыць, — і ён паказаў маме і тату на пусты ложак, на які па ўзмаху яго рукі ўселіся не толькі ягоныя бацькі, але і Сонін тата. Максім паўхвіліны збіраўся з думкамі, круцячы ў руках папяровы кубачак, але нарэшце прамовіў, гледзячы проста перад сабою: — Я, пакуль вас чакаў, добра ўсё абдумаў і вось што вырашыў… З гэтымі вечнымі пераездамі дзеля вашай кампаніі развальваліся ўсе мае — дзіцячыя — кампаніі, і я страчваў сяброў. І вось я зноў мушу ехаць туды, дзе амаль нікога не ведаю, і ўсё пачынаць спачатку. Мама, тата, мне падабаецца жыць у Мінску, і я хачу застацца тут. Прынамсі, пакуль што. Спакойна скончыць школу і мець выпускны, як усе нармальныя людзі. Ды-джэі, шампусік з чырвонай ікрою і што там яшчэ... Світанак хачу сустрэць, урэшце! Потым я атрымаю за мяжой MBA, якое захоча тата, і буду працаваць там, дзе тата скажа, але пакуль я хачу вучыцца ў БДУ і калі стажыравацца, то ў мінскім офісе. Усё самае важнае, што варта ведаць пра татаў бізнес, адбываецца тут, а не ў Лондане ці на Кіпры. Не трэба высылаць мяне «па навуку ў Еўропу», нібы я нейкі зулускі прынц, які дома нічому не навучыцца. Магчыма, я раблю памылку, але гэта мая памылка і толькі мая, а не ваша. Бо вам я, калі што, дакладна ніколі не дарую, а з сабой як-небудзь разбяруся… Ну ладна, мне пара. Я яшчэ паспяваю ў школу на фізіку, у нас кантрольная, пайду напішу па прыколе, — і, падчапіўшы рукой заплечнік, хлопец выйшаў з палаты, пакінуўшы за сабой нямую сцэну.

— Вы яшчэ тут?!! — узвілася медсястра, зазірнуўшы з калідора. — Пачаўся абход! З прафесарам! Каб праз секунду было пуста!!!

Калі ў палаце засталіся толькі пацыенткі, дзяўчынка ў сінім халаціку нарэшце закрыла рот, каб праз секунду адкрыць яго зноў:

— Ваў, — сказала яна Соні, — ну і сямейка ў цябе. Зацягвае круцей ад серыяла.

Соня, якая за ўвесь час у палаце не сказала і паўслова, павярнулася на бок і ўпершыню за некалькі тыдняў спакойна заснула.

x x x

Трэцяга памеру ў прыродзе не бывае. Яго прыдумалі маркетолагі, каб пластычным хірургам было за што купляць яхты і вілы. Так думала Соня Сінічка, круцячы ў руках белы карункавы станік, падораны ёй сяброўкамі на дзень нараджэння.

Побач на ложку ляжала адпрасаваная белая блузка і чырвоная стужка з надпісам «Выпускніца». «Не забудзь: чорна-белая гама!» — радасна прасакатала мама Юля, выбягаючы з дому на паўгадзіны раней за ўсіх астатніх. Зусім хутка пачыналася лінейка і апошні званок Соні і Максіма. У дзень, калі яе сын адмовіўся ехаць вучыцца за мяжу, да мамы Юлі вярнуліся заўсёдны імпэт і жвавасць. «Як добра, — паўтарала яна, — што і Соня так хутка акрыяла, і Максік застаўся дома. Бо, хто ведае, калі б не Соня...» Соню гэта моцна напружвала. У школьным пабліку нехта адразу напісаў, нібыта Статкевіч не паехаў здаваць іспыты ў Лондан, бо спазніўся на самалёт, адвозячы Сінічку ў больніцу. Гэта была няпраўда, але Соня не мела ні часу, ні сіл аднаўляць справядлівасць.

З люстэрка на Соню глядзеў выцягнуты змучаны тварык у чырвоных крапінках. Тры дні таму яна зноў глытала зонд, і на твары палопаліся капіляры. Выдатны падарунак на канец школы. Да вяселля, можа, і загоіцца — а вось да выпускнога?

Гэты паўторны зонд нічога страшнага не паказаў. Зрэшты, і першы не паказаў ніякай язвы, таму, як сказала загадчыца аддзялення, Соню можна было выпісваць у той жа дзень, каб не займаць месца, але палатная доктарка — маладая і адказная — дыягнаставала галоднае знясіленне і трымала Соню на кропельніцах і аўсянцы амаль тыдзень. Прапісала Соні дыету для хворых на гастрыт, якую трэба было заядаць гарой неапетытных бурых пігулак, а таксама правяла грунтоўную гутарку, спрабуючы выявіць, ці не хварэе Соня на анарэксію. Соня, аднак, супакоіла пільную лекарку, што яе хвароба называецца «паступленне», а анарэксія ёй не пагражае хоць бы таму, што Соня добра ведае: ад дыет першымі знікаюць грудзі, а яе самая галоўная мара — каб яны ў яе, наадварот, з'явіліся. Доктарка пасмяялася і нарэшце афарміла выпіску, але некаторы час яе яшчэ «назіралі» — амбулаторна.

Цяпер Соня сядзела на ложку і набіралася нахабства. Чырвоныя крапінкі, якія не здолеў схаваць нават тональны крэм, сталіся апошнім аргументам. Бо калі зрабіць гэта, на твар сёння ніхто дакладна глядзець не будзе…

Соня Сінічка рашуча разарвала папяровы цючок, выцягнуты з тумбачкі, і стала набіваць чашачкі станіка ватай.

x x x

Клац! Клац! Клац!

— Вось гэта кадр! — ускрыкнула мама Юля, і дзяўчаты згрувасціліся вакол фотаапарата. У двары-калодзежы, на ўнутраным ганку школы, зліліся ў жарсным пацалунку Лена Канькова і Ваня Каланіцкі. Строгія пінжачкі і выпускныя стужкі цераз плячо каларытна адцяняліся раскошнымі пучкамі дрэдаў на іх макаўках.

Усе глядзелі на экран, захапляючыся прыгажосцю моманту, мамай Юляй і ейным спрытам, але раптам, узняўшы

галовы, пераканаліся, што ў жыцці пацалунак яшчэ трывае. Мама Юля зрабіла яшчэ некалькі кадраў і заскакала на адной назе, як падлетак.

— Мама Юля! Мама Юля! — «дэшкі», апранутыя ў чорнае, белае і чорна-белае, збіраліся вакол кабеты галаслівай зграяй.

Калі Соня трапіла ў больніцу, аднакласніцы трымалі сувязь з Максімавай мамай. І, слова за слова, дамовіліся, што кабета бясплатна здыме «Д» класу нефармальны выпускны альбом. Толькі фоткі хай самі друкуюць, каму якія падабаюцца. Бо фармальны — такія строгія твары ў рамачках — ужо быў, і класу гэта зусім не спадабалася. Таму ў траўні мама Юля не вылазіла са школы, здымаючы бясконцыя рэпартажы пра фізру, хімію і нават паяданне сасісак у сталоўцы, а ў адзін сонечны дзень звадзіла «дэшак» у Севастопальскі парк, дзе зрабіла кучу пацешных партрэтаў на фоне графіці. Такі стыль як найлепей перадае дух вашага класа, сказала яна.

Лінейку, якая скончылася некалькі хвілін таму, мама Юля ўжо адфоткала, і Соня не магла не адзначыць, што Максім трапляе на яе памятныя фота. Бо каму ж яшчэ было насіць на плячы першакласніцу, якая звініць апошнім званком?

Раптам з вестыбюля пачуўся дзявочы віскат, ды такі, што ўсе, хто стаяў у двары, павярнуліся ў бок школы. Адгадаць прычыну пярэпалаху было няцяжка. Калі стала вядома, што Максім Статкевіч нікуды не з'язджае, у 234-й як дамбу прарвала.

Максім выйшаў на ганак, тым самым перапыніўшы зацяжны пацалунак фізікаў, а за ім высыпалі школьніцы ўсіх калібраў — дзясятыя, дзявятыя і восьмыя класы — з мабільнікамі напагатове. Для многіх дзяўчатак гэта быў апошні шанц пабачыць небажыхара зблізку.

Як часам найбольш бессаромныя вераб'і сядаюць проста на булачку, якую ты трымаеш у руцэ, спрабуючы дзяўбці яе, так і самыя адважныя малалеткі, падскокваючы побач

з кумірам, спрабавалі зрабіць з ім здымак. Гэта выглядала смешна і мізэрна адначасова.

— Блін, я ўсё разумею, але гэта проста край, — прабурчэла Снежка. — Такое ўражанне, што школу заканчвае не паралель на сотню з гакам чалавек, а адзін Статкевіч. Апошні званок — ён, прамова ад імя выпускнікоў — зноў ён, а цяпер яшчэ і гэта. Дальбог, яму б гітару ў рукі ўзяць і пачаць лабаць нешта, а то ў мяне карцінка са зместам не стасуецца.

— На гітарах, Снежа, нагадваю, лабаюць нашы пацаны, але нешта гэта не вельмі падымае ім рэйтынг, — адказала Галя.

— О, Сініца, зірні, твая фанатка Паўзункова, — штурхнула Соню Сняжана.

Ля адной з калон двара-калодзежа панавала феерыя. Там кучкаваліся рослыя дзявіцы ў экстрэмальна кароткіх карычневых сукенках з белымі фартушкамі і пушыстымі бантамі ў валасах. На нагах ува ўсіх былі нязменныя шпількі. Гэта 11 «Г» апрануўся «тэматычна», і Паўзункова з імі. Школьніцы-перарosткі панура паглядалі на ажыятаж вакол Статкевіча, але ісці фоткацца разам з «малымі», відаць, было для іх несалідна.

— Ой, дзеванькі, што мне сёння расказалі, — перайшла на шэпт Галя. — Помніце, мы тыдзень таму рагаталі з Паўзунковай, якая спрабавала запусціць дэбільны флэшмоб «Усе мы родам з дзяцінства»?

— Гэта наконт выпускнога, маўляў, уся паралель мусіць прыйсці ў сукенках а-ля Папялушка? — паморшчылася Соня. Усё, звязанае з Паўзунковай, выклікала ў яе ваніты.

— Каб жа Папялушка, — гігікнула Галя, — лялька Барбі, але сутнасць тая ж. Дык вось, у яе групу, якую ўсе тут жа перахрысцілі ва «Усе мы ўроды з дзяцінства», па стане на ўчора дадалося чалавек пятнаццаць, прычым палова з іх — хлопцы, што пачалі Паўзункову троліць. Бо насамрэч няма дурных гойсаць па Ждановічах у пошуку кубаметраў

ружовага цюлю, як дыктуе гэты няўмольны стыль з 1959 года, калі ў штаце Вісконсін выпусцілі…

— Давай лекцыю па гісторыі моды апусцім, — нецярпліва сказала Снежка. — Да чаго ты?

— Да таго, што я сёння ішла на лінейку з Ротміствравай, і тая сказала, што Паўзункова натхніла яе на альтэрнатыўны флэшмоб, які яна ўмоўна назвала «Little Black Prom».

— Маленькае чорнае што? — недачула Соня.

— Маленькі чорны выпускны. Сутнасць у тым, каб усім дзяўчатам прыйсці ў маленькіх чорных сукенках а-ля Како Шанэль, тым самым адцяніўшы «незямную прыгажосць» Паўзунковай і яе хабёлак. Ідэя сапраўды прыкольная, бо, па-першае, шмат хто ўжо такую сукенку мае, а калі не мае, то займець не зашкодзіць, па-другое, гэта цытата, даруй Снежа, з гісторыі моды, а па-трэцяе, ашчадзіўшы на сукенцы, можна адарвацца на абутку, укладках і біжутэрыі, так што ніводнай інкубатарскай усё адно не будзе…

— Па-чацвёртае, калі ідэя Ротміствравай пераможа, яна пакажа Паўзунковай, хто насамрэч у школе ўвесь час была гаспадыня. Гол у шатню, як сказаў бы мой тата, — з’едліва прамовіла Соня.

— Ладна, Сініца, Ротмістраву ты не любіш, але пагадзіся, ейная ідэя сапраўды крутая.

— Годзе, дзевачкі, — прымірэнча сказала Снежка. — Ты, Галюнь, лепш скажы, ці не супярэчыць Машкіна ідэя нашаму плану.

— Ні ў якім разе! Наш план мы проста скарэктуем.

— Няясна толькі, калі мы ўсё паспеем.

— А хто сказаў, што будзе лёгка? — нервова засмяялася Галя. — І так ясна, што выспацца ўдасца не хутка.

Іхнія перашэпты ў баку ад класа перапыніла мама Юля, якая мякка кранула Соню за плячо.

— Соня, чаму б табе не сфоткацца з Максімам? — хітра прапанавала яна.

— Мне? Навошта? — вылупіла вочы Сінічка. Дзяўчаты абярнуліся на Статкевіча. Цяпер ён стаяў на двары адзін, засунуўшы рукі ў кішэні. Злева, аднак, да яго няўмольна набліжалася брыгада Паўзунковай. Робячы выгляд, што зацята штосьці абмяркоўваюць, дзяўчаты ў савецкай форме паволі, але верна перабіралі ў бок хлопца шпількамі.

— Ну як навошта? Бо я так хачу. Сёння скончылі школу два дарагія мне чалавечкі, няўжо я не маю права на іх супольную фотакартку?.. Сынок, хадзі сюды! — памахала мама Юля рукою, і Максім неахвотна, не вымаючы рук з кішэняў, падышоў да мамы, якая стаяла ў атачэнні прыціхлых ад нечаканасці «дэшак». Твар Паўзунковай, якая не чакала такога абломy, перакасіла ад расчаравання.

— Я хачу сфоткаць цябе і Соню разам, — лагодна прамовіла мама Юля

Соня аслупянела. Максім уважліва разглядаў яе. Прычым — тут яе разлік быў верны — глядзеў ён ёй зусім не ў вочы.

— Добра, — нарэшце адказаў хлопец. — Але толькі адзін кадр. Ты ж ведаеш, я гэтага не люблю.

І ён стаў побач з Соняй і нават прыабняў яе за плечы. Агаломшаная дзяўчына расцягнула твар ва ўсмешцы, спадзяваючыся, што на фотцы гэта будзе выглядаць хутчэй міла, чым тупа.

— Раз… Два... — пачала камандаваць мама Юля.

— У цябе вата з левай чашачкі выбілася. Папраў, — ціха сказаў Максім Соні на вуха. Тая разявіла рот, перапужана схапілася рукою за грудзі і паглядзела ўніз.

— Тры!

Клац! Клац!

— Адзін кадр. Я ж сказаў, што толькі адзін, нават не пачынай, — самазадаволена абвясціў Максім, пабачыўшы твар мамы Юлі, калі тая прагарнула фота на хуткім праглядзе, і пайшоў прэч.

Ніхто з «дэшак» так і не зразумеў, што адбылося. А Максім тым часам далучыўся да таварышаў, якія махалі яму з боку стадыёна. Там было намяшана «ашак» і «бэшак», і Соня тут жа пазнала ў натоўпе тонкі сілуэт Ротмістравай. Відаць, ішлі тусавацца на Цнянку.

— Ну што, народ, на прыпынак, — скамандавала мама Юля, і «дэшкі» пасунуліся на выхад са школы паўз вестыбюль. Двор-калодзеж імкліва бязлюднеў.

— Ты, Сініца, ідзі, мы дагонім, у нас са Снежкай адна пільная справа, — сказала Галя.

— Ты дакладна ведаеш, што ён там? — спыталася Сняжана, калі аднакласнікі адышліся. Галя матлянула чорнымі кудзеркамі:

— А дзе яму яшчэ быць?

x x x

Пад дальнім мурам корпуса пачаткоўкі быў глухі кут, які не праглядаўся са школьных вокнаў. У гады кіравання Лабановіча гэты кут стаўся выспачкай свабоды для ўсіх нязгодных з новымі парадкамі — менавіта сюды ў перапынках лёталі на «інгаляцыі» зацятыя курцы. І, пакуль школу не атынкавалі, тут заўсёды можна было пабачыць смелыя графіці з лаканічнай характарыстыкай дырэктара і некаторых настаўнікаў.

Вася сапраўды быў тут, у адзіноце. Сядзеў на кратцы падвала і курыў, гледзячы пад ногі. Плітка пад ягонымі нагамі была ўсланая недапалкамі — відаць, ён прабавіў тут даволі часу.

Апрануты Вася быў, як усе «дэшкі» сёння: чорныя нагавіцы і белая кашуля з кароткім рукавом. На грудзях у яго боўтаўся пацешны вузкі гальштук на гумцы, што рабіла яго падобным да кіроўцы аўтобуса. Па вечна растрапаных яго валасах прайшоўся грабянец, а скроні былі прыгладжаныя гелем, як ува ўсіх выпадках, якія Вася лічыў асаблівымі.

— Што робіш? — спыталася Галя, сядаючы побач.

— Хіба не відаць? З дзяцінствам развітваюся, — панура сказаў Васілеўскі.

— Тут? І не баішся?

— А хто мне што цяпер зробіць? — хмыкнуў хлопец і затушыў нагой чарговы недапалак.

— Хадзем хутчэй, клас у цэнтр паехаў, фоткацца. Цябе ўсе шукалі.

— Так ужо і шукалі, — зноў хмыкнуў Вася. — Каму я патрэбны?

— Ну давай, скажы яшчэ, што табе не званілі, не эсэмэсілі…

— Не ведаю, я мабілу адключыў.

— Лёша, каліся, што здарылася? — строга спыталася Сняжана, складваючы рукі на грудзях. — Цябе ж хлопцы бачылі зранку, усё было нармальна, а з лінейкі ты знік.

— Хочаш ведаць, што здарылася, Кавалёва? Ладна, я раскажу, — Васілеўскі ўскінуў галаву насустрач сіняму травеньскаму небу, і дзяўчатам нават здалося, што ў ягонае вока закацілася назад самотная слязінка.

— Мяне колькі тыдняў таму выклікаў да сябе Андрэй Васілевіч.

— Хто-о-о выклікаў?!! — акругліла вочы Снежка.

— Ну, дзірык.

— Не, я ведаю, хто такі Андрэй Васілевіч, проста дзіўна чуць гэтае імя ды з тваіх вуснаў.

— Я ішоў і думаў, ну што яму яшчэ ад мяне трэба, а ён, уяўляеце, гарбаты мне наліў. І кажа: «Аляксей, у мяне для вас важная навіна. Гонар даць апошні званок на лінейцы школа давярае вам».

— Ну нішто сабе! — выдыхнулі дзяўчаты. — Як гэта — табе?

— У мяне было тое ж пытанне. А ён загнуў нешта пра заблудную авечку. Маўляў, я — сімвал ягоных педагагічных

дасягненняў, бо паддаўся перавыхаванню. Ну, можа, вы заўважылі, я ў гэтай чвэрці гарбаціўся за партай, як апошні батан…

Дзяўчаты згодна заківалі. У апошняй чвэрці хлопец звольніўся з «Сайгону» і пачаў спраўна хадзіць на ўрокі, чым усіх шакаваў.

Вася зноў хмыкнуў і выцягнуў з кішэні цыгарэтны пачак.

— І ты нам нічога не сказаў?

— Я нікому не сказаў. Толькі маці. Хацеў усім сюрпрыз зрабіць... Ведаеце, мы з гэтай маляўкай нават рэпетавалі ў спартзале пасля ўрокаў. Яна пужлівая вельмі, баялася на карак лезці.

— Але ж…

— Сёння я, як дэбіл, прыйшоў за паўгадзіны да лінейкі ў настаўніцкую… І мама прыйшла… А Лабановіч спачатку вочкі адводзіў, хаваўся, а потым сказаў, што я магу ісці да класа, бо ён тады думаў, што гэты лонданскі баклажан звальвае ў свой Лондан… Маўляў, завучы яго, Лабановіча, некалькі дзён даконвалі і нарэшце даканалі.

Галя і Снежка моўчкі пераглянуліся.

— Павар’яцелі ўсе ад гэтага Статкевіча. Вось і Сініцы гэты баклажан вочы засціць. І праўда, куды мне да яго?

— Ох… Скажы яму нарэшце, Галюня.

Галя ўзнялася і ўстала побач са Снежкай:

— Лёша, даражэнькі... Ты што, праўда думаеш, дзеўкі вішчаць ад Статкевіча, бо ён нейкі Апалон? Ды калі цябе прычасаць і сфоткаць і фотку тваю побач з ягонай у інтэрнэт павесіць, трэба яшчэ паспрачацца, хто больш лайкаў збярэ. Але ты ходзіш як афэлак, і паводзішся як крэтын. І каб жа толькі ты — многія хлопцы так. А Статкевіч умее падаць сябе. Шармам бярэ.

— Менавіта. Часам зірнеш на якога пацана на калідоры — аж дух займае. Але тут ён раскручвае асадку і пачынае

пляваца паперкамі... У галаве не ўкладаецца — біцэпсы во, а мазгі, як у дзетсадаўца! — абурана паказала на сабе Снежка.

— Мы лічым, — працягнула Галюня, — што табе яшчэ не позна змагацца за Сініцу. Пагатоў мы зразумелі з ейных слоў, што «лонданскі баклажан» даўно забыты.

— Праўда? Тады я з ёй сёння ж пагавару, — прыўзняў брыво Васілеўскі.

— Ч-ш-ш, не смей, — зашыпела Снежка. — Зноў усё сапсуеш.

— Самы прыдатны момант — выпускны, — павучальна сказала Галя. — Там ты мусіш яе ўразіць раз і назаўсёды.

— Менавіта! — падхапіла Снежка. — Многія шчаслівыя стасункі пачыналіся з выпускнога!

— Па-першае, табе трэба час, каб прывесці сябе ў парадак. Купіць нарэшце прыстойны гарнітур і чаравікі. Нармальна пастрыгчыся. Бо пры якім парадзе здольны прыйсці Статкевіч, ты неаднаразова бачыў. Сініцы падабаюцца дагледжаныя хлопцы, і я яе разумею…

— Я не даганяю, Вайтовіч: ты за мяне ці за баклажана?

— Я — за справядлівыя і дэмакратычныя выбары. Але пакуль ты рассякаеш па школе з гальштукам-селядцом на шыі, выбіраць Сініцы, па шчырасці, няма з чаго. Так што ў пятніцу знайдзі час, мы зранку едзем у ЦУМ купляць тканіну. Заадно дапаможам табе з гарнітурам.

— Але гэта яшчэ не ўсё, — працягнула Снежка. — Ты мусіш скарыць Соню чымсьці незвычайным. Навучыцца танцаваць вальс, напрыклад. Або зладзіць рамантычнае спатканне на даху…

— У мяне іншая ідэя! — ускочыў на ногі Вася. Да яго імкліва вярталася бадзёрасць духу. — Але вам я не раскажу. Гэта будзе неспадзяванка для ўсіх, але пасля такога Сініца гарантавана мне не адмовіць…

— Вось і слаўна!

— Усё, едзем фоткацца. Трэба дагнаць астатніх.

— Вы ідзіце, я пінжак у настаўніцкай пакінуў. Я сам звяжуся з пацанамі.

— І калі мы толькі ўсё паспеем, — паківала галавой Снежка, калі дзяўчаты засталіся адны. — Ты выпадкова не ведаеш сайт, дзе можна дакупіць пару лішніх гадзін на суткі?

x x x

У траўні, калі заканчвалася школа, у доме Статкевічаў выкідалі макулатуру. У Лондане дзеля гэтага ставілі спецыяльныя кантэйнеры на вуліцах, але ў Мінску ў той час, каб утылізаваць старую паперу, трэба было ехаць к чорту ў балота. Адказваў за гэта Максім, але паколькі макулатуры заўсёды былі горы — мама выносіла ў гараж кожную скрыначку ад калготак ці парфумы, — ехаць трэба было на машыне, з бацькамі. Таму зранку Максім быў не ў гуморы. Хутчэй бы дажыць да васямнаццаці, каб атрымаць правы і рабіць усё самому. Давялося тройчы нагадаць маме пра сямейны дзень экалогіі, які яна сама ж калісьці прыдумала.

Да выпускнога заставаўся тыдзень, і ў гасцёўні «лялечнага дома» ўжо трэція содні працаваў пашывачны цэх. Зранку да ночы там сноўдалі дзяўчаты з «Д» класа, збольшага гэтая кудлатая таўстушка, лёталі стужкі сантыметраў і ашмёткі тканіны, пераважна нейкі чорны шыфон. Уразнабой стракаталі ажно дзве швейныя машынкі, а калі Максім саркастычна пытаўся, калі пахаванне, яму адказвалі цытатамі з нейкіх жаночых камедый, нешта накшталт таго, што чорны — гэта новы ружовы. У паўзах паміж стракатаннем машынак шыпела кававарка і выбухалі смехам дзявочыя галасы. Самыя гідкія «хі-хі-хі» было чуваць чамусьці тады, калі Максім спускаўся ўніз з нейкай патрэбы. І ягоная родная мама была часткай усяго гэтага. Жыць у доме было рашуча немагчыма.

Максім увайшоў у гараж і пачаў згружаць макулатуру ў багажнік матчынай машыны. Смецце з кухні… Потым

газеты і часопісы... Кардонка ад кава-апарата... Нарэшце падчапіў пару сваіх скрынак і дробны пакуначак Вадзіка. Малы з характару выявіўся яшчэ тым плюшкіным і з маленства змагаўся за малюнак або сшытак з крамзолямі, заяўляючы, што «гэта для алхіву». Пераязджаючы з Лондана, нават давялося выслаць у Мінск пасылку з ягонай дзетсадаўскай лепкай з пластыліну.

У куце заставалася яшчэ адна кардонка. Сіняя скрынка з ружовага пекла. Максім паставіў яе ў багажнік і па даўняй завядзёнцы пачаў перабіраць змесціва, правяраючы, ці не замяшаўся ў паперу цэлафан і ці не пакінуў хто фольгу ў абгортцы ад шакаладкі.

Сшыткі, сшыткі, сшыткі... Скрыначкі ад касметыкі і батарэек. Аркушы з тэстамі... Карыбскі крызіс і парабалы... Рэцэпт крэм-бруле... Гараскопы, крыжаванкі, сячэнні конусаў, нататнікі з прынцэсамі... Раптам позірк вычапіў нешта знаёмае.

Гэта быў канверт у ружачкі з надпісам «For Maxim from Sonya with Love». Сонья... Ну-ну. Ён выцягнуў з кішэні ключ і акуратна надарваў канверт збоку. Здабыў такі самы — у ружачкі — аркуш паштовай паперы, спісаны стараннымі фіялетавымі літарамі. Падышоў да дзвярэй гаража, на святло. Уважліва прачытаў.

Потым акуратна склаў напалам канверт з аркушам, запхаў паміж сшыткаў і зачыніў багажнік.

x x x

*Прывітанне, Максім!*

*Я — Соня Сінічка з 11 «Д». Мы не знаёмыя, хоць вучымся ў адной школе, і наўрад ці калі пазнаёмімся. Як сказалі б брытанскія арыстакраты, нас няма каму прадставіць. Таму я наважылася напісаць гэты ліст, у якім хачу сказаць вельмі важную для мяне рэч. Я цябе кахаю.*

*Я ўсім сэрцам пакахала цябе, як толькі пабачыла два гады таму на лінейцы ў дзявятым класе. З таго часу ты надаеш сэнс майму жыццю. Са мной такое здарылася ўпершыню. Спачатку я спадзявалася, што гэта проста завіхрэнні ў маёй галаве (бо як можна па-сапраўднаму кахаць кагосьці, з кім нават не размаўляў?), але цяпер разумею, што ўсё сапраўды сур'ёзна. І лепш напісаць пра гэта, каб не трымаць у сабе. Гэта самы надзейны спосаб «выпусціць пару».*

*Чаму я цябе кахаю? Дзіўнае пытанне, бо калі кахаюць — то гэта нібыта зніадкуль, проста так. Але мне здаецца, я маю адну важную прычыну.*

*Я кахаю цябе, бо ты прыклад для мяне. Прыклад чалавека, якім я хачу аднойчы стаць: адукаванай, упэўненай у сабе, спартыўнай дзяўчынай, што без акцэнту размаўляе па-англійску... Магчыма, я сапраўды зраблюся такою і мы сустрэнемся, калі скончым школу… Нібыта ўпершыню. Але гэта адно мары.*

*Ведаеш, я зусім не спадзяюся на ўзаемнасць. Разумею, што гэта недарэчна. Усё, што мне трэба, — каб ты прачытаў гэты ліст. Каб ты проста ведаў. Тады мне сапраўды палягчэе.*

*На гэтым застаюся адданая табе,*

Соня Сінічка

Раздзел XII

# МАЛЕНЬКІ ЧОРНЫ ВЫПУСКНЫ

Мама Юля пацягнула на сябе вузкую аканіцу, і ейны твар абдало свежым паветрам. Павярнулася спінай да акна, уздыхнула на поўныя грудзі і задаволена абвяла вачыма плён сваёй справы.

Прасторная актавая зала 234-й школы была пад завязку напоўненая народам — толькі першыя чатыры шэрагі пакуль пуставалі. Гэтыя першыя шэрагі былі драпіраваныя белай тканінай і ўпрыгожаныя чырвонымі і срэбнымі стужкамі. Ніз сцэны, чырвоныя кулісы паабапал яе і доўгі груваскі стол, на якім стосікамі высіліся атэстаты і граматы, пакрывала гэткая ж белая драпіроўка, а па ёй зіхцелі кветкі з пурпуровай і срэбнай паперы. З-пад ламбрэкена кулісы над сцэнай звісалі шнуркі, на якія былі рэдка нанізаныя гіганцкія папяровыя пумпоны, падобныя да хрызантэм — срэбныя, пурпуровыя і яшчэ белыя. Паўкруглая, спавітая гірляндай з кветак такіх самых колераў арка абрамляла ўваход у залу. Такія аркі стаялі яшчэ і ў двух праходах у першым шэрагу. Усе, хто сёння перасоўваўся па зале, мусілі прайсці праз кветкавы порцік — гэта надавала дзеі яшчэ большай урачыстасці. Госці вечара ўжо фатаграфаваліся, пазіруючы ў гэтых арках.

Сёння ўжо ні ў кога з бацькоў язык не павернецца сказаць, што выпускны ў мурах школы — гэта «не па-багатаму».

А ўсё дзякуючы ёй — маме Юлі.

Хіба яна не малайчынка? Яшчэ зімою, калі бацькоўскі камітэт збіраўся першы раз, яна лоўка пераканала ўсіх мам і татаў, што варта адзначаць выпускны менавіта тут. А ўсё ж магло скласціся іначай! У самым пачатку таго сходу слова ўзяла (а дакладней, захапіла), гэтая непрыемная дама. Мама Юля ў думках называла яе «мадам Паўзункова». Напорыстая кабета з грубымі манерамі і няправільнымі націскамі, але чамусьці менавіта такім людзі ў нас вераць і такім рахмана падпарадкоўваюцца. Мадам Паўзункова заявіла, што школа проста абавязаная прыняць прапанову ейнага мужа і «дастойна атмеціць» выпускны ў адной з рэстарацый Беларускай чыгункі. Грошы за арэнду, з ейных слоў, выходзілі «проста смяшныя». Мадам Паўзункова пусціла па шэрагах фота банкетнай залы. Інтэр'ер адрозніваўся ад школьнай сталоўкі хіба што аксамітнымі шторамі колеру бардо, разлапістымі жырандолямі і люстрамі ў залачоных рамах.

Бацькі разгубіліся ад такога наскоку актыўнай мамы з 11 «А» і ўжо збіраліся галасаваць «за».

Юлія Сталкевіч, якая часта дапамагала тату Віцю ладзіць прыёмы для партнёраў, вокамгненна калькулявала ў галаве «смешныя грошы». Ёй адразу зрабілася нясмешна. Рэстарацыя таго не каштавала — нехта яўна збіраўся зарабіць на школьніках. Але мама Юля была мудрай жанчынай, таму скандалу падымаць не стала, а замест гэтага какетліва падняла руку і з усім абаяннем, на якое была здольная, нагадала дарослым, як незабыўна весела прайшлі іх выпускныя ў звычайных школьных сталоўках. Як радасна было ў той апошні вечар дзяцінства, як шмат усе смяяліся і танцавалі, а потым беглі сустракаць світанак… Напрыклад, яны з аднакласнікамі ўсю ноч гойсалі над Дзвіною ў родным Полацку.

У кожных мамы і таты была свая Дзвіна — вочы заблішчэлі настальгіяй і замілаваннем… І ў гэты момант мама Юля незаўважна перайшла да лічбаў. Яна назвала суму

ўнёску за выпускніка ўдвая меншую, чым перад тым Паўзункова. Гэта была перамога. Юлію Статкевіч аднагалосна абралі галавой выпускнога камітэта паралелі і прадстаўніцай бацькоў 11 «А» ў пытаннях выпускнога вечара.

Таццяне Паўзунковай прыдумалі ганаровае і адказнае заданне — упрыгожыць школьную сталоўку для банкета і дыскатэкі, падкрэсліўшы, як гэта важна для дзяцей і іхняга настрою. Але з мамай Юляй яна ўсё адно не віталася.

Працы патрабавалася шмат — мама Юля нават хадзіла на курсы па дэкоры і фларыстыцы, каб уласнаручна ўпрыгожыць актавую залу. Давялося дакласці крыху ўласных грошай, каб усё атрымалася, — але ж праўда мы не выдадзім яе маленькага сакрэту?..

А тата Віця хацеў адняць у яе ўсю радасць ад гэтага вечара, выправіўшы сынулю ў Лондан. Як жа слаўна ўсё склалася!

— Юлечка, гэта проста цуд! — высокая цёмнавалосая кабета ў авангарднай паласатай сукенцы кранула маму Юлю за плячо. — Бацькі 11 «Б» перадаюць вам сваё захапленне… Да слова, вы ўжо былі ў сталоўцы?.. Калі не былі, то і не хадзіце. Паберажыце нервы, — кабета з’едліва захіхікала. — Добра, што моладзь танцуе ў цемры.

— Ах, Эльвіра, — дробна затопала ножкамі мама Юля, — я так хвалююся! Але гэта такія прыемныя дрыжыкі, нібыта я сама сёння заканчваю школу!

У сваёй ярка-зялёнай сукенцы з доўгай ніткай перлінаў, завязанай вузлом, на срэбных шпільках і з пышнай укладкай, у якой каралявала белая ружа, мама Юля выглядала, як сама Царыца Вясна. І толькі важкі фотаапарат са здаровым аб’ектывам, які вісеў у поўнай баявой гатоўнасці ў яе на дэкальтэ, крыху зазямляў узнёслы вобраз.

Раптам загарэўся белы прастакутнік сцэнічнага задніка. Праектар выплюнуў на яго першы слайд: «Бывай, школа!» Гэта ўжо не мама Юля, гэта самі выпускнікі. Зайграла

ўрачыстая музыка. Зала прыціхла, і ўсе вочы скіраваліся на арку пры ўваходзе.

— Ух, колькі пажывы сёння! — захоплена сказала мама Юля, палашчыўшы аб'ектыў камеры, нібы дзюбу прыручанага пелікана. — Колькі пажывы!

х х х

У гэты час перад актавай залай віравала і гула «біржа». Пяць класаў выстройваліся ў доўгую працэсію. Яшчэ дзесяць хвілін — і пачнуць уручаць атэстаты. У калідорчыку пры самых зачыненых дзвярах кучкаваўся рэспектабельны «А» клас. У канцы даўжэзнай чаргі шыхтаваўся мітуслівы «Д». Ну… вы ў курсе алфавіта.

Некалькі вучняў 11 «Б» хадзілі ўздоўж звілістага ланцуга і прасілі хутчэй разбівацца на пары — «бэшкі» адказвалі за выпускны вечар. Пры ўваходзе на «біржу», каля настаўніцкай, працэсію замыкалі Галя і Снежка. Ваня Каланіцкі адвёў іх сюды, сказаў стаяць і заганяць усіх наперад.

— Ну што там? — нецярпліва падскоквала нізенькая Галя. — Ці шмат?

— Ну, дастаткова, — рапартавала высокая Снежка. Выцягнуўшы шыю, яна разглядала цуг перад сабою. — Недзе палова дзевак. «Ашкі» — дык амаль пагалоўна. Хоць мне не вельмі адсюль відаць.

— Калі я цябе чакала ўнізе, паўз мяне вельмі многа прайшло ў чорным, — задаволена сказала Галя. — Нават Дубовік заўважыў, сказаў, «я ні понял, кто-та умер»?

— Ну што ж, Вайтовіч, залік. Можна сказаць, мы ў трэндзе.

На Галі сёння была прасторная чорная туніка з шыфону, схопленая на плечыках шырокімі палоскамі атласу ў блакітныя, чорна-белыя і салатавыя кветкі. Такія ж палоскі працінаі туніку па баках, як лампасы. Яе пухлыя ножкі былі

зацягнутыя ў ярка-блакітныя панчохі, а на чорных туфліках з маленькім абцасам красавалі белыя атласныя ружачкі. Сукенка Снежкі шчыльна абліпала яе хударлявы стан, сягала ёй пятаў і была не менш дзіўнай. Спераду — усё той жа кветкавы атлас, затое спінка была абсалютна чорнай, шыфонавай, і трохкутны выраз смела агаляў яе вострыя лапаткі, сягаючы таліі. Спераду на каўнерыку «пад горла» сядзела невялічкая чорная ружа, з таго ж шыфону. Абцасы чорных лакаваных туфляў і зачасаныя наверх валасы рабілі Кавалёву проста неймаверна высокаю.

— А ну, рукі! — дзяжурна гыркнула яна, ляснуўшы зялёным пластыкавым клатчам «Я кракадзіл» Вову-матэматыка, які ў адказ гнюсна загігікаў. — Прыкінь, ён мне пальцам у спіну тыцнуў! Вось ужо гэтыя твае эксперыменты…

— Спакуха, Снеж! Будзе бомба, вось пабачыш.

— Гэта што, Соня Сінічка з 11 «Д»?

— Ну нішто сабе!

— Ды афігець і не ўстаць.

— Пашэнціць жа сёння камусьці.

— Ды ладна, Воўчык… Нібы не ведаеш, што шэнціць тут толькі аднаму суб’екту…

Гэта Вову-матэматыка дагнаў аднакласнік. Галя і Снежка адразу ж павярнуліся да той, якая зрабілася прадметам хлапечай размовы.

— Пра сябе, Галюнь, нічога не скажу, а вось Сініца — дакладна твой шэдэўр, — задумліва працягнула Сняжана.

— Ды ладна, ты ж яе мэйкапіла, а мама Юля — прычэсвала. Так што гэта калектыўная творчасць, — для прыліку запярэчыла Галя, любуючыся справай рук сваіх.

Соня стаяла каля акна «біржы», паклаўшы каленку на чырвоную кушэтку, і на ейны твар кідала промні вечаровае чэрвеньскае сонца. У яе сукенцы чорныя і квяцістыя палосы спляліся крыж-накрыж на тугім ліфе, як у строі арлекіна, пераходзячы ніжэй у пашытую з асіметрычных абрэзкаў шыфону

і атласу спадніцу-клёш. Паміж ліфам і спадніцай ішла шырокая шыфонавая ўстаўка. Галюнін шэдэўр ператварыў Соню амаль у гераіню фільма «Стылягі». Прыкладна так — а-ля Одры Хэпбёрн — і прычасала яе мама Юля. Сукенка пакідала адкрытымі далікатныя плечы, тонкую шыю і спадала да каленак, адкрываючы зграбныя ногі ў празрыстых калготках. Абутая наша гераіня была ў туркусовыя туфлікі на абцасе, а ў якасці торбачкі на ейнай руцэ боўтаўся чорны мяшэчак, расшыты бісерам.

Шыю прыгожа абхоплівалі туркусовыя каралі, якія Соня купіла ў Кіеве.

Але не толькі незвычайнае ўбранне рабіла Соню асаблівай. Найбольш сяброўак уразіў твар. Ён быў спакойны, ясны і прамяніў такую ўпэўненасць у сабе, якой яны раней ніколі ў Сінічцы не бачылі.

— Як слаўна, што яна папусцілася наконт Статкевіча, — зашаптала Галя. — Новы чалавек!

— Хто ведае… Магчыма, добра забыты стары, — павяла хударлявымі плячыма Снежка.

— Гм?

— А што мы, па сутнасці, пра Сініцу ведаем? Вось я думаю, нічога. Калі памятаеш, мы з ёй пазнаёміліся ў дзень, калі яна ўцюхалася ў гэтага вундзера. І гэтае пекліца доўжылася з пераменным поспехам больш за два гады. Сляпое каханне дэфармуе чалавека. А цяпер яна вылекавалася ад бацылы Статкевіча і, можа, сталася сама сабою.

— Згадай каку, вось і бяка, — скрывілася Галя.

Паўз іх па калідоры ішлі хлопцы-«ашкі» пры поўным парадзе: у бездакорных строях, белых кашулях і напарфумленыя. Наперадзе Бергер і Залескі, зашпіленыя на ўсе гузікі, а за імі — з рукамі ў кішэнях шыкоўнага цёмна-шэрага гарнітура, у рыпучай ад крухмалу бялюткай камізэльцы і нават з хустачкай у нагруднай кішэні, але без гальштука — Максім. Галя і Снежка, пад ціскам працэсіі, што ўсё падаўжалася,

ужо адступілі з «біржы» ў цесны калідорчык, які вёў у іншае крыло школы, і больш не маглі бачыць Соню. Затое яны пабачылі, як Залескі, выйшаўшы на пятачок, адкуль яе было добра відаць, павярнуў галаву і рэзка затармазіў, так што Статкевіч, які ішоў следам, траха не ўляцеў яму ў спіну. Дзяўчаты не вытрымалі, падбеглі і, вызірнуўшы з-за рага, сталі цікаваць, што адбудзецца.

Але нічога асаблівага не адбылося.

— Макс, гэта што, твая Сінічка? — ціха спытаўся Залескі, павярнуўшыся да Статкевіча. Бергер адно прысвіснуў.

— Ты, Ягор, паасцярожней з займеннікамі, — спакойна адказаў Статкевіч і, абышоўшы сяброў, імкліва рушыў да «А» класа.

Залескі з Бергерам, усё яшчэ абарочваючыся на Сінічку, пасунуліся следам.

— Сініца — малаток! — канстатавала Галя, вяртаючыся ў канец працэсіі. — І брывом не павяла. Мусіць, сапраўды вылекавалася… Слухай, можа, адменім сама-ведаеш-што?

— Ну зараз, адменім, — нахмурылася Снежка. — Столькі рэпетавалі. Гэта ж каронны нумар.

— Але ж навошта зноў гэта варушыць?

— Ну не! Пакінем як ёсць. А то Макей пакрыўдзіцца... Я ўжо не паспею нешта прыдумаць, і значыць, Аліна проста не выйдзе на другое дэфіле… Дый не бойся за Сініцу. Усё яна нармальна прыме. Лепш падумай, як нам палаўчэй звесці яе з нашым пратэжэ…

— Дарэчы, ты яго бачыла дзе-небудзь?

— Ёкарныкампот… Вось зараз на яго гляджу, — змрочна сказала Сняжана, узіраючыся ўглыб калідора, адкуль на «біржу» прыбывалі апошнія выпускнікі. — Але табе глядзець не рэкамендую.

Галюня павярнулася і завохкала, схапіўшыся за сэрца.

— Можна вывезці пацана з раёна, але раён з пацана… — рэзюмавала Снежка і адвярнулася.

Вася стаяў на іншым канцы калідора ў атачэнні хлопцаў «Д» класа. Яны гучна перамаўляліся і рагаталі. Васілеўскага было не пазнаць. Шэры гарнітур у рубчык сядзеў на ім як уліты. Валасы былі ахайна падстрыжаныя і зачасаныя набок. З-пад калашын нагавіцаў (акурат такой даўжыні, як патрэбна ў прыстойным таварыстве) выглядалі ідэальныя чорныя чаравікі, якія проста ззялі чысцінёй і стылем. Калі Васілеўскі варушыў нагою, паказвалася цёмна-сіняя шкарпэтка, якая тон у тон супадала з колерам палосак на ядвабным шэрым гальштуку, завязаным у бездакорны вузел.

Гэта быў бы іншы чалавек, калі б не адно але. Пад свой нятанны гарнітур, што так пасаваў яму, падкрэсліваючы, які ён насамрэч высокі і плячысты, Васілеўскі начапіў кашулю ў чырвоныя, зялёныя і сінія краткі. Ядвабны гальштук — Снежка забіла паўгадзіны, выбіраючы яго ў ЦУМе — выглядаў на стракатай бавоўне, як свежазлоўленая акіянская рыбіна на кухоннай цыраце.

— Я вось не разумею, — сказала Снежка, — ты яму прачытала цэлую лекцыю пра чаравікі і шкарпэткі і забыла патлумачыць, што кашуля мусіць быць белай? Ці хоць бы аднатоннай?

— Мне і да галавы не прыйшло, што ён такое адмочыць, — закаціла вочы Галя. — Я яму толькі сказала, што рукавы трэба доўгія.

— Анягож, рукавы доўгія, — зноў павярнула галаву Снежка.

У гэты момант дзверы актавай залы расчыніліся і загучала музыка. «Біржа» замітусілася.

— Ну, з богам! — сказаў Васілеўскі, падышоўшы да дзяўчат і абняўшы іх за плечы.

— І праўда што з богам, — прамармытала Снежка. — Бо без яго сёння — ніяк.

— Што? Я не расчуў.

— Цудоўна выглядаеш, Лёшачка.

Так пачаўся маленькі чорны выпускны Соні Сінічкі.

x x x

— …Напрыканцы я хачу сказаць не ад імя ўсіх выпускнікоў, а ад сябе асабіста. Я паступіў у 234-ю школу, бо лянівы, — лёгкі смех у зале. — Я не хацеў ездзіць у цэнтр горада ў ліцэй ці гімназію, модныя ў нашых мам і татаў тры гады таму. Я прыйшоў сюды — і ні разу не пашкадаваў. У звычайнай, як тады здавалася, школе я сустрэў крутых настаўнікаў і не менш крутых аднакласнікаў, з якімі цікава было вучыцца і — чаго там хаваць — спаборнічаць. Так я і праспаборнічаў з вамі тры гады. Я думаў, што тры гады — замалы час, каб адкрыцца людзям. Навошта гэта рабіць, калі жыццё ўсё адно раскідае па зямлі? Але нядаўна адна… адзін разумны чалавек падказаў мне нечаканую думку: развітваючыся, мы не страчваем — мы набываем. Свайго чалавека ў Іерусаліме, знаёмага нобелеўскага лаўрэата па фізіцы… Блат у паліклініцы, урэшце… *(рогат)*. Дзякуй, сябры! У апошнія тыдні школы я змог пабачыць у вас нешта большае за канкурэнтаў — я пабачыў у вас сёстраў і братоў — і вельмі даражу гэтым пачуццём. Нас зрадніла школа — і гэта ўжо назаўжды. Мы — стартавы капітал адно аднаго. Дык парупімся ж, каб з гадамі ён толькі павялічваўся…

— Ох, які ж ён усё-ткі сэксі, калі прамаўляе, — зацмокала Галя. Яны са Снежкай стаялі за кулісай побач са школьнай партай, дзе быў ахайна раскладзены рэквізіт. Нумар Снежкі быў амаль тэатральным, рыхтавацца трэба было загадзя, таму ўсе яго ўдзельнікі ад 11 «Д» падняліся на сцэну, як толькі Лабановіч скончыў раздаваць медалі, атэстаты і граматы.

На сцэне пры мікрафоне стаяў Максім Статкевіч. 11 «А» вырашыў элегантна адкруціцца ад актыўнага ўдзелу ва ўрачыстым канцэрце, адправіўшы яго прамаўляць ад імя класа.

— Бліна, зірні на Сініцу, — адказала Галі Сняжана.

Соня стаяла ў супрацьлеглай кулісе — адтуль яна мусіла выйсці на сцэну. Яе шчокі палалі ружовым, фарбаваныя

бляскам вусны прыадчыніліся ад здзіўлення, а вочы проста паядалі Максіма.

— Ды ён яе магнітам прыцягвае! — сказала Снежка. — Ты як хочаш, а я думаю, фігу яна вылекавалася.

— Снежа, благаю, давай усё спынім! — зашаптала Галя. — А то выйдзе як тады з калажыкамі.

— Позна, ужо зусім позна, — адрэзала Сняжана.

— Дзякуй вам, сябры. Вы — космас! — сказаў Максім і імкліва збег са сцэны пад авацыі.

Фраза пра космас была яўна дамоўленая з вядоўцамі — Каньковай і Каланіцкім. Яны тут жа выйшлі на сцэну. Лена парадаксальна падтрымала маленькі чорны флэшмоб усіх разумных дзяўчатак паралелі — яна была ў белай карункавай сукенцы з карункавай жа стужкай у дрэдах. На шыі ў яе красавалі грубыя каралі з неапрацаванай чорнай лавы. Каланіцкі апрануў беласнежны гарнітур, пад якім замест кашулі была чорная футболка з намаляваным на ёй гальштукам.

— Дарэчы, пра космас… — харызматычна падхапіў Ваня. — Сустракайце: гурт «Астэроід»! — скончыла за яго Лена.

Пакуль прамаўляў Максім, на сцэне размяшчаліся тры хлопцы з 11 «Д» з электрагітарамі і сінтэзатарам. З імі быў яшчэ бубнач, якога ніхто не ведаў, — літаральна за тыдзень да вечара яны адшукалі яго ў дзявятай гімназіі разам са старэнькай ударнай сістэмай. Увесь клас сачыў за гэтай драмай — пацанчыкі не паспелі сыгр459, і цяпер мусіла адбыцца жорсткая імправізацыя.

На сцэну выйшла Наста Ракавец у чорнай трыкатажнай сукенцы з прынтам, на якім усміхаўся і махаў рукой Гагарын. Хлопцы ўдарылі па струнах — і яна заспявала не вельмі складную пераробку песні гурта «Ундэрвуд» з рэфрэнам: «Дырэктар, я вас любіла, а-ла-ла-ла». У гэты час на задніку пачалі круціцца слайды з выпускных альбомаў усіх адзінаццатых класаў — у тым ліку мамы Юліны фоткі «дэшак».

Гэта быў яшчэ не самы адстойны нумар праграмы — фізікі, матэматыкі і эканамісты не моцна напружыліся і падрыхтавалі хто вершыкі, хто КВЗ пра жыццё школы. Галя і Снежка назіралі гэтую нуду на рэпетыцыі і ні кропелькі не ўразіліся. Добра, што ў дырэктара Лабановіча была палачка-выручалачка — Каця Арызона, якая пагадзілася заспяваць пару эстрадных песенек пад мінусоўку.

Так што нумар Галі і Снежкі мусіў быць гваздом.

Шасцёра дзяўчатак 11 «Д» скінуліся грашыма і пашылі сабе сукенкі на выпускны па Галіных эскізах. Разам усе ўборы складалі адну модную калекцыю маладой дызайнеркі Галіны Вайтовіч. І цяпер — пад нацягнуты жарт вядоўцаў пра «Zialony Luh Fashion Weekend» — пачыналася ўласна дэфіле.

Спярша Снежка, Соня, Аліна Макей і яшчэ дзве дзяўчыны-«дэшкі» хуценька перабеглі ў цэнтр сцэны за шырму, якую вынеслі два іх аднакласнікі і якая затуляла стол з рэквізітам. Вядома ж, Галя і Сняжана спярша папрасілі дапамагчы Васю з таварышамі, але той сказаў, што ён на выпускным «па сваёй праграме». Таму да ўдзелу ў шоу намовілі іншых хлопцаў. Рэжысёркай была Сняжана. Першую частку дэфіле яна абставіла як звычайны модны паказ: дзяўчаткі проста хадзілі па сцэне на абцасах, стараючыся ставіць ногі, як запраўскія мадэлькі, не заблытацца ў спадніцах і не паваліцца. Страшна было, ясная справа, але зала зычліва падтрымала воплескамі. Пагатоў Галініны сукенкі сапраўды былі шэдэўральныя.

Другая частка дэфіле ўяўляла з сябе карыкатуры на школьных знакамітасцей.

Спачатку на сцэну пад бадзёры саўндтрэк выйшла сама Снежка з папяровым пакетам. Яна вымала з пакета і раскідвала сшыткі, а за ёй беглі хлопцы і падбіралі іх. Напрыканцы хлопцы пасадзілі яе на рукі і вынеслі за кулісы. То была пародыя на беларусіцу Алену Іванаўну, якая славілася сваім какетлівым стаўленнем да вучняў мужчынскага полу

і трапіла ў зоркі школьнага пабліка напрыканцы другой чвэрці, калі ў адзін дзень правяла дыктоўкі ў пяці класах і склала ўсе сшыткі ў вялікі папяровы пакет з абутковай крамы, каб праверыць дома. Дно разарвалася, і дыктоўкі густа засыпалі лесвіцу з трэцяга да першага паверха. Іх увесь перапынак збіраў дзяжурны клас у поўным складзе, радасна здымаючы працэс на мабілкі.

Ссадзіўшы Снежку, хлопцы вярнуліся на сцэну ў чорных капелюшах і сталі спінамі да публікі, а чарнявая аднакласніца Лера ў сукенцы з простакутным сілуэтам ар-дэко стала круціцца вакол іх, зусім як спявачка Арызона ў сваім адзіным пакуль што кліпе: яго зусім нядаўна запусцілі на музканале. Лера знікла — з’явілася фігурыстая Дарына. На першым дэфіле яна выкрочвала ў кароткай сукенцы а-ля дыска, але на другое выйшла ў пышнай цыганскай спадніцы з захінам. Хлопцы-асістэнты, якія ўсё яшчэ заставаліся на сцэне, targанулі спадніцу ў розныя бакі, і з-пад яе вылузнулі ружовыя трэнікі. Дарыначка зрабіла сканфужаны твар і ўцякла. Выпускнікі выбухнулі рогатам і авацыямі, а аб’ект злой насмешкі — Ліза Паўзункова (яна сапраўды была сёння ў пышнай і безгустоўнай бальнай сукенцы персікавага колеру) — сядзела чырвоная як бурак.

Соня таксама хіхікала, высунуўшыся з-за шырмы, але злацешыць асабліва не было калі, бо надышла ейная чарга.

Паненка выскачыла на сцэну, дзе застаўся толькі адзін з хлопцаў-асістэнтаў. Той зняў капялюш, агаліўшы ніцяны парык з дрэдамі. Соня павісла ў яго на шыі, сагнуўшы ногі ў каленках і счапіўшы іх ззаду спакуслівым замочкам — і хлопец, адкінуўшыся, закруціў яе па сцэне. Зала заўлюлюкала — гэта быў фірмовы фокус Каньковай і Каланіцкага, які яны часцяком выкідвалі на школьных калідорах. Тыя таксама зарагаталі ды запляскалі, а потым сталі побач і прадэманстравалі арыгінал.

Здаецца, шоу спадабалася. Засталося апошняе дэфіле, пасля якога дзяўчаты і хлопцы мусілі выйсці на паклон і па завядзёнцы модных паказаў запрасіць на подыум мадэльерку…

На сцэну з-за шырмы выслізнула Аліна Макей, а за ёй — аднакласнік з тэніснай ракеткай на плячы.

З ракеткай — бо трэба было пазнавальна намякнуць на Статкевіча.

Аліна ішла задам наперад і несла перад сабой гіганцкі — памерам з ватман — канверт з налепленым на яго чырвоным сэрцам, прываблiваючы хлопца, як кацяня фанцікам. Той спрабаваў зачапіць канверт ракеткай, але Аліна кожнага разу спрытна адскоквала. Нарэшце — перад самым краем сцэны — «Максім» ухапіў канверт рукою, яны з «Соняй» — Аліна, ясна, увасабляла яе — пацягнулі яго ў розныя бакі, папера парвалася — і ў залу пасыпалася канфеці.

Гэта быў фурор.

Усе ўдзельнікі нумара пад авацыі высыпалі на сцэну, цягнучы за сабой Галюню. Толькі Сінічкі паміж імі не было.

— Пакуль спявае Арызона, — абвясціў Ваня Каланіцкі, падкрэсліўшы слова «пакуль», — пакуль унізе ідуць апошнія рыхтаванні да неафіцыйнай часткі вечара, родныя і сябры могуць сфатаграфавацца з выпускнікамі. Калі ласка, запаліце святло ў зале…

x x x

*Пакуль, пакуль,*
*Гэты боль невядома адкуль.*
*Пакуль, пакуль,*
*Так было заўжды і паўсюль.*
*Расстаемся, гаворачы*
*Словы без горычы,*
*На-на-на-на-на…*

Арызона спявала хіт Свірыдавай і круцілася вакол мікрафона, зусім як у сваім кліпе. Зала кіпела, быццам варэнне з чарніц, — мамы і таты абдымалі сыноў у строгіх гарнітурах і дачок у чорных сукенках, паварочваючы іх тварамі да фотаапаратаў і відэакамер. Успыхвалі ўсмешкі і бліскавіцы.

— Трэба пагаварыць, — сказала Соня, прабіўшыся да Галі і Снежкі, якія стаялі пад сцэнай са сваімі бацькамі. — Зараз жа.

Цокаючы абцасамі, паненкі ўзняліся на прыступкі сцэны бліжэй да выхаду з актавай залы. Але толькі Соня набрала паветра ў грудзі, каб пачаць, знізу азваўся ўзлаваны голас:

— Ваша брыгада дастала ўжо сваімі перформансамі, Сінічка! — гучна, каб перакрычаць Арызону, сказаў Максім, падыходзячы да прыступак. — Ты што, моўчкі не можаш пакутаваць? Абавязкова было зноў ганьбіць мяне на ўсю школу? І гэта — перш чым закочваць свой Галя-канцэрт, — паморшчыўся ён, скасавурыўшыся на Вайтовіч, — трэба было б усё-ткі разабрацца, хто тут за кім бегае.

Ён павярнуўся і выйшаў у калідор, нырнуўшы ў квяцістую арку.

*Вось і ўсё, маё золатка,*
*Нам з табой было соладка,*
*Як гарэла да золку нам*
*Белай ночы святло.*
*Не вярнуць, што не вернецца,*
*Ты не Бог, я не верніца,*
*І цяпер цяжка верыцца,*
*Што каханне было.*

На Соніны вочы навярнуліся слёзы.

— Я проста хацела сказаць, што Статкевіч выліе на мяне вось усё тое, што вы пачулі, — сказала яна дзяўчатам. — І бессэнсоўна яму тлумачыць, што вы мяне падставілі,

гнюсна так, за маёй спінай утварылі падлу. І, вядома ж тады, калі ён… Калі я… Эх вы — абы напаскудзіць... Сяброўкі.

*Пакуль, пакуль,*
*Зразумей і рэчы спакуй.*
*Пакуль, пакуль,*
*Не пішы лістоў мне адтуль.*
*Усё, што трэба, пачула я,*
*Справы мінулыя,*
*На-на-на-на-на…*

— А я папярэджвала, — сказала Галя, калі яны са Снежкай засталіся сам-насам. — І што цяпер рабіць?

— Што-што… Прасіць прабачэння ў Сініцы. І віну сваю загладжваць. Бачыш жа, што яна па-ранейшаму ўцюханая ў баклажана па вушы.

— Ага, а ён з Ротмістравай сустракаецца.

— Ды не!

— А каго ж ён у сваёй прамове згадваў? «Адна разумны чалавек»… Ха! Такія рэчы абы пра каго не кажуць!

— Ведаеш, калі нешта сёння і можна зрабіць для Сонькі, дык гэта раз і назаўжды праясніць кейс «Статкевіч — Ротмістрава».

— І як?

— Ды наўпрост у яе спытацца! Думаеш, яна не скажа?..

— І сапраўды! І як мы раней не даўмеліся…

*Пакуль, пакуль,*
*На маім тэрмометры нуль.*
*Быў час, калі*
*Мы з табой у нябёсах жылі.*
*Будуць новыя радасці,*
*Дзякуй. Пара ісці.*
*На-на-на-на-на…*

— Дзеўкі! У мяне ўсё чыкі-пукі! Вам — заданне! Роўна а другой нуль нуль абавязкова будзьце на дыскатэцы. І Сініцу пры сабе трымайце! — прагарлаў Вася, падбегшы да прыступак.

— Халера… Зусім пра яго забылася, — паківала галавой Галя, калі Вася вылецеў з залы.

— Што гэта было?

— Думаю, ён нешта замуціць для Сонькі… Ты ж яму сама гэтую ідэю ў галаву ўбіла.

— Ох і заварылі мы кашу, Галюнь... Выкіпае.

Клац! Клац!

— Вось вы дзе, мае дзяўчаты! Мае зорачкі! Чаго такія кіслыя? Сма-а-айл! Хадземце, сфоткаю вас з бацькамі! Ці бачылі вы, куды пайшлі Соня і Максім? Я іх шукаю! Ах, якія колеры! Якія сукенкі! Які вечар! Столькі пажывы!!!

*Вось і ўсё… было соладка…*
*Нам з табой… Пакуль… Пакуль…*

x x x

— Тата, выходзь! — сурова сказала Соня, раскрываючы дзверы кабінета рускай мовы.

— Што такое, сонейка? — сказаў Пётр Сінічка. У руках ён трымаў пластыкавы кубак і канапку з чырвонай рыбай. Лустачка рыбы скруцілася на кругляку багета ў адмысловы вузельчык, які выдаваў у канапцы прадукцыю рэстарацыі «Пан Сцяпан».

— Што за пекла творыцца ўнізе? — спыталася дачка.

— А што такое?

— Як што? Мы прыходзім у сталоўку, а там накрыты адзін вялікі стол на «ашак» і «дэшак»!

— А-а-а. Гэта геніяльная ідэя Юлькі. Яна палічыла, што калі скласціся на фуршэт двума класамі, то выйдзе танней. Ну і я па сабекошце харчоў падагнаў нарэзку…

— А нічога, што «ашкі» нас спрадвеку з граззю мяшалі? Ведаеш, што там цяпер робіцца? Там людзі курыныя ножкі лічаць і на розныя канцы стала пароўну раскладаюць.

— Праўда? Дзіўна, — азірнуўся Сінічка.

Соня агледзела кабінет. Толькі цяпер яна заўважыла, што дарослых у класе неяк замнога. Анягож — тут сабраліся не толькі бацькі іхняга класа, але і мамы-таты «ашак». І тут усё адбывалася значна больш мірна, чым у сталоўцы. Мама Юля прыязна гутарыла з Антанінай Васілеўскай. Тата Лінькова чаркаваўся з татам Ротміставай. Многія дарослыя былі міжсобку даўно знаёмыя. І нават Ніначка з Іванавічам, седзячы ўдваіх за настаўніцкім сталом, наварочвалі аліўе і з чагосьці сабе смяяліся.

Відаць, пасля школы няма розніцы, хто на што вучыўся.

— Эх вы… Ведала б — зусім не прыходзіла б на выпускны.

— Ну што ты, дачушка… Ты сёння такая прыгажуня… То бок ты ў мяне ўвогуле прыгожая, але сёння — асабліва.

— Слухай, накладзі мне ежы тут. Я хачу адна паесці. Не хачу там сядзець.

— Не дуры, маляўка. Давай, хуценька цокай ножкамі назад. Там жа твае сябры…

— Ага, сябры… Вочы б не бачылі.

— Мама, хадзі сюды! — раптам пачуўся віскат ззаду. — Што за фігню вы замуцілі ў сталоўцы?

Гэта Паўзункова прышамацела па Сонiных слядах сваёй персікавай сукенкай.

— Ладна, татусь, праехалі. Я сапраўды пайду.

х х х

Соня спусцілася ў паўцёмную сталоўку, калі ўжо грымеў дыскач. На невялічкай сцэне-подыуме ў куце залівіста падбадзёрваў танцпол запрошаны ды-джэй. Дзяўчына акуратна

села на адно з крэслаў, пастаўленае пры сцэнцы, там, куды не дабівалі блікі дыска-шара, і стала медытатыўна глядзець на рытмічныя рухі целаў. Дрыгацца не хацелася. Яна прыкмеціла Галю і Снежку ў купцы аднакласніц, але падыходзіць не збіралася.

У англійскім слэнгу ёсць спецыяльнае слова для тых, хто падпірае сценкі на школьных дыскатэках і ўвогуле не вытыркаецца па жыцці — wallflower.

Соня заўсёды была такой кветкай. Навошта яна адарвалася ад сценкі? Трэба ведаць сваё месца.

Яна пашукала вачыма Статкевіча. Ён сядзеў за інтэграваным «А-Д» сталом з іншымі хлопцамі-«ашкамі» і флегматычна жаваў адбіўную. У водбліску дыска-шара было відаць, як пад бравурна расшпіленым бялюткім каўнерам рытмічна рухаюцца вострыя ключыцы.

Ды-джэй абвясціў павольны танец — і з дынамікаў палілася адна з рок-балад «Scorpions».

— Можна цябе запрасіць? — раптам пачула Соня.

Паненка спужана ўскінула галаву. Перад ёй стаяў сябар Максіма, Ягор Залескі.

Трэба было сказаць не, але яна чамусьці пагадзілася.

*...Here I am, will you send me an angel?*
*Here I am — in the land of the morning star.*

— Ну што за антыкварыят?.. Мусіць, яшчэ мой тата пад яе танцаваў... А можа, і дзядуля...

— А мне падабаецца.

— Ай ладна, не зважай. Гэта я каб пачаць размову.

Ягор добра танцаваў і, што спадабалася Сінічцы, вёў яе далікатна, як у вальсе. Хлопцы з «Д» класа, запрашаючы паненак на танец, зграбалі іх у абдоймы і так качалі ўсе тры хвіліны медляку. Часам трэба было прасіць іх крыху адсунуцца

і выслухаць кпіны пра «піянерскую адлегласць». А Залескі не парушаў межаў.

— Дзіўна, што ты мяне запрасіў, — сказала Соня.

— Я заўтра з'язджаю ў Чэхію. Буду паступаць у Празе ў міжнародны эканамічны. Вось, персанальна развітваюся з сімпатычнымі мне людзьмі.

— І ўсіх запар на танец запрашаеш?

— Ну чаму? Бергеру я асадку падарыў.

— Хм… Нехта з «ашак» называе кагосьці з «дэшак» сімпатычным чалавекам. Санкцый не баішся? Нашы класы толькі што адбіўныя дзялілі. А я дык навечна ў апале… Можаш уявіць, што Статкевіч сказаў пра наш нумар.

— А, Статкевіч… Дык ён вядомы зануда. І жартаў на свой адрас не ўспрымае. Я з ім тры гады за адной партай прасядзеў — ведаю, што кажу. А нумар быў адпад! Даўно я так не смяяўся.

— Гэта не я. Я нават не ведала… Чорт, ён на нас глядзіць.

— А то. Столькі нудзець камусьці на вуха пра абсалютнае зло Соню Сінічку — і раптам пабачыць, што гэта працуе з дакладнасцю наадварот. Мне вось у выніку шкада аднаго — што мы з табой не былі бліжэй знаёмыя. Я думаю, ты незвычайная дзяўчына. Ведаеш, калі раптам будзеш у Празе, абавязкова мяне знайдзі.

Апошнюю фразу ён дагаварыў, калі музыка аціхла.

— Дзякуй за танец! І гэта… Удачы, Соня, — сказаў Ягор, галантна правёўшы яе да крэсла пры сцэнцы.

— Дзякуй. І табе шчасліва паступіць.

— Так, але я не пра іспыты, — сказаў Залескі і знік у натоўпе.

Захацелася піць. Пабачыўшы, што амаль увесь яе клас танцуе, Соня пайшла разжыцца сокам. Неахайна ссунутыя сталы поўніліся пластыкавымі талеркамі з пансцяпанаўскімі прысмакамі, знаёмымі з дзяцінства. Соня падчапіла свае любімыя тарталеткі і радасна імі захрумсцела, запіваючы

ананасавым нектарам. Адно да аднаго — і ўжо амаль другая гадзіна ночы. А яна з абеду нічога не ела.

Калі яна ўжо з апетытам абірала гроначку вінаграду, з боку ды-джэйскага пульта пачулася неверагоднае.

— Калі нехта з вучняў 11 «Д» — паўтараю, адзінаццатага дэ! — дыхае паветрам або проста ўзяў тайм-аўт, вялікая просьба сабрацца каля сцэны. Бо літаральна праз пяць хвілін перад вамі з эксклюзіўным нумарам выступіць ваш аднакласнік. Асобная просьба падысці да сцэны Соф'і Сінічцы!

Божухна! Што яшчэ? Яе сёння ўвогуле пакінуць у спакоі? Усе, хто быў у сталоўцы, сталі абарочвацца, шукаючы яе вачыма. Соня прамакнула вусны сурвэткай і пацокала да подыума, на якім стаяла апаратура. Але на ўсякі выпадак стала паводдаль. Ступакі, закутыя ў абцасы, гулі ад стомы.

Народ пачаў вяртацца ў залу. Не толькі «дэшкі»: і «А», і «Б», і «В», і «Г» — усе выпускныя класы набіліся ў сталоўку і заінтрыгавана абступілі сцэну. У Соні было нядобрае прадчуванне.

І сапраўды: праз колькі хвілін праектар вывеў на заднік сцэны гіганцкія барвовыя ружы, і ды-джэй запусціў трэк. Гэта быў невынішчальны шлягер гурта «Фрыстайл» пра ах-какую-жэншчыну. Гімн пошласці ўсіх народаў былога Савецкага Саюза.

Максім зайшоў у сталоўку і стаў перад сцэнай, прытуліўшыся да калоны і склаўшы рукі на грудзях. Побач з Ротмістравай.

А на подыуме з'явіўся Вася.

Ён быў сёння вельмі сімпатычны — Соня не магла не прызнаць гэтага. Нават няўдалая стракатая кашуля, пра якую ўвесь вечар буркатала Галя, не надта яго псавала. Вася ўзяў мікрафон і стаў раскачвацца ў такт мелодыі.

І тут танцпол зарагатаў. Бо за Васем на сцэну выпаўзлі Дубовік і Лысы. У кароткіх жаночых сукенках у абліпку,

у туфлях сорак другога памеру на абцасах і яскрава размаляваныя. Яны пачалі віхляць сцёгнамі на заднім плане.

Соня адчула, што чырванее ад сораму.

А Вася як нічога ніякага заспяваў. Прычым заспяваў душэўна, пранікліва і нават менш фальшыва, чым Наста Ракавец пра дырэктара:

*Я цябе сустрэў у школе,*
*Мы тусілі па прыколе,*
*Мне нікім была ты аж да сёння.*
*Ты сядзіш за трэцяй партай,*
*Не глядзіш назад упарта,*
*Абярніся ж, дзеўка Соня…*
*Не сяку параграфу —*
*Водар ад тваіх парфум*
*Так дурманіць галаву шальную…*
*Ах, якая дзеўчына, якая дзеўчына —*
*Мне б такую…*

Песня была зацяжной, манатоннай, а прыпеў пра «дзеўчыну» паўтараўся бясконца. Гледачы пачалі нецярпліва пасвістваць. На апошнім куплеце Дубовік і Лысы не ведалі ўжо, якія прыдумаць рухі, і затанцавалі адзін з адным павольны танец. Гэта было жахліва.

З апошнім акордам песні Вася з усіх ног вылецеў са сталоўкі. Ніхто нічога не зразумеў. Так прайшла амаль хвіліна. Дубовік і Лысы, якія нарэшце пачуліся ніякавата, бо ўсе глядзелі толькі на іх, таксама паціху зматалі ў калідор. Сталоўка азадачана загула.

— Клаўнада для клаўнесы, — раптам гучна прамовіў Статкевіч.

Нехта захіхікаў.

Не першы ўжо раз Соня зірнула на сябе вачыма Максіма. І сапраўды — якім банальным і тандэтным магло падацца

чалавеку з густам ейнае жыццё! Але ў тым і рэч — гэта было ейнае жыццё. Ейнае кола, ейны свет. І ніхто не меў права смяяцца з гэтага. Яна рашуча прабралася праз тлум і спынілася перад Максімам. Цяпер усе глядзелі на іх абаіх.

— Але табе ўсё адно слабо, — спакойна і цвёрда сказала яна.

— Што слабо? Аблажацца на публіцы? Так аблажацца — слабо.

— Быць самім сабой. Адкрыта праяўляць свае пачуцці. Ды, халера, нават комплексы свае пераадолець… Выйсці на людзі ў жаночай сукенцы — і не баяцца, што цябе гомікам назавуць. Так, яны аблажаліся. Але яны — жывыя і шчырыя. А ты наскрозь фальшывы. Ты — фанабэрысты, піжоністы, эгаістычны балван.

— А-а-а-а! — загуў выпуск. Пачынала быць сапраўды цікава.

Максім слухаў Соню, апусціўшы галаву. Потым ён прыўзняў яе і, хітра прымружыўшыся, зірнуў дзяўчыне ў вочы.

— Але ж менавіта таму ты мяне і кахаеш. Таму што я фанабэра, піжон і эгаіст. Isn’t it?

— О-о-о-о-о!

— Ніфіга я цябе не кахаю! Гэта было даўно і няпраўда, — нарэшце выбухнула Соня.

— Ага, расказвай.

Максім за два скокі перасек сталоўку і падышоў да мікрафона.

— Праўда ж усім тут цікава ведаць, што было ў тым самым лісце?

— Ы-ы-ы-ы!

— Ну то слухайце. «Я — Соня Сінічка з 11 „Д“. Мы не знаёмыя, хоць вучымся ў адной школе, і наўрад ці калі пазнаёмімся. Як сказалі б брытанскія арыстакраты, нас няма каму прадставіць. Таму я наважылася напісаць гэты ліст, у якім хачу сказаць вельмі важную для мяне рэч. Я цябе кахаю».

— Дзе ты яго ўзяў і нахалеры прачытаў???

— А хіба яно не мне адрасаванае? Што хачу са сваёй поштай, тое і раблю. «Я ўсім сэрцам пакахала цябе, як толькі пабачыла два гады таму на лінейцы ў дзявятым класе. З таго часу ты надаеш сэнс майму жыццю».

— Нафіг было на памяць завучваць???

— А я папярэджваў, я аўтаматычна запамінаю!

— Дасталі тут усіх! Калі вы ўжо ажэніцеся? — выгукнуў нехта.

— «Са мной такое здарылася ўпершыню. Спачатку я спадзявалася, што гэта проста завіхрэнні ў маёй галаве…»

Ох і раз'юшылася ж Соня! Яна выхапіла з торбачкі мабільнік, дрыжачым паказнікам адкалупала ў меню тэчку з фотаздымкамі і хуценька заварушыла вялікімі пальцамі. Потым рынулася да ноўтбука побач са сцэнай. Пры ім сядзеў запрошаны ды-джэй, які не ведаў кантэксту гэтай мілай разборкі, і таму агаломшана назіраў за «ашызелымі дзеткамі».

Толькі б там быў інтэрнэт.

Інтэрнэт быў. Схапіўшы мышку, Соня адкрыла браўзер і па памяці набрала адрас сваёй старонкі.

Барвовыя ружачкі на задніку змяніліся выявай сімпатычнай дзяўчыначкі ў строі сняжынкі.

Соня ўскочыла на сцэну.

— Вашай увазе — фота Максіма Статкевіча, калі ён быў маленькім. Да чатырох гадзікаў ягоная мама думала, што ў яе нарадзілася дачка!

— Ы-ы-ы-ы!

Тут мабільнікі выцягнулі нават тыя, хто быў паленаваўся здымаць фрык-шоу Васі, а потым дэкламацыю Максіма.

— Дуруша, што ты нарабіла? — папунсавеў Максім, абярнуўшыся на сцяну.

— Гэта ты дурань, калі думаў, што я копію не захаваю, — сказала Соня і, састроіўшы Максіму міну, вылецела са сталоўкі.

x x x

Каб школьнікам было зручней выходзіць дыхаць паветрам, адміністрацыя адкрыла бакавыя дзверы каля сталоўкі. Яны вялі ў двор-калодзеж. Туды ж разнасцежылі дзверы вестыбюля. Пра гэтую прастору таксама падбала клапатлівая мама Юля. Сюды вынеслі парты і крэслы, лаўкі са спартзалы, па калонах развесілі гірлянды ліхтарыкаў. Атрымаўся ўтульны дворык, дзе гурталіся дзеці, іх бацькі і настаўнікі ды дзе з нудотным выглядам сядзеў міліцыянт, пастаўлены сачыць за парадкам.

Але Соня была ў бяспамяцтве, таму выбегла са школы той дарогай, якую ведалі ногі: па калідорах на ганак галоўнага ўвахода. Тут не было ні душы. Гарэў толькі адзін цьмяны ліхтар над дзвярыма.

Дзяўчына зляцела з высокай лесвіцы і забілася ў цёмны выступ паміж сходамі і фронтам ганка. Прытулілася голымі плячамі да прахалоднага бетону і аддыхалася.

Што яна нарабіла?

Цяпер Статкевіч дакладна зжыве яе са свету.

Трэба здаваць іспыты ва ўнівер і тут жа ад іх высяляцца. Больш гэтага трываць немагчыма.

Яна хаатычна кеміла, што рабіць. Плячам было золка. Трэба забраць куртачку — яна засталася ў кабінеце русліту, — схапіць за каўнер тату і валіць дадому. Ніякіх світанкаў.

Раптам яна пачула крокі. Нехта спускаўся па лесвіцы. Аёй — Максім! Яна прымружылася і яшчэ мацней уціснулася ў сцяну.

Ён быў скіраваўся ў школьны парк, але Соня, відаць, надта гучна сапла, бо ён абярнуўся.

— Ага, вось ты дзе, — сказаў ён, вяртаючыся. — Нашкодзіла — і ўцякаць?

— Ты першы пачаў, Статкевіч. І атрымаў па заслугах. Што, прыемна, калі з цябе ўся школа рагоча?

— Затое ад твайго ліста ніякай аддачы. Ніхто не засмяяўся. Нясмачна напісала. Ніводнай граматычнай памылкі.

— Хе, абламаўся? Нарэшце знайшлося тое, чаго ты не змог абсцябаць? — сказала яна з запалам, гледзячы проста яму ў твар. — А ведаеш чаму? Бо там усё праўда. Я кахаю цябе — і гэта мая хвароба.

— Ай, усё, — абыякава сказаў Максім і, засунуўшы рукі ў кішэні, павярнуўся да сходаў.

— Але я перастану. Чуеш? Я клянуся, што забуду цябе. Паступлю ва ўнівер і знайду сабе нармальнага хлопца. А цябе — раскахаю.

Максім нечакана застыў на месцы, павярнуўшы да Соні нахмураны твар. Вочы ягоныя іранічна бліснулі.

— Што, Сінічка, — прамовіў ён, падыходзячы ўпрытул. — Забыць мяне надумала?

— Ага, — зніякавела Соня.

— Ну што ж, паспрабуй…

У наступнае імгненне ён згроб яе вусны сваімі. Гэта было адначасова патрабавальна і чулліва, жарсна і далікатна. І неймаверна доўга — так здалося Соні. Правай рукой Максім злёгку прыціснуў яе плячо да сцяны, а левую паклаў ёй на пояс і напружыў цягліцы так, што нельга было ані вырвацца, ані кінуцца яму на шыю. І калі вялікі палец ягонай левай рукі, павольна шнарачы па тонкім шыфоне, праваліўся ва ўпадзіну яе пупка, яна нарэшце адказала на пацалунак.

Ён адняў свае вусны, як толькі ейныя варухнуліся.

— Давай, забывай, — сказаў ён, шумна выдыхнуўшы. Фыркнуў і за некалькі скокаў узляцеў на школьны ганак.

Ногі нарэшце адмовілі Соні. Яна спаўзла па сцяне на халодную плітку двара.

x x x

Няясна, колькі яна так праседзела — чвэрць гадзіны або чвэрць стагоддзя. Нарэшце недзе паводдаль яна пачула галасы.

— Сініца! Ты норм, Сініца? Што з табою?

На справе Галя і Снежка стаялі блізка і крычалі ёй на вуха.

— Вось ты дзе! Мы ўсю школу аблазілі, цябе шукаючы.

— У нас навіна! Крутая!

— Мы спыталіся ў Ротмістравай… Дык вось, яны з Максімам не сустракаюцца! У іх нават у думках не было!

— Проста на Ротмістраву бацькі моцна ціснуць з паступленнем, і ў Статкевіча тая ж фігня. І яны на гэтай тэме стусаваліся.

— Так што ні ён не закаханы, ні яна.

«Я ведаю! — хацелася крыкнуць Соні. — Я ведаю!» Але яна не змагла. Відаць, таму, што насамрэч яна ўжо нічога не ведала і нічога не разумела.

— Сонька, уздымайся! Там нашы каля стадыёна збіраюцца, каб ісці світанак сустракаць. Пакуль дойдзем…

— Ну, уставай, ты ж на брудным сядзіш… Не шкадуеш сябе — пашкадуй хоць сукенку…

Забягаючы наперад, скажу, што сонца ў той дзень так і не ўзышло над 234-й школай.

х х х

Вася сядзеў на подыуме ў пустой сталоўцы, мокры ад поту і з вачыма, шклянымі ад стомы і роспачы. Перад ім на падлозе стаяў вялізны кош з белымі ружамі. Запрошаны дыджэй ужо скруціў сваю немудрагелістую апаратуру і паціху выносіў яе да машыны. На сценах і калонах абмякалі чырвоныя і ружовыя балонікі, поўныя паветра з лёгкіх мамы і дачкі Паўзунковых. За акном шарэла.

Паводле плана, скончыўшы спяваць, Вася мусіў выбегчы са сталоўкі, заскочыць у медпункт, які быў тут блізенька, вынесці адтуль кош руж і ўручыць яго Сінічцы на вачах ува ўсёй паралелі. Ён спецыяльна дамовіўся з медсястрою. Тая на просьбу дырэктара ўсю ноч дзяжурыла і ахвотна пагадзілася папільнаваць букет.

Вось толькі калі Вася падляцеў да медпункта, той быў зачынены. Святло гарэла, але дзверы былі замкнёныя.

Пакуль ён бегаў па паверхах, шукаючы медсястру, прайшло хвілін пятнаццаць. Выявілася, чыясьці мама самлела ў кабінеце матэматыкі, і сястрычка пабегла на рэанімацыю, а кабінет у спешцы з трэскам зачыніла.

Калі ён уварваўся на дыскатэку з кветкамі, усе зноў танцавалі тыц-тыц-тыц, а Сінічкі нідзе не было. Момант быў безнадзейна ўпушчаны.

— Капітан пакідае карабель апошнім? — раптам пачуў ён.

Андрэй Васілевіч акуратна падцягнуў нагавіцы і, крэкнуўшы, прысеў на подыум побач з вучнем.

Вася нічога не адказаў. Ён адно глядзеў перад сабою і круціў кош за дзяржальна, нібы гіганцкі ваўчок.

— Што, дзяўчына пракінула? — спытаўся Лабановіч, ківаючы на кветкі. — О так, дзяўчаты — яны цяпер такія…

Вася працягваў маўчаць.

— Я моцна вінаваты перад табой за лінейку, — сказаў Лабановіч. — Гэта была мая вялікая памылка як педагога. Я прашу прабачэння, але здагадваюся, што ты мне не даруеш.

Вася пацiснуў плячыма.

— Ведаеш, раз я, як вы выслаўляецеся, так налажаў, я табе адплачу.

Вася падазрона скасавурыўся на дырэктара.

— Ага. Раскажу таямніцу, якую ў школе ніхто не ведае. Ты будзеш адзіным. Працягні руку, — дадаў ён, калі пабачыў, што Вася зацікавіўся.

Ён расшпіліў пінжак і паклаў Васеву руку сабе на левую ключыцу. Хлопец намацаў там нейкую круглую цвёрдую скрыначку.

— А цяпер глядзі, — Лабановіч адсланіў каўнер — і хлопец пабачыў на плячы ў дырэктара здаровы бугор скуры са шнарам.

— Гэта кардыястымулятар. Мне сорак пяць гадоў, але без такой штукі маё сэрца ўжо ніколі не зможа біцца. Год таму я больш за месяц быў у адпачынку, — працягнуў Лабановіч, не дачакаўшыся Васевай рэакцыі. — Дык вось, то быў не зусім адпачынак. Мне рабілі аперацыю, а потым я ляжаў на рэабілітацыі ў Аксакаўшчыне. І вельмі баяўся, што ў школе пранюхаюць. Бо мой знаёмы прафесар, які выкладае ва ўніверсітэце на біяфаку, атрымаў мянушку Тэрмінатар, калі студэнты даведаліся пра такую штуку. А мне ніякіх мянушак не хацелася. Але цяпер я разумею, што гэта глупства — хацець здавацца іншым, чым ты ёсць насамрэч… Ну вось, я расказаў. Можаш цяпер зрабіць што заўгодна. Разнесці па школе. Або ў інтэрнэце напісаць. Прыдумаць мне мянушку.

— Ды ладна, — урэшце загаварыў Вася. — Маракі сваіх не здаюць.

— Як хочаш, — усміхнуўся Лабановіч. — Я расказаў… Хадзем ужо. Трэба тут усё зачыніць. І знаеш, дзякуй табе, — сказаў ён, уздымаючыся. — Не ведаю, як ты за адзінаццаць гадоў, а я за паўгода шмат чаму ад цябе навучыўся… Я хачу цябе папрасіць пра нешта вельмі важнае. Паабяцай мне зніжку дзесяць адсоткаў у сваёй першай рэстарацыі. Заробкі ў настаўнікаў ніколі не павялічацца.

x x x

…За акном шарэла, але сонца так і не ўзышло над 234-й школай. Дакладней, яно ўзышло недзе а палове на пятую, як яму і належыць у чэрвені, недзе там, за ватным слоем хмар, але мі-мі-мі ад гэтага не было ніякага. Мінск стаяў шэры, і шэрым быў Зялёны Луг, і Цнянскае вадасховішча пералівалася так, нібы ў яго ўсю ноч сцэджвалі ртуць з градуснікаў. Шэраю была форма міліцыянтаў, якія ўважліва праводзілі вачыма купкі моладзі, і шэрымі — стомленыя твары выпускнікоў, якім хацелася спаць і не хацелася больш ніякай

рамантыкі. Шэрымі былі маленькія чорныя сукенкі выпускніц. І толькі на шэрым пяску пляжа засталося зялёнае шкло ад шампанскага і аранжавае шалупінне ад апельсінаў. Дзяцінства афіцыйна скончылася.

## КАНЕЦ ПЕРШАЙ КНІГІ

*Працяг ёсць :)*

# СПЕЎНІК СОНІ СІНІЧКІ

## «КОЛИ ДО ГУБ ТВОЇХ…»

*Арыгінал; у рамане песня цытуецца ў перакладзе на беларускую мову Паўла Свярдлова.*

*Словы: Грыцько Чубай*

*Музыка: Тарас Чубай (гурт «Плач Єремії»)*

**F#m E**
Коли до губ твоїх лишається півподиху,
**Bm C#m**
Коли до губ твоїх лишається півкроку —
**F#m E**
Зіниці твої виткані із подиву,
**Bm E**
В очах у тебе синьо і широко.

**F#m E A**
Щось шепчеш зачаровано і тихо ти,
**D A E**
Той шепіт мою тишу синьо крає,
**F#m E A**
І забуваю я, що вмію дихати,
**Bm C#m F#m E**
І що ходити вмію, забуваю.

**F#m E A**
А чорний птах повік твоїх здіймається
**D A E**
І впевненість мою кудись відмає,
**F#m E A**
Неступленим півкроку залишається,
**Bm C#m F#m E**
Півподиху у горлі застряває.
**F#m E A**
Зіниці твої виткані із подиву,
**D A E**
В очах у тебе синьо і широко,
**F#m E A**
Але до губ твоїх лишається півподиху,
**Bm C#m F#m E**
До губ твоїх лишається півкроку.
**F#m E A**
Але до губ твоїх лишається півподиху,
**Bm C#m F#m E F#**
До губ твоїх лишається півкроку.

## «ХТО НАТХНІЦЬ МЯНЕ НА СМЕРЦЬ…»

*Словы: Анатоль Сыс*
*Музыка: Лявон Вольскі*

**Em A**
Хто натхніць мяне на смерць?
**Em A**
Я такой не маю волі.
**G A**
Маю толькі болі. Болі —

**Em**
каб пасціцца і гавець,
**A Em**
каб пасціцца і гавець.

З гор сыдзі, як з купалоў,
Дух у вобразе старога,
праз пакуты дай мне Бога,
дай мне Богавую кроў,
дай мне Богавую кроў.

Не жыву — хаджу, што сцень,
брыдкі і чужы паветру,
хоць і выйшаў колісь з ветру,
выйшаў і азмрочыў дзень,
выйшаў і азмрочыў дзень.

Ты натхніш мяне на смерць,
чалавек, цяжарны Богам,
праз цябе мая дарога,
моцы дай яе здалець,
моцы дай яе здалець.

## «ПАКУЛЬ»

*Музыка і словы: Алена Свірыдава*
*Пераклад з рускай мовы: Андрэй Хадановіч*

I
**Cm A#**
Пакуль, пакуль,
**G# D#**
Гэты боль невядома адкуль.

**Cm A#**
Пакуль, пакуль,
**G# D#**
Так было заўжды і паўсюль.
**Fm**
Расстаемся, гаворачы
**G# Fm**
Словы без горычы,
**G**
На-на-на-на-на...

*Прыпеў:*
**Cm**
Вось і ўсё, маё золатка,
**A#**
Нам з табой было соладка,
**Fm**
Як гарэла да золку нам
**G# G**
Белай ночы святло.
**Cm**
Не вярнуць, што не вернецца,
**A#**
Ты не Бог, я не верніца,
**Fm**
І цяпер цяжка верыцца,
**G# G**
Што каханне было

II
Пакуль, пакуль,
Зразумей і рэчы спакуй.
Пакуль, пакуль,
Не пішы лістоў мне адтуль.

Усё, што трэба, пачула я,
Справы мінулыя,
На-на-на-на-на...

*Прыпеў*

III
Пакуль, пакуль,
На маім тэрмометры нуль.
Быў час, калі
Мы з табой у нябёсах жылі.
Будуць новыя радасці,
Дзякуй. Пара ісці,
На-на-на-на-на...

*Прыпеў*

# ЗМЕСТ

## ТОМ ПЕРШЫ

Раздзел I. Катастрофа ..... 7
Раздзел II. Яшчэ адна катастрофа ..... 23
Раздзел III. Неверагодны збег акалічнасцей ..... 29
Раздзел IV. Дзявочыя сакрэты ..... 45
Раздзел V. Успомніць усё ..... 66
Раздзел VI. У скуры батаніка ..... 84
Раздзел VII. Логавішча звера ..... 93
Раздзел VIII. Таямніца дзявятай планеты ..... 103
Раздзел IX. Ацэтонавыя войны ..... 115
Раздзел X. Кіеўскія вакацыі ..... 120
Раздзел XI. Хто такі Дэн ..... 148
Раздзел XII. Шведская эстафета ..... 155

## ТОМ ДРУГІ

Раздзел I. Васямнаццаць градусаў ..... 195
Раздзел II. Кім быць ..... 200
Раздзел III. Адкуль узялася Ротмістрава ..... 225
Раздзел IV. Ноч святога Валянціна ..... 234
Раздзел V. Васю выключаюць ..... 253
Раздзел VI. Англійская сервіроўка ..... 270
Раздзел VII. Кўо Вадзік? ..... 296
Раздзел VIII. Пікнік на попелішчы ..... 321
Раздзел IX. Начное капучына ..... 341
Раздзел X. Ніначка *ex machina* ..... 357
Раздзел XI. Дыягназ — паступленне ..... 371
Раздзел XII. Маленькі чорны выпускны ..... 413

Спеўнік Соні Сінічкі ..... 442

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Вайтоўская** Ева
(**Мартысевіч** Марыя Аляксандраўна)

ГАРЭЗЛІВЫ ПАЦАЛУНАК

Кніга першая

*Моладзевы раман*

16+

Адказны за выпуск *Андрэй Янушкевіч*
Рэдактар *Настасся Мацяш*
Карэктар *Наста Анцімонік*
Камп'ютарная вёрстка *Андрэй Янушкевіч*
Дызайн вокладкі *Кацярына Грэковіч*

Падпісана да друку 12.03.2020. Дата вырабу 05.2020.
Фармат 84×108/32. Папера Lux Cream. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 25,2. Ул.-выд. арк. 17,4.
Наклад 1000 экз. Заказ 20119.

Індывідуальны прадпрымальнік Янушкевіч Андрэй Мікалаевіч.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы і распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/218 ад 18.03.2015.
Вул. Шафарнянская, 3/135, 220125 г. Мінск.
https://januskevic.by

Друкарня «Пэтра афсетас».
вул. Наўёі Рывоню 25С, LT-03153 г. Вільнюс, Літоўская Рэспубліка.
https://petroofsetas.lt



Жыццё ціхай троечніцы Соні Сінічкі да непазнавальнасці змяняецца ў выпускным класе ў той дзень, калі яна прызнаецца ў каханні найлепшаму вучню школы Максіму Статкевічу. Рамантычная гісторыя, якая пачынаецца ў сярэдняй школе аднаго з мікраараёнаў Мінска, трымае ў напружанні да апошняй старонкі. Моладзевы раман па-беларуску.



ISBN 9789857210459

ЯНУШКЕВІЧ
выдавецтва

9 789857 210459



ЕВА
ВАЙТОЎСКАЯ

# ГАРЭЗЛІВЫ ПАЦАЛУНАК

КНІГА 1